ЯНКА КРУК

# СІМВОЛІКА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ



# СІМВОЛІКА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ



ЯНКА КРУК

# СІМВОЛІКА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

*2-ое выданне*

**Мінск**
**«Беларусь»**
**2003**

УДК 393.3 (=826) + 008(476)
ББК 82.3 (Беи) + 71(4 Беи)
К 84

© Крук І.І., 2000
© Тарэеў Ю.А., афармленне, 2000
© УП «Выдавецтва «Беларусь», 2003

ISBN 985-01-0460-0

# СЛОВА ДА ЧЫТАЧА

Шаноўныя чытачы! Вы трымаеце ў руках незвычайную кнігу, якая, хочацца верыць і спадзявацца, праз пэўны час будзе ляжаць на стале ў кожнай сям'і і стане добрым дарадчыкам у шматлікіх жыццёвых сітуацыях. Падчас падрыхтоўкі кнігі перада мной стаяла надзвычай цяжкая і, магчыма, да канца невырашальная задача: зазірнуць у свяшчэнныя тайны традыцыйнай народнай культуры, асэнсаваць законы і заканамернасці яе шматвяковага існавання і паспрабаваць перакінуць надзейны масток у дзень сённяшні, каб патлумачыць суайчыннікам-сучаснікам, што без глыбокага ведання сваіх каранёў і вытокаў мы не зразумеем асаблівасцей нашага светаўспрымання і светаадчування, не зможам асэнсаваць ролю і месца чалавека ў прыродным ланцужку планеты Зямля і бязмежнага Космасу.

Разважаючы над праблемамі і асаблівасцямі гістарычнага развіцця беларускай народнай культуры, я ўсё больш пераконваўся ў тым, што духоўная спадчына нашага народа грунтуецца на функцыянальных законах, аналагічных законам фізікі і матэматыкі, біялогіі і хіміі, а таксама ў адпаведнасці з законамі сацыяльных і гуманітарных навук. Аналогіі ўзнікаюць розныя і шматбаковыя. Напрыклад, няведанне законаў тэрмадынамікі або працякання хімічных працэсаў, сусветнага прыцяжэння можа прывесці да непрадказальных вынікаў. Гэтаксама і парушэнне законаў існавання і развіцця народнай культуры можа прывесці да разладу ў сем'ях, да непрадбачаных цяжкіх захворванняў, розных псіхафізічных паталогій. Аб тым, як пазбегнуць шматлікіх непрыемнасцей, і вядзецца гаворка ў прапануемай кнізе.

У цэнтры нашай увагі асноўныя абрады і рытуалы, якія спадарожнічаюць чалавеку на яго шляху ад нараджэння і да пахавальнага вогнішча.

У кнізе вы знойдзеце адказы на шматлікія пытанні, над якімі, магчыма, і не задумваліся: чаму нявеста на вяселлі ў белым, якой павінна быць фата ў маладой, якім ручніком і як перавязваць сватоў на вяселлі, як правільна адправіць да вян-

ца і сустрэць маладых перад парогам сваёй хаты; якой сістэмы рэгламентацый павінна прытрымлівацца цяжарная жанчына, як выбіраць імя нованароджанаму і хто можа быць хроснымі бацькамі; як правесці абрад першага рытуальнага купання дзіцяці; як неабходна паводзіць сябе ў час пахавання чалавека; як дакладна накрыць вясельны і памінальны стол і як пасадзіць за імі гасцей?..

Каб сённяшнім дарослым і дзецям была больш зразумелай сутнасць абрадаў, пакінутых нам у спадчыну продкамі, я імкнуўся патлумачыць змест розных рытуальных сітуацый, а таксама сэнс ужывання тых ці іншых атрыбутаў (ручніка, зоркі, падковы, каравая, кветак, галінак елкі).

Асобная ўвага ўдзяляецца глыбіннай і надзвычай багатай сімволіцы лікаў, універсальнаму рытму нашай культуры, які прамаркіраваны лікамі *3—9—40*. У кнізе выказваецца меркаванне, што наша сучасная традыцыя хадзіць на спатканне з дзяўчынай з трыма кветкамі, а на "спатканне" з памерлымі сулродзічамі з дзвюма — недаравальная памылка, якую трэба тэрмінова ўсім народам выпраўляць.

Хочацца спадзявацца і на тое, што кніга з цягам часу можа стаць вучэбным дапаможнікам для настаўнікаў, якія выкладаюць родную мову і літаратуру, гісторыю культуры і мастацтва і якія возьмуць на сябе адказнасць і пачэсны абавязак захаваць набыткі нашай культуры і перадаць іх наступным пакаленням.

Маю гонар абавязкова адзначыць, што эфектыўнасці маіх навуковых пошукаў спрыялі дзелавыя сустрэчы і абмеркаванні даследуемых пытанняў з маімі калегамі-паплечнікамі, якія выказвалі слушныя заўвагі і прапановы. Перш за ўсё хачу назваць імёны кандыдатаў філалагічных навук У.М.Сысова, А.В.Цітаўца, магістра педагогікі А.В.Катовіч, навуковага супрацоўніка Т.К.Цяпковай, выдатных знаўцаў камп'ютэрных тэхналогій і кніжнай графікі І.Ю.Кузьмянковай і А.В.Лазара. Не магу не ўзгадаць добрым словам маю бабулю Аўдоццю Іванаўну Крук, якая не толькі ўзгадавала мяне, паставіла на ногі і адправіла ў далёкую дарогу за ведамі, але і была маёй першай Настаўніцай, якая пазнаёміла з паэтычнай спадчынай беларускага народа, багатым вопытам народнай медыцыны, непаўторным хараством народных казак і песень. Самыя шчырыя і цёплыя словы хочацца выказаць у адрас маёй сям'і, якая з вялікім паразуменнем і бязмежнай цярплівасцю паставілася да маіх навуковых штудый і зрабіла ўсё магчымае, каб кніга ўбачыла свет.

*ЯНКА КРУК*

# ЧАЛАВЕК І ЧАС



# БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР: шляхі фарміравання, архітэктоніка, семантыка і семіётыка рытуальна-абрадавых комплексаў

Сёння наўрад ці здзівіць каго-небудзь наступнае відовішча: малады чалавек імкліва крочыць па шумлівай вуліцы горада і, прыклаўшы да вуха радыётэлефон, вядзе дзелавую гаворку са сваім партнёрам па бізнесу. Сотавы тэлефон стаў неад'емным атрыбутам хуткасных аўтамабіляў, электронная сетка Internet дазваляе вокамгненна звязацца з любым куточкам зямнога шара і ўвачавідкі пераканацца ў жыцці-здароўі далёкай радні або калег па рабоце, якія знаходзяцца ў працяглай замежнай камандзіроўцы. Некалі зададзены Творцам Сусвету касмічны рытм, які непасрэдна ўплываў на фарміраванне фізічных, псіхічных і сацыякультурных працэсаў, а таксама этнічнага менталітэту, пастулова адыходзіць на другі план, зонай яго ўплыву застаюцца толькі макрапрацэсы, якія знітоўваюць у адзінае цэлае космас-прыроду — чалавека і культуру. Паказальнай у гэтым плане з'яўляецца экспрэсія дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, народных карагодаў і танцаў, песень і казачнага эпасу. Прыродная стрыманасць, разважлівасць, побытавая практычная накіраванасць дэкору паўтараліся ў карунках танцаў, якія сваімі ў-*Зор*амі-фігурамі нагадвалі кампазіцыі нябесных Плеяд-су*Зор*'яў. Рытмамеладычныя характарыстыкі народных танцаў, у сваю чаргу, арганічна стасаваліся да архітэктонікі твораў казачнага эпасу. Беларускі народны танец — гэта сюжэт увасоблены ў рухах казкі, а тая ж казка — не што іншае, як танец народнай фантазіі, карункі слоўнага мастацтва, аздобленыя пластыкай пазаслоўнай інфармацыі: мімікай, жэстамі, элементамі пантамімы.

Вось гэты адвечны рытм прыроднага і чалавечага суіснавання, духоўна-культурнага асваення рэчаіснасці ў слове, песні, танцы, дэкору літаральна на вачах аднаго пакалення мадэрнізуецца, паскарае амплітуду сваіх ваганняў і тым самым ставіць перад чалавекам найскладанейшую дылему далейшага яго прыроднага і сацыяльнага існавання.

Хуткасці касмічных спадарожнікаў, камп'ютэрныя тэхналогіі рашэння звышскладаных задач, відэагульні вымагаюць ад чалавека прынцыпова іншага фізічнага і псіхічнага рэага-

вання, імклівасці разумовага мыслення. Але наколькі згаданыя сацыякультурныя змены адпавядаюць адэкватным біяхімічным і фізічным рэакцыям нашага арганізма, наколькі наша прыродна-адаптаваная сфера псіхічных рэакцый, навыкаў і прыдбаных уменняў паспявае за стрэсаправакуючымі рытмамі хутка зменлівай сацыяльнай рэчаіснасці?

Адной з ключавых праблем сучаснай практычнай псіхалогіі з'яўляецца праблема адаптацыі нашага арганізма да рытмаў дзейнасці дзелавога чалавека, бізнесмена, рабочага і яго псіхафізічнай кампенсацыі не толькі на працягу сутак, тыдня, месяца, але і ўсяго года. Зараз псіхолагі ўсяго свету прапануюць шмат аўтагенных кампенсаторных практык, скіраваных на паскораную нейтралізацыю псіхафізіялагічных перагрузак. Пільная патрэба ў такіх самакампенсацыях наспела, таму што чалавечы арганізм адрэагаваў на перагрузкі натуральным чынам — адпаведнымі захворваннямі: інфарктамі, неўрозамі, інсультамі, суіцыдам. Пакуль што мы толькі фіксуем драматызм сацыяльнай неадпаведнасці і некамфортнасці, але нічога прынцыповага не змяняем у нашым жыцці. Структура працоўнага тыдня з двума выхаднымі па-ранейшаму скіравана на ўсебаковы інтэнсіўны адпачынак чалавека ад асноўнай працы, хаця для пераважнай большасці гарадскога насельніцтва гэтыя дні, напрыклад, у летні перыяд напоўнены цяжкай фізічнай працай на сваім дачным участку. Гадавы цыкл працоўнай дзейнасці кампенсуецца больш працяглым па часе адпачынкам, зноў-такі хутчэй намінальным, чым рэальным, таму што толькі мізэрная частка працуючага насельніцтва здольна аплаціць далёкую замежную паездку на знакамітыя міжнародныя курорты.

Аднак наш сучасны грамадзянскі каляндар пакуль што не адпавядае патрабаванням канкрэтнага чалавека або ўсяго соцыуму, скіраваным на вырашэнне актуальных праблем адаптацыі і кампенсацыі сіл арганізма ва ўмовах пастаяннага прэсінгу перш за ўсё такіх фактараў, як час і ўмовы. Наш сучасны каляндар не мае ніякай логікі ў сваёй пабудове, ён цалкам хаатычны і сітуатыўны. Зразумела, што ў ім зафіксаваны падзеі розных гістарычных эпох, розных сацыяльных узрушэнняў і плыняў, святы розных культурных традыцый. А ўвесь гэты гісторыка-культурны сімбіёз ускладнены яшчэ і канфесіяльным рознагалоссем: святы праваслаўнага кшталту адзначаюцца па старому стылю (юліянскае летазлічэнне), а каталіцкай парафіі — па новаму (грыгарыянскі каляндар).

Цяжка зразумець, што адбываецца ў нашым жыцці з 25 снежня (дзень святкавання Раства Хрыстова па каталіцкай традыцыі) і да 19 студзеня (праваслаўнае Вадохрышча). Гэта

суцэльная паласа навагодніх святкаванняў, якая ўвабрала ў сябе каталіцкае і праваслаўнае Раство Хрыстова, Новы год, Стары Новы год, калядныя вечары з іх шматлікімі абмежаваннямі і забаронамі на розныя віды працоўнай дзейнасці. Некалі дакладна вызначаныя і ўсталяваныя ў шырокім коле насельніцтва маральна-этычныя прадпісанні і ведыйска-хрысціянскія рэгламентацыі адносна ўжывання ежы адпавядалі тром існуючым традыцыям (каталіцкай, праваслаўнай і свецкай). Зараз жа яны ўтварылі спецыфічны духоўна-культурны, рэлігійна-канфесіяльны і свецка-палітызаваны кангламерат, які выклікае шматлікія непаразуменні ў нашых дзеяннях падчас выканання адпаведных святочных рытуалаў. Толькі адзін прыклад. Сакральна-магічная прыказка раіць і адначасова прадказвае: “Як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе”. Але ж нашаму сучасніку, які, уявім сабе, захоча падпарадкаваць свае дзеянні гэтаму сацыякультурнаму прадпісанню, неабходна будзе адразу ж вырашыць некалькі задач. Па-першае, *калі*, а па-другое, *як* сустракаць Новы год.

У больш простай і набліжанай да касмічнай суаднесенасці сітуацыі будуць прадстаўнікі каталіцкага веравызнання. Яны так, як і большасць жыхароў Еўропы, будуць сустракаць Новы год у ноч з 24 на 25 снежня (зімовы сонцаварот), якая з прыходам хрысціянства стала называцца Раством Хрыстовым.

Чалавеку свецкаму, далёкаму ад хрысціянскіх каштоўнасных арыенціраў, яшчэ прасцей: ён адкаркуе бутэльку шампанскага апоўначы 31 снежня, пасля таго як будзе закончана святочная прамова Прэзідэнта краіны. Але чаму менавіта ў гэту ноч прагучыць зварот кіраўніка краіны да свайго народа? Хутчэй за ўсё толькі таму, што раніцай будзе перагорнута апошняя старонка ў настольных календарах усіх столаначальнікаў. Гэты факт у жыцці дзяржаўных служачых не мае ніякага дачынення да прыродна-касмічных працэсаў (як, напрыклад, у мусульман ці будыстаў), з якімі звычайна суадносяцца паваротныя падзеі ў жыцці людзей.

І ўсё ж больш за ўсіх на Беларусі не пашанцавала праваслаўнаму люду. Сустракаць надыходзячы год разам з католікамі не выпадае — праз два тыдні будзе адзначацца Божае нараджэнне па праваслаўнай традыцыі. Можна было б аб’яднацца са свецкімі людзьмі і адзначаць Новы год у ноч з 31 снежня на 1 студзеня. Аднак гэты часовы саюз не стасуецца з узгаданай вышэй прыказкай, алгарытм якой мадэліруе-прадказвае будучыню: “Як сустрэнеш!..” — пераконвае і адначасова папярэджвае яна. У гэтым “як сустрэнеш” сфакусіравана ўсё: і характар паводзін, і шчырасць віншаванняў, і пярэстасць святочных прысмакаў на стале. Напрыклад, даўней на

стол абавязкова ставілі 12 страў, каб на працягу ўсяго года (12 месяцаў) любое застолле было такім жа шчодрым на разнасолы.

Але ж у гадавым колазвароце жыцця праваслаўнага чалавека Калядам і Раству Хрыстову папярэднічае шчасцітыднёвы Піліпаўскі пост, які закончыцца толькі 6 студзеня. Атрымліваецца, што наш грамадзянскі Новы год трапляе на заключную, самую строгую ў рытуальным плане частку посту, якая вымагае стрыманасці паводзін і строгіх абмежаванняў у ежы. З гэтага вынікае, што святочны стол, які будзе накрыты апоўначы 31 снежня,павінен быць посным. А як жа заключная частка прыказкі: “такім ён і будзе”? Значыць, увесь год будзе посным. Навошта ж так!

Зразумела, што праваслаўны люд знайшоў выйсце з гэтай складанай жыццёвай сітуацыі. Заканчэнне посту плаўна пераходзіла ў калядныя святкаванні, якія распачынала першая Куцця. Яна мела пераходны, прамежкавы характар, таму і называлася “поснай”. А вось ужо другая Куцця, святкаванне якой супадала са Старым Новым годам, атрымала назву Шчадрэц і праводзілася па ўсіх канонах славянскай гасціннасці і ветлівасці. Святочны стол літаральна поўніўся рознымі адмысловымі прысмакамі: бліны ячныя, жытнія, грэцкія падаваліся разам са смажанымі каўбасамі і салам. Тут жа мясціліся яечня, вараная свіная галава, сальцісон, грыбы кіслыя. І зразумела ж, святочная вячэра не абыходзілася без двух-трох ягадных кісялёў і булак з макам.

Такім чынам, навагодне-калядныя ўцехі “расцягнуліся” ў нас амаль што на тры тыдні. Магчыма, гэта і не блага для тых, хто займаецца цяжкай працай. Але ж свята павінна мець пэўны стрыжань, вакол якога разгортваецца ўся абрадавая дзея, скіраваная на тое, каб зблізіць і паяднасць тых, хто прымае ў ёй удзел. Часцей за ўсё кожнае свята мела ці то прыроднакасмічную, ці то грамадска-дзяржаўную арыентаванасць з дакладным разуменне сэнсу гэтай прымеркаванасці, а таксама месца і часу правядзення. Нашы ж навагоднія і калядныя святкаванні пакуль што не столькі яднаюць нас, колькі падзяляюць па розных статусна-культурных прынцыпах. Такім чынам, наспела патрэба ўсеагульнага абмеркавання пытання аб вызначэнні адзінай даты святкавання, якая магла б аб’яднаць за сталом людзей свецкіх і вернікаў розных рэлігійных плыняў.

Наступным перыядам празмернай святочнай насычанасці з’яўляецца час ад каталіцкага Вялікадня і да Радаўніцы, які, здараецца, бесперапынна пераходзіць у паласу першамайскіх фэстаў: свята Працы, Дзень Перамогі, ушанаванне св. Юр’я і г.д.

Такое становішча здзіўляе ўвесь дзелавы свет. А нас здзіўляе, што дзяржаўныя функцыянеры ўносяць прапановы аб увядзенні новых святаў, не думаючы аб агульнай логіцы і раўнамернай насычанасці або ўраўнаважанасці нашага календара на працягу ўсяго года. Пры гэтым не ўлічваецца гісторыя фарміравання традыцыйна існуючай сістэмы святкаванняў з яе ўнутранай логікай паслядоўнай змены аднаго свята іншым.

Адсутнасць сістэмаўтваральнага прынцыпу ў нашым грамадска-дзяржаўным цыкле святкаванняў стала асабліва відавочнай у апошнія гады, калі Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову аб пашырэнні кола святаў і ўключэнні ў спектр агульнадзяржаўных шэрагу святаў традыцыйнай і хрысціянскай накіраванасці, а таксама падзей перыяду незалежнага існавання Беларусі.

Разам з тым адвольны кангламерат элементаў розных гісторыка-культурных эпох можна было б паступова сістэматызаваць, упарадкаваць і максімальна наблізіць да стагоддзямі адпрацаванага ладу, надаючы пры гэтым кожнаму нашаму святу нейкае новае, сугучнае часу і ідэалам грамадства, адценне. Напрыклад, у 1996 годзе абмяркоўвалася пытанне аб ушанаванні жанчыны-маці, бабулі. Цудоўная ідэя, асабліва калі ўспрымаць яе ў кантэксце нашай гісторыі другой паловы 20 ст. Шукалі-шукалі, разважалі і... не зразумела чаму прымеркавалі гэтае свята да 10 кастрычніка. Сёння, калі ў наша жыццё ўсё шырэй уваходзяць народныя і хрысціянскія каштоўнасці, лагічна было б далучыць гэта свецкае ў аснове сваёй свята да святаў, звязаных з ушанаваннем нашай агульнай праматулі-Багародзіцы: напрыклад, да дня Раства Багародзіцы (21.09), якое супадае з доўгачаканай "залатой" парой пачатку восені — "бабіным летам". Але праз тры гады было знойдзена простае выйсце: дзень Маці далучыць да Пакроваў (14.10).

У тым жа 1996 годзе быў праведзены ўсенародны рэферэндум па абмеркаванню некалькіх лёсавызначальных пытанняў. У шэрагу іншых Прэзідэнт краіны ініцыіраваў пытанне аб святкаванні Дня Незалежнасці. Той дзень, калі Вярхоўны Савет 13-га склікання сапраўды абвясціў пачатак новага этапа ў гісторыі беларускага народа — 27 ліпеня — па нейкіх прычынах не задавальняў дзяржаўную ўладу. На абмеркаванне выносілася прапанова: Дзень Незалежнасці святкаваць у Дзень вызвалення горада Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — 3 ліпеня. Да гэтай жа даты далучалася і зусім новае па часе ўзнікнення свята — Дзень горада.

Рэферэндум засведчыў: большасць яго ўдзельнікаў падтрымала прапанову кіраўніка краіны, не вельмі задумваючы-

ся аб ідэі самога свята. За вынікам усенароднага абмеркавання хаваўся не ўласна духоўны феномен, а надзённая палітычная сітуацыя. Калі ж прынятае рашэнне прааналізаваць з пункту гледжання логікі гісторыі культуры і народных традыцый, то адразу бачны некаторыя алагізмы.

Напрыклад, не зусім дакладна дзень вызвалення аднаго горада (няхай сабе і сталіцы), умоўна кажучы рэгіянальны Дзень Перамогі, лічыць днём вызвалення ўсёй рэспублікі. Калі пачаткам вайны лічыцца дзень штурма першай крэпасці, першага населенага пункта, які стаяў на дзяржаўнай мяжы, то адпаведна і днём вызвалення павінен быць той дзень, у які быў вызвалены апошні населены пункт краіны. Ніхто ж, напрыклад, не лічыць дзень, у які прарвалі блакаду Ленінграда або Севастопаля, днём заканчэння вайны для Расіі.

Відаць, гэта непазбежны закон нашай псіхікі — кожнага паасобку і ўсіх у цэлым. Кожнаму пакаленню — свае выпрабаванні, якія пакінуць у агульнай калектыўнай памяці свае знакі прысутнасці. Адны помняць, як перад боем уступалі ў партыю, іншыя — як публічна на плошчы спальвалі свой партыйны білет (яго спаліць можна, а як быць з памяццю?). Адны помняць, як былі дэлегатамі партыйнага з'езда, а іншыя — як выганялі з хаты і адпраўлялі бязвінных людзей на Салаўкі ці ў Магадан. Помняць, як колькі гадоў таму выганялі за мяжу навуковую і творчую інтэлігенцыю. Тыя, хто выганяў, сёння гатовы першымі кінуцца ў абдымкі пры сустрэчы. Але ў памяці свае законы. Помняць тых, каго выганялі, а не тых, хто выганяў. І так будзе вечна.

У сувязі з гэтымі разважаннямі паўстае пытанне: ці трэба аднадзённым палітычным эмоцыям падпарадкоўваць гістарычна важныя падзеі і пазначаць іх знакамі Вечнасці? Дзень Перамогі будзе жыць вечна як знак паяднання народаў. Дзень вызвалення канкрэтнага горада — гэта свята толькі яго жыхароў. Ці лагічна прыцягваць да яго Дзень нацыянальнай незалежнасці?

Апошняе дзесяцігоддзе 20 ст. праходзіць пад знакам вяртання да вытокаў, да вечных каштоўнасцей агульначалавечай і этнічнай культуры. Дзяржава зрабіла першыя крокі да афіцыйнага прызнання духоўнай спадчыны народа, сканцэнтраванай і зафіксаванай у святочным колазвароце. Чырвоным колерам пазначаны ў календары дні святкавання Калядаў і Растава Хрыстова, Вялікадня і Радаўніцы. Чаму не зрабіць яшчэ адзін прынцыповы крок да вытокаў, да зблізкэння традыцый, да арганічнага суіснавання з Космасам Сусвету Космасу Душы?

Навошта нам два дні ўшанавання жанчыны? Навошта іх,

шаноўных і паважаных, дзяліць на дзве катэгорыі: *на проста жанчын*, якіх мы віншуем у Міжнародны (чаму міжнародны, калі нідзе ў свеце ўсур'ёз ён не адзначаецца?) жаночы дзень 8 сакавіка (у самую "галодную" часіну — для свецкіх жанчын, у час Вялікага посту — для праваслаўных прыгажунь, нарэшце ў той час, калі мужчыны не могуць адарыць іх прыгожымі кветкамі, узгадаванымі сваімі рукамі), і *жанчын-маці*, якіх ушаноўваем 14 кастрычніка. Там прырода яшчэ не ажыла. А тут ужо спачыла зімовым сном. А вось 21 верасня ўсё было б проста цудоўна. Паслухайце, як гучаць назвы гэтага дня ў культуры нашых продкаў:

Багач, Багатуха — свята заканчэння збору ўраджаю ў традыцыйнай культуры;

Раство Багародзіцы, Прачыстая — дзень нараджэння Дзевы Марыі, імя якой увабрала ў сябе і водгук аб першай жанчыне роду чалавечага: дз-*Ева*.

Як тут не прадоўжыць агульначалавечую традыцыю і не ўшанаваць нашых родных: матулю, бабулю, дачку, жонку, каханую.

Звернем увагу на касмічную прымеркаванасць гэтага свята — яно адзначаецца ў дзень восеньскага раўнадзенства, што сімвалізуе багацце і спакой, раўнавагу і апору, надзею і заміланасць.

Гэтаксама і цэнтральныя летнія святы — Дзень горада, Дзень Незалежнасці — магчыма, трэба было прымеркаваць яшчэ да адной касмічнай падзеі: дня летняга сонцавароту і адпаведна — Купалля, а таксама да дня нараджэння Івана Хрысціцеля.

Свята павінна мець не рэгіянальны, лакальны, прафесійны накірунак (Дзень настаўніка, шахцёра або медработніка і г.д.), агульнарадавы, агульнанародны, агульнанацыянальны характар, каб максімальна здымаць усе бар'еры размежаванняў (так было заўсёды: у культуры продкаў ніхто не адзначаў дзень нараджэння асобнага чалавека.., святкавалі дзень яго хрышчэння, у якім браў удзел увесь род, або дзень анёла-ахоўніка). Менавіта такую мэту ставяць перад сабой арганізатары шматдзённых карнавалаў у Бразіліі, розных святаў у гонар... любімых нацыянальных напояў, як, напрыклад, піва ў Германіі.

У нас да гэтага часу захавалася даволі моцная сувязь са святамі народнага і хрысціянскага календара. І трэба па магчымасці максімальна выкарыстоўваць іх духоўны патэнцыял у фарміраванні сучаснага гадавога кола агульнадзяржаўных і агульнанародных святкаванняў, дапасуючы да іх спрадвечнага сэнсу (гістарычнай памяці-повязі соцень папярэдніх пакаленняў) духоўныя імператывы нашых сучаснікаў, тым самым

паглыбляючы памяць кожнага новага пакалення і пашыраючы гарызонты іх будучыні.

Каб спалучэнне розных гісторыка-культурных плыняў у нашай свядомасці было як мага больш арганічным і зразумелым, нам неабходна прааналізаваць структуру беларускага народнага календара, спасцігнуць логіку яго пабудовы, асноўныя сістэмаўтваральныя прынцыпы, звярнуцца да рэканструкцыі галоўных рытуальна-абрадавых комплексаў з мэтай выпрацоўкі універсальнага алгарытму іх структуры. Адной з найцікавейшых задач даследавання календара з'яўляецца неабходнасць спасціжэння логікі паслядоўнасці абрадавых цыклаў у іх рэтраспектыўнай і перспектыўнай узаемазалежнасці (напрыклад, чаму за Калядамі ідзе Масленіца, а затым Вялікдзень, а не наадварот). А гэтую логіку можна зразумець толькі тады, калі будуць раскрыты асноўныя канструкцыйныя прынцыпы фарміравання рытуальна-абрадавых комплексаў і растлумачаны функцыі іх галоўных удзельнікаў у залежнасці ад сацыяльнага статусу, полу і ўзросту (мужчыны — жанчыны, хлопцы — дзяўчаты, замужнія — незамужнія, удовы, цяжарныя і г.д.). Ніжэй мы ўпершыню паспрабуем паказаць складаныя ўнутраныя ўзаемасувязі паміж двума глабальнымі цыкламі абрадавых структур нашай культуры: абрадамі гадавога колазвароту і абрадамі, якія суправаджаюць асноўныя этапы ў жыцці кожнага чалавека: радзіны — хрысціны — вяселле — пахаванне і памінкі.

Вывучаючы асобныя рытуальна-абрадавыя комплексы гадавога колазвароту, даследчыкі беларускага, рускага і ўкраінскага народнага календара і яго песнятворчасці часцей за ўсё прытрымліваліся прынцыпу храналагічнай паслядоўнасці. Традыцыя гэта была распачата ў другой палове 19 — на пачатку 20 ст. такімі навукоўцамі, як Е.В.Анічкаў[1], Д.Г.Булгакоўскі[2], Е.Р.Раманаў[3], П.А.Бяссонаў[4], П.В.Шэйн[5], Я.Ф.Карскі[6], а ў другой палове 20 ст. была падхоплена і прадоўжана У.І.Чычаравым[7], У.Я.Пропам[8], В.К.Сакаловай[9], Л.М.Вінаградавай[10], Г.А.Барташэвіч[11], А.С.Лісам[12], А.Ю.Лозкам[13], У.А.Васілевічам[14], калектывам укладальнікаў серыі "Беларуская народная творчасць", якая выходзіць у свет пачынаючы з 1971 года.

У такім падыходзе ёсць свая логіка, якая грунтуецца на прыроднай дэтэрмінаванасці цыкла сельскагаспадарчых работ і адпаведнай паэтычна-абрадавай асэнсаванасці яго. Такі падыход "скануе" сітуацыю, а сам даследчык у дадзеным выпадку дыстанцыраваны ад вывучаемай з'явы і толькі "счытвае" тое, што адбываецца, пасіўна фіксуючы надыход таго ці іншага свята.

Каб зразумець агульныя прынцыпы пабудовы календара,

неабходна разглядаць яго адначасова з дзвюх пазіцый. Пазіцыя вонкавай аддаленасці дазволіць зразумець непаўторнасць, спецыфічнасць кожнага рытуальна-абрадавага комплексу паасобку, а вось пазіцыя процілеглая, калі даследчык імкнецца аказацца як бы ўнутры гадавога кола, дазваляе ўбачыць моцныя сілавыя лініі або нясучыя канструкцыі гэтага мудрагелістага збудавання. Успрыняцце календара з дзвюх супрацьлеглых пазіцый дае магчымасць выйсці на ўзровень структурных і сістэмных абагульненняў, адкрыцця універсальных прынцыпаў, якія ўтрымліваюць народны каляндар як адзінае і непадзельнае цэлае.

Кропкай адліку для нас будуць Каляды, святкаванне якіх да прыходу на беларускія землі хрысціянства распачыналася ў момант зімовага сонцавароту — у ноч з 24 на 25 снежня (у адпаведнасці з юліянскай сістэмай летазлічэння). Аднак у Сярэднявеччы і ў Новы час недакладнасць разлікаў у юліянскім календары (год аказаўся на 44 хвіліны карацей сапраўднага сонечнага экватарыяльнага года) прывяла да таго, што дзень святкавання Калядаў пачаў год ад году апярэджваць вызначальную астранамічную падзею. У 1582 годзе Папа Рымскі Грыгорый XIII распачаў распрацоўку новай сістэмы летазлічэння, бо на той час розніца паміж днём святкавання Калядаў і колішняй дакладнай астранамічнай прывязкай складала ўжо 10 дзён. Пасля ўвядзення ва ўсёй Еўропе “новага стылю” святы хрысціянска-каталіцкага веравызнання пачалі адзначацца на 10 дзён раней за святы праваслаўнай пасхаліі. На сёння гэта дыстанцыраванасць павялічылася яшчэ на 3 дні і ўжо складае роўна 2 тыдні.

З цягам часу тэрміны правядзення хрысціянскіх святаў “пацягнулі” за сабой і святы народнага календара.

Сярод праваслаўных вернікаў Каляды пачалі адзначацца па старому (юліянскаму) стылю, а сярод католікаў — па новаму (грыгарыянскаму) стылю, але гэта не дае ніякіх падстаў сцвярджаць, што Каляды з гэтага часу сталі ўласна каталіцкімі або ўласна праваслаўнымі. З гэтымі недарэчнасцямі мы сутыкаемся на кожным кроку. Некалькі год таму ў “Настаўніцкай газеце” быў змешчаны артыкул пад назвай “Каталіцкія Каляды”. Сама назва, безумоўна, абсалютна непісьменная, гэта наватвор-кентаўр, у якога галава — язычніцкая, а ногі — хрысціянскія. Аналагічныя недакладнасці гучаць у нашым радыё- або тэлеэфіры. Напрыклад, у праграме “Радыёфакт” 25 снежня 1998 года я пачуў наступнае: “У Ватыкане пачалося святкаванне каталіцкіх Калядаў”. Ні ў якім разе! У Ватыкане — цытадэлі і калысцы каталіцкіх традыцый — магло распачацца святкаванне толькі Раства Хрыстова і больш нічога.




Мал. 1. Святы, прымеркаваныя да асноўных фазаў руху Сонца па небасхіле

У кантэксце гэтых прынцыпова важных гістарычных зменаў надзвычайную актуальнасць набывае праблема сінхранізацыі складанай, моцна разгалінаванай, шматпланавай сістэмы народнай астраноміі — каляндарных прыкмет, павер'яў, назіранняў, легенд, былічак — з адэкватнай, сапраўднай прыродна-касмічнай прымеркаванасцю. Напрыклад, збіранне безлічы лекавых траў днём 24 або 25 чэрвеня ўяўляецца абсалютна заканамернай з'явай. Гэта быў той момант, калі дзякуючы самаму працягламу дню раслінны свет максімальна поўніўся жыццядайнай энергіяй Сонца і сокамі Зямлі і здольны быў вылечыць самыя складаныя хваробы, загаіць самыя састарэлыя раны. Збіранне зёлак адвячоркам напярэдадні праваслаўнага свята ў гонар Івана Хрысціцеля (7.07) уяўляецца нам запозненым. Ужо цэлых два тыдні светлавы дзень памяншаецца, сонца даўно мінула свой апагей і павярнула да "сваёй смерці", зразумела, што і гаючыя здольнасці лекавых траў адпаведна пачалі рэзка памяншацца.

Такім чынам, у дзень заканчэння перыяду зімовага сонцастаяння распачалося двухтыднёвае святкаванне *Калядаў*. Калі мы ўявім сабе гадавы колазварот у форме круга, то акажацца, што на супрацьлеглым канцы дыяметра, праведзенага ад дня зімовага сонцастаяння, будзе знаходзіцца дзень летняга сонцавароту, на які прыходзілася яшчэ адно велічнае свята — *Купалле* (мал. 1). Цяпер па ўсёй Беларусі яно адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня.

Але зразумела, што і гэта свята ў старажытныя часы было прымеркавана да дня летняга сонцавароту, які адпавядаў ночы з 23 на 24 чэрвеня (дата, цалкам сіметрычная зімоваму сонцавароту, не атрымліваецца, бо даўжыня сонечнага года 365 дзён, а няцотны лік напапалам не дзеліцца, таму трэба адняць роўна адзін дзень).

Прыведзеныя вышэй разважанні даюць падставы зрабіць этапнае падсумаванне: мы пайшлі "следам за сонцам", вызначылі дзве важныя фазы ў яго руху па небасхіле і адзначылі, што менавіта да іх прымеркаваны два найвялікшыя святы нашага старажытнага календара: у адным выпадку дзень быў самым кароткім, а ноч самай доўгай; у другім — сітуацыя была адваротнай.

Але ж вядома, што паміж гэтымі дзвюма фазамі ёсць яшчэ дзве пераходныя фазы, якія называюцца веснавым і асеннім (мал. 1) раўнадзенствамі: дзень і ноч маюць аднолькавую часавую працягласць. Аказваецца, і гэтыя дні адзначаны ў народным календары спецыяльнымі святочнымі ўрачыстасцямі. З веснавым раўнадзенствам супадала святкаванне *Вялікадня* (з яго абходамі двароў валачобнікамі) і, магчыма, галоўнае свята ў гонар славянскага бога Сонца Ярылы. Параўнанне славянскага *Ярылы* з нямецкім *Jahr*, англійскім *year* (шэрагам іншых аднакарэнных беларускіх слоў: яркі, яравы, яры, ваяры, баяры, ярка) наводзіць на думку аб тым, што менавіта дзень веснавога раўнадзенства быў некалі старажытным пачаткам новага года ў нашых продкаў.

Дню асенняга раўнадзенства адпавядала свята ў гонар заканчэння збору ўраджаю *Багач*. У гэты дзень у многіх мясцінах Беларусі ладзілі кірмашы, выконвалі рытуал абносу свечкай усёй вёскі і "вечны агонь", які гарэў у двары з дня веснавога раўнадзенства, уносілі ў хату. Печ станавілася сімвалам-захавальнікам роду на працягу ўсяго зімовага перыяду.

Такім чынам, мы адзначылі ўжо *чатыры фазы ў руху Сонца* па небасхіле і *чатыры святы*, прымеркаваныя да гэтых астранамічных падзей. Аднак структура беларускага календара сведчыць аб тым, что ў ім ёсць яшчэ чатыры святы, якія адзначаліся ў роўных прамежках часу паміж чатырма фазамі Сонца. Па сутнасці яны фіксавалі маргінальныя прыродныя сітуацыі — пераход адной пары года ў іншую. Заканчэнне зімы і надыход вясны былі пазначаны *Масленіцай* (у іншых рэгіёнах Беларусі гэта магло быць Стрэчанне, гуканне вясны, Сарақі, Звеставанне, або Благавешчанне), напрыканцы вясны і на пачатку лета святкавалася *Сёмуха* (зялёныя святкі, ваджэнне куста, ваджэнне стралы). *Жніво* з яго моцна акцэнтаваным у рытуальным плане пачаткам (зажынкі) і заканчэннем (дажынкі) фіксавала сітуацыю пераходу лета ў восень. Нарэшце, на стыку восені і зімы заўсёды адзначаліся *Восеньскія Дзяды*. Пры гэтым неабходна ўзгадаць яшчэ адну асаблівасць нашага календара: калі святы першага цыкла (звязаныя з паўтараемымі касмічнымі падзеямі) мелі дакладна вызначаныя даты,




Мал. 2. Пераходныя святы, якія адзначаюцца ў роўных прамежках паміж фазамі Сонца або на пераходзе з адной пары года ў іншую

то святы-маргіналы былі рухомымі, гэтаксама як і мяжа паміж порамі года (мал. 2).

Графічная выява структуры беларускага народнага календара з яго васьмю асноўнымі святамі адразу ж высвечвае супадзенне з добра знаёмым фрагментам узораў на нашых саматканых ручніках, пасцілках, арнаменце, вышытым на народным адзенні (мал. 3).

На мяжы І і ІІ тысячагоддзяў н.э. на ўсходнеславянскіх землях паступова пачынаецца распаўсюджванне хрысціянства — новай веры, новай рэлігіі, якое прынесла з сабой новыя маральна-этычныя і культурныя каштоўнасці. Для ментальнасці славяніна, якая моцна трымалася на непарушнасці адвечна заведзенай, прашчурамі прынятай, а продкамі замацаванай і ашчадна захаванай *традыцыі*, паверыць нечаму новаму і прыняць яго, пры гэтым беспадстаўна і жорстка руйнаваць тое, што ячшэ ўчора саграваwala душу, абнадзейвала розум і мацавала характар, здавалася з'явай звышнатуральнай і бесперспектыўнай. Мы не будзем кранаць пытанне асаблівасцей распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі — гэта тэма асобнага даследавання. У дадзеным выпадку адзначым толькі некаторыя акалічнасці. На жаль, сталася так, што ідэя, якую несла з сабой новая рэлігія — ідэя ўзвышэння над этнічнымі традыцыямі і паяднання людзей розных вер і этнасаў у адзінае і непарушнае цэлае — на самой справе не толькі не аб'яднала, але, наадварот, размежавала ўсходнеславянскія плямёны, а затым і ўтвораную беларускую народнасць па канфесійнай прыналежнасці: на праваслаўных і католікаў.

Добра вядома гістарычная спроба валявым рашэннем аб'яднаць дзве канфесіі на парытэтных пачатках, утварыць унікальны саюз паміж рымскай і візантыйскай традыцыямі ды пры гэтым умудрыцца яшчэ і арганічна прыстасаваць да яго этнакультурную спадчыну. Асобныя беларускія гісторыкі і этнакультуролагі схільны лічыць уніяцтва ўласна беларускім




Мал. 3. Васьміканцовая зорка як сімвал беларускага народнага календара

феноменам, які адзіны быў здольны адначасова захоўваць архаіку і пашыраць новае. Але вядома, што уніяцтва праіснавала амаль што тры стагоддзі, а затым зноў-такі валявым рашэннем расійскіх уладаў было забаронена.

Экспедыцыйныя запісы валачобных песень, якія з'яўляюцца своеасаблівай энцыклапедыяй паэтычных мініяцюр, паказваюць, што ў народнай свядомасці і паэзіі ў пэўнай ступені набліжанымі аказаліся і праваслаўная, і каталіцкая, і уніяцкая традыцыі.

Зноў звернемся да схемы этнічнага календара. На прыкладзе зліцця народнай і праваслаўнай традыцый прасочым шлях гэтага гістарычнага дыялогу, вызначым яго характар і асаблівасці.

На момант распаўсюджвання хрысціянства на ўсходнеславянскіх тэрыторыях яно налічвала ўжо тысячагадовую гісторыю. Безумоўна, за такі працяглы адрэзак часу хрысціянская традыцыя сфарміравалася ў даволі складаны духоўна-культурны арганізм, які меў сваю ідэалогію, свае культавыя прыярытэты, атрыбутыку, сістэму выпрацаваных рытуалаў. Адным з моцных сістэмафарміруючых пачаткаў быў хрысціянскі каляндар, у аснове якога ляжала праваслаўная Пасхалія — сістэма святаў і прысвяткаў, якія ўтваралі гадавы кругаварот са сваёй шкалой прыярытэтаў. Праваслаўная Пасхалія — з'ява ўнікальная, дакладна і лагічна структурыраваная, яна аб'яднала ў сабе два цыклы святкаванняў. З аднаго боку, гадавое кола Пасхаліі з'яўляецца мікрамадэллю жыццяпісу Ісуса Хрыста, а з другога — яно ўвабрала ў сябе найважнейшыя падзеі з жыцця Багародзіцы.

Якім жа чынам каляндар новай веры ўводзіўся ў асяроддзе ўсходнеславянскіх плямёнаў? Зразумела, што гэта быў вельмі складаны духоўны, светапоглядны, сацыякультурны, прававы і палітычны працэс, вынікам якога стала спецыфічнае спалучэнне дзвюх культур, якое атрымала назву "двухвер'е", а апошнім часам больш актыўна навукоўцы карыстаюцца тэрмінам "народнае праваслаўе". Калі паглядзець на вынікі дыялогу дзвюх прынцыпова рознахарактарных культур з пазіцый сённяшняга становішча, то неабходна будзе канстатаваць, што і тут спрацаваў феномен беларускай ментальнасці: народ не адцураўся сваёй, спрадвечнай духоўнай спадчыны, але адначасова давер'ыўся і прыняў чужое, сілай навязанае.

Думаецца, галоўнай асаблівасцю сімбіёзу дзвюх традыцый было тое, што фундаментам і нясучым стрыжнем засталося старое, а новае было пераасэнсавана і адаптавана праз прызму гэтага ж старога. Але агульны прынцып рэалізаваўся ў

некалькіх інтэграцыйна-асацыятыўных накірунках. Па-першае, уласна храмавая форма і характар правядзення хрысціянскіх святаў і рытуалаў вытрымліваўся ў адпаведнасці са старавізантыйскімі канонамі. Хрэсьбіны, вянчанне і адпяванне праводзіліся так, як таго патрабавала еўхарыстыя. Але, па-другое, гэтыя духоўныя акты далучэння людзей да хрысціянства, да царквы былі і засталіся не самадастатковымі рытуаламі, фіксуючымі змены сацыяльнага статусу чалавека, а толькі невялікай складанай часткай значна больш разгорнутых традыцыйных рытуальна-абрадавых комплексаў, якія суправаджалі нараджэнне, вяселле і смерць чалавека. Напрыклад, вянчанне і адпяванне, працягласць якіх складала прыкладна гадзіну-дзве і адбывалася ў прысутнасці абмежаванай колькасці ўдзельнікаў, сталі невялікім (хаця і важным) звяном у працяглай, трохдзённай, абрадавай дзеі, у якой прымалі ўдзел прадстаўнікі аднаго або двух вялікіх родаў.

Аналагічныя працэсы адбываліся ў каляндарнай абраднасці і ў вусна-паэтычнай творчасці, якая яе суправаджала. Пантэон хрысціянскіх святых пастунова выцясняў пантэон язычніцкіх багоў, але пры гэтым адзін са святых амаль цалкам "браў" на сябе абрадавыя функцыі свайго папярэдніка, напрыклад, св. *Улас* часткова выконваў функцыі *Вялеса*, прарок *Ілля* пачаў спалучаць паўнамоцтвы *Перуна*, св. *Юрай* цалкам замяніў *Ярылу*.

З цягам часу сталася так, што *народны каляндар* у значнай ступені асіміляваў хрысціянскую традыцыю і прыцягнуў да важнейшых сваіх урачыстасцей галоўныя святы хрысціянскай накіраванасці. Так, адначасова з *Калядамі* пачалі адзначаць *Раства Хрыстова*, з *Вялікаднем — Пасху*, з *Сёмухай — Тройцу*, следам за *Купаллем* пачаў святкавацца *Ян*, або *Іван Купала*; *збору жыта* (а жніво мела ў сваёй структуры тры этапы: зажынкі — само жніво — дажынкі) пачаў адпавядаць *Спас*, які таксама мае тую ж трохчасткавую структуру: *Першы Спас* (14.08) называецца *Макавеем, Другі Спас* (19.08) — найбольш вядомы і пашыраны сярод беларусаў і называецца *Яблычным, Трэці Спас* (29.08) прыкрыты больш значным святам — *Успеннем Багародзіцы* (28.08), таму "рассыпаўся" на тэрыторыі Беларусі рознымі лакальнымі назвамі. У адной мясцовасці яго называюць *Арэхавым*, у іншай — *Мядовым*, але дамінантнай, найбольш пашыранай з'яўляецца назва *Хлебны*, бо ён супадаў з трэцім, заключным этапам збору жыта — хлеба. Адначасова са святам заканчэння збору ўраджаю *Багачом* пачалі адзначаць *Раства Багародзіцы. Восеньскія Дзяды*, якія адзначаюцца напярэдадні ўшанавання памяці Дзмітрыя




Мал. 4. Прынцыповая схема гістарычных напластаванняў хрысціянскага календара на старажытнабеларускі (ведыйскі)



Зажынкі.

Салунскага (8.11), пачалі называцца Дзмітраўскімі, або *Змітраўскімі, Дзядамі* (мал. 4).

Зразумела, што ўзгаданыя супадзенні зусім не выпадковыя. Яны адзначаны ў культурах розных народаў свету і грунтуюцца на універсальных законах мыслення, светаўспрымання, светапогляду, таму і народныя календары нават аддаленых этнасаў таксама маюць тыпалагічныя падабенствы. Іншая рэч: кропкі адліку ў розных календарах могуць прыпадаць на розныя перыяды года. Напрыклад, пачатак новага года ў славян некалі адпавядаў дню веснавога раўнадзенства, а ў старажытных іудзеяў ён адзначаўся ў верасні. Пры перанясенні хрысціянскага календара на землі славян таксама спатрэбілася падкарэкціраваць час правядзення святаў так, каб іх ідэйна-сэнсавае напаўненне хоць аддалена, але адпавядала (супадала, нагадвала, дапаўняла, цалкам паўтарала) зместу традыцыйна існуючай сістэмы святкаванняў.

Для таго каб праілюстраваць шлях сумяшчэння дзвюх традыцый — народнай і хрысціянскай, зноў-такі звернемся да *чатырох* найбольш *важных пазіцый* у структуры календара.

# СЭНСАВА-СЕМАНТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ СІНХРАНІЗАЦЫІ АБРАДАВЫХ КОМПЛЕКСАЎ У НАРОДНА-ВЕДЫЙСКІМ І ХРЫСЦІЯНСКІМ КАЛЕНДАРАХ

Агульнай пасылкай у дадзеным выпадку для нас будзе наступны тэзіс: у сучасным беларускім народным календары адлюстраваны *дзве* рознастадыяльныя рэлігійна-культурныя *плыні*:

а) народны (язычніцкі, паганскі, *ведыйскі*) каляндар, у аснове якога ляжыць культ Сонца (Ярылы);

б) хрысціянскі каляндар, у аснове якога ляжыць культ (або ўшанаванне) Сына Божага Ісуса Хрыста, а таксама Багародзіцы, Дзевы Марыі.

Звернемся да кожнай з вызначаных чатырох пазіцый і паспрабуем зразумець прынцып суаднесенасці, збліжэння або сінхранізацыі святаў народнага і хрысціянскага календароў.

1. *Зімовае сонцастаянне*:

а) у ноч з 24 на 25 снежня ў прыродзе адбываецца прынцыпова важная падзея: *Сонца* паварочвае на новы гадавы цыкл, у міфалагічным плане *яно* вырвалася з царства Танатаса і зноўку *нарадзілася*, каб абудзіць і ажывіць прыроду і душу чалавека;

б) ні адно з Евангелляў не дае дакладных звестак аб часе нараджэння Хрыста, але дзень нараджэння Сына Божага ўвесь хрысціянскі свет адзначае. Прычым выбраны ён невыпадкова, бо цалкам супадае з днём нараджэння прыроднага свяціла — 25 снежня.

2. *Веснавое раўнадзенства*:

а) 21 сакавіка ў прыродзе дасягнута раўнавага паміж сіламі Дабра і Зла; з гэтага моманту ў гадавым колазвароце пачнецца той час, калі светлыя сілы будуць дамінiраваць аж да дня восеньскага раўнадзенства. У міфалагічным плане гэты час асэнсоўваецца як *момант канчатковай перамогі Дня над Ноччу*: дні станавіліся даўжэйшымі або большымі за ноч, г. зн. вялікімі, адсюль, відаць, паходзіць і назва свята — Вялікдзень (Вялікі дзень);

б) з гісторыі станаўлення хрысціянства вядома, што ў дзень веснавога раўнадзенства (14-ы дзень месяца нісан) Хрыстос разам са сваімі вучнямі прысутнічаў на апошняй Тайнай Вячэры, на якой адзначалася іудзейская Пасха. Затым у сераду Іуда Іскарыёт выдаў свайго Настаўніка, а ў пятніцу Хрыста ўкрыжавалі. Праз тры дні — у нядзелю — цела Сына Божага не знайшлі ў грабніцы, ён уваскрэс.

У народнай свядомасці гэты факт хрысціянскай гісторыі быў асэнсаваны ў рэчышчы старажытнай міфалагічнай традыцыі як *дзень канчатковай перамогі Жыцця над Смерцю*.

3. *Летняе сонцастаянне*:

а) у манаграфіі А.С.Ліса “Купальскія песні”[15] прыводзіцца некалькі версій паходжання назвы свята Купалле. Працягваючы логіку нашых паралеляў, прапануем наступны ланцужок разважанняў. У асяроддзі славян шырока бытуе павер’е аб тым, што Сонца купальскім ранкам выплывае з-за гарызонта “*іграючы*”. Яно быццам рассыпаецца на часткі і, як сведчаць народныя легенды[16], спачатку крыху ўздымаецца над зямлёй, затым апускаецца ўніз, і так колькі разоў. Калі ж назіраць за гэтым аптычным эфектам над вадой (часцей за ўсё рытуальнае месца, на якім нашы продкі адзначалі гэта свята, знаходзілася на ўзбярэжжы ракі або возера), то будзе ствараецца ўражанне, што Сонца, якое “*іграе*”, “*купаецца*” ў вадзе. Дзень, калі “Сонца купаецца”, і атрымаў у народзе назву Купалле;

б) словы з народнай купальскай песні “Сягоння Купала, а заўтра Ян”[17] дакладна расстаўляюць усё па сваіх месцах. Услед за гуллівай купальскай ноччу хрысціяне адзначалі ў гэты ж час яшчэ адно вялікае свята — дзень нараджэння Івана Хрысціцеля, які некалі пахрысціў Сына Божага[18]. Але ж вядома, што асноўнай складанай часткай абраду далучэння чалавека да храма, да хрысціянскай традыцыі з’яўляецца ачышчэнне (абмыванне, купанне) вадой у асвечанай крыніцы ці рэчцы. Так хрысцілі Ісуса Хрыста, так хрысцілі ў Дняпры кіеўлян[19], амаль што так — акрапляючы свянцонай вадой — прымаюць у лона храма сённяшніх нованароджаных.

У народнай вусна-паэтычнай традыцыі гэта важная падзея ў жыцці Ісуса Хрыста атрымала наступнае асэнсаванне: Іван Хрысціцель *пахрысціў, пакупаў* Сына Божага, таму і сталі яго зваць *Іван Купала*. Так што ўсім тым, хто толькі распачынае вывучэнне народных традыцый, трэба памятаць: Купалле (старажытнае дахрысціянскае) і Ян, або Іван Купала (уласна храмавае), — гэта зусім розныя святы.

4. *Восеньскае раўнадзенства*:

а) далёка за плячамі засталіся веснавыя клопаты аб тым, каб хутчэй узараць і пасеяць; летнія турботы аб тым, каб своечасова прайшоў дождж і ўзмацніў сокі зямлі новай жыццядайнай сілай; ужо перастала балець спіна пасля жніва, пасеяны азімыя, выбрана бульба, карацей — усё сабрана і прыбрана, упарадкавана і дагледжана. Таму зусім заканамернай бачыцца назва свята, якое было прымеркавана да часу восеньскага раўнадзенства — *Багач*.

У гадавым колазвароце гэта была важная мяжа, якая фіксавала заканчэнне земляробчых работ. Праз некалькі дзён, на Узвіжанне (27.09), увесь хтанічны свет (гадзюкі, вужакі, змеі) збярэцца ў купы і адправіцца ў вырай, на "той" свет (пад пні і трухлявыя калоды), каб заснуць глыбокім сном аж да першага веснавога грому, які абвесціць аб пачатку новага жыццёвага цыкла:

"...На звіжанне гадзюкі збіраюцца ў адно месца, каб паўзці на зіму ў вырай. Гадзюкі, як і птахі, маюць свой асабісты вырай. Яны ў яго паўзуць пад камандаю свайго цара, каторы паўзе папераду ключа. От трэба на звіжанне чуць свет пайсці ў лес, дзе каля палянaчкі е шмат лому да й цікаваць. Як толькі ўзыдзе сонейка да добра прыгрэе, дак усялякія гадзюкі пачнуць вылазіць з лому да з нор і паўзці на сонейка грэцца. Перш гадзюкі поўзаюць туды-сюды ўмітуські, а потым, як пакажацца сам цар, дык яны пачнуць яго абвіваць, як пчолы сваю матку. От тады трэ па том клубку ўдарыць паплiскаю толькі адзін раз, не больш, дак цар гадзюк і скіне свае ражкі. Тагды хутчэй іх узяць і ўцякаць, не аглядаючыся, а то гады загрызуць яго"[20].

Канчатковае засынанне зямлі адбудзецца на Пакровы (14.10). З гэтага часу і да Радаўніцы чапаць яе (капаць, сеяць, садзіць што-небудзь) не дазвалялася, а таксама нельга было ладзіць на ёй і гучныя гулянні, якімі поўнілася веснавая і летняя пара. Таму пасля Багача пачынаўся час зусім іншых гулянняў, якія спраўляліся ў хаце: беларусы ладзілі *вяселлі*.

На перыяд доўгага зімовага спачыну зямлі святочныя гулянні пераносіліся ў абмежаваную (замкнёную) прастору хаты. Гэтыя важныя змены ў характары працоўнай, жыццёвай і культурнай дзейнасці чалавека былі пазначаны спецыяльным святам. Амаль паўсюдна на Багача спраўлялі абрад, сутнасць якога заключалася ў наступным: кожную хату паасобку і ўсю вёску ў цэлым абносілі спецыяльнай свечкай, якая мацавалася ў лубцы, напоўненай зернем жыта новага ўраджаю. На перыяд дамініравання багіні Мараны вёску "замыкалі" сімвалічным колам, якое павінна было засцерагчы ад уплыву нядобрых сіл[21].

Замыканне свяшчэннага кола ў пэўных абставінах — з'ява на Беларусі пашыраная і агульнавядомая. Рытуальны круг вакол вёскі прачэрчвалі плугам распранутыя да споднягa жанчыны-ўдовы, калі трэба было ратавацца ад летняй засухі або абвальнай эпідэміі[22]. Жанчына ў споднім і з іконай у руках тройчы абыходзіла хату або іншыя забудовы, якія ахапіў пажар[23];

б) аднaчасова са старажытным святам *Багач* (Багатуха, Багатнік) праваслаўныя беларусы адзначаюць царкоўнае свя-

та *Раство Багародзіцы* (або Другую Прачыстую). У дадзеным выпадку беларускамоўная прыстаўка *пра-* з'яўляецца калькай рускамоўнага прэфіксу *пре-*, які звычайна ўказвае на самую высокую ступень апісваемай якасці ці ўласцівасці: словазлучэнне Прачыстая Дзева Марыя сведчыла аб тым, што гэта жанчына была і пасля нараджэння сына засталася бязгрэшнай. У народнай свядомасці свята Раство Багародзіцы цесна злілося з Багачом на падставе блізкасці тлумачэння рознахарактарных з'яў. У адным выпадку *Багач* сведчыў аб заможным становішчы гаспадаркі (сямейна-радавы кантэкст); у другім — ушаноўвалася жанчына, якая нарадзіла (а*Бага*ціла свет людзей) незвычайнага *Бога*-чалавека.

Але найбольш моцны ўплыў хрысціянская традыцыя аказала на веснавы цыкл народнага календара. Прычынай значных зменаў сталі заканамернасці праваслаўна-візантыйскай Пасхаліі, у якой час правядзення святаў быў у значнай ступені падпарадкаваны іншаму нябеснаму свяцілу — Месяцу, які таксама меў тыя ж чатыры фазы ў сваім руху па небасхіле, але рытм іх чаргавання быў значна хутчэйшым, чым у Сонца: кожная фаза доўжылася 7 дзён. Дарэчы, у апошні час з'яўляецца ўсё больш пераканаўчых доказаў, што ў структуры старажытнаславянскага календара было не 12, а 9 месяцаў (перыяд фарміравання эмбрыёна чалавека), з якіх кожны няцотны доўжыўся 41 дзень, а кожны цотны — 40. Сума іх якраз і адпавядала сонечнаму году (4 мес х 40 дзён = 160 дзён) + (5 мес х 41 дзень = 201 дзён) = 365 дзён[24].

Актыўны ўплыў Месяца на структуру календара быў прадвызначаны пастановай Усяленскага Нікейскага сабора (325 г. н. э.), дзе быў выпрацаваны алгарытм, у адпаведнасці з якім павінна вызначацца дата святкавання Пасхі: *першая нядзеля* (выхадны, вольны ад працы дзень) *пасля першай поўні* (фаза найвышэйшага росквіту Месяца), якая надыходзіць *пасля дня веснавога раўнадзенства*. Усе астатнія веснавыя святы хрысціянскага календара спалучаліся з Пасхай і дыстанцыраваліся ад яго адным і тым жа часавым інтэрвалам.

У цэлым гэты алгарытм быў перанесены на славянскую этнакультурную традыцыю, на якую аказаў даволі моцнае ўздзеянне, парушыўшы яе адвечны прыродна-касмічны рытм. Устойлівыя, прымеркаваныя да канкрэтных славянскіх прыродна-ландшафтных, эканамічных і сацыякультурных асаблівасцей, святы веснавога цыкла сталі рухомымі, прычым амплітуда іх ваганняў аказалася празмерна вялікай — прыблізна месяц. Усе асноўныя святы прывязваліся да Пасхі, але ў сувязі з тым, што гадавы цыкл Сонца (365 дзён) зусім не супадаў з рытмам Месяца (28 дзён), межы яе святкавання пашырыліся




Мал. 5. Схема веснавога цыкла рухомых святаў, звязаных з праваслаўнай Пасхаліяй (сонечна-месяцовае спалучэнне)




Мал. 6. Благавешчанне — нерухомае свята, яно звязана з Раством Хрыстовым

ад 4 красавіка да 6 мая. Адпаведнае здарылася і з астатнімі святамі. *Масленіца павінна была скончыцца за 7 тыдняў да Вялікадня* (таму яна пачала адзначацца ў шырокім дыяпазоне: другая палова лютага і першая палова сакавіка), а *праз 7 тыдняў пасля яго пачыналася Тройца* (якая зноў-такі траплялa на другую палову мая бо першую палову чэрвеня). Затым *за 7 дзён да Пасхі заўсёды адзначалася Вербніца, а на 9-ы дзень* (тут усё ж спрацаваў вельмі моцны алгарытм славянскай этнакультурнай традыцыі, які абапіраўся на добра вядомы рытм 3—9—40) *пасля яе пачалі адзначаць Радаўніцу* (тут парушэнне традыцыі дапушчана, таму што адзіным днём ушанавання продкаў была "радзіцельская" субота. У асобных мясцінах памінанне душ продкаў адбываецца ў чацвер (Наўскі Вялікдзень, Вялікдзень мёртвых), на 3-і дзень пасля Вялікадня (мал. 5).

Адзіным выключэннем у гэтым цыкле святкаванняў стала Благавешчанне (дзень абвесткі аб бязгрэшным зачацці Дзевы Марыі). Яно заўсёды трымаецца адной і той жа даты — 7 красавіка, таму што самым цесным чынам звязана з 7 студзеня — днём Раства Хрыстова, паміж якімі захоўваецца адрэзак часу роўны 9 месяцам (мал. 6).

## КУЛЬТ ПРОДКАЎ ЯК СТРУКТУРАЎТВАРАЛЬНЫ ПРЫНЦЫП НАРОДНАГА КАЛЕНДАРА

Яшчэ раз засяродзім увагу на святочным колазвароце беларусаў. Нельга не адзначыць адну вельмі выразную яго своеасаблівасць. Пераважная большасць святаў у сваёй лагічнай паслядоўнасці з'арыентавана на дыялог чалавека з Прыродай, з Космасам, асноўны сэнс якога — заручыцца падтрымкай сілаў прыроды, каб яны актыўна і эфектыўна паспрыялі вялікаму,



Восеньскія Дзяды. Супрацоўнікі Беларускай акадэміі мастацтваў на магіле этнографа Міхася Раманюка.

складанаму і працягламу па часе цыклу сельскагаспадарчых (у аснове сваёй землярбочых) работ.

Аднак нельга не заўважыць, што ў гэты *адладжаны рытм*



Святкаванне Радаўніцы ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці.

*земляробчых святаў уключаны два*, характар і сэнсавае напаўненне якіх прынцыпова адрозніваецца ад усіх астатніх. Гэта святы, *звязаныя з ушанаваннем продкаў*: *веснавая Радаўніца* і *Восеньскія Дзяды*. Калі быць больш дакладнымі, то неабходна адзначыць, што дзён ушанавання памёршых было значна больш. Сярод іх субота перад Масленіцай, першая, другая і трэцяя суботы Вялікага посту, субота перад Тройцай. Але, мяркуем, не будзе вялікай памылкі, калі адзначым, што *найбольш вядомымі* і пашыранымі сярод беларусаў *былі менавіта Дзяды і Радаўніца* (хаця яна магла адзначацца ў розны час: у першы або другі дзень Вялікадня, у чацвер як Вялікдзень мёртвых). У межах аднаго і таго ж раёна, напрыклад Чэрвеньскага, побач знаходзяцца вёскі, у якіх веснавое ўшанаванне продкаў адбываецца і на Радаўніцу, і ў суботу перад Тройцай.

Калі мы лініяй злучым на схеме веснавы і восеньскі дні ўшанавання, то адразу ж стане выразна бачна, што гэтыя святы як бы акрэслівалі паўсферу, якая ахоплівала час правядзення асноўных земляробчых работ. Дні ўшанавання продкаў фіксавалі мяжу пачатку і заканчэння найважнейшага цыкла аграрна-каляндарных святкаванняў. Калі ж улічыць, што пачатак Новага года ў беларусаў супадаў з днём веснавога раўнадзенства, атрымліваецца, што першым святам новага жыццёвага цыкла станавілася Радаўніца. Чым гэта абгрунтавана і як гэта можна патлумачыць (мал. 7)?

Каб знайсці адказ на гэтыя пытанні, неабходна звярнуцца да структуры асноўных святочна-абрадавых комплексаў народнага календара і паспрабаваць знайсці тое, што ўсіх іх аб’ядноўвае.

## АСНОЎНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ ФАРМІРАВАННЯ РЫТУАЛЬНА-АБРАДАВЫХ КОМПЛЕКСАЎ БЕЛАРУСАЎ

Якія б са святаў народнага календара мы ні ўзялі, у іх структуры абавязковай дамінантай будуць рытуальныя дзеянні, абрадавыя песні або танцы, атрыбуты і сімвалы, варожбы, прыкметы, магічныя дзеянні, скіраваныя на рэалізацыю *ідэі паляпшэння дабрабыту*.

Напрыклад, у структуры Калядаў вядома некалькі складаных кампанентаў, у якіх выразна прасочвалася галоўная ідэя. Сярод іх рытуальны дыялог паміж бацькам і маці:

— Не бачыш ты мяне? — пыталася маці.

— Не, ня бачу! — адказваў бацька.




Мал. 7. Святы ўшанавання продкаў — Радаўніца і Восеньскія (Дзмітраўскія) Дзяды — распачынаюць і закругляюць цыкл земляробчых работ

3. Зак. 25

Жонка тут жа прамаўляла заключную сакральна-магічную формулу, сэнс якой быў празрыстым і зразумелым у кантэксце навагодніх святкаванняў:

— Каб жа ты не бачыў за стагамі, за капамі, за вазамі, за снапамі свету!

Затым дыялог паўтараўся ў адваротным накірунку. Цяпер ужо бацька ў заключай формуле-замове мадэліраваў ідэальную карціну дабрабыту, звязаную з жаночай сферай дзеяння ў гаспадарцы:

— Каб жа ты не бачыла за агуркамі, за гарбузамі, за капустай, за буракамі свету![25]

Па стану надвор'я, па колькасці зорак на небе прадказвалі, які будзе ўраджай, як будуць раіцца пчолы, ранняй ці позняй будзе вясна.

Аналагічныя абрадавыя складальныя былі ў структуры Масленіцы, гукання вясны, Саракоў, Благавешчання, Юр'я, Тройцы. Але найбольш высокай ступені паэтызацыі і стварэння ідэалізаванай карціны сямейнага дабрабыту дасягнулі калядныя і велікодныя песні. У каляднай абрадавай паэзіі падаецца ідэалізаванае ўяўленне беларуса аб заможнасці, шчаслівай сялянскай долі:

Прачыстая ідзе, тры радасці нясе:
Першая радасць — у тваім доме,
Другая радасць — у тваёй аборы,
Трэцяя радасць — у чыстым полі.
У тваім доме — дробныя дзеткі,
У тваёй аборы — валы, каровы,
У чыстым полі — буйна жыта.
Буйна жыта каласіста, ядраніста.
Кладзіце копачкі, як у небе зорачкі,
Кладзіце стажкі на чатыры ражкі.[26]

Выключнай з'явай беларускай песнятворчасці з'яўляюцца валачобныя песні, у якіх паказаны цяжкі і працяглы па часе шлях паэтапнай рэалізацыі задуманай ідэі. *Валачобныя песні* — гэта своеасаблівы берасцяны скрутак, у якім паслядоўна паўстаюць святы і тыя святыя, якія адказваюць за чарговы этап у цыкле земляробчых спраў[27]:

Збіраліся, рахаваліся,
Катораму святцу ўперад стаці.
А Збор мовіць гаспадару:
— Слаўны мужу над мужамі!
Твае дзела — на торг ехаць,
Зялеза купляць, нарогі каваць.
Аўдакею дровы сячэць,
А Саракі клады кладзіць,
Аляксею — сані на плот,

Сані на плот, рыба аб лёд,
Лёд вадою, рыба лускою.
Благавешчанне — араты на ніву,
Араты на ніву, сядун на прызбу.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Вазьмі ж, ваша, нову сошку
Да й коніка варанога,
Варанога, маладога,
Едзь жа, ваша, у чыста поле,
У чыста поле заарываць
З соллю, з хлебам, з белым яйцом,
З белым яйцом, з боскім слаўцом.
Вярба свята — нова лета,
Вярба пасвіць у поле гнала.
Дай жа, Божа, гэта святца праважаці,
Свята Вялічка дажываці!
Да й у радасці, весялосці
Тры дні святца чырвоным яечкам,
Чырвоным яечкам разгаўляецца,
Малым дзеткам на вуліцу,
На вуліцу, на прагулянне.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Маеш сабе чаляданьку.
Загадай, ваша, свайму чалядку:
Няхай возьмецць златы ключы,
Златы ключы ад стаенькі,
Няхай ідзецць у стаеньку,
Няхай закладаецць да й коніка,
Варанога, маладога,
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Вазьмі, ваша, солі, хлеба,
Солі, хлеба, чаго трэба.
Ідзі ж, ваша, да касцелу,
Да касцелу пасвянцаці,
Да прывезшы, спажываці.
Сядзь жа, ваша, на скам'іцу.
І з жаною з маладою,
І з дзеткамі маленькімі,
Шасні, бразні па скам'іцы.
Вазьмі, ваша, залаты кубак
Да й пі віно зеляное.
Віно зеляное — на сваю жану,
Жана твая — на дзетачак,
Дзеткі твае — на сямейку,
А сямейку — на чалядку,
Чаляданька — сама на сябе.
Радаўнічка — яна ў Бога
Парадлічка, парадзіла
Баранаваці, поле раўняці.
Стары Юрый, боскі ключнік,

Да йдзі ў поле да ў чыстае,
Адамкні зямлю, пусці расу,
Пусці расу на гэту вясну,
Да й мокрую, да й цёплую,
На гэты свет, на ўсякі цвет,
На люд вясёлы, на ўраджай.
Святы Барыс ляды паліць,
Зямлю грэець, ячмень сееець
З поўнай сявенькі, з правай жменькі.
Кінеш рэдка — дасць бог густа.
Дай жа, Божа, зарадзі, Божа,
Каласіста, ядраніста.
Святы Мікола, старая асоба,
Гарох сееець, па полі ходзіць,
Па полі ходзіць, жыта глядзіць.
Дзе вымакла, там падсушыць,
Дзе высахла, там падмочыць.
Святы Шоснік — аўсы шастаць.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Закладай, ваша, да й коніка,
Вернага, маладога,
Вядзі, ваша, у чыста поле,
У чыста поле авёс сеяць.
У адной кашулі, без шапачкі,
З поўнай сявенькі, з правай жменькі.
Кінеш рэдка — дасць бог густа.
Дай жа, Божа, зарадзі ж, Божа,
Да й вяцвісты, ядраністы.
Святая Сёмка — позна сяўба,
Позна сяўба — грэчку сееець,
На вуліцы стучыць, гручыць,
Гнайкі возіць, папар арэць.
Дзевятушка-памяжаначка
Па мяжах хадзіла, жытцо абзірала,
Жытцо абзірала да й раўнавала.
Дзесятуха красу давала,
А Пяцінка красу здымала,
Красу здымала, пятку стаўляла.
Святы Іван коску правіць,
Лугі пратаць, у сціррты кідаць.
Святы Пятро — саўсім ядро,
Папар барануець, поле раўнуець,
Поле раўнуець, грунт гатуець.
Шыпілінка ў кузню ідзець,
У кузню ідзець, сярпы зубіць.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Збірай, ваша, стары сярпы
Да йдзі ў кузню напраўляці.
Кузнец-маладзец, зубі сярпец!
Табе плата — чырвон злоты,
Чырвон злоты табе на боты.

Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Да йдзі ж дамоў да аддай жане
Да маладзе новы сярпок.
Няхай ідзець твая жана
У чыста поле жытцо жаці
З ячным блінам, з белым сырам,
З белым сырам, з трэцім сынам.
Свята Ілля — старая жняя,
Яна жала, не ўважала,
Што раз зажнець, то сноп звяржэць.
Святыя Ганны да помачы сталі,
Вязь вязалі, копы клалі.
Святы Барысе, за мешань бярыся!
Святы Спас па полі ходзіць,
Копы лічыць, раскладаець:
Гэта на семя, гэта на емя!
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Сядлай, ваша, да й коніка,
Варанога, маладога,
Едзь жа, ваша, у чыста поле,
У чыста поле копы лічыць.
Як на небе звёзды густы,
Гусцей таго ў полі копак.
Прачыстая да большая
Жытцо пасвянцала, засявала.
Да й меншая, дык лепшая,
Дык лепшая паненачка
Перад Богам кланялася:
— Я ж, Божа, не гуляла,
Жытцо пахала, у грань паганяла,
У грань паганяла, як збірала.
А Ян-сценцель руней сцеліць.
Узвіжанне — унясі ж, божа,
Узнімі, Божа, з ільном, з аўсом,
З усім дабром у гуменца.
Святы Пакроў пакрыў зямлю
Жоўтым лістом, маладым сняжком,
Ваду лёдам, пчалу мёдам.
Святы Зміцер — на ўсё хіцер:
Салады салодзіць, піва робіць,
Сыноў жэніць, дачок выдаець.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Ці ўслых табе наша песенька,
Наша песенька старасвецкая,
Што мы ходзім, Бога просім:
— Дай жа, Божа. Зарадзі ж, Божа,
У пуні кладам, на таку ўмалотам,
У дзяжы падходам, у печы ростам,
У печы ростам, на стале насытам.
Гаспадару, слаўны мужу,

Слаўны мужу над мужамі!
Дары гасцей, не баў, бардзей.
Нашы дары невялікія,
Невялікія — у дзверы не лезуць,
Праз аконца як шыць шыюць.
Дай мерачку за фатыгачку,
Чырвон злоты мне на боты,
Пачынальніку — капу яек,
Братцам-памагальнікам —
па дзесятачку.
Да й на двары ветрык веець,
Валачобнікам ножкі млеюць;
Да й на дварэ дождж дыміць,
Валачобнікам жывот ныць.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі!
Прасі к сабе гасцей у хатку,
Сыр на талерку, кварту гарэлкі,
Кварту гарэлкі, пшонны пірог,
К таму пірагу місу тварагу.

Дай жа, Божа, каб васьмёркай пахалі,
Васьмёркай пахалі, дзевятым ганялі,
А дзесяты падбрыківаў,
А на адзінаццатым у дружкі ездзіць.

Нязгаснае, неадольнае жаданне беларуса стаць калі-небудзь на ногі, каб адчуваць сябе Гаспадаром з вялікай літары, уладаром свайго лёсу, не было самамэтай. Яшчэ раз звернемся да прыведзенага вышэй тэксту калядцай песні. На першае месца пастаўлена бадай што для ўсіх часоў галоўная радасць — "добрыя дзеткі". Гэта дае нам падставы сцвярджаць, што другім найважнейшым структураўтваральным прынцыпам каляндарных святкаванняў быў *прынцып захавання і працягу свайго Роду*.

Практычна ў кожным гадавым свяце прысутнічала варажба дзяўчат аб замужжы, аб стварэнні моцнай і вялікай сям'і. Дзяўчаты варажылі на Каляды і Купалле, Масленіцу і Тройцу, на Андрэя і Пакровы[28]. Ім наперад хацелася "знаць, з кім давядзецца век векаваць": адкуль будзе нарачоны, яго імя, характар, колькі дзяцей будзеш мець, беднай ці багатай будзе сям'я.

Вядома, што ў структуры народнага календара быў прадугледжаны час, які лічыўся найбольш спрыяльным для вяселляў[29]. Трэба адзначыць, што ў радзіннай, вясельнай і пахавальнай абраднасці амаль што кожнае рытуальнае дзеянне было скіравана на захаванне жыцця, яго памнажэнне і працяг. Напрыклад, цяжарнай жанчыне нельга было глядзець на непры-

гожага чалавека, каб такім не нарадзілася дзіця, нельга было што-небудзь украсці, забаранялася праць, ткаць, вязаць і вышываць, каб "не зашыць" розум дзіцяці. Цяжарнай не дазвалялася хадзіць на пахаванне, цалаваць нябожчыка і г.д.[30]

Безліч прыкмет, розных прадпісанняў і забарон тычыліся паводзін маладых на вяселлі. Калі пачыналі дзяліць каравай, то першымі да маладых падыходзілі родныя дзед і баба і зычылі ім, самае галоўнае, наступнага:

Дорым жменю медзі,
Каб дзеці былі як мядзведзі.

* * *

Жадаем, каб у кожным куточку
Было па сыночку,
А на кожнай падушцы
Было па дачушцы.

Дарую бульбы падполле,
Каб дзяцей было застолле.

* * *

Я дару нітак клубочак.
Каб быў першы сыночак[31].

Своеасаблівым звязуючым звяном паміж прынцыпам паляпшэння дабрабыту і захавання і працягу свайго роду з'яўляецца *прынцып, скіраваны на ўшанаванне продкаў.* Можна без перабольшання сцвярджаць, што гэта адзін з самых галоўных структураўтваральных прынцыпаў не толькі кожнага рытуальна-абрадавага комплексу паасобку, але і календара ў цэлым. Больш за тое, калі ў адных абрадавых структурах ён быў "адным з некалькіх раўназначных", то ў іншых гэта быў ключавы фактар, які жорстка рэгламентаваў паводзіны ўсіх удзельнікаў.

Каб больш выразна і шматбакова паказаць месца і ролю для беларускай этнакультурнай традыцыі культа продкаў, мы выдзяляем з трэцяга прынцыпу яшчэ адну складальную, якую можна было б пазначыць з пэўнай доляй умоўнасці як самастойны прынцып. Мы фармулюем яго як жорсткае табу, як неабвержнае прадпісанне, якое рэгламентуе нашы паводзіны ў абрадавых сітуацыях: "*Перш чым сабе — продкам*".

У якасці ілюстрацыі прывядзем некалькі прыкладаў:

1. Сярод беларусаў і сёння шырока бытуе прыказка "Першы блін комам", сэнс якой у другой палове 20 ст. пачалі тлумачыць наступным чынам: адсутнасць вопыту часта прыводзіць да таго, што задуманае не ўдаецца цалкам здзейсніць. Дапускаецца і ўласна натуралістычнае тлумачэнне: наша паспешлівасць ва ўжыванні страў прыводзіць да таго, што гарачы блін "перасядае".

Аднак шматлікія абрадавыя кантэксты дазваляюць даць зусім іншую інтэрпрэтацыю зместу прыказкі. У асяроддзі беларусаў існаваў звычай: на кожнае вялікае свята ў сям'і абавязкова пяклі бліны (ячныя, пшанічныя, бульбяныя, жытнія,

грэцкія), але першы спечаны блін (у адпаведнасці з патрабаваннем этыкетна-нарматыўнага прадпісання) клалі на сподак і ставілі ў чырвоны кут пад абразы, таму што ён прызначаўся душам памёршых продкаў. Тры дні ляжаў гэты блін на самым пачэсным месцы, затым яго аддавалі птушкам або сабаку. А калі хто-небудзь парушаў прадпісанне звычаёвага права і спрабаваў сам з'есці блін, то ён (блін) "станавіўся колам".

Кантэкст фразеалагізма "колам стаў" аналагічны папярэдняй прыказцы. З апісанняў усходнеславянскіх этнографаў вядома, што "ведзьмакоў" або самагубцаў (людзей, якія парушылі свяшчэнны запавет: "Бог даў, Бог і ўзяў") хавалі асобна, па-за могілкамі, а над магілай ставілі адпаведны знак парушэння — не крыж, а асінавы кол[32].

2. Усе ўдзельнікі жалобнага стала таксама падпарадкоўваюцца важнейшаму абрадавафарміруючаму прынцыпу "перш чым сабе — продкам", г. зн. першую чарку наліваюць памёршаму; абсалютна кожная страва, якая пададзена на стол, павінна быць патрошку адкладзена ў талерку памёршаму.

3. На ўсёй Беларусі да сённяшняга дня жанчыны, у якіх памерлі малыя дзеці, прытрымліваюцца забароны ўжываць яблыкі да Яблычнага Спаса (19.08). Хрысціянская легенда сведчыць, што ў гэты дзень Бог адорвае памёршых дзяцей рознымі пачастункамі, сярод якіх ёсць і яблыкі. Калі ж чыя-небудзь маці не ўтрымалася і з'ела яблык да Спаса, то лічылася, што дзіця на "тым" свеце застанецца без падарунка. Для маці гэта было вялікім грахом, таму першыя яблыкі новага ўраджаю на Спаса свенцілі ў храме і неслі на магілкі дзяцей, а затым ужо елі і самі.

4. У ранейшыя часы існаваў звычай: маладыя адразу пасля вянчання выходзілі з храма і ішлі да магіл сваіх продкаў, таму што могілкі былі тут жа, у непасрэднай блізкасці. Наш сучасны ЗАГС не з'яўляецца храмам, таму не стаіць каля могілак. Аднак у памяці людзей усё роўна захаваўся штокольвечны прынцып: перш чым маладыя паедуць дадому, яны абавязкова павінны накіравацца да брацкай магілы або іншых рытуальных мясцін, звязаных з ушанаваннем загінуўшых або памёршых.

5. Нагадаем яшчэ адно даволі жорсткае папярэджанне, шырока вядомае сярод старэйшых людзей: "Не чапай зямлю да Радаўніцы або да Благавешчання — можа быць смерць у вашай сям'і"[33]. Інакш кажучы: *перш чым узяцца за лапату і пайсці наводзіць парадак у сваёй гаспадарцы, трэба схадзіць на могілкі і спачатку навесці парадак там.* Тая ж жыццёвая логіка падказвала: калі на Радаўніцу вы заручыліся падтрымкай сваіх продкаў, а на Багача парадаваліся сабранаму багата-

му ўраджаю, то *на Восеньскія Дзяды трэба аддзячыць продкаў за дапамогу і падзяліцца з імі набытым багаццем.*

Яшчэ адным важным структураўтваральным прынцыпам традыцыйнай культуры з'яўляецца *прынцып падабенства* (больш празрыстай і зразумелай з'яўляецца наступная рабочая фармуліроўка: "*падобнае выклікае падобнае*"). Прынцып гэты скразны, ён ахоплівае (пранізвае, структурыруе) практычна ўсе рытуальна-абрадавыя комплексы беларусаў. Напрыклад, у час першага рытуальнага купання ў ночвы дзяўчынцы клалі аднакапеечную медную манету (каб лёгкімі і непрацяглымі былі месячныя). На вяселлі маладых садзілі на вывернуты кажух, каб яны былі багатымі і мнагадзетнымі. Моладзь дашлюбнага ўзросту не дапускалі да жалобнага стала, каб захаваць здольнасць працягу роду. На навагодні стол ставілі дванаццаць страў, каб кожны месяц сямейны стол быў такім жа багатым. У час зажынак першы сноп падкідвалі ўгару, каб так высока ставіліся бабкі са снапоў. На Масленіцу дзяўчаты каталіся на прасліцы з гары: хто далей заедзе, у таго і лён будзе вышэй. Той жа сэнс мелі і гушканні на арэлях[34].

Літаральна кожны рытуальна-абрадавы комплекс быў напоўнены элементамі *магіі*. Сакральна-магічны пачатак бадай што ўвогуле вылучаў абрадавае дзеянне з шырокага кола пабытавай практыкі чалавека. Магія была і застаецца прыхаванай тайнай спружынай рытуальнай практыкі беларусаў. Сярод магаў, чарадзееў, знахараў існуе глыбокая перакананасць, што дадзеныя ім веды нельга тыражыраваць і загадзя перадаваць іншаму. Таму прафесіяналы-этнакультуролагі да нашага часу не ведаюць і нават не ўяўляюць усяго багацця гэтай кампаненты абрадавай практыкі, а значыць не могуць дакладна патлумачыць шматлікія сэнсава-семантычныя і знакава-сімвалічныя аспекты абрадавых сакральна-магічных дзеянняў.

Такім чынам, яшчэ раз звернемся да атрыманай схемы (гл. мал. 7). Лінія Радаўніца—Восеньскія Дзяды ахапіла зону дзеяння тых сацыякультурных прыярытэтаў, якія былі скіраваны на паляпшэнне дабрабыту. Багач у абрадавым плане зафіксаваў паспяховае завяршэнне цыкла земляробчых спраў.

Далей паўстае заканамернае пытанне: "А чым жа поўнілася жыццё селяніна ў познюю восень і зіму?" Безумоўна, гаспадарчы клопат не перапыняўся ніколі. Але заможнае становішча сям'і і гаспадаркі давала магчымасць спакойна падумаць і пра тое, каб справіць вяселле: выдаць замуж дачку або ажаніць дарослага сына.

4. Зак. 25

# ЗАХАВАННЕ І ПРАЦЯГ СВАЙГО РОДУ

У народзе кажуць: "Смерць і радзіны не выбіраюць гадзіны". А як быць з вяселлямі? Аказваецца, яны таксама былі строга падпарадкаваны рытмам народнага календара, у якім быў час, калі вяселлі катэгарычна забараняліся, і, наадварот, час, які лічыўся найбольш спрыяльным для фэстаў моладзі.

І ў старажытнаславянскай, і ў хрысціянскай традыцыях вяселлі не дазвалялася спраўляць у час пастоў:

1. Шасцітыднёвы Піліпаўскі пост пачынаецца 28.11, а заканчваецца 6.01 напярэдадні Каляд.

2. Вялікі сямітыднёвы пост, які доўжыўся ад Масленіцы і да Вялікадня. Дакладныя даты назваць нельга, таму што святы гэтыя рухомыя, але паміж імі заўсёды адзначаецца самы працяглы па часе перадвелікодны пост.

3. Пятроўскі пост пачынаўся ў другі панядзелак пасля Тройцы, а заканчваўся на Пятра (6.07).

4. Двухтыднёвы Спасаўскі пост, які працягваецца ад Першага Спаса (14.08) да Першай Прачыстай (28.08)[35].

5. Да сістэмы пастоў, якія служылі не толькі духоўнаму і фізічнаму ачышчэнню арганізма, але падрыхтоўвалі яго да ўспрыняцця новай ежы, неабходна яшчэ дадаць адрэзак часу ад 6.01 да 21.01, які атрымаў у народзе назву "крывых вечароў" і таксама забараняў вясельныя гулянні[36]. Затое ў гэты перыяд у паўночных раёнах Беларусі моладзь ладзіла гульні "Жаніцьба Цярэшкі".

Летняя актыўнасць працы і сістэма працяглых пастоў прадвызначылі два асноўныя прамежкі часу, якія лічыліся найбольш спрыяльнымі для стварэння сям'і (мал. 8):

1. *Вялікая вясельніца*, якая працягвалася ад Пакроваў (14.10), у некаторых месцах ад Багача (21.09) і да 27.11: "Да Змітра дзеўка хітра, а па Змітры — хоць яе выстры".

2. Уважліва глядзім на схему і звязваем у адзінае цэлае ўсю пазначаную на ёй інфармацыю. Мадэліруем сямейную абрадавую сітуацыю. Вяселле маладыя справілі на пачатку мясаеду. Адразу пасля яго (пасля першай шлюбнай ночы) пачнецца (спадзяваліся) фарміраванне новага чалавека, прычым *зачацце адбудзецца ў ачышчаным пасля Піліпаўскага посту арганізме*. Эмбрыён фарміруецца за кошт арганізма маці. І тут важна ўзгадаць, як называўся гэты час — мясаед: зразумела, што жанчына-маці атрымлівала самае энергаёмістае (бялковую ежу, неабходную для нармальнага развіцця эмбрыёна) сілкаванне. І нарэшце, нараджэнне чалавека прыпадае на той час (Багач), які будзе прадстаўлены самай вітамінізаванай ежай. Гэта акалічнасць тлумачыць, чаму перад Вялікай вясельніцай




Мал. 8. Сістэма пастоў у народным календары. Асноўныя перыяды святкавання вяселляў

не патрэбен быў пост: прырода шчодра адорвала ў гэты час чалавека неабмежаваным багаццем вітамінаў.

У гадавым колазвароце беларусаў існаваў яшчэ адзін перыяд (але кароткі і не зусім удалы), калі часам ладзілі вяселле. Прыпадаў ён на прамежак часу паміж Тройцай і Пятроўскім постам, калі заканчваліся ўсе асноўныя земляробчыя работы і наступаў невялікі зацішак перад касавіцай. Час гэты ацэньваўся народам не зусім станоўча, аб чым сведчаць адпаведныя прыказкі: "Як беднаму жаніцца, дык і ноч кароткая" (зразумела, што самымі кароткімі былі ночы перад і пасля Купалля). Часцей за ўсё Тройца прыпадала на другую палову мая — час, да якога зноў-такі беларусы ставіліся надзвычай скептычна: "Хто ў маі ажэніцца, той усё жыццё маяцца будзе".

Улічваючы ўсё гэта, прыводзім выніковую схему народнага календара, у якой адлюстраваны ўсе асноўныя структураўтваральныя прынцыпы, якія тычацца гадавога круга ў цэлым (мал. 9).

Разам з тым хацелася б адзначыць, што народны каляндар беларусаў хавае ў сабе яшчэ даволі шмат таямніц, спасцігнуць якія можна будзе толькі тады, калі арбітай яго існавання сумесна зоймуцца не толькі фалькларысты, але і гісторыкі, археолагі, псіхолагі, астраномы, этналінгвісты, матэматыкі. Для яго больш глыбокага разумення трэба па магчымасці максімальна сабраць і асэнсаваць багаты пласт народнай фразеалогіі, у якой сканцэнтраваны веды і назіранні, прыкметы і павер'і, якія тычацца народнай агратэхнікі, стану надвор'я, астраноміі, паводзін прадстаўнікоў жывёльнага і птушынага свету, а таксама неабсяжнага вопыту народнай медыцыны, шмат у чым заснаванага на таямніцах расліннага свету.

Напрыклад, у асяроддзі беларусаў шырока вядома прыказка "Грамніцы — палова зіміцы", сэнс і змест якой на першы погляд здаюцца супярэчлівымі. Грамніцы адзначаюцца 15 лютага, а гэта ўжо палова трэцяга, заключнага месяца зімы. Каб праверыць дакладнасць прыказкі, якая фіксуе нашу ўвагу на "сярэдзіне зімы", неабходна знайсці святы, якія адпаведна будуць вызначаць пачатак і заканчэнне зімы. Іншыя прыказкі і валачобныя песні падказваюць нам, дзе трэба шукаць гэтыя межы.

Пакровы (14.10) былі тым часам, калі зямля першы раз усцілалася снегам, а гэта значыць пачыналася зіма — гаспадар ставіў скаціну ў хлеў. Працягваючы гэту думку, мы лёгка здагадаемся, што зіма поўнасцю скончыцца тады, калі скаціну выганяць у поле. А адбудзецца гэта на Юр'я (6.05). Дакладнасць нашых высноў пацвярджае яшчэ адна прыказка, якая самым цесным чынам звязвае згаданыя святы: "Калі на Грам-



Мал. 9. Выніковая схема структуры беларускага народнага календара




Мал. 10. "Грамніцы — сярэдзіна зіміцы"

ніцы з-пад страхі певень нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы". Схематычнае выражэнне ўсёй гэтай інфармацыі яскрава сведчыць, што прыказка "Грамніцы — палова зіміцы" дакладна асэнсоўвае каляндарна-абрадавыя асаблівасці беларускай этнакультурнай традыцыі (мал. 10).

Надзвычай важнымі для разумення прынцыпаў пабудовы народнага календара з'яўляюцца моцныя сілавыя лініі, якія звязваюць паміж сабой Саракі і Узвіжанне, Валоссе і Іллю-Грамавержца, зімовага і веснавога Юр'яў. Існуюць у календары і трохчленныя сувязі, напрыклад, Пакровы — гуканне вясны — Купалле або Тройца — жніво — Каляды. Асаблівую цікавасць уяўляюць сабой паўсферныя стасункі — супрацьстаянні. Сярод іх назавём такія, як паўсфера, якая ахоплівае час ад восеньскага і да веснавога раўнадзенства — перыяд валадарства бога Вялеса. І наадварот, паўсфера ад веснавога да восеньскага раўнадзенства ахоплівае межы валадарства Перуна.

Хрысціянскі каляндар дапоўніў народны яшчэ адной прыгожай заканамернасцю, якая, дарэчы, цалкам стасуецца з агульнаславянскай і, відаць, агульначалавечай традыцыяй падзяляць усю жыллёвую і абрадавую прастору на правую і левую як увасабленне мужчынскага і жаночага пачаткаў (нагадаем толькі асобныя прыклады: мужчынскае адзенне зашпільваецца на правы бок, жаночае — на левы; за пахавальным сталом мужчыны садзіліся справа, уздоўж сцяны, жанчыны — злева, бліжэй да цэнтра хаты; адпаведна ў храме нявеста заўсёды павінна стаяць злева ад жаніха).

Сталася так, што ў структуры нашага календара правая паўсфера (ад дня зімовага сонцастаяння да дня летняга сонцавароту) пераважна напоўнена святамі, якія адлюстроўваюць асноўныя падзеі ў жыцці Ісуса Хрыста. А вось левая паўсфера прысвечана жыццяпісу Багародзіцы. Такі падзел і такая арыентацыя захаваліся і ў праваслаўных храмах (мал. 11).




Мал. 11. Цыклы святаў, звязаных з жыццём Ісуса Хрыста (правая палавіна) і Багародзіцы (левая палавіна)

У нашым календары прысутнічаюць і больш складаныя алгарытмы ўзаемасувязей паміж, здавалася б, зусім не суадноснымі святамі. Напрыклад, купальская легенда пра папараць-кветку нечакана выводзіць нас на святы пачатку вясны. У папараць-кветцы сканцэнтравана энергія Сонца, якую яно перадало на захаванне ў момант павароту да сваёй смерці. Кветку — працяг Сонца, дзіця нябеснага свяціла — знаходзіць чалавек і захоўвае яе да пэўнага часу. Нагадаем, на Каляды Сонца народзіцца, але яшчэ доўгі час яно не зможа адолець Марану і сагрэць цяплом наваколле. Тады той, хто знайшоў папараць-кветку, на самым высокім месцы падпаліць ёй (магічнай кветкай) Масленку — старое саламянае чучала, якое аддасць сваё цяпло Сонцу. А тое, у адпаведнасці са старажытным зачынам прыроды і жыцця — "усё вяртаецца на кругі свае", хутка пачне вяртаць энергію чалавеку. Бліжэй да Сонца знаходзяцца птушкі, вось менавіта яны першымі і прынясуць вестку аб надыходзе вясны — мы сустракаем іх прылёт з выраю святам Саракі. Затым на пацяпленне адрэагуюць дрэвы — мы ўшаноўваем вярбу. Кола замыкаецца на веснавое раўнадзенства ўшанаваннем перамогі Ярылы-Сонца.

Такіх складаных ланцужкоў узаемасувязі ў нашым календары яшчэ даволі шмат. Усебаковае вывучэнне гэтых глыбінных стасункаў толькі пачынаецца.

# ЧАЛАВЕК І ЯГО ЛЁС



# МЛЕЧНЫ ШЛЯХ ПАД РУКАМІ БАБУЛІ

## СІМВОЛІКА РУЧНІКА Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Этнакультурныя даследаванні беларускіх навукоўцаў у 20 ст. мелі пераважна вузкапрадметны характар. Фалькларысты вывучалі бязмежна багатую вусна-паэтычную спадчыну: жанравыя структуры, архітэктоніку фальклорнага твора, сістэму вобразаў, тыпалогію і варыятыўнасць іх сюжэтнага вырашэння, паэтычныя асаблівасці цэлых песенных цыклаў. Вынікам шматгадовай працы стаў фундаментальны збор “Беларуская народная творчасць” (выдадзена 42 тамы). Разам з тым гэта праца мае два істотныя недахопы. Па-першае, тэксты песень, казак, легенд, этнаграфічных апісанняў прадстаўлены ў адаптаваным выглядзе і, па-другое, укладальнікі падалі *слоўны тэкст без* дакладнай *прывязкі да пэўнага фрагмента рытуальнага дзеяння.* У выніку паэтычны твор згубіў сваю абрадавую паўнату, звузілася поле яго сэнсавага напаўнення, збяднілася гама семіятычных кантэкстаў. Уласна кажучы, тэкст, надрукаваны ў зборніку, набыў сваё жыццё, але ніякай арганічнай сувязі з першаасновай ён ужо не мае.

Анатаміраванннем цэласнага жывога арганізма займаліся і этнографы, у полі зроку якіх было найперш абрадавае дзеянне, рытуал, комплекс атрыбутаў-маркёраў. Слова для іх мела другаснае значэнне, выступала своеасаблівым эстэтычным фонам, які мог толькі аздабляць або дубліраваць сэнсавыя структуры абраду, але ні ў якім разе не надзялялася патэнцыялам структураўтваральнага характару.

Гэтым жа шляхам ішлі этнамузыколагі, харэографы, мастацтвазнаўцы. Апошнія, напрыклад, вывучалі тэхналогію ткацтва ручнікоў, посцілак, абрусаў, даследавалі эстэтычныя аспекты іх арнаментаў, высвятлялі рэгіянальныя асаблівасці каляровай гамы гэтых неад’емных атрыбутаў народнага побыту і святкаванняў. Аднак сёння ніхто з этнакультуролагаў і мастацтвазнаўцаў не мае падрабязнага рэестра дакладнага абрадавага ўжывання тых ці іншых ручнікоў. Як гэта не балюча ўсведамляць, але навукоўцы сёння аперыруюць толькі прыблізнымі звесткамі рытуальнага выкарыстання абрадавых атрыбутаў. На жаль, мы ведаем толькі тое, што, напрыклад, ручнік ужываўся ў шматлікіх рытуальна-абрадавых комплексах (у

радзіннай, вясельнай, памінальнай абраднасці), у аказіянальна-сітуатыўных рытуалах (выкліканне дажджу, спыненне агню, эпідэміі). Больш таго, ведаем мноства дакладных прывязак да пэўнага фрагмента якога-небудзь разгалінаванага і падоўжанага ў часе абраду (напрыклад, бацька ўводзіў сваю сям'ю ў новую хату, павязаўшы рукі кожнаму з іх ручніком, і г.д.). Аднак мы не ведаем, магчыма, самага галоўнага, глыбіннага і сакральна-дэтэрмінаванага факта: *які канкрэтна ручнік* (яго памеры, кампазіцыя арнаменту, каляровая гама, структурна-тэхналагічныя асаблівасці, час вырабу) *ужываўся ў тым ці іншым кантэксце*, хто меў права выкарыстоўваць яго ў пэўнай святочнай дзеі.

Усё гэта сведчыць аб тым, што наспеў час пошуку прынцыпова новых падыходаў да вырашэння актуальных праблем народнай культуры. Безумоўна, вузкаспецыяльныя пытанні былі і застануцца прэрагатывай прафесіяналаў-фалькларыстаў, этнолагаў, археолагаў і г.д. Аднак асэнсаванне агульных заканамернасцей існавання і развіцця культуры, спасціжэнне сакральных глыбіняў-таямніц і эстэтычных вышынь духоўных тварэнняў нашых продкаў мажліва толькі на аснове міждысцыплінарных падыходаў.

Сталася так, што кожная з навуковых галін вылучыла з адзінага цэлага адну складаную кампаненту і спрабавала праз яе прызму рэканструяваць гэтае цэлае, не звяртаючы ўвагі на структурныя і сістэмныя сувязі разглядаемай кампаненты. Добра вядома, што кожнае свята ўяўляе сабой складаны поліфанічны рытуальна-абрадавы комплекс, у якім адначасова разгортваецца некалькі раўназначных плыняў, якія М.І.Талстой называў ***кодамі***. Пералічым некаторыя з іх:

*акцыянальны код*: разгалінаваная сістэма рытуальна-абрадавых дзеянняў (выпяканне вясельнага каравая, расплятанне валасоў нявесты, спальванне масленічнага чучала, апусканне труны з нябожчыкам у магілу, пасляродавае купанне дзіцяці, скокі моладзі праз вогнішча на Купалле, зажынанне першага снапа, ушанаванне продкаў за святочным сталом на Дзяды, качанне яек, абыход вясельнага поезда бацькамі маладой, першы выган жывёлы ў поле і г.д.);

*вербальны код*: песенныя і празаічныя творы з шырокім спектрам функцый (сакральная, магічна-ахоўная, прадуцыравальна-папераджальная, эстэтычная, геданічная, карпаратыўная);

*атрыбутыўны код*: вялікая колькасць прадметаў, без якіх не выконвалася амаль што ніводнае рытуальнае дзеянне (абраз, калядная зорка, велікоднае яйка, грамнічная свечка, масленічныя бліны; бяроза, клён, аер, якімі ўпрыгожвалі храм,

падворак і хату на Сёмуху-Тройцу; купальскае вогнішча, дажынкавы сноп-гаспадар, памінальная куцця, “бабіна” каша на радзінах, крыж на пахаванні, галінка вярбы, ручнік, пояс, намітка, фартух; дзяжа, на якую садзілі маладую; фата; жменька пяску, якую кідалі ў магілу);

*выяўленчы код*: мастацкае аздабленне рытуальнага дзеяння праз адпаведную сістэму сімвалаў (колераў, формы, варыянтаў павязвання і спосабаў выкарыстання). Адзенне дзяўчат у рытуалах было адным, нявесты — іншым, жанчыны — зноў-такі адметным. Вясельная дзея вымагала адной каляровай гамы строяў, памінальная — прынцыпова іншай. Функцыі асноўных удзельнікаў вяселля дубліраваліся адпаведнымі выяўленчымі сродкамі: кветкамі, фатой, ручнікамі, паясамі;

*лакатыўны код*: месца рытуальнага дзеяння (храм, узвышша, могілкі, бераг ракі, чырвоны кут, парог хаты, скрыжаванне дарог, стод, лазня, гарышча, вароты хлява, печ, стол, зоны пад бэлькамі ў хаце, месца, дзе ляжыць камень-валун);

*тэмпаральны код*: час разгортвання дзеяння (зімовае і летняе сонцастаянне, веснавое і асенняе раўнадзенства, усход або захад сонца, поўдзень, поўнач, пост, дзень нараджэння, хрысціны, вянчанне на пэўную фазу Месяца, “сатанінскія” дні);

*музычна-харэаграфічны код*: суправаджэнне амаль усіх рытуальна-абрадавых комплексаў беларусаў песнямі, танцамі, адпаведнай музычнай кампазіцыяй.

Зразумець ўсё багацце сэнсаў і зместу рытуальна-абрадавых комплексаў можна толькі тады, калі будуць дасканала вывучаны як *гарызантальныя* (узаемасувязь розных функцый у межах аднаго кода), так і *вертыкальныя* (міжкодавыя) *сувязі* вызначаных параметраў. Менавіта таму сёння асабліваю актуальнасць набываюць скразныя ідэі, тыпавыя знакі, сімвалы, атрыбуты, вобразы, у якіх факусіруецца генакод нашай культуры. Таму зусім заканамерным з’яўляецца выхад у свет розных энцыклапедычных выданняў, такіх як “Мифы народов мира”, “Славянские древности”, “Мифологический словарь”, “Энциклопедия суеверий”, у якіх робіцца спроба набліжэння да пабудовы этнічнай мадэлі свету і вырашэння глабальных праблем духоўнай культуры аднаго народа, іх блізкароднаснай сям’і і нават усяго чалавецтва. Гэта, так бы мовіць, даследаванні ў галіне геннай інжынерыі чалавечай душы і яе творчых узлётаў, эўрыстычных адкрыццяў, а часам і драматычных беззваротных зломаў.

Сярод найбольш значных архетыпаў, міфалагем, культуралагем, хранатопаў, рытуалаформ беларускай народнай культуры можна вылучыць васьміканцовую зорку, ромб, крыжы розных выяў, дрэва сусвету, пантэон язычніцкіх багоў, хтанічны

(падземны) свет, вясельны каравай, дамавіну, хату, могілкі, карагодныя кампазіцыі, сістэму табуіравання, прадпісанняў і рэгламетацыі паводзін, сістэмную каталагізацыю з'яў, якія па звычцы называюцца прыкметамі і павер'ямі, або проста забабонамі.

Адным з найбольш цікавых феноменаў традыцыйнай культуры беларусаў з'яўляецца *ручнік*. Ён — адвечны спадарожнік чалавека. Калі пагадзіцца з думкай французскага акадэміка А.Айванхава, што літаральна кожны крок свядомага чалавека — гэта мікракосм[1], то можна без перабольшання сцвярджаць, што ручнік цесна зніттаваны з жыццём чалавека ад моманту яго нараджэння і да моманту пераходу ў іншае, касмічнае, жыццё, а таксама штодзень з ранку і да вечара. На тонка браны ручнік прымала бабка-павітуха новую жывую істоту. На спецыяльна вытканым ручніку стаялі маладыя падчас шлюбавін у храме. На тых самых ручніках выносілі з хаты, неслі да могілак і апускалі ў магілу труну з нябожчыкам. Ціха і павольна плыў гэты драўляны саркафаг (старажытны правобраз касмічнага карабля) на руках суродзічаў, якія асцярожна, з вялікай павагай "перадавалі" яго ў рукі волатаў-багоў. Тыя ж пакідалі людзям тварэнне іх рук — труну і цела, а з сабой забіралі тварэнне боскае — душу.

Ручнік — спадарожнік чалавека не толькі ў важных святочных падзеях, але і ў штодзённых жыццёвых турботах. Для таго каб смела зірнуць на сонца, чалавек перш-наперш "змываў" сон — тонкае покрыва начнога палёту ў абсягі вечнасці — і лашчыў твар ручніком-уціральнікам. Перш чым сесці за стол, трэба было падзякаваць Богу за дараванае жыццё і долю. Позірк чалавека быў скіраваны ў чырвоны кут, а там, пад столлю, пад хатнім небам, знаходзіўся лік Творцы Сусвету і быў ён пакрыты бялюткім ручнікам — адмысловым тварэннем рук чалавечых.

Улетку першы промень сонца часта сустракаў гаспадара на сенакосе. У полудзень да яго спяшалася дачка або жонка, праз плячо якой быў перакінуты ручнік з падвязаным глякам-спарышом. Збіраўся чалавек у далёкую дарогу або проста ў госці да сваякоў, браў з сабою кавалак сала, лусту хлеба, пляшку гарэлкі. Уся спажыва акуратна ўкладвалася ў плеценую валізку, а зверху прыкрывалася чыстым ручнікам.

Дык што ж гэта за незвычайная рэч, без якой нельга было і кроку ступіць? Якую таямніцу душы ўкладвалі ў яго жаночыя рукі, якія ткалі доўгімі зімовымі вечарамі? Якім зместам напаўнялі яны белую дарогу, упрыгожваючы мудрагелістым арнаментам? Што за сакрэты светаўспрымання і светабудовы хаваліся і хаваюцца за крыжамі, ромбамі, палоскамі, елачкамі,



Народнае адзенне пачатку 20 ст. Слуцкі раён.

раслінамі, іх шматлікімі і непаўторнымі спалучэннямі, што за сакральныя, свяшчэнныя веды перадаваліся ад бабулі да ўнучкі, калі *ткаць ручнік можна было толькі ў пост*, у той час, калі цела ачышчалася ад бруду, думкі напаўняліся дабром, паводзіны характарызаваліся стрыманасцю і пачцівасцю, а душа вызвалялася ад цяжару будзённасці і асвятлялася жыццесваральнай энергетыкай Космасу.

Памятаю, як мяне яшчэ ў школьныя і студэнцкія гады здзіўляла адна акалічнасць у паводзінах і бабулі і маці. Пасля мыцця бялізны звычайна “вафельныя” ручнікі (іх куплялі ў краме) складвалі “ў чацвёрку” (напапалам і яшчэ раз напапалам), а вось саматканыя скручвалі ў “трубы”, або “кацёлкі”. У сувязі з гэтым узнікла адно вонкавае і сэнсавае параўнанне. Магчыма, ручнік — гэта старажытны манускрыпт, пісьмовы скрутак, рукатворная “Галубіная кніга” нашай культуры, яе Біблія, у якой зашыфраваны генетычны код нашай духоўнасці, пазначаны пуцявіны гістарычных міграцый нашых продкаў, іх культурныя стасункі з суседзямі, узбагачэнне іх творчымі набыткамі і пашырэнне ўласных гарызонтаў. Які змест закадзіраваны, напрыклад, у Мандале (выяве) васьміканцовай зоркі, вакол якой часцей за ўсё разгортваецца кампазіцыя ўзораў на ручніках, посцілках, настольніках, жаночых строях? Якую сусветную ідэю сфакусіравала яе манаграма, калі выяву гэту можна бачыць на ткацкіх вырабах не толькі беларусаў, украінцаў, але і нашых паўночных суседзяў — народаў фіна-угорскай сям’і?

Расшыфроўка гэтага кода патрабуе глыбокага і ўсебаковага філасофска-культуралагічнага асэнсавання, удумлівасці, сканцэнтраванасці інтэлектуальных і духоўных сіл чалавека. Але ж такой выключнай засяроджанасці, свядомасці вымагаў найперш абрад ініцыяцыі — абрад-іспыт, які павінен быў пацвердзіць высокі ўзровень фізічнага і духоўнага сталення новага прадстаўніка роду і далучыць яго да шматлікіх таямніц зямнога існавання, надзяліць правам стварыць сям’ю, нарадзіць дзіця, прымаць удзел у строга рэгламентаваных узроставым цэнзам і сацыяльным статусам абрадах[2]. Вядома, што абрад пасвячэння, далучэння да адпаведных ведаў, якія давалі ключ да таямніц свету і сусвету розных грамадскіх фарміраванняў, быў абавязковым у практыцы ўсіх цывілізацый, шматлікіх сацыяльных арганізацый: ордэнах, масонскіх ложах, партыях, брацтвах. Напрыклад, у традыцыях шматлікіх народаў свету дзяўчына трапляла ў грамаду жанчын толькі праз абрады вянчання і вяселля, папярэдне выткаўшы *сорак ручнікоў*. Пераканаты, што ідэя стварэння ручніка тоесная ідэі шэрагу вусна-паэтычных твораў розных жанраў. Глыбінны сэнс арнаменту ручніка той самы, што і ў легендах пра папараць-кветку або пра асноўную прыродную падзею Узвіжання.

Коратка нагадаю змест адпаведных фальклорных твораў.

1. У незвычайную летнюю ноч, якраз на Купалле, зацвітае чарадзейная папараць-кветка. Той, хто знойдзе яе, становіцца пра*зар*ліўцам, г.зн. спасцігне таямніцы *зор*нага неба, стане *зор*кім, навучыцца чытаць яго ў*зор*ы, су-*зор*’і і па іх прадказваць лёс чалавека[3].

2. Узвіжанне — час, пасля якога зямля заціхае ў працяглым зімовым сне. Таму дзень гэты лічыцца паваротным у існаванні ўсяго хтанічнага свету. Усе вужакі і гадзюкі збіраюцца ў рой і клубком коцяцца да месца зімоўкі, у вы-*Рай*. Той, хто знойдзе ў сабе сілы пайсці гэтай ноччу ў лес, можа сустрэць своеасаблівае развітальнае шэсце. Узначальвае яго цар вужоў, на галаве якога зіхаціць залатая карона — сімвал уладарнасці і мудрасці. Нашы продкі раілі: не разгубіцеся ў гэты момант, рассцяліце перад ім ручнік, станьце на калені і нізка схіліцеся долу. Вужака-цар скіне сваю карону і перадасць яе вам, а з ёю і сакральныя веды пра пабудову Сусвету, мудрасць, яснабачанне, надорыць вас разуменнем мовы самой прыроды[4]. Ці не гэтую ж мову космасу, прыроды, карагодныя фантазіі нябесных сузор'яў, сімвалічны код светабудовы выткалі нашы мудрыя бабулі на сваіх ручніках?

У беларускіх этнакультурных даследаваннях даўно сфарміравалася ўстойлівая традыцыя разглядаць тыя ці іншыя з'явы фальклорнай паэтыкі, адштурхоўваючыся ад рытуальна-побытавых кантэкстаў. Напрыклад, выкарыстанне бараны напрыканцы святкавання Восеньскіх Дзядоў не тлумачыцца аніякім чынам. Проста следам за этнографамі-збіральнікамі 19 ст., якія дакладна занатавалі дэталі і фрагменты гэтага абраду, сучасныя даследчыкі абмяжоўваюцца той самай канстатацыяй факта, крыху пашырыўшы інфармацыйнае поле аналагічнымі фрагментамі, запісанымі сучаснымі збіральнікамі. Інварыянт гэтага рытуальнага дзеяння напаўняецца блізкароднаснымі атрыбутамі, асаблівасцямі адпаведных абрадавых паводзін гаспадара (ён браў венік і “вымятаў”-праганяў душы памёршых продкаў з хаты або імітаваў гэта дзеянне толькі рукамі), але пытанне аб выкарыстанні менавіта гэтага прадмета (бараны) так і заставалася па-за ўвагай даследчыкаў. Магчыма, тут галоўную ролю адыгрываюць канструктыўна-тэхналагічныя асаблівасці бараны, напрыклад вострыя пальцы. А магчыма, яе перавяслы сімвалізавалі радавую паяднанасць. Нельга выключаць і тое, што яе “вокны” ці “гнёзды” выконвалі тую ж культуралагічную ролю, што і хамут, акно, вусце печы, калодзеж, якія лічыліся пасрэднікамі паміж “тым” і гэтым светам[5].

Пашырана сярод беларусаў і ўяўленне аб тым, што *ў той час як па вёсцы ідзе пахавальная працэсія, трэба ўсім устаць і пажадана выйсці з хаты, а не глядзець праз акно* (вунь колькі гэтых акенцаў у баране). *Калі ж у хаце спіць немаўля* і не хочацца яго будзіць, *то на гэты час пад бок малому клалі нож вастрыём да вуліцы* (смерць не падпускалі да дзіцяці)[6]. А на Купалле, каб ведзьма не забрала малако ў каровы, у дзвя-

рах хлява вешалі грамнічную свечку, крапіву-жыгучку або серп лязом уніз[7]. Нават сёння многія ведуны раяць: *каб парог вашай хаты не змог пераступіць непажаданы госць*, благі чалавек або злодзей, *убіце ў вушакі зверху і знізу па дзве іголкі, скіраваныя вастрыём да дзвярнога праёма*[8].

Такім чынам, ***рытуальнае выкарыстанне атрыбута ў значнай ступені абумоўлена яго ўласнымі функцыянальнымі асаблівасцямі, якія ў побытавым ужыванні маюць іншую, уласна практычную накіраванасць.***

Паспрабуем выкарыстаць гэты ход і для разумення абрадавай ролі ручніка. Перш чым разглядаць яго рытуальную ўжытковасць, звернемся да сімволікі яго кампазіцыі. Толькі пасля гэтага паспрабуем “прачытаць” абрадавыя тэксты і праз сістэму рытуальных кантэкстаў зразумець сімволіку ў цэлым.

Абраць менавіта такі накірунак даследавання рытуальна-семантычных аспектаў ужывання ручніка мяне прымусіў зусім нечаканы выпадак. У 1993 годзе дыскагенны радыкуліт моцна прыкаваў мяне да бальнічнага ложка. Мяне чакала апошняе выпрабаванне — аперацыя. Але лёс наканаваў мне непрадказальны паварот. Праз сваіх знаёмых даведаўся аб тым, што пад Мінскам жыве жанчына, якая лечыць сваімі сродкамі і спосабамі гэтую цяжкую хваробу. Трох саракахвілінных сеансаў, напоўненых спецыфічнымі працэдурамі народнай медыцыны, да гэтага часу невядомых мне, аказалася дастаткова, каб я зноў адчуў сябе паўнацэнным чалавекам, здольным не проста працаваць, а пераадольваць значныя фізічныя нагрузкі. Бабуля Феня — так завуць маю выратавацельку — дала згоду зрабіць некалькі відэазапісаў сеансаў яе лячэння розных захворванняў.[9]

Падчас адной з чарговых сустрэч я стаў сведкам незвычайнага спосабу лячэння хворага чалавека. Па дапамогу да бабулі прыехала маладая маці з Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Яна паведаміла лекарцы пра сваё няшчасце. Яе двухгадовы сынок ніцеў, “сох бы кляновы ліст увосень”, але ніхто не мог даць рады ні дзіцяці, ні яго матулі. Праз нейкі час, выслухаўшы споведзь стомленай госці, бабуля села за кросны і пачала ткаць ручнік. Даўжыня яго была каля 120 сантыметраў, кампазіцыя дзялілася на тры роўныя часткі: сярэдзіна — белая, канцы — чырвоныя. Бабуля аддала саматканы выраб маладой жанчыне і загадала: “Ляці дадому, загарні дзіця ў ручнік і *40 дзён* не здымай. А затым абавязкова прыедзь і раскажы, ці адбыліся якія-небудзь змены”.

Тое, што я ўбачыў у наступную сустрэчу, уразіла, усхвалявала, прымусіла шмат над чым задумацца і пашукаць нетрывіяльныя адказы на розныя пытанні. Перш за ўсё было не

пазнаць саму жанчыну. Адчувалася, што гэта зусім іншы чалавек: бадзёры, гаваркі, памаладзеўшы, адкрыты жыццю і людзям. Прычынай "перараджэння", безумоўна, былі прынцыповыя змены ў стане здароўя яе дзіцяці. Зразумела, такі паварот падзей патрабаваў спробы прааналізаваць з'яву з розных бакоў. Што ж уратавала гэта дзіця? Што ж такое "наш" ручнік? Якая моц, якія жыццядайныя пачаткі прыхаваны ў ім? Тысячы ручнікоў, якія давялося бачыць у час шматлікіх экспедыцыйных паездак, так не ўскалыхнулі маю душу, як гэты — бабулі Фені. На першы погляд, нічым асаблівым ён не вылучаўся. Нечаканым быў сітуатыўны кантэкст яго выкарыстання і вынікі ўжывання. Таму я паспрабаваў вылучыць розныя (у тым ліку і пазанавуковыя) аспекты станоўчага ўздзеяння на чалавека, якія маглі факусіравацца ў ручніку.

*Па-першае*, даўно даказана і шматлікімі пакаленнямі пацверджана станоўчае ўздзеянне на самаадчуванне чалавека льну, з якога быў вытканы гэты ручнік.

*Па-другое*, у бабулі Фені незвычайныя рукі. Ад іх моцна патыхае цяплом, яны здольны хутка суцішыць неймаверны боль. Вось гэтыя рукі аддалі сваю энергетычную моц ручніку, а праз яго магло быць аказана ўздзеянне на дзіця.

*Па-трэцяе*, пакуль ніты ператвараліся ў суцэльную дарогу, бабуля ціхенька "гаварыла" з ручніком. Хутчэй за ўсё добры дзесятак замоў быў "перададзены" ("закадзіраваны") яму ў час чарадзейства над кроснамі. Ва ўсіх культурах свету вядома мноства спосабаў перадачы энергіі слова (як станоўчай, ажыўляючай, так і адмоўнай, здольнай зжыць чалавека са свету) праз нейкага пасрэдніка. У знахарскай практыцы славян часцей за ўсё хваробу "выгаворвалі" на хлеб, соль, яйка, нож, воск. Наадварот, "нагаворвалі" няшчасце на іголку, магільны пясок, здохлую мыш, пратухлае яйка, сабачую поўсць, асінавы пруток (таму не спяшайцеся браць голымі рукамі ўсе пералічаныя рэчы, асабліва калі знойдзеце іх у варотах, на парозе, каля ўваходных дзвярэй сваёй кватэры). Аднак самым моцным пасрэднікам-перадатчыкам безумоўна з'яўляецца вада[10]. Невыпадкова "жывая" і "мёртвая" вада прысутнічае ў шматлікіх народных казках. Можна меркаваць, што ў нашай сітуацыі трансляцыйную ролю выконваў бабулін ручнік.

*Па-чацвёртае*, асноўнымі колерамі на тым ручніку былі белы і чырвоны. Ці выпадковае гэта суседства? Хутчэй за ўсё не. Дастаткова ўзгадаць некаторыя публікацыі аб тэрапеўтычным уздзеянні розных колераў на псіхічны і фізічны стан чалавека, каб пераканацца ў тым, што каляровая гама ручніка далёка не выпадковая.[11]

Помню, як у дзяцінстве бабуля лячыла мне барадаўкі на

руцэ. Яна ўзяла простую *белую* нітку даўжынёй роўна 40 сантыметраў і пачала над кожнай бародаўкай завязваць вузел. Затым нітку палажыла пад слуп, на якім трымаліся вароты на гаспадарчы двор. За некалькі дзён яна перацерлася, вузлы развязаліся і бародаўкі ў адзін дзень зніклі. З таго часу прайшло 30 год, але ніводная з іх, дзякуй Богу, не з'явілася зноў. З гісторыі медыцыны вядома, што такое няпростае захворванне, як "рожа", лечыцца толькі замовамі і з выкарыстаннем тканіны *чырвонага колеру*.

*Па-пятае*, на той час фаза Месяца набліжалася да поўні. (Ніжэй будзе прыведзена даволі шмат прыкладаў, якія сведчаць аб прынцыпова важнай ролі Месяца ў жыцці і культуры беларусаў.)

*Па-шостае*, перакананы, што мы яшчэ вельмі далёка стаім ад прачытання хронаметрычных "тэкстаў" нашых ручнікоў: кожны ўзор меў сваю дакладную прымеркаванасць.[12] Магчыма, некалі мы будзем гаварыць пра сістэму жанраў ручнікоў, сімволіку іх ўзораў, паэтыку тэкстаў.

Вылучэнне аспектаў станоўчага ўздзеяння на чалавека, якія, скарэй за ўсё, факусіруюцца ў ручніку, можна было б працягваць, але паспрабуем больш глыбока зразумець ужо адзначаныя.

## МЕТАКОД СІМВОЛІКІ КОЛЕРАЎ

Пераважная большасць даследчыкаў гісторыі беларускай культуры пагаджаецца, што архаічнымі, найбольш старажытнымі колерамі беларускага ручніка былі *белы* (шэры) і *чырвоны* (або светла-карычневы). Як гэта не дзіўна, але пры ўсім разнаквецці нашага ландшафту, пры ўсёй яго стракатасці і часавай зменлівасці, пачынаючы ад веснавой кіпені садоў і заканчваючы барвамі восеньскага лесу, асноўнымі колерамі адзення і розных саматканых атрыбутаў упрыгожвання хаты сталі толькі два: белы (дамінуючы колер садоў падчас іх пераходу ад зімовага спакою да летняй аксамітавай перанасычанасці) і чырвоны (наадварот, апошні мажорны ўсплеск шыракалістых дрэў напярэдадні зімовага спачывання). Так, посцілкі былі і зялёнымі, і карычневымі, і чорнымі, але ж асаблівую эстэтыку святочнай урачыстасці стварала толькі бель, шчодра ўсыпаная зорамі чырвані. І гэта зусім не выпадкова. Тонкае адчуванне прасторы і бездакорнае валоданне стылістыкай святочнай імпрэзы, пабудаванай на энергетыцы эмацыянальнай узрушанасці, узбуджанасці, дапамагалі нашым продкам зрабіць дакладны выбар.

Як мала пакуль што мы ведаем пра структуру космасу сялянскай хаты, яе функцыянальныя (у будзённым і святочным значэнні) зоны, пра арыентацыю сцен і вокнаў, выбар месца і аптымальныя памеры, пра паралельнасць яе асноўных сілавых ліній і знакавую скіраванасць агульнарадавых сувязей, архітэктоніку гарызонтаў і міфалогію вертыкальных узроўняў.

Аказваецца, адну з галоўных жыццёва важных праблем упарадкаванасці прасторы хаты — па магчымасці ўраўнаважыць светлавую насычанасць розных яе куткоў — нашы продкі вырашалі якраз спалучэннем белага і чырвонага колераў. Уявіце сабе звычайны вясковы дом. Невысокая столь, тры (пазней пяць) невялічкія акны (каб было лягчэй захоўваць цяпло ўзімку), прычым адно (два) ад вуліцы і два (тры) ад двара. Сцяна, уздоўж якой стаялі печ і ложкі, была "глухая", без вокнаў. Натуральна, што зімовымі днямі і бясконцымі вечарамі гэта была самая цёмная частка хаты. Каб нейкім чынам насыціць яе святлом і было знойдзена бездакорнае канструктыўнае рашэнне: ложкі засціляліся адбеленымі саматканымі пасцілкамі, аздабляліся знізу шыкоўнымі вязанымі падзорнікамі, зверху ляжала "гара" расшытых белых падушак. Такім чынам ствараўся суцэльны белы экран, які роўна асвятляў самую прыцемненую частку хаты. А на гэтай белі выразна і лёгка "чыталіся" чырвоныя сімвалы арнаменту: зоры, крыжы, ромбы.

Гэта агульны малюнак каляровага аздаблення прасторы хаты. А як жа кожны з гэтых колераў быў знітаваны з абрадавымі структурамі, у якіх рытуальных кантэкстах яны ўжываліся і якую знакава-сімвалічную ролю выконвалі? Узгадаем шэраг рытуальных сітуацый, дзе дамінуючым выступае той ці іншы колер.

Некалькі год таму на старонках вядучых рэспубліканскіх выданняў культуралагічна-гуманітарнага накірунку быў надрукаваны шэраг артыкулаў, прысвечаных расшыфроўцы кода нашых найважнейшых дзяржаўных сімвалаў. Былі зроблены змястоўныя і нетрывіяльныя захады вывесці нашу сімволіку (перш за ўсё яе каляровую паліфанію) з глыбіняў індаеўрапейскай агульнасці: аналізаваліся сюжэтна-кантэкстуальныя сітуацыі галоўных помнікаў фальклорна-эпічнай і ведыйскай літаратуры Індыі "Махабхарата", "Рамаяна", "Упанішады"[13]. У якасці надзейнага факталагічнага грунту тых даследаванняў выступалі некаторыя славянскія міфалагемы або культуралагемы хрысціянскай спадчыны. Аднак незразумела, чаму па-за ўвагай аўтараў тых публікацый засталося самае блізкае і надзейнае: цудоўныя вырабы нашага ткацтва, напоўненыя

жывінкаю ў-*Зор*-аў (адбіткам малюнкаў неба — *зор*) геаметрычнага і раслiннага арнаменту, наша бязмежная вусна-паэтычная спадчына, абрады, рытуалы, звычаі, прыкметы, народная медыцына з яе неад'емнай кампанентай — замовамі.

Структурная і гістарычная лінгвістыка назапасіла на сённяшні дзень найбольшы вопыт параўнальных даследаванняў, з якога вынікае, што беларускі лексічны фонд захаваў бадай адзін з самых старажытных сярод славянскіх моў пласт светаўспрымання, светаадчування і светаадлюстравання, а таму ў ёй можна лёгка адшукаць санскрыцкія карані-адпаведнікі. З гэтага вынікае, што зварот да старажытнаіндыйскіх літаратурных крыніц з'яўляецца лагічным і абгрунтаваным. І ўсё ж за гэтым гісторыка-культурным экскурсам бачыцца не толькі жаданне знайсці надзейнае апірышча ў глыбінях вытокаў, але і пэўны недавер да ўласнага этнічнага матэрыялу (а недавер гэты, як вядома, трымаецца на масавай свядомасці нігілізму, фарміраваннем якой займаліся ўладныя структуры на працягу трох апошніх стагоддзяў і асабліва ў другой палове 20 ст.). А таму паспрабуем падысці і да вырашэння гэтай праблемы з другога боку, напрыклад, шляхам сістэматызацыі беларускага фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу, а затым ужо пошуку адпаведных паралеляў у славянскай і суседніх з ёю культурных традыцыях.

На сустрэчах з настаўнікамі-гісторыкамі і філолагамі мне часта даводзіцца абмяркоўваць праблему паходжання і тлумачэння зместу асноўных беларускіх дзяржаўных сімвалаў розных гістарычных перыядаў. Калі ж гаворка заходзіць пра бел-чырвона-белы сцяг, то пераважная большасць настаўнікаў узгадвае спрошчанае (разлічанае на ўспрыманне школьнікамі малодшага ўзросту) тлумачэнне, запазычанае з напаўлітаратурнай легенды з добра вядомым сюжэтам. Вось як яго перадае В.Вячорка ў брашуры "Пра герб і сцяг":

"Быццам жыў на Беларусі разумны і мужны князь, якога шанаваў народ і баяліся ворагі. Калі ж нападалі чужынцы — смела ішоў у бой, сам ваяваў ды іншымі камандаваў так, што непрыяцель у жаху ўцякаў. Ды неяк у сечы князя паранілі: чужы рыцар мечам рассек яму лоб. Верныя сябры вынеслі князя з поля бітвы і перавязалі рану белым палатном. Але беларускія рыцары, застаўшыся без любімага князя, пачалі адступаць. І тады паранены князь падняўся, зняў павязку з ілба і разгарнуў яе над галавой, быццам сцяг... Разгорнутая белая павязка з чырвонай паласой пасярэдзіне стала знакам мужнасці, стала сцягам..."[14]

Гэта легенда трапіла ў падручнікі па гісторыі Беларусі і стала аксіяматычным фактам, які моцна ўплывае на фарміра-

ванне стэрэатыпаў масавай свядомасці, што па сутнасці зразумела і знаходзіць адпаведнае тлумачэнне. Пачатковы этап фарміравання суверэннай дзяржавы заўсёды патрабаваў пошуку або стварэння міфа ці прыгожай легенды, змест якіх быў бы напоўнены духам гераізацыі. Менавіта гэты прынцып ляжаў у аснове ўсіх колішніх падручнікаў па гісторыі Расіі і Савецкага Саюза.

Разам з тым мне ўяўляецца, што звядзенне ўсіх фактараў, якія б спрыялі расшыфроўцы нацыянальнай сімволікі, толькі да аднаго (няхай і меўшага месца ў гісторыі народа), усё ж непазбежна збядняе змест сімвала і спрошчвае яго сэнсавае напаўненне. Ніжэй я паспрабую ўзгадаць шматлікія рытуальныя кантэксты спалучэння або паасобнага ўжывання ў духоўнай культуры беларусаў чырвонага і белага колераў і на аснове рада культуралагічных фактараў даць сваю трактоўку іх кода.

## Белы колер у рытуалах беларусаў

Знаёмства са шматлікімі рытуальнымі сітуацыямі пераканаўча сведчыць аб тым, што *белы* колер прадстаўлены практычна ва ўсіх абрадавых комплексах, звязаных з асноўнымі этапамі жыцця кожнага чалавека, кожнай сям'і, усяго роду. Пакуль узгадаем толькі ключавыя моманты народзінаў, вяселля і рытуалаў, звязаных са смерцю чалавека і вызначаючых паводзіны суродзічаў у яго пасляпасмяротны час.

1.1. У асяроддзі беларусаў лічылася, што падчас *нараджэння* дзіцяці жанчына становіцца небяспечнай істотай, якая мае сувязь з "тым" светам і можа нашкодзіць дамачадцам. Гэта акалічнасць вымагала, каб народзіны адбываліся не ў жылым пакоі (у хаце), а ў лазні[15]. (Можа таму яшчэ і сёння мы прытрымліваемся гэтай традыцыі і адвозім цяжарных жанчын у спецыяльную ўстанову — радзільны дом.) Першы "кантакт" нованароджанага адбываўся менавіта з шэрым (белым, адбеленым) ручніком. Бабка-павітуха клала немаўля ў гэтую цёплую і мяккую лодку-калыску і несла да ночваў, каб змыць сляды жыцця на "тым" свеце і пераходу ў гэты.

1.2. Паслярадавы перыяд і жыццё немаўля да года таксама суправаджаліся шэрагам прадпісанняў, абмежаванняў, забаронаў, цікавых рытуалаў і твораў вуснай паэзіі. Адным з важнейшых момантаў было першае рытуальнае *купанне* дзіцяці і яго нарачэнне. Выконвала гэты абрад *родная бабуля* ці бабка-павітуха. Пасля купання яна *спавівала дзіця ў белую пялёнку*, а затым туга перавязвала тонка браным ручніком.[16]

1.3. Чарговым адказным этапам у жыцці чалавека (калі мець на ўвазе шлях ад нараджэння да смерці) было вяселле. Кожнае вясельнае абрадавае дзеянне зноў-такі ўпрыгожвалася ручнікамі (іх было ад 24 да 40). Але на працягу ўсяго шматдзённага святкавання былі два кульмінацыйныя моманты: вянчанне і дзяльба каравая, якія таксама не абыходзіліся без ручнікоў.

Падчас *вянчання* ў храме маладыя стаялі поруч на *белай частцы* чырвона-бела-чырвонага ручніка.




Вясельны *каравай* "плыў" з каморы ў хату да чырвонага кута на высока ўзнятых руках свата, а ляжаў ён таксама *на белай частцы* спецыяльнага ручніка.

1.4. Да нашага часу дажыла традыцыя: нявеста (калі яна цнатлівая) у першы дзень вяселля апранаецца ў *белае адзенне*, а яе галава ўпрыгожваецца *белай фатой* (вэлюмам, чапцом, вянцом).

Хутчэй за ўсё традыцыя апранання маладой у белае і паслужыла асновай другаснай метафарызацыі сімволікі гэтага колеру. Сёння ў масавай свядомасці пануе ўяўленне аб белым колеры выключна як сімвале чысціні і дзявочай цнатлівасці.[17] Але чаму ж тады першая палова вяселля на Беларусі поўніцца мінорна-сумнаватымі, тужліва-надрыўнымі песнямі-галашэннямі? Чаму гэта маці маладой, адпраўляючы доню ў дарогу, адчайна плясне рукамі і зальецца слязамі, а вясковы хор імкліва падхопіць песню, ад якой постаць маці на нейкі час быццам бы здранцвее:

Чыя гэта мамачка
У канцы століка стаіць?
Ручкамі апёршыся,
Што людскія дзевачкі,
Слёзкамі аблiўшыся.
Яны п'юць, гуляюць,
На мае дзіцятка
*Бела лунь* пала,
*Бела лунь* пала
З макавага цвету.
З макавага цвету
І не згіне да веку.[18]

1.5. Аб тым, што сям'ю напаткала гора, сведчылі адпаведныя дзеянні людзей і спецыяльныя рытуальныя знакі, атрыбуты. Так, пасля смерці мужа жонка выбягала ў двор або на

вуліцу і пачынала *галасіць*[19]. Навошта гэта рабілася? Галашэнне было гукавым рытуальным знакам (як, напрыклад, перазвон у храме, ружэйныя залпы, сучаснае выкарыстанне духавых інструментаў), знакам бяды, які аблятаў усё наваколле і нёс гаротную вестку суродзічам і аднавяскоўцам.

Галашэнне не магло працягвацца бясконца, таму недзе праз гадзіну яго змяняў другі рытуальны знак: *белы* ручнік, накінуты на акно ад вуліцы.[20]

1.6. У апошнія дзесяцігоддзі традыцыя закрываць люстэркі (калі ў хаце нехта памёр) атрымала лагічны працяг. У кватэрах гараджан з'явіліся тэлевізары, камп'ютэры, залы сталі ўпрыгожваць бліскучай паліраванай мэбляй, таму сёння абачлівыя гаспадыні занавешваюць *белым* покрывам ўсё тое, што можа адлюстроўваць, даваць адбітак, паказваць выяву смерці.

1.7. Пасля таго як нябожчыка памыюць, яго клалі на лаву: *мужчын справа* ад уваходу, уздоўж сцяны ад двара, *жанчын злева*, уздоўж сцяны ад вуліцы. Над памёршым да сцяны мацаваўся спецыяльны белы ручнік.[21].

1.8. *Белы колер* прысутнічаў і ва ўпрыгожванні труны і ўбранні нябожчыка. Звычайна жанчыны рыхтавалі сабе "на смерць" адзенне загадзя. Яно цалкам паўтарала святочны абрадавы строй. Гэта было далёка не выпадковай з'явай. Калі свайго жывога суродзіча дзе-небудзь у далёкай старонцы мы пазнаём па гаворцы, яе інтанацыйнай афарбоўцы, дыялектным разнагалоссі, нейкіх найбольш тыповых слоўцах, то нашы дзяды-продкі "пазнавалі" памёршага суродзіча па "мове" ўзораў адзення: непаўторных строях, адпаведнай каляровай гаме, спецыфічным арнаментальным аздабленні, пэўных сямейнарадавых знаках-сімвалах, па іх мудрагелістых камбінацыях і спалучэннях.[22]

Вядомая беларуская паэтка Раіса Баравікова расказала мне пра такі выпадак. Паміраў яе бацька. За некалькі хвілін да смерці ён пачаў прасіць жонку, якая сядзела побач з ім, стрэсці смецце з грудзей і ўжо ў беспрытомнасці працягваў рабіць рукамі жэсты, нагадваючыя гэта перадсмяротнае ачышчэнне. Затым быў працяглы ўздых і, нарэшце, з глыбіні грудзей вырвалася апошняе слова — "Мама!". Яго інтанацыйнае адценне нагадвала ці то нечаканае здзіўленне, ці то шчырае задавальненне, якое мы перажываем пры нечаканай сустрэчы з самым блізкім чалавекам пасля доўгай разлукі.

Што ж азначала гэта апошняе слова? На мой погляд, толькі адну звычайную жыццёва-касмічную заканамернасць:

"Мама!" — гэта першае слова, якое свядома пачынае гаварыць чалавек на гэтым свеце. І гэта невыпадкова. Мудрая прырода словамі новай жывой істоты дзякуе

таму, хто дае жыццё, хто падтрымлівае яго бесперапыннасць.

"Мама!" — апошняе слова-развітанне з гэтым светам і магчыма зноў-такі першае пры пераходзе ў свет Вечнасці.

"Мама!" — гэта той чалавек, які дае параўнальна непрацяглае жыццё, а затым павядзе за руку і ў бясконцыя прасторы Су(межнага) — свету.

Вось у гэты адказны час, час пераходу з адных каардынат існавання ў іншыя, *лодка-труна* (дамавіна) і *сам нябожчык* былі *ўпрыгожаны белым покрывам*. Звычайна *дно труны і яе абодва ўнутраныя бакі абабіваліся трыма белымі ручнікамі, а самога нябожчыка ад ног і да пояса закрывалі яшчэ адным белым ручніком* (у больш познія часы — проста белай мануфактурнай тканінай тонкага вырабу).

1.9. У старадаўнія часы па ўсёй Беларусі (а сёння толькі ў паасобных вёсках або сем'ях) *труну з нябожчыкам апускалі ў магілу на спецыяльных чырвона-бела-чырвоных ручніках*. Замест іх магло быць і звычайнае даўжэзнае палатно, якога хапала, каб двойчы прапусціць пад труной. У апошнім выпадку канцы сувоя вылучаліся больш густой шэрай таніроўкай.[23]

Раней *у асяроддзі беларусаў існавала некалькі агульнарадавых памінальных святаў*:

1.10. Вясновая *Радаўніца* (Радоніца, Радуніца), час правядзення якой вар'іраваўся ў розных рэгіёнах:

1.10.1. *Першы або другі дзень Вялікадня*;

1.10.2. *Чацвер Велікоднага тыдня* (найбольш пашыраны на Брэсцкім Палессі) атрымаў назву "Наўскі Вялікдзень", або "*Вялікдзень мёртвых*" (старажытнаславянскае "навы" — душы памёршых);

1.10.3. *Аўторак на другім паслявелікодным*, Фамінымі, *тыдні*, які часцей за ўсё і называюць Радаўніца (навуковых і навукова-папулярных версій паходжання назвы свята некалькі, але пакуль што ніводная з іх не грунтуецца на надзейных этналінгвістычных крыніцах і не адпавядае яго гісторыка-культурнаму і сакральна-этычнаму зместу).

1.11. *Траецкія Дзяды адзначаюцца ў суботу перад Тройцай* (не мелі дакладнай даты з часу прыняцця хрысціянства).

1.12. *Восеньскія, або Змітраўскія, Дзяды, Асяніны*. У асяроддзі беларускіх этнакультуролагаў няма пакуль што адзінай думкі адносна дакладнай даты правядзення гэтага свята. Этнаграфічныя крыніцы мінулага стагоддзя канстатуюць шэраг рэгіянальных тэрмінаў: 1 або 2 лістапада; першая субота лістапада; найбольш пашырана *трэцяя субота пасля Пакроваў*.

Пакровы заўсёды адзначаюцца 14 кастрычніка, *трэцяя субота* (а яе ў нас называюць "*радзіцельская*") *пасля гэтай даты*

*і з'яўляецца дакладным днём восеньскага ўшанавання продкаў.*[24]

Жорсткая прывязка Дзядоў да 2 лістапада (дата, якую зацвердзіў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь) не мае ніякіх гістарычных падстаў. Фіксацыя даты прыводзіць да чарговага культурнага парадокса эпохі сучаснага адраджэння: добра знаёмая і ўсім глыбока запалая ў падсвядомасць "*радзіцельская субота*" "паплыла" па ўсіх днях тыдня. Зразумела, што ў дадзеным выпадку народныя абраннікі *імкнуліся адначасова задаволіць прадстаўнікоў дзвюх хрысціянскіх канфесій*: *праваслаўных* (узаконіўшы для іх веснавую радаўніцу) *і католікаў* (прывязкай Восеньскіх Дзядоў да іх свята Усіх Святых). Можа, гэта і не зусім блага.

Больш таго, у народным свяце закладзена асноўная (спецыфічна беларуская) ідэя ўшанавання *сваіх* п-*Род*-каў у глыбіні, якіх толькі магла дасягаць чалавечая памяць. Ідэя хрысціянскага свята прынцыпова іншая: ушанаванне не сваіх продкаў, не ўсіх тых, хто ў розныя гістарычныя эпохі падтрымліваў і падзяляў хрысціянскія каштоўнасці, а толькі тых, хто асабліва вызначыўся ў служэнні Богу і быў аднесены да ліку святых.

У сэнсе гістарычнай эвалюцыі гэта можна лічыць заканамернай тэндэнцыяй, калі чалавек пачынае ўяўляць сябе не толькі часцінкай вось гэтага канкрэтнага Роду, а ўсяго Роду чалавечага. Але пакуль што гэта ідэя не даведзена да лагічнага завяршэння. Па-першае, сярод каталіцкага кола "ўсіх святых" няма знакамітых візантыйска-ўсходнеславянскіх прадстаўнікоў, а па-другое, ці так ужо блага захаваць *сваё* радаводнае дрэва, памяць аб *сваіх* знакамітых суродзічах. Мы ж, наадварот, ведаем гісторыю Старажытнага Рыма, Грэцыі, Індыі, сярэдневяковай Еўропы, але не ведаем гісторыю *свайго* народа. Гаворым пра агульначалавечыя каштоўнасці, маючы на ўвазе "сем цудаў свету", храмы Кітая, абсерваторыі кельтаў, ацтэкаў, інкаў, палацы Багдада, Мадрыда, храмы Кракава, Прагі, Рыгі, Вільні, Санкт-Пецярбурга, Масквы, а пры гэтым не пералічым храмы Мінска і Гродна, Гомеля і Віцебска, амаль што нічога не скажам пра культуру *свайго* народа. У свой час мы на памяць ведалі радавод Пушкіна, Лермантава, генеалогію Раманавых, нарэшце Леніна,затым крыху аднавілі больш блізкае: К.Тураўскага, Е.Полацкай... але да гэтага часу ніхто з беларусаў не выдаў кнігі пад назвай "Мой Род у гісторыі майго на-Рода" або "Мой Род і чалавецтва". Зусім не ўпэўнены, што цывілізаваным, культурным і адукаваным можна лічыць чалавека, які ведае радавод Пушкіна ці Раманавых, але не ведае *свайго*, які ўскладае кветкі да ма-

гілы Коласа, Багдановіча, Караткевіча, Адамовіча, але ні разу не наведаў магілу *свайго* дзеда, таму што... проста не ведае, дзе яна.

Так, чалавек жыве ў космасе культуры Роду—Народа—Чалавецтва, але спасціжэнне ўсяго існага, зямнога, агульначалавечага пачынаецца са *сваёй* калыскі. Перш чым прыйсці да святыняў чалавецтва — егіпецкіх пірамід, Галгофы, Труны Господняй, Кіева-Пячэрскай лаўры, Опцінскай пустыні — трэба набрацца моцы ад малака *сваёй* маці, стаць на ногі ў *сваёй* калысцы і, нарэшце, выйсці за парог *сваёй* хаты. А каб дарога была больш лёгкай, трэба атрымаць благаславенне *сваёй* бабулі і матулі. А перш чым стаць на калені і нізка схіліць галаву перад святынямі Вечнасці, трэба зрабіць гэта ж самае перад абразамі ў *сваёй* хаце, перад магілай свайго дзеда, перад алтаром *свайго* Храма.

1.13. Апошнімі (ці дакладней чарговымі) у гэтым гадавым колазвароце былі *масленічныя Дзяды*, якія святкаваліся ў суботу перад Масленіцай.

За выключэннем апошніх практычна ва ўсе астатнія памінальныя дні нашы продкі хадзілі на могілкі ўшаноўваць памёршых (вясной — на пачатку года, перад тым як распачаць сельскагаспадарчыя работы, каб заручыцца іх падтрымкай, і восенню — у знак падзякі за дапамогу). *На надмагільныя крыжы падвязваліся* адпаведныя *атрыбуты белага колеру*: фартушкі, ручнікі, вяночкі[25].

1.14. Практычна да пачатку 90-х гадоў нашага стагоддзя беларусы цвёрда прытрымліваліся яшчэ адной традыцыі. Звычайна ў *суботу* перад Вялікаднем людзі займаліся апошнімі прыгатаваннямі да найбуйнейшага гадавога свята. Сярод іх важнае месца займала фарбаванне яек у *чырвоны* колер. *Калі ж паміж сустракаемым і мінулагоднім Вялікаднем у сям'і здаралася гора — паміраў нехта з суродзічаў першага калена сваяцтва, то яйкі ў чырвоны колер не фарбавалі. Іх проста варылі і пакідалі белымі або распісвалі фарбамі сіняга, чорнага або зялёнага колеру* (хаця ў апошні колер іх фарбавалі перад "зялёнымі святкамі" — Сёмухай, Тройцай)[26]. У 1994—1996 гг. праваслаўныя святары сваімі перадсвяточнымі прамовамі ўнеслі пэўную блытаніну ў паводзіны людзей, якія зноў-такі прытрымліваліся больш старажытнай традыцыі. Яны сцвярджалі, што незалежна ад абставін сям'я павінна фарбаваць яйкі ў чырвоны колер і асвячаць іх у храме.

Давайце шырэй паглядзім на праблему і паспрабуем зразумець сутнасць пярэчання.

Век ад веку, год за годам нашы продкі жылі ў адпавед-

насці са станам прыроды, падпарадкоўваліся раўнамернаму руху сонца па небасхіле і ў адпаведнасці з яго фазамі адзначалі адны і тыя ж святы: Каляды, Масленіцу, Ярылавіцу, Купалле, Перуна, Багача... Каляндар гэты быў пастаянным і нязменным тысячагоддзямі, таму невыпадкова называўся “Коладзён” (нешта блізкае да фантастычнай па маштабах каменнай абсерваторыі Стоўхендж у Англіі). *Усе святы мелі агульнарадавы характар* з дакладным размежаваннем і рэгламентацыяй паводзін старэйшых і малодшых, жанчын і мужчын, хлопцаў і дзяўчат, дзяцей. У залежнасці ад часу правядзення свята кожная з гэтых сацыяльна-ўзроставых груп дамініравала ў развіцці святочнай дзеі.

Сям’я, у якую прыходзіла бяда, тут жа *выключалася* з агульнапрынятага рытму суіснавання і *пераходзіла са звычайнага гадавога кола святкаванняў на спецыяльны цыкл пахавальна-памінальных трызнаў*, галоўнымі вехамі ў якім былі трацiны, дзевяцiны, саракавiны i ўгодкi.




Пасля таго як быў адзначаны заключны ў гадавым пасмяротным памінальным цыкле рытуальны стол, з сям’і здымаліся ўсялякія абмежаванні і яна зноў вярталася ў вір агульнарадавых святаў.

Цяпер уявім такую сітуацыю: за некалькі месяцаў або дзён да Вялікадня сям’ю напаткала гора. Яе паводзіны тут жа пачынала вызначаць сістэма рытуалаў памінальнага характару, якая ў цэлым блізка нагадвала рэгламентацыі хрысціянскіх пастоў: стрыманыя паводзіны, адзенне строгіх колераў, забарона спяваць, весяліцца, танчыць. Цяжка ўявіць, што члены гэтай сям’і будуць утульна адчуваць сябе за шматгалосым велікодным сталом у час асвячэння страў святочнай трапезы і што іх чорнае адзенне будзе гарманіраваць з

расквечанымі вопраткамі ўсіх астатніх вернікаў. Яшчэ цяжэй паверць у тое, што гэтыя людзі са шчырай радасцю, звонка-раскаціста разам з усімі прысутнымі тройчы выгукнуць: "Сапраўды ўваскрэсе!" — у адказ на радасны воклiч: "Хрыстос васкрэсе!"

Шкада, што асобныя святары, дасканала ведаючы культурную традыцыю візантыйскага або рымскага хрысціянства, не суадносяць свае словы і ўчынкі з мясцовымі традыцыямі, не ўлічваць якія ніхто не мае права, займаючыся вельмі тонкай і далікатнай справай.

Увесь шэраг этнакультурных атрыбутаў і рытуальных кантэкстаў іх ужывання, пра якія гаварылася вышэй, дазваляе трактаваць белы колер як сімвал смутку, жалобы, гора, смерці, трансфармацыі, *пераходу* ў іншы стан, сімвал дарогі з аднаго свету ў іншы.[27] У міфалагічным сэнсе слова — гэта сімвал бязмежнасці, *вечнасці* Сусвету. Адпаведную трактоўку пацвярджаюць шматлікія фальклорныя жанры: казкі, замовы, паданні, абрадавая лірыка, вясельныя і пахавальныя галашэнні. Напрыклад, у цэлым шэрагу ўсходнеславянскіх чарадзейных казак ("Смерць-кума" і інш.) Смерць апранута ў адзенне белага колеру і трымае касу ў руках. Такую ж выяву яна мае і ў народных драмах ("Цар Ірад"). Ці не на аснове гэтых міфалагічных уяўленняў узнік выраз: "Бачыў я цябе ў дамавіне ў белых тапачках".

Добра вядома, што ў многіх еўрапейскіх і азіяцкіх народаў асаблівай павагай карысталіся жывёлы белага колеру. Так, у Шатландыі белыя каровы лічыліся першапродкамі-татэмамі, свяшчэннымі жывёламі, ад якіх пайшоў род людзей, таму іх малако забаранялася ўжываць у ежу. Культ белых жывёл да нашага часу захоўваецца ў краінах Усходу. У Сіаме — гэта белыя сланы, у афрыканскіх краінах — белыя ваўкі, на Аравійскім паўвостраве — белыя валы, у Кітаі — белыя коні. У Старажытным Егіпце любая жывёліна, якая мела белую пляму, магла быць ахвяравана багіні Ізідзе. Беларусы асаблівую пашану выказваюць "бацяну" — беламу буслу, які прыносіць з "таго" свету дзетак і "пакідае іх у капусце". У вельмі блага пакуль што даследаванай міфалогіі беларусаў адной з цэнтральных фігур быў Бела Бог, месца якога ў больш позняя часы заняў Вялес ці, магчыма, Бялес (параўн.: бялёсы).[28]

2.1. У сувязі са сказаным вышэй хочацца яшчэ раз больш уважліва прыгледзецца да арнаментаў нацыянальнага адзення, да структуры нашых саматканых ручнікоў, да кампазіцыі іх арнаменту і яго сіметрычнай перавернутасці на розных канцах.




| | | | |
|---|---|---|---|
| 1) Паглыбляем трактоўку, пашыраем, разгортваем *тэзіс:* | *чыё?* | *чыя?* | *чыё?* |
| 2) Рабочая версія: | *наша* | *наша* | *нашых дзетак* (захаванне радаводнай сувязі, пераемнасці) |
| 3) Правяраем тэзіс аксіёмнай народнай культуры: | *абодва канцы ручніка абсалютна падобны* | | |
| 4) Тады магчыма: | *"Якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын".* | | |

Але дастаткова ўявіць сабе гэты ручнік на руках матулі, якая сустракае вясельных гасцей з хлебам-соллю, як становіцца зразумелым: гэта версія зусім не падыходзіць. *Кампазіцыя арнаменту на абодвух канцах падобная, але перавернутая(!), як у люстэрку.* Міжволі прыходзяць на ўспамін шматлікія ***сітуацыі рытуальнай перавернутасці ў пахавальна-памінальнай абраднасці***: табурэткі перавярнуць, насценныя партрэты нахіліць (ці не таму да гэтага моманту існуе традыцыя ў час нацыянальнай жалобы сцягі прыспускаць і нахіляць долу), кілішак перакуліць і г.д. Гэта тыпалагічнае падабенства вымушае шукаць іншы ход думкі для тлумачэння кампазіцыі ручніка:

**ЖЫЦЦЁ** → **СМЕРЦЬ** → **ЖЫЦЦЁ**

| *наша*, тут, на гэтым свеце | *наша*, пераход у іншы свет | *наша* — пасля смерці |
|---|---|---|

Дастаткова надаць (увагнуць) ручніку форму "лодкі смерці" і стануць зразумелымі многія рытуальныя сітуацыі, у якіх фігуруе прыгожы нацыянальны атрыбут.

2.2. Чытаем акцыянальна-атрыбутыўны код рытуалу:

2.2.1. *На белай частцы ручніка труна* (смерць, *нябожчык*); *два мужчыны*, якія апускаюць труну ў магілу, *трымаюцца за чырвонае.*

2.2.2. Маладыя збіраюцца ехаць да вянца. Як толькі закончыўся гулліва-свавольны рытуал выкупу, *бацька бярэ ручнік, абвязвае ім па поясу* сваю *дачку* і *тройчы па сонцы абводзіць яе вакол стала*.

Што за абрад выконвае бацька? Каб зразумець яго сутнасць, неабходна ўспомніць, *што адбываецца ў хаце тройчы на дзень вакол стала?* Сям'я збіраецца падсілкавацца, выканаць з дапамогай малітвы ачышчальна-прадуцыравальны абрад, каб набрацца моцы на ўвесь працоўны дзень. Такім чынам, *стол быў сімвалам паяднання сям'і, яе цэласнасці, зладжанасці, узаемнай згоды, сімвалам яе духоўнай сталасці. Трохразовае хаджэнне вакол стала* магло азначаць толькі адно: *развітанне дачкі з хатай бацькоў*, са сваімі роднымі і блізкімі. Прычым важна адзначыць і такую акалічнасць, як *паяснае* (вакол жывата) *абвязванне ручніка*.

Скажам, калі сям'я спраўляла "ўлазіны" ў новую хату, то бацька па чарзе перавязваў рукі ўсім дамачадцам (гаспадарча-побытавы акцэнт) і ўводзіў-уцягваў у хату.

А цяпер удакладняем дэталі *паяснога* (эратычна-прадуцыравальны акцэнт) павязвання: *дачка аперазана белай часткай ручніка* — яна "памірае" ў статусе дачкі для гэтай сям'і і нараджаецца ў статусе гаспадыні ў іншай, новаствранай. Бацька свайго статусу не змяняе, таму трымаецца за чырвонае.

2.2.3. Лагічным працягам пераходу маладых у новае — пасляшлюбнае — жыццё з'яўляецца даволі позні па паходжанні *абрад вянчання маладых у храме, падчас якога і жаніх і нявеста стаяць зноў-такі на сярэдняй — белай — часткы ручніка*.

Дарэчы, хрысціянскі абрад вянчання заканчваецца дакладным паўторам дахрысціянскага абраду шлюбавін. Нагадаю сюжэт даволі папулярнай у славянскім свеце казкі "Кот і ліса". Хцівая ліса вырашыла стаць гаспадыняй лесу, напужаўшы звяроў нечаканым госцем — сібірскім катом, за якога яна імкнецца выйсці замуж. Працэдура рытуальнай фіксацыі факта стварэння новай сям'і была кароткай і простай: яны тройчы па сонцы абышлі высачэзную сасну — дрэва, якое сімвалізавала рытуальны цэнтр радавога космасу. Ваджэнне бацькам дачкі вакол стала ў хаце і ваджэнне маладых у храме вакол алтара (які першапачаткова ў хрысціян меў форму стала і выконваў ролю ўзвышша, на якое клалі ахвяраванні) — не што іншае, як водгук сівой мінуўшчыны.

Назіраем далей за развіццём падзей на вяселлі. Пасля вянчання маладыя прыязджаюць да дому маладога.

2.2.4. *Перад парогам хаты маці сустракала іх хлебам-соллю, які ляжыць на белай часткы ручніка*. Але ж з гісторыі

народнай культуры вядома, што хлеб сімвалізуе жыццё. У сучасных беларускіх фалькларыстычных даследаваннях дамініруе традыцыя ставіцца да сімволікі хлеба, зерня, каравая як тоеснай, аднатыповай. Зноў-такі паспрабуем прасачыць за месцам і часам ужывання гэтых атрыбутаў у беларускім вяселлі.

2.2.5. Нам патрэбна вярнуцца крыху назад і ўспомніць, як жа бацькі адпраўлялі маладых *да вянца*. На ўсёй Беларусі існаваў яшчэ адзін цікавы рытуал, у якім цэнтральнае месца належала таму ж самаму ручніку. Пасля таго як адбыўся выкуп маладой, бацька абводзіў дачку вакол стала, а затым каля печы або *каля парога хаты бацькі станавіліся ўжо ўдваіх, кожны з іх браў па бохану хлеба і загортваў яго ў чырвоныя канцы ручніка. Адной рукой яны трымалі хлеб, а другой узнымалі як мага вышэй сярэдзіну ручніка. Утваралася трыумфальная арка* (дах, небасхіл, ра-*дуга*-вясёлка, форма сімвала шчасця — падкова і г.д.), праз якую дачка-нявеста і будучы зяць адпраўляліся ў новае жыццё.

Што ў дадзеным выпадку сімвалізаваў хлеб, чаму менавіта два боханы загортваліся ў чырвоныя канцы ручніка? Ды толькі тое, што *да вянца ехалі два* (да гэтага часу паасобныя) *маладыя жыцці. У Храме Божым паяднаюць, павяжуць, абвянчаюць, звядуць у адзінае цэлае, вось таму маці і сустракала маладых* пасля вянца ўжо толькі *а д н ы м боханам хлеба*.

2.2.6. Але чаму сустрэча адбываецца перад парогам хаты? У значнай ступені кантэкст-архіў, звязаны з архетыпам парога ў славянскай міфалогіі (аб гэтым будзе асобная гаворка), дае падставы гаварыць аб тым, што *п а р о г — гэта своеасаблівая мяжа паміж мінулым і будучыняй*, гэта *зона радаводнай памяці*, мажліва, *старажытная зона пахавання продкаў*, або месца, куды закопвалі ахвяру дамавіку (часцей за ўсё — пеўня) на пачатку будаўніцтва новай хаты. Пераступіць гэту мяжу азначала толькі адно: пераход у новае жыццё, у новыя сацыяльныя адносіны, набыццё прынцыпова іншага сацыяльнага статусу.

2.2.7. Уважліва прыгледзімся яшчэ да адной дэталі і паспрабуем прааналізаваць яе праз прызму больш шырокага поля кантэкстаў. *Хлеб-соль ляжыць на сярэдняй — белай — частцы ручніка*. Чаму ж сімвал жыцця ды на полі смерці? Таму што хлеб — гэта сімвал жыцця, якое адляцела ў вы-*Рай*, якое заканчваецца, гэта знак памежжа між закончаным і распачынаючымся жыццём. Пра гэта сведчыць яшчэ адна яскравая дэталь. Як толькі маладыя павітаюцца з бацькамі (цалуючы, а не кусаючы хлеб), перад імі адкрывалася дарога ў родную хату. Першы іх крок быў сігналам прысутнай моладзі, якая тут жа

пачынала *абсыпаць жаніха і нявесту зернем жывога жыта*, каб яны прараслі ў гэтай хаце, у новай сям'і новым коласам ("колькі каласочкаў, столькі сыночкаў").

З аналагічным ужываннем гэтых сімвалаў мы сутыкаемся і ў пахавальна-памінальнай абраднасці.

*Напрыканцы рытуальнага стала*, з'арыентаванага ў чырвоны кут хаты, *клалі бохан хлеба — сімвал* прысутнасці *душы памёршага. Але ж за сталом сядзелі жывыя, якім трэба доўжыць свой радавод, таму побач з боханам хлеба ставілі посуд з зернем жыта*, у які ўстаўляўся яшчэ адзін амбівалентны атрыбут — *свечка*.

Як хутка мы развітваемся са сваімі адвечнымі сімваламі. Калі *ў вёсцы* да сённяшняга часу *людзі ідуць на памінкі і нясуць з сабой бохан хлеба, міску жытнёвага зерня, у сярэдзіне якой ляжыць яйка*(!) — жывым жыць, то *ў горадзе* нарадзілася іншая традыцыя: блізкія і знаёмыя *нясуць кветкі — знак квітнеючага, юнацкага жыцця*, якія *пакідаюць на асфальт* і тут жа *растопчуць* нагамі.

У такім разе маладых сустракалі перад парогам невыпадкова. Праз спецыяльную сістэму абрадавых дзеянняў ім паказвалі, што *дашлюбнае жыццё засталося перад парогам, за ім жа пачыналася прынцыпова іншая жыццёвая дарога*.

У шматдзённым вясельным абрадзе ёсць яшчэ некалькі момантаў, дзе фігуруе не толькі белая, але і чырвоныя часткі ручніка. Гэта вымагае нас узгадаць хаця б некаторыя рытуальныя аспекты выкарыстання чырвонага колеру.

## Чырвоны колер у структуры рытуальна-абрадавых комплексаў

Найбольш значныя этапы ў жыцці чалавека (нараджэнне—вяселле—смерць) суправаджаюцца складанымі і працяглымі па часе рытуальна-абрадавымі комплексамі, структура якіх мае амбівалентны (адначасова звернуты ў мінулае і ў будучыню) характар. З аднаго боку, яны канстатуюць факт "смерці" чалавека ў яго папярэднім сацыяльным статусе, а з другога — выкананне пэўнага рытуалу дазваляе яго ўдзельніку выйсці з лімінальнай (Ван Генеп), пераходнай зоны (зоны смерці-перараджэння) і атрымаць прынцыпова іншы грамадскі статус.

Прывяду толькі некаторыя прыклады ўзаемаспалучэння або рытуальнага супрацьпастаўлення атрыбутаў *чырвонага* колеру вышэйзгаданым атрыбутам *белага* колеру:

3.1. Каб не дапусціць да парадзіхі злых духаў, а таксама каб папярэдзіць родавыя пашкоджанні, праз яе перакідвалі

чырвоную нітку, якая выконвала ролю магічна-ахоўнага сродку[29].

3.2. Пасля першага — рытуальнага — купання дзіця туга спавівалі ў белае, а затым перавязвалі чырвонай паскай (спецыяльным саматканым поясам, які перадаваўся ад пакалення да пакалення і зноў-такі выконваў ролю паяднання сям'і і найперш — дзетак).

3.3. Адным з галоўных атрыбутаў беларускага вясельнага абраду быў каравай, які сімвалізаваў жыццесцвярджальнае радавое адзінства, пачатак новага жыццёвага цыкла ў бясконцым радаводным ланцужку. Вясельныя песні, што гучалі падчас прыгатавання каравая і асабліва ў той момант, калі яго даставалі з печы, засяроджвалі ўвагу на ідэалізаванай характарыстыцы жанчын-каравайніц; далей у адпаведнасці з прынцыпам псіхалагічнага паралелізму гэтыя ж якасці пераносіліся на каравай, які быццам бы мадэліраваў і праграміраваў шкалу каштоўнасцей і духоўную арыентацыю мікракосмасу будучай сям'і. Часцей за ўсё асноўным колерам, які характарызаваў сэнсава-змястоўны аспект каравая, быў *чырвоны*:

Ой, харошы каравай, харошы,
Знаю, яго харошыя рабілі.
Ой, удалы каравай, удалы,
Знаю, яго ўдалыя рабілі.
Ой, *чырвоны* каравай, *чырвоны*,
Знаю, яго *чырвоныя* рабілі.[30]

3.4. На Палессі захавалася старажытная форма ўпрыгожвання каравая "шышачкамі" (сімвалам эратычнага пачатку і адначасова элементам вянчання мадэлі сусвету), а зверху яшчэ і *чырвонымі* стужкамі. Апошнім часам дзякуючы міграцыйным працэсам і сродкам масавай інфармацыі ўсё большае пашырэнне набывае трохузроўневы каравай: *ніжняя* (самая шырокая) *частка сімвалізуе Род, сярэдняя* (меншая) — *сям'ю*. Заканчваецца кампазіцыя *парай "галубкоў"* (сімвал маладых), *якія "сядзяць" павернутыя адзін да аднаго, дзюбачкай да дзюбачкі* (а сёння мы бачым мерседэсы, упрыгожаныя нежывымі гусямі, якія замацаваны паралельна). Вось гэтыя птушачкі таксама перавязваюцца *чырвонымі стужкамі (васьмёркай)* — знакам вечнасці, бясконцасці.

Калі пачыналі дзяліць каравай і адорваць маладых адзеннем, палатном, бялізнай, грошамі і жывёлай, то першай да маладых падыходзіла маці і дарыла чырвоны андарак.[31]

У асобных мясцінах Брэстчыны напрыканцы вяселля нявеста мясіла цеста для асобнага каравая. Пакуль яно падыходзіла, дзяжа была накрыта чырвоным поясам[32].

Першую шлюбную ноч маладыя праводзілі ў стадоле. Дружка ішоў наперад і рассцілаў на таку некалькі снапоў, накрываў іх *белым радном*, укладваўся на іх сам. Затым моладзь прыводзіла ў стадолу маладых. Але дружка не саступаў ім месца да таго часу, пакуль "нявеста не абдорыць яго чырвоным поясам сваёй работы на некалькі локцяў даўжыні"[33].

3.5. На другі дзень вяселля нявеста абавязкова пераапраналася ў іншае адзенне (ужо не ведаючы і не разумеючы сэнсу спрадвечнага рытуалу, нашы сучасніцы таксама робяць гэта), у якім асноўную знакавую функцыю выконваў сімволіка-арнаментальны "тэкст" *чырвонага* колеру.

3.6. Нарэшце *на белых фартушках*, што развешваліся ў памінальныя дні на крыжах, *нашываліся* невялічкія *чырвоныя крыжыкі*.

3.7. Засцерагальна-прадуцыравальную ролю выконваюць атрыбуты *чырвонага* колеру ў народных замовах. Напрыклад, у замове ад хваробы вачэй чытаем: "А ў нядзельку раненька яшчэ сонца не ўсходзіць, сам Госпад па небу ходзіць, тры кролікі водзіць. На *сінім* едзе, *белым* паганяе, а *чырвоненькім ды харошанькім* з вочка боль зганяе"[34]. З кантэксту замовы вынікае, што менавіта "чырвоненькі-харошанькі" не толькі адганяе хваробу, але і вяртае воку здольнасць добра бачыць.

3.8. Але як ні ўзгадаць той факт, што па ўсёй Беларусі літаральна рассыпаны населеныя пункты ці нейкія ландшафтныя мясціны пад назвай Чырвоная (Красная) гара (горка). Паходжанне іх хутчэй за ўсё звязана са старажытнымі мясцінамі правядзення агульнарадавых святочных рытуалаў прадуцыравальна-магічнага і эратычна-шлюбнага характару. А чаму менавіта "чырвоная"? З аднаго боку, таму што абрады каляндарнага цыкла былі скіраваны на паляпшэнне дабрабыту і адначасова на захаванне і працяг роду. З другога — узгорак сапраўды палаў чырванню рытуальнага вогнішча і строяў удзельнікаў народных абрадаў. Гэтаксама як і чырвоны кут у хаце, дзе зноў-такі на абразах і ручніках дамінiраваў чырвоны колер.

## КОЛЕР ЖЫЦЦЯ — АБЯРЭГ НАШАГА РОДУ

Чырвоны колер шырока выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне. Напрыклад, народныя лекары мінулага стагоддзя давалі параду, як пазбавіцца барадавак. Трэба было ўзяць цыбуліну, пацерці ёю ўсе барадаўкі, затым закруціць цыбулю ў чырвоную анучку і схаваць у гной.

Вельмі моцным абярэгам лічацца галінкі рабіны. Адзін з экстрасэнсаў раіў мне: каб ніхто не ўкраў сумачку жонкі або

мой дыпламат, каб ніколі не здарылася аварыя ў дарозе, трэба заўсёды з сабою насіць некалькі невялічкіх палачак, выразаных з галінак чырвонай рабіны. А дзве палачкі рабіны, звязаныя крыж-накрыж чырвонай ніткай і зашытыя ў крысо паліто, перасцерагаюць ад сурокаў, уздзеяння энергетычных вампіраў.

Цікавым метадам лячэння коклюшу карыстаюцца ірландцы. Яны бяруць пасмачку валасоў з галавы чалавека, які ніколі не бачыў свайго бацьку, загортваюць яе ў чырвоную хусцінку і абвязваюць шыю хворага[35].

У асяроддзі беларускіх ведуноў бытуюць замовы ад рожы. Адначасова з прамаўленнем рытуальнага тэксту лекары выкарыстоўваюць і пэўныя атрыбуты. Напрыклад, бяруць кавалак чырвонага сукна, у яго мелка крышаць крэйду або стружкі мыла; сукно добра награюць і прыкладваюць да хворага месца. Працэдуру паўтараюць некалькі разоў.

Такім чынам, ***розныя кантэксты рытуальнага ўжывання чырвонага колеру даюць падставы расшыфроўваць яго як сімвал жыццёвага пачатку***, а таксама пацвярджаюць трактоўку бінарнай апазіцыі чырвонага і белага колераў як супрацьпастаўлення жыцця і смерці. Вышэй ужо адзначалася, што велікодныя яйкі звычайна фарбуюць у чырвоны колер, што сімвалізуе ўваскрашэнне Ісуса Хрыста; аднак калі ў бягучым годзе паміраў нехта з родзічаў, то яйкі не фарбавалі.

4.1. На другі дзень вяселля, раніцай, бацькі маладых выконвалі сумесна са сватамі і дружкамі абрад *падымання маладых*. Сват браў каравай, маці поўную міску яечні і, спяваючы спецыяльную песню, ішлі будзіць маладых. “Як дружына ўвойдзе, маладыя найперш пачынаюць мыцца вадою, якую ім падае дружка; у гэты час маці маладога бярэцца аглядаць на прасцірадле “іерогліфы пачцівасці” маладой, і калі гэта спраўдзіцца, пляскае ў далоні і радасна выгуквае:

Ой, Бог нам даў, што наш Ясенько
Пачцівую Марысю ўзяў!”

Чырвоная пляма крыві на белай прасціне маладых сімвалізавала смерць жаніха і нявесты і іх нараджэнне-пераражджэнне ў якасна іншым сацыяльным статусе — мужа і жонкі.[36] Гэтую ж ідэалагему ўтрымліваюць і вясельныя (“пасадныя”) песні:

Ляцелі гусі-лебедзі церез сад,
Клікнулі маладога Іванку на пасад:
— Засцель *чырвоны* колер, то пайду,
Палажы кажух, той сяду.[37]

Калі ж прыгадаць, што якасна іншы стан нявесты-жанчыны (ужо пасля першай шлюбнай ночы) у адрозненне ад няве-

сты-дзяўчыны фіксуецца дадатковай візуальна-апазнавальнай інфармацыяй (маці мужа пасля дзяльбы каравая павяжа ёй — нявестцы — фартух, аснову кампазіцыі якога складае рытмізаванае, паслядоўнае чаргаванне пяці чырвоных і белых палосак), то ўзнікае разуменне таго, што гэты атрыбут, як і кампазіцыйна падобны каравай, сімвалізуе радаводную эстафету жыцця на фоне бясконцасці вечнасці.

4.2. Пяціўзроўневая структура фартушка далёка не выпадковая. Яна адлюстроўвала самы актуальны, мінімальна дапушчальны ланцужок жывой радаводнай сувязі, якую падтрымлівала свята Восеньскіх Дзядоў. Зыходзячы з прынцыпу пасадкі прысутных за сталом і сутнасці дзеі, дзед (Д) садзіўся на чале памінальнага стала і распачынаў для унукаў (У) свой радаводны ўспамін. Даводзячы яго як мінімум да свайго дзеда (Д). Тады схема Д $\leftarrow$ Д $\rightarrow$ У дае магчымасць лёгка зразумець, што кожны ўнук ведаў свой радавод як мінімум да пятага калена, што і зафіксавана на фартушку, які свякроў павяжа нявестцы пасля дзяльбы каравая.

З гэтага вынікае, што фартушок сімвалізаваў радаводную эстафету, прычым (гэта прынцыпова) верхняя частка і пояс, на якім трымаўся атрыбут жаночай долі, былі чырвонымі, г.зн. жывот жанчыны — улонне новага жыцця — быў экраніраваны (закрыты) чырвоным — жыццёпрадуцыравальным — фрагментам ручніка. Яго сілу ўзмацняў яшчэ адзін выключна моцны абярэг — чырвоны пояс. Менавіта таму хочацца параіць будучым матулям: на працягу ўсяго перыяду цяжарнасці разам з вамі павінен быць чырвоны пояс-абярэг (яго нельга завязваць на вузел, трэба перакінуць канцы васьмёркай).

Ахоўна-карпаганічную, прадуцыравальную ролю выконваў гэты ж пояс, калі ў сям'ю прыходзіла смерць. Як толькі паміраў нехта з блізкіх, бабуля перавязвала цяжарную чырвоным поясам, ствараючы вакол яе магічны круг, які перасцерагаў будучае дзіця.

Недакладнае (ці неўважлівае) прачытанне рытуальных сітуацый, якія характарызуюць спрадвечную традыцыю, прыводзіць да адвольнага (недапушчальна адвольнага) ужывання ключавых атрыбутаў у жыцці нашых сучаснікаў. Міжпакаленная перарванасць традыцыі правакуе непаразуменні, у аснове якіх ляжыць вядомы прынцып "чулі звон, ды не ведаюць, адкуль ён".

Яшчэ раз акцэнтую ўвагу на тым, што менавіта на другі дзень вяселля, *пасля* таго як *дзяўчына-нявеста перарадзіцца ў статусе жанчыны*-гаспадыні, да яе падыходзіла маці жаніха, здымала фату і вянок (вэлюм — сімвал непарушнасці, цнат-

лівасці) і павязвала два атрыбуты жаночай долі: хусцінку (намітку) і фартушок.

4.3. З аналагічным ужываннем гэтых узростава-статусных атрыбутаў мы сутыкаемся і ў іншай рытуальнай сітуацыі. На Радаўніцу на надмагільныя крыжы (знак роўнасці перад Богам) павязваюць адпаведныя знакі-сімвалы:

а) на магіле дзяўчыны — *белы* вянок;

б) на магіле жанчыны — *белы* фартушок (жанчына змяняла месца жыхарства, прозвішча, статус, таму іншым быў і атрыбут-маркёр);

в) атрыбутыўнай дыферэнцыяцыі "хлопчык—юнак—мужчына" хутчэй за ўсё не было (хлопец нарадзіўся ў гэтай хаце, ажаніўся тут жа, прозвішча не змяніў, таму і не мяняўся знак-маркёр): над іх магіламі ціха пялёскаліся саматканыя ручнікі. Хаця ў Мядзельскім, Бабруйскім, Смалявіцкім раёнах мне даводзілася бачыць, як на крыжах, якія стаялі над магілкамі хлопчыкаў, былі павязаны вузкія паясы.

Што ж робім мы, калі дзяўчынак — удзельніц дзетсадаўскіх або школьных фальклорна-этнаграфічных гурткоў — апранаем у рытуальныя традыцыйныя строі, абавязковым элементам якіх з'яўляюцца фартушкі (у народзе іх часта называюць "шырма"). Гэтымі самымі шырмамі адгароджвалі частку хаты, дзе спалі, ад прыхожай і зоны чырвонага кута. Ніякавата адчуваеш сябе, калі бачыш, як у некаторых гараджан над ложкам у спальні прымацавана ікона.

І наадварот, з дакладным прачытаннем сімволікі гэтых атрыбутаў сустракаемся мы, калі бачым, як на крыжах, якія стаяць пасярэдзіне або на ўскрайку вёскі і выконваюць ахоўна-засцерагальную функцыю, павязаны адначасова і ручнік, і вянок, і фартушок, таму што прызначаны перасцерагчы ўсіх жыхароў вёскі: малых і старых, дзяўчат і хлопцаў.

4.4. Таксама не магу не ўзгадаць адзін культурны пярэварацень. Яшчэ ў пасляваенны час на Беларусі жыла цудоўная традыцыя першага рытуальнага купання дзіцяці. Бабуля ласкава і асцярожна купала немаўля, кладучы ў драўляныя ночвы неабходныя атрыбуты (якія павінны былі паўплываць на лёс чалавека), спавівала поясам *чырвонага* колеру. Прычым як і нацельныя рэчы для кожнага нованароджанага, так і пояс у сям'і былі адны і тыя ж (імкнуліся яднаць усіх у адно цэлае).

Падкрэсліваю, адным і тым жа — *чырвоным* — поясам перавязвалі і хлопчыка, і дзяўчынку. А як паводзяць сябе сучасныя маладыя маці, калі іх з нованароджаным забіраюць з радзільнага дома? Запазычылі яны чужую традыцыю і перавязваюць дзяўчынак ружовымі, а хлопчыкаў блакітнымі стужкамі.

4.5. Расшыфроўка метакода чырвонага колеру паказвае ўсю недарэчнасць дзеянняў сучасных фірмаў, якія аказваюць паслугі падчас смерці чалавека. Можна бачыць, як труну звонку абабіваюць тканінай сіняга або чорнага колеру. Ні ў якім разе. Нябожчык ляжыць на фоне белага, а жывыя павінны быць экраніраваны ад смерці толькі тканінай *чырвонага* колеру.

4.6. Яшчэ адзін парадокс: чырвоныя кветкі, з якімі прыходзяць адведаць нябожчыка, звычайна кладуць у труну да яго ног. Гэта недарэчнасць. Кветкі — сімвал юнацкага жыцця, іначай кажучы — жыцця ўвогуле, таму класці іх неабходна ўздоўж труны. Гэтаксама нельга садзіць іх на магіле. Яны — знак нашай пастаяннай памяці, прысутнасці, сувязі з продкамі, сімвал-замяшчальнік. Дык хіба ж мы ходзім па магіле, стаім на ёй. Не і яшчэ раз не. Ганаровая варта жывым калідорам стаіць — і павінна стаяць — толькі ўзбоч магілы. На самой жа магіле садзяць спецыяльныя кветкі (скачкі, бяссмертнікі і г.д.).

Ніжэй хацелася б прааналізаваць яшчэ два прыклады адначасовага ўжывання двух колераў-апазіцыянераў.

4.7. Аднойчы восенню выпадкова стаў сведкам такога відовішча. На рагу вуліцы А.Кашавога і Партызанскага праспекта (што ў Мінску) ёсць ЗАГС. Бачу, як вясельная працэсія на чале з маладымі спускаецца па высокіх прыступках уніз да ўпрыгожанага картэжу машын. І — о, дзіва! Малады ўзяў маладую на рукі і панёс уніз па прыступках. Прыгожа! Але гэта зноў-такі сучасная адвольная інтэрпрэтацыя старога звычаю. У сюжэтнай дзеі беларускага вяселля быў *адзіны момант, калі малады браў маладую на рукі — каб унесці яе праз парог у сваю родную хату*.

Зноў вяжам у адзінае цэлае сімволіку зон, атрыбутаў і персанажаў. *Парог — зона смерці, зона продкаў*, таму, *каб абсалютна выключыць магчымасць нечаканага, выпадковага дотыку* да табуіраванай зоны той, якая прыйшла прадоўжыць жыццёвую эстафету, жаніх браў маладую на рукі і пераносіў праз парог. Але перад гэтым яго бабуля праз той самы парог павінна была палажыць чырвона-белы ручнік такім чынам, каб чырвоныя канцы былі перад і за парогам, а непасрэдна над парогам ляжала белая частка.

Малады станавіўся на чырвонае поле (жыццё юнацкае), браў маладую на рукі (жыццё дзявоцкае), пераносіў яе над недатыкальнай зонай і станавіўся на процілеглае поле чырвані (новае мужчынскае — жаночае жыццё). Усё! Публічны, у прысутнасці радні і з яе згоды пераход у новае жыццё заканчваецца.

Цудоўным прыкладам, які яскрава ілюструе ролю ручніка як пасрэдніка паміж гэтым і “тым” светам, з’яўляецца бела-



Жанчыны ў нацыянальных строях. Гомельскі рэгіён.

руская народная казка, якую ў канцы 19 ст. запісаў вядомы фалькларыст М.Федароўскі ў в. Краснае Сяло Ваўкавыскага раёна. Казачны сюжэт пачынаецца з таго, што тры каралеўскія дачкі хадзілі ў лес па ягады. І кожны дзень нечакана налятала хмара, на якой сядзеў змей. Няпрошаны госць хапаў адну з дзяўчат і забіраў з сабою. Калі не стала трэцяй дачкі, сын караля вырашыў пайсці шукаць сваіх сясцёр. Кароль даў яму ў дарогу толькі дзве рэчы: саломінку і ручнік. Далей казка распавядае: "Ідзе, так ідзе (каралевіч), аж стаіць рэчка, так ён палажыў саломінку, паверх ручніка і па том, як па мосце, перайшоў шчасліва".

4.8. Пасля таго як маладыя пераступілі праз зону продкаў, яны *па сонцы* (злева направа) ідуць у *чырвоны кут* (зона гаспадароў) хаты і садзяцца там пад абразамі. І тут усё невыпадкова. Ікона — сімвал вечнасці — абавязкова пакрыта ручніком, арнамент якога мае тую ж самую трохчастковую кампазіцыю. Зноў глядзім уважліва: *сімвал вечнасці* пакрыты *белым полем вечнасці*, ніжэй звісаюць палаючыя чырвоныя канцы, на якіх вышыты маладыя пеўні. Тая ж "трыумфальная арка вечнасці" (падкова шчасця) звязвае "маладых пеўняў", якім доўжыць справу бацькоў у гэтай хаце!

4.9. Хачу звярнуць увагу яшчэ на адну акалічнасць: белае рытуальнае адзенне беларускіх жанчын было расшыта чырвоным арнаментам іменна ў зонах-разрывах, праз якія магло быць нанесена энергетычнае пашкоджанне. І тады ўсе гэтыя зоны (рукавы, разрэз для галавы, пройма, пояс, ніз спадніцы і жыццядайная зона грудзей) былі экраніраваны чырвонымі магічнымі знакамі-абярэгамі.

4.10. У рэчышчы гэтага прачытання арнаменту рытуальных ручнікоў ляжыць выкарыстанне іх у пахавальным абрадзе. Труну з нябожчыкам апускаюць у магілу на адным даўжэнным белым палатне (двойчы працягнутым пад труной) або на двух чырвона-бела-чырвоных ручніках. Атрымліваецца форма перавернутай аркі — “лодка смерці” (добра вядомая па мастацкіх выявах у культурах розных народаў свету), на якой нябожчыка адпраўлялі (перапраўлялі) на “той” свет.

Расшыфроўваем змест выкарыстання ручніка і ў гэтай абрадавай сітуацыі: *на белым полі ляжыць труна* (нябожчык, смерць), а мужчыны (*жывыя*), якія паціху апускаюць яе ў магілу, трымаюцца за *чырвоныя канцы* ручніка.

4.11. У сувязі з гэтым жаданне нашых сучаснікаў-гараджан перавязваць сватоў такімі ж па кампазіцыі ручнікамі ўяўляецца парадаксальным непаразуменнем. Недаравальнае свавольства: сват — не дачка, якая змяняе статус, і не нябожчык, які пераходзіць у іншае жыццё. Яго роля на вяселлі ўсім добра вядома: сёння заручыць адну пару, заўтра пажаніць другую, праз тыдзень кіраваць складаным спектаклем у хаце іншых суседзяў-аднавяскоўцаў. Гэты яго клопат даволі выразна закадзіраваны ў пабудове спецыяльнага ручніка: на ўсім працягу ён правінен быць расшыты (вытканы) дакладна рытмізаванымі паласкамі чырвонага колеру накшталт радаводнага фартушка жанчыны. Кожная чарговая палоска сімвалізуе новую сям’ю, новую заручоную пару. Прычым ёсць ручнікі, на якіх палоскі ўпрыгожаны трохкутнікамі, вяршыні (“дзюбачкі”) якіх скіраваны адна да адной: ▽ = мужчынскі пачатак, △ = жаночы пачатак (як у тых птушачак на вясельным караваі). І толькі ў першую шлюбную ноч яны ўтвораць зусім іншую кампазіцыю: павернуцца асновай да асновы і ўтвораць *ромб — сімвал жыцця, пасярэдзіне якога будзе кропля, з якой гэта жыццё пачынаецца*.

Дэталёвы аналіз шматлікіх рытуальных сітуацый, неад’емныя атрыбуты якіх былі пафарбаваны ці то ў белы, ці то ў чырвоны колер, дазваляе вывесці пэўныя агульныя заканамернасці, на якіх грунтуецца народная філасофія, эстэтыка і культура. Аднатыпнасць, семантычнае адзінства кантэкстаў у рытуалах гадавога (каляндарна-абрадавага і сямейна-бытаво-

га) цыкла даюць падставы для надзейных высноў: ***метакод мае ўніверсальны характар***.

Валодаючы такім ключом-дэшыфратарам, цяжка ўтрымацца ад спакусы даць сваю трактоўку бел-чырвона-беламу сцягу, які зусім нядоўга прабыў у якасці важнейшага дзяржаўнага сімвала. Як і фартушок (знак радавой прыналежнасці), так і сцяг (знак этнанацыянальнай супольнасці) бачацца мне фрагментамі радаводнага ланцужка, філасофія якога асэнсоўвае чалавечае жыццё як момант існавання (чырвоная паласа) на фоне бязмежнасці і недасягальнасці сусвету небыцця. Інакш кажучы, *мы ёсць не што іншае, як субстанцыя, якая ўзнікла з небыцця і, мільгануўшы знічкаю жыцця, зноў адышла ў нябыт.*




Амбівалентнасць белага колеру (г.зн. адначасовая яго скіраванасць у мінулае і ў будучыню), які агортвае з двух бакоў чырвоную паласу жыцця, дае магчымасць зразумець тоеснасць, здавалася б, разнаполюсных устойлівых словазлучэнняў: “нарадзіўся на белы свет” (а моманту нараджэння спадарожнічае кроў) і “пайшоў на той свет” (нагадаем шматлікія апісанні людзей, якія ў стане комы “ішлі” калідорам-тунэлем, у канцы якога зіхацеў іншы “свет”).

У сувязі з гэтым ёсць сэнс нагадаць і пра св. Юрыя-Ягорыя, які “прыязджае з таго свету” на белым кані, каб “адамкнуць” жыццёвы патэнцыял зямлі і адначасова “замкнуць” пашчы ваўкам і ўсякім гадам.

У гэтым сэнсе пасіянарная тэорыя этнагенезу Л.Гумілёва знаходзіць адлюстраванне і пацвярджэнне ў сімволіцы нацыянальнага атрыбуту, хоць падобнае супадзенне ў пэўнай ступені і драматызуе гістарычную перспектыву. Сімволіка ж нацыянальнага адзення і яго складаных частак будуе гэту перспектыву ў іншым ракурсе: прастора бясконцасці небыцця (*белы колер*) акаймляе жыццесцвярджальным пачаткам радавога бяссмерця (чырвоны колер). Адсюль бярэ пачатак структура і сістэма адзінага па сваёй сутнасці абрадавага комплексу прыроднай і сямейнай (сацыяльнай) накіраванасці. Узгадаем масленічныя абходы вёскі гуртам жанчын старэйшага ўзросту. Функцыя іх рытуальнага дзеяння цалкам супадае з кантэкстам сімволікі радавой атрыбутыкі: кожнае но-

вае пакаленне павінна прыняць і пранесці эстафету ў бяссмерце.

Агульныя прынцыпы кампазіцыі арнаменту ручніка даюць магчымасць лагічна і арганічна ўпісаць яго ў шырокае поле кантэкст-сітуацый іншых сфер народнай культуры. Паўторым наш асноўны тэзіс. ***Структура ўзораў ручніка складаецца з трох частак: адзін канец расшыты чырвоным полем (там ёсць белыя інтэрвалы, ёсць белае поле на самым пачатку і ўсё ж, пакуль што ўмоўна будзем лічыць яго полем чырвані). Далей працяглая белая дарога і зноў той жа чырвоны фрагмент з тым жа рытмам чаргавання.*** Усё паўтараецца з абсалютнай дакладнасцю, але наадварот, як бы перавернутае, быццам у люстэрку.

Чаму ж здарылася так, што ўзоры на абодвух канцах ручніка аказаліся адзін у адносінах да аднаго быццам перавернутымі? Якая таямніца прыхавана за гэтай асаблівасцю арнаментальнай кампазіцыі? Адказ на пастаўленыя пытанні неабходна шукаць у светапоглядных асновах славянскай міфапаэтычнай мадэлі свету, верхні гарызонт якой скіраваны да сонца і зор, а ніжні — да продкаў і хтанічнага свету зямлі. Сімвалічнай выявай мадэлі славянскай светабудовы з'яўляецца Дрэва Сусвету, у якім карані і крона роўнавялікія, але накіраваны да супрацьлеглых палюсоў. Прынцып разнаполюснай накіраванасці ляжыць у адным з ключавых законаў беларускай духоўнай культуры — законе рытуальнай перавернутасці ў духоўнай спадчыне нашых продкаў.

## ПЕРАВЕРНУТЫ КІЛІШАК НА СТАЛЕ, АБО ЗАКОН РЫТУАЛЬНАЙ ПЕРАВЕРНУТАСЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

Шырокі спектр культурных кантэкстаў, сістэматызаваных па прынцыпе бінарнай апазіцыі "жывы—нежывы", дае падставы гаварыць аб існаванні адзінай універсальнай структуры, якая ахоплівае найбольш значныя абрадава-рытуальныя комплексы духоўнай культуры беларусаў. Мы разгледзім ***прадметна-атрыбутыўны, акцыянальны*** (рытуальныя дзеянні) і ***вербальны*** (слоўны) ***коды*** ў абрадах рэпрадуктыўнага (шматдзённы, сістэмна ўпарадкаваны вясельны абрад) і прэвентыўна-папераджальнага (строга вытрыманы пахавальна-памінальны абрад) характару. Яскрава высвечваецца вельмі важная заканамернасць: кожная парадыгма разгортвае змест хра-

натопа ў адной і той жа паслядоўнасці, але з улікам культуралагічнага прынцыпу люстэркава-сіметрычнай перавернутасці.

У славянскай фалькларыстыцы і этналогіі ўжо даўно склалася традыцыя тлумачыць асноўныя рытуальныя дзеянні вясельнага і пахавальнага абрадаў як тоесных у семантычным і прагматычным сэнсах. У аснове сваёй яны скіраваны на тое, каб рытуальна зафіксаваць змены семіятычнага статусу галоўнага аб'екта абраду, які пераходзіць з "аднаго свету" ў іншы.[1] У беларускай этнакультурнай традыцыі ў адным шэрагу з вясельным і пахавальным цыкламі знаходзіцца вельмі багаты комплекс рытуальных дзеянняў, які суправаджае нараджэнне і хрышчэнне дзіцяці. Яго абрадавая структура, сакральная атрыбутыка, кола ўдзельнікаў і адна з найбагацейшых у культуры славянскіх народаў паэтычная спадчына дазваляюць абгрунтавана заняць месца побач з вышэйзгаданымі метакомплексамі лімінальнай (пераходнай з аднаго стану ў іншы) скіраванасці.[2]

Разам з тым ёсць адна акалічнасць, якая істотна ўдакладняе агульнапрынятую сістэму статусна-культурных трансфармацый чалавека з моманту яго з'яўлення з "таго" свету на гэты, пераходу ў іншы сацыябіялагічны і культурны статус падчас вяселля і далей падчас смерці. Пры супастаўленні асноўных семіятычных кодаў, якія рытуальна фіксуюць стан пераходу, высвечваецца прынцыповая універсальная структура, паасобныя коды якой маюць супрацьлеглае развіццё.

Этналінгвіст М.І.Талстой падрабязна разгледзеў прынцып люстэркава-сіметрычнай перавернутасці ў славянскім пахавальным абрадзе на прыкладзе перш за ўсё прадметна-атрыбутыўнага кода. У працэсе аналізу гэтай культуралагічнай з'явы ён абапіраўся пераважна на сербскую традыцыйную культуру і толькі фрагментарна ў яго працы фігуравалі спасылкі на архіўныя матэрыялы і экспедыцыйныя запісы, зробленыя на Беларускім Палессі.[3] Мы паспрабуем даць сістэматызаванае апісанне прынцыпу перавернутасці на аснове беларускага этнакультурнага фонду і выявіць яго дзеянне ў іншых парадыгмах рытуальна-абрадавых комплексаў.

## ПРАДМЕТНА-АТРЫБУТЫЎНЫ КОД, АБО ПЕРАВАРОЧВАННЕ ПРАДМЕТАЎ У ПАХАВАЛЬНЫМ АБРАДЗЕ

У традыцыйнай культуры беларусаў існаваў і да сённяшняга часу захаваўся цэлы шэраг дзеянняў, звязаных з перакульваннем або пераварочваннем прадметаў, якія суправа-

джаюць асноўныя этапы пахавальна-памінальных абрадаў. Зразумець сістэмаўтваральны характар перавернутасці дапамагаюць дзве паралельныя плоскасці, на адной з якіх разгортваецца вясельны абрад, а на другой — пахавальны.

*Момант надыходу смерці вызначалі па стану перавернутага люстэрка, паднесенага да вуснаў паміраючага.* Сухая паверхня сведчыла аб адсутнасці прыкмет жыцця, што патрабавала распачаць адпаведныя рытуальныя дзеянні. (У сувязі з гэтым хочацца параіць нашым жанчынам і дзяўчатам: *ніколі не пераварочвайце сваё люстэрка*, нават тое, якое знаходзіцца у пудраніцы. Жывыя ходзяць вертыкальна: ваша выява, якая надоўга застаецца ў люстэрку, пасля таго як вы паглядзеліся ў яго, павінна заставацца ("захоўвацца") толькі вертыкальнай. Нагадаю: у кожнай дамскай сумачцы з боку ёсць спецыяльная кішэня, у якую і пажадана ставіць люстэрка або пудраніцу.)

Калі смерць надыходзіла цяжка, аганізуючага чалавека пераносілі на зямлю (на падлогу), засцеленую саломай мінулагодняга ўраджаю.[4] Пры гэтым чалавека клалі галавой да дзвярэй (пераварочвалі) ці пад прамым вуглом да асноўных сілавых ліній хаты, г.зн. паралельна трэцяй — радаводнай — бэльцы[5]. Відаць, менавіта гэты акт пахавальнага абраду пакладзены ў аснову сюжэта казкі "Смерць-кума"[6].

Алгарытм перавернутасці або змена функцый атрыбута на супрацьлеглыя прагляд аліся і ў заключнай частцы пахавальнага абраду. *Памерлага выносілі з хаты ўперад нагамі*[7] і адразу ж *пераварочвалі табурэткі або лаўкі, на якіх стаяла труна*. Прычым існуюць два варыянты пераварочвання: перавярнуць абедзве табурэткі ўверх нагамі ці толькі адну і паставіць яе ніцма на другую[8]. Змест гэтага дзеяння быў адзін і той жа: не даць смерці раней за жывых "заняць" гэта месца і "забраць" яшчэ каго-небудзь з гэтай сям'і. У некаторых выпадках перш чым табурэткі перакуляць, на іх прасілі сесці таго з членаў сям'і нябожчыка, хто баяўся памёршых. Як толькі жалобная працэсія скіроўвалася да могілак, нехта са сваякоў памёршага перамешваў зерне розных сельскагаспадарчых культур так, каб тое, якое было знізу, аказалася зверху, і наадварот.

Знакам актыўнай земляробчай дзейнасці чалавека, сям'і, роду, абшчыны было засеянае поле, здольнае даць жыццё новаму жытнёваму коласу, таму невыпадкова выява ромба ў яго розных варыянтах стала адным з найважнейшых элементаў арнаменту народнага ткацтва і вышыўкі. Узвышша над магілай таксама мела форму асвоенай прасторы (прамавугольніка), аднак *структурныя гарызонты зямлі падчас засыпання магілы мяняліся месцамі. Дзёран і чарназём кідалі на дно*

*магілы, а зверху ўтваралі ўзвышак з жоўтага (белага) пяску*, у якім зерне не магло прарасці новым коласам.

Даволі нечаканую трактоўку зместу абраду пераварочвання дае святар Дзмітрый Булгакоўскі, які абапіраецца на традыцыю рэгіёну Пінскага Палесся. Ён мяркуе, што, паводле ўяўленняў мясцовых жыхароў, *душа адразу пасля смерці чалавека абмываецца ў вадзе, якая на той час ёсць у хаце*, і тым самым *робіць яе небяспечнай для ўжывання*. Каб пазбегнуць гэтага, *нехта з хатніх незадоўга да смерці хворага выліваў усю ваду на двор, а посуд*, у якім яна знаходзілася, *перакульваў уверх дном.*

На Піншчыне вядомы яшчэ адзін рытуал пераварочвання ў заключнай частцы пахавальнага абраду. За трунай звычайна неслі гаршок з вадой, якой святар крапіў магілу. Рэшткі вады вылівалі, а *гаршок пераварочвалі і клалі на магілу ў галавах*[10]. Тое ж рабілі і з місай або гліняным гаршком, у якім следам за нябожчыкам неслі палаючыя вугольчыкі. *Сані або калёсы*, на якіх везлі труну з нябожчыкам, таксама *пераварочвалі і пакідалі* ў такім стане *да саракавін побач з могілкамі* або непадалёку ад вёскі.

Пераважная большасць узгаданых рытуалаў мела папераджальны (апатрапеічны) характар. Жывыя экраніравалі смерць і праз пэўныя абрадавыя дзеянні імкнуліся пазбегнуць новых ахвяр. У структуры пахавальнай абраднасці важнае месца займаў апошні зямны шлях нябожчыка, з якім звязаны вялікі цыкл вераванняў, прыкметаў і прадказанняў, што вызначалі далейшы лёс сям'і, блізкіх або аднавяскоўцаў:

не пажадана, каб нехта ехаў або ішоў насустрач;

кепска, калі за пахавальнай працэсіяй ідзе якая-небудзь жывёліна (у гэтым выпадку нехта з мужчын выварочваў шапку і спрабаваў адагнаць яе. М.Нікіфароўскі сведчыў, што аналагічны *рытуал выварочвання шапкі* або верхняга адзення выконваў падарожнік, каб адагнаць ад сябе звера, у якога мог перакінуцца мясцовы ваўкалак)[11].

Жыхар в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна М.В. Коўчык расказаў мне некалькі былічак аб штукарствах ваўкалакаў у іх мясцовасці. Каб ператварыцца ў ваўка, чалавек ішоў у лес, выбіраў там невялікую дзялянку, убіваў у зямлю чатыры асінавыя калы (акрэсліваў рытуальную зону пераўвасаблення), станавіўся між імі і *тройчы перакульваўся назад праз галаву.* Працэдура, выкананая ў зваротным накірунку, спрыяла вяртанню ваўкалаку чалавечага аблічча.[12]

*Важную ролю прынцып перавернутасці выконваў і ў структуры першага памінальнага стала*, які звычайна рабіўся на трэці дзень пасля смерці чалавека або адразу ж пасля вяртання з могілак.

Хацелася б адзначыць вельмі важную акалічнасць: мае пастаянныя сустрэчы з дарослымі слухачамі адназначна сведчаць аб тым, што ў пасляваенны час адбылося страшэннае разбурэнне (а можа, нават і мэтанакіраванае знішчэнне) некалі вельмі моцных і трывалых традыцый святкавання вяселляў і ўшанавання памёршых суродзічаў на памінальных трызнахвячэрах. Толькі людзі сталага веку трымаюць у памяці звесткі, якія дапамагаюць аднавіць, рэканструяваць і — самае галоўнае — растлумачыць, якую форму павінны мець вясельныя і памінальныя сталы, у якім парадку і паслядоўнасці абавязаны садзіцца і сядзець за імі госці-радзіна, у адпаведнасці з якімі рытуальнымі канонамі неабходна іх сервіраваць. Аказваецца, *традыцыйная форма вясельнага стала нагадвала літару "Г", што сімвалізавала* вянчанне, *саюз*, збліжэнне, паяднанне двух родаў (нагадаю: пры пабудове новай хаты чатыры бярвёны, пакладзеныя па перыметру зруба, называліся "вянком" ці "вянцом").

Непасрэдна з гэтай культуралагемай звязана расшыфроўка зместу сну з наступным сюжэтам. З роднай хаты вываліліся два верхнія бярвёны: са сцяны ад двара і са сцяны ад вуліцы — і ляглі пасярод двара крыжам. Кут, які ўтвараюць гэтыя сцены, называецца чырвоным, або пачэсным, а таму кожная сцяна сімвалізуе род нявесты і род жаніха. Выпадзенне верхніх бярвёнаў прадказвае хуткую смерць двух сватоў — старэйшых прадстаўнікоў гэтых родаў.

У сучасных "рэстаранных" вяселлях стол звычайна ставяць літарай "П". Пры гэтым маладых садзяць на чале стала (там, дзе перакладзіна), а прадстаўнікоў кожнага роду — яе і яго — за правым і левым "крылом". Аднак у дадзеным выпадку не ўлічваецца вельмі важная акалічнасць. Госці, пасаджаныя ўздоўж вонкавага боку стала, будуць звернуты адзін да аднаго тварам (што адпавядае мэце вясельнага абраду), але ж мы садзім гасцей і ўздоўж унутранага боку стала. А гэта ўжо недарэчнасць: прадстаўнікі двух родаў будуць сядзець спінамі адзін да аднаго, як тыя пасварыўшыяся, што на суд едуць. Вось вам і вяселле, вось вам і пачатак новага жыцця заручонай пары... Як пачнеш... так і пражывеш. За прагай да багатых пачастункаў забыліся пра асноўнае: дзеля каго і дзеля чаго справу ладзілі.

Калі *вяселле яднала два роды*, то *смерць забірала прадстаўніка аднаго роду* (заставалася толькі адна палавіна сям'і). Адпаведна гэтаму *форма памінальнага стала нагадвала* літару *"І"*. Стол ставілі толькі ў адзін рад — ад чырвонага кута і да парога. Дазвалялася і ў два рады, але абавязкова без перамычкі, каб не ўтварыць літары "П".

Прычым *абрус, якім засцілалі стол* на вяселле, *на дзень нараджэння ці з нагоды юбілею, клалі* ***правым*** *бокам, а на памінальны* (на "траціны", "дзевяціны", "саракавіны", "угодкі", на Радаўніцу і Змітраўскія Дзяды) — наадварот, ***левым***. Па-рознаму клалі і прыборы: *лыжку і відэлец выемкай уверх — на вясельным стале, выемкай уніз — на памінальным* (перавернутая лыжка нагадвае заход сонца).[13]

Прынцып перавернутасці строга вытрымліваўся пры размяшчэнні гасцей за сталом падчас вяселля. Самы высокі ўзровень семіятычнасці (рытуальнай важкасці, паўсядзённа-побытавай і святочнай значнасці) у хаце заўсёды меў чырвоны кут (покуць), таму менавіта ў ім сядзелі (прычым на вывернутым кажусе) асноўныя ўдзельнікі вясельнай урачыстасці.

Варта звярнуць увагу і на такую важную дэталь: *маладыя садзіліся ў чырвоны кут не праз вугал стала*, які ў культуры сімвалізуе раздзяленне, раз'яднанне, разрыў (менавіта таму для любой урачыстасці беларусы рабілі спецыяльныя сталы даўжынёй на ўсю хату, каб не раздзяляць, не разлучаць прадстаўнікоў адной сям'і), а *на лаву, якая стаяла ўздоўж сцяны ад двара*. Гэтую рэгламентацыю трэба разумець наступным чынам: *маладая — госця*, новы чалавека, прадстаўніца іншага роду — заўсёды *прыходзіла "з вуліцы"*, *малады* — спадкаемца гэтага роду, сям'і, *гаспадар двара*, які "пераводзіў", "перакупляў", "*перацягваў*" (у рытуальна-культурным аспекце) *яе на свой бок* (двор).

*Побач з маладымі садзілі сведкаў* (дружкаў, старшых шафера і шаферку): як бы *давалі зразумець прысутным*, што *чарга браць шлюб ім. Затым* садзіліся *хросныя бацькі*. У паўсядзённым жыцці адказнасць за дзіця неслі родныя бацькі. У рытуальна акцэнтраванай сітуацыі, якая заўсёды вызначаецца асаблівым полем духоўнасці, на авансцэну святочнай дзеі выходзяць "культуралагічныя" бацькі, адметна пазначаныя статусам рытуальнасці, які рэалізуецца праз пэўныя феномены культуры — ручнікі. Прадстаўнікі кожнага роду добра ведалі хросных сваіх дзяцей і ўнукаў. А вось "госці з замосці" маглі іх не ведаць, а таму *асноўным маркёрам рытуальнай статуснасці хросных былі спецыяльныя, аздобленыя мноствам папярочных чырвоных палосак ручнікі, павязаныя праз плячо*.

Не садзіце сямейную пару, якая прыйшла да вас у госці, за рознымі сталамі, каб між імі не было ніякіх разладаў.

Дарэчы, у тым выпадку, *калі нехта з маладых быў сіратой, хросныя бацькі садзіліся побач са сваім хрэснікам*.

Следам за хроснымі рассаджваліся *радзіна маладой (уздоўж сцяны ад вуліцы) і маладога (пад вокнамі ад двара)*.

# СХЕМА ВЯСЕЛЬНАГА СТАЛА




*Прынцып пасадкі быў па ўзросце: чым далей ад чырвонага кута, тым старэй.* За асобным сталом, *бліжэй да печы* або *парога* (што зноў-такі мае вялікую сімвалічную нагрузку), *садзілі людзей сталага веку*, тых, хто фізічна ўжо не мог прадоўжыць род.

Такім чынам, адзіна правільнай формай вясельнага стала можа быць тая, калі два крылы яго сходзяцца ў чырвоным куце. У такім разе госці абодвух родаў садзяцца бокам да абразоў на покуці. Сучасныя вяселлі часцей за ўсё спраўляюцца ў сталоўках ці рэстаранах, дзе зона чырвонага кута не вызначана і не пазначана адпаведнымі сакральнымі атрыбутамі. Таму людзі знайшлі выйсце: стол пачалі ставіць вялікай літарай "П". *Маладых* садзяць на "пачэсным" месцы — *за папярэчным сталом*, а *прадстаўнікі* двух *родаў — за аднолькавымі па даўжыні сталамі*, якія прымыкаюць да стала маладых пад прамым вуглом. Калі ўлічыць, што сённяшнія вяселлі не святкуюцца, як раней, тры дні і рыхтуюцца адначасова і ў роўнай (?) ступені двума родамі, то форма стала, якая нагадвае літару "П", бачыцца прывабнай з юрыдычнага, прыймальнай з этыкетнага, этычнага боку — усё і ўсім аднолькава.

Аднак давайце больш уважліва прыгледземся да культу-

ралагічных (абрадава акцэнтаваных) аспектаў сучаснага вясельнага стала.

Жаніх, нявеста, дружкі і хросныя селі за папярэчным сталом; яе радзіна — за правым крылом; яго — за левым. Госці сядзяць адзін да аднаго тварам (цудоўна! Так і павінна быць на вяселлі!) (гл. схему: вектар 1).

Але ж мы садзім гасцей і ўздоўж *унутранага боку сталоў*. Атрымліваецца парадаксальная сітуацыя: святкуецца вяселле, якое сімвалізуе *паяднанне двух родаў*, але госці селі спінамі адзін да аднаго (вектар 2) (так ездзілі толькі "на суд"). Таму сталы ставіць літарай "П" можна, а вось як пасадзіць гасцей, трэба добра падумаць.

Зрэдку ў вялікіх залах вясельны стол ставяць у адзін доўгі рад. Маладых садзяць у сярэдзіне стала, а радзіну — па абодва бакі ад маладых. Доўгі стол — як сімвал доўгай сумеснай жыццёвай дарогі — вельмі эфектны крок, але ж гэта дарога ў вы-*Рай* і па аднаму, а не парай.

За *памінальны стол* садзіліся інакш. *На вугал стала*, з'арыентаваны ў чырвоны кут, *ставілі спецыяльны знак "прысутнасці"* таго, дзеля каго сабраліся жывыя, — *сподак і чарку для нябожчыка*, побач (*першым*), *пад абразамі, садзіўся* с а м ы с т а р ы м у ж ч ы н а, *а затым (зноў-такі па ўзросце) рассаджваліся ўсе астатнія*: ч ы м д а л е й а д ч ы р в о н а г а к у т а, т ы м м а л а д з е й. За вясельны стол — стол працягу жыцця, радаводнай эстафеты — не садзіліся самыя старыя прадстаўнікі роду. Гэты ж прынцып (толькі ў адваротным парадку) вытрымліваўся і на памінальнай вячэры.

Нормамі звычаёвага права катэгарычна забаранялася садзіць за памінальны стол членаў роду, якія не прайшлі ўсе этапы сацыялізацыі: моладзь 16—18 гадоў.

Неабходна звярнуць увагу яшчэ на адзін важны этыка-прававы нюанс пасадкі гасцей за сталом. *На вяселлі ўся* р а д н я с а д з і л а с я с я м е й н ы м і п а р а м і, *на памінках* — п а а с о б к у, дакладней, а д з і н н а с у п р а ц ь а д н а г о: *мужчыны — з правага боку*, уздоўж сцяны ад двара, *жанчыны — злева ад уваходу*, бліжэй да той часткі хаты, функцыянальна-рытуальным цэнтрам якой была печ. Такім чынам, вырашалася адна з найважнейшых маральна-этычных задач, якая ахоплівала вельмі тонкую і далікатную сферу міжасабовых, унутрысямейных адносін і мела надзвычай высокі семіятычны статус: *сям'я* — вечнае і непадзельнае ўтварэнне, арганічная і *непарушная* сацыяльная *адзінка, узрост якой вызначаецца не сумай гадоў мужа і жонкі, а часам з моманту вянчання* — кропкі адліку новага жыцця. Таму, *седзячы адзін насупраць аднаго, муж і жонка* як бы *адначасова набліжаліся*

*да абрадава важнага тарца стала, які сімвалізаваў заканчэнне жыццёвага шляху.*

У некаторых вёсках Слуцкага і Уздзенскага раёнаў да нашага часу захаваўся адзін са старажытных варыянтаў агульнарадавой трызны. Пасля таго як вып'юць трэцюю чарку гарэлкі, палова стала прыбіралася, *абрус пераварочвалі на правы бок* і старэйшыя жанчыны (ці не далёкі водгук матрыярхату?) падавалі каманду: "Пагаравалі, а цяпер спяваць будзем!" У сівой даўніне так яно і было — пачынаўся рытуал абрання і прызнання (прызначэння) новага старэйшыны роду.

Тлумачэнне бінарнай апазіцыі "правы — левы" як мужчынскага і жаночага пачатку пацвярджаецца не толькі размяшчэннем удзельнікаў рытуальнай трапезы, але і выбарам часовага месца для нябожчыка, *пакуль робяць труну. Жанчыну клалі на левую ад чырвонага кута лаву, а мужчыну — на правую.*[14]

Да цяперашняга часу захоўвае сваю актуальнасць і забарона садзіць каго-небудзь у тарцы памінальнага стала. Шматлікія тыпалагічна блізкія кантэксты дазваляюць зразумець сутнасць гэтага абрадавага табу. Звернемся да галоўных прасторава-часавых характарыстык традыцыі найбольш распаўсюджаных славянскіх варожбаў. Час дзеяння — маргінальная, пагранічная зона: заканчэнне старога года (калі здаецца, што ў прыродзе ўсё запавольвае рух, заціхае-замірае на некалькі дзён) і пачатак новага. Сутачная лакалізацыя: часцей за ўсё поўнач, гэта значыць заканчэнне аднаго і пачатак наступнага дня. Прасторавы локус (месца дзеяння): калодзеж, дзяжа, печ, акно, палонка, вядро з вадой. Спектр іх функцый у фальклорнай традыцыі добра вядомы і семантызуецца як своеасаблівы "канал сувязі" паміж светам жывых і "светам" памёршых. Тым самым каналам сувязі з'яўляецца і памінальны стол. Толькі абавязковай адкрытасцю гэтага канала падчас рытуальнага дзеяня можна растлумачыць і *неабходнасць абразаць акрайчыкі хлеба і не падаваць іх на памінальны стол.*[15] З прыходам хрысціянства ў тарцы стала, які знаходзіўся ў чырвоным куце хаты, пачалі садзіць святара або пеўчых людзей, якія як бы выконвалі пасрэдніцкую ролю паміж гэтым і "тым" светам.

Сістэматызацыя рытуалаў перакульвання прадметаў у пахавальна-памінальнай абраднасці дазваляе зразумець асаблівасць мацавання рамак з фотаздымкамі ў вясковых хатах. *Калі ў рамцы змешчаны фотакарткі жывых* суродзічаў, *то яна будзе вісець паралельна сцяне*, строга *вертыкальна* (усё жывое цягнецца да сонца, падпарадкоўваецца рытмам яго ак-

тыўнасці); *калі ж там будуць* вялікія *партрэты бабулі і дзядулі, якія даўно памерлі, то яна будзе вісець нахіленай* пад вуглом прыкладна ў 75 ° да падлогі.

У рэчышчы гэтай традыцыі можна патлумачыць прыкмету, звязаную з выццём сабакі: калі яго галава нахілена ўніз, лічыцца,што ў хуткім часе памрэ нехта з членаў сям'і.[16]

## АКЦЫЯНАЛЬНЫ КОД. ВЯСЕЛЛЕ І ПАМІНКІ: супрацьлеглая накіраванасць рытуальных дзеянняў

У размежаванні двух тыпаў рытуальнай перавернутасці ёсць пэўная ўмоўнасць. І тым не менш неабходна асобна вылучыць дзеянне, скіраванае на рытуальны аб'ект (атрыбут) з мэтай змянення яго становішча на супрацьлеглае (пераварочванне табурэткі, лаўкі, абруса, лыжкі, зерня, саней, гаршка з вадой, урны з прахам нябожчыка і г.д.), і рытуальнае дзеянне як складовы элемент працяглага абраду, як нейкі сюжэтнаўтваральны ход, у якім заняты ўдзельнікі памінальнай абраднасці.

Працягнем шэраг параўнанняў. Жывыя, як правіла, закручвалі анучы на нагах злева направа, а аборы завязвалі вузлом спераду. Нябожчыку ўсё гэта рабілася наадварот: анучы закручвалі налева, а аборы перавязвалі крыж-накрыж не спераду (як жывым), а ззаду.[17] Абутак жывым рабілі з моцнай падэшвай, бо трэба было шмат хадзіць. Для нябожчыка выбіралі белы абутак без тоўстай падэшвы — хадзіць яму ўжо не давядзецца.

*За вясельны стол галоўныя дзеючыя асобы* (маладыя і дружкі) *заходзілі толькі па сонцы, за памінальны — наадварот* (згадаем рэфрэн у пахавальных галашэннях: "закацілася яснае сонейка"), супраць ходу гадзіннікавай стрэлкі.

Найбольшай семіятычнай значнасцю вылучаўся з а к л ю ч н ы *момант вяселля*, калі *новая сям'я — малады з маладою* — практычна ўпершыню *ўставала з-за стала* і паўставала перад гасцямі ва ўсёй велічы і прыгажосці. Гэты рытуал абвяшчаў пра пачатак дзяльбы каравая — абрадавай падзякі прысутным за шанаванне і адначасова абяцанне абавязковай падтрымкі суродзічамі новай сацыяльнай адзінкі.

У сваю чаргу *памінальны стол* п а ч ы н а ў с я *рухам па крузе канона* (куцці, кашы, сыты), з якога кожны з прысутных браў сваю долю, а *заканчваўся тым, што* п е р ш ы м (!) *з-за стала ўставаў* с а м ы с т а р ы м у ж ч ы н а, *а затым* ужо *адначасова ўставалі ўсе* астатнія *госці*.

На Беларусі да сённяшніх дзён шырока бытуе звычай: *калі хто-небудзь з хатніх збіраецца ў далёкую дарогу, гаспадыня*

паперад абавязкова *зачыняе печ засланкай*, а калі той выйшаў з хаты, то *катэгарычна забараняецца месці падлогу. У той жа час дзеля таго, каб лягчэй наступіла смерць, у хаце адчынялі дзверы, вокны, юшку, а ўслед за нябожчыкам вымяталі смецце і мылі падлогу.*[18]

*Жывому чалавеку*, асабліва дзяўчыне перадшлюбнага ўзросту, *забаранялася ступаць або садзіцца на парог. Разам з тым* у некаторых раёнах Цэнтральнай і Паўднёва-Заходняй Беларусі да цяперашняга часу *існуе звычай тройчы апускаць труну з нябожчыкам на парог.*

Цікавай асаблівасцю беларускага пахавальнага абраду быў рытуал вынасу труны праз акно.[19] Затое на поўдні нашай краіны вядомы звычай уносіць праз акно нявесту, у якой першы або другі муж заўчасна памерлі.

Прывядзем яшчэ некалькі прыкладаў рытуальнай перавернутасці. *Калі ўзор на кашулі вышывалі злева направа*, трымаючы *іголку "на сябе", то навалачку для падушкі нябожчыку зашывалі справа на лева,* а *іголку* з ніткай *трымалі толькі "ад сябе".* [20] Гэтаксама *"ад сябе" — кідалі жменьку зямлі ў магілу* тыя, хто развітваўся з нябожчыкам на могілках, або ўслед пахавальнай працэсіі тыя старэйшыя жанчыны, якія хадзілі да ўскрайку вёскі, а затым вярталіся рыхтаваць памінальную вячэру.[21] У рэчышчы гэтай традыцыі *існуе звычай не чокацца на памінках* (затое гэты рытуал абавязковы для вяселля), а *таксама не прыбіраць стол на ноч.*[22] Яшчэ і цяпер на Случчыне бытуе даволі рэдкі звычай: як толькі закончыцца памінальная вячэра, прысутныя ўстаюць і на дзве-тры хвіліны садзяцца спінай да стала.

Часцей за ўсё *чырвоны кут у хаце быў з'арыентаваны на ўсход* ("на ўсход сонца"), а *арыентацыя трупапалажэння ў магіле мае "перавернуты" характар — галавой на захад.*[23]

З цягам часу дзеянне прынцыпу сіметрычнай перавернутасці было значна пашырана і атрымала не толькі рытуальна-апасродкаваны, але і сітуатыўны, побытавы, паўсядзённы характар. Напрыклад, і сёння жыве перасцярога наліваць віно "ад сябе" або левай рукой праз стол, ляжаць ніц, тварам да зямлі, дзяўчыне садзіцца на пустое перавернутае вядро (можа быць бяздзетнай), класці хлеб скарынкай уніз, апранаць бялізну левым бокам, пераварочваць фотаздымак жывога, люстэрка, раскрытую кнігу; і наадварот, сурокі ў дзяцей "здымаюць" левым бокам споднягa і прамаўленнем адпаведных замоў.

Логіка навуковай сістэматызацыі вымагае пошуку пэўнага асноватворнага прынцыпу і адпаведнага яму структуравання фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў. Аднак уласна навуковыя падыходы да даследуемай з'явы часам разбураюць наша

цэласнае ўяўленне аб тым ці іншым рытуальна-абрадавым комплексе. Таму, каб лягчэй убачыць дзеянне закону рытуальнай перавернутасці, мы яшчэ раз звернемся да сістэматызацыі фактаў, але ў аснову структуравання (упарадкавання) эмпірычнага матэрыялу пакладзем паралельнае *адначасовае разгортванне двух абрадавых комплексаў: беларускага вяселля, з аднаго боку, і пахавання і памінак — з другога.*

| № п/п | Вяселле | Пахаванне. Памінкі |
|---|---|---|
| | "Свет жывых" | "Свет жывых" у час кантактаў са смерцю |
| 1 | Маладую на вяселлі закрывалі вэлюмам, каб ніхто "не сурочыў". | "Калі нябожчык быў яшчэ ў маладых гадах, дык, кладучы яго ў труну, яму развязваюць каўнер кашулі для таго, каб удавец ці ўдава, што засталіся, хутчэй маглі зноў узяць шлюб".[24] |
| 2 | Бацькі маладой утваралі з ручніка арку перад парогам хаты, маладыя праходзілі пад ёю разам, пакланіўшыся пры гэтым парогу — далёкім продкам-ахоўнікам. | Труну з нябожчыкам апускаюць у магілу на двух ручніках, форма якіх нагадвае перавернутую арку. |
| 3 | *Маладыя едуць да вянца*: следам за імі *ніхто не стане месці ў хаце*. Гэтаксама ніхто не падмятае ў хаце, калі нехта з дамачадцаў паехаў у далёкую дарогу. | Адразу ж пасля смерці чалавека ўсе люстэркі (экраны тэлевізараў і г.д.), што ёсць у хаце або ў тым пакоі, дзе ляжыць нябожчык (і па шляху яго вынасу з гарадской кватэры), экраніруюць прасцінамі белага колеру. Як толькі з хаты вынесуць труну з нябожчыкам і павязуць на могілкі, нехта з блізкіх (суседзяў, знаёмых, сяброў) вяртаецца дамоў і пачынае прыбіраць у хаце. *Падлогу падмятаюць і вымываюць* (але смецце і ваду не выносяць з хаты да таго часу, пакуль людзі, якія бралі ўдзел у пахаванні, не вернуцца назад). |
| 4 | *Маладога*, які прыехаў выкупіць маладую, каб везці яе да вянца, *пазнаюць па вонкаваму* абліччу. | *Нябожчыка выносяць* з хаты *ўперад нагамі*. |
| 5 | Маладую садзілі на дзяжу ў час абраду "пасаду". Затым на вечка гэтай дзяжы клалі хлеб-соль, з якімі бацькі сустракалі маладых пасля вянца. | Табурэткі або лаўкі, на якіх стаяла труна з нябожчыкам, адразу ж *пераварочваюць* (ці адначасова абедзве, ці адну ставяць на другую). |
| 6 | Маладыя прыехалі дадому з-пад вянца. Бацькі суст- | Труну з нябожчыкам выносяць з хаты. Яе *тройчы апускаюць на парог*. Далёкай |

| № п/п | Вяселле | Пахаванне. Памінкі |
|---|---|---|
| | "Свет жывых" | "Свет жывых" у час кантактаў са смерцю |
| | рэлі іх *перад парогам* роднай хаты *хлебам-соллю.* Затым *малады браў нявесту на рукі і пераносіў праз парог,* каб яна абсалютна нічым не датыкнулася да зоны продкаў (смерці): ёй трэба было доўжыць род, нарадзіць шмат дзяцей, таму і абсыпалі маладых зернем жыта. | радзіне (памёршым продкам) давалі знак: сустракайце. |
| 7 | Сустракаюцца госці на вяселлі. Усе радуюцца, абдымаюцца, *прытуляюць адзін аднаго да сябе.* | Труну з нябожчыкам апусцілі ў магілу. Кожны з прысутных падыходзіць і кідае па *тры жменькі зямлі "ад сябе"* (смерць адганяюць). Яшчэ раз нагадаю: *пясок кідаюць толькі чужыя людзі і сваякі, пачынаючы з трэцяга калена. Сям'я кідае толькі грошы,* каб выкупіць магілу і заплаціць за пераправу нябожчыка на "той" свет. |
| 8 | На працягу ўсяго вяселля маладыя сядзяць *у чырвоным куце хаты,* а ён часцей за ўсё *з'арыентаваны на ўсход сонца.* | *Нябожчыка ў магіле кладуць галавой на захад,* каб яго "погляд" таксама заўсёды быў скіраваны на ўсход. У сувязі з гэтым жывым *забараняецца спаць галавой на захад.* |
| 9 | *Госці,* якія прыходзілі на вяселле, *маглі памыць рукі непасрэдна ў хаце.* | Усе *сваякі і блізкія* (хто прымаў удзел у пахаванні) вяртаюцца назад, заходзяць у двор, *мыюць рукі* (а іменна праз гэты "канал сувязі" быў кантакт з "тым" светам) *перад парогам* (пад'ездам) хаты (дома). |
| 10 | Пры падрыхтоўцы (сервіроўцы) вясельнага стала *абрус сцелюць правым бокам, лыжкі і відэльцы кладуць выемкай уверх* ◡. | На памінальным стале ўсё наадварот: *абрус сцелюць левым бокам, лыжкі і відэльцы кладуць выемкай уніз* ◠. |
| 11 | *За вясельны стол маладыя заходзяць толькі па сонцы.* | *За памінальны стол* прысутныя заходзяць у адваротным накірунку — *супраць сонца.* |
| 12 | *За вясельным сталом* захоўваецца адзіны прынцып пасадкі гасцей: побач *з жаніхом і нявестай садзіцца моладзь,* а затым па ўзросце: *чым далей ад чырвонага кута, тым старэй* (гл. схему вясельнага стала, с. 98). | За *памінальны стол* прысутныя садзяцца ў адваротным парадку: *у чырвоным куце — самыя старыя,* а *чым далей ад кута, тым маладзей.* Дзеці да 18 год і старэй (тыя, хто не стварыў сям'і і не нарадзіў хаця б аднаго дзіцяці — не прадоўжыў род) за памінальны стол не садзяцца (гл. схему памінальнага стала, с. 99). |

*Працяг*

| № п/п | Вяселле | Пахаванне. Памінкі |
|---|---|---|
| | "Свет жывых" | "Свет жывых" у час кантактаў са смерцю |
| | Расшыфруем прынцыпы пасадкі: | |
| | НЖ — *нявеста* прыйшла "з вуліцы", *жаніх* "забірае", "перацягвае" яе ў свой двор. З боку ад вуліцы маладыя садзіліся толькі тады, калі ён (жаніх) ішоў у прымы. | Таго, дзеля каго сабраліся госці, няма, тады на вугал стала, з'арыентаванага ў чырвоны кут, ставяцца "рытуальныя знакі яго прысутнасці": сподак, чарка, бохан хлеба з соллю, свечка ў шклянцы з жытам.<br>СВ — святар садзіцца на чале стала як пасрэднік паміж "тым" і гэтым светам.<br>СС — *на чале стала садзіцца самы стары сярод прысутных* (захоўваецца прынцып: "наступная чарга ваша"). Ён як бы сведчыў: я пражыў свой век, а вам яшчэ жыць ды жыць. |
| | Д — дружкі (шаферкі, шаферы): $Д_2$ яго — побач з маладым, $Д_1$ яе — побач з маладою. | 1—2—3 — тыя, хто дапамагаў капаць магілу. |
| | Ніякіх "ракіровак" (дружак мяняць месцамі) ніхто і ніколі не рабіў.<br>$X_1X_1$ — яе хросныя.<br>$X_2X_2$ — яго хросныя.<br>20—30—40 — госці селі па ўзросце, але сямейнымі парамі.<br>70—60 — самыя старыя селі за асобным сталом, бліжэй да парога. | А—Б—В — жанчыны, якія мылі нябожчыка, або пеўчыя.<br>70—60—50 — госці селі па ўзросце ў адваротным вясельнаму парадку ("не лезь паперад бацькі ў пекла"). |
| | | Застаюцца два надзвычай важныя моманты.<br>1. За памінальны стол *не пускалі дзяцей* (накрывалі асобны), а таксама *катэгарычна забаранялася садзіцца цяжарнай жанчыне*.<br>2. *За жалобны стол* трэба сесці сямейнай пары. Але ж той, *хто сядзе першым* і апынецца бліжэй да чырвонага кута, *павінен будзе* (меркавалі) *першым і пайсці з жыцця (памерці)*. Як быць? Каму сесці першым: мужу ці жонцы? І зноў у народнай культуры было знойдзена выдатнае рашэнне: *муж і жонка садзіліся адзін насупраць аднаго, праз стол*. Гэту сімволіку можна прачытаць наступным чынам: "У адзін дзень павянчаліся, у адзін дзень і пойдзем". |

| № п/п | Вяселле | Пахаванне. Памінкі |
| --- | --- | --- |
| | "Свет жывых" | "Свет жывых" у час кантактаў са смерцю |
| 13 | За маладых абавязкова *ўсе "чокаюцца"* са звонам. | За жалобнымі сталамі *ніколі не "чокаюцца"*. |
| 14 | На вяселлі першую чарку заўсёды дапіваюць да дна. | За памінальным сталом першую чарку не дапіваюць, а пасля трэцяй яе перакульваюць і ставяць на стол дном уверх. |
| 15 | *З-за вясельнага стала першымі ўстаюць маладыя.* | *З-за памінальнага стала першым устае самы стары* сярод прысутных *мужчына*, а затым усе ўдзельнікі трызны ўстаюць адначасова. |
| 16 | *Вяселле заканчваецца дзяльбой каравая.* | *Жалобны стол пачынаецца дзяльбой канона* (куцці, сыты). |
| 17 | Вясельны стол пачыналі прыбіраць *адразу ж пасля заканчэння святкавання.* | *Жалобны стол прыбіралі толькі на другі дзень.* Ноччу рэшткамі "сілкаваліся" душы продкаў, якія памерлі. |
| 18 | Кветкі маладым дораць, перадаючы з рук у рукі. | Кветкі памёршаму кладуць уздоўж труны ў нагах. |
| 19 | Рамка з фотаздымкамі жывых павінна вісець строга вертыкальна (!). | Рамка з партрэтамі памёршых заўсёды вісіць нахіленай ад сцяны Y. |
| 20 | Жывы чалавек, як правіла, анучы закручваў злева направа. | Памёршаму анучы закручвалі справа налева. |
| 21 | Калі цяжарную жанчыну адпраўляюць у раддом, то муж тройчы па сонцы абводзіць яе вакол стала. | Калі цяжарная жанчына сустрэне мужчын, якія нясуць труну, то яны апускалі дамавіну на дол, а цяжарная тройчы абыходзіла яе супраць сонца. |

# СХЕМА
# ВЯСЕЛЬНАГА СТАЛА
# (АСАБЛІВАСЦІ ПАСАДКІ ГАСЦЕЙ)




Прынцып перавернутасці ўплывае на нашы паводзіны і ў нерытуальных сітуацыях. Нагадаю толькі некаторыя забароны:

не насіце кветкі, апушчаныя “ўніз галавой”;

не кладзіце люстэрка перавернутым (уніз люстраным бокам);

не пераварочвайце канспект або кнігу (нічога з прачытанага не запомніце);

калі пякуць бліны, іх пераварочваюць; калі падаюць на стол, трэба іх перавярнуць яшчэ раз (каб ляжалі на талерцы тым бокам, якім налівалі на патэльню);

не садзіцеся на пустое перавернутае вядро;

не кладзіце хлеб акрайцам уніз;

не налівайце віно “ад сябе” (як нябожчыку);

не апранайце адзенне, вывернутае на левы бок;

не вазіце ўперад нагамі дзіця, якое спіць у калясцы;

этыкет медыкаў забараняе вывозіць (выносіць) з палаты хворага на каталцы ўперад нагамі.

І яшчэ адна заўвага. Самым моцным натуральным лікам з’яўляецца лік 9, а самай моцнай камбінацыяй — 999. Ведаю-

# СХЕМА ПАМІНАЛЬНАГА СТАЛА (АСАБЛІВАСЦІ ПАСАДКІ ГАСЦЕЙ)




чы закон перавернутасці, зразумела, чаму "сатанінскім" лічыцца лік з трох "перакуленых" дзевятак — 666. Дарэчы, вельмі цікавую з'яву можна заўважыць у рускім алфавіце. Побач стаяць тры літары, графічную аснову якіх утварае сатанінскі лік 6: "ь" — мяккі знак, "ъ" — цвёрды знак, "ы". Усе іншыя алфавіты славянскіх і неславянскіх народаў не маюць гэтай тройкі ў поўным наборы.

## ВЕРБАЛЬНЫ КОД. СУПРАЦЬЛЕГЛАСЦЬ ПАЭТЫЧНЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК У ВЯСЕЛЬНАЙ І ПАХАВАЛЬНАЙ ПАЭЗІІ

І ў першай, і ў другой парадыгме галоўнае месца ў сюжэтна-прасторавым хранатопе займалі паміраючы (памёршы) чалавек і асноўныя локусна-атрыбутыўныя маркёры яго жыл-

ля. Далей мы паспрабуем разгледзець гэтыя кампаненты на ўзроўні тэкставых структур. Зробім толькі адно істотнае ўдакладненне: ланцужок "чалавек — яго жытло" дапоўнім яшчэ адным звяном — культуралагемай "дарогі" (шляху) як своеасаблівага канала сувязі паміж гэтым і "тым" светам.

Вобраз чалавека практычна ва ўсіх фальклорных жанрах атрымаў не канкрэтна-намінатыўную, персаніфікаваную сацыяльна-псіхалагічную характарыстыку, а звычайна надзяляецца рысамі або асаблівасцямі, якія факусуюць у сабе абагульнены мастацкі тып, які звычайна вымагаў адпаведнага алгарытму паводзінаў і вырашэння сюжэтных канфліктаў. Напрыклад, былінныя Ілья Мурамец, Алёша Паповіч, Мікула Селянінавіч; казачныя Вярнідуб, Іван-дурань, Баба-Яга, Алена Прымудрая, Салдат; у замовах — Прачыстая Маці, Георгій Цудатворац, Мікола Угоднік, бабка-шаптуха; у вясельных песнях — малады і маладая, свахі, баяры.

Між іншым неабходна адзначыць, што ў плане цеснай спалучанасці канкрэтнага вобраза і адпаведнага сюжэтнага дзеяння замовы займаюць прамежкавую пазіцыю між жанрамі традыцыйнай накіраванасці і фальклорнай спадчынай 19—20 ст., у якіх пачынае дамініраваць персаніфікацыя і псіхалагізацыя ў пабудове сюжэта. Прамежкавы стан тлумачыцца тым, што сюжэт у замовах, з аднаго боку, разгортваецца па класічнай традыцыйнай схеме, а з другога — адрасат дзеяння ўжо строга персаніфікаваны.

Разам з тым адзіным жанрам народнай творчасці, у якім чалавек набываў персаніфікаваную характарыстыку, з'яўляюцца *пахавальныя галашэнні*. Зразумела, што пры аналізе гэтых твораў неабходна памятаць пра табу, забарону гаварыць пра нябожчыка благое, якая абавязкова патрабуе ўвядзення элементаў ідэалізацыі (напрыклад, гаспадар, гэтаксама як і ў велічальных шчадроўках, заўсёды выступае цэнтрам, стрыжнем, вакол якога фарміруецца рытуальна-побытавы космас мікрасоцыуму — сям'і, роду). Аднак сюжэтная дынаміка, якая разгортвае жыццяпіс памёршага ў рэтраспектыўным плане, максімальна выкарыстоўвае маркёры індывідуалізацыі:

***Галашэнне па бацьку***

Татулічка мой родненькі,
Куды ж гэта ты прыбраўся,
У якую староначку, у якую дарожаньку?
Параднічак ты мой мілы!
Парай ты мне парадуньку,
З кім мне цяпер парадзіцца
І ў каго праўдачку папытацца?

Як мне жыць цяпер на свеце без свайго
татулічкі,
Без свайго параднічка?
Саколік мой ясненькі!
Лябедзька мой беленькі!
Адлятаеш ты далёка,
Век з табою не ўвідзіцца,
Сонца маё ненаглянае!
Я ж на цябе не наглядзелася
І ўсю праўданьку не дапытала.
А ні ў мяне мамунькі,
А ні ў мяне татунькі,
Ні ў мяне пітоманнай хатунькі.
Я ж яшчэ не ў розуме,
Я ж яшчэ недарослая і ні ў якім спосабе,
Галоўка мая бедная, сіротунька я вечная.
К каму цяпер прыхінуся,
К каму цяпер прыгарнуся!
Людзі будуць з дарогі татак сустракаць,
А я ж цябе не сустрэну і з табою не ўвіжуся.
Паследняе наша з табой павіданнейка,
Вечнае маё гараванійка.
Трэба мне па людзях хадзіць
І людскім таткам гадзіць,
У канцы стала настаяцца,
І ўсім пітунькі нападавацца!
Прагаманіла я з табой увесь дзянёчак,
А ты мне слоўцам не сказаўся,
Што ж ты стаў такі горды,
Што ж ты стаў такі пышны,
Што ты мне і слоўца не прамовіш,
Ці ты ж на мяне ўсердзіўся?
Віцца, я цябе даглядала
І пітунькі падавала,
І естунькі паднасіла,
І Бога здаровійка табе прасіла.
Прасці, мой татулічка, прасці, мой родненькі!
Суседзькі мае родныя,
Суседзькі мае мілыя,
Зрубіце майму татулічку дамочак вясёленькі!
Каб ён быў раскошненькі,
Прасячыце ў ім ваконачка,
Каб ён адтуль мог глядзеці
На мяне, бедную сірацінАчку.
Паследняе наша павіданнейка,
Паследняе наша цалаваннейка![25]

### *Галашэнне па маці*

Мамулічка ж мая родненькая,
Як жа ты мяне, маладзенькую, аставіла,
А як жа я цяпер буду расставацца,
А як жа я буду размышляцца?
А я ж і маладая, і дурная, і неразумная,
А я ж ужо чужы парожак пераступіла,
А я ж усім нагадзілася і наравілася.
Бяры ж ты лучча мяне ўжо з сабой,
Нічымся мне гора гараваці.
А мамулічка ж ты мая родная!
Ці мае ж слёзы Богу пацешныя,
Што яны маю мамулечку атабралі?
Хоць бы я ж і гаротная была ў цябе,
Хоць бы я ж к табе перахадзіла,
Жуду, бяду падзяліла.
Галовачка ж мая буйная!
А зараненька ж ты скланілась.
А вочкі ж мае яркія,
Зараненька ж вы зачыніліс.
А ручачкі ж мае белыя!
Зараненька ж вы сашчапіліс,
А ножачкі мае борзыя!
Зараненька вы падламіліс,
А славечкі мае верныя,
А славечкі мае шчырыя!
А ці я сваю мамулічку чым угнявіла?
А я ж к ёй прыйшла блізюсенька,
А яна мне нічога не атвячала,
Што я к табе часценька захадзіла?
Што я табе часценька пасцелькі не пераслала?
А мая матулечка родненькая,
А ці ж я цябе тым угнявіла,
Што я табе часценька піткі не давала?
А ці табе сянні палягчала?
А не баляць тваe, мамачка, сянні грудачкі,
А не баляць, мая мамачка, сянні плечачкі?
Ці табе сягодні палягчала,
Ці табе ж сянні палепшыла?
А пчолачка мая дарагая!
Куды ж ты раненька паляцела?
Ці ты ў яравое полечка, ці ты ў жытавое?
Адкуль жа мне цябе дажыдаці?
Адкуль жа мне цябе пазіраці?
Ці ты ранняю зарой ускінешся, ці ты позняю?
А мамулічка ж ты мая родная!
Ці ты ка мне жаркім соўненькам ускоцішся?
Ці ты ка мне ясным месяцам?
Ці ты, мая мамулічка, дробнымі звёздамі?
Ці мне ж цябе па гаворунцы спазнаваці,
Ці мне ж цябе па паходунцы ўзнаваці?
А славечкі мае верныя,

Нічога ж ты, мая мамулічка, не слухаеш,
А я ж у цябе пытаюся шчырусенька,
А я ж пры табе стаю блізюсенька,
Чым жа я цябе, мамачка, угнявіла?[26]

Адметнай асаблівасцю паэтыкі галашэнняў з'яўляецца стварэнне ідэалізаванага вобраза памёршага не прамым указаннем пэўных рысаў характару, а ўскосна-адваротным! Дачка імкнецца паведаць родным і блізкім пра непаўторнасць свайго бацькі, але пры гэтым не столькі ўзгадвае, якім гаспадарлівым ён быў, колькі засяроджвае ўвагу на тым, чаго ёй самой хапаць не будзе. Дысгармонія яе новага становішча ад таго, што смерць бацькі парушыла некалі адладжаны духоўны і фізічны рытм жыцця.

Кампазіцыя пахавальных галашэнняў часцей за ўсё мае трохступеньчатую структуру, што, здаецца, зусім не выпадкова і адпавядае трохчасткавай кампазіцыі рытуальнага ручніка, трохпакаленнай структуры сям'і, нарэшце, трохсфернай міфапаэтычнай мадэлі сусвету. Першая, у пэўнай ступені экспазіцыйная, частка фіксуе толькі што ўзніклую сітуацыю неўраўнаважанасці, сацыяльна-побытавага дыскамфорту, парушэння гармоніі ў жыццёвым колазвароце сям'і. Гэты рытмічны рух служыць эмацыянальна-псіхалагічным штуршком да сюжэтнага развіцця падзей, рух якіх скіраваны да розных полюсаў: з аднаго боку, актуалізуецца рэтраспектыва ідэальнай падзейнасці ў яе ўстойлівым і завершаным плане, а з другога — нявызначанасць, неасэнсаванасць, няўстойлівасць перспектывы, вымалёўванне якой адбываецца праз сістэму пытанняў, што загадзя з'арыентаваны на адназначна адмоўны адказ:

А хто ж нам будзе памагаць,
Хто нам будзе есці варыць,
Хто нас будзе дома сустракаць?[27]

Асноватворная кампазіцыя гэты—"той" свет непазбежна вымагае універсальнага структуравання дадзеных хранатопаў. Неабвержным доказам з'яўляецца ідэнтычнае арнаментальнае вырашэнне двух супрацьлеглых канцоў ручніка, на якім труну з нябожчыкам апускалі ў магілу. Такая тоеснасць задае і адпаведны алгарытм рытуальнага дзеяння: усе асноўныя атрыбуты — маркёры жыцця на гэтым свеце — будуць пакладзены ў труну як функцыянальна важныя для пасляsмяротнага існавання.

П.М.Шпілеўскі наступным чынам апісвае гэта абрадавае дзеянне: "Калі нябожчык быў халасты, на яго труну кладуць вянок з руты, а калі жанаты ці ўдавец, то з папараці. Акрамя

таго, у труну часам ставяць гарэлку, бліны ці кашу, таксама амаль заўсёды кладуць грошы і, здараецца, некаторыя прылады хатняга ўжытку, напрыклад, нож, сякеру ці серп. Відаць, гэта сведчыць пра тое, што ў беларускім народзе захаваўся звычай продкаў нашых рускіх славян забяспечваць нябожчыка ўсімі гэтымі прадметамі ў выніку веры ў замагільнае жыццё...”[28]

Самым галоўным сацыяканструктыўным элементам культуры з'яўляецца падворак з яго рытуальна-вызначальным цэнтрам — хатай. (Космасу жытла селяніна прысвечаны спецыяльныя раздзелы, у якіх з пункту гледжання міфалагізаванай семантыкі падаецца трактоўка важнейшых семіятычных зон як у вертыкальнай, так і ў гарызантальнай структуры. Заўважым толькі, што актуалізацыя прынцыпаў бінарнасці і люстэркавай перавернутасці дазваляе зразумець прынцып мадэліравання “жытла” нябожчыка на “тым” свеце.)

У беларускай традыцыі адначасова, як раўназначныя, ужываюцца дзве назвы: “труна” (ад “труп”) і “дамавіна” (ад “дом”), лакальна бытуе назва “дымаўе” (магчыма, як эквівалент уліку гаспадарак у залежнасці ад колькасці “дымаў”). Нягледзячы на выразнае семантычнае падабенства, структураванне прасторы “жыцця” нябожчыка мае прынцыповае адрозненне:

Да долечка ж мая,
Да куды ж ты ўходзіш?
Да *пакідаеш хату відненькую,*
Да *йдзеш у цёмненькую,*
Да й *без вакон, без дзвярэй.*

Аналагічную трактоўку мае і архетып дарогі. У фальклорнай традыцыі шлях, *дарога заўсёды сімвалізавалі памежную, маргінальную зону, сыходжанне дзвюх неаднародных прастор*, якія складаюць апазіцыю “свой — чужы”. Пераадоленне дарогі ў былінах або казках звязана з шэрагам самых неверагодных перашкод. Уласна кажучы, прастора-антаганіст не вымагае ўжыўлення, адаптавання героя (яна ў асноўным нагадвае прастору першапачатковага руху), а вось пераадоленне самой дарогі, на якой размешчаны маркёры іншароднасці асвойваемага свету, і складае сюжэтную канву эпічных твораў.

Выхад героя за межы асвоенай, добра знаёмай прасторы заўсёды прадугледжваў яго вяртанне, таму з яго боку або з боку сваякоў рабіліся спецыяльныя захады дзеля адпаведнай перасцярогі, стварэння рухомай, але замкнёнай сферы вакол спадарожніка, якая павялічвала яго здольнасці і адначасова змяншала рытуальнае супраціўленне асяроддзя ўваходжання.

Аналагічныя дзеянні сакральна-магічнага характару павінны былі перасцерагчы і запраграміраваць удалае развіццё

падзей у шматдзённым абрадзе вяселля. Малады, напрыклад, абавязаны быў пераказаць замову ў дарогу:

Іду я ў дарогу,
Гасподзь Бог са мною,
Маці Божая перад вачамі,
Ісус Хрыстос за плячамі,
З бакоў анёлы мяне ахраняюць,
Усю бяду ад мяне адганяюць.[29]

Са слоў замовы лёгка зразумець, што малады быццам бы акрэсліў прастору вакол сябе, у якой забяспечваліся стабільнасць, надзейнасць, недатыкальнасць. У гэтай камфортнай сферы, пад яе пастаянным прыкрыццём ён рухаўся па шляху ў іншы свет.

*У момант ад'езду маладых да храма бацька маладой з абразом тройчы абыходзіў вясельны поезд і такім чынам замыкаў у круг маладую пару.* Маці дубліравала (узмацняла, дапаўняла) гэта дзеянне абсыпаннем картэжу жытам.

Замок і само рытуальнае дзеянне замыкання сімвалізавалі духоўнае і фізічнае адзінства сям'і, непарыўнасць і вечнасць шлюбавін. Семантыка гэтага атрыбута высвятляецца ў кантэксце рытуалу "замыкання" маладых у момант пераступання імі парога хаты пасля вянчання. *Хтосьці са старэйшых сваякоў* па жаночай лініі *клаў на парог разамкнёны замок, і як толькі маладыя пераступалі праз яго, замок замыкалі і кідалі ў студню, а ключ хавалі ў куфар*. Мелася на ўвазе: як ніхто не можа адамкнуць гэты замок, так ніхто не разлучыць заручоную пару.

Гэтае ж рытуальнае дзеянне завяршала шматлікія абрады, якія суправаджалі народнае лекаванне замовамі. Прычым вядомы два варыянты замыкання. У адным з іх вербальны тэкст дубліруе (тлумачыць) акцыянальны тэкст: "Ішла Святая Прачыстая з усімі святымі апосталамі, няслa залатыя замкі, сярэбраныя ключы, замыкала рабы Божыя жываты да пары" (замова на захаванне плода); "Госпадзі Божа, благаславі, Прачыстая, пасабі (замкнуць замок і закапаць у зямлю пад варотамі). Замыкаю і загаворваю замок. Як я замкнуў замок, каб у звера замкнуліся рот і санкі; як ня відзіць ніхто гэтага замка, каб ён не відзеў мае скаціны, чорнай шарсціны" (замова ад ваўкоў).[30]

Зусім іначай актуалізуецца матыў дарогі ў пахавальных галашэннях. У стылі імправізаванага рытуальнага маналога плачкі гучыць сітуатыўна-эпічнае пытанне: "У якую ты дарожаньку адпраўляешся?" і адначасова ўслед ляціць адказ-абагульненне: "У дарожаньку невазврацімую".

Матыў аднаскіраванасці шляху нябожчыка дамініруе ў

галашэннях, якія суправаджаюць розныя этапы пахавальнага абраду, аднак ні ў адным з іх не ўзнікае патрэба папярэдняга акрэслівання круга ці замыкання прасторы. Але ж прынцып перавернутасці задае нерэдуцыраваны алгарытм здзяйснення (рэалізацыі), які абавязкова запатрабуе актуалізацыі гэтага матыву. І ён узнікне ў той час, калі труну з нябожчыкам апусцяць у магілу, г.зн. ён будзе "выдвараны" (пераселены) у іншы свет. Дзеля таго каб рытуальна замкнуць яго ў прасторы іншабыцця і тым самым адгарадзіць ад смерці сябе, і прагучыць з боку прысутных галашэнне, якое ўзмацніць выніковасць абрадавага дзеяння:

Замкнуць жа цябе, маё дзіцятачка, трыма замочкамі.
Первый жа замочак — грабавыя дошчычкі,
Другой жа замочак — жоўты пясочак,
А трэці замочак — травычка-муравычка.[31]

Прынцып сіметрычнай перавернутасці асабліва характэрны для галашэнняў, што суправаджаюць пахаванне дзяцей, а таксама юнакоў і *дзяўчат*, якія не паспелі стварыць сям'ю. Іх *хавалі ў вясельных строях*, а праз усе этапы абраду праходзіў сакральны рэфрэн: "Вяселейка невясёлае, вяселейка не параває".

Дачушка мая любая!..
А зрабіла мне вяселейка пячальнае.
Нашы песні невясёлыя,
Нашы госці маркотныя,
А ні музыкі не граюць,
А ні дзевачкі не скачуць,
А ўся наша бяседанька слёзкамі ўмываецца.[32]

Такім чынам, ***прынцып сіметрычнай перавернутасці з'яўляецца адным з найважнейшых сістэма- і структураўтваральных прынцыпаў і выразна прасочваецца ва ўсіх асноўных кодах фальклорна-рытуальнай традыцыі беларусаў***.

# У ЧЫІХ РУКАХ ПРАДЗІВА НАШАГА ЛЁСУ, АБО СІМВОЛІКА ЛІКАЎ У КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Даволі часта на старонках кнігі ўзгадваліся і будуць узгадвацца тыя ці іншыя лікі, з якімі мы сутыкаемся не толькі ў пэўных культуралагічных кантэкстах — рытуальна-акцэнтаваных (напрыклад, толькі тры, а не дзве ці чатыры, жменькі зямлі трэба было кінуць у магілу пасля таго, як туды апусцяць труну з нябожчыкам), святочна-абрадавых падзеях (ка-

лядоўшчыкі заходзілі ў хату з "казой", тая прыкідвалася "мёртвай", каб выпрасіць пачастунак, "ажывала" яна толькі, калі яе *тройчы* прасілі ўстаць), але і ў звычайных побытавых сітуацыях (бульбу скародзілі толькі два разы: спачатку ўпоперак, затым уздоўж). У астралагічнай і культуралагічнай традыцыях народаў Блізкага і Далёкага Усходу ўсе натуральныя лікі маюць сваю спецыфічную трактоўку. *У традыцыйнай культуры славянскіх народаў не ўсе лікі маюць аднолькавае зместавае напаўненне.* Ёсць лікі асабліва пазначаныя ўвагай народа, а ёсць і такія, што не пакінулі ў гісторыі нашай культуры выразнага следу.

Зразумела, што ўжо нават гэты факт сведчыць аб тым, што практычна кожны лік меў свой лёс, сваю культуралагічную сферу ўжывання, свой зямны або касмічны рытм запатрабаванасці. Тое, што, напрыклад, шасцёрка або васьмёрка даволі рэдка фігуруюць у вядомых нам абрадавых кантэкстах, не сведчыць аб нейкім адмоўным стаўленні да іх з боку чалавека. Магчыма, гэтыя і некаторыя іншыя лікі маюць дачыненне да тых сакральных зон культуры (напрыклад, чорнай магіі), якія пакуль што не сталі (а можа і не стануць) дасягальнымі збіральнікам і даследчыкам духоўнай спадчыны нашага народа. Калі ўзяць за аснову класічны прынцып народнай культуры — супрацьстаянне Дабра і Зла, Жыцця і Смерці, Гармоніі і Хаосу, Святла і Цемры (Ночы), то сістэма лікаў хутчэй за ўсё павінна мець той самы падзел: адны з іх факусіруюць у сабе філасофію гармоніі жыцця, а іншыя — хаос смерці. Якую касмічную энергетыку ці духоўную моц хавае ў сабе кожны лік, чым ён вызначаецца ў шэрагу іншых? Магчыма, гэта звязана з падзелам лікаў на цотныя і няцотныя. А магчыма, што ў культуры беларусаў адлюстравалася найстаражытнейшая агульначалавечая з'ява — супрацьстаянне двойкі (пары) як першаасновы фізіялагічнага выжывання і працягу роду і тройкі, якая ўвасабляла сабой не толькі канкрэтную колькасць (тры чалавекі, тры капы сена, трыпольная сістэма агратэхнікі), а і любое мноства, якое перавышала пару. Дадзеная версія мае права на існаванне, таму што і на другім дзесятку злічэння менавіта гэтыя лікі (10 + 2 = *12* і 10 + 3 = *13*) вылучаюцца найбольшым напружаннем супрацьстаяння.

Знаёмства са шматлікімі гісторыка-этнаграфічнымі крыніцамі, з міфалогіяй і вусна-паэтычнай спадчынай беларусаў сведчыць, што **найчасцей у іх фігуруюць** лікі 1, 2, 3, 4, 6, 7, 9, 12, 13, 33 і 40.

Прычым даволі часта сустракаецца выразная заканамернасць: тыя ці іншыя лікі маюць сваю пару (напрыклад, 3 і 9, 6 і 9, 12 і 13). А вось лікі 7 і 40 захоўваюць пэўную самастой-

насць, адзіноту, быццам за імі хаваюцца таямніцы найбольш сакральных ведаў, нейкія ключы да універсальнага кода светабудовы. Ствараецца ўражанне, быццам лікі 7 і 40 ахопліваюць кантэксты касмаганічнай накіраванасці, а ў абрадах сямейна-бытавога цыкла асноўнымі апазіцыянерамі з'яўляюцца лікі 2 і 3.

## СІМВОЛІКА ЦОТНАСЦІ І НЯЦОТНАСЦІ

*Букет кветак у вашых руках: што ён сабой сімвалізуе?*

Вось ужо колькі год спрабую зразумець сутнасць і выявіць карані аднаго з культурных парадоксаў, з якім даводзіцца пастаянна сутыкацца ў розных рытуальна-абрадавых сітуацыях. Гаворка ідзе пра кветкі — неад'емны атрыбут нашых шматлікіх сучасных святкаванняў. Як склалася так, што толькі ўсходнія славяне (беларусы, рускія і ўкраінцы) вылучыліся з агульнаеўрапейскай традыцыі і пайшлі сваім шляхам у трактоўцы іх колькаснай сімволікі? Чаму на вяселле, дзень нараджэння, юбілейны фуршэт мы ідзём з няцотнай колькасцю кветак (3—5—7), а на памінкі, могілкі — з цотнай (2—4—6), хаця, здавалася б, гісторыя нашай старажытнай культуры і шматлікія рытуальныя сітуацыі сучаснасці сведчаць аб адваротным?

Летам 1997 года ўпасла Францыі на Беларусі заканчваўся тэрмін дыпламатычнай службы і ён адбываў у Парыж. На развітанне пасол правёў прэс-канферэнцыю. Адзін з карэспандэнтаў папрасіў яго ўспомніць які-небудзь незвычайны выпадак, што здарыўся з ім за час пражывання на Беларусі. Пасол тут жа ўзгадаў, як у першыя дні яго ганаровай місіі ён трапіў на канцэрт нашай эстраднай зоркі. Выступленне спадабалася госцю, і ён вырашыў паднесці букет кветак. Калі ж пасол уручаў іх спявачцы, то заўважыў яе здзіўлены позірк, больш таго, глыбокае непаразуменне. Толькі значна пазней усё стала на свае месцы. У букеце замежнага госця было 4 кветкі (у Францыі на спатканне з дамай нясуць менавіта цотную колькасць кветак), а у нас з такімі букетамі ходзяць толькі на могілкі. Дзеля таго каб глыбей разабрацца ў гэтым, нам зноў-такі неабходна ўспомніць, дзе і ў якіх рытуальных сітуацыях мы сутыкаемся з парнасцю або няпарнасцю. Затым ужо сума аднатыповых фактаў дазволіць больш дакладна асэнсаваць дамінантныя характарыстыкі сімволікі цотнасці або няцотнасці.

## ПАРНАСЦЬ У КУЛЬТУРЫ ПРОДКАЎ І Ў НАШЫМ ЖЫЦЦІ

Караваю-раю з цесцячка —
*Чатыры каленцы ў мясцечка.*
Каб наш каравай велькі рос,
Каб Міхаська да Матронкі прыпоўз.

*З вясельнай песні*

* * *

Штоб у маёй стаенцы конікі ржалі,
Штоб мая нявехна сыноў раджала.
Штоб яна радзіла дзевяць сыночкаў,
*Дзевяць сыночкаў і дзесяту дочку.*

*З вясельнай песні*

* * *

Дарую падарунак
На чатыры канты,
*Каб было чатыры сыны*
І ўсе музыканты.

*Вясельнае пажаданне маладым*

> *Пра што сведчаць абрады нашых продкаў і чым кіруемся мы, трапляючы ў абрадавую сітуацыю?*

1. Яшчэ нашы бабулі і матулі, калі былі дзяўчатамі, варажылі аб сваім лёсе, перш за ўсё аб тым, будуць ці не будуць замужам. У марозную калядную ноч (гэта магло быць познім вечарам 24 снежня, 6, 13 або 19 студзеня) выбягалі яны ў двор, хапалі аберуч дровы ці, шырока раскінуўшы рукі, абхаплівалі штыкетнік і лічылі колькасць дошак або калоў. *Парная колькасць паленцаў* або штыкецін прадказвала хуткія шлюбавіны, *замужнае жыццё — у пары*; *няпарная* — была знакам таго, што яшчэ год давядзецца “хадзіць у дзеўках”, *заставацца адной, без пары.*[1]

2. Беларускія дзяўчаты карысталіся і такім простым, але вельмі інфарматыўным спосабам прадказання будучыні. Яны бралі 41 зерне бобу і адвольна раскладвалі на тры кучкі. Затым дакладна падлічвалі колькасць зярнят у кожнай кучцы паасобку. *Цотная колькасць* зярнят у першай з іх была *знакам паляпшэння дабрабыту, няцотная* — няўсцешна *наракала*: будзеш *хварэць і цярпець* шатлікія *непрыемнасці* ад сваіх родных. Далей падлічвалі колькасць зярнят у другой горцы.

*Цотная колькасць* бабін усцешвала душу прадказаннем, што на рабоце і ў вучобе *вас чакае поспех, няцотная* была сведчаннем *няўдачы*, магчымай змены месца працы. І, нарэшце, трэцяя кучка сімвалізавала гаспадаранне і сямейны стан. *Цот — прадвесце* спакою і *добрага здароўя, няцот — знак* магчымых *сямейных спрэчак*, лаянак і скасавання шлюбу.[2]

3. У вашай сям'і святочная падзея, вы сервіруеце стол. На жаль, сённяшнія застоллі ўсім сваім ходам нагадваюць рытуал эстэтызаванай дэманстрацыі фінансавай заможнасці і пацвярджэння сярэдняга ці высокага сацыяльнага статусу гаспадароў. А сапраўдныя сутнасныя аспекты абрадавай дзеі дэсакралізаваны і прафаніраваны. Напрыклад, калі ў адпаведнасці з добрай славянскай традыцыяй цэнтральнае месца на святочным стале заўсёды належала бохану хлеба, то сёння яго заняла бутэлька дарагога заморскага пітва, а пра хлеб мы ўзгадваем толькі, калі сядзем за стол.

Але ж у старой традыцыі беларусаў усё было якраз наадварот. Дзеля таго каб у сям'і заўсёды былі згода, пашана, лад, каб у вашай хаце заўжды радаваліся гасцям і вы маглі спадзявацца на дапамогу суседзяў, каб сумеснае застолле ніколі не закончылася сваркай або бойкай, першым на сярэдзіну стала клалі духмяны бохан хлеба. А вось нож (які здольны быў толькі раздзяць цэлае на асобныя кавалкі) на стале ніколі не трымалі, гэтаксама як ніколі не клалі *шапку, грэбень, ключы і сумку*.[3] А цяпер уважліва прасачыце за сваімі паводзінамі, калі вы пачынаеце сервіраваць святочны стол. На ўзроўні падсвядомасці, не задумваючыся, *мы* адразу ж *разразаем бохан хлеба напапалам* (што можа сімвалізаваць *два бакі ўдзельнікаў застолля: гаспадароў і гасцей*); *на кожны спадачак кладзем толькі па два кавалачкі хлеба* (што, у сваю чаргу, з'яўляецца сімвалам сямейных пар, якія сабраліся за сталом). Напрыканцы святочнай дзеі гаспадыня парадуе гасцей салодкімі прысмакамі і абавязкова падкрэсліць: "*Цукеркі бярыце ў пару*".[4]

Дарэчы, ці заўважалі вы, што *сталовыя наборы і чайныя сервізы звычайна прадаюцца толькі на шэсць або дванаццаць чалавек, г.зн. іх колькасць заўсёды цотная.*

4. Адна з жыхарак в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна ўспамінала: "Калі я была яшчэ ў дзеўках, то бабуля давала мне ў суботу тры цукеркі і прыгаворвала: "Бяжы, на танцах пару шукай".[5]

Як адзначае даследчык беларускай народнай паэзіі Арсень Ліс, *спарышовыя* (ад "спорны", "спараны", які знаходзіцца ў пары; спарыш — гэта здвоеныя слівы, бульбіны, арэхі або жытнёвыя каласы) *песні* ўтваралі ў жніўным цыкле абрадавых песень асобны падраздзел са сваёй тэматыкай, скіраванай на

павелічэнне ўрадлівасці нівы, дабрабыту сям'і, спору ў вядзенні гаспадаркі. "Спарыш уяўляўся чалавеку міфічнай істотай, якая ўвасабляла сілу ўрадлівасці"[6], — падкрэсліваў навуковец. Думка фалькларыста дакладна падмацавана словамі народнай песні:

Хадзіў Спарыш па вуліцы,
Па вуліцы па шырокай,
Па мураўцы па зялёнай.
А ніхто Спарыша ў двор не завець.
Выйшла, выехала Хвядорыха:
— Хадзі, Спарыш, ка мне на двор,
Ка мне ва двор, за цясовы стол.
У мяне сталы пазасціланы,
Віном кубкі паналіваны.
У мяне пірагоў панапечана,
У мяне мёду панасычана,
Сядзь, Спарыш, на покуце,
На покуце, да на золаце,
Пі, Спарыш, зеляно віно.
Спары, Божа, у маім гумне,
У маім гумне, у маім дварэ:
На таку ўмалот, а ў дзяжы падход.
А ў печы рост, а на стале сыццё.[7]

У народзе існавала вера ў тое, што дзяўчына, якая з'есць спарыша, народзіць двайнят. Добра памятаю, як мая маці выкідвала слівы-спарышы нават тады, калі збіралі іх для варэння. І наадварот, верылі, калі насіць пры сабе арэхавы спарыш, то ўвесь час будзеш пры грашах.

5. Сімволіка парнасці вызначала характар і асаблівасці выканання найбольш значных рытуальных дзеянняў разгорнутага вясельнага абраду. Верх вясельнага "хлеба-солі" (каравая, з якім маладых сустракалі перад парогам хаты) быў упрыгожаны *двума* кавалачкамі цукру, што павінна было сімвалізаваць "салодкі" лёс сямейнай пары. Вяршыню святочнага каравая ўпрыгожвалі *дзвюма* птушачкамі, выпечанымі з таго ж цеста, што і сам каравай. Побач з маладымі *хросныя бацькі павінны сядзець толькі парай. Калі ж у жаніха або нявесты засталіся толькі маці або бацька, то яны не мелі права сустракаць маладых па аднаму.* Прынцып падабенства лёсу тых, хто сустракаў, і тых, каго сустракалі, прадказваў маладым жыццё ў адзіноце. Каб пазбегнуць гэтага, трэба было браць да пары каго-небудзь са сваякоў. Калі засталася толькі матуля, то яна брала сабе ў пару хроснага бацьку (дачкі або сына) або свайго брата. Бацька браў "у пару" хросную маці ці сваю родную сястру. У некаторых выпадках маладых сустракалі хросныя бацькі. Калі ж ім трэба было быць у храме на вянчанні, то

дома перад парогам *маладых магла сустрэць поўная сям'я старэйшага брата.*[8]

6. Неабходна адзначыць, што ў календары еўрапейскіх народаў, пачынаючы з часоў Старажытнага Рыма, замацаваліся *назвы месяцаў*, якія *мелі парадкавую нумарацыю*. Гэта традыцыя была запазычана і нашымі суседзямі — расіянамі. Да сённяшняга часу іх месяцы другой паловы года маюць назвылічэбнікі: сентябрь (ад лац. *septémber*) — сёмы месяц, октябрь (ад лац. *octóber*) — восьмы месяц і г.д. У народным календары беларусаў захавалася яго старажытная аснова, якая адлюстравала цесную ўзаемасувязь стану зямлі і прыроды з космасам, напрыклад люты, сакавік, ліпень, жнівень, лістапад, снежань. Як бачым, у назвах месяцаў адлюстравана ўся гама прыродных і чалавечых стасункаў. Кожная назва фіксавала ў сабе найбольш характэрную рысу стану прыроды, зямной чуласці да касмічнага цяпла або холаду, значную падзею ў земляробчым цыкле чалавечай дзейнасці. У сувязі з гэтым адзначым, што не ўсе месяцы года мелі аднолькавыя зместавыя характарыстыкі. Вядома, напрыклад, што вяселлі не спраўлялі ў маі, каб не маяцца ўсё жыццё.

Працягваючы гэту думку, адзначым, што і "наш *тыдзень*" меў сваю ўнутраную структуру, якая абапіралася на паслядоўную паўтаральнасць адных і тых жа дзён, назвы якіх адлюстроўвалі ўсё тыя ж лікі: панядзелак — першы дзень пасля нядзелі, па(сля)нядзелак; аўторак — другі; серада — сярэдні, трэці; чацвер — чацвёрты; пятніца — пяты; субота (ад старажытнаяўрэйскага *sabbat* — шабаш) — шосты.

Знаёмства з вялікай колькасцю прыкмет і павер'яў, рэгламентацый і забарон абрадавай і гаспадарчай практыкі пераканаўча сведчыць, што *шчаслівымі, спрыяльнымі* для распачынання важных спраў з'яўляюцца *цотныя дні*: аўторак і чацвер (другі і чацвёрты). І наадварот, *нешчаслівымі* лічацца *няцотныя дні*: панядзелак (першы), серада (трэці) і пятніца (пяты). Менавіта з імі звязана найбольшая колькасць усялякіх абмежаванняў як у працы, так і ў харчаванні (серада і пятніца — посныя дні).[9]

7. Дзіўная рэч, на якую чамусьці не звяртаюць увагі этнографы. У нашы сучасныя песні і святкаванні (Каляды, Масленіца) прыйшло запазычанне з рускай культуры і побыту — асноўным вобразам зімовых святаў становіцца шпаркая тройка коней. Але ж на самай справе на Беларусі памочнікам чалавека ў гаспадарцы была не "тройка", а *параконка* ("Запрагай сваю парку", — казалі ў народзе; поле аралі парай валоў).

8. Калі гаспадар выбіраў на базары ў бондара дзяжу, то абавязкова лічыў клёпкі. Існавала перакананасць: там, дзе іх

цотная колькасць — рошчына будзе добрая, а дзе няцотная — цеста будзе няўдалым, а хлеб ацеслівым.[10]

## НЯПАРНАСЦЬ У ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Дарагі татачка, як жа хараша прыбраўся,
Куды, татачка, сабраўся?
*Ты адзін, татка, паедзеш ці пойдзеш,*
І нікога з сабою не возьмеш?
Ты, татачка, ніколі так не рабіў
*І нікуды адзін не хадзіў.*

*З пахавальнага галашэння*

* * *

Ох, Ільюшка,
Ох, разлучка!
Мы з табою разлучыліся.
Ты мяне пакінуў,
Як сірацінaчку.
*Я ж цяпер сама, адна,*
Як быліначка ў полі...

*З пахавальнага галашэння*

Каб растлумачыць, што сабой сімвалізуе няцотнае спалучэнне атрыбутаў, дзеянняў, слоўных паўтораў, зноў звернемся да традыцый нашых продкаў і адначасова прааналізуем шэраг сучасных жыццёвых сітуацый, у якіх так ці інакш фігуруе няпарнасць (1—3—5—7—9 і г.д.).

1. На Радаўніцу кожная беларуская сям'я адпраўляецца на могілкі, каб ушанаваць сваіх памёршых продкаў. Гэта свята вылучаецца з усяго гадавога колазвароту сваёй эмацыянальнай танальнасцю. Тут, на могілках, можна сустрэць далёкіх суродзічаў, колішніх аднавяскоўцаў і аднакласнікаў, якія раз'ехаліся па ўсім свеце і наведваюць родныя мясціны толькі таму, што ў гэтай зямлі пахаваны іх бацька або маці. І тады ўспамінам няма канца-краю. Тут можна пачуць тужлівае, надрыўнае галашэнне-малітву па нядаўна памёршых, можна бачыць, як на магілку загінуўшага сына абяссілена апусціцца яшчэ маладая, але ўжо ссівелая матуля. Эмоцыі — гэты агульначалавечы выплеск энергіі, які цяжка спасцігнуць розумам, ці то прыглушае-прытупляе боль памяці, ці то, наадварот, сілкуе радавым знітаваннем і дае трываласць нагам, уцеху душы, палёгку сэрцу. Шкада толькі, што спрадвечны звычай у яго заключнай частцы паціху ператвараецца (калі ўжо не ператт-

варыўся) у агульную п'янку-лаянку. Так і хочацца крыкнуць: "Людзі добрыя! Ачаломкайцеся, адумайцеся, шануйцеся! Могілкі — не шынок, не карчма, могілкі — святое, свяшчэннае месца, таму і паводзіць сябе там патрэбна як у храме".

Прыдзіце туды са сваімі дзецьмі і ўнукамі, навядзіце святочны парадак: падмяціце сухое лісце, збярыце апалыя галінкі дрэў, абнавіце фартушкі або вяночкі; калі ж магілка свежая (*да года пасля смерці чалавека*) — абкладзіце яе роўна нарэзаным дзёрнам, пасыпце жоўтым пяском, а затым падрыхтуйцеся да рытуалу памінальнай трапезы.

Аднойчы ў часопісе "Алеся" давялося прычытаць слязамі напісанае пісьмо жанчыны, якая кожным словам літаральна галасіла і прасіла ўвесь свет адмовіцца ад святкавання Радаўніцы, таму што, маўляў, народ канчаткова співаецца. Пытанні аб тым, можна або нельга ставіць гарэлку на памінальны стол, ці дазваляецца браць яе на могілкі не толькі на Радаўніцу, але і на дзевяты і саракавы дзень ушанавання памёршага, усплываюць пастаянна на самых розных сустрэчах з работнікамі сферы культуры і адукацыі.

Адказ на яго павінен мець дзве часткі: гістарычную і сучасную. У мінулым стагоддзі, а таксама ў першай палове гэтага захоўвалася трывалая традыцыя продкаў абавязкова выпіваць чарку на магіле. Кілішак гэты выконваў перш за ўсё сацыяльна-псіхалагічную ролю: здымаў стрэс, палягчаў боль душы, збліжаў далёкую радзіну. Аднак пачынаючы недзе з 60-х гадоў нашага стагоддзя сітуацыя рэзка змянілася. Людзі акрыялі пасля вайны, крыху разбагацелі (быў зафіксаваны стабільны ўзровень гаспадарання) і пачалі бясконца піць даволі таннае па тым часе пітво. Сёння гэты працэс набыў абвальны характар. Таму цалкам падтрымліваю каталіцкіх святароў, якія катэгарычна адмаўляюцца праўляць паніхіду, калі нехта ўздумае паставіць на стол бутэльку. На цяперашні час гэта прымусовая мера з'яўляецца адзіным выйсцем з агульнанароднай наркатычнай залежнасці. Аднак хочацца адзначыць, што не Радаўніца ці Вялікдзень, не Купалле ці Каляды ў гэтым вінаваты. Перш за ўсё вінаваты мы самі! Мы, а не хтонебудзь іншы, знішчылі прыгожыя сямейныя святы, мы самі зруйнавалі агульнарадавыя фэсты. Справа ў тым, што ў колішніх святах усе ўдзельнікі былі ўцягнуты ў абрадавае дзеянне, на сучасных жа вяселлях бойкі вядучыператварае ўвесь абрад у канцэртнае шоу, на якім госці — звычайныя гледачы. І тады атрымліваецца, што чалавеку няма чым заняцца апроч бясконцай выпіўкі.

Гэта сённяшні варыянт святкавання вялікіх фэстаў. А як было калісьці на Радаўніцу? Водгукі той культуры яшчэ дзе-

нідзе ўбачыш на вясковых могілках сярод людзей сталага веку, якія захавалі старажытную форму ўшанавання тых, каго больш няма. Непасрэдна на магілу кладзецца чысты белы абрус, на які ставяць розныя рытуальныя стравы. Вакол магілы рассаджваецца ўся радня. *Па кругу, пачынаючы ад самага старэйшага, пускаюць памінальную чарку. Яна павінна быць адна на ўсіх.* Той, каму падалі чарку, *спачатку некалькі кропель адліваў на магілу, большую частку выпіваў сам, пакідаючы на дне таксама некалькі кропель.* Тая “слязінка”, якая заставалася на дне кілішка, “хадзіла” па кругу і як бы дадаткова злітоўвала, яднала-павязвала ўсіх прысутных у непарушны Род.[11] (*Таму на любой святочнай урачыстасці вас ветліва папросяць першую чарку дапіць да дна — не пакідаць “гаротных слёз”.*) Апошні з прысутных (каму дазвалялася) выпіваў сваю “долю”, а пакінутыя на дне чаркі кроплі зноў-такі выліваў на магілку. Кілішак хадзіў па кругу не больш і не менш, а роўна *тры разы*.

Аднак перш чым распачаць агульнарадавую трапезу, неабходна было падрыхтаваць невялікі рытуальны “стол” для памёршых. Каля кожнага крыжа ці помніка звычайна ставілі:

*адзін* сподак;
*адну* чарку, у якую крыху налівалі гарэлкі;
на чарку клалі *адзін* кавалачак хлеба.

Побач на сподак або на свежы пясок клалі:

*адно* чырвонае велікоднае яйка;
*адзін* яблык;
*адну* цукерку;
*адну* пячэніну (у старой традыцыі гэта былі “хрэсты”, “птушачкі”, “галёпы”, кавалак велікоднага пірага).

Такім чынам, усе абрадавыя атрыбуты для памёршага ставяцца *па аднаму*, а іх сумарная *колькасць* складае 7.

І яшчэ адно істотнае дапаўненне. Калі ў даўнія часы абрус з рытуальнымі стравамі клалі на магілу, а радня рассаджвалася вакол яе, то сёння кладуць абрус побач з магілай або тут жа ставяць сапраўдны стол і садзяцца вакол яго. Можна і так. Аднак нашы навацыі зайшлі далёка. Здараецца, што людзі ставяць стол за межамі агароджы і там святкуюць. Гэта недарэчнасць, гэта ўсё роўна як пабыць дома, але ў двор не зайсці, а не тое што ў хату.

Выключэнне можа складаць калектыўнае (не сямейна-радавое, а прадстаўнікоў розных родаў) ушанаванне, як, напрыклад, гэта адбываецца ў Кобрынскім раёне.

2. Любы памінальны стол (трацiны, дзевяціны, саракавіны,

угодкі) пачынаецца з таго, што *па кругу (толькі па сонцы, пачынаючы ад чырвонага кута, ад старэйшага сярод прысутных чалавека, і да парога, дзе сядзяць маладзейшыя)* пускаецца *тры* спецыяльныя *стравы* (канон, куцця, сыта, боршч, просвірка — у розных рэгіёнах існуюць свае камбінацыі страў). Прычым місы пускаюць дзве, каб не перадаваць праз стол.

Сёння ў цэнтральным рэгіёне Беларусі, напрыклад у Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці, даводзілася бачыць, як гасцям падаюць адну прыгатаваную страву — адвараны рыс з разынкамі або батон ці абаранак, размочаныя ў малацэ з мёдам, а замест дзвюх астатніх страў на стол кладуць салодкае (цукеркі) і печыва. У суседнім жа Чэрвеньскім раёне на жалобны стол падаюць канон (нарэзаны невялічкімі кубікамі і размочаны батон), боршч і рысавую кашу як знак заканчэння абрадавай вячэры. *Кожны з прысутных за сталом абавязаны тройчы прыгубіць-пакаштаваць кожнай стравы.*

| Звычай жорстка прадпісвае: |
|---|
| **за памінальным сталом дазваляецца выпіць толькі т р ы чаркі.** |

На жаль, сённяшнія і жалобныя, і вясельныя сталы (амаль заўсёды) ператвараюцца ў сапраўны фарс. Са скуры вон лезем, каб на памінальным стале паставіць прысмакаў больш, чым было ў суседзяў на вяселлі. Навошта ўсё гэта? Мая бабуля папярэджвала: “Памру — як накрыеце стол, то больш каб нічога не дабаўлялі”. А мы ўсё носім і носім, п’ем і п’ем, пасля трэцяй чацвёртая, пятая, а там... і паспяваць захочацца.

3. У старажытныя часы *пад парогам хавалі* (закопвалі) *розныя ахвяраванні дамавіку*[12]. Узгадаем, што мы робім, каб патрапіць у чужую хату або ў хату нашых знаёмых: абавязкова “запытаем дазволу” ў гаспадароў хаты (дамавіка, продкаў, жывых) — *тройчы* пастукаем ў дзверы.

Звернемся да вертыкальнай структуры сялянскага жылля: ніжэй узроўню прасторы пражывання чалавека знаходзіўся пограб (рус. погребение, по-*гроб*, склеп), у якім сёння *хаваюць* бульбу, буракі, квашаніну, а раней на Беларусі *хавалі* нябожчыка. Хутчэй за ўсё ў дахрысціянскія часы, калі існавала традыцыя трупаспальвання, урну з прахам *хавалі* пад парогам хаты. Атрымліваецца, што парог не толькі мяжа паміж хатай (зонай жанчыны) і дваром, полем (зонай мужчыны), асвоенай і неасвоенай прасторай, гармоніяй і хаосам, але яшчэ паміж жывымі і мёртвымі, калі хочаце, уласны фамільны склеп. Пасля гэтага становіцца зразумелым, чаму мужчыны не падаюць

адзін аднаму руку праз парог (праз зону продкаў, смерці), таксама як і праз труну або магілу.

Менавіта таму ў Капыльскім, Уздзенскім, Старадарожскім, Баранавіцкім, Столінскім, Мазырскім, Верхнядзвінскім раёнах Беларусі захаваўся звычай: калі *труну з нябожчыкам* выносяць з хаты, то яе *тройчы апускаюць на парог*, на колішнюю зону пахавання. Гэтым рытуальным дзеяннем як бы папярэджваюць продкаў: сустракайце наступнага сваяка.[13]

4. Калі на пахаванні апусцілі труну з нябожчыкам у магілу, *усе прысутныя* (за выключэннем самых блізкіх) абавязкова кідаюць на труну *па тры жменькі зямлі. Радня першага і другога калена сваяцтва кідае толькі грошы* (каб “выкупіць” магілу і “аплаціць пераправу” на “той” свет).[14]

Удакладнім паводзіны сваякоў падчас пахавання:

а) *памёр бацька*: жонка, дзеці, яго родныя і дваюрадныя браты і сёстры, яго бацька і маці кідаюць толькі грошы (медныя манеты); усе астатнія кідаюць толькі па тры жменькі зямлі;

б) *памерла бабуля*: унукі, праўнукі павінны кідаць у магілу толькі жменькі пяску;

в) *памерла цешча* (цесць): зяць кідае толькі зямлю, гэтаксама як і нявестка ў магілу свайго свёкра (свекрыві);

г) калі *памірае жонка*, то муж кідае ў магілу толькі грошы, гэтаксама робіць і жонка, калі памёр муж.

5. Да замужжа нашы бабулі часцей за ўсё прыбіралі валасы ў *адну касу*, але ў зборную суботу, перад самым вяселлем, сяброўкі расплятали дзявочую касу і пераплятали валасы нявесты ў *дзве касы*, што сімвалізавала прынцыповыя змены ў яе сацыяльным статусе: яна выходзіла замуж, пачынала жыць у пары.[15] Затое нашы маленькія дзяўчынкі прыходзяць на святочныя ранішнікі ў дзіцячыя садкі з шыкоўнымі бантамі, уплеценымі ў дзве касы. Куды ляцім, куды спяшаемся? Прыгожа? Так. Але ж калі апранаем іх у народныя строі, развучваем з імі народныя песні і танцы, якія суправаджаюць старажытныя святы, давайце ва ўсім будзем дакладнымі, уважлівымі і паслядоўнымі.

Нагадаем яшчэ адну важную акалічнасць: сімвалам дзяўчыны (акрамя адной касы) у вясельным абрадзе, а таксама ў абрадах гадавога колазвароту (напрыклад, на Тройцу, Купалле) быў вянок. Напрыканцы вяселля вянок нявесты (якая пасля першай шлюбнай ночы стала жанчынай) свякроў перадавала першай дружцы або роднай сястры маладой. Аб тым, што яна стала замужняй жанчынай, будуць сведчыць ужо *два* вонкавыя *атрыбуты*: *хусціна і фартушок*.[16]

Такім чынам, ***усе згаданыя вышэй рытуальна-абрадавыя сітуацыі міжволі прыводзяць нас да адназначнай высновы: калі гаворка ідзе пра жывых — пераважае сімволіка парнасці, калі ж ушаноўваюцца памёршыя — мы пастаянна сутыкаемся з няпарнасцю.***

Абапіраючыся на сфармуляваны тэзіс, паспрабуем знайсці выйсце з сітуацый, з якімі даводзіцца раз-пораз сутыкацца ў жыцці.

*Прыклад 1.* Прасачыце, як вы наразаеце хлеб, калі сям'я садзіцца вячэраць.

Аказваецца, мы *спачатку* адразаем *цэлую лусту хлеба*, а *затым дзелім яе напапалам*: табе і мне.

*Прыклад 2.* Каго і ў якой колькасці неабходна запрасіць на памінальную вячэру на дзевяты дзень пасля смерці чалавека?

Гэта спецыяльны стол падзякі ўсім тым, хто дапамагаў выканаць асноўныя абрадавыя дзеянні. Таму на яго запрашаюць *толькі 9 чалавек*: тых, хто мыў нябожчыка (*3*); тых, хто рабіў труну (*3*); тых, хто капаў магілу (*3*).

*Прыклад 3.* На Віцебшчыне, у Верхнядзвінскім раёне, да нашага часу існуе звычай: чаркі на памінальны стол не ставяць, іх на сподачку вакол стала абносіць гаспадар. Якім чынам выконваецца гэты рытуал?

Гаспадар (а калі паміраў ён сам, то яго браты) ставіць на сподак *чатыры чаркі* (для жывых) і *тройчы* (ушаноўваючы нябожчыка) *па сонцы* робіць абход вакол стала наступным чынам: ён налівае ў чаркі гарэлку, чатыры чалавекі бяруць іх са сподачка і выпіваюць. Гаспадар зноў налівае гарэлку ў тыя ж чаркі і падыходзіць да наступных чатырох чалавек. Тыя выпіваюць і ставяць чаркі назад. *На працягу жалобнай вячэры гаспадар тройчы абыходзіць стол.*[17]

*Прыклад 4.* Набліжаюцца Восеньскія Дзяды. У гэты дзень многія наведваюць могілкі, як і на Радаўніцу. І ўсё ж *галоўнай падзеяй* абраду ўшанавання продкаў *павінен быць жалобны стол*, які накрываюць дома ў адпаведнасці са строгімі канонамі традыцыі. Пры гэтым абавязкова трэба ***накрыць стол так, каб на ім стаяла няцотная колькасць страў*** (7—9—11—13—15—17 і нават 19)[18] — знак ушанавання памёршых. Але ў сувязі з тым што ***памінаць будуць жывыя***, на стале ***павінны быць атрыбуты сімволікі парнасці***.

Шукаем выйсце. Часцей за ўсё на Восеньскія Дзяды беларусы ставілі на стол 7 страў (няцотны лік), таму што ўшаноўвалі свой Род. А мінімальная колькасць пакаленняў, якую ахоплівала структура Роду, раўнялася *сямі* (пра чалавека, які добра ведаў сваю радню, казалі: "Ведае свой род аж у сёмае

калена”). Паўстае пытанне: чаму менавіта “да сёмага”, а не да шостага ці восьмага? Давайце выпішам паняцці, якія абазначаюць вертыкальную (у мінулае і ў будучыню) структуру нашага Роду. Схематычна яе можна прадставіць наступным чынам.

**СТРУКТУРА НАШАГА РОДУ**




Такім чынам, гарызонт актыўнай сямейна-радавой памяці ахоплівае толькі сем пакаленняў. Нашы нашчадкі, як і нашы далёкія продкі (прашчуры), знаходзяцца па-за межамі ўласна радавой структуры. З гэтага вынікае: калі на стол мы паставім 7 страў, то гэтым самым захаваем *сімволіку няпарнасці* — для продкаў. Але ж каб не нашкодзіць жывым, якія прымаюць удзел у абрадзе ўшанавання, на стале адначасова павінны быць і *знакі парнасці*. Продкі пакінулі нам у спадчыну арыгінальнае выйсце з гэтай сітуацыі, прычым яно ляжыць у нашай падсвядомасці і нават сёння пастаянна карэліруе нашы паводзіны: *кожную страву мы падаем на стол у **дзвюх** талерках*. Знойдзена цудоўнае вырашэнне праблемы: *на стол пададуць 7 страў у 14 талерках*! Усё дакладна, калі ўзгадаць, што парнасць гэта пачыналася яшчэ з моманту наразання *хлеба: па два кавалачкі кожнаму прысутнаму*.

Ніколі не забудуся, як на жалобны стол з нагоды смерці маёй маці падавала стравы мая хросная. Бульбу, катлеты, галубцы яна брала з каструлі вялікай лыжкай так, *каб у ёй кожны раз усяго было па пары*! Гэта значыць, што на кожнай талерцы абавязкова была толькі цотная колькасць бульбін або катлет.

*Прыклад 5.* У святочны або будны дзень вы наведалі храм і захацелі паставіць рытуальны знак пашаны і памяці — свечкі. Але ж колькі іх павінна быць?

Зноў-такі звяртаемся да добра знаёмага рытуальнага прадпісання: кожны павінен ушаноўваць свой Род аж да сёмага калена (тры пакаленні, якія жылі наперад нас: бацькі, дзяды, прадзеды, і тры пакаленні, якім жыццё далі мы: дзеці, унукі, праўнукі); гэта патрабаванне зафіксавана ў добра вядомай хрысціянска-царкоўнай формуле: “За здравие и за упокой”, г.зн. за здароўе жывых і за спачын памёршых. Такім чынам, для таго *каб ушанаваць свой Род аж да сёмага калена, трэба паставіць дзве свечкі* (гл. схему структуры Роду, с. 119).

*Прыклад 6.* Чаму ў звычайнай сялянскай хаце толькі ***13*** “вянкоў”?

Усё правільна і тут не парушана сімволіка парнасці і няпарнасці. Сама жыллёвая прастора хаты ахоплівае 12 вянкоў, затым уразаюцца бэлькі, кладзецца столь, а апошні 13-ы вянок замкне зруб і адначасова будзе служыць асновай гарышча, якое, па народных уяўленнях, было сферай існавання праціўнікаў чалавека.[19]

*Прыклад 7.* А якой гадзіне трэба выносіць нябожчыка з хаты?

На Беларусі да нашых дзён прытрымліваюцца (часам ужо не разумеючы сутнасці з’явы) звычаю выносіць нябожчыка ў 12 або ў 14 гадзін. Гэта яшчэ адно пераканаўчае пацвярджэнне размежавання свету жывых (сімволіка цотнасці) і “свету” мёртвых (сімволіка няцотнасці). Прасочым паслядоўнасць рытуальных дзеянняў і засяродзім увагу на часе іх выканання.

| | |
|---|---|
| *Нябожчыка выносяць з хаты* ***(свет жывых)*** | **14.00** (або 2 гадзіны апоўдні) — выносілі труну парамі |
| *Пахавальная працэсія прыбывае на могілкі (****“свет” мёртвых****) у няцотную колькасць гадзін* | **15.00** (або 3 гадзіны апоўдні) — кідалі тры жменькі зямлі |
| *Пасля пахавання ўдзельнікі рытуалу вяртаюцца дадому* ***(свет жывых)*** *зноў-такі ў цотную колькасць гадзін* | **16.00** (або 4 гадзіны апоўдні) — сустракалі перад парогам хаты з чатырма прадметамі |

Дарэчы, сімволіка цотнасці — няцотнасці захоўваецца і на пераходзе з "таго" свету ў гэты: рытуальнае развітанне з нябожчыкам заканчваецца тым, што *кожны з прысутных кідае ў магілу тры жменькі зямлі*. А як толькі тыя, хто прымаў удзел у пахаванні, вяртаюцца дадому, то *перад парогам хаты іх сустракаюць з чатырма* (парнасць) *атрыбутамі* — з іх дапамогай трэба будзе памыць рукі (асноўны канал сувязі з "тым" светам) і ачысціць сябе ад напластаванняў іншага свету: *вядро з вадой, конаўка, ручнік і мыла*.

Усе прыведзеныя вышэй прыклады пераканаўча сведчаць: ***сімвал жывых — цотнасць, сімвал мёртвых — няцотнасць.*** *Таму хочацца звярнуцца да жыхароў Беларусі з просьбай перагледзець свае адносіны да сімволікі наогул і да сімволікі кветак у прыватнасці, перш за ўсё да іх колькасці падчас выкарыстання ў святочнай або жалобнай сітуацыі.*

Неабходна адзначыць, што *сімволіка "тройкі"* атрымала найбольшае пашырэнне ў беларускай вусна-паэтычнай творчасці, у народнай медыцыне і ў тым фальклорным жанры, які быў неад'емным спадарожнікам знахарскай практыкі — замовах. Практычна ва ўсіх буйных жанрах народнай паэзіі — казках, былінах, баладах, замовах — дамініруе *трохчасткавая кампазіцыя*, якая складаецца з зачыну, разгортвання сюжэтных падзей і фіналу. Прычым асноўным прыёмам развіцця фабульнага дзеяння таксама з'яўляецца *трохразовы паўтор*. А тэксты замоў, па глыбокай перакананасці практыкаў-знахароў, дазваляюць дасягнуць жадаемага выніку толькі пры ўмове іх *трохразовага паўтарэння* ў цэлым, ад пачатку і да зааміньвання (заключная формула "Амінь" за кожным разам *паўтараецца тройчы*).

Асаблівае пашырэнне трохразовыя паўторы набылі ў беларускіх казках: напрыклад, чалавек тройчы абманіў мядзведзя ("Каму вяршкі, а каму карашкі"); ліса тройчы спрабуе перахітрыць мужыка-рыбалова; ліса і жораў тры разы ходзяць адзін да аднаго ў госці. У чарадзейных казках Баба-Яга тройчы спрабуе перахітрыць і з'есці Алёнку; Іван-царэвіч тры разы скача на кані да акна, каля якога сядзіць прыгажуня царэўна.

Што ляжыць у аснове такой кампазіцыі фальклорных твораў? Магчыма, трохразовы паўтор спрыяў надзейнаму запамінанню расказваемага, магчыма, галоўную ролю выканала старажытная вера ў тое, што менавіта тройчы паўторанае слова дапамагала дасягнуць жадаемага выніку. Усе памочнікі галоўнага героя з'яўляюцца толькі тады, калі магічная формула будзе паўторана тры разы: "Сіўка-Бурка, вешчая Каурка! Стань перада мной, як ліст перад травой": "Ізбушка, ізбушка, стань да лесу задам, да мяне перадам".

У старажытных тэкстах народных замоў пастаянна фігуруе зварот да трох нябесных свяціл:

Зара-зараніца,
Божая памачніца,
Памагаеш людзям,
Памажы і нам[20].

* * *

Сонцам асвячуся,
месяцам абгараджуся,
чорным макам абсеюся.
Як мой мак не сабраць,
так маю кароўку не забраць.[21]

* * *

Першым разам,
Добрым часам,
Прашу сонечкі,
Месячкі,
Ясныя зорачкі,
Прыступіце да памажыце тамі
Іспуг згаварыць[22].

З прыходам хрысціянства зварот да нябесных свяціл саступіў на другі план, а на першае месца быў узведзены зварот знахара да Творцы Сусвету, Багародзіцы, вялікіх святых:

Спасіцель-бацюшка,
Царыца-матушка,
Мікалай-угоднічак,
Вялікі цудатворац,
Благаславі мяне[23].

* * *

Госпаду Богу памалюся,
Святой Прачыстай пакланюся...[24]

* * *

Памалюся, пакланюся
Госпаду Богу,
Духу Святому
І ўсім празнічкам.[25]

Магчыма, запазычаная хрысціянская Тройца (Бог Бацька, Бог Сын і Бог Дух Святы) аказала моцны ўплыў на народную

медыцыну. Напрыклад, каб вылечыць дзіця ад хваробы, трэба было знайсці трохгадовую асліцу і дзевяць разоў "прадзець" голае дзіця пад яе жыватом і над спінай. Затым трэба было выдаіць у яе тры сталовыя лыжкі малака, састрыгчы з бруха і спіны па тры шарсцінкі, палажыць у малако, пачакаць тры гадзіны (каб яно стала лячэбным сродкам) і даць выпіць дзіцяці. Гэтую працэдуру неабходна было паўтараць кожную раніцу на працягу трох дзён.

У практыцы беларускіх знахароў існуе звычай лячыць карову вадой, якую набралі ў адзін дзень з трох рэчак.

Відаць, пад уплывам хрысціянскай Тройцы да сённяшніх дзён захаваўся звычай тройчы цалавацца пры сустрэчы гасцей або пры развітанні з імі.

## "ПЕРШЫМ РАЗАМ, ЛЕПШЫМ ЧАСАМ"

Шматлікія рытуальна-абрадавыя кантэксты пераканаўча сведчаць аб тым, што ў беларускай народнай культуры асноўнымі апазіцыянерамі з'яўляюцца лікі 2 і 3. Менавіта ім падпарадкаваны спецыфічныя асаблівасці рытуальных дзеянняў, колькасць іх паўтарэнняў, наяўнасць тых ці іншых абрадавых атрыбутаў.

Разам з тым у духоўнай спадчыне беларусаў, як і ў культуры ўсіх славянскіх народаў прыкметнае месца належыць яшчэ адной незвычайнай пары апазіцыянераў. На адным полюсе супрацьстаяння знаходзіцца фігурант, прамаркіраваны знакам "*першы*" (тое, што распачынае, адкрывае, дазваляе, забараняе, рэгламентуе, раіць, прадказвае), на другім, супрацьлеглым — замацавалася міфалагема, імя якой "*апошні*" (прычым гэты полюс неаднародны: ён можа быць прадстаўлены як цотным, так і няцотным лікам).

Увесь поліфанізм абрадавага гучання, шырыня спектра рытуальных кантэкстаў і шматвектарны функцыяналізм міфалагемы "*першы*" сведчыць, што гэта адзін з самых моцных сімвалаў у традыцыйнай духоўнай культуры беларускага народа. Чырвонай ніццю ён праходзіць як праз сістэму каляндарных абрадаў, так і праз рытуальна-абрадавыя комплексы ўласна сацыяльнай накіраванасці.

Надзвычай высокі семіятычны статус міфалагемы "*першы*" прадвызначаўся класічным прынцыпам народнай светапоглЯднай канцэпцыі: "як пачнеш, так яно і будзе". (Як пачнеш год, такім ён і будзе; як пашанцуе раніцай, дык пашчасціць і вечарам; нарадзіцца ў добрую часіну; ведай, калі сяўбу распа-

чаць, ведай, у які дзень бульбу або цыбулю выбіраць, каб добра захоўвалася на працягу ўсёй зімы.)

Навукоўцы ўжо даўно заўважылі, што ў сістэме народных прыкмет і павер'яў, забарон і прадпісанняў існуе цесная ўзаемасувязь паміж цыклам земляробчых, сельскагаспадарчых святаў і святаў жыццёвага кола чалавека. Тлумачыцца гэта аднолькавым стаўленнем нашых продкаў да *жанчыны-маці*, якой Богам наканавана працягваць жыццё, і да *матухны-Зямлі*, якая падтрымлівае, сілкуе жыццё чалавечага роду. У выніку атрымалася, што пэўныя рытуальныя дзеянні чалавека маглі паўплываць на ўрадлівасць зямлі, а свяшчэннае стаўленне да яе — нават на шчаслівы зямны шлях чалавека. Напрыклад, гушканні моладзі перадшлюбнага ўзросту на арэлях, лічылася, аказвалі ўплыў на хуткі рост ільну-даўгунцу. І наадварот, калі першы раз заворваеш зямлю і ў першай баразне знойдзеш каменьчык, яго трэба падкінуць у фартух дзяўчыне, якая хоча мець на гэты год дзіця.[26]

Асабліва шырока магія пачатку або сімволіка "*першага*" была прадстаўлена ў каляндарнай абраднасці, перш за ўсё ў святах, якія *распачыналі* той ці іншы перыяд года або цыкл земляробчых работ. Безумоўна, важнай падзеяй у структуры календара былі Каляды. Яны распачыналі новы год, таму паводзіны членаў кожнай сям'і паасобку і ўсёй вёскі ў цэлым у першую калядную раніцу мадэліравалі іх жыццё на ўвесь надыходзячы год. Е.Р.Раманаў падае наступнае апісанне калядных клопатаў беларускіх сялян: "Каб скаціна лепш вялася, трэба *першыя бліны* ад кожнай Куцці і ад святаў Раства, Новага года і Вадохрышча — усяго шэсць бліноў — засушыць і, расцершы іх, усыпаць у корм. Адны гаспадыні робяць гэта на Вадохрышча, другія — на Юр'я (6 мая)".[27]

З Калядамі звязаны рытуал, які павінен быў уплываць на стан здароўя чалавека. У першы дзень Каляд, калі ў хату прыносілі свежую ваду, гаспадар браў дробную срэбную манету і кідаў у вядро. Затым пачынаў маліцца сам, а за ім і астатнія члены сям'і: меркавалі, што твар пасля гэтага не будзе "псавацца" на працягу года ні ад вялікай спякоты, ні ад траскучых маразоў.[28]

Лічылася, калі на Каляды першым чыхне мужчына, будуць радзіцца бычкі і баранчыкі, а як жанчына — цёлачкі і авечкі.[29] Не выкідвалі смецце з хаты на Новы год, у *першы дзень* Вялікадня і другі дзень Каляд, каб куры не несліся на чужых дварах.[30] Каб на працягу года сям'я жыла заможна, нічога і нікому не пазычалі на *першы дзень* Вялікадня і Раства Хрыстова.[31]

У цыкле земляробчых работ адказным лічыўся пачатак

ворыва і сяўбы. Былі перакананы: "Хто першы пачынае араць, той першым будзе ва ўсіх работах на полі".[32] Ідучы араць першы раз, гаспадар старанна ўмываўся і апранаў чыстую вопратку, каб збажына была чыстая ад зелля[33], запрагаў валоў у саху, абыходзіў іх тры разы з поўным вядром вады, абліваў той вадою, каб у іх хапіла сілы на ўсе веснавыя работы.[34] (Аналагічнае рытуальнае дзеянне выконвае бацька, калі маладыя адпраўляюцца ў храм на вянчанне. З поўным вядром вады ён тройчы абыходзіць увесь вясельны картэж, а затым вылівае ваду пад колы першай машыны.)

Высокім статусам надзялялася міфалагема "*першы*" ў юраўскай абраднасці. "У дзень першага выгану жывёлы ў поле пад парог хлява клалі навойчык ад кроснаў, і калі карова пераступіць яго, то ўжо значыць не адаб'ецца ад чарады; дзе б ні згубілася ў лесе — абавязкова прыйдзе дадому".[35] Асобныя гаспадыні выконвалі больш складанае абрадавае дзеянне, якое суправаджалася большай колькасцю сакральных атрыбутаў. На Віцебшчыне "перад першым выганам скаціны на пашу ля парога хлява кладуць: замок, нож, кажух поўсцю навыварат, хлеб і яйка, каб: а) скаціна была гладкая, як яйка; б) каб у непрыяцеля замкнуліся рукі, а ў звера пашча; в) каб скаціне была простая дарога да дому і г) каб яе напладзілася столькі, колькі ў кажуху шарсцінак. Скаціна выганяецца са двара асвечанай вярбою і пераступае цераз пакладзеныя ля парога прадметы, пасля чаго пастух апранае кажух, падпярэзваецца папругаю, кладзе хлеб і яйка запазуху, а замок падвешвае да дзвярэй хлява ці бярэ яго ў поле, дзе ўвесь час трымае ў кішэні. У некаторых мясцінах усе гэтыя прадметы застаюцца некранутымі да загону скаціны ў хлеў. Калі якая-небудзь жывёліна расплюсніць пакладзенае ля парога хлява яйка, то воўк з'есць гэтую жывёліну".[36]

Каб статак не расходзіўся, каб ніводную карову не загрызлі ваўкі, у *першы* дзень пастух абыходзіць чараду тры разы.[37]

Вядома, што большасць пасяўных работ праводзілася ў час маладзіка — *першую* фазу Месяца. Сярод незвычайных веснавых назіранняў хацелася б узгадаць яшчэ і такія. Калі *першы* гром прагрыміць на голы лес[38] або "як яшчэ на рацэ лёд"[39], то вясна будзе халодная, а год галодны. З дзяцінства памятаю, як мы чакалі прылёту буслоў. Заўсёды хацелася ўбачыць *першага* з іх у палёце, бо верылі, што гэта прадказвала здароўе і бадзёрасць на ўвесь год. Калі ж убачыш бусла, які сядзіць у гняздзе, трэба было чакаць хвароб.

Па некаторых прыкметах прадказвалі ўраджай на новы год. Так, напярэдадні Першага Спаса варылі столькі яек, колькі ў двары мужчын. За абедам кожны выбіраў яйка з місы і

разбіваў яго. Той, у каго яно паўней, *першым* пойдзе засяваць жыта, каб так поўна было на налецце ў свіране.[40]

У паўночных раёнах Беларусі існавала павер'е, што "добраму вываду гусянят вельмі дапаможа зямля з-пад правай нагі, узятая ўвесну, як першы раз убачыш у небе дзікіх гусей; гэтаю зямлёй трэба злёгку патрусіць наседжваемые яйкі".[41]

Цікавы спосаб барацьбы з пустазеллем прапаноўвалі інфарматары беларускага фалькларыста А. К. Сержпутоўскага: "Калі на полі расце паганае зелле, то яго трэба перааараць тымі сашнікамі, што падвараны ў першую пятніцу".[42]

Узгадаю яшчэ некалькі прыкладаў *магіі* міфалагемы "*першы*":

а) *першым снегам* пратрыце твар і прагаварыце: "Сняжок упаў, Бог здароўе паслаў";

б) *першы* раз пачулі *гром*, трэба пацерціся спінай аб дуб — не будзе балець цэлы год;

в) калі куплялі карову, то *першы раз* "упіхвалі яе ў хлеў задам наперад, каб яна не баялася падзіву і не цуралася свайго хлява";[43]

г) у *першы дзень будоўлі* хаты закладвалі толькі *першы вянок*. Пры гэтым сачылі, куды паляціць *першая стружка*: калі ў сярэдзіну хаты, у сям'і ва ўсім будзе прыбытак. Калі ж, наадварот, у бок двара, усё дабро сыйдзе з хаты;

д) ніколі не прадавалі першае цяля, бо меркавалі, што тым самым перапынялася плоднасць жывёліны, пагаршалася яе малочнасць;

е) "як сядзеш за стол, то першы кавалак аддай сабаку, няхай ён з'есць, бо ніколі не ведаеш, праз чыю ласку жывеш".[44]

Міфалагема "*першы*" даволі шырока прадстаўлена і ў сямейнай абраднасці беларусаў. Лічылася, "як першы раз прыйдуць сваты, то яны не павінны сутрымоўвацца каля парога ці сярод хаты, а хутчэй іці к сталу да садзіцца там на лаву. Калі ж яны супыняцца, то пэўна за таго малайца дзеўкі не аддадуць. Калі сваты, уходзячы ў хату да запнуцца ці спаткнуцца аб парог, то з таго сватання нічога не будзе".[45]

Сэнсавыя межы сімволікі "*першага*" часам настолькі шырокія, а асацыяцыі, якія яны выклікаюць, настолькі нечаканыя, што не перастаеш здзіўляцца мастацкаму таленту народа, асаблівасцям яго мыслення, шляхам стварэння вобраза. Напрыклад, усе прысутныя і ўдзельнікі провадаў маладых да вянца уважліва сачылі, за што першае возьмецца жаніх. Калі за лейцы — будзе трымаць жонку ў руках, калі за пугу — будзе біць. У гэты ж час мужчыны кідалі шапку, каб першым нарадзіўся сын.[46]

Аналагічныя назіранні тычыліся і вянчання ў храме: "хто, становячыся пад вянец, першы ступіць на падножнік, той будзе ў доме за галоўнага. У час шлюбу на падножнік трэба пакласці манету, каб маладыя былі заможнымі".[47]

Выключна багата прадстаўлена міфалагема "першы" ў радзільна-хрэсьбіннай абраднасці і паэзіі. У народзе існуе перакананасць, што "аднаполыя блізняты амаль заўсёды гадуюцца. А вось з разнаполых хутка памрэ той, які выйшаў *першым*".[48] Калі дзіця пасля першага рытуальнага купання пакласці на правы бок, яно будзе "праўшаком", а калі на левы — "леўшаком".[49]

Сярод беларусаў існавала цэлая сістэма прадказанняў адносна лёсу чалавека. Людзі верылі, што па паводзінах нованароджанага можна пазнаць працягласць яго жыццёвага шляху. Калі дзіця ўзялі на рукі і яно выцягнула ногі, то хутка памрэ; калі ногі падабрала — доўга жыць будзе.[50]

Пры з'яўленні *першага зуба* дзіця садзілі ў рэшата і вазілі па падлозе, каб хутчэйраслі іншыя.[51] Першы выпаўшы малочны зуб кідалі за печ, каб астатнія трымаліся доўга. Важнымі падзеямі ў жыцці нованароджанага таксама былі выбар яго хросных бацькоў, першы крок, першы пастрыг. Дзе-нідзе забаранялася даваць дзіцяці першы блін, "бо не хутка чытаць навучыцца".[52]

Чым больш упартасці праяўляла дзіця, калі яго апраналі ў нязвыклую вопратку (раней дзеці сялян доўгі час хадзілі без штаноў), тым даўжэй, згодна з прыкметай, яно будзе жыць. Даношаныя да зрэб'я *першыя* штаны не аддавалі анучніку, не мылі, а спальвалі ў печы.

Пра шматлікія іншыя рытуальна-абрадавыя кантэксты ўжывання міфалагемы "*першы*" гаворка будзе весціся далей.

## "СЕМ РАЗ АДМЕРАЙ, АДЗІН РАЗ АДРЭЖ"

Самым моцным лікам у культуралагічным плане з'яўляецца, безумоўна, *сямёрка*. Магчыма, яе значнае пашырэнне ў сацыякультурнай сферы грунтуецца на пэўных касмічных з'явах. Напрыклад, найбольш выразна на нашым небасхіле бачыцца сузор'е Вялікай Мядзведзіцы, у якое ўваходзіць іменна сем зорак. У славянскім казачным эпасе адной з найбольш папулярных з'яўляецца казка пра ваўка, які з'еў сямёра казлянят. Тры разы воўк спрабаваў падабраць голас казы, каб патрапіць у хатку і з'есці яе дзетак. За трэцім разам яму гэта ўдалося.

Што ляжыць у аснове выбару менавіта гэтага ліку? На мой

погляд, зноў-такі добра знаёмая з'ява, якая тысячагоддзямі прытрымлівалася аднаго і таго ж рытму: гэта змена квадраў Месяца. За дваццаць восем дзён ён праходзіць у сваім касмічным цыкле чатыры фазы па сем дзён. Тры з іх ён бачны на фоне начнога неба, а на адну знікае з нашага поля зроку. А затым зноў нараджаецца маладзіковым сярпом.

Адзін з законаў чалавечай псіхікі сведчыць, што аб'ём актыўнай памяці таксама ахоплівае сем бітаў інфармацыі. Гістарычна склалася так, што адным з прынцыпаў падзелу часу на лёгка фіксуемыя адрэзкі стаў тыдзень — 7 дзён.

Дарэчы, паўнацэннай сацыяльнай адзінкай працягу Роду з'яўляецца Сям'Я, у структуры якой зноў-такі чуецца сямёрка. Хто ж уваходзіць у гэтае магічнае кола з сямі "Я"? Адказ просты:

бабуля — дзядуля, бацька — маці і трое дзяцей.

Прыказка "Адзін сын — не сын, два сыны — паўсына, тры сыны — сын"[53] вельмі дакладна сфармулявала прынцып падаўжэння роду за кошт яго абавязковага пашырэння (+ адзін чалавек) у трэцім пакаленні. Гэта гарантыя таго, што ваш Род не толькі ўтрымаецца на нагах, дзякуючы натуральнаму біялагічнаму паўтору, але і атрымае сваё непазбежнае пашырэнне.

Сімволікай сямёркі напоўнена амаль што кожная старонка нашай свяшчэннй кнігі — Бібліі. Магчыма, менавіта гэты фенаменалагічны фактар паўплываў на фарміраванне некаторых заканамернасцей беларускага народна-хрысціянскага календара, у якім *лік сем (як і лік сорак) — структураўтваральны*. Нагадаем толькі некаторыя яго пазіцыі: Раство Хрыстова — 7.01 (па каталіцкай традыцыі 25 снежня, але ж для нумаралогіі 25 — гэта тое ж, што і 7), Дабравешчанне — 7.04, Купалле і дзень нараджэння Івана Хрысціцеля (Яна, Івана Купалы) — 7.07, ад Масленіцы да Вялікадня і ад яго да Тройцы — па сем тыдняў. Відаць, гэты касмічны і культурны рытм паспрыяў узнікненню абачлівага і ўзважанага папярэджання (а магчыма, аднаго з найважнейшых прынцыпаў этнапедагогікі): "*Сем раз адмерай, адзін раз адрэж*".[54]

Сямёрка літаральна знітавала паміж сабой космас і нашу культуру. Як толькі паветра пасля моцнага навальнічнага дажджу напоўніцца ўзбуджаючым азонам, неба абавязкова расквеціцца падковай шчасця — вясёлкай, якая ўвабрала ў сябе *сем колераў*. Выдатныя шэдэўры музычнага мастацтва таксама створаны на аснове геніяльных камбінацый ўсё тых жа *сямі нот*.

Гісторыя міфалогіі, культуры і цывілізацыі зведала і пакінула нам у спадчыну *сем цудаў свету*, у старажытным Кіеве

на Падоле стаяла *сем выяў* асноўных славянскіх *багоў*.[55] У хрысціянскай традыцыі сустракаюцца сямігаловыя храмы, а ў падсвечніку ставіцца *сем свечак*, што сімвалізуе самбой *сем хрысціянскіх таінстваў*, а таксама *сем дзён тварэння свету*. З гісторыі астраноміі вядома, што доўгі час зямляне ведалі *сем планет*, якія ўваходзілі ў Сонечную сістэму.

Лік сем шырока прадстаўлены ў вусна-паэтычнай творчасці і магічнай практыцы народных лекараў. Напрыклад, у вясельнай паэзіі (песнях, якія суправаджалі выпяканне каравая) ідзе шматрадовы пералік інгрэдыентаў святочнага печыва: сямі крыніц вадзіца, сямі двароў мука, сямі гаспадынь соль, сямі курэй яйкі:

Суботанька нядзельку радзіла,
Сабралася Мар'юшкіна радзіна.
Прывязлі яны сем пудоў мукі на каравай:
Вялік будзець, харош будзець наш каравай.
Суботанька нядзельку радзіла,
Сабралася Мар'юшкіна радзіна.
Прывязлі ж яны сем пудоў масла на каравай:
Харош будзець, маслен будзець наш каравай.
Суботанька нядзельку ўрадзіла,
Сабралася Мар'юшкіна радзіна.
Прывязлі ж яны сем пудоў солі на каравай:
Салон будзець, харош будзець наш каравай,
Суботанька нядзельку ўрадзіла,
Сабралася Мар'юшкіна радзіна.
Прывязлі ж яны сем пудоў сахару на каравай:
Харош будзець, смачан будзець наш каравай.
Хто будзець каравай есці,
Тот будзець машной трэсці.
Мікітка* будзець каравай есці,
Мікітка будзець машной трэсці.
Ганулька* будзець каравай есці,
Ганулька будзець машной трэсці[56].

Часам для лячэння вельмі цяжкіх захворванняў (асабліва псіхічнага характару) славянскія знахары выкарыстоўвалі *зямлю з сямі магіл*, у якіх пахаваны былі добрыя людзі.

У народаў Заходняй Еўропы існаваў наступны спосаб лячэння коклюшу. Дзіця прыводзілі да таго месца, дзе пасвіліся авечкі. Трэба было, каб авечка падыхала малому ў твар. Затым яго клалі на тое месца, на якім толькі што ляжала авечка. Лічылі: калі такі рытуал выканаць сем разоў, то дзіця абавязкова паправіцца.[57]

У славянскіх народаў быў такі звычай: трэба, каб новая хата сем дзён пастаяла недабудаванай, шэсць дзён у ёй павін-

* Бацька і маці жаніха.

ны начаваць розныя хатнія жывёлы і толькі на сёмы дзень туды магла пераходзіць сям'я.

Такім чынам, можна беспамылкова сцвярджаць, што лік сем з'яўляецца адным з самых моцных па сваёй інфарматыўнай напоўненасці. Асаблівасць яго ў тым, што ў адрозненне ад большасці лікаў першай дзесяткі ён не мае свайго апазіцыянера — ліка, які супрацьстаіць яму ў розных культуралагічных кантэкстах. Магчыма, гэтым тлумачыцца яго амбівалентнасць — рознанакіраванасць. Лік сем сканцэнтраваў у сабе шыфраграму акта першатварэння (касмаганічны аспект: Бог стварыў Зямлю за сем дзён), феномены астранамічнага кшталту (фазы Месяца), увасобіў структуру міфапаэтычнай мадэлі свету, асноўныя канцэпты сацыяльнай (сямейна-радавой) арганізацыі грамадства, а таксам квінтэсенцыю утылітарна-практычнага вопыту чалавека.

У міфапаэтычнай мадэлі свету лік сем спалучае два планы: з аднаго боку, як сімвал паяднання часу (у яго трох вымярэннях: былое — сучаснасць — будучыня) і прасторы (чатыры бакі свету), а з другога — сам космас мае сем нябёсаў (узгадаем нашу ацэнку эмацыянальнага становішча шчаслівага чалавека: "На сёмым небе ад шчасця").[58]

Шырокі спектр міфапаэтычных, сакральна-магічных, абрадава-рытуальных кантэкстаў ужывання ліку сем паўплываў на утылітарна-прагматычны этыкет дзейнасці чалавека. Адзін з прынцыпаў народнай педагогікі дае слушную параду кожнаму, хто бярэцца за новую справу: "Сем раз адмерай, адзін раз адрэж". Сярод нормаў этыкету фігуруе наступны маральны імператыў: "Сямёра аднаго не чакаюць".

Аднак у любым выпадку зразумела, што сямёрка магла "прыглушыць" сваім нябесным узвышэннем лікі-суседзі, але не нейтралізавала іх цалкам. А магчыма, што лікі 6 і 8 былі спалучаны з тымі сферамі дзейнасці чалавека, якія засталіся тайнай для непасвечаных.

Напрыклад, васьмёрка практычна нідзе не называецца, але сям-там прысутнічае сваімі сімвалічнымі праявамі. Так, на вяселлі бацька маладой перавязваў маладым рукі крыж-накрыж ручніком, каб завесці пад абразы. Калі бацька і маці сустракалі маладых перад парогам хаты, бабуля тым часам клала праз парог ручнік, а пад яго хавала замок, які па форме нагадваў тую ж васьмёрку.

Знакам саюза, вечнага паяднання і бясконцага працягу радаводнага дрэва ў будучыню была васьмёрка ў гарызантальным становішча: два абручы-пярсцёнкі на вясельным картэжы, два галубкі на вясельным караваі, перавязаныя між сабою, і г.д.

Больш складана паддаецца інтэрпрэтацыі лік шэсць. Ствараецца ўражанне, што ён шырока прадстаўлены ў магічна-абрадавай практыцы калдуноў. На такія разважанні наводзяць асобныя дзіцячыя лічылкі:

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
выйшаў зайчык пагуляць.
А за зайчыкам Луна
просіць выйсці калдуна.[59]

У гэтым папулярным "творы", які суправаджае дзіцячыя гульні, ёсць некалькі акалічнасцей, на якія неабходна звярнуць увагу. Па-першае, Луна-Месяц з'яўляецца начным свяцілам і лічыцца спадарожнікам цёмнай сілы; замест таго, каб назваць сам лік шэсць, лічылка ўказвае на непасрэдны персанаж, які хаваецца за чарговай пасля пяцёркі намінацыяй.

У працах, прысвечаных даследаванню ці апісанню практык магіі, лік шэсць выступае як дэканструктыўны ў параўнанні з тройкай ці сямёркай.

У тыднёвым злічэнні ліку шэсць адпавядае субота — дзень звароту нашай памяці да ўшанавання продкаў. Магчыма, гэта невыпадковая з'ява, таму што лік шэсць — палова касмічнага ліку дванаццаць, цэласнасць якога ахоплівае дзве роўнавялікія катэгорыі: дзень і ноч, дабро і зло, мужчынскі і жаночы пачатак.

Калі ў эзатэрыцы і нумаралогіі лікам Боскага ўвасаблення з'яўляецца лік 9, то яго антыподам, люстэркава-асіметрычным адбіткам, пярэваратнем з'яўляецца лік 6.

Каб зразумець яшчэ адзін аспект стаўлення да гэтага ліку, трэба мець на ўвазе, што ў аснове лікаў 6 і 9 ляжыць тройка — універсальны лік Боскага пачатку. Тройка, памножаная на двойку (парнае, жаночае ўвасабленне), дае шасцёрку, а вось памножаная на тройку (мужчынскі пачатак на універсалію Творцы Сусвету), дасць самы моцны ў духоўным плане лік — дзевятку.

Акрамя таго, у духоўнай спадчыне беларусаў можна сутыкнуцца з такімі сітуацыямі, калі для ўзмацнення ўздзеяння або абавязковага дасягнення жадаемага выніку той ці іншы лік не памнажаецца на тры, а падвойваецца або патройваецца, прычым кожны наступны ўзводзіцца ў чарговую ступень, напрыклад лік 3 ператвараецца ў менш загадкавы лік 33 (узрост быліннага Іллі Мурамца; Ісуса Хрыста), лік 7 ператвараецца ў першым выпадку ў 77, у другім — у 777. Прычым камбінацыі з трох сямёрак могуць утварацца двума шляхамі. У адным выпадку адбываецца ланцужковы паўтор сямёрак, як, напрыклад, у "Откровении св. Иоанна Богослова": "Тайна *семи*

звёзд, которые ты видел в деснице Моей, и *семи* золотых светильников *есть сия: семь* звезд суть ангелы *семи* церквей; а *семь* светильников, которые ты видел, суть *семь* церквей" (Откровение, 1:20). Тут падвойнае выкарыстанне сямёркі скіравана не толькі на пацвярджэнне тэзіса, а на яго замацаванне і канчатковае перакананне таго, хто ўспрымае інфармацыю або на каго яна скіравана апасродкавана.

У народных замовах ужо здвоеная сямёрка выступае сімвалам канчатковасці: "Сабраліся вуж і вужыцы, гады і гадзіцы — семдзесят сем"[60], "Вас хіндзяў семдзесят сем"[61], "Ціхоны-пераходы, вас упрашаюць, умаляюць, ссылаюць на вас дванаццаць братцоў старшых да семдзесят сем младшых"[62].

Народныя лекары часта выкарыстоўваюць прыём, калі нават гэты лік патройваецца. У адной з рускіх замоў мы сустракаемся з наступным варыянтам ланцужковага ўзмацнення падвойнай сямёркі: "За морем, за Хвольінским, во медном городе, во железном тереме сидит добрый молодец, заточен во неволе, закован в семьдесят семь цепей, за семьдесят семь дверей, а двери заперты семьюдесятью замками, семьюдесятью крюками"[63]. Падкрэсліваецца, што ніхто (акрамя Бога або роднай маці) не зможа вызваліць героя з гэтага царства.

У вельмі рэдкіх выпадках ланцужок сямёрак утварае самы моцны сакральна-магічны лік — 777, а ланцужок дзевятак — самы моцны сімвал духа і духоўнасці — 999. А вось перавернуты сімвал інтэлектуальнай моцы ўтворыць лік д'ябла — 666. Мне расказвалі, як студэнтка адной навучальнай установы звярнулася з просьбай змяніць табельны нумар (666). З моманту яго прысвойвання ў яе пачаліся праблемы са здароўем і вучобай. Калі ж нумар змянілі, становішча выправілася.

## "ДВАНАЦЦАЦЬ БРАТОЎ-МАЛАЙЦОЎ"

Калі мы аналізавалі міфалагему ліку сем, то заўважылі, што яго ўнутраная структура спалучыла суму двух лікаў (3+4), якія сфакусіравалі ў сабе вельмі моцны духоўны пачатак (3) і чатыры асноватворныя стыхіі зямнога існавання. Культуролаг М.Мамуна ў сувязі з гэтым адзначыў: "Такім чынам, праз здабытак гэтых лікаў, або іх суму — сем (3 плюс 4), злучаюцца адно з адным і як бы становяцца адзіным цэлым свет зямны і свет нябесны. Ніжні і верхні свет. Зямны і боскі. Свет чалавечы і свет зорны".[64]

Аднак дастаткова параўнаць між сабой духоўнае поле не толькі сумы лікаў 3 і 4, але і здабытак (3 х 4), як адразу стане відавочнай іх блізкасць. Лікі 7 (колькасць дзён у тыдні) і

12 (колькасць месяцаў у гадавым колазвароце) правяць космасам, які, у сваю чаргу, моцна ўплывае на жыццё чалавека і шмат у чым прадвызначае характар і асаблівасці культур розных народаў свету. Лік 12 цесна знітаваны з Боскім пачаткам, з містыкай, прычым ён з'яўляецца парадыгмальным у найстаражытнейшых пластах культуры і значна менш праяўлены ў культурных навацыях больш позняга часу.

Падарожжа егіпецкага бога Сонца Ра на свяшчэннай ладдзі Манджэт доўжыцца ў светлавую частку дня 12 гадзін, затым ён перасаджваецца на начную ладдзю Масктэб і пачынаецца яго плаванне ў зваротным накірунку ўжо па падземным Ніле, падзеленым 12 варотамі на 12 частак. Зразумела, што ў дадзеным выпадку гэта падарожжа сімвалізуе сабой гадавы рух Сонца па задыякальным коле. Гэты ж самы міф ляжаў і ў аснове кампазіцыі знакамітага егіпецкага лабірынта, які звязваў між сабой 12 храмаў. А ў галоўным храме горада Сонца стаяла 12 калон з выявамі знакаў задыяка.[65]

Гэты ж сюжэт прысутнічае і ў старажытнагрэчаскай міфалогіі. Бог Сонца Геліас імчыць на сваёй вогненнай калясніцы над Геяй (Зямлёй) па зорным небасхіле. Усё вышэй падымаецца ён. Скончыўшы свой дзённы шлях, Геліас спускаецца да свяшчэнных вод Акіяна. Там яго чакае залаты човен, у якім ён плыве назад, на ўсход, у страну сонца, дзе адпачывае ноччу ў цудоўным палацы, каб узыйсці ва ўсёй красе на наступны дзень.

А свяшчэнны шлюб паміж Зямлёй і Уранам (Небам) прынёс багатырскую спадчыну: 12 тытанаў (6 братоў і 6 сясцёр). Пантэон алімпійскіх багоў меў тую ж колькасць.

Поўную аналогію мела і міфалогія Старажытнага Рыма. Двухаблічнаму богу Янусу было прысвечана 12 алтароў. Гэта зусім не выпадкова: лічылася, што ён — гаспадар небасхілу, які адкрывае дзверы перад богам Сонца і зачыняе іх следам за ім. Мяркуюць, што першы месяц года — ад лац. *jannarus* (уваход) атрымаў сваю назву ад імя гэтага бога.

Лік 12 вызначаў і асаблівасці спаборніцтваў у старажытнай Алімпіі.[66] Дванаццаць разоў аб'язджалі іпадром удзельнікі заездаў на калясніцах. На 12 караблях адправіўся ў плаванне Адысей.

Можна дакладна сказаць, што лік 12 — адзін з найбольш сустракаемых у старажытнаіндыйскай, будыйскай і хрысціянскай міфалогіях. Напрыклад, калясніцы рыты (светабудовы) мелі 12 спіц, тая ж усходняя Мандала (якая сімвалізавала дыск, круг, кола) налічвала 12 сімвалічных элементаў — нідан. Адна з найбольш вядомых у еўрапейскім свеце старажытных абсерваторый — Стоўнхендж — мела тую ж структуру.[67] Ста-

ры Запавет падхапіў старажытную традыцыю народаў-суседзяў. Дванаццаць медных валоў падтрымлівалі “меднае мора” — вялізную ёмістасць у храме цара Саламона, у якой мылі ногі святары перад уваходам у храм і набліжэннем да алтара. У Саламона было 12 настаўнікаў над усім Ізраілем “и они доставляли продовольствие царю и дому его, каждый должен был доставлять продовольствие на один месяц в году”.

У Новым Запавеце гэта традыцыя не парушаецца. Дванаццаць валхвоў прынеслі падарункі толькі што народжанаму Хрысту. З цягам часу ў Сына Божага будзе 12 апосталаў. Безумоўна, і ў дадзеным выпадку выкарыстанне сакральнага ліку невыпадковае. Хутчэй за ўсё хрысціянская міфалагема пратрансліравала адвечную касмалагему: Сонца — Ісус Хрыстос, ясныя зоры — вучні яго.

Фальклорная стыхія славянскіх народаў не стала выключэннем у ланцужку гісторыка-культурнага развіцця агульначалавечай цывілізацыі. У казачным эпасе беларускага народа вялікай папулярнасцю карыстаюцца творы пра дванаццаць братоў-малайцоў, якія дапамагаюць у крытычных сітуацыях галоўнаму герою. У казках пра паход героя на “той” свет заключны бой адбываецца з дванаццацігаловым Змеем-Гарынычам.

Асабліва часта лік 12 сустракаецца ў народных замовах самай рознай лячэбна-прафілактычнай накіраванасці. Напрыклад, у замове ад змей гаворыцца:

*“У полі на якоры на белым камяні сядзіць цар Арцямон і царыца Уліта. Прыходзя к ім святы Алістрацій Міхайла: “Што ж вы, цар Арцямон, імесця сабе дванаццаць братоў, дванаццаць пабраціных, і ты, царыца Уліта, імееш дванаццаць сясцёр. Што ж вы іх ня сунімаеця, ня судзяржаеця, па бялу свету рассылаеце?”*[68]

Старажытная міфалагема паўплывала на развіццё сюжэта і ў замовах ад прыстрэку і ад ліхаманак:

*“Ехаў Ісус Хрыстос на вараном кане, на залатом сядле з залатою грэбелькаю. Як зямля з небам выскраслася, усе грэшныя ваксрасліся: дванаццаць сутокаў, дванаццаць прарокаў, дванаццаць урэкаў, дванаццаць прыстрэкаў. Ідзіце, урэкі-прыстрэкі, на чарата, на балата, на сіні клевата”*[69]*; “На полі, на кіяні стаіць дуб Ракітані; на том дубе дванаццаць какатоў, на тых на дванаццаці какатах дванаццаць Цяцюх (цёткаліхаманак), яны зжадаліся, у раба Божага сабіраліся”.*[70]

У вуснай паэзіі беларусаў вядомы паэтычны прыём, калі нейкая зададзеная колькасць (героя ці яго памочнікаў) абавязкова пералічваецца ў прамым або зваротным парадку. Гэты прыём сустракаецца ў кумулятыўных казках, песнях, замовах, лічылках. З’яўленне яго ў фальклорнай паэтыцы магло быць

выклікана рознымі прычынамі, аднак адной з іх магла быць сакральна-магічная. Дакладны, без пропускаў, пералік быў скіраваны на тое, каб не "ўпусціць" (не забыцца назваць) той ці іншай хваробы або праявы Боскай сілы, улады, якая павінна лакалізаваць хваробу і "аднесці" яе ў чортава балота. З такім прыёмам мы сустрэнемся ў замовах прэвентыўна-засцерагальнага характару, напрыклад на захаванне плода:

*"Хіліца ты царыца, радзіла ж ты дванаццаць сыноў, з дванаццаці адзінаццаць, з адзінаццаці дзесяць, з дзесяцёх дзевяць, з дзевяцёх восем, з васьмёх сем, з сямёх шэсць, з шасцёх пяць, з пяцёх чатыры, з чатырох тры, з трох два, з двух адзін. Той жа адзін старшы і большы. Памажы і падымі і на месячку залатнічок пастанаві".*[71]

Безумоўна, усе прыведзеныя прыклады маюць адну і тую ж першааснову: Боскі пачатак у сваёй касмічнай выяве. Прычым зноў жа трэба адзначыць, што менавіта цотны лік задаваў цэласнасць і гармонію, якая арганічна аб'ядноўвала ў сабе мужчынскі і жаночы пачатак (6 братоў і 6 сясцёр).

Але дастаткова да гэтай гарманізаванай, універсальнай, касмічнай манады (12) дадаць яшчэ адну адзінку, як мы адразу ж трапляем у поле дзейнасці амаль што самай незвычайнай лічбы сусветнай культуры — *трынаццаць*. За гэтай лічбай з даўніх часоў вядзецца толькі негатыўная радаслоўная. Карані яе трэба шукаць у старажытнай язычніцкай традыцыі.

Легенда сведчыць, што ў мястэчку Вальгале багі сабраліся на вялікі святочны баль. Было іх дванаццаць. Праз нейкі час, калі свята было ў самым разгары, да іх завітаў няпрошаны госць, бог сваркі і разладу Локі. Гасцей стала 13. Апошні з іх хутка зрабіў сваю справу: гулянка скончылася агульным непаразуменнем, бойкай, у выніку якой загінуў любімец багоў Бальдр. Гісторыя ўтварэння хрысціянства нарадзіла абноўленую легенду, але фінал яе сюжэта практычна не змяніўся. На Тайнай Вячэры Хрыста з нагоды іудзейскай Пасхі таксама было трынаццаць асоб. Адна з іх прынесла найвялікшае няшчасце чалавецтву. Апостал Збавіцеля — Іуда — здрадзіў і выдаў яго. Гэта адбылося ў сераду, у пятніцу Сына Божага ўкрыжавалі (распялі на крыжы). З гэтай нагоды праваслаўныя хрысціяне ў сераду і пятніцу прытрымліваюцца посту. А з тых далёкіх часоў жыве па ўсёй Еўропе нядобрае павер'е: *калі пасадзіць за адзін стол 13 гасцей, нехта з іх абавязкова памрэ (загіне) на працягу гэтага года.*[72] А самымі нешчаслівымі ў годзе лічацца тыя дні, калі чысло 13 трапляе на пятніцу.[73]

# “У ТРЫДЗЕВЯТЫМ ЦАРСТВЕ, У ТРЫДЗЕСЯТЫМ ГАСУДАРСТВЕ”

Ёсць у фальклорнай спадчыне нашых продкаў жанр, які не пакідае раўнадушным ні малога, ні старога. Можна без перабольшання сцвярджаць, што з казкай чалавек нараджаўся, пражываў жыццё, з ёю ж адпраўляўся ў ...ці не ў той самы казачны свет. Пад словы калыханкі і пацешнай казкі люлялі немаўля, з дапамогай просценькіх сюжэтаў казак пра жывёл дзіця ўводзілі ў складаны свет узаемаадносін паміж людзьмі, а таксама чалавекам і навакольным светам, вучылі культуры паводзін, таму, што следам за ноччу надыходзіць дзень, што якім бы цяжкім і складаным не было жыццё, але Дабро заўсёды перамагае Зло.

Калі 12—14-гадовыя хлапчукі адпраўляліся ў начное — пасвіць коней, яны бавілі час даўжэзнымі чарадзейнымі казкамі, сюжэты якіх былі напоўнены дынамічнымі сцэнамі, інтрыгуючымі паваротамі ў развіцці дзеяння, страшэннымі пачварамі, якія, здавалася б, патушы вогнішча і будуць тут як тут. Ды што там хлапчукі, хлопцы-парасткі, якім час прыспешваў браць шлюб, расказвалі і чарадзейныя, і эратычна-навелістычныя казкі на попрадках, вечарынках, у ноч купальскага сяткавання.

Не абыходзілася без казак і ў асяроддзі людзей сталага веку. Бабулі любілі распавядаць пра царэўну-несмяяну, падчарку, пунсовую кветачку; дзяды ж, прыцмокнуўшы ды закруціўшы сівы вус, гнулі сваё: пра Алі-бабу і сорак разбойнікаў, пра салдата, які Ліха адолеў і з тапара кашу зварыў.

Падчас дваццацігадовых фальклорных экспедыцый у шматлікія раёны нашай краіны мне пашчасціла запісаць каля 700 казак амаль што ад трыццаці таленавітых беларускіх казачнікаў. Сярод іх былі і жанчыны, і мужчыны. Мяне заўсёды ўражваў рытуал падрыхтоўкі казачніка да распачынання незвычайнага мастацка-паэтычнага дзейства: выбіралася спецыяльнае месца (каб, крый Божа, не пад бэлькай), чалавек унутрана канцэнтраваўся, выглядаў засяроджаным, бы перанесеным зусім у іншы свет. Некаторыя з іх, як, напрыклад, Вяргун Фёдар Іосіфавіч з в. Скрыгалаў Мазырскага раёна або Мельнікава Кацярына Міхайлаўна з в. Уборкі Лоеўскага раёна, расказалі мне па трыццаць цудоўных рознахарактарных казак. Расказвалі суткамі — казка за казкай, не збіваючыся, не прапускаючы важных дэталей, з захаваннем непаўторных вобразных характарыстык іх герояў.

Недзе пасля трэцяй, а яшчэ больш пасля пятай казкі мяне пачынала здзіўляць дакладнасць, стараннасць і абавязковасць



У час фальклорных вандровак. І.І.Крук і знаўца народных традыцый, казачніца К.М.Мельнікава.

інфарматара ў стаўленні да кожнага твора. Але больш за ўсё здзіўляла тое, як пачыналася і заканчвалася кожная казка: стваралася ўражанне, што казачнік не казку распавёў, а распачаў будаўніцтва новай хаты — гэтак усё было паслядоўна, лагічна ўвязана, перасыпана ўзорамі цудоўных фразеалагізмаў, устойлівых магічных формул, яскравых паэтычных характарыстык. Уражвала вытанчаная закругленасць кожнай казкі. Распачынаючы новы твор, ён ужываў адну і тую ж формулу: "У некаторым царстве, у некаторым гасударстве жылі-былі..." Прамаўляючы гэтыя словы, казачнік нібы адсякаў рэчаіснасць свайго ўласнага існавання і ўзводзіў сцяну паміж жыццём прысутных і жыццём тых, пра каго ён збіраўся расказваць. Усё гэта вяртала ў дзяцінства і прыгадвалася гульня "ў даганялкі". Калі адчуваў, што сіл не хапае, каб уцячы, прыпыняўся, хуценька прачэрчваў вакол сябе круг і гучна прамаўляў: "Чур мяне!" Калі ж пагроза знікала, акружнасць на зямлі выціралася нагой і ты зноў станавіўся ўдзельнікам гульні. Вось так і казачнік, заканчваючы незвычайнае падарожжа ў чароўны свет, "размыкаў" каардынаты яго рэчаіснасці заключнай формулай: "І сталі яны жыць-пажываць ды дабра наживаць".

На маё пытанне: "Навошта за кожным разам распачы-

нацць казку адной і той жа формулай?" К.М.Мельнікава адказала: "Без яе цуду не будзе. А без цуду што за казка!"

Добрыя знаўцы казачнага эпасу ведаюць, што ў багатай скарбонцы беларусаў ёсць казкі, разлічаныя на розны густ, узрост, сітуацыю. Параўнанне іх мастацкіх асаблівасцей паказвае, што казкі для дзяцей (перш за ўсё гэта творы пра жывёл і звяроў) пачынаюцца добра знаёмым: "Жыў сабе дзед ды баба, былі ў іх унукі", "Жылі-былі ў адным лесе лісіца і заяц", "Быў у аднаго гаспадара сабака". Казкі, разлічаныя на зусім маленькіх дзяцей, не патрабавалі выхаду за межы знаёмай ім прасторы. Тут, менавіта тут, на кожным кроку для іх быў цуд. Таму казка магла распачынацца зусім па-будзённаму: "Аднаго разу араў сабе чалавек пад лесам, аж выходзіць да яго мядзведзь..." або яшчэ прасцей: "Сустрэла ліса жураўля", "Ішоў адзін чалавек да лесу па дровы, ажно спатыкае льва"[74].

Падобныя зачыны мае і большасць казак, разлічаных на дарослую аўдыторыю: "Быў адзін такі пан", "У адным мястэчку згадзіўся майстар зрабіць для новага касцёла дванаццаць постацей апосталаў", "Скажу вам не казку, шчырую праўду. Дзе тое было — цяпер я забыўся, бо ўжо, бачыце, старасць. А ведама, калі з чупрыны гінуць валасы, то й памяць — з галавы"[75].

І толькі ўласна чарадзейныя казкі распачыналіся сапраўднымі казачнымі зачынамі: "У некаторым царстве, у некаторым гасударстве жыў-быў цар", "У неякім царстве, у неякім гасударстве, за даўнейшы час, як яшчэ не было нас, жыў сабе адзін кароль да ведзьма-караліха, на яе ліха"[76]. Куды адсылаў або пераносіў казачнік сваіх слухачоў, дзе знаходзіцца тое царства, у якім далей будуць разгортвацца незвычайныя падзеі? У некаторых казках можна сустрэць пэўную дэталізацыю месца дзеяння: "На моры, на акіяне, на востраве Буяне". Аднак і гэты "канкрэтны" адрасат захоўваў таямніцу, якую, відаць, нельга было ўдакладняць далей. Чаму казачнік не меў права гэта рабіць? Можа таму, што дакладнае вызначэнне месца дзеяння, напрыклад родная або суседняя вёска, мястэчка, адразу ж рабіла расказваемае прыземленым, звычайным, знаёмым усім прысутным і тады сам казачнік як чалавек, які бываў і ў "тым" царстве, страчваў сваю загадкавасць і станавіўся звычайным суседам. Не мог дапусціць вопытны казачнік такога стаўлення да сябе! Наадварот, ён ускладняў фармуліроўкі, псіхалагічна дакладна канструяваў пачатак незвычайнага паведамлення, каб нават дарослыя слухачы "забыліся" на тое, што яны сядзяць у хаце, што перад імі знаёмы аднавясковец. А пры дапамозе гэтых вытанчаных слоўных карункаў ён "вырываў" прысутных з каардынат іх зямнога існавання і ці то ўздымаў

высока над зямлёй, каб сапраўды ўбачыць тое далёкае царства, ці то апускаў у марскія глыбіні, каб падплыць, наблізіцца да царства Дабрыні і Шчасця, Дабрабыту і Спагады, Вечнасці і Спакою.

Трэба сказаць, што свае "прафесійныя" сакрэты такім чынам хавалі не толькі казачнікі, а ўсе сапраўдныя майстры, якія займаліся традыцыйнымі беларускімі рамёствамі і промысламі. З тых самых казак вядома, як шаўцы і краўцы "выдумалі" сваю мову зносін, якую не разумеў ніхто з прысутных. Кожны трымаў свае веды ў сакрэце.

На фоне ўсіх гэтых "прафесійных" недагаворак,стараннага кадзіравання каардынат разгортвання казачных падзей нейк нечакана гучыць уступная формула, у якой казачнік быццам зжаліўся і дакладна вызначыў месца будучага дзеяння: "*У трыдзевятым царстве, у трыдзесятым гасударстве жылі-былі*".

Каб лягчэй было зразумець, дзе знаходзіцца тое царства, як у яго патрапіць, чым яно адрозніваецца ад нашага, якія прасторавыя і часавыя асаблівасці для яго характэрны, нарэшце, якія героі ў ім жывуць, трэба акрэсліць кола тых казачных сюжэтаў, дзе развіццё падзей абавязкова звязана з трыдзевятым царствам. Сярод іх перш за ўсё будуць сюжэты тыпу "Бой на Калінавым мосце". Асноўныя падзеі гэтых казак разгортваюцца вакол пошукаў нявесты або прапаўшай сястры, вакол таго, як сын хадзіў на другі бераг ракі ці за мора, каб даведацца, як *там памёршы бацька жыве*. Дарога ў тое царства незвычайная. Гэта не ўезджаны фурманкамі шлях, не ўтоптаны босымі нагамі гасцінец і нават не вузкая сцежка-змейка. Часцей за ўсё гэта невялікая цёмная нара або лаз накшталт калодзежа, прыкрыты вялікім каменем.

Узгадаем саму казку. "Ну, сабраліся ўсе браты ў кучу і паабедалі. Паабедалі, адпраўляюцца яны ў ход. Ішлі, ішлі, ішлі, ішлі, падходзяць — стаіць дуб аграмаднейшы, і пад тым дубам пайшла нара, так, як калодзезь усё роўна". Апусціўся ў нару малодшы брат. "От ён апусціўся і відзіць *там такі ж свет, як ба й тут*. Ён стаў хадзіць там, любапытстваваць і відзіць — стаіць медны дварэц. Ён падходзіць к яму і нідзе не можаць дзвярэй найсці"[77].

У гэтым урыўку больш чым дастаткова розных дэталей, якія прама ці ўскосна дапамагаюць нам зразумець, што нара вядзе ў *"той" свет*, свет нашых продкаў, свет, у якім жыве *Кашчэй Бяссмертны*. Або тры царствы "таго" свету — меднае, сярэбранае і залатое, у якіх жывуць нявесты-прыгажуні, сцеражэ трох-, дзевяці- і дванаццацігаловы Змей-Гарыныч[78].

Сёння існуе шмат публікацый (перш за ўсё кніга Р.Моўдзі

“Жыццё пасля смерці”), дзе даецца безліч аповедаў людзей, якія апынуліся ў стане комы і прайшлі тым даўжэзным калодзежам-калідорам, у канцы якога ззяе дзівоснае святло і часта душу памерлага сустракаюць выявы родных бабулі або дзядулі. Ці не той самы калідор утвараюць людзі, калі з хаты выносяць нябожчыка. Памінальны стол раней таксама меў форму калідора: сталы ставілі ў адзін рад: з аднаго боку садзіліся мужчыны, з другога — жанчыны, а ў тарцы стала, з’арыентаванага да чырвонага кута хаты, садзіліся “людзі ад Бога” — пеўчыя і святар; другі канец стала заставаўся адкрытым. З гэтай нагоды беларусы ніколі не падавалі на памінальны стол акрайцы хлеба, яны абразаліся і ўтваралася яшчэ адна адкрытая структура. Такім жа калідорам ставяць вянкі з хвоі над магілай.

Казачныя аналогіі пошуку нявесты, яе пераход у царства героя адбываецца толькі пасля таго, як жаніх здольны будзе вытрымаць некалькі даволі складаных выпрабаванняў: тройчы перамагчы Змея, падняць нявесту калодзежам у сваё царства, самому з дапамогай птушкі Гамаюн, зноў-такі дзякуючы многім ахвяраванням, вярнуцца да свайго роду і ў рэшце рэшт справіць доўгачаканае вяселле.

Адразу ж узнікаюць параўнанні: ці не закадзіраваны ў казцы добра знаёмы нам вясельны абрад продкаў, пачынаючы ад заручын (пранікнення ў царства нявесты) і заканчваючы выкупам яе напачатку самога вяселля — перад тым як маладыя паедуць да вянца? Дарэчы, мяне часта пытаюць: чаму жаніх пераносіць нявесту па мосце на руках, калі па дарозе дадому ім сустракаецца рака? Зноў-такі казкі дапамагаюць знайсці адказ.

Справа ў тым, што ў больш позніх па паходжанні варыянтах казак герой спрабуе патрапіць на “той” свет, каб паглядзець, як там жыве бацька (пан, цар, кароль). Аказваецца, мяжой паміж “тым” і гэтым светам з’яўляецца вада — рака (калодзеж). Адзін бераг ракі — гэта свет жывых, другі — царства памёршых. Звязвае два берагі стары перавозчык. Такім чынам, мост праз раку (як і парог у хаце) — гэта мяжа паміж двума царствамі. Аб гэтым зноў-такі знаходзім пацвярджэнні ў казках. Іван-царэвіч на “тым” свеце павінен змагацца са Змеем. Сеў герой пад мастом і чакае. Праз нейкі час “уз’язджае Змей на гэты масток, і спатыкнулася яго лошадзь”, пачула, што не тым “духам” запахла. Калі з падземнага царства нявесту выносіць птушка, то і мяжу паміж прасторай нявесты і родам жаніха неабходна пераадолець на руках (на крылах) чалавека.

Дарэчы, цікавыя аналогіі знаходзім мы і ў памінальных

галашэннях нашага народа. Вось, напрыклад, як гучыць невялічкі ўрывачак з галашэння маці па дачцэ:

Усе птушачкі з вы-*Раю* вылятали,
А ты, мая дзевачка, у вы-*Рай* заляцела.

Але ж добра вядома, што птушка — сімвал душы, якая адлятае ў вы-*Рай* пасля смерці чалавека або прылятае да свайго Роду падчас памінальных святаў.

Ролю памежных маркёраў выконваюць у нашых казках Баба-Яга і Калінавы мост. Персанаж Бабы-Ягі яшчэ не атрымаў у даследаваннях нашых навукоўцаў дакладнай шматаспектнай ацэнкі, але ўжо зараз можна беспамылкова сцвярджаць, што яна — таксама як і перавозчык, як і калодзеж — звёнка паміж светам жывых і су-светам (сумежным) продкаў. Адсюль невыпадковай з'яўляецца здвоенасць імя і тая ж палярызацыя ў яе партрэтнай характарыстыцы: адна нага як нага, а другая — касцяная (зноў-такі яскравы атрыбут "таго" свету). Яе хатка на курыных ножках таксама стаіць на мяжы дзвюх прастор: поля — асвоенай тэрыторыі жывых — і лесу — патаемнага, загадкавага, непрадказальнага "свету" продкаў. Баба-Яга дае герою клубочак, які коціцца наперад яго і паказвае дарогу ў чужы свет. Гэтаксама паводзім сябе і мы, калі пад ногі пахавальнай працэсіі кідаем вечназялёныя галінкі хвоі.

Яўнай прыкметай "таго" свету з'яўляецца і такая дэталь, як адсутнасць дзвярэй — уваходу ў замак (аналогія з труной, пра якую ў галашэннях гаворыцца: пабудавалі табе хатачку цёмную: без акон і дзвярэй).

Казачныя пейзажы "таго" свету практычна нічым не адрозніваюцца ад відарысаў гэтага. Такія ж прыгожыя горы, рэкі, азёры, паляны, замкі. Адзінае, што нечакана падсцерагае там героя, дык гэта фантастычны Змей-Гарыныч. Дзіўнае супадзенне: *трыдзевятае царства ахоўвае трох-, дзевяці-, дванаццаціцаловы Змей* (Смерць). Канечне ж, усё гэта далёка не выпадкова. Калі ўзгадаць больш познюю па паходжанні, але вытокамі сваімі адыходзячую ў язычніцтва хрысціянскую міфалогію, то высвятляецца, што *душа пасля смерці чалавека як бы паэтапна праходзіць свае* ***тры царствы****: на трэці дзень яна пакідае хату, на дзевяты — зямлю і толькі на саракавы дзень прадстае перад Богам дзеля вызначэння свайго далейшага лёсу*. У эзатэрычнай літаратуры знаходзім яшчэ адну прамую аналогію: *на дзевяты дзень заканчваецца паміранне фізічнага цела, на саракавы — астральнага*.

Ну што ж, падарожжа можна лічыць закончаным. Казачнае *Тры-Дзевятае царства ёсць не што іншае, як "Той" свет*,

свет продкаў, сімволіка якога надзвычай багата прадстаўлена ў нашай пахавальна-памінальнай абраднасці. Нагадаю яе асноўныя, вузлавыя моманты, у час якіх яшчэ і сёння жывыя ўспамінаюць добрым словам душы, адляцелыя ў вы-*Рай*.

*Тры* — "трацiны", трэці дзень пасля смерці чалавека, дзень развітання з ім, дзень яго пахавання і час правядзення першага рытуальнага ўшанавання.

*Дзевяць* — "дзевяціны", другі памінальны стол, спецыяльны абрад падзякі радні і блізкім за дапамогу. На вячэру запрашаюць толькі дзевяць чалавек.

А што ж за *дванаццацігаловы Змей*, адолець якога цяжэй за ўсіх, але перамога над якім дае магчымасць вярнуць жыццё ў звычайнае рэчышча? Ды гэта не што іншае, як "*угодкі*", апошні памінальны стол, які *спраўляюць праз дванаццаць месяцаў пасля смерці чалавека*. Гэты стол здымаў з сям'і ўсе абмежаванні з нагоды жалобы і дазваляў ёй зноў уключацца ў звычайны штогадовы працоўны і святочны рытм жыцця. На ўзроўні свайго асэнсавання рэчаіснасці і з дапамогай сваіх сродкаў мастацкага ўвасаблення казка дае адказ на гэта пытанне: апусцілі браты самага малодшага брата ў калодзеж, ён ім загадвае: "Ну, вы, братцы, тут даўжны быць круглы год, да гэтага часу, як мяне ўпусціце туды. Ну, а тады як год выйдзе, вы даўжны прыбыць сюды, і я пас (вяроўку) гэты скалатну, і вы мяне выцягніце"[79].

Параўнанне мадэлі "таго" свету з гэтым сведчыць аб вельмі блізкім падабенстве іх канструктыўных кампанентаў. І, безумоўна, на фізічным (энергетычным) узроўні існуе цесная ўзаемасувязь паміж рознымі структурамі нашага Сусвету. У людзей тонкага псіхічнага складу, адораных талентам мастацкага светаўспрымання (паэты, музыканты, спевакі, кампазітары, мастакі, экстрасенсы, народныя лекары і ведуны), гэта сувязь існуе хутчэй за ўсё на падсвядомым узроўні. Інфармацыйным каналам узаемасувязі можа быць сон (узгадайце шматлікія вызначэнні, захаваныя ў нашай мове: сон у руку, вешчы сон, збыўся сон).

Аднак шматлікія рытуальныя дзеянні пахавальнага абраду сведчаць аб тым, што людзі імкнуліся закрыць прамыя каналы інфармацыйнай сувязі. Пахавальны саркафаг, труну рабілі шчыльна зачыненымі, "запячатвалі" ў глыбокай магіле. Аб тым, што сувязь са светам памёршых недапушчальная і можа прывесці да трагічных вынікаў, сведчаць розныя гістарычныя факты. Так, з гісторыі археалогіі вядома, што многія знакамітыя навукоўцы, якія адкрылі старажытныя пахаванні (маўзалеі, склепы) і спрабавалі ўскрыць саркафагі, ці то вар'яцелі пасля гэтага, ці то гінулі пры нечаканых абставінах. Турыстаў,

якія наведваюць знакамітыя егіпецкія піраміды, папярэджваюць аб непрадказальных выніках для стану здароўя тых, хто асмеліцца прайсціся калідорамі Вечнасці.

У сувязі з гэтым мне хацелася б прывесці адно цікавае назіранне з нашага жыцця, у якім, зразумела, праяўляюцца тысячагадовыя ўяўленні нашых продкаў. Мы, сучаснікі фантастычных адкрыццяў у розных сферах навукі, лёгка зжываемся з вопытам папярэднікаў, успрымаем яго як паэтычную фантазію і не спрабуем зазірнуць у вытокі. А давайце задумаемся, чаму ўсе казкі пачынаюцца адной і той жа формулай, у якой асноўныя персанажы пазначаны наступным чынам: “Жылі-былі дзед і баба, былі ў іх унукі”. І вось першае тлумачэнне: старэйшае пакаленне (дзяды і бабулі) — гэта тыя, хто валодае жыццёвай мудрасцю, практычным вопытам, якія патрэбна захаваць для жывых і перадаць нашчадкам (унукам). І ўсё ж, відаць, “той” свет і гэты — прынцыпова розныя інфармацыйныя прасторы, прычым наш — гэта толькі эмбрыён Сусвету, які жывіцца, сілкуецца “тым” светам, і ні ў якім разе не наадварот.

Звернемся да некаторых фактаў нашай мовы. Пра малое дзіця мы часта кажам: “разважае, як стары дзед”. І зусім нечакана гаворым пра нашых састарэлых: “здзяцініўся”. Вось ён, прынцып суіснавання “таго” і гэтага свету: наша жыццё быццам замкнёнае кола, “дзіцячы” вопыт зямнога існавання зусім не патрэбны банку даных Абсалюту, Вечнасці. Схематычна гэта можна паказаць наступным чынам:




А пра тое, што менавіта свет продкаў у многім (перш за ўсё ў культурным плане) вызначае нашы паводзіны, мадэліруе абрадавую практыку, структуруе асноўныя рытуалы, уплывае на нормы этыкету, сведчаць усё тыя ж факты з нашага рытуальна акцэнтаванага жыцця.

Паспрабуем яшчэ раз звярнуцца да алгарытму казачнага трыдзевятага царства і прасачыць, як ён уплывае на структуру вялікіх, складаных, працяглых па часе рытуальна-абрадавых комплексаў і як вызначае характар паводзін асноўных яго ўдзельнікаў.

**1. Структура славянскага пахавальна-памінальнага цыкла.**

| 0 | 3-і дзень | 9-ы дзень | 40-ы дзень | 1год |
|---|---|---|---|---|
| момант смерці (сям'я выключаецца з *гадавога* святочнага кола і пераходзіць на *гадавы* памінальны цыкл) | дзень пахавання (першая памінальная вячэра); сям'я памёршага за памінальны стол не садзіцца; цяжарныя жанчыны і дзеці за памінальны стол не дапускаюцца | другі жалобны стол | трэці жалобны стол | заключны стол памінальнага цыкла (сям'я зноў становіцца ўдзельнікам агульных святкаванняў, але жонцы (мужу) памёршага (ай) забараняецца спяваць да трох год) |

Чаму менавіта ў гэтыя дні адбываецца ўшанаванне памёршага спецыяльнымі рытуальнымі трапезамі? Дакладны адказ на гэта пытанне пакуль што не можа даць ніхто. Але пра тое, што яны далёка не выпадковыя і літаральна пранізваюць усе нашы найважнейшыя рытуальна-абрадавыя комплексы, сведчанняў даволі шмат.

Французскія і амерыканскія фізікі правялі 500 разоў адзін і той жа эксперымент. Яны звярнуліся да насельніцтва сваіх краін з просьбай патэлефанаваць ім адразу ж пасля смерці некага з родных. Побач з чалавекам, які памёр, навукоўцы ставілі спецыяльныя прыборы з датчыкамі і самапісцам, якія фіксіравалі і графічна паказвалі на паперы ўсе змены, якія адбываліся з памёршым. Аказалася, што менавіта ў адзначаныя дні (3—9—40) прыборы фіксіравалі моцную энергетычную інтэнсіўнасць, якая цалкам знікала пасля саракавога дня.

Фізічныя прыборы толькі пацвердзілі тое, пра што сваёй мовай гаварыла і народная, і хрысціянская культура:

**0** — момант смерці, адбываецца раздваенне асобы — душа пакідае фізічнае цела;

**3-і дзень** — дзень пахавання, душа следам за целам пакідае хату;

**9-ы дзень** — душа пакідае зямлю, дзе ёй "пакажуць" два полюсы новага жыцця: рай і пекла;

**40-ы дзень** — роўна ў поўдзень душа апошні раз "прыляціць" дадому, "спаласнецца" ў той рытуальнай чарачцы, якая стаіць на стале ў чырвоным куце (калі прасачыць за гэтым момантам, вадкасць у кілішку абавязкова здрыганецца), і "адляціць" у Вечнасць, каб паўстаць перад Творцам Сусвету і атрымаць прысуд на сваё далейшае існаванне.

Гэтыя ключавыя пазіцыі знаходзяцца ў нашай падсвядомасці і пэўным чынам уплываюць на нашы паводзіны. Менавіта таму мы прытрымліваемся правіла *не гаварыць пра памёршага ніводнага кепскага слова да сарака дзён*. Ці не таму кожны, хто бярэ слова падчас пахавання або на жалобных сталах трэцяга і дзевятага дня, а таксама пры ўспаміне аб нябожчыку з любой нагоды, абавязкова скажа заключную формулу: "*Зямля яму пухам*". А ўжо *на саракавы дзень* мы павінны змяніць яе на зусім іншую: "*Царства яму нябеснае*". Гэтыя словы папярэднічаюць любому ўзгадванню пра памёршага да трох год пасля яго смерці.




Падвядзем некаторыя вынікі. Пры любым успаміне пра памёршага да 40 дзён абавязкова ўжываецца формула-абярэг для жывых і пажаданне для фізічнага цела сканаўшага: "*Зямля яму пухам*". На працягу гэтага часу кожны дзень (хаця б на некалькі хвілін) трэба запальваць у хаце грамнічную свечку.

***Да 40 дзён нельга*:**

гаварыць пра нябожчыка дрэнна ("Не судзі да не судзім будзеш");

"кантактаваць" з рэчамі памёршага, а таксама з магільным пяском;

на стале або сценах дома ставіць ці вешаць партрэт памёршага (ён "забірае" энергію жывых, а пасля 40 дзён, наадварот, душа, патрапіўшая ў Рай, будзе дапамагаць сям'і, асабліва ў дні вялікіх святаў);

уключаць тэлевізар, глядзецца ў тыя люстэркі, якія знаходзіліся ў пакоі, дзе ляжаў памёршы;

наведваць могілкі цяжарнай жанчыне.

Вось яшчэ адно цікавае назіранне. Вартаўніком "таго" свету з'яўляецца Кашчэй Бяссмертны або шматгаловы Змей. Калі галоўны герой казкі ідзе ў "той" свет шукаць сваю нявесту,

яму трэба пазмагацца і перамагчы *трох Змеяў*. У аднаго з іх *тры* галавы, у другога — *шэсць* ці *дзевяць*, а ў трэцяга — *дванаццаць*. Пакуль герой не адолее дванаццацігаловага Змея, ён не можа справіць вяселле. Якую ж культуралагічную шыфраграму захавала для нас казка? Ды толькі тую, якая *перасцерагае-забараняе спраўляць вяселле да году пасля смерці каго-небудзь з дамачадцаў*.

Сёння маладыя амаль не прыслухоўваюцца да гэтых парад і ўстрымліваюцца толькі на працягу сарака дзён пасля смерці. Аднак такія парушэнні вельмі часта прыводзяць да скасавання шлюбу.

Не магу не звярнуць увагу і на тое, што чалавека, які памёр, беларусы называюць "нябожчык". Хрышчоны чалавек, якога некалі яшчэ дзіцем прынеслі ў храм і "паставілі перад Богам", раптам страціў сваю суаднесенасць з Творцам, стаў "*ня-Божым*". Гэта звязана з тым, што Божай, Боскай душа стане толькі на саракавы дзень пасля смерці.

Даўным-даўно пераканаўся ў тым, што за кожным фразеалагізмам прыхаваны духоўны, эзатэрычны, педагагічны, эстэтычны, гістарычны вопыт яго стваральніка — народа. Фразеалагічныя слоўнікі — гэта генетычны код шляхоў фарміравання этнасу і этапаў яго гістарычнага развіцця, моцныя фантомы нацыянальнага духу, каталізатары народнай ментальнасці, шыкоўныя ўзоры-карункі непаўторнай этнічнай моватворчасці. Спасцігаючы глыбінную сутнасць гэтых брыльянтаў народнага духу, мы прыадчыняем таямніцы стасункаў этнасу з навакольным асяроддзем, са сваімі суседзямі, з Космасам і адначасова пранікаем у законы і заканамернасці, прынцыпы мастацкага асэнсавання сваёй уласнай гісторыі ў кантэксце "белага свету" і Вечнага Сусвету.

Раз-пораз мы будзем звяртацца да пытання асэнсавання фразеалагізмаў не з пункту погляду нашага сучасніка, у вачах якога яны перажываюць другую метафарызацыю і губляюць сувязь з першароднымі вытокамі, а з пазіцый гісторыка-культуралагічнага рэканструявання, якое вымагае раскадзіраваць асаблівасці пачатковай метафарызацыі і зразумець яе правобразныя вытокі.

Не аднойчы даводзілася бываць на пахаваннях зімой. Мужчыны пачынаюць закопваць магілу. На вечка труны падаюць *цяжкія* глыбы змерзлай зямлі. Наваколле поўніцца *цяжкім* водгукам-уздыхам "таго" свету. А тым часам з галавы не выходзіць свяшчэнная формула жывых: "Зямля яму пухам". З дапамогай якой логікі можна зразумець і спалучыць гэтыя, здавалася б, несумяшчальныя рэчы?

Адказ на гэта пытанне быў знойдзены зусім нечакана, але

там жа, на могілках. Наша маці пакінула траіх сыноў улетку 1985 года. Роўна праз пяць год не стала і бацькі. Мужчын, якія збіраліся ехаць капаць магілу для бацькі, я папрасіў: "Капайце як мага бліжэй да магілы маці". Яны дакладна выканалі маю просьбу. І вось калі труну апускалі ў магілу, вузкая палоска зямлі не ўтрымала вагі мужчыны, які стаяў у нагах, і абсыпалася. Усе прысутныя са здзіўленнем ахнулі: на дне суседняй магілы стаяла цалюткая труна маці, а побач з ёю і зверху сантыметраў на 25—30 зямлі не было. Якая сіла ўзняла яе над труной і зрабіла "пухам"? На гэта пытанне адказ павінны даць навукоўцы-фізікі. Але зразумела, што нашы продкі дакладна ведалі пра гэты феномен і закадзіравалі яго ў кароткай, але вельмі ёмістай формуле-загадцы: "Зямля яму пухам".

На вялікі жаль, час ваяўнічага атэізму размыў, а то і выкарчаваў з нашай культуры і свядомасці даўнюю народна-хрысціянскую традыцыю. Ужо не ўсе ведаюць як накрыць жалобны стол, у якім парадку пасадзіць за ім гасцей, ды і ўвогуле каго запрашаць у гэтыя дні на памінкі. Некалі было так: на траціны збіралася ўся радня і аднавяскоўцы, якія дапамагалі ў правядзенні рытуальных спраў; на дзевяціны запрашалі толькі 9 чалавек; на сарачыны зноў збіралася ўся радня; на ўгодкі (заключнае ўшанаванне памінальнага цыкла) — таксама ўся радня.

Пасля года ўшанаванне памёршых адбывалася ўжо ў дні агульнарадавых святаў, найперш на Радаўніцу і ў Восеньскія Дзяды. Як гэта ні дзіўна, але і тут фігуравалі ўсё тыя ж містычныя лікі. *Восеньскія Дзяды павінны адзначацца ў трэцюю суботу пасля Пакроваў*, а *Радаўніца — на дзявяты дзень пасля Вялікадня.* Дарэчы, хрысціянскі каляндар (Пасхалія) таксама трымаецца на цыклавой рытмічнасці, у аснове якой ляжаць тыя ж самыя лікі: 9 і 40. Так, *Стрэчанне* адзначаецца *на саракавы дзень пасля Раства Хрыстова*, *Ушэсце святкуюць на саракавы дзень пасля Вялікадня* і г.д.

Такім чынам, здавалася б, адна частка пачатковай формулы разгадана і яе адрасат — "Тры-Дзевятае царства" — канкрэтызаваны ў прасторы — "той" свет. Уласна кажучы, гэта не што іншае, як могілкі і магіла (як калодзеж), якая "запячатана" надмагільным каменем.

Але як быць з другой часткай добра знаёмага казачнага зачыну: "*у трыдзесятым гасударстве*"? Ведаючы ключ да ўсяго метафарычнага шыфру, можна сказаць, што гэта паэтычны паўтор-удакладненне таго ж "трыдзевятага" царства. Справа ў тым, што ў хрысціян каталіцкага веравызнання існуе традыцыя спраўляць імшу на *трыццаты* (!) (тры-дзесяты) дзень

пасля смерці (тое ж, што ў праваслаўных называецца "саракавіны"). Яны запазычылі старазапаветную, іудзейскую традыцыю адпяваць чалавека на працягу трыццаці дзён пасля смерці: "И увидело все общество, что Аарон умер, и оплакивал Аарона весь дом Израилев тридцать дней" (Числа, 20:29); "И взошел Моисей с равнин Моавитских на гору Нево, на вершину Фасти... И умер там Моисей, раб Господень. Моисею было сто двадцать лет. И оплакивали Моисея сыны Израилевы на равнинах Моавитских тридцать дней" (Второзаконие, 34:1, 5, 7, 8).

Аднак і гэта яшчэ не ўсё. Аказваецца, рытмічны код — *3—9—40—1 год*, які пераважнай большасцю дарослых людзей успрымаецца як структураўтваральны ў гадавым цыкле пахавальна-памінальнай абраднасці, на самай справе з'яўляецца універсальным, асноваўтваральным як у радзінна-хрэсьбіннай, так і ў вясельнай абраднасці беларусаў.[80]

## 2. Радзінна-хрэсьбінны цыкл беларускіх народных абрадаў.




**0** — нараджэнне дзіцяці;

**3-і дзень** — адпраўленне дадому бабкі-павітухі, якая прымала роды і дапамагала парадзісе ва ўсім; падзяка ёй, адорванне хлебам-соллю, ручнікамі. Тры дні забаранялася даваць штонебудзь з хаты, каб не нашкодзіць нованароджанаму;

**9-ы дзень** — першае рытуальнае купанне дзіцяці. У ночвы дзяўчынцы абавязкова клалі аднакапеечную манету (каб больш

кароткімі і лёгкімі былі месячныя), а ваду вылівалі пад вішню (каб была прыгажуняй, “чырвонай”). У ночвы хлопцу клалі заручальны пярсцёнак бацькі (каб адгарадзіць ад нядобразычліўцаў і ўсялякіх пашкоджанняў), а ваду вылівалі пад маладую яблыньку (каб плённым і багатым было жыццё). Выбіралі будучае імя чалавека;

**40-ы дзень** — хрышчэнне дзіцяці ў храме; юрыдычнае замацоўванне імя;

**1 год** — да года катэгарычна забаранялася паказваць дзіця ў люстэрка, абразаць пазногці і стрыгчы валасы.

Нарэшце, яшчэ адзін важны і адказны перыяд у жыцці чалавека — яго *вяселле, шлюб* — таксама суправаджаўся доўгатэрміновым цыклам абрадавых дзеянняў.

### 3. Вясельны цыкл беларускіх народных абрадаў.




**0—3 дні** — вяселле, як правіла, доўжылася тры дні;

**9-ы дзень** — “пярэзвы”, “пірагі”: бацькі маладога едуць да бацькоў маладой і святкуюць “сваё” вяселле;

**9—40-ы дзень** — працягваецца “мядовы” месяц у маладых;

**1 год** — да года нявестка прыходзіла дадому толькі на агульнарадавыя памінальныя святы.

Зусім нечаканым з’яўляецца тое, што і развіццё чалавечага эмбрыёна падпарадкавана гэтаму ж прыродна-касмічнаму рытму. Перакананасць у тым, што зачацце адбылося, будзе толькі на *трэці* дзень пасля першай шлюбнай ночы. Ужо на *дзевяты* дзень пачнецца фарміраванне мозгу чалавека (ці не таму так востра стаіць праблема вызначэння крайняй мяжы, якая дазваляе зрабіць аборт або ўвогуле яго забараніць), на *саракавы* дзень у арганізме цяжарнай жанчыны ажыве другое сэрца. Увогуле перыяд цяжарнасці звязаны ўсё з тымі ж лічбамі: *сорак* тыдняў, або *дзевяць* месяцаў.

Гэтыя ж лічбы вызначалі ўзаемаадносіны чалавека з жы-

вёльным светам. Аказваецца, пасля ацёлу каровы гаспадыня лічыла ўдоі. Толькі пасля *трэцяга* падпускала да каровы цяля, пасля *дзевятага* — варыла малодзіва сваім дзецям, а пасля *саракавога* можна было піць сырадой.

Аднойчы позна вечарам слухаў радыёперадачу пра знакамітую французскую спявачку Эдзіт Піяф, якая доўгі час была наркаманкай. Калі яе ў трэці раз прывезлі ў рэабілітацыйны дыспансер, то доктар, высветліўшы, наколькі свядомым было рашэнне спявачкі, тут жа папярэдзіў: самымі цяжкімі, крызіснымі будуць ... 3, 9 і 40-ы дні лячэння.

Прыведзеныя схемы і аналогіі паміж рознымі плынямі чалавечага (і не толькі) жыцця пераконваюць, што *пераход душы ў свет Вечнасці* пасля смерці чалавека *доўжыцца сорак дзён*.

У адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі душу гэту вясною з вы-*Раю* прыносяць беларускія сакральныя птушкі: жураўель, бусел, ластаўка і інш. Падкінуць яны душу ў капусту, а мы яе там знойдзем і будзем радавацца папаўненню ў хаце. Але ж дакладнай датай вяртання “сарака саракоў” з вы-*Раю* з’яўляецца дзень пачатку вясны — 9 сакавіка. Калі гэту дату падаць лічбамі, то атрымаецца добра знаёмая паслядоўнасць: 03 (месяц) — 09 (дзень) — 40 (выр’яў); ці больш дакладнай будзе сітуацыя рытуальнай люстэркава-сіметрычнай перавернутасці: свята Саракоў (40) адзначаецца дзевятага (09) сакавіка (03).

Перакананы, што яшчэ шмат таямніц хаваецца за гэтымі лікамі-сімваламі, своеасаблівымі магічнымі знакамі, якія ўплываюць на наша жыццё, дзякуючы свайму касмічнаму паходжанню.

## СОРАК

Сорак — адзін з самых незвычайных і супярэчлівых па сваёй інфарматыўнай напоўненасці лікаў у традыцыйнай культуры славянскіх народаў. Як і лік сем, сорак не мае выразна акрэсленага апазіцыянера, аднак з шырокага кола рытуальна-абрадавых, сакральна-магічных і утылітарна-прагматычных кантэкстаў вынікае: калі лік не ўтварае бінарнай апазіцыі, ён сам становіцца амбівалентным і можа аб’ядноўваць у сабе прыкметы разнаполюснай накіраванасці.

Неабходна адзначыць, што лік сорак з’яўляецца ў значнай ступені структураўтваральным у пабудове беларускага народна-хрысціянскага календара. Вядома, што час правядзення найбольш значных яго святаў прыпадае на асноўныя фазы ў

руху Сонца па небасхіле: Каляды і Купалле — да зімовага і летняга сонцастаяння, а Вялікдзень і Багач — да веснавога і асенняга раўнадзенства. Астатнія чатыры найважнейшыя святы (Масленіца, Сёмуха—Тройца, Жніво—Спас і Восеньскія Дзяды) адзначаліся ў роўных прамежках паміж "фазавымі" святамі (на мяжы пор года). Калі ад гэтых адрэзкаў часу адняць дні саміх святкаванняў, то атрымаецца, што паміж галоўнымі святамі нашага календара будзе прыкладна 40 дзён. Столькі ж доўжыўся пост Ісуса Хрыста. Зразумела, што сённяшняя праваслаўная сістэма чатырох пастоў суадносілася непасрэдна з гэтай біблейскай міфалагемай. Хутчэй за ўсё, што ў старажытнасці зімовы перадкалядны (Піліпаўка) і вясновы (Вялікі) пасты таксама былі па сорак дзён, а вось летнія — Пятроўскі і Спасаўскі — разам мелі працягласць каля сарака дзён.

Фальклорна-этнаграфічныя крыніцы, архіўныя матэрыялы і даныя сучасных палявых даследаванняў пераканаўча сведчаць, што лік сорак быў вызначальным у абрадавых падзеях дня святкавання Саракоў (Сорақі, Саракі, Сорак Саракоў, Сорак Вялікамучанікаў). Лічылася, што менавіта ў гэты дзень да нас з вы-*Раю* прылятае "сорак саракоў" або "сорак выр'яў", таму рытуальныя дзеянні, атрыбуты, якія суправаджалі магічны аспект свята, а таксама печыва ўтрымлівалі ў сабе міфалагему сорак.

На Беларусі ў гэты дзень выпякалі сорак якіх-небудзь мучных вырабаў ("галёпы", булачкі, галушкі, варэнікі, бабкі, кацяшкі, а таксама піражкі арнітаморфнага тыпу: "жаваранкі", "кулікі", печыва ў форме лапы бусла), якія часткова з'ядаліся дома, а астатнімі адорвалі дзяцей у тых сем'ях, да якіх хадзілі ў госці; некалькі штук пакідалі для наступных святаў або важных гаспадарчых падзей (напрыклад, для першага выгану скаціны ў поле)[81].

Абрадавая практыка гэтага дня была не вельмі разнастайнай. Дзяўчаты варажылі аб замужжы: трэба было сорак разоў падскочыць на дошцы, пакладзенай упоперак палена, і не зваліцца або зламаць сорак трэсак, тады муж будзе высокі. Гаспадыня кідала на сцяну хлява сорак саломін і глядзела, колькі з іх завісне: столькі яек будуць несці куры штодзень.

У народным календары з гэтым днём звязаны шэраг прыкмет і павер'яў. Найбольш пашыраным сярод іх з'яўляецца павер'е аб тым, што ў гэты дзень з выраю вяртаецца сорак выр'яў (буслы, жураўлі, жаўрукі і інш.) і кожная з птушак прынясе ў сваё гняздо сорак галінак. Ёсць такое назіранне: калі на Сораکі будзе мароз, то і пасля іх будзе яшчэ сорак замаразкаў. Дарэчы, гэты ж алгарытм звязаны з летнім святам у гонар Іллі Грамавержца (2.08): "Калі на Іллю дождж, то і пасля Іллі сорак дзён тож".

Адзначым і тое, што лік сорак з'яўляецца ключавым ва універсальным космапланетарным і макракультурным рытме, у адпаведнасці з якім разгортваюцца ўсе асноўныя рытуальна-абрадавыя комплексы, звязаныя з жыццём чалавека на гэтым свеце і паслясмяротным пераходам "у тры-дзевятае царства". Менавіта саракавы дзень пасля смерці з'яўляецца найважнейшым у вырашэнні далейшага лёсу душы нябожчыка, на саракавы дзень пасля вяселля заканчваўся "мядовы месяц у маладых", на саракавы дзень хрысцілі ў храме немаўля; жанчына, якая нарадзіла, не мела права да сарака дзён наведваць храм. З усяго гэтага вынікае, што *лік сорак — двухаблічны Янус*: з аднаго боку, ён скіраваны ў свет продкаў (у гэты дзень душа адлятае ў вы-*Рай*), а з другога — з'яўляецца трансферам паміж выраем і светам жывых (узгадайце: бусел у гэты дзень (на Сракі) прыносіць душу з выраю і "падкідвае ў капусту"). Двухасабовасць ставіць лік сорак у адзін рад з казачнымі персанажамі накшталт Бабы-Ягі, якая жыве якраз на мяжы поля і лесу (зоны Жыцця і Смерці) або "лётае ў ступе" (пра нябожчыка кажуць: "душа адляцела", а каб гэта адбылося лягчэй, адкрываюць у печы юшку ці душку).

Сімволіка ліку сорак як памежжа, як своеасаблівая лімінальная зона ў пахавальным і іншых абрадах (вядома, што жанчына — на ўвесь перыяд цяжарнасці, а таксама нябожчык, магільны пясок і адзенне памёршага, люстэрка і фотаздымак — да сарака дзён з'яўляюцца небяспечнымі для прамых кантактаў з жывымі) паслужыла падставай *да ўзнікнення забароны жывым адзначаць сваё саракагоддзе*.

У гэтым кантэксце зусім нечакана можна інтэрпрэціраваць прыказку: "Адна сарока — адна марока, сорак сарок — сорак марок". Птушка сарока (у назве якой ужо закладзены лік сорак) у міфалогіі лічыцца, як і варона, птушкай-вястункай, якая прадказвае, вяшчуе аб лёсе чалавека, аб яго хуткай смерці (мрак, сумеркі, змрок, змярканне, маркотны і д.п.). На Беларусі распаўсюджана павер'е: калі птушка стукае ў акно, то хутка памрэ нехта з гэтай сям'і.

Дзякуючы сваёй моцнай абрадавай уплывовасці лік сорак атрымаў пашырэнне і ў шэрагу гаспадарчых спраў, у аснове якіх ляжыць магія, скіраваная на нармалізацыю і гарманізацыю становішча, а таксама рэгламентацыі звычаёвага права, якія маюць прэвентыўна-папераджальны характар. Напрыклад, жанчынам пасля родаў забаранялася сорак дзён хадзіць у гумно. Калі карова пасля ацёлу з'ела "месца" ("пасцель"), то малодзіва можна было ўжываць толькі пасля сарака ўдояў. Калі карова ці конь неаднаразова спрабавалі вярнуцца да былых гаспадароў, трэба было напрасці нітку на ўзыходзе сонца,

завязаць на ёй сорак вузлоў, чытаючы перад кожным "Багародзіцу", а затым нітку прывязаць да шыі жывёліны. Сані або калёсы, на якіх везлі нябожчыка на могілкі, пасля пахавання перакульвалі каля вёскі і пакідалі на сорак дзён.[82]

Шматразова лік сорак выкарыстоўваецца ў кантэксце пахавальна-памінальнай абраднасці. У некаторых мясцінах пад кожны вугал труны клалі па дзесяць манет (усяго сорак), сорак аднакапеечных медных або срэбных манет кідалі ў магілу. На Палессі вядомы звычай "падымаць (уздымаць, качаць) паветра" — памінаць у храме нябожчыка на саракавы дзень пасля смерці або анучай, якой выцiралі (абмывалі) сканаўшага, махаць па паветры, а затым выкінуць яе ў двор.

У рускай народнай традыцыі можна сустрэць такія сентэнцыі: "сорок лет: прости, мой век", "сорок лет бабий век".

Трэба адзначыць, што лік сорак неаднаразова ўзгадваецца і ў Біблії, праўда часцей кантэксты яго ўжывання маюць негатыўнае адценне. Напрыклад, у Законе Маісея аб скасаванні шлюбу гаворыцца: "И если виновный достоин будет побоев, то судья пусть прикажет положить его и бить при себе, смотря по вине его, по счёту сорок ударов можно дать ему, а не более, чтобы от многих ударов брат твой не был обезображен перед глазами твоими" (Второзаконие, 25:2—3).

## ДАТА НАРАДЖЭННЯ І ЛЁС ЧАЛАВЕКА, АБО КВАДРАТ ПІФАГОРА ДАПАМАГАЕ ЗАЗІРНУЦЬ У СВАЮ БУДУЧЫНЮ

Апошнім часам стала з'яўляцца мноства публікацый, у якіх робяцца спробы ўвязаць між сабою лічбавы код імя чалавека з яго лёсам. Сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі даюць магчымасць прааналізаваць тысячы імёнаў найбольш знакамітых людзей планеты і вывесці агульныя заканамернасці гэтай касмічна-асабовай узаемазалежнасці.

Хацелася б прапанаваць чытачам адну з найбольш універсальных і простых схем, якая грунтуецца на квадраце Піфагора і дае магчымасць хоць крыху разабрацца ў сваім характары, сваіх талентах і здольнасцях, прааналізаваць негатыўныя фактары ўласнага жыцця і паспрабаваць у пэўнай ступені іх падкарэкціраваць. Веданне гэтых кодаў дапаможа ў нейкай ступені наладзіць унутрысямейныя адносіны, стварыць шчырую, дабразычлівую і творчую атмасферу. У аснове квадрата Піфагора ляжаць поўная дата нараджэння чалавека і некалькі вытворных ад яе лікаў. Але ўсё па парадку.

Бярэм адвольную дату нараджэння, напрыклад, 6.05.1962 г.

З яе складаных частак утвараем шэсць рабочых лікаў, якія дапамогуць раскрыць мікракосм асобы (6, 5, 1, 9, 6, 2):

1. Падсумоўваем усе лікі даты нараджэння: 6+5+1+9+6+2=29 (першая пазіцыя).

2. Складваем паміж сабой лікі першай пазіцыі: 2+9=11.

3. Ад сумы ўсіх лікаў трэба адняць падвоены першы лік дня нараджэння: 29 - (2x6) = 17.

4. Складваем між сабою лікі трэцяй пазіцыі: 1+7=8.

Далей у адзін радок выпісваем дату нараджэння і ўсе атрыманыя лікі: 6.05.1962, 29, 11, 17, 8. Малюем квадрат Піфагора і разносім іх па клетках:

| | | |
|---|---|---|
| 1<br>4 | 4<br>— | 7<br>1 |
| 2<br>2 | 5<br>1 | 8<br>1 |
| 3<br>— | 6<br>2 | 9<br>2 |

У клетку пад нумарам адзін выбіраем усе адзінкі, у клетку пад нумарам два — усе двойкі і так да 9. Затым расшыфроўваем кожную лічбу, памятаючы адну ўмову: чатыры лічбы ў кожнай клетачцы — ідэальная сітуацыя; менш і больш — сітуацыя, якае патрабуе паляпшэння.

Кожны лік сімвалізуе сабой тыя ці іншыя асаблівасці чалавека: здольнасці, рысы характару, здароўе і г.д., а напоўненасць лічбамі кожнай клеткі ў квадраце сведчыць аб ступені праяўлення пэўнай якасці.

№ 1 — воля чалавека;
№ 2 — упарадкаванасць жыцця;
№ 3 — навуковыя здольнасці;
№ 4 — код здароўя;
№ 5 — яснабачанне;
№ 6 — сувязь з зямлёй;
№ 7 — таленты;
№ 8 — сувязь са сваім родам;
№ 9 — інтэлект.

І апошняе. Дата нараджэння хавае ў сабе і нашы жыццёвыя ўзлёты і падзенні. Для таго каб пабудаваць парабалу жыцця, трэба зрабіць два простыя матэматычныя дзеянні:

1. Дзень нараджэння неабходна памножыць на месяц нараджэння: 6x5=30.

2. Атрыманую лічбу памножыць на год нараджэння: 1962x30=58 860.

Нарэшце задаем сістэму каардынат, у якой вертыкальная

вось будзе адзначаць узровень творчага патэнцыялу (УТП) у пэўны прамежак жыцця (ПЖ) — гарызантальная вось. Вектар жыцця дзеліцца на дванаццацігадовыя цыклы.

Бярэм утвораны лік 58 860 і на аснове яго будуем парабалу. Першы лік (5) адпавядае 12 гадам жыцця, другі (8) — 24, трэці (8) — 36 і г.д.




Дыяграма сведчыць, што чалавеку наканаваны даволі высокі індэкс жыцця: узрост з 24 да 48 самы прадуктыўны.

Паверце і праверце. А раптам і спраўдзіцца.

# СІМВОЛІКА ДЗЁН І ДАТ У НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

Позняй восенню 1993 года мяне запрасілі на сустрэчу з работнікамі культуры Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У Мінск я вяртаўся маршрутным аўтобусам, які ішоў з Лунінца. Жадаючых ехаць было даволі шмат. Услед за натоўпам паволі ўціснуўся ў аўтобус і пакрочыў да свайго месца. Абодва крэслы былі не занятымі. Сеў каля акна, а побач са мной уладкаваўся малады хлопец. Праз некалькі хвілін да нас падышла сімпатычная дзяўчына і сказала: “Даруйце, калі ласка, маё месца...” — і назвала нумар месца майго суседа. У адказ хлопец паказаў свой квіток, на якім значыўся той самы нумар. Доўга не спрачаліся. Як толькі дзяўчына ўселася, я запытаў: “І часта так шанцуе?” — “Часта, — адказала яна. — Я ж —

“панядзелак!”. Па дарозе ў Мінск мая суседка расказала пра добры тузін неверагодных здарэнняў, якія літаральна на кожным кроку сыпаліся на яе. Дзяўчына была пераканана, што прычынай усіх дзівосаў быў дзень яе нараджэння — панядзелак.

Я адразу ж пачаў успамінаць нашы сямейныя “правілы”, звязаныя з пачаткам вясковых работ, а таксама розныя перасцярогі, якімі ў свой час дзялілася мая бабуля. Іх аказалася дастаткова шмат, але ў нейкую лагічную сістэму яны не складваліся. Вось тады мне захацелася звярнуцца да набыткаў культур розных народаў свету і паспрабаваць упарадкаваць звесткі пра кожны дзень нашага тыдня. Аказалася, што ў культуры існавала даволі складаная і разгалінаваная сістэма ведаў, у адпаведнасці з якой нашы продкі штодня суадносілі свае клопаты, справы і паводзіны. Кожны дзень тыдня меў сваю “партрэтную” характарыстыку. Ніжэй прыводзяцца толькі некаторыя звесткі, якія, на мой погляд, і да сённяшняга часу не страцілі сваёй актуальнасці.

## ПАНЯДЗЕЛАК (*ЦЯЖКІ*)

Першы дзень тыдня лічыцца цяжкім і нешчаслівым. Вядома некалькі версій адмоўнага стаўлення да гэтага дня. Адны сцвярджаюць, што панядзелак — дзень цяжкага пахмелля пасля нядзельнага святкавання. Іншыя спасылаюцца на тое, што пасля дня адпачынку не адразу хочацца брацца за справу.

Каб зразумець прычыны негатыўнага стаўлення беларусаў і наогул славян да панядзелка, трэба ўпісаць яго ў больш шырокі кантэкст аднародных з’яў, дамінуючай і яднаючай рысай якіх будзе *сімволіка пачатку* любой справы: сева, зажынак, родаў, радзінаў, вяселля, дня, тыдня, года. Народная мудрасць сведчыць:

*Не пашанцавала з ранку, не пашчасціць і вечарам.*
*Нарадзілася цялятка з плямкай — з плямкай і памрэ.*
*Як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе.*

У рускіх прыказках, узятых, напрыклад, са слоўніка Ул. Даля, выкарыстоўваецца менавіта гэты алгарытм для ацэнкі панядзелка як ключавога, вызначальнага моманту, які мадэліраваў жыццё чалавека (яго справы, паводзіны, гаспадаранне) на ўвесь набягаючы тыдзень:

*С понедельника деньги выдавать — всю неделю расход.*
*С понедельника на всю неделю — счастье или несчастье.*
*Чихнуть в понедельник — корысть на неделю.*

Балгары таксама лічаць: калі ў панядзелак раніцай атрымаць грошы, то ўвесь тыдзень будзеш іх атрымліваць; калі ж аддаць, то ўвесь тыдзень вяртаць (аддаваць) будзеш.[1]

Надзвычайная важнасць *моманту пачатку* чаго-небудзь адлюстравана ў рытуалах, якія суправаджаюць пабудову хаты, печы, улазіны (уваходзіны ў новы дом) або проста першае наведванне госцем новай хаты (напрыклад, пераступіўшы парог, трэба сыпануць на падлогу жменю манет, каб у хаце заўсёды дастатак быў).

У час экспедыцый не раз даводзілася чуць параду аб тым, што трэба абавязкова звяртаць увагу на паслядоўнасць сваіх дзеянняў у ранішні час, калі вы толькі прачнуліся і пачынаеце мыцца (*спачатку толькі рукі*, а затым ужо чыстымі рукамі твар і г.д.) або прыбіраць у хаце (напрыклад, ложак, на якім вы спалі, нельга прыбіраць адразу, няхай "астыне", а то можаце сябе "запячатаць").

Разам з тым панядзелак — "мужчынскі" дзень, што дапамагае зразумець некаторыя асаблівасці сялянскага гаспадарання. Напрыклад, не пажадана было садзіць курыцу на яйкі, таму што маглі вывесціся адны пеўнікі.[2] І наадварот, гэты дзень лічыўся спрыяльным для пасадкі фасолі, агуркоў і гарбузоў; вечар панядзелка — для квашання капусты.

Меркавалі, што менавіта ў ноч з панядзелка на аўторак можна зачаць хлопчыка.

З цягам часу з'явіліся дадатковыя перасцярогі, звязаныя з гэтым днём: не пажадана класціся ў бальніцу (доўга хварэць будзеш), а таксама звяртацца па дапамогу ў гэты дзень да знахараў, распачынаць лячэнне цяжкіх або задаўненых захворванняў.[3]

На гэтым жа прынцыпе трымаецца і агульнавядомая выснова, сфармуляваная ў прыказцы "*У панядзелак нават цыган у дарогу не збіраецца, бо не пашанцуе*": чалавек, які ўсё жыццё вандруе па свеце, і той трымаецца перасцярогі не рушыць з месца ў першы дзень тыдня. Калі ж гаворка ідзе пра селяніна-земляроба, які "прыкіпеў" да свайго лапіка і пакідае яго толькі, калі трэба патрапіць на базар або кірмаш, гэта перасцярога набывае характар табу. Ці яшчэ: сон, які прысніцца ў панядзелак, збываецца толькі для тых людзей, якія нарадзіліся ў гэты дзень; каб быць заўсёды пры грашах, нельга ў панядзелак стрыгчы пазногці, і г.д.

Разам з тым беларускія легенды, відаць, не без уплыву біблейскіх сюжэтаў, апавядаюць пра тое, што "ў панядзелак свет снаваўся". У старажытнай ведыйскай традыцыі лічыўся днём ушанавання бога Хорсы.

## АЎТОРАК (*РАДАЎНІЦА*)

Другі дзень тыдня лічыцца адным з найбольш спрыяльных для пачатку важных для гаспадаркі і значных для сям'і спраў. Можна смела адпраўляцца ў далёкую дарогу: абавязкова пашчасціць, паездка будзе выніковай. Відаць, менавіта мужчынскі пачатак (гэта "мужчынскі" дзень) у сукупнасці з сімволікай цотнага дня вызначылі станоўчае стаўленне да аўторка і прадказвалі поспех у задуманай або распачынаемай справе, напрыклад: пайсці ў сваты — не атрымаць "ад варот паварот", адняць дзіця ад грудзей — яно не будзе прасіць сусла; чалавек, які народзіцца ў гэты дзень, пражыве доўгае і шчаслівае жыццё.

Звычайна ў аўторак або чацвер (цотныя, шчаслівыя дні) распачыналі будаўніцтва новай хаты, сеялі яравыя, садзілі курыцу на яйкі, квасілі капусту, спраўлялі зажынкі.

Разам з тым сярод славян існуе павер'е, якое папярэджвае: не пазычай ніколі грошай у аўторак, усё жыццё хапаць не будзе.[4]

Менавіта на аўторак на другім паслявялікодным тыдні прыпадае Радаўніца. Гэта адзіны выпадак, калі дзень ушанавання продкаў трапляе не на суботу. Прычынай таму, відаць, з'яўляецца парадкавы нумар гэтага дня — дзевяты, які ў структуры цыкла абрадаў ушанавання памерлага лічыцца адным з ключавых ("дзевяціны").

Сон, які прысніўся ноччу ў аўторак, можа збыцца толькі праз 7—10 год.[5]

## СЕРАДА (*ГРАДАВАЯ*)

Сярэдні, "жаночы" дзень тыдня, якому адпавядае няцотны лік "3", у славян-хрысціян лічыцца нешчаслівым, посным, таму што якраз у сераду Іуда здрадзіў Ісусу Хрысту і выдаў яго.

Серада на чацвёртым тыдні Вялікага посту называецца "перапалавіннем" — пост "ломіцца" напапалам, пачынаецца яго другая палавіна.

Калі гэты дзень трапляў на "маладзіковую" фазу Месяца, ён лічыўся спрыяльным для закладкі хаты або печы.[6] У той жа час у сераду забаранялася пачынаць сеў, хадзіць у сваты, збірацца ў далёкую дарогу, бяліць печ, прасці, купаць дзяцей; парасяты, якія з'явяцца на свет у сераду, прападуць.[7]

На Палессі, каб засцерагчы пасевы ад граду, ушаноўвалі Градавую сераду[8] — першую пасля Тройцы або чацвёртую пасля Вялікадня (у розных месцах).

Сон, які прысніўся ў ноч з серады на чацвер, мае прароцкае, прадказальнае значэнне.[9]

Славянскія знахары раяць у гэты дзень здымаць цяжкія нагаворы, закляцці, лячыць родавую гарачку.

У праваслаўных хрысціян поснай лічыцца не толькі серада, але і пятніца. Магчыма, гэтую акалічнасць падкрэсліваюць некаторыя прыказкі: "Чаго ты косішся, як серада на пятніцу" або "Надуўся як серада на пятніцу". Пра чалавека, у якога відаць споднае, кажуць: "Серада з-пад пятніцы тырчыць".[10]

У сувязі з тым, што посных дзён два, на Беларусі ўзнікла легенда пра тое, які ж з іх лічыцца больш важным, праўда, канчатковы адказ на гэта пытанне не даецца[11]:

"Серада і Пятніца сустрэліся раз на растанцох ды й пашлі далей разам. От ідуць яны да йдуць да й сустракаюць чалавека, каторы варочаўся з кірмашу дамоў. Параўняўся чалавек да як зірнуў, што ідуць якіясь падарожныя жанчыны, сказаў ім "дабрыдзень" да й паехаў далей. Адышліся Серада з Пятніцаю да й пачалі спрачацца, каму гэта чалавек даў "дабрыдзень". Адна кажа — мне, а другая — мне. Доўга спрачаліся яны, нарэшце згадзіліся вярнуцца да папытаць самога чалавека. От яны пераляцелі назад да й зноў сустракаюць таго чалавека. Зірнуў чалавек да адразу й пазнаў, што гэта тыя самыя.

— Што за ліха, — думае ён, — што гэта за праява. Хіба якая марока. Баццэ я сустрэў іх на растанцох ці кала павараткі, а тут ці ося ад'ехаў, а яны зноў ідуць насустрэк. Але ж людзі кажуць: бога хвалі да й чорта не гняві, бо часам ліхое бога перамагае. Ліха іх вазьмі, дам ізноў ім "дабрыдзень".

Тут ён аж целюхнуў да й кажэ:

— Дабрыдзень!

— Чалавеча, — пытае Серада, — каму ты даў дабрыдзень?

— Чаго? Тпру! Каб цябе ваўкі зарэзалі! — крыкнуў чалавек на каняку, супыняючы яе.

— Каму ты даў дабрыдзень? — пытае ўжо Пятніца.

Чалавек зірнуў та на адну, та на другую да й кажа:

— А ці я ведаю! Богі вас ведаюць, хто вы такія.

— Мы Серада й Пятніца, дак каго ты больш шануеш, сераду ці пятніцу?

— І серада й пятніца добрыя дзянькі. Мы іх і шануем.

— А каго больш?

— Звесна, гэта посныя дні. Поп, як едзіць па малітве, та заўжды нам кажа, каб мы пасцілі і сераду, і пятніцу.

— Але каго больш?

— Каго? Мабыць жа, пятніцу, бо сераду ляхі саўсім не посцяць.

— Не, але каго вы больш любіце, сераду ці пятніцу?

— Мы больш любім нядзельку, бо гэта свята.

— А з нас каго больш?

— У серадную ўсё ядуць, а ў пятніцу ні прадуць, ні аруць.

Пабачылі Серада і Пятніца, што ад хітрага мужыка нічога не дапытаешся, плюнулі да й пашлі далей. Мужык ад'ехаў, азірнуўся, ці няма каго, да й кажа:

— Ото ж, патаскухі, яшчэ пытаюць, каго мы больш шануем. Абедзве голадам морацъ да яшчэ пашаноты хочуць. Той пашаноты нажыве, хто нам есці дае".

Нормы звычаёвага права беларусаў патрабуюць: "У сераду не смейся, у Пятніцу не плач".

## ЧАЦВЕР (*ЧЫСТЫ*)

"Мужчынскі" дзень, якому адпавядае цотны лік "4". Лічылася, што аўторак і чацвер (як цотныя дні) найбольш спрыяльныя для пачатку пабудовы хаты (каб у ёй усяго было ў пару), прычым пажадана, каб час узвядзення новабудоўлі ахапіў Тройцу (узгадаем рускую прыказку "Без Троицы дом не строится").[12]

Увогуле беларусы былі перакананы, што гэта самы спрыяльны дзень для засолкі або квашання прадуктаў харчавання. У той жа час забаранялася садзіць гародніну і саліць сала, бо дзень лічыўся "чарвівым", відаць, на падставе таго, што у назве дня была літара "р".

Як правіла, у чацвер хадзілі па вёсцы і запрашалі гасцей на вяселле; распачыналі жніво, спраўлялі зажынкі.

Каб быць багатым на працягу года, толькі ў чацвер трэба было стрыгчы пазногці (на маладзік), а таксама есці бліны на Масленічным тыдні. Менавіта ў гэты дзень, як сцвярджаюць беларускія знахары, лепш за ўсё выконваць любоўныя нагаворы (прысушкі).[13]

У язычнікаў, хутчэй за ўсё, гэта быў святочны, выхадны дзень (накшталт нядзелі ў хрысціянскія часы). Захаваўся рытуальны дыялог, які пацвярджае, што вяселлі даўней спраўлялі менавіта ў гэты дзень:

— Калі жаніцца будзеш? — пыталіся хлопцы ў свайго сябра-пераростка.

— Пасля дождждычка ў чацвер! — адказваў той.[14]

На працягу года ўшаноўвалі некалькі чацвяргоў: *на Масленічным тыдні, перад Вялікаднем, на Велікодным тыдні, перад Сёмухай*.

У чацвер на Масленічным тыдні, які лічыўся днём бога Воласа (Вялеса) — ахоўніка хатняй жывёлы, аб'язджалі мала-

дых коней, а таксама на высокі пагорак за вёскай вывозілі саламянае чучала, каб затым у нядзелю спаліць яго.[15]

У *Чысты чацвер* трэба было пакупацца ў крынічнай вадзе на ўзыходзе сонца (пакуль воран сваіх дзетак не пакупаў), тады твар будзе чыстым і белым. У больш позні час гэты абрад быў заменены мыццём у лазні.[16]

На Віцебшчыне ў Чысты чацвер на ўвесь дзень на полі ставілі які-небудзь посуд з вадой. Гэта вада лічылася "святой" і валодала гаючымі якасцямі: напрыклад, калі карова пачынала даіцца крывёю, то яе вымя трэба было абцерці змочанай у гаючай вадзе рукой.[17]

У беларускіх валачобных песнях можна сустрэць наступныя апісанні Чыстага чацвярга і тых сялянскіх клопатаў, якія з ім былі звязаны: "Чысты чацвер вулкі чысце, дваркі мяце, слядкі кладзе святому Вялічку", "Чысты чацвер ячмень засяваець".

У каталіцкіх храмах званы заціхаюць у чацвер на Страсным (перадвелікодным) тыдні і маўчаць да паўдня нядзелі.

На поўдні Беларусі ў чацвер на Велікодным тыдні хадзілі на могілкі ўшаноўваць продкаў (Наўскі Вялікдзень),[18] а ў Вілейскім павеце ў чацвер перад Дзядамі спраўлялі "прыдзедкі", каб паесці і папіць уволю.[19]

На Беларускім Палессі існавала традыцыя рашчыняць каравай у чацвер, аднак калі хтосьці з маладых нарадзіўся менавіта ў чацвер, то звычай патрабаваў рашчыняць на дзень раней (у сераду), у рэдкім выпадку — у пятніцу. Пры гэтым імкнуліся распачынаць адказную справу ў той момант, калі сонца хоць на хвіліну выгляне з-за хмар, каб жыццё маладых не было пахмурным.

## ПЯТНІЦА (*ПАРАСКЕВА*)

"Жаночы" дзень, якому адпавядае няцотны лік "5". Лічыўся самым спрыяльным для пасадкі і прапалкі цыбулі. Але ў гэты дзень не раілі вывозіць гной — жывёла магла перастаць весціся.

Вясной імкнуліся менавіта ў пятніцу першы раз выгнаць карову ў поле. У той жа час катэгарычна забаранялася стрыгчы пазногці, каб іх не "зганяла" і не прыкідвалася панарыца; заплятаць валасы ў касу — казалі, будзе доўга балець галава.[20]

Серада і пятніца ў праваслаўных хрысціян лічацца поснымі днямі. Аднак да посту ў пятніцу існуюць больш жорсткія патрабаванні, таму што ў адпаведнасці з евангельскай традыцыяй, Ісус Хрыстос быў укрыжаваны менавіта ў гэты дзень. Тыя

неймаверныя пакуты, якія Ён пацярпеў за грахі чалавечыя, нарадзілі культ пакутніцы Параскевы Пятніцы (ад грэч. *parasqeue* — пятніца), за хрысціянізаваным вобразам якой стаіць не сапраўды існаваўшая гістарычная постаць, а персаніфікаванае легендарна-міфалагічнае ўвасабленне выключнага ў гісторыі чалавецтва дня. Евангельскі сюжэт стаў асновай узнікнення легенд пра Пятніцу, якая, з аднаго боку, дапамагае тым жанчынам, якія строга прытрымліваюцца хрысціянскіх канонаў, а з другога — можа жорстка пакараць тых, хто парушае этыкетныя прадпісанні звычаёвага права.[21] Культ Параскевы даволі пашыраны ў асяроддзі беларусаў, аб чым сведчаць шматлікія табу і прадпісанні. Напрыклад, жанчыны мыліся ў лазні толькі ў пятніцу. Даўней перад “дзядамі” (суботнім ушанаваннем даўно памерлых па мужчынскай лініі) адзначаліся “бабы” (ушанаванне радаводу па жаночай лініі ў пятніцу).

У дзень Параскевы дзяўчаты хадзілі ў храм і прасілі ў святой сабе суджанага.[22] Калі доўга засуха выпальвала ўсё наваколле, жанчыны з малітоўнымі словамі звярталіся да сваёй апякункі Параскевы Пятніцы і выконвалі абрад прадзення ручніка-”абыдзённіка”. Некалькі жанчын збіраліся ў якой-небудзь хаце, прыносілі з сабой кужаль, пралі з яго ніткі, па чарзе вытыкалі ручнік, асвячалі яго ў храме, а затым распускалі і з даўжэзнай ніткай абыходзілі вакол вёскі.[23] Уся магічна-ахоўная дзея выконвалася ў пятніцу. Аднак гэта рабілася ў выключнай сітуацыі, а вось ў паўсядзённым жыцці існавала забарона працы ў пятніцу, бо верылі, што святым “радзіцелям” вочы кастрыцай засыпле.

Ва ўсходніх славян бытуе даволі шмат легенд, у якіх персанаж Пятніцы мае сваю партрэтную характарыстыку. Звычайна гэта старэнькая бабуля, апранутая ў дзіравую світку, галава якой пакрыта markedly рознай старызнай, з-пад якой вытыркаюцца каўтуны сівых валасоў. У беларускай легендзе яна паўстае міфалагічнай істотай, якая ходзіць па дварах і праз вокны назірае за паводзінамі жанчын.[24]

Рускі фальклярыст А.М.Афанасьеў прыводзіць прыклад духоўнага верша, у якім душа, развітваючыся з целам, нагадвае яму тыя зямныя грахі, за якія давядзецца трымаць адказ перад Богам. Адзін з іх за тое, што “по средам, по пятницам платье золовали, платье золовали, мы льны прядовали”:

Что так жили мы были на вольном свету,
Мы на вольном свету, на прошедшем веку —
Не имеем мы ни Среды, ни Пятницы,
Ни Великого поста понидельничку;
Мы по средам, по пятницам платье золовали,
Платье золовали, мы льны прядовали.[25]

Там жа фальклярыст расказвае аб тым, як у Калужскай губерні распачынаюць зажынкі. Старая жанчына, лёгкая на руку, позна ноччу ідзе ў поле, зажынае першы сноп, затым перавязвае яго, тройчы ўздымае над галавой і прыгаворвае: “Пятница-матушка! Помоги рабам Божиим (называюцца імёны гаспадынь) без скорби и болезни окончить жатву; будь им заступница от колдуна и колдуницы, еретика и еретицы!” Кладзе сноп на зямлю, а затым зноў уздымае і паўтарае прыгавор.

Акадэмік Б.А.Рыбакоў перакананы, што напаўхрысціянская Параскева з’яўляецца двайнікам стараязычніцкай багіні Мокашы, якая была ахоўніцай урадлівасці зямлі і шчаслівых шлюбаў, жаночых клопатаў, дзявочага лёсу. Сведчанне таму — святкаванне дня Параскевы 28 кастрычніка: у гэты час ва ўсходніх славян быў самы разгар Вялікай вясельніцы (актыўнага правядзення восеньскіх вяселляў).[26]

Надзвычай цікавыя звесткі аб найбольш шанаваных пятніцах змешчаны ў працы С.В.Максімава “Нечистая, неведомая и крестная сила”. Ён адзначае, што з вялікімі цяжкасцямі быў знойдзены тэкст “Павучання Клімента аб дванаццаці пятніцах”:

1-я Пятніца — на першым тыдні Вялікага посту. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той чалавек ад нечаканай смерці не памрэ.

2-я Пятніца — перад Благавешчаннем (дзень, калі Каін забіў Авеля). Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той ад дарэмнага забойства пазбаўлены будзе (па іншых спісах: той да убоства вялікага не дажыве і ад мяча засцярогу мець будзе).

3-я Пятніца — на Страсным тыдні Вялікага посту. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той ад разбойнікаў не пацерпіць (варыянт: ад мукаў вечных і нячыстага духа пазбаўлены будзе).

4-я Пятніца — перад Узнясеннем Хрыстовым, калі пакараў Гасподзь Садом і Гамору. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той без Святых Тайн Хрыстовых не памрэ і ад жабрацтва захаваны будзе.

5-я Пятніца — перад сашэсцем Святога Духа. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той ніколі не ўтопіцца (варыянт: той напрыканцы жыцця смерць сваю пабачыць і ад грахоў смяротных перасцярогу мець будзе).

6-я Пятніца — перад днём св. Івана Прадцечы. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той не захварэе на сухоты і ліхаманку.

7-я Пятніца — перад днём прарока Іллі. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той ад грому, маланкі, граду і голаду перасцярогу мець будзе.

8-я Пятніца — перад Успленнем Прасвятой Багародзіцы

(дзень, калі Маісей на гары Сінай прыняў Закон). Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той перад смерцю Багародзіцу ўгледзіць.

9-я Пятніца — перад днём Кузьмы і Дзям'яна. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, той ад вялікага граха захаваны будзе.

10-я Пятніца — перад днём Архангела Міхаіла. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, таго душа праз вогненную раку перанясецца.

11-я Пятніца — перад Раством Хрыстовым (дзень, калі 14 тысяч дзяцей ад цара Ірада, у Віфлііеме Іудзейскім забіты былі). Хто ў гэтую пятніцу посціцца, імя таго чалавека будзе запісана ў самой Прасвятой Багародзіцы на прастоле.

12-я Пятніца — перад Богаяўленнем. Хто ў гэтую пятніцу посціцца, імя таго чалавека ў кнігу жывых запісана будзе.[27]

Характарыстыкі ўсіх пералічаных пятніц даюць магчымасць зразумець агульнавядомую заканамернасць асаблівага стаўлення ў нашых найбольш значных рытуальна-абрадавых комплексах да рытмаўтваральных паўтораў 3—9—10—1 год (12 месяцаў). Аказваецца, і ў вышэйзгаданым пераліку менавіта 3, 9 і 12-я пятніцы ў пэўнай ступені аб'яднаны дамінуючай рысай: хто ўстрымаецца ў гэтыя пятніцы ад ужывання скаромнага і будзе прытрымлівацца забаронаў звычаёвага права, той будзе захаваны ад вялікага граху, а гэта значыць, што душа яго прадстане перад Богам на саракавы дзень пасля смерці бязгрэшнай і яе не напаткаюць пякельныя выпрабаванні.

С.В.Максімаў узгадвае і пра народную забарону купаць дзяцей у пятніцу, каб не напаў "сушэц". Калі ж маці нечакана забылася і пакупала дзіця, то каб папярэдзіць магчымае пакаранне хваробай, яна звала да сябе суседку, перадавала ёй дзіця, а сама станавілася каля вакна ад вуліцы і чакала, калі суседка падасць ёй дзіця праз акно. Суседка ж не проста аддавала, а "прадавала" дзіця за капейку.[28]

Апісанні, аналагічныя прыведзеным С.В.Максімавым, можна знайсці і ў беларускай этнаграфічнай літаратуры. М.А.Янчук падае наступнае апісанне святых пятніц:

"...На Беларусі... мноства ўяўна святых дзён, у якія лічыцца грахом рабіць... у некаторыя дні, як, напрыклад, сераду і пятніцу пасля маладзіка не пачынаюць толькі асабліва важныя справы. Наогул гэтыя святкаванні выпадаюць на долю серады і пятніцы, якія ідуць пасля вялікіх святаў. Напрыклад, на Святым тыдні святкуецца "градавая" серада і пятніца (інакш "ледаваты" дзень), каб летам палі не нішчыліся градам.

Яшчэ святкуюцца пятніцы: 1) пасля Раства Хрыстова, 2) на Масленіцы, 3) пасля Сёмухі — серада і пятніца, 4) на 10-м тыдні пасля Вялікадня, т.зв. "дзесятуха", таксама ад граду...

Серада і пятніца як дні, прысвечаныя ўспамінам пакут і смерці Хрыста, заўсёды шанаваліся і царквою і народам. Але ў народа гэта ўшанаванне мела ўжо з даўніх часоў некаторае хрысціянскае адценне. Па пятніцах, згодна з народным павер'ем, нельга ні прасці, ні араць, каб не запыліць матухну-Пятніцу і не засыпаць ёй вочы кастрыцаю і пяском"[29].

У асяроддзі беларусаў існавала павер'е: калі свята Каляд выпадае ў пятніцу, то на той год будзе паміраць больш жанчын, чым мужчын, а калі ў панядзелак, то жанчыны ў тым годзе з цяжкасцю будуць раджаць.

Тое, што Параскева пераняла ў Сярэднявеччы функцыі міфалагічнай Мокашы сведчыць і яе цесная сувязь з вадой. Сярод усходніх славян бытуе мноства легенд аб тым, што іконы Параскевы Пятніцы знаходзяць каля ручаін або крыніц, вада з якіх набывае пасля з'яўлення нерукатворнай іконы гаючыя якасці.[30]

## СУБОТА (*РАДЗІЦЕЛЬСКАЯ*)

Назва гэтага дня паходзіць са старажытнаіудзейскай мовы, у якой *sabbat* — заканчэнне справы (шабаш). У Старым Запавеце аб гэтым дні сказана: "Так совершено небо и земля и все воинство их. И совершил Бог к седьмому дню дела Свои, которые Он делал, и почил в день седьмой от всех дел своих, которые делал. И благословил Бог седьмой день, и освятил его; ибо в оный день почил от всех дел своих, которые Бог творил и созидал" (Бытие, 2:2—3).

Вельмі часта ў нашай навукова-папулярнай літаратуры дапускаецца блытаніна ў разуменні структуры старажытнаіудзейскага і еўрапейскага хрысціянізаванага тыдня. Асобныя даследчыкі схільны лічыць, што ў славянскім календары тыдзень пачынаўся нядзеляй, таму што субота, маўляў, была днём адпачынку. На самай справе ў славян з часу пашырэння хрысціянства ролю старажытназапаветнай суботы пачала выконваць новазапаветная нядзеля (воскресенье) — дзень уваскрашэння Ісуса Хрыста.

У славянскай народнай традыцыі субота лічыцца "жаночым" днём, якому адпавядае цотны лік "6". У народнай свядомасці відавочна стаўленне да яго, як да лёгкага, спрыяльнага дня, можа таму, што напярэдзе дзень адпачынку. У суботу звычайна прыбіралі ў хаце, перад Вялікаднем фарбавалі яйкі і пяклі пірагі. Акрамя таго, субота лічылася спрыяльнай для ад'езду ў далёкую дарогу, разам з тым народная традыцыя папярэджвае не распачынаць у гэты дзень адказную справу

(напрыклад, класці печ або падваліны хаты) — нічога добрага з гэтага не атрымаецца.[31]

Знаёмства са структурай беларускага народнага календара паказвае, што субота была незвычайным днём у плане сакральна-магічнага напаўнення. У гэты дзень нашы продкі быццам па спецыяльным інфармацыйным канале далучаліся да шматлікіх таямніц сусвету, яны "наладжвалі" кантакты з душамі далёкіх суродзічаў, звярталіся да іх па дапамогу дзеля добрага ўраджаю ці шчаслівай долі маладых, якія ўзялі шлюб. З цягам часу ў народным календары ва ўсе поры года з'явіліся асобныя суботы, якія лічыліся днём ушанавання продкаў. У асяроддзі беларусаў іх пачалі называць "дзядамі", або "радзіцельскімі": субота перад Масленіцай; 2, 3 і 4-я суботы на працягу Вялікага посту; субота перад Тройцай; трэцяя субота пасля Пакроваў (атрымала назву "Восеньскія Дзяды").[32]

Каб "падключыць" падсвядомасць удзельнікаў абраду ўшанавання продкаў да кантактнага дыялогу з душамі даўно памёршых суродзічаў, беларусы выкарыстоўвалі розныя сродкі і шляхі. Напрыклад, у невялікім храме раскладвалі вогнішча, куды кідалі галінкі ядлоўцу, сабраныя на Купалле, і засушаныя лекавыя травы, якія змяшчалі ў сабе галюцынагены. Потым некаторыя ўдзельнікі гэтага абраду сцвярджалі, што бачылі ў аканіцах храма выявы памёршых суродзічаў і аднавяскоўцаў.

Р.Зінкевіч пакінуў наступнае апісанне святкавання Восеньскіх Дзядоў у Пінскім павеце: "Яшчэ некалькі дзесяткаў год назад пад час святкавання Дзядоў завязвалі вочы смялейшай і спецыяльна выбранай для гэтага дзяўчыне ці жанчыне і саджалі яе на слуп, укапаны ў падлогу каля печы. Гэта жрыца, цэлы дзень перад тым не еўшы, прыглядалася да душ, якія ўваходзілі ў хату, стараючыся пазнаць у іх сваіх знаёмых і родных; бачыла ў сваім уяўленні, як душы далёкіх сваякоў і сяброў дружалюбна набліжаліся да тых, хто сядзеў за сталом, палохалася выгляду постацей душ, не вядомых яе дому і чужых, і абцяжарных пракляццем за крыўды і прысваенне чужога. Убачыўшы постаці гэтых непрытульных агрэсіўных душ, жанчына палохалася, часам страціўшы прытомнасць, валілася на зямлю, палохаючы тым самым астатніх".[33]

Відаць, суботні рытуальны дыялог з продкамі паўплываў на некаторыя абрадавыя кантэксты ў культуры беларусаў. З аднаго боку, яны верылі: калі дзіця пахрысціць у суботу, яно пражыве доўгі і шчаслівы век; дзіця, якое нарадзілася ў гэты дзень, можа стаць лекарам, знахарам, а таксама можа бачыць выявы духаў сваіх продкаў. З другога боку, арыентаванасць

зместу "радзіцельскага" дня ў мінулае паслужыла падставай для забароны правядзення ў гэты дзень абрадаў, якія скіраваны ў будучыню, перш за ўсё гэта вянчанне маладых у храме.[34]

## НЯДЗЕЛЯ (*СВЯТАЯ*)

Апошнім, заключным днём тыдня з'яўляецца нядзеля (у самой назве чуецца святочнасць, урачыстасць: дзень "не для дзела", "ня-дзелай"). Беларускае "нядзеля" як сёмы дзень тыдня і рускае "неделя" як "седмица" дзён паходзяць з аднаго кораня, змест якога хутчэй за ўсё вызначаўся асаблівасцямі старажытнаіудзейскага календара, які праз хрысціянскую традыцыю аказаў уплыў на ўсходнеславянскую традыцыю вымярэння часу. Менавіта гэты дзень лічыўся днём уваскрашэння Ісуса Хрыста. Магчыма, гэта надзвычайная падзея паспрыяла таму, што нядзеля стала храмавым днём (у які вянчалі ў храме). Захавалася прыказка, якая вызначае межы святкавання беларускага вяселля: "Вяселлю казала і качарга гуляць ад нядзелі да чацвярга".

Фальклорна-этналагічныя крыніцы і сучасныя экспедыцыйныя запісы сведчаць пра тое, што ў гэты дзень забаранялася займацца шматлікімі жаночымі справамі: шыць, вязаць, прасці, ткаць, сукаць ніткі, купаць дзяцей і мыць бялізну (каб не хварэлі дамачадцы і хатняя жывёла). Адначасова нядзеля лічылася спрыяльнай для распачынання пераважна мужчынскіх спраў: пажадана было правадзіць засяўкі, збірацца на сенакос, першы раз выганяць скаціну ў поле, закладваць падваліны новай хаты. Прыярытэт мужчынскага пачатку ў дачыненні да гэтага дня, відаць, невыпадковы, таму што, хутчэй за ўсё, моцна хрысціянізаваная нядзеля (дзень уваскрашэння Ісуса Хрыста) пераняла ў Сярэднявеччы звычаёва-этыкетныя і рытуальна-абрадавыя функцыі старажытнаведыйскага чацвярга. Абрадавая практыка сведчыць, што ў шэрагу рытуальных кантэкстаў рэгламентацыя дзеянняў і паводзін людзей у гэты дзень тыпалагічна блізкія чацвярговым (чацвер як мужчынскі дзень таксама лічыўся спрыяльным для пачатку адказных работ). У звычаёвым праве беларусаў днём пачатку вяселляў была нядзеля.

Хрысціянізацыя беларусаў паспрыяла таму, што нядзеля стала ў гадавым святочным колазвароце асноўным днём для правядзення абрадавай практыкі. Становіцца зразумелым, чаму беларусы меркавалі, што дзіця, якое нарадзілася ў нядзелю, будзе валодаць незвычайнымі здольнасцямі, яго нельга суročыць, на яго нельга навесці шкоду. Існавала перакананне: людзі,

якія з'явіліся на свет у гэты дзень, могуць "бачыць" месца, дзе зарыты клад, таму што над ім заўсёды "свяціцца блакітнае святло нябёсаў", якое не ўсе бачаць.[35]

Пажадана, каб маці з дзіцем упершыню выйшла з хаты менавіта ў гэты дзень.

У беларускай міфалогіі Нядзеля паўстае антрапаморфнай адухоўленай істотай, якая ў адным выпадку быццам з'яўляецца пасланніцай і памочніцай Бога, а ў другім — прадстае святой апякункай жывых у іх паўсядзённых справах. А.К.Сержпутоўскі наступным чынам пераказвае легенду пра Нядзелю: "Святая Нядзелька паказваецца людзям й перасцерагае іх, каб яны ў нядзелю нічога не рабілі, шчыра святкавалі, бо Бог скарае не то што на том свеце, але й за жытку наробіць усялякае шкоды ў гаспадарцы ці адніме здароўе".[36]

У міфалагічных творах можна знайсці нават апісанні вонкавага выгляду гэтай істоты, звычайна падкрэсліваецца, што яна ходзіць у белым адзенні: "... паненка ўсянютка ў белі прыбраная".

М.А.Янчук падае легенду, у якой персаніфікаванымі рысамі надзяляюцца пятніца, субота і нядзеля. "Ішлі тры жанчыны: св. Пятніца, св. Субота і св. Нядзеля. Самая прыгожая, нарадная і вясёлая з іх была менавіта Субота, затое дзве другія былі сумныя, заплаканыя і абарваныя; Пятніца была ўся ў ранах, парэзаная, паколатая, а пра Нядзелю ўжо й казаць няма чаго: на ёй жывога месца не заставалася, адны раны і сінякі, а сукенка ўся ў шматках. Ва ўсім гэтым вінаватыя людзі, яны не шануюць як належыць пятніцу і нядзелю. Шые баба ў пятніцу — яна коле св. Пятніцу; працуе селянін з сякераю ў нядзелю ці распачынае бойку ў п'яным стане — наносіць раны і пабоі св. Нядзелі. Адна толькі св. Субота жыве весела і спакойна, таму што яўрэі з усёй строгасцю захоўваюць прысвечаны ёй дзень".[37]

У слоўніку Ул. Даля прыводзіцца некалькі разгорнутых прыказак, у якіх праз адну галоўную падзею прамаркіравана сутнасць кожнага дня тыдня:

"Воскресенье — свято, понедельник — черный, вторник — повторник, среда — постница, четверток — перечит, пятница — корячится, суббота — делу почин;

В понедельник — на могильник, во вторник — на кокорник, в среду — на переды, в четверг — на коты, в пятницу — на мельницу, в субботу — на работу, в воскресенье — на веселье;

В понедельник я банюшку топила, во вторник в баньку ходила, в среду в угаре пролежала, в четверг буйну голову чесала, в пятницу добры люди не пряли, в субботу родителей поминали, в воскресенье на веселье погуляли".[38]

Беларускае звычаёвае права патрабавала: “У сераду (посны дзень) не смейся, у нядзелю не плач”.

## ФАЗЫ МЕСЯЦА І ІХ УПЛЫЎ НА СІСТЭМУ ПРЫКМЕТ, ПАВЕР'ЯЎ, ХАРАКТАР ГАСПАДАРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Вышэй гаворка ішла пра сонечны каляндар, у аснове якога ляжаў рух Зямлі вакол Сонца. На працягу многіх стагоддзяў яго прытрымліваліся ўсе еўрапейскія краіны, пачынаючы яшчэ са Старажытнага Рыма. Разам з тым вядома, што культура народаў Азіі з даўніх часоў і да сённяшняга дня грунтуецца на месячным календары. Гістарычна склалася так, што Беларусь, хаця і знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, але яе народная культура даволі выразна адлюстравала суаднесенасць як з Сонцам, так і з Месяцам. На жаль, у этнаграфічнай літаратуры мінулага стагоддзя такіх звестак досыць мала. І гэта заканамерная з'ява. Выхаваныя на еўрапейскай традыцыі, збіральнікі зярнят народнай мудрасці проста не звярталі ўвагі на культуратворныя фактары ўздзеяння больш блізкага да Зямлі касмічнага спадарожніка. І ўсё ж у нашай этнаграфічнай літаратуры, сярод архіўных матэрыялаў і ўласных экспедыцыйных запісаў аўтара можна знайсці дастаткова шмат пераканаўчых сведчанняў аб тым, што беларускія сяляне ў сваёй працоўнай дзейнасці абавязкова ўлічвалі фазу Месяца. Прычым шматвяковыя назіранні за начным нябесным свяцілам сведчаць, што пераважна большасць прыкмет звязана з першай фазай Месяца — **маладзіком:**

валасы заўсёды належыць стрыгчы на першай квадры — будуць добра расці;

калі Пакровы супадуць з маладзіком — зіма будзе цёплай, калі ж выпадуць на поўню або збыта — чакай лютых маразоў;

капусту збіраюць і квасяць толькі на маладзік (лепш за ўсё на 5-ы дзень) — будзе цвёрдай;

бульбу садзяць “межамі” — на стыку першай і другой чвэрці Месяца — гэта абяцае багаты ўраджай;

калі пасеяць гарбузы ў трэцюю сераду маладзіка — прыбору не будзе;

цыбулю выбіраюць на 4—5-ы дзень маладзіка; пад поўню нельга — будзе гніць;[39]

кабана лепш біць на маладзік, тады сала будзе белае; калі ж пад поўню — “будзе дуцца і заплесняе”. Прычым трэба каб сала складваў той чалавек, які не меў перад гэтым інтымных адносін з жонкай, “тады яно не будзе слюзнуць”. Непа-

жадана, каб саланінай займалася жанчына ў перыяд месячных;

каб пазбавіцца бародавак, трэба "ў першы панядзелак на маладзік, убачыўшы першы раз месяц з правага боку, г.зн. правым вокам, узяць правай рукой з-пад пальцаў левай нагі трохі зямлі, на якой стаіш, і пашмараваць ёю бародаўкі — і тыя абавязкова знікнуць. Хто ўбачыў маладзік у той першы панядзелак левым вокам, ужо не можа вылечыцца ў тым месяцы";[40]

калі маладзіковы Месяц першы раз убачыш з правага боку, то распачаты месяц будзе шчаслівы, калі з левага — нешчаслівы.[41]

Значнае месца займаў маладзік і ў перадшлюбнай варажбе моладзі. Напрыклад, дзяўчына, пабачыўшы маладзік, спынялася і ціхенька гаварыла:

Маладзік маладый,
У цябе рог залатый.
Ты па свету ходзіш,
Няўжо ты майго мілага не бачыш?
Найдзі ж ты яго,
Прывядзі ж ты яго,
З кім мне век векаваць,
Штоб мне таго ўва сні павідаць.[42]

М.Федароўскі запісаў наступны варыянт дзявочай варажбы аб сваім будучым лёсе: "Калі дзеўка хоча ведаць, за каго пойдзе замуж, то як угледзіць першы раз маладога месяца, то трэба ўкленчыць, загаварыць тры "Здровась, Марыя", узяць з-пад правага калена жменю зямлі ці пяску і, прынёсшы дахаты, падсыпаць пад голаў, — тады прысніцца той, за каторага замуж пойдзе".[43]

Маладзіковая фаза Месяца карыстаецца асаблівай увагай і павагай народных лекараў, якія перакананы, што "найпамацнейшы тое зелле, што на маладзіку збірана, і тым больш калі яго збірае недаростак або старая кабета, катора з лет вышла".[44]

У этнаграфічных крыніцах мінулага стагоддзя можна сустрэць апісанне даволі складаных узаемасувязей прыродна-касмічных і культуралагічных фактараў. Напрыклад, лічылася, што "маёвыя зёлачкі", у прыватнасці, сабраныя ў канцы першай квадры перад поўняй, "у прыбытныя дні", з'яўляюцца найбольш дзейснымі. "Затое нельга збіраць зёлкі ў апошнюю квадру, прынамсі, першыя тры дні пасля поўні, бо такія зёлкі не дапамагаюць, а шкодзяць".[45]

Хранічнае, састарэлае захворванне імкнуліся таксама ля-

чыць на маладзік. Так, маці брала на рукі дзіця і, гледзячы праз акно на Месяц, “грызла” ў дзіцяці хворае месца, “а хто-небудзь іншы, стаўшы на парозе хаты, пытаў: “Што грызеш?” — “Грызь грызу”, — адказвала маці. “Грызі, грызі, каб не было!” — тройчы адказваў той, хто стаяў на парозе. Гэта паўтараецца, калі трэба, штомесяц на маладзік па тры разы”.[46]

А вось каб пазбавіць дзіця ад глістоў, трэба было, наадварот, розныя лекі “даваць у апошняй квадры і ніколі — на маладзік, бо выкарыстанне лекаў у гэтую пару толькі ўзбуджае глісты...”[47]

У ліку надзейных сродкаў ад трасцы “рэкамендуюць адвар з кары і лісця, сабраных на маладзік з дваццаці розных дрэў, які трэба піць тры дні запар, перад усходам і пасля заходу сонца”.[48]

А.К.Сержпутоўскі прыводзіць цікавы сродак лячэння дзіцячай касавокасці: “Трэба ў маладзікавую пятніцу чорнай хустачкаю завязаць адно вока і не знімаць тае хустачкі ні ўдзень, ні ўночы аж да самага другога маладзіка. Ад гэтага касавокасць прападзе”.[49]

Беларусы былі перакананы, што на маладзік трэба ставіць вуллі, каб пчаліная сям’я хутка расла. А калі на трэці дзень (як убачыш маладзік) прышчапіць дрэўца, то ўжо на трэці год яно дасць плады.[50]

Сяляне імкнуліся не вывозіць гной на маладзік, бо былі перакананы, што такім чынам можна ўчыніць неўраджай на сем год.[51]

У народным этыкеце існавала забарона нават самым блізкім сваякам пазычаць што-небудзь на маладзік: “Як толькі гэта зрабілі, дом, які пазычыў, на цэлы месяц трапляе ў патаемную залежнасць ад дома, куды пайшла пазыка: дзеці пачнуць крыўдзіць дзяцей таго гаспадара, які пазычыў, скаціна і птаства будуць псаваць агароды, палі, лугі і заходзіць на двор... У маладзіковыя дні прыстойныя суседзі стараюцца абысціся без пазык, а калі абысціся без гэтага нельга, спяшаюцца “атудзеньчыць пазыку пазыкаю”.[52]

Зубны боль лягчэй суцішыць на маладзік. Аб гэтым сведчаць надзвычай паэтычныя замовы нашых беларускіх знахараў.

* * *

Маладзік малады,
Твой розум залаты.
Як табе век на зямлі не бываць,
Так век хай мае зубы не баляць.[53]

* * *

— Маладзік маладзенькі,
Твой ражок залаценькі.
На могілках бываў?
    — Бываў.
— Мёртвых відаў?
    — Відаў.
— Мёртвыя спяць?
    — Спяць.
— Іхні зубкі не баляць?
    — Не баляць.
— Хай і мае не баляць.
    — Хай не баляць.
— Як табе, маладзіку, жаны ня мець,
Так маім зубам не балець.[54]

* * *

Месяц, ты, месяц, сярэбраныя твае рожкі, залатыя твае ножкі.
Зайдзі ты, месяц, знімі маю зубную боль,
занясі боль пад аблокі.
Мая боль не малая. Не цяжкая, а твая сіла магучая.[55]

* * *

А ты, месяц малады, табе вянок залаты.
Дай Бог табе на пастаянне, а маім зубам на добрае здароўе.[56]

А вось каб зубы ніколі не балелі, трэба заўсёды абуваць спачатку правую нагу. "Убачыўшы маладзік, трэба кісць правае рукі ўцягнуць у рукаў кашулі і схаванай рукою, не адрываючы позірку ад месяца, тройчы перахрысціцца".[57]

Раны, якія ўзніклі на маладзік, доўга не загойваюцца.[58]

І наадварот, каб суцішыць боль у нагах або руках, замовы трэба гаварыць на **поўню**, якая з'яўляецца другой квадрай Месяца.

У час поўні непажадана сеяць агуркі і гарбузы, а таксама гарох, боб і мак, бо ўсе гэтыя расліны будуць цвісці пустацветам: "Найлепей у час поўні: зачынаць сяўбу збожжа — наогул распачынаць і працягваць заняткі, якія маюць на мэце збіранне разнастайных запасаў, "штоб усюды было поўна ўсялякага дабра".[59]

Печ не робяць пад поўню, "бо разваліцца", і наадварот, печ, зробленая ў поўню, будзе служыць доўга і грэць добра.

Ёсць вялікі касмічны закон: калі час ідзе пад поўню, то жыццёвыя сокі раслін збіраюцца пераважна над зямлёй, а калі на збыта — пад зямлёй, у карэнні. Таму тыя расліны, якія даюць плады над зямлёй садзяць пад поўню, а караняплоды — пачынаючы з трэцяй чвэрці Месяца.

Гэтаксама на поўню лячылі дзяцей ад лунатызму. "На поўню, апоўначы, каб не ведаў хворы, абводзяць крэйдаю на падлозе месячнае святло і потым кладуць хворага на тое месца на цэлую гадзіну. Паўтараць гэта трэба да чацвёртага разу ўвесь месяц і менавіта на поўню, на апошнюю квадру, на маладзіку і на першую квадру".[60]

Найгоршым часам для правядзення сельскагаспадарчых работ лічылася трэцяя квадра, калі месяц паварочваў **на "збыта"**, на "старыка", на "сходні": "Пасеяўшы на сходу, не дажыдай плоду". Трэцюю квадру называлі "гнілой", таму асцерагаліся распачынаць уборачныя работы — усё згніе. Народны вопыт сведчыў, што лён мачыць трэба было толькі на маладзік, тады будзе белы, "калі ж памочыш у старом (месяцы), так ён пачарнее".[61] А вось лес для будаўніцтва хаты нарыхтоўвалі на збыта. У гэты час у ім менш вільгаці, хата прастаіць век.

Каб звесці барадаўкі, на збыта трэба ўзяць белую нітку і над кожнай завязаць вузялок, нітку закапаць. Як толькі яна згніе, барадаўкі адваляцца.[62]

З фазай Месяца звязана шматназіранняў за станам прыроды. Напрыклад, раней былі перакананы: калі змянялася фаза Месяца, а надвор'е заставалася нязменным, то яно захаваецца такім жа яшчэ сем дзён.

Калі наўкола Месяца на маладзік з'явіцца туманавае кола, то ўлетку гэта прадказвала дождж, а зімой — моцныя маразы. А вось калі сам Месяц затуманены — будзе вялікі снегапад. І наадварот, вялікі і ясны Месяц летам абяцаў цёплае ўстойлівае надвор'е, зімою — траскучыя маразы.

Часам можна сустрэць і нечаканыя доўгатэрміновыя прагнозы па стану надвор'я і фазе Месяца. Напрыклад, калі на 4-ы дзень маладзіка было пахмурна або ішоў дождж, гэткае ж надвор'е застанецца на працягу ўсяго месяца (пакуль Месяц не пройдзе ўсе наступныя фазы і не дойдзе да той самай, па якой вызначалася прадказанне).[63]

У рускай этнаграфічнай літаратуры можна сустрэць звесткі, якія сведчаць аб тонкай назіральнасці іх інфарматараў: у цэнтры ўвагі аказваліся не фазы начнога свяціла, не туманнасці на ім або вакол яго, а ступень завостранасці (прадказвае добрае надвор'е) або закругленасці (да дажджу) самога дыска.

Цікава адзначыць, што ў традыцыйнай культуры існаваў шэраг прадказанняў, якія грунтаваліся на цеснай узаемасувязі паміж днём тыдня і фазай Месяца маладзіком. Так, вопыт народных назіранняў сведчыў:

"Егда месяц родится в понедельник, бывает тот месяц студен и мокро, а зимою снежно и ветрено.

Егда родится во вторник, бывает тепло и сухо, а зимою морозно.

А егда в среду, бывает мокро и знойно, а зимою снежно.

Егда родится в четверг, бывает тепло и мокро, а зимою снежно.

А егда родится в пяток, бывает мокро и знойно.

Егда родится в субботу, бывает студено, сухо и ветрено.

Егда в неделю (в воскресенье) родится, бывает тот месяц горяч и сух, а зимою мразно".[64]

Дарэчы, праходжанне Месяца праз яго чатыры фазы і знакавая суаднесенасць з імі розных фактараў культуры цалкам супадае (пацвярджае, дапасоўваецца) з прынцыпам рытуальнай перавернутасці. Маладзік (растучы Месяц) вывернуты дугой у правы бок (у культуры знак "+": усялякія дзеянні абяцаюць мецъ станоўчы вынік), на "старыку" дуга павернута ў левы бок (у культуры знак "-": адпаведна накладваецца забарона на распачынанне доўгатэрміновых і лёсавызначальных спраў).

Распаўсюджванне хрысціянства на беларускіх землях дапоўніла старажытную язычніцка-ведыйскую сістэму абмежаванняў, звязаных з дакладнымі днямі або датамі. Перш за ўсё гэта тычыцца часу, калі забараняецца вянчанне ў храме:

*Па-першае*, царкоўны шлюб не можа быць здзейснены ў *аўторак, чацвер, суботу*.

*Па-другое*, шлюб і вяселлі катэгарычна забараняюцца ў пасты:

а) шасцітыднёвы Піліпаўскі ("Рождественский") пост, які доўжыцца з 28 лістапада і да 6 студзеня;

б) Вялікі сямітыднёвы пост, які працягваецца ад Масленіцы і да Вялікадня (Пасхі);

в) Пятроўскі пост (яго пачатак рухомы і залежыць ад часу святкавання Сёмухі—Тройцы), які пачынаецца з другога панядзелка пасля Тройцы, а заканчваецца на Пятра (12.07);

г) двухтыднёвы Спасаўскі ("Успенский") пост, які працягваецца ад 14 да 28 жніўня (ад Першага Спаса да Першай Прачыстай).

*Па-трэцяе*, вянчанне не праводзіцца напярэдадні вялікіх храмавых святаў, а таксама і ў гэтыя ж святы:

10 і 11 верасня — пярэдадзень і дзень Усекнавення галавы Івана Прадцечы; напярэдадні Другой Прачыстай (28 жніўня), дня Раства Прасвятой Багародзіцы (20 верасня);

перад і ў дзень Узвіжання Крыжа Гасподня (26 і 27 верасня);

напярэдадні Пакроваў Прасвятой Багародзіцы (13 кастрычніка);

напярэдадні Грамніц, або Стрэчання Гасподня (14 лютага);

на 39-ы дзень пасля Пасхі, перад святам Узнясення Гасподня;

на 49-ы дзень пасля Пасхі, перад Тройцай і на саму Тройцу.

*Па-чацвёртае*, неабходна не планаваць вянчанне на перыяд:

паміж Калядамі (ад 7 і да 19 студзеня). Гэты час у народзе называюць "крывымі вечарамі", а вяселлі "воўчымі";

на "сырную сядміцу", на Масленіцу, г.зн. за тыдзень да пачатку Вялікага посту;

на працягу ўсяго Велікоднага тыдня.

Акрамя пералічаных вышэй нормы звычаёвага права прадпісвалі *шэраг абмежаванняў у паводзінах*, а таксама *забаронаў, звязаных з цыклам сельскагаспадарчых работ* у той ці іншы час:

***нельга***:

складываць сена ў стог паміж Купаллем (6.07) і Пятром (12.07) — абавязкова спаліць Пярун[65];

стрыгчы пазногці ў "міжыкалядзь" (паміж Калядамі: ад 06.01 да 19.01) — будзе зганяць капыты ў кароў;

ставіць помнік над магілай памёршага сваяка (нягледзячы на тое што ўжо мінуў год пасля смерці) пасля Пакроваў (15.10), таму што зямлю "замкнулі на зіму". Адамкне яе св. Юрай (06.05). Лепш паставіць помнік перад Радаўніцай;

спраўляць вяселле раней за 40 дзён пасля смерці каго-небудзь з родных першага і другога калена сваяцтва;

пазычаць у нядзелю ці іншыя святочныя дні што-небудзь (асабліва хлеб, соль і запалкі). Лічаць, што "госць" прыйшоў з благімі намерамі, а пазычаныя прадметы будуць "нагавораны" (потым іх могуць падкінуць вам з мэтай навесці шкоду);

мыць галаву на Івана Галавасека (11.09) — каб не захварэць на каўтуна;

есці да Яблычнага Спаса (19.08) яблыкі новага ўраджаю жанчынам, у якіх памерлі дзеці;

купацца пасля Іллі (02.08);

саджаць, сеяць у той дзень тыдня, у які была Гасподня Куцця — будзе благі ўраджай, голад[66];

пачынаць араць сваё поле на маладзік ці ў той дзень тыдня, калі на той год былі Грамніцы[67];

несці першы кошык бульбы ў пограб не ў той дзень, калі ў гэтым годзе было Благавешчанне (07.04). Гэта свята трымаецца адной і той жа даты, а вось дні штогод змяняюцца. Калі ў бягучым годзе яно трапіла на аўторак, першы кош бульбы новага ўраджаю трэба накапаць менавіта ў аўторак;
спяваць да трох год жанчынам (мужчынам), у якіх памёр хто-небудзь з родных;
мыць бялізну жанчыне ў той дзень тыдня, у які памёр яе муж (да года).

Цікавыя назіранні за станам прыроды і ўзаемазалежнасці паводзін чалавека і яго гаспадарчых клопатаў падаюць В.М.Дабравольскі і Ф.Вярэнка:

"Калі на маладзіку святэй Ілля (2 жніўня), сей жыта пазней, недалёка ад Пакрава (14 кастрычніка), ад самага Хрыста (Узвіжання — 27 верасня). На схаду Ілля святэй — не празявай жыта сеяць: ад Спаса штоб — к Хралу (дзень Флора і Лаўра — 31 жніўня) адсейся.

Глядзі расы за тры дні Ягор'я (6 мая) — хлеб паспеіць за тры дні Іллі; за нядзелю перад Ягор'ем раса — за нядзелю паспеіць хлеб да Іллі.

Калі на Іллю дождж, па лагчынах не вельмі сейце: вымікі будуць, а па буграх харошае будзіць жыта"[68];

"Прафілактычнымі (а таксама дапаможнымі) сродкамі ад усялякіх хваробаў лічацца: вада, асвячоная 19 студзеня ("на крышчэнне") і ўжываная на ўнутраны і на знешнія лекі; разнастайныя зёлкі, асвячоныя 7 ліпеня ("на Івана") ці 28 жніўня ("на Бальшую Прачыстую"), на абкурванне і ўнутранае карыстанне; соль, асвячоная ў Вялікі Чацвер ("Чысты Чэцверг"), якую носяць у мяшэчку на шыі, і, нарэшце, вада, зачэрпнутая з ракі на поўню, апоўначы, у тую хвіліну, калі вада "засыпаець", г.зн. калі плынь затрымліваецца на пару хвілінаў"[69].

Прыведзеныя прыклады пераканаўча сведчаць аб тым, што дыялог нашых продкаў з Космасам меў самы актыўны характар. У аснове гэтай філасофска-культуралагічнай сістэмы ляжаў сонечны год, які падзяляўся на пэўныя перыяды, месяцы на тыдні, тыдні на дні, дзень драбіўся яшчэ на чатыры часткі. Кожны маркёр сонечнага цыкла дадаткова карэліраваўся адпаведнымі фазамі Месяца. Часам складваецца ўражанне, што па Сонцы звяралі маштабныя, этапналёсавыя падзеі; па Месяцы — з'явы больш дробнага парадку. Але былі і такія сітуацыі, калі лёсавызначальная роля двух свяцілаў была аднолькавай. Скажам, адным з лепшых перыядаў справіць вяселле быў зімовы мясаед (вызначальны фактар — Сонца), але ж у залежнасці ад даты святкавання Вялікадня і правядзення перад ім сямітыднёвага посту мясаед мог быць кароткім (да паўтара месяца) і доўгім (да двух месяцаў). Разам з тым Вялікі мясаед быў не аднолькава пры-

датны да шлюбу на ўсім працягу. Лічылася, што больш прыязным быў час "пад поўню", але пры гэтым трэба было суаднесціся і з неспрыяльнымі днямі (зноў уплыў Сонца).

Лічыцца, што падмурак новага дома трэба закладваць у Вялікі пост на маладзік і будаваць яго так, каб ахапіць святкавання Тройцы.

Акрамя пералічаных вышэй складаных прыладкаванасцей гаспадарчых клопатаў да пэўных дзён тыдня або да пэўнай фазы Месяца ў народнай культуры існаваў спіс так званых цяжкіх, неспрыяльных, "чорных" дзён, якія, як сведчаць рукапісныя сшыткі, паўтараліся з года ў год і былі падпарадкаваны толькі руху Сонца па небасхіле. У нашай табліцы прыводзяцца чатыры розныя спісы, якія існуюць у асяроддзі ўсходніх славян. У першай графе падаецца спіс, прыведзены А.Ю.Лозкам[70], у астатніх — Н.І.Сцяпанавай[71].

**Табліца спісаў неспрыяльных дзён**

| Месяц | Першы спіс | Другі спіс | Трэці спіс | Чацверты спіс |
|---|---|---|---|---|
| СТУДЗЕНЬ | 1, 2, 6, 11, 17, 18 | 1, 11, 12, 18, 26 | 1, 2, 4 | 1, 11, 26 |
| ЛЮТЫ | 8, 16, 17 | 2, 16, 18 | 11, 17, 18 | 8, 6 |
| САКАВІК | 1, 12, 13 | 1, 3, 12, 13 | 1, 4, 14, 24 | 1, 13, 17, 18 |
| КРАСАВІК | 1, 13, 15, 17, 18 | 1, 3, 12, 13 | 2, 17, 18 | 1, 3, 13, 19 |
| МАЙ | 8, 10, 13, 17, 30 | 3, 10, 27, 30 | 7, 8 | 8, 10, 18 |
| ЧЭРВЕНЬ | 1, 17 | 12, 17 | 17 | 1, 7, 17, 23 |
| ЛІПЕНЬ | 1, 5, 6 | 15, 18, 30 | 17, 21 | 7, 13, 21, 30 |
| ЖНІВЕНЬ | 1, 3, 18, 20 | 1, 3, 17 | 20, 21 | 7, 13, 17 |
| ВЕРАСЕНЬ | 15, 18, 29 | 15, 18, 30 | 10, 18, 30 | 10, 18 |
| КАСТРЫЧНІК | 15, 17 | 11, 13 | 6 | 2, 11, 15 |
| ЛІСТАПАД | 11, 17 | 1, 7, 17 | 6, 8 | 3, 4, 24, 29 |
| СНЕЖАНЬ | 1, 7, 11 | 17 | 6, 11, 18 | 5, 7, 11, 17 |

Нехта з чытачоў усміхнецца і падумае: "Задужа складаная сістэма. Ці нельга прасцей?" Відаць, можна. Сёння ўсё адбываецца па спрошчаных схемах. Сучасны ЗАГС нічым не адрозніваецца ад заводскага канвеера па зборцы рухавікоў ці аўтамабіляў. Пост для яго не пост, Спас — не свята, і г.д. Штампуюць без разбору. Ці не таму спрадвечнае вянчанне сталі называць "рэгістрацыяй брака?" (чыйго? канвеернага?). Прыгожае, надзейнае, доўгатэрміновае — на ўсё жыццё — коліш-

няе “выйсці замуж” сёння падмянілі новатворным “выскачыць” (“Як Піліп з канапель”) — з адпаведным вынікам.

Ляцім. Скачам... Замуж — скачам. Маці памёрла, чаго яе тры дні дома трымаць, хутчэй на могілкі і давай спадчыну дзяліць-сварыцца. Ляцім. Птушыны важак з года ў год, з веку ў век вядзе свой клін адным і тым жа маршрутам. І ніколі не збіліся з дарогі. І продкі нашы, гледзячы ў неба, сумавалі на развітанне ды шчыра радаваліся сустрэчы. А што мы? Радуемся, калі ляцім на Канары, сумуем, калі трэба вяртацца дадому.

# ЧАЛАВЕК І ЯГО РОД



# “ВЫЙДЗІ, МАМАЧКА, З СВЯЧАМІ, МЫ ТВАІХ ДЗЯЦЕЙ ЗВЯНЧАЛІ”

Не адну пару лапцей Бог стаптаў,
пакуль гэтую пару сабраў.

Пары злучаюцца на небе,
вяселлі ладзяцца на зямлі.

*Народная мудрасць*

У наша жыццё спакваля вяртаецца адзін з ключавых рытуалаў беларускага вяселля — вянчанне ў храме. Няхай пакуль што гэты цудоўны абрад (глыбінны па сваёй лёсавызначальнай ідэі і шыкоўна-вытанчаны па свайму знешняму аздабленню) успрымаецца моладдзю як чарговая даніна модзе, нейкі своеасаблівы, непаўторны момант у складанай святочнай дзеі, які пажадана запісаць на відэастужку, каб пасля з гонарам паказваць сваякам і гасцям. На жаль, часцей гэта так. І ўсё ж хочацца спадзявацца, асабліва ўлічваючы вельмі хвалюючыя статыстычныя даныя аб колькасці скасаваных шлюбаў, што храмавае вянчанне станоўча паўплывае на маральную годнасць хлопцаў і дзяўчат і паспрыяе шлюбнаму даўгавеччу. Перакананы, што на ўзроўні глыбокай падсвядомасці сучасная моладзь разумее рэгістрацыю ў ЗАГСе як звычайны юрыдычны акт, за якім мала што стаіць прынцыпова для іх важнага. Пасля рэгістрацыі новастворанай сям’і дзяржаўны орган абсалютна не цікавіць яе далейшы лёс.

Зусім іншае стаўленне да вянчання ў храме. Яно ўспрымаецца не толькі як узнёслая рытуальная працэдура, а як найвялікшы маральна-этычны абавязак перад будучымі дзецьмі, перад сваімі бацькамі, сваім Родам і, нарэшце, перад Творцам Сусвету. Абавязак, які да скону веку патрабаваў адпаведных паводзінаў, адпаведнага стаўлення жонкі да мужа, мужа да жонкі і дзяцей. Наколькі важным быў гэты крок у жыцці кожнага чалавека гавораць наступныя народныя прыказкі:

*ажаніўся, то і пераменіўся; жонка — найлепшая сполка; жонка — не лапаць, з нагі не скінеш; з мілым па душы — рай і ў шалашы; добрая жонка — дома рай, злая — хоць з хаты ўцякай; вазьмі сабе жонку хоць татарку, абы вяла ў хаце гаспадарку; ажаніцца, як і паміраць, не спяшайся; багацце нявесты на шчасце не пераробіш.*

З усіх гэтых адшліфаваных мудрасцю продкаў паэтычных мініяцюр выразна вынікае, што *шлюб — гэта наканаваны*

*лёс*, гэта адказны крок у самастойным жыцці кожнага чалавека, крок насустрач Вечнасці. Гэта чарговая прыступка ў радаводнай лесвіцы, якая зніТоўвае нашы маўклівыя карані і шумлівую крону будучыні. Аднак радаводная разгалінаванасць у сынах і звонкае шапаценне лістоты-ўнукаў заўсёды залежыць ад таго, наколькі ствол нашага пакалення захавае і данясе да самай вяршаліны сокі зямлі, якія пакрысе збіралі продкі-карані.

Абрад вянчання існуе на Беларусі з даўніх часоў прыняцця хрысціянства, таму ён даволі арганічна ўпісаўся ў абрадавую кампазіцыю ўсяго вяселля, пры гэтым сканцэнтраваў вакол сябе безліч розных прыкмет і перасцярог. Віншавальных песень, зычэнняў і благаславенняў, забаронаў і прадпісанняў, якія тычыліся і гасцей і маладых. Рытуальныя дзеянні гасцей (бацькоў, сватоў, дружак, каравайніц) былі скіраваны на тое, каб забяспечыць шчаслівы і надзейны шлюб, каб новыя гаспадары мелі заможную гаспадарку і дастатак у хаце, каб нарадзілі дзетак і заставаліся здаровымі; маладыя ж у сваю чаргу імкнуліся пры дапамозе магічных сродкаў паспрыяць сваім лепшым сябрам, якія на вяселлі выконвалі ролю дружак, хутчэй стварыць свае сем'і.

Гістарычна склалася так, што *ў шматдзённым святкаванні вяселля* ўтварылася *некалькі кульмінацыйных момантаў — заручыны, зборная субота, першая шлюбная ноч, дзяльба каравая*, якія факусіруюць у сабе рытуальнае развітанне дзяўчыны са сваім родам і пераход яе ў дом жаніха. Кожны з гэтых этапаў складаецца з мноства абрадавых дзеянняў, якія спачатку падрыхтоўвалі цэнтральны рытуал, а затым шэрагам магічна-засцерагальных дзеянняў замацоўвалі атрыманы вынік.

*Абрад вянчання* таксама разгортваецца па гэтай прынцыповай схеме. У яго структуры можна вылучыць наступныя этапы: *прыезд жаніха, выкуп маладой, адпраўка да вянца, самі шлюбавіны, вяртанне ад вянца, перагароджванне дарогі, сустрэча маладых перад парогам хаты*.

Мой уласны вопыт удзелу ў некалькіх гарадскіх вяселлях сведчыць, што перш-наперш з абрадам храмавага заручэння звязана найбольшая колькасць памылак і парушэнняў з боку практычна ўсіх яго ўдзельнікаў. Да чаго гэта можа прывесці — гаворка асобная і даволі далікатная. Можна было б спасылаючыся на ўспаміны людзей сталага веку, з якімі даводзілася сустракацца і гутарыць у розных мясцінах Беларусі, прывесці прыклады недакладнага выканання рытуалу і тых наступстваў, якія яны справакавалі. Разумею, што такія парушэнні, магчыма, былі ў жыцці многіх чытачоў і цяпер здольны выклікаць негатыўныя эмоцыі, перажыванні і абурэнні. Таго, што было,

назад не вернеш, таму абурацца на сваё нешанцаванне бессэнсоўна, гэтаксама як і на аўтара, які толькі цяпер данёс гэту інфармацыю да чытача. Застаецца адзіны шлях: узаемапавагі, узаемападтрымкі і ўзаемаспачування. Таму, абапіраючыся на свае ўласныя экспедыцыйныя запісы, архіўныя матэрыялы і этнаграфічныя друкаваныя крыніцы мінулага стагоддзя, аўтар прапануе падрабязнае апісанне асноўных рытуальна-абрадавых дзеянняў і, што, магчыма, больш важна, паспрабуе патлумачыць, які сэнс за гэтым хаваецца і якое значэнне надавалі яму нашы продкі.

## ПРЫЕЗД ДРУЖЫНЫ МАЛАДОГА

Увесь перадвясельны перыяд займаў даволі значны прамежак часу і разгортваўся няспешна, павольна, быццам навобмацак. Запоіны, заручыны, зборная субота праходзілі ў атмасферы празмернай перасцярогі і абачлівасці. Тут дзейнічаў прынцып “паспяшыш — людзей насмяшыш”. У ходзе падрыхтоўкі і правядзення кожнага з гэтых этапаў улічвалася любая дэталь, любы знак, якія выконвалі ролю прадказанняў. Бывалі выпадкі, што сваты нават вярталіся дадому, калі дарогу ім перабягала чорная кошка або заяц. А калі конь пачынаў біць зямлю капытом або іржаць, то ўвогуле не ад’язджалі з двара.

Эмацыянальны настрой першага дня вяселля ў стане дружыны маладога быў зусім іншы. На першы план святочнага балю выходзіла моладзь, а там, дзе яна, там гамана, гумар, фрывольныя жарты, сяброўскія кпіны ды лёгкая разняволенасць у паводзінах. Аднак гэта юнацкая вірлівасць тонка і далікатна кантралявалася прадстаўнікамі старэйшага пакалення — censored сватамі.

Перад ад’ездам жаніха клопату хапала ўсім. Дзяўчаты і хлопцы з дружыны маладога ўпрыгожвалі павозкі, брычкі, тарантас (як у якой мясцовасці). Асабліва стракатай і расквечанай была брычка, якая ўзначальвала вясельны поезд, бо на ёй ехаў сам малады. Дугу каня з першай павозкі аплямталі хвояй (галінкамі елкі, сасны або ядлоўцу), а зверху мацавалі некалькі прыгожых рознакаляровых стужак. Самым галоўным атрыбутам усёй кампазіцыі ўпрыгожвання былі званочкі: пасярэдзіне большы, а з бакоў меншыя. У эстэтычна-рытуальным плане яны павінны былі здалёк абвяшчаць жыхароў навакольных вёсак аб чарговай святочнай падзеі — стварэнні новай сям’і. У плане эзатэрычным, на ўзроўні тонкіх энергетычных структур гэта быў знак-папярэджванне “цёмным сілам” саступіць дарогу і не ўчыняць ніякіх перашкод. У народзе ве-

рылі, калі нехта з мясцовых ведзьмакоў зачароўваў дарогу, то сваточны пераліў званочкаў нейтралізаваў, знішчаў гэтыя чараванні і ачышчаў дарогу ад усякай брыдоты.

У сучасных гарадскіх вяселлях гэтая акалічнасць амаль што не ўлічваецца. Як правіла, моладзь едзе да маладой на неўпрыгожаных аўтамашынах. І толькі калі адбудзецца выкуп, дружына нявесты будзе іх упрыгожваць. Прычым трэба адзначыць, што сучасныя ўпрыгожванні ў нечым паўтараюць сэнсавае прызначэнне традыцыйных, а ў нечым разбураюць яго і ўносяць новыя адценні. Напрыклад, захаваўся звычай упрыгожваць машыны рознакаляровымі стужкамі. А вось ключавы знак вясельнага поезда шырока вар'іруецца. Прыгожай і змястоўнай навацыяй з'яўляецца замацаванне на машыне сімвалічных "заручальных пярсцёнкаў", якія заходзяць адзін за другі, утвараючы "васьмёрку", выява якой літаральна на кожным кроку суправаджала найбольш значныя этапы вяселля (маладых заводзілі за стол, перавязаўшы рукі крыжнакрыж ручніком; на парог клалі замок, які адначасова быў эратычным сімвалам і сімвалам "замыкання", паяднання маладых; на працягу ўсяго вяселля жаніх і нявеста павінны былі хадзіць, трымаючы адзін аднаго пад руку). Два кольцы, замацаваныя такім чынам, абвяшчаюць аб шчаслівай падзеі ў жыцці маладых.

Авангарднымі ўяўляюцца дзеянні тых, хто мацуе на капоце першай машыны двух лебедзяў. Калі на вясельным караваі два выпечаныя з цеста "галубкі" не толькі перавязаны між сабою чырвонай стужкай (усё тым жа знакам вечнасці), але яшчэ і пасаджаны дзюбачкай да дзюбачкі (быццам цалуюцца), то гэтым самым каравайніцы праграмавалі маладым жыццёвую згоду, душэўную шчырасць. А які жыццёвы лёс прасілі ў Бога дружкі маладых, калі садзілі гэтых лебедзяў паралельна, а то і адвярнуўшыся адзін ад другога, а то і толькі аднаго?

І ўжо зусім не вытрымлівае ніякай крытыкі сучасны варыянт упрыгожвання машыны маладых лялькай. Яна ж нежывая? Прынцып рытуальнага мадэліравання паводзін "падобнае выклікае падобнае" прадказвае толькі адно: смерць дзіцяці ў гэтай сям'і.

Прадбачу, нехта прачытае гэтыя словы і падумае: "Містыка, віртуальная рэальнасць". Магчыма і так, але... Наша бяда ў тым, што ўсю культурную спадчыну продкаў мы ўспрымаем як з'яву ўласна эстэтычную, мастацкую. Безумоўна, народнае мастацтва выконвае і гэтую ролю. Некаторыя сучасныя навукоўцы-фальклярысты прытрымліваюцца менавіта гэтай пазіцыі.[1] Адштурхоўваючыся ад тэзіса "фальклор — мастацтва

слова", яны лагічна прыходзяць да высновы: калі гэта мастацтва, то галоўнай функцыяй яго з'яўляецца эстэтычнае выхаванне чалавека. Тое, што фальклор ў кантэксце рытуалу — з'ява непаўторна прыгожая, ніхто не будзе аспрэчваць. Але заўсёды хочацца задаць пытанне: "А дзеля чаго ўсё гэта робіцца і чаму менавіта ў такой форме і ў такі час?" Не перакананы, што сучасныя вернікі прыходзяць у храм толькі дзеля таго, каб атрымаць эстэтычную асалоду. Ну, якая можа быць асаблівая прыгажосць у рытуале, які выконваецца ў мячэці: мужчыны стаяць на каленях спіной адзін да аднаго і нізка, да самай падлогі, раз за разам схіляюць галаву? Аднак пры ўсёй неэстэтычнасці згаданай позы — гэта асноўнае рытуальнае дзеянне ўсіх вернікаў-мусульман.

Іншая справа, калі, напрыклад, праваслаўны чалавек бачыць (або заходзіць) ісламскі ці будыйскі храм. Ён успрымае яго не як спецыяльнае рытуальнае месца для сакральнага свяшчэннадзейства, а як прыватнае архітэктурнае збудаванне, сузіранне якога выклікае пэўныя эмоцыі і не болей. Сутнасць рытуальнага дзеяння, яго сэнсавая напоўненасць пакідаюць праваслаўнага чалавека абыякавым, бо гэта не яго стыхія, не яго духоўнае поле актуалізацыі памяці і імгненнага свядомага ўключэння ў структуру рытуалу.

Гэты ж самы прынцып дыстанцыравання (навуковай інтэрпрэтацыі, эксперыментальнага анатаміравання, урбаністычнага пасіўнага сузірання, а не актыўнага ўключэння ў святочную дзею) вызначае нашы адносіны да спадчыны продкаў. Большасць з нас нагадвае маладога біёлага, які ўпершыню назірае за жыццём клеткі праз мікраскоп: ён бачыць рух жывой матэрыі, але не можа растлумачыць, якім фізічным, біяхімічным, энергетычным законам гэты рух падпарадкаваны. Або, скажам, колькі паэтычных радкоў напісана пра начное неба. Але сабраныя ўсе пад адну вокладку хрэстаматыі, яны літаральна нічога не дадуць для разумення таго, чаму менавіта такім яно створана і па якіх законах.

Тое ж і з культ-*ура*-й: мы ўспрымаем яе як мастацкі феномен, але не "разумеем", не "бачым" *аўру* гэтага. А аснову кожнага рытуалу складаў перш за ўсё сакральна-магічны пачатак. Кожнае абрадавае дзеянне было своеасаблівым дыялогам з Космасам, Вечнасцю, Абсалютным Розумам, Творцам Сусвету. Аб тым, што чалавек або група ўдзельнікаў рытуалу як бы падключаліся да незвычайнага канала сувязі з Універсальнай касмічнай субстанцыяй, сведчыць штогадовая паўтаральнасць святкаванняў з захаваннем дакладна выпрацаванага рытму. Дыялог з Космасам разгортваўся па некалькіх кодавых сістэмах. Код дзеяння (напрыклад, расплятанне касы

або заручыны) абавязкова падмацоўваўся прадметна-атрыбутыўным кодам (расплятанне адбывалася на дзяжы) і канчаткова замацоўваўся прыгожым словам (песняй, рытмамеладычныя асновы якой адпавядалі дынаміцы рытуальнага дзеяння). Дастаткова ўслухацца ў словы вясельных (і не толькі) песень, каб зразумець, што іх эстэтыка была падпарадкавана галоўнай мэце святочнай падзеі:

А едзь, Васечка, ды й не пазніся,
Штоб твая шапачка пылам не спала,
Штоб твая дзевачка з другім не стала.[2]

Перад намі не што іншае, як звычайная народная замова. Яе словы адначасова паўтаралі (пераказвалі) рытуальнае дзеянне, задавалі яму дакладны накірунак развіцця, асцярожна, але настойліва раілі прытрымлівацца дзядамі выпрацаванай "завядзёнкі". Апошні радок быццам бы дапускаў магчымасць парушэння, але ж аднначасова прадказваў-падказваў і магчымы вынік, калі раптам адбудзецца адхіленне ад рытуалу.

У чым тут містыка, калі ўсе варыянты ўжо неаднаразова былі апрабаваны жыццём, а паслядоўнікі (захавальнікі вопыту продкаў) загадзя ведалі адказы на любы з "пазаштатных" хадоў. На гэтым вопыце грунтуюцца традыцыі распрацоўкі сноў, прыкмет і тых самых адхіленняў ад рытуалу. Стаўленне да гэтай "віртуальнай рэчаіснасці" магло б быць больш рацыянальным і практычным, калі б кожны дарослы жыхар Беларусі ўспомніў шэраг выпадкаў з уласнага жыцця, у аснове якіх ляжала папярэдняя інфармацыя, дадзеная чалавеку ў розных формах выяўлення. І калі б усё гэта было сабрана ў адзіную кнігу памяці нашай культуры і ўсебакова асэнсавана, то перад намі адкрыліся б дзіўныя таямніцы, якія даваліся ў рукі толькі выключным асобам.

Авалоданне унікальным банкам агульначалавечай памяці дазволіла б зразумець шматлікія законы арганічнага суіснавання як з Космасам, так і паміж людзьмі. Толькі тады мы выразна ўбачылі б наколькі цесная сувязь існуе між намі, паміж пакаленнямі, паміж Родамі і сем'ямі. І толькі тады б зразумелі, што дзяды нясуць адказнасць за лёс унукаў, бацькі — за дзяцей, муж — за жонку і г.д. І, магчыма, у нашым жыцці стала б менш брыдкаслоўя, здзеку, гора, слёз, а навагоднія пажаданні далятал і б да Творцы не па засмечанаму, перапоўненаму вірусамі, а па чысцюткаму каналу сувязі. Відаць, і вынікі зваротнай сувязі былі б зусім іншыя. Як хочацца, каб наша традыцыйнае святочнае пажаданне "крынічнай вады і ніякай бяды" стала рэальнасцю прыроднага і духоўнага існавання чалавека.

Спадзяюся, што невялікі экскурс у структуру абрадавых кампазіцый і асэнсаванае прачытанне іх паасобных элементаў дапаможа больш сур'ёзна ставіцца да абраду вяселля, пры гэтым не проста ашчадна захоўваць яго рытуальную канву, але і разумець сэнсавую накіраванасць і зместавае напаўненне.

...Калі ўсё было гатова да ад'езду, бацькі ставілі пасярод хаты стол, усцілалі яго белым абрусам, клалі хлеб-соль, ставілі вядро з вадой, запальвалі грамнічную свечку. Бацька доўгім ручніком перавязваў рукі сына, тройчы па сонцы абводзіў яго вакол стала і вёў да парога. Потым даваў яму ў рукі невялічкую ікону з выявай Ісуса Хрыста, а маці з грамнічнай свечкай і хатнім абразам благаслаўляла сына ў дарогу. Абраз пакідалі ў хаце. А "грамніцу" перадавалі свату, каб у дарозе пашчасціла і нічога не здарылася. Акрамя таго, сват браў з сабой усялякія рытуальныя рэчы (грошы, гарэлку, цукеркі, печыва, паясы, мёд), неабходныя для выкупу нявесты.

Разам з маладым у склад дружыны ўваходзілі сват, хросная маці, паджанішнік (родны брат або лепшы сябра) і яшчэ дзве-тры падводы моладзі з музыкам. Перад ад'ездам і па дарозе пачэсная кампанія амаль бесперапынна спявала:

Да борам, борам, барамі
Ехалі сваты радамі,
А молад Яначка напярод,
А яго брахнечка пасярод.
Стойце, пастойце, сватове!
Чы не зязюлька кукуець?
Чы не салавейка шчабечаць?
Яначка адказваець:
— То не зязюлька кукуець,
Не салавейка шчабечаць;
Гэта маёй Агатцы песні пяюць,
Мне, маладому, ведама даюць.
Для сватняга двара
Да высокая гара.
Не ўзыйці, не ўз'ехаць,
Сакалом не ўзляцець.
Што даці, то даці,
Тую гару раскапаці.
І ўзыйці, і ўз'ехаць,
Сакалом узляцець
А Яначку ўз'ехаць[3].

Аднак перад тым як адправіцца ў дарогу, дружына маладога садзілася за стол, каб выпіць па чарцы і закусіць. Затым кожны ўдзельнік вясельнага поезда браў са стала па кавалачку хлеба з соллю і хаваў за пазуху.

Прыгожа апранутыя хлопцы разам з дзяўчатамі рассаджваліся па вазах. Як толькі ўсе ўсядуцца, маці маладога ў вы-

вернутым кажусе тройчы абыходзіла вясельны картэж і абсыпала яго аўсом, а дружка біў яе бізуном.

Пакуль дружына маладога збіралася ў дарогу, сябрына маладой рыхтавалася да сустрэчы доўгачаканых і жаданых гасцей. Родныя дзяўчыны рыхтавалі святочны стол, а яе сяброўкі займаліся ўборамі. Звычайна *нявесту прыбіралі не ў сваёй хаце*, а ў хаце блізкіх суседзяў. Фалькларыст Ул. Сысоў звяртае ўвагу на тое, што *выбар хаты быў далёка не выпадковым* (вось вам яшчэ адно пацвярджэнне таму, якая ўвага надавалася кожнай дэталі ў працэсе выканання рытуалу). Яна вызначалася ў адпаведнасці з тымі ж асноўнымі прынцыпамі народнай культуры. Перш-наперш нявесту нельга было пераводзіць праз вуліцу (цікавыя паралелі: калі па вёсцы неслі труну з нябожчыкам, то вуліцу таксама забаранялася пераходзіць), таму хата павінна была быць з таго боку вуліцы, што і хата бацькоў, але не ў той бок, з якога будзе ехаць малады. Трэба было, каб ён праехаў каля роднай хаты сваёй каханай і, як бы не знайшоўшы яе там, паехаў шукаць далей. Катэгарычна забаранялася пераапранаць маладую ў хаце ўдавы, або ўдаўца, або ў той, дзе паміралі дзеці ці здарыўся пажар. Лепш, калі ў гэтай хаце быў дастатак, багата дзяцей і шчаслівая доля ў саміх гаспадароў[4].

Сяброўкі вірылі-завіхаліся вакол маладой. Заплятала касу, абувалі ў прыгожыя чырвоныя боцікі, падладжвалі сукенку, перавязвалі саматканым чырвоным поясам. А, напрыклад, на Берасцейшчыне маладой ззаду на сукенцы прышывалі невялікі чырвоны бант, “каб ніхто не сурочыў”. У апошнюю чаргу мацавалі вэлюм, фату.

На Беларусі існавала некалькі разнавіднасцей галаўнога шлюбнага ўбору. У паўднёвых раёнах вянок рыхтавала сваціца. У абручык вянка яна ўшывала заручальны пярсцёнак нявесты, потым зверху і знізу абшывала яго кветкамі (папяровымі або засушанымі). Але абавязковай дэталлю вяночка была рута — сімвал дзявоцкай цнатлівасці і чалавечай годнасці. На Віцебшчыне вянок рабіла баярка з дапамогай сябровак. Спачатку з папяровых кветак сплялі венчык, да яго мацавалі дзве часткі самой фаты, зробленай з лёгкай, рэдзенькай тканіны чыста белага колеру. *Адна частка фаты прыкрывала доўгую касу, другая — вочы*, а яшчэ адна збіралася палярынкай і, як рушачкі, клалася праз лоб на абедзве скроні. Паверх палярынкі надзявалі прыгожы высокі вяночак у выглядзе дзвюх вінаградных гронак, якія шчыльна аблягалі галаву ад скроняў да падбародка. Па форме і расквечанасці гэтага вяночка можна было меркаваць аб статусе нявесты. Калі, напрыклад, яна была сіратой, то ў яго ўплятала зялёны лісточак.

## ВЫКУП НЯВЕСТЫ

І вось у двары стала гаманліва. Дружына маладога настойліва прабіраецца да нявесты. Аднак у сенцах дарогу прыехаўшай моладзі перагарадзілі сталом, вакол якога гуртам стаяць брат нявесты і яе сяброўкі. На Беларусі захаваліся *дзве формы выкупу*. Найбольш старажытная, калі ў адпаведнасці з законам матрыярхату, жаніх выкупляў нявесту ў яе старэйшай сястры. У больш позні часы "таргавацца" даводзілася з родным братам. Спачатку жаніху падстаўлялі іншую "маладую" — пераапранутую ў нявесту старэнькую бабулю. Калі ж дружына распазнавала зман, то ўсе гучна крычалі:

— Не наша! Не наша!

Пасля гэтага баярка выводзіла з-за фіранкі сапраўдную нявесту і распачынала торг: патрабавала ад маладога грошы, упрыгожванні, падарункі.[5]

Сёння выкуп маладой нагадвае фрагмент кірмашовага торгу. А сам торг пачынаецца ўжо на лесвічнай пляцоўцы. Хлопцы з боку маладой падаюць дружыне маладога трохлітровы слоік "з крынічнай вадой", на дне якога ляжыць ключ "ад за́мка", у якім схавана маладая. Для таго каб ключ дастаць, ваду трэба выпіць. Затым ужо ў прыхожай дарогу перагароджваюць невялікім столікам, вакол якога разгортваюцца асноўныя падзеі. Ад жаніха патрабуюць даляры, просяць "залатымі" манетамі выкласці імя нявесты і многае іншае.

Нарэшце, апошні бар'ер пераадолены. Усе радуюцца: дружына маладога — "прыдбанай" прыгажуняй, сябрына маладой — удалым торгам.

Выкупленую нявесту жаніх браў за руку і вёў у родную хату. Там за шчодрым сталом радзіна маладой ужо зачакалася гасцей. Дружына маладога садзілася за стол уздоўж сценкі ад вуліцы, а родныя нявесты — уздоўж двара. Старшы сват даваў каманду наліць па чарцы і выказваў шчырае пажаданне: "Вып'ем, каб было весела гуляць і наша вяселле доўгія гады не забываць!" Пасля непрацяглага сталавання збіраліся ў дарогу.

У Верхнядзвінскім раёне існаваў звычай: маладая перад тым як пакінуць хату, падыходзіла да іконы і пачынала "чытаць" падарожную малітву, а затым "пускала голас" і развітвалася з усімі прысутнымі. Яна рабіла па хаце развітальны круг: падыходзіла спачатку да бацькоў, радні, а потым да астатніх гасцей, кланялася ў пояс і кожнага цалавала. Той, з кім яна развітвалася, жадаў ёй "шчасця-долі".[6]

На Міншчыне бытуе крыху іншы варыянт адпраўкі маладых да вянца. Пасля кароткага застолля бацька апраразваў

дачку спецыяльным ручніком, тройчы па сонцы абводзіў яе вакол стала і даводзіў да парога. Затым бацька і маці бралі па бохану хлеба, загортвалі яго ў розныя канцы таго ручніка, якім бацька апяразваў дачку. Адной рукой яны трымалі хлеб, а другой высока ўздымалі сярэдзіну ручніка, утвараючы трыумфальную арку (дах хаты, вясёлку, падкову). Маладыя праходзілі праз рытуальную браму неўміручасці і выходзілі ў двор. Прысутныя жанчыны імгненна падхоплівалі песню:

Ой, прыбылі конікі да крыльца,
Сабірайся, дзевіца, да вянца.
Сядай, сядай, дзевіца, на каня,
І паедзем, дзевіца, да вянца[7].

Малады са сваёй дружынай садзіўся ў адну павозку, маладая ў іншую. Дуга каня ў павозцы, на якой ехала нявеста, была ўпрыгожана "шоркамі" - спецыяльнымі вяночкамі, якія па форме нагадвалі вянок самой маладой.

Як толькі ўсе рассядуцца, бацька браў ікону і, трымаючы ў руках дзве запаленыя свечкі, абыходзіў павозкі, рухаючыся па сонцы. Следам за ім ішла маці і абсыпала ўсе павозкі зернем жыта.

У 70-я гады нарадзілася савецкая традыцыя запрашаць у ЗАГС на рэгістрацыю шлюбу бацькоў маладых. Спецыяльна для іх у некаторых ЗАГСах былі зроблены высокія масіўныя крэслы — як для самых ганаровых гасцей.

Давайце супаставім дзве традыцыі і два абрады, у якіх быў сфакусіраваны змест гэтых традыцый.

Што рабілі бацькі, калі абыходзілі вясельны поезд і абсыпалі яго зернем жыта? Зразумела, што бацькі маладой "замыкалі" вакол вясельнага поезда круг, каб ніхто не змог па дарозе да храма і назад зрабіць маладым шкоду. Калі ж бацькі хацелі паглядзець абрад рэгістрацыі, яны мусілі сесці ў адну з машын і тым самым "разрывалі" тое кола, якое ж самі ўтварылі. Зусім нелагічнай уяўляецца гэтая навацыя і па другой прычыне. Справа ў тым, што пасля хрышчэння дзіцяці за яго духоўнае жыццё неслі адказнасць не фізічныя (родныя), а хросныя бацькі. Як толькі хрэснік аказваўся ў рытуальнай сітуацыі, побач з ім знаходзіліся і яго хросныя.

Агульнавядома, што няпоўная сям'я не мела права адпраўляць да вянца і сустракаць пасля вянчання маладых (каб нешчаслівы лёс бацькоў не напаткаў дзяцей). Часам ролю родных бацькоў выконваюць хросныя. Але і гэта памылковы крок. Калі хросныя абнясуць вясельны картэж, то тады яны не змогуць быць побач з маладымі ў храме. Таму сустракаць мала-

дых прасілі самую шчаслівую пару сярод сваёй блізкай радні.

Сёння ў некаторых мясцінах абрад адпраўкі маладых да вянца заканчваецца яшчэ адным незвычайным рытуалам. Маці рассцілае на зямлі ручнік, кладзе на яго хлеб-соль, запальвае свечку і ўсе машыны вясельнага поезда павольна праязджаюць над гэтым свяшчэнным вогнішчам, якое павінна перасцерагчы маладых у дарозе. Гэты рытуал пераклікаецца з купальскімі скокамі праз вогнішча. Дзеля таго каб атрымаць дазвол пераходу ў статус дзяўчат перадшлюбнага ўзросту, трэба было “згарэць” у папярэднім стане. Перадшлюбны праезд над “вогнішчам” — храмавай свечкай — гэта зноў-такі акт фізічнага ачышчэння і духоўнага сталення.

## РЭГІСТРАЦЫЯ Ў ЗАГСЕ І ВЯНЧАННЕ Ў ХРАМЕ

Дарога вясельнага поезда да храма нагадвала шлях казачнага героя, якому патрэбна было пераадолець некалькі непрадбачаных перашкод. У народзе яна ўспрымалася як праекцыя жыццёвага шляху маладой пары. Тут улічвалася кожная дэталь і прыкмета. Часам, здаецца, зусім нязначная падзея, на якую іншым разам проста не звярнулі б увагі, ператваралася ў надзвычай інфарматыўна-папераджальны або прадказальны знак. Лічылася, калі на дарозе першым сустрэнуць мужчыну, то ў маладых першым народзіцца хлопчык, калі жанчыну, то чакаць трэба дзяўчынку. Асабліва дрэнным знакам была сустрэча пахавальнай працэсіі — гэта прадказвала хуткую смерць каго-небудзь з маладых (зноў-такі ў залежнасці ад таго, каго хавалі).

На Палессі адным з галоўных і нават абавязковых удзельнікаў вяселля лічыўся знахар, які павінен быў уважліва сачыць за ходам святкавання і своечасова рэагаваць на чыюнебудзь спробу нашкодзіць маладым. Здаралася, што знахара бралі ў склад вясельнага поезда, асабліва калі ведалі, што трэба будзе праязджаць каля дома ведзьмака. А тыя тварылі многае. Ведаючы пра вяселле, загадзя бралі зямлю з таго месца, дзе куцаліся сабакі, і абсыпалі маладых або кідалі пад павозку, на якой яны ехалі. Сваркі паміж маладымі было не мінаваць.

Ужо гаварылася, што ў савецкі час царкоўнае вянчанне было заменена юрыдычнай рэгістрацыяй утворанай сям'і ў ЗАГСе. Дзейнасць практычна ўсіх дзяржаўных органаў на сучасным этапе нагадвае спробу ўтрымацца абедзвюма нагамі на дзвюх лодках, якія плывуць да таго ж у розныя бакі. Гэта акалічнасць не абмінула і першы крок маладой сям'і: спачат-

ку ў нас праводзіцца рэгістрацыя ў ЗАГСе, а затым ужо вянчанне ў храме. Па форме правядзення ўрачыстасці гэтыя працэдуры ў нечым падобныя, а ў нечым адрозныя.

У апошнія гады нашы ЗАГСы павярнуліся тварам да спрадвечных традыцый. Аднак супрацоўнікі іх у большасці сваёй не з'яўляюцца свядомымі носьбітамі і захавальнікамі гэтых традыцый, таму часам уключаюць у кантэкст свайго "абрадавага" дзеяння рытуалы і атрыбуты народнага вяселля і храмавага заручэння. Уключаць уключаюць (што добра і прыгожа), але не ведаюць і не разумеюць значэння іх сімволікі (што кепска). Прывяду некалькі прыкладаў недакладнага прачытання народных абрадаў і ў сувязі з гэтым неадпаведнага іх выкарыстання ў структуры сучаснага рытуалу рэгістрацыі ў ЗАГСе.

*Прыклад 1*. Імкнучыся паказаць сваю гасціннасць і шчодрасць, выказаць задавальненне тым, што бяруць на сябе адказнасць за шчаслівы лёс новастворанай сям'і, работнікі ЗАГСа сустракаюць маладых перад парогам хлебам-соллю.

Катэгарычна "не"! Узгадаем: бацькі адпраўлялі маладых з дому нявесты, утварыўшы ручніком арку шчасця-долі, пры гэтым у абодва канцы ручніка былі загорнуты *два* боханы хлеба, што сімвалізавала іх паасобнае дашлюбнае жыццё. У ЗАГСе або ў храме іх аб'ядноўваюць (злучаць), таму перад парогам роднай хаты бацькі сустрэнуць *адным* караваем. Але ж работнікі ЗАГСа спрабуюць мовай сімвалаў апярэдзіць сітуацыю. Яшчэ не "заручылі", дакумент не выдалі, а ўжо паспяшылі назваць (на ўзроўні сімвалаў) адзінай сям'ёй. Таму *перад парогам ЗАГСа маладых можна сустракаць толькі "брамай неўміручасці"* — той самай *аркай, утворанай чырвона-бела-чырвоным* (толькі такім) *ручніком*.

*Прыклад 2*. Як у храме, так і ў ЗАГСе маладых ставяць не на голую падлогу, а на спецыяльны ручнік (не чыста белы, не з блакітнай паласой, як аднойчы давялося бачыць у Гомелі, а зноў-такі толькі на той, у якога канцы чырвоныя). Але як ставяць? З даўніх часоў як у прыродзе, так адпаведна і ў культуры існаваў падзел на мужчынскі і жаночы пачатак. У міфапаэтычнай мадэлі свету беларусаў "*верх*" лічыўся *сферай мужчынскага пачатку* (яго напаўнялі богі: Пярун, Вялес, Дажджбог, Стрыбог, Хорс), адпаведна "*ніз*" — вада, тое, што дае жыццё, апладняе зямлю, лічыўся *сферай уплыву жанчыны* (параўнайце: іх боствамі-ўладарамі былі "русалкі"). Гарызантальная вось культуры таксама мела сферы ўплыву жанчын і мужчын (для параўнання: нават родавая катэгорыя назоўнікаў, якія абазначалі зоны пераважнай дзейнасці, супадала з гэтым падзелам: хата—хлеў; лук, нож, багор — нажніцы, лапата, матыка;

капуста, морква, цыбуля — часнок, бурак, перац, і г.д.). Дык вось у культуры правы бок (пазначаўся знакам "+") суадносіўся з мужчынскай сферай, а левы (пазначаўся знакам "-") — са сферай жаночага ўплыву. Таму менавіта такога прынцыпу прытрымліваюцца ў час вянчання ў храме: маладую ставяць на ручнік злева ад маладога.[8] Гэтаксама павязваюць ручнікі сватам: жанчынам — вузел пад левую руку, мужчынам — пад правую; мацуюць кветкі і стужкі дружкам маладых.

*Прыклад 3.* У храме ручнік клаўся перад алтаром. Далей (бліжэй да Бога) ісці дазвалялася толькі тады, як будуць закончаны звядзенне свечак і абмен заручальнымі пярсцёнкамі: святар возьме маладых за рукі і павядзе да іконы Маці Боскай і тройчы абвядзе вакол алтара. У ЗАГСе маладыя сыходзяць з ручніка (быццам з дарогі жыцця збочылі, заблудзіліся) і па аднаму (о, дзіва! што ж гэта за пара, якая па аднаму ходзіць) падыходзяць да стала, каб паставіць свой подпіс у кнізе ўліку. Недарэчнасць. Куды прыгажэй і цывільней было б, каб супрацоўнік ЗАГСа сам падышоў да маладых і яны, не сыходзячы з месца, пакінулі б у рэгістрацыйнай кнізе знак вечнай згоды — уласныя подпісы.

Дарэчы, храмавае вянчанне пастаянна суправаджае гарэнне свечак. Іх нельга трымаць голымі рукамі, каб не быць беднымі і нешчаслівымі (а ў ЗАГСе кніга ляжыць на голым стале, чаму хаця б не на ручніку). Па тым, як гарэлі свечкі, прадказвалі лёс маладых. Калі полымя было роўным і спакойным, маладыя будуць жыць у згодзе. Калі ж яно хісталася або трашчала, жыццё не абыдзецца без сварак і непаразуменняў. Чыя свечка больш згарала, той пражыве карацейшы век. Нядоўгі век прадказвала і нечаканае затуханне свечкі. Пасля вянчання ручнік, на якім стаялі, маладыя забіралі з сабой. Яго скручвалі ў кацёлку, пакідаючы ўнутры дзве перавязаныя хусцінкай або чырвонай стужкай свечкі, і захоўвалі ўсё жыццё.

*Прыклад 4.* Важным момантам адрознення вянчання ад рэгістрацыі з'яўляецца час стварэння сям'і. У храме звычайна *вянчалі ў нядзелю* і ў найбольш спрыяльны час — восенню (Вялікая вясельніца) і зімой (мясаедныя вяселлі). Але катэгарычна забаранялася вянчацца ў чатыры пасты і ў дні вялікіх святаў. Нашы ЗАГСы рэгіструюць і ў пятніцу (што дапускаецца), і ў суботу (што забараняецца, бо гэта дзень ушанавання продкаў), і ў пасты.

*Прыклад 5.* Звычайна адразу ж пасля вянчання маладыя ішлі да магіл сваіх продкаў, каб заручыцца іх падтрымкай на будучае сумеснае жыццё. Нашы сучасныя пары едуць да брацкіх магіл, да іншых рытуальных мясцін, звязаных з захаваннем продкаў (дакладны крок), або да помнікаў правадыру

сусветнага пралетарыяту (незразумела, навошта). Сёння ў ЗАГСах адразу ж пасля рэгістрацыі маладых запрашаюць у суседні пакой "замацаваць" падзею бакалам шампанскага. Там жа ладзіцца невялікі "спектакль" для маладых, а то і з іх удзелам. Я з жахам гляджу на тых масавікоў-забаўнікаў, якія прапаноўваюць маладым адламаць (?) (хлеб ламалі толькі на могілках) па кавалачку хлеба і ад душы шчыра "аздобіць" яго соллю. Вось гэта ўжо сапраўды "віртуальная рэальнасць". Маладая насыпае са смакам соль на яго кавалачак хлеба, а ён — на яе. Соль сыплецца — маладыя ўсміхаюцца. Але ці надоўга?

*Прыклад 6*. Хацелася б звярнуць увагу на адну вельмі істотную акалічнасць, аб якой мне неаднаразова ўзгадвалі супрацоўнікі мінскіх ЗАГСаў. У храмах існуе дакладны парадак: пад вянец маладыя заходзяць праз адны дзверы, нябожчыка дзеля адпявання заносяць праз іншыя, а хрышчэнне ўвогуле адбываецца ў асобным пакоі. Гэта вельмі важна. Маладыя ніколі не павінны заходзіць праз тыя дзверы, праз якія ўносілі памёршага. На жаль, у нас усё не так: напрыклад, загадчыца ЗАГСа толькі што разглядала складанае пытанне аб скасаванні шлюбу, а літаральна праз некалькі хвілін яна, узрушаная, у кепскім настроі, з далёка не святочнымі думкамі, павінна "ляцець" і праводзіць рэгістрацыю новастворанай сям'і. Які ж энергетычны паток яна перадасць маладым? На гэты аспект у нас ніколі не звярталі ўвагі. Але сёння існуе ўжо больш чым дастаткова даследаванняў, якія пераконваюць, што мы ўплываем адзін на аднаго самым непасрэдным чынам. Чаму ж тады не зрабіць, каб дні рэгістрацыі шлюбаў і дні іх скасавання былі розныя.

## СУСТРЭЧА МАЛАДЫХ ПЕРАД ПАРОГАМ ХАТЫ

Завітаўшы да продкаў або ўсклаўшы кветкі да розных помнікаў (часцей галоўнага мемарыяльнага знака ў населеным пункце), маладыя едуць дадому. Да нашых дзён захаваўся звычай пераносіць маладую праз мост на руках (часам, кажуць, трэба было праехаць сем мастоў), калі ён сустракаецца на зваротнай дарозе. Ніхто з аднасяльчан не меў права пераходзіць вясельнаму поезду дарогу. Назад маладыя і сваты ехалі ўжо ў адной павозцы (машыне). На вясковым скрыжаванні або недалёка ад дому ім стараліся перагарадзіць дарогу. На стол (табурэт, стул) ставілі вядро з вадой і хлеб-соль. Суродзічы патрабавалі ад сватоў "мытнай пошліны за ўвоз чужога чалавека" — выкуп за нявесту. Пад'язджаць да хаты маладой (і



Беларускае вяселле пачатку 20 ст.

потым маладога) стараліся з таго боку, з якога ўзыходзіць сонца. Маладыя заставаліся ў павозцы, пакуль бацькі не выходзілі з хаты. Маці апраналася ў валёнкі і вывернуты поўсцю наверх кажух. Яна трымала ў руках хлеб-соль на ручніку, а бацька графін з гарэлкай і дзве чарачкі.

У абрадзе сустрэчы маладых ёсць некалькі важных momantaў, на якіх трэба засяродзіць увагу. *Па-першае*, катэгарычна забараняецца сустракаць маладых адной удаве. Трэба, каб гэта абавязкова была сямейная пара: хросныя бацькі або сям'я роднай цёткі ці дзядзькі. *Па-другое*, хлеб патрэбна класці не на белую частку ручніка, а на зведзеныя ў адно чырвоныя канцы, сярэдзіна ў такім разе правісае ўніз. *Па-трэцяе*, маладыя не павінны сыходзіць з павозкі (выходзіць з машыны) на голую зямлю, толькі на дыван. *Па-чацвёртае*, шмат непаразуменняў сёння звязана з тым, што маладым рабіць з хлебам, якім іх сустракаюць перад парогам. Адны ломяць, іншыя кусаюць (хто большы кавалак адломіць, той будзе лідэрам у сям'і), трэція (самыя разумныя) проста тройчы цалуюць яго і дзякуюць бацькам за гасціннасць. *Па-пятае*, што рабіць з пітвом і чаркамі? Бацька налівае па першай чарцы і просіць маладых выпіць. Яны прыгубляюць і ківаюць галавой: пакуль нельга піць. Тады па прынцыпу "на табе, Божа, што мне не гожа" гарэлку выліваць праз *левае* (і толькі праз яго!) плячо за спіну.

За другім разам усё зноў паўтараецца. Калі ў трэці раз бацька нальецца таго ж напітку, маладыя злёгку прыгубяць пітво і тут жа (ужо не выліваюць) кідаюць кілішкі праз левае плячо за спіну. Разбіваць іх перад сабой спецыяльна нельга. Што з імі зробіцца (уцалеюць ці рассыплюцца) – гэта ўжо справа лёсу.

Як толькі кілішкі паляцелі ўгару, бацькі саступалі маладым дарогу і яны рушылі ў хату. Малады браў маладую на рукі і, каб выключыць магчымасць яе дотыку да парога — зоны смерці, мяжы паміж "тым" і гэтым светам — пераносіў-уносіў нявесту праз парог. У гэты час прысутная моладзь абсыпала іх зернем жывога жыта.

Прарасціце новым каласком, новым пакаленнем у бясконцай повязі Часу, Лёсу, Жыцця. Маладыя ўступалі ў новае жыццё, а ўслед ім ляцела песня-пажаданне:

Дай жа, Божа,
Каб вам было гожа,
Весела жылося,
Шчасліва вялося:
У полі ўродзіста,
У гумне наміліста,
У клеці насыпіста,
У млыне немаліста,
У дзяжы падыходзіста,
На стале ўедзіста.

Дай, Божа,
Каб вы пілі, елі
І спераду гарбацелі!

## "САМ БОГ КАРАВАЙ МЕСІЦЬ"

На старонках розных перыядычных выданняў на працягу апошніх гадоў было змешчана шмат публікацый, прысвечаных народным святам і абрадам. Але амаль што ва ўсіх гэтых артыкулах гаворка ішла пераважна пра абрадава-рытуальныя комплексы каляндарнага цыкла. Аднак па-за ўвагай этнакультуролагаў застаўся яшчэ адзін надзвычай цікавы і разнапланавы цыкл абрадаў, звычаяў, рытуалаў і вусна-паэтычных твораў, якія суправаджалі найбольш значныя падзеі ў жыцці кожнага чалавека: яго нараджэнне і хрышчэнне, вяселле і смерць.

Гэта прынцыпова недаравальная з'ява. Навукоўцы-этнолагі і фалькларысты, этнакультуролагі сцвярджаюць, што для сучаснага працэсу актуалізацыі народных святаў і абрадаў характэрна агульначалавечая, тыпалагічна блізкая з'ява: рытуальныя дзеянні і суправаджаючая іх сакральна-магічная паэзія паступова страчваюць свой першасны, уласна абрадавы і набываюць другасны, эстэтычна-гульнёвы характар. Сучасны стан традыцыйнай культуры (і перш за ўсё абрады гадаво-

га цыкла) неабвержна пацвярджае ўзмацненне гэтай разбуральнай тэндэнцыі. Разам з тым, на маё глыбокае перакананне, традыцыі продкаў, звязаныя з асноўнымі этапамі жыццёвага шляху чалавека, эвалюцыяніруюць не так хутка і маштабна, асабліва ў вясковым асяроддзі.

Безумоўна, сённяшняе гарадское вяселле проста немагчыма параўнаць са шматпланавай, шматдзённай, празмерна гаманлівай і перапоўненай абрадавымі песнямі святочнай дзеяй беларускай вёскі канца мінулага, або пачатку гэтага стагоддзя. Змянілася (стала больш адвольнай) форма вясельнага стала, не вытрымліваецца абавязковы прынцып узроставай пасадкі гасцей, не знойдзеш шэрагу абавязковых атрыбутаў-сімвалаў, пры дапамозе якіх госці маглі "атрымаць" багатую інфармацыю аб маральнай чысціні і фізічнай моцы маладых. Гаспадары і госці вяселля не могуць растлумачыць, якой павінна быць структура фаты ў маладой, з якіх частак яна складаецца і якую ролю павінна выконваць кожная з іх, якім ручніком трэба перавязваць сватоў, а на якім пакласці хлеб-соль, як пачапіць кветкі, якімі ўпрыгожваюць маладых, і што з імі рабіць далей. І ўсё ж за гэтымі абрадамі да нашага часу замацаваны арэол святасці, боскай прадвызначанасці, агульнарадавой лучнасці, таму хацелася б, каб наша моладзь не спяшалася развітвацца з імі, а, наадварот, пільна прыгледзелася, паразважала — і душой і сэрцам прыняла.

Выключным феноменам беларускага народнага вяселля з'яўляецца *каравай*. Доўгая і складаная працэдура яго гатавання суправаджаецца цікавымі рытуальнымі дзеяннямі, дасціпным, але багатым на асацыяцыі рытуальным словам, вялікай колькасцю абрадавых песень.

Этнаграфічныя крыніцы сведчаць, што яшчэ ў 19 ст. каравайны абрад быў шырока вядомы ў асяроддзі славянскіх народаў. Аднак з цягам часу і асабліва сёння арэал бытавання гэтага абраду звузіўся да межаў Беларускага Палесся ды яшчэ некаторых блізка да яго прылягаючых рэгіёнаў.

Шкада, што гарадскія жыхары скарыстоўваюць у цяперашні час у якасці рытуальна-сімвалічнага хлеба спечаны ў якой-небудзь сталоўцы торт. Думаецца, што захаванне ўсіх этапаў падрыхтоўкі, выпечкі і дзяльбы каравая значна ўпрыгожылі б шматдзённую вясельную дзею, надалі б ёй большую ўрачыстасць, змястоўнасць, сімвалічнасць, дазволілі б прыцягнуць да радавога свяшчэннадзейства асноўнае кола блізкай радні, суседзяў і знаёмых.

Знаёмства з асноўнымі этапамі беларускага вяселля дазваляе выказаць меркаванне аб тым, што *каравай* (хлеб — жыта — дзяжа — новае жыццё) як рытуальнае печыва *вызна-*

*чаў пачатак і заканчэнне асноўнай*, найбольш важнай часткі вяселля. Але агульнакультурнае значэнне яго было значна большае: хлеб у розных яго іпастасях сімвалізаваў пачатак або заканчэнне чарговага этапу ў жыцці чалавека. Толькі адзін прыклад. Сваты прыходзілі заручыць дзяўчыну і прыносілі з сабой спецыяльна выпечаны хлеб-каравай. Калі дзяўчына давала згоду ўступіць у шлюб, то яна брала з рук старэйшага свата рытуальны хлеб, а ў адказ давала яму бутэльку, цалкам запоўненую жытнёвым зернем. Калі пасля вянчання маладыя ехалі дадому, перад парогам хаты бацькі сустракалі іх хлебам-соллю, а моладзь абсыпала тым самым зернем. Памінальны стол распачынаўся з таго, што па кругу жывыя пускалі міску з куццёй (рытуальнай кашай), а ў гэты час на рагу стала (бліжэйшага да чырвонага кута) стаяла чарка з зернем і свечкай.

З гэтых рытуальных сітуацый вынікае, што *хлеб* як атрыбут абрадавага дзеяння *сімвалізаваў пераход з аднаго* фізічнага і сацыяльнага *статусу ў іншы*. Спечаны хлеб падкрэсліваў закончанасць (смерць) адной фазы, а зерне (тое, што доўжыць жыццё, дае яму новы імпульс, чарговы, больш высокі ўзровень на бясконцай спіралі касмічнага існавання) канстатавала пачатак (нараджэнне) другой.

Аналагічная трактоўка сімволікі каравая цалкам стасуецца з яго месцам у беларускай вясельнай абраднасці. Каравай сведчыў аб заканчэнні юнацтва жаніха і нявесты, аб публічным, агульнарадавым прызнанні іх сталення і згодзе старэйшых уключыць шлюбную пару ў кола правамоўных членаў грамадства з абавязковым выкананнем адпаведных сацыякультурных функцый. Заўважу, *каравай выпякаўся толькі адзін раз — пры першым шлюбе.* Калі ж мужчына або жанчына ўтваралі другую сям'ю, рытуальны хлеб не гатавалі. Дарэчы, хрысціянства запазычыла гэтую культуралагему: *вянчанне дазваляецца толькі адзін раз у жыцці.*

Каравайны абрад — з'ява даволі складаная і працяглая па часе. Беларускія фалькларысты *выдзяляюць* у ім да *пятнаццаці* паслядоўна разгортваемых *структурных элементаў*.[1]

У старой беларускай традыцыі само вяселле пачыналася з прыгатавання абрадавага хлеба. Дзеля таго каб зразумець, які глыбінны сэнс укладваўся ў гэтае радавое свяшчэннадзейства, трэба мець на ўвазе ўсё той жа прынцып народнай культуры: "падобнае выклікае падобнае". Магія пачатку, магія падабенства шырока практыкавалася нашымі продкамі як надзейны сродак, які дазваляў зазірнуць далёка наперад і па пэўных прыкметах, вядомых і зразумелых толькі старому люду, прадказаць лёс новай сям'і.

Менавіта таму да кожнага этапа падрыхтоўкі каравая ставіліся з вялікай адказнасцю. Часцей за ўсё ў яго прыгатаванні бралі ўдзел 5—7 увішных жанчын-каравайніц, *галоўнай* сярод якіх *лічылася хросная* маці маладога або нявесты. Каравайніцамі маглі быць толькі вопытныя, паважаныя сярод вяскоўцаў жанчыны, дбайныя і руплівыя гаспадыні. Катэгарычна *забаранялася запрашаць да ўдзелу ў рытуале ўдовых ці бяздетных жанчын;* меркавалася, што *іх нешчаслівы лёс можа паўплываць на будучыню ствараемай сям'і.* Звычайна рыхтавалі і *выпякалі два караваі.* У хаце маладой ён меў форму круга-сонца , а ў хаце маладога — нагадваў месяц.

Практычна кожны крок каравайніц суправаджаўся мноствам спецыяльных абрадавых песень, рытуальных дзеянняў, заклінанняў, замоў. Словы песень скіраваны былі на тое, каб замацаваць выніковасць дзеянняў каравайніц, былі іх зваротам да Бога і святых па дапамогу:

Благаславіце, людзі,
Блізкія суседзі,
Гэтаму дзіцяці
Каравай замясіць
Ручкамі бяленькімі,
Персцнямі залаценькімі,
Песнямі весяленькімі.
Ты сaступ, божа, з неба,
Як нам цяпер трэба!
Памагай рашчыніць,
Памагай замясіць
Ручкамі бяленькімі,
Персцнямі залаценькімі,
Песнямі весяленькімі.
Не стой, божа, за дзвярмі,
Да ідзі, божа, у хату,
Да сядзь, божа, на куце,
Да дай долю маладзе.
— Я ў хату не пайду,
Я за дзвярмі пастаю,
Маладзе долю перашлю.
Збірайся, родзе,
Да к беленькаму караваю!
Старыя бабы для парадку,
Маладзіцы песні пець,
Удалыя малойцы каравай печ.

Талочнасць, саборнасць усёй беларускай культуры яскрава прасочваецца і ў каравайным абрадзе. Прадстаўнікі родаў, якія спраўлялі вяселле, сярод іх і жанчыны-каравайніцы неслі з сабой муку, яйкі, масла, розныя ўпрыгожванні. Аб калектыўным характары свяшчэннадзейства сведчаць шматлікія ка-

равайныя песні: "Сабралася Агаты радзіна. Прыехала сем цётак родных; знеслі ж яны на каравай тры бочкі мукі, кваску, масла, капу яек, бязмены солі, нават прывязалі і тры вазы суччa; ... муку да й пшанічную, па кварце солі, фунту цукру, маслечка каравішнае, яечка куранячае".

Каб я знала, каб я ведала,
Да што ў тваім каравай
Да тры вядры крынічнай вадзіцы,
Да тры пуды пшанічнай мучыцы,
Да тры фаскі дравічнага масла,
Да тры капы перапяліных яек,
Да два фунты загранічнае солі.

* * *

Звязлі, знясл
Сем бочак мукі на каравай.
Звязлі, знясл
Сем фасак масла на каравай.
Звязлі, знясл
Сем коп яйцаў на каравай.
Звязлі, знясл
Сем пудоў цукру на каравай.
А Божа мой,
Вялік, высок наш каравай.

*Прыгатаванне* каравая *распачыналася* звычайна *ў суботу*. Неабходна адзначыць, што *кожны* з запрошаных *выконваў строга вызначаную ролю*. Самая блізкая радня рашчыняла цеста, назірала за бездакорнасцю выканання абрадавых цырымоній:

Старшая каравайніца –
Залатая зарукаўніца.
Не стыдна ж ёй даць
Каравай учыняць.
Дай Бог нашаму караваю
У дзяжы спор,
А ў печы падход.

Кожным крокам, кожным абрадавым дзеяннем, шматлікімі песнямі-замовамі настойліва падкрэслівалася ідэя адзінства, лучнасці, купы. Пры гэтым у песнях выкарыстоўваліся самыя вытанчаныя мастацкія вобразы, удзельнікі каравайнага абраду параўноўваліся з нябеснымі свяцiламі і карагодам зор:

Каля месяца зорачкі,
Каля каравая жоначкі,
Каля месяца ясныя,
Каля каравая красныя.

“Касмічная” вобразнасць каравайных песень была зусім не выпадковая. Відаць, праз гэта звяно паднябеснай іерархіі каравайніцы імкнуліся заручыцца падтрымкай самога Творцы Сусвету ў далейшым лёсе маладых (непасрэдна ў іх сумесным жыцці):

Калі я каравай мясіла,
Тады я Бога прасіла:
– Удайся, удайся, караваю,
Да пану Богу на хвалу,
Добрым людзям на славу,
Нашым маладым на красу,
Нашай дзевачцы на красу.

Тым часам *два жанатыя мужчыны насілі дровы,* рыхтавалі капусныя лісты, лапаты, венік і іншыя рэчы, неабходныя для таго, каб выпаліць печ і пасадзіць каравай; *два нежанатыя хлопцы садзілі каравай у печ, а дзве дзяўчыны выраблялі* з цеста фігуркі розных звяроў, жывёл, птушак, “шышачкі” і *ўпрыгожвалі імі абрадавы хлеб.*

Разам з тым у розных рэгіянальных традыцыях колькасць выпякаемых караваяў і характар іх прызначэння шырока вар'іраваліся. Напрыклад, у адным з этнаграфічных апісанняў каравайнага абраду Міншчыны гаворыцца: “Адзін каравай робяць у выглядзе паўмесяца — ён прызначаецца для абмену; другі — у форме вялікай булкі, якая называецца перапека. Выпякаецца яшчэ адна невялікая булачка — трэці каравай: калі маладая першы раз на рацэ палошча бялізну, ёй дапамагаюць суседкі; яна частуе іх гэтым пірагом і гарэлкай.

Тры часткі каравая ўпрыгожваюцца рознымі фігуркамі. Робяць яшчэ і чацвёртую булку, без упрыгожванняў, плоскую — каб хутчэй спяклася. Яе потым дзеляць паміж сабой каравайніцы і ўсе прысутныя. Акрамя таго, для кожнай каравайніцы і каравайніка, а таксама для кожнага дзіцяці, якое ёсць у хаце, пякуць па маленькаму піражку — называецца ён кроска.

Караваі саджаюць у печ па чарзе два мужчыны. Пры гэтым яны за кожным разам стукаюць у столь лапатаю, якую пад канец стараюцца зламаць. Трэці каравайнік раскладае на загнеце з дубцоў чыстага веніка агонь і ўвесь час яго падтрымлівае — каб каравай быў румяны. Дзяўчаты пры гэтым спяваюць:

Шчарбаты, лупаты загнет закладаець,
Яму бог не памагаець.

Калі ўсе пірагі пасаджаны, каравайніцы скачуць і спяваюць, пляскаючы ў ладкі:

Хвала ж богу, што мы дзела рабілі,
Каравай усадзілі
Ручкамі бяленькімі,
Персцнямі залаценькімі,
Песнямі весяленькімі.
Каравайніцы п'яны,
Усё цеста пакралі,
Па кішэнях паклалі.
Ах, ця мне прышло,
У кішэні цеста падышло.
Чыя жана гожа,
Языком дзяжу гложа,
Чыя жана хіжа,
Языком дзяжу ліжа.
Дайце мне чарку, я тую вып'ю,
Дайце другую, я вып'ю і тую,
А за трэцюю падзенькую.

Кожны чарговы этап у цырымоніі прыгатавання рытуальнага хлеба распачынаўся і заканчваўся калектыўным магічным дыялогам з абавязковымі сакральнымі формуламі. Напрыклад, у хату ўносяць дзяжу, у якой будуць учыняць цеста. Старшая каравайніца звяртаецца да бацькоў і іншых прысутных з гэтага роду: "Ёсць тут Бог, бацька і матка раджоныя, суседзі блізкія і далёкія, мужы старэчныя, бабкі заплечныя, дзеткі запечныя? Благаславіце краснай пане каравай учыніць!" Усе прысутныя гучна тройчы адказваюць: "Бог благаславіць!".

І так на працягу ўсіх пятнаццаці этапаў каравайнага абраду. Зразумела, што гэтым рытуальным дыялогам прысутныя зноў-такі імкнуліся заручыцца згодай і падтрымкай Творцы Сусвету, сваіх продкаў, нарэшце лёсу, атрымаць ад іх пэўны сакральны кодавы знак, сімвал-пацвярджэнне або прадзівапрадказанне. Гэта асабліва выразна і празрыста гучыць у шэрагу хрысціянізаваных каравайных песень:

Сам Бог каравай месіць,
Прачыстая свеціць,
Ангелы ваду носяць,
Хрыстос прыступае,
Хусткаю накрывае.

Аналагічнай абрадавай рытуалаформулай каравайніцы прасілі ў бацькоў дазволу паставіць рошчыну ў печ, а затым пасля закісання вынуць і пакласці на вечка дзяжы пасярэдзіне хаты. У гэты час бацькі стаялі побач са свечкай-трайчаткай і прасілі ў Бога шчаслівай долі і веку доўгага сваім дзецям.

Хлеб-*каравай – прадказанне*, своеасаблівая кніга будучага жыцця. Мне расказвалі пра такі выпадак. Мясіў цеста, ставіў рошчыну ў печ, распальваў яе і нарэшце вымаў каравай род-

ны дзед нявесты. І вось што адбылося. Калі дзядуля адкрыў засланку і пачаў вымаць прыгожы на першы выгляд хлеб, то аказалася, што каравай меў скразную глыбокую трэшчыну. Усе прысутныя разам залямантавалі: благі знак, жыць у пары не будуць. Тады параілі дзеду зрабіць другі замес і паўтарыць усю працэдуру яшчэ раз. Але і ў другі раз здарылася тое ж самае. Вяселле справілі, але сям'я пратрымалася роўна месяц.

Узгадаў я аб гэтым толькі каб падкрэсліць важнасць моманту замешвання і рашчынання каравая. Менавіта ў гэты час бацькі прасілі ў Бога долю для сваіх дзетак.

Яны запальвалі свечку-трайчатку, а каравайніцы дружна мясілі цеста, гучна пляскалі ў далоні, энергічна скакалі вакол дзяжы, спявалі безліч велічальных песень, у якіх ствараўся ідэальны вобраз жанчын-удзельніц. Кожны паэтычны троп скіраваны быў непасрэдна на каравайніц, але меркавалася, што яны выконвалі ролю толькі транслятара, пасрэдніка, праз якога ўсё сказанае-спетае будзе перанесена на заручоную пару. Таму і поўніліся песні наступнымі элементамі партрэтнай характарыстыкі: “беленькімі ручкамі”, “сінія запаясачкі, чырвоны закаўрошачкі, залатыя зарукаўніцы, срэбрам-золатам зарукавы пашыты”. Акрамя ўсёй гэтай метафарычнай прыгажосці ніколі не забываліся на тое, што галоўным у лёсе маладых павінна быць шчаслівая доля:

Караваю, мой раю,  
Я табе пяю, іграю.  
Красівыя мясілі,  
Шчаслівыя садзілі.

Каб каравай удаўся пышны і чырвоны (прыгожы, румяны), печ палілі дубовымі ці бярозавымі дровамі. Зверху яго ўпрыгожвалі рознымі фігуркамі або (на Палессі) “шышачкамі”, якія абавязкова перавязвалі ваўнянымі чырвонымі ніткамі:

Колькі на небе зорачак –  
То на караваі шышачак,  
Як на небе ясныя –  
Так на караваі красныя.

Садзіць каравай у печ даручалася прыгожай сямейнай пары: “кучаравы печ мяце, халасты саджае, харашуха папраўляе”.

Нельга не ўзгадаць яшчэ адну каравайную песню, у якой вельмі моцна і яскрава адлюстравана асаблівасць не толькі беларускага вяселля, але і ўсяго жыцця ў цэлым, калі на адказную працу або з нагоды важнага моманту ў жыцці сям'і і роду (радзіны – вяселле – пахаванне) збіралася ўся радня, уся сябрына, дружны талочны гурт. Акцэнтаванне гэтага матыву

ў каравайных песнях невыпадковае: пры дапамозе слоўнай, паэтычнай магіі хацелі пажадаць, каб заручоная пара жыла ў згодзе і паразуменні са сваім вялікім родам:

Да збірайся, род, к роду,
Да старыя бабкі, на параду,
Маладыя малодачкі, к караваю.
– Не сядзіце, малодачкі, не сядзіце,
Вазьміце каравай усадзіце,
Сабе гарэлачкі зарабіце.

Пасля таго як каравай на спецыяльнай лапаце пасадзяць у печ, з ёю танцавалі, а ў дзяжу ставілі запаленыя свечкі, клалі крыж-накрыж нажы, а потым падымалі і праз яе ўсе цалаваліся, што павінна было сімвалізаваць каханне маладых. Усе гэтыя дзеянні суправаджаліся прыгожымі песнямі:

Падайце залату лапату,
Засцяліце кляновы ліст,
Засцяліце кляновы ліст
Да саджайце каравай у печ.

Наш каравай, да як калясо,
Красачкі, да як кубачкі,
Як у лесе пралесачкі,
Як на небе ясны звёздачкі.

Падыходзь, падыходзь, караваю,
Да вышай печы мураванай,
Вышай сталба залатога,
Вышай князя маладога.

Спечаны каравай клалі на века дзяжы, засцеленае чысцюткім белым ручніком і пасыпанае зернем жыта. Старэйшы сват тройчы пакружыцца з ім, спяваючы : “Караваю-раю-раю, я з табою пагуляю”. Жанчыны-каравайніцы тут жа ўпрыгожваюць яго калінай, зробленымі з паперы кветкамі грушы, вішні, яблыні, рутай, мятай, барвінкам; упрыгожвалі і несупынна спявалі:

Палажылі каравай на стол –
Сталовыя ножкі зыбляцца,
Усе людзі дзівяцца,
Што ўдаўся наш каравай
Госпаду Богу на хвалу,
Добрым людзям на славу.
Вы, добрыя людзі, глядзіце
І грошыкі нам кладзіце.

Пасля гэтага хлеб нясуць у камору або клець, дзе ён будзе знаходзіцца да заключнага моманту вяселля — яго дзяльбы:

Наш каравай у рагожы –
Да няхай нясуць прыгожы.
Наш каравай у паперы –
Да няхай нясуць кавалеры.
Наш каравай у палаценцы –
Няхай нясуць маладзенцы.

Вядомы *два варыянты падзелу рытуальнага хлеба*. У адным выпадку каравай маладога дзеляць пасля вянчання ў хаце маладой, і наадварот, хлеб нявесты будзе падзелены паміж сваякамі жаніха. Але больш пашырана традыцыя радавы каравай дзяліць між прадстаўнікамі свайго роду: маладой — у яе дома, маладога — напрыканцы вяселля.

У беларускім традыцыйным вяселлі дзяльба каравая лічылася заключным этапам. Калі каравай дзялілі ў маладой, гэта быў знак заканчэння вясельнай дзеі ў яе доме і госці збіраліся ехаць да радзіны маладога; калі ж каравай пачыналі дзяліць у хаце маладога, гэта сведчыла аб заканчэнні ўсёй шматдзённай святочнай цырымоніі.

Дзяльба каравая – гэта яшчэ адна адметная рыса нашай нацыянальнай традыцыі. У чырвоным куце хаты пад абразамі, пад нябеснай дугой ці падковай, утворанай саматканым ручніком, станавіліся маладыя, побач з імі – самыя паважаныя госці: хросныя маці і бацька. А насупраць, праз стол па дыяганалі жыцця, якая звязвала чырвоны кут і белую печ, станавілася ўся радня маладой ці маладога, пачынаючы ад бацькі і маці, затым бабуля і дзед, потым родныя браты і сёстры, сяброўкі, суседзі і г.д. Кожны, абавязкова кожны ўдзельнік вяселля падыходзіў да жаніха і нявесты, надзяляў іх шчасцем-долею і адорваў тым, чым мог. Зразумела, што гэты абрад – далёкі адгалосак беларускай сябрыны, якая заўсёды імкнулася дапамагчы маладой сям'і хутчэй стаць на ногі.

Хор мясцовых жанчын-спявачак не прыпыняўся ні на хвілінку. Сваімі песнямі ён быццам тлумачыў тое, што адбывалася, падказваў радзіне, што трэба зрабіць у дадзеным выпадку:

Як з раю, з раю сонечна ўстае,
Так маладая Мар'юхна на пасаг сядае
І просіць бацаньку на ўспамаганне:
– Мой бацаньку-месячку, спамажы мне
Шчаслівым бытам,
Капою жытам,
Шчасцем, здароўем,
Доляю, пакоем.
– Няхай табе, доньку, Бог спамагае
І ўсе святыя, і людзі добрыя.

* * *

Не стой, радзіна, за плячыма,
Не моргай вачыма.
Ступі ты да хаты,
Ой, род мой харошы,
Не жалуй грошы.
Прыходзь да хаты
Маладых успамагаці.

Дапамагалі хто чым мог: хто рублём, хто талерам, хто наміткай; блізкая радня адорвала тым, што патрэбна было ў гаспадарцы:

Родзе, родзе багаты,
Да даруюць скаціну рагату.
Родныя братове – па карове,
Родныя сястрыцы – па цяліцы,
Родныя дзядзі – па авечцы,
Родныя цёткі – па намётцы,
А родны татка – каня і воз,
Каб малады часта ў госці вёз.

Калі ж раптам была якая затрымка, то жанчыны, вострыя на язык, маглі "секануць" і такой песняй:

Як гуляць – поўна хата,
Як дарыць – мама, тата,
Як гуляць – поўны сені,
Як дарыць – усе паселі.
Як гуляць – па застоллю,
Як дарыць – па заўголлю.

Аднак асноўным рэфрэнам песень заключнага этапа вяселля было апяванне (і адпаведнае надзяленне маладых) не столькі "хлеба-солі", колькі пажаданне "шчасця і долі":

Татулька мой родненькі,
Не надзяляй мяне ні хлебам, ні соллю,
Ні хлебам, ні соллю, ні золатам, ні
серабром,
Надзяляй мяне і доляй, і шчасцем,
І доляй, і шчасцем, і добрым здароўем.

Яшчэ адной асаблівасцю беларускага вяселля было адорванне маладой усёй радні маладога: каму сувой палатна, каму пояс, каму намітку. Таму дзяўчына яшчэ задоўга да вяселля распачынала падрыхтоўку да гэтага святочнага моманту. Усё трэба было наткаць-напрасці сваімі рукамі. А па прыгажосці падарункаў, па ступені іх мастацкага аздаблення госці ацэньвалі здольнасці і ўменні будучай гаспадыні. Таму як толькі

пачынаўся абрад дзяльбы каравая, жанчыны падхаплівалі жартоўную песню:

Паглянь, Надзечка,
Па новай хаце,
Ці многа трэба
Дароў аддаці?
Ой, што куточак –
Сядзіць браточак,
Ой, што паліца –
Сядзіць сястрыца.

У гэтым гаваркім і гаманкім эпізодзе вяселля як у люстэрку высвечваліся адносіны паміж раднёй, імпэт таго ці іншага госця, яго ўменне прыгожа і далікатна пажадаць маладым дабра і згоды, але адначасова заявіць і аб сваёй заможнасці, месцы ў гурце гасцей.

У цэнтры ўвагі ключавых каляндарна-абрадавых дзеяў заўсёды былі старэйшыя прадстаўнікі роду. У вясельным абрадзе мы маем справу з адзіным выключэннем, калі ўвесь род на чале са сваімі пачынальнікамі гуртам пачціва ўставаў перад толькі што Богам заручонай парай — сям'ёй, дзеля таго каб з рук старшага шафера (маршалка, старшага свата, хроснага бацькі) атрымаць не проста кавалачак абрадавага хлеба, а сваю *долю-жывіцу* і адначасова паспрыяць станаўленню дабрабыту маладых, а таксама выказаць ім свае ***вясельныя пажаданні.***

Вось ён свяшчэнны закон нашай этнічнай ментальнасці, ***асноўная рыса беларускай народнай культуры***, сэнс адвечнай традыцыі і характар абрадавых комплексаў — ***узаемадапамога, узаемападтрымка, згуртаванасць, талочнасць.*** Пацвярджэнне таму — сакральна-гімнічная песня, якой распачынаўся самы адказны этап вяселля:

Ой, дай, Божа, добры час,
Як у людзей, так і ў нас...
Няхай вас Бог благаславіць.
Шчасцем, доляю,
Векам доўгім,
Бытам добрым.
Дай жа, Божа, гэтай пары
Шчасце ў долю,
Хлеба ўволю,
Каб Бог жыта радзіў,
Скаціну зашчыціў,
Здароўем надзяліў!
Каб былі багаты, як зямля,
Здаровы, як вада,
Нахільны, як вярба,
Каб адзін аднаго шанавалі
І нас старых не забывалі.

Разам з гэтымі высокамастацкімі пажаданнямі, з'арыентаванымі, як бачна, перш за ўсё на сямейны дабрабыт і фізічнае здароўе, існавала цэлая сістэма няпісаных законаў, строга рэгламентуючых паводзіны прысутных, каб выключыць нават магчымасць нанесці шкоду маладым.

Звернем увагу на дзве надзвычай важныя акалічнасці вясельнага абраду. Па-першае, ні ў якім разе *не дазвалялася паціснуць* дзеля віншавання *рукі маладым голай рукой.* Справа ў тым, што на вяселлі маглі прысутнічаць людзі з адмоўнай біяэнергетыкай або тыя, хто наўмысна ці міжволі мог пашкодзіць жаніху і нявесце. Таму, каб выключыць магчымасць прамога ўздзеяння, і жаніх, і нявеста закрывалі рукі чысцюткай белай хусцінкай. Ад гасцей патрабавалася тое ж. Падвойны экран гарантаваў надзейнае перакрыццё выключнага канала ўздзеяння. А па-другое, аналагічную ролю выконвала і фата маладой або зімовая шапка жаніха, у якой ён (незалежна ад пары года) сядзеў на працягу ўсяго вяселля. Колькі не распытваў у людзей сярэдняга пакалення, якой павінна быць кампазіцыя фаты, так ніводнага разу не атрымаў дакладнага тлумачэння. Давайце яшчэ раз паразважаем сумесна.

*Сімвалам цнатлівасці*, дзявоцкасці ва ўсіх абрадах *з'яўляецца вянок*. Таму калі жанчына выходзіла замуж другі раз, то яна ўжо не мела права ўпрыгожвацца гэтым сакральным атрыбутам. Разам з вянком мацавалася *фата*, якая абавязкова *павінна* была *мець дзве часткі*: адна — даўжэйшая — перакрывала такі канал магічнага ўздзеяння, як валасы ("руса каса да пояса"), а другая — карацейшая — закрывала твар і, галоўнае, люстэрка душы — вочы, таксама адзін з самых моцных каналаў нанясення шкоды.

На жаль, у апошнія гады стаўленне да аднаго з найпрыгажэйшых і найцікавейшых момантаў вяселля — дзяльбы каравая ператвараецца ў фармальны акт. Блізкая і далёкая радня падыходзіць да стала не столькі дзеля таго, каб павіншаваць маладых і нешта пакінуць на добры ўспамін, а хутчэй каб прадэманстраваць сваё сацыяльна-фінансавае становішча.

Асабліва выразна гэта праяўляецца на тых вясellях, дзе абрад адорвання — але не дзяльбы каравая (бо яго часам ўвогуле не бывае) ладзіцца на самым пачатку святочнай дзеі. У сталоўцы ці ў рэстаране гасцей пастаўяць жывым калідорам і бойкі хлопец з музычнага ансамбля будзе прымусова выклікаць прысутных (пры гэтым не ведаючы нікога). Здзек ды й годзе!

А вы толькі ўслухайцеся ў тыя словы, якія "выціскаюць" з сябе "на цвярозую галаву і на пусты страўнік" тыя госці. Вы

пачуеце “дзяжурныя” фразы, у якіх не будзе свайго ўласнага пачуцця, сваёй красамоўнасці, сваёй душы і сэрца. А таму хочацца прывесці шэраг прыкладаў тых вясельных пажаданняў, якімі ў свой час віншавалі нашы дзяды і бабулі. Яны гарманічна дапаўняюць змест велічна-заклінальнай песні. Думаецца, мы пакуль не асэнсавалі сапраўдную глыбіню зместу гэтага лапідарна-афарыстычнага фальклорнага жанру. Вось дзе бяздонне і бязмежжа гарызонтаў нашай этнапедагогікі, вось дзе жыццёвая мудрасць вякоў і тысячагоддзяў, вось па чым трэба пісаць кодэкс чалавечага суіснавання, вось на якіх каштоўнасцях павінны трымацца законы грамадства і дзяржаўнага развіцця.

Тэксты пажаданняў яскрава сведчаць: *народная паэтычная стыхія чуйна рэагуе на сучасныя рэаліі жыцця, але не паддаецца спакуслівым разбуральным тэндэнцыям*, а, наадварот, *шукае надзейнае выйсце* з дапамогай папярэдняга гістарычна-культурнага вопыту.

## ПАЖАДАННІ

Надзяляем хлебам, соллю
І добрай доляй,
Золатам, серабром
І ўсялякім дабром!

* * *

Дарую вам мех зрэбны
Да рубель срэбны
На век доўгі,
На быт добры,
На новую гаспадарку .

* * *

Дару табе грошы,
Каб былі дзеці харошы,
Дару срэбра бочку,
Каб былі сыны і дочкі.
Дару цябе дугой,
Каб не бегаў за другой,
Каб былі багатыя, як восень ,
Вясёлыя, як вясна,
А семяністыя, як вярба,
Дзе ні садзіш, расце.

* * *

Дарую каробачку гліны,
Каб да году пазвалі на радзіны.

* * *

Я дару нітак клубочак,
Каб быў першы сыночак.

* * *

Жадаю, каб у вас было столькі дачушак,
Колькі ў хаце падушак,
Столькі сынкоў, колькі ў сценах сучкоў.

* * *

Грошыкі дорыць маці,
Каб была добрая гаспадыня ў хаце.

* * *

Каб ваш ложак рыпаў, рыпаў,
А да году сынок выпаў.

* * *

Дару шклянку суніц,
Каб не хадзіў да чужых маладзіц.

* * *

Дарую падарунак
На чатары канты,
Каб было чатыры сыны,
І ўсе — музыканты.

* * *

Дарую буракамі, каб не былі дзеці дуракамі.

* * *

Дару вас "белачкамі",
Каб былі з дзевачкамі,
Дару "зайчыкамі",
Каб былі вы з мальчыкамі.

* * *

Дару вам "лася"*,
Каб маладая маладому аддалася.

***

Дару вам "бабра"*,
Каб маладая была, як гара.

***

Дарую вам 50 рублёў,
Картошкі падполле,
Каб завялі дзетак застолле.

***

Дару медзі,
Каб дзеці былі, як мядзведзі.

***

Дарую пяцёрку,
Каб нарадзіла дачку танцорку.

***

Дару вам рубель,
А я на яго працаваў,
Хачу, каб малады
Маладую пацалаваў.

***

Дару вам рубель,
А я на яго працаваў,
Хачу, каб зяць
Цешчу пацалаваў.

***

Дару вам рубель,
Каб купілі карабель,
Каб дзень цалаваліся,
А ноч кахаліся.

* * *

Дарую гаршчок капусты,
Каб не даваў жонцы распусты.

* * *

Так будзьце ж здаровы
І жывіце багата,
Як вам пакажа ваша зарплата.
Калі ж будзе муж не разіня,
Палучыш медаль "Маць-гераіня".

Народзяцца дзеткі, дочкі з сынкамі,
А пракарміць як іх —
Глядзіце ўжо самі.

***

Хай Бог надзеліць
Шчасцем і долею,
Хлебам з соллю,
Доўгім векам
З добрым чалавекам.

***

Дарую я сваім маладым, не сваім да Божым, чырвонага золата, цёлку, аўцу і свінню. Да на ета пушчай не спагадаюць, а рана ўстаюць, атца і маць паважаюць, то і Бог паможа!

***

Жадаю пары маладой
Дажыць да свадзьбы залатой,
Жыць і харашо дружыць,
Па другіх не хадзіць.

***

Дарую маладой каробку жукоў,
Каб не любіла чужых мужыкоў.

***

Жадаю маладым шчасця і долі,
І век доўгі, і розум добры.

***

Дару цябе дугою,
Каб не бегаў за другою.

***

Я дарую грошы,
Бо маладая і малады харошы.

***

Я дарую вам хату,
Каб былі багаты,
Каб жылі-пажывалі
І нас не забывалі.

***

Дарую кароўку шчэ й бычка,
Каб першы быў сынок, другая – дачка.

***

Паздраўляю пару маладых з законным бракам на сто лет і жалаю добрага здароўя, шчасця, каб вы багата жылі, многа кароў мелі, сыр і масла елі. На полі радзіла, у хляве пладзіла. Што куток, то і сынок. А як Бог дасць на другім гадочку, каб Бог даў і дочку.

***

Каб ноччу не спалі, не ленаваліся
І дзеткі штогод паяўляліся.

***

Колькі ў Колінай хаце куточкаў,
Каб столькі было сыночкаў,
Колькі ў Насці падушак,
Каб столькі было дачушак.

***

З вяселейкам вас паздраўляю,
Шчаслівай жызні вам жадаю.
Каб адзін аднаго шанавалі,
І бацькоў старых не забывалі.

***

Дарую грошы, каб былі дзеці харошы,
Дарую грошы, за якія я працавала,
Хачу, каб маладая маладога пацалавала.

***

Дарую мех пшаніцы,
Каб не чапаў чужых баб за спадніцы.

***

Дарую меднымі,
Каб не былі беднымі.

***

Дару жаніха ніткамі,
Каб не бегаў за чужымі лыткамі.

***

Дару спіцамі,
Каб жаніх не бегаў за чужымі спадніцамі.

***

Дарую гектар грэчкі,
Каб вяліся авечкі.

***

Дарую лес, а ў лесе дубкі,
Колькі ў лесе дубкоў,
Каб столькі было ў вас сынкоў.

***

Жывіце здаровы,
Адзін аднаго любіце, паважайце
І нас не забывайце.

***

Каб жылі багата, як восень,
Каб былі красны, як вясна,
А душы, як вада,
Каб разам усё жыццё ішлі,
Шчасце-долю сабе знайшлі.

***

Дарую маладым каробку медзякоў,
Каб ня слухалі чужых языкоў.

***

Дару цыбуляю,
Каб праз год пазваў бабуляю.

***

Дарую маладым сенакос,
Штоб вы касілі, ды касілі,
Ды і за куму запрасілі.

***

Дарую табе загон пшаніцы,
Каб жала не сажала,
Каб цераз год мяне за куму ўзяла.

***

Дару маладым сувой палатна,
Каб да году каляску валакла.

***

Дарую шчасце і долю,
І век доўгі,
І каробачку спічак,
Каб не хадзіў да чужых маладзічак.

***

Жадаю, каб у вас было столькі сыноў,
Колькі куткоў,
І столькі дачушак,
Колькі падушак.

***

Няхай у вас будзе столькі сыноў,
Колькі ў сцяне сучкоў.

***

Дарую цялушку,
Каб не бегаў шукаць другую падружку.

***

Дарую бычка,
Каб не шукала другога мужычка.

***

Дарую курачку-квактуху,
Штоб маладая пацалавала свякруху.

***

Дарую мяшок жыта,
Каб жонка не была біта.

***

Дарую маладым пчолы, каб кусалі
І ўначы спаць не давалі.

***

Дарую маладому зялёную рошчу,
Каб любіў сваю цёшчу.

***

Дарую дубовы пень,
Каб любіліся ноч і дзень.
Дарую дзежачку круп,
А ў дзежачкі чатыры ражочкі,
Штоб было чатыры сыночкі.
Дарую мяч,
Каб быў сын урач.
Дарую каробку клубніц,
Каб не любіў чужых дурніц.

***

Шчасця, долі,
Хлеба-солі,
Крынічнай вады,
І ніякай бяды.

# "Я НЕ АДНА, СА МНОЙ ДРУГІ"

## ЦЯЖАРНАЯ ЖАНЧЫНА Ў КУЛЬТУРЫ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Сярод шматлікіх таямніц Сусвету адной з самых загадкавых з'яўляецца тайна ўзнікнення Жыцця, а таксама здольнасць жывой матэрыі бясконца аднаўляць сябе ў сабе падобных постацях нашчадкаў і спадкаемцаў. Жыццё – амбівалентнае тварэнне: яно абмежавана ў часе на прыкладзе існавання кожнай канкрэтнай асобы і бесперапыннае, бясконцае пераемнае ў жыватворнай повязі Роду.

Самыя геніяльныя мысліцелі чалавецтва імкнуліся разгадаць тайну ўзнікнення Жыцця як найбольш незвычайнага феномену Сонечнай Галактыкі. Прычым у гэтай праблеме зноўтакі вымалёўваюцца дзве плоскасці. Адна з іх – фенаменалогія жыцця як з'явы, другая — жыццё кожнай істоты паасобку. Хто ўдыхнуў у яго энергію першапачатковага руху, надае дынаміку росту і развіцця, сталення і старэння; хто вызначае працяглась жыцця, жыццёвыя пуцявіны і павароты; хто прызначае дзень нашага зямнога спачыну і пераходу ў пространавачасавыя каардынаты Вечнасці?

Кожная зямная цывілізацыя ставіла і будзе ставіць перад сабой гэтыя пытанні. Складанасць праблемы прадвызначала, магчыма, не столькі рэцэптурны характар адказаў на іх, колькі прыхаваную за слоўнай шматзначнасцю накіраванасць шляхоў пошуку гэтых адказаў нашымі продкамі. Яны зафіксаваны (закадзіраваны, зашыфраваны) у нашай род-

най мове, у яе асобных словах і ўстойлівых слоўных спалучэннях:

1. Жыццё – Жыва – Жывіцца, жыта, жанчына, жонка, сям'я, гаспадыня – Рожаніца – Доля.

2. Чалавек – Род – Народ – Муж – Жаніх – Лёс – Рок.

У старажытнай славянскай міфалогіі лічылася, што жыццё даруе (надзяляе ім) багіня *Жыва*. З часоў пашырэння хрысціянскай культурнай традыцыі жыватворны патэнцыял быў пераадрасаваны да Творцы Сусвету. Кароткі, безапеляцыйны па сваёй сутнасці вердыкт канстатуе народная прыказка: "Бог даў – Бог узяў". Прычым катэгарычнасць апазіцыі не пакідае месца выпадковасці, бо, як сведчыць іншая прыказка: "Не адну пару лапцей Бог стаптаў, пакуль гэтых маладых сабраў".

Як бачым, узгаданыя фразеалагізмы практычна не набліжаюць нас да разумення таямніцы Жыцця, таму неабходна ўвесь спектр пытанняў "звязаць у адзіны вузел", каб хоць крыху прыадкрыць тайну сувязі паміж Творцам Сусвету і жыццём асобнага чалавека:

Бог дараваў чалавеку Жыццё,
вызначыў яму Век,
надзяліў Доляй,
наканаваў Лёс,
абраў Суджаную(ага),
адарыў Сям'ёй,
ашчасліў Дзецьмі,
прызначыў Імя,
прысудзіў быць у акружэнні Роду.

Аднак як толькі чалавек пройдзе ўсе ступені свайго зямнога існавання, як толькі ён абрасце карэннем-парасткамі свайго Роду, Бог пашле за ім Смерць, якая абавязкова выканае яго прысуд ( "Круці не круці, а трэба ўмярці", "Ляжы не ляжы, уставаць трэба, жыві не жыві, паміраць трэба").

Толькі праз разуменне гэтай жыццядайнай повязі, яе самакаштоўнасці і самадастатковасці можна *паспрабаваць* зазірнуць у сакральныя сэнсы нашай рытуальна-абрадавай практыкі і вуснай паэзіі і хоць крыху зразумець тыя шматлікія табу, рэгламентацыі, перасцярогі, прадпісанні, пажаданні, этыкетныя нарматывы, якія скіраваны былі на тое, каб заручылася шчаслівая пара, каб нявестка хутка зацяжарыла і нарадзіла прыгожае, здаровае і чаканае дзіця.

І яшчэ адна важная акалічнасць: хутчэй за ўсё ў беларусаў існавала вера ў рэінкарнацыю, у тое, што жыватворны згустак энергіі, які ў хрысціянскай традыцыі атрымаў назву Душа, пасля смерці чалавека на пэўны час пераносіўся ў вы-*Рай*, а

затым (магчыма, па запатрабаванню су-*родз*-ічаў) вяртаўся назад. Што маецца на ўвазе? Нашы продкі верылі, што шматлікія перасцярогі абавязкова паўплываюць на будучы лёс нованароджанага.

Вялікае мноства самых розных рэгламентацый і прадпісанняў адрасавана жанчыне на ўвесь перыяд цяжарнасці. Кожны яе крок, кожны рух, кожны ўчынак у дзень будзённы і ў дзень святочны быў дакладна вызначаны.

Немагчыма раўнадушна чытаць статыстычныя даныя, якія па-свойму адлюстроўваюць найбольш тыповыя сацыяльныя працэсы ў развіцці нашага грамадства на працягу апошніх год. Толькі за 1996 год насельніцтва Беларусі ў цэлым пастарэла і зменшылася на 30,3 тыс. чалавек. (Зараз нараджальнасць у нашай рэспубліцы меншая чым у гады Вялікай Айчыннай вайны.) Па ўсёй Беларусі было зарэгістравана 10 535 шлюбаў, а скасавана 8 196. Для нацыі, якая спрабуе самастойна стаць на ногі і верыць у сваю будучыню, а таксама для яе кіруючых дзяржаўна-прававых структур такія лічбы не могуць не гучаць набатам. Аднак і яны не з'яўляюцца абсалютнымі велічынямі. З аднаго боку, неабходна ўлічваць такі суцяшальны фактар, як стварэнне нашымі грамадзянамі другой або нават трэцяй сям'і. А з другога боку, вялікая колькасць сем'яў юрыдычна яшчэ лічыцца цэласнай сацыяльнай адзінкай, а фактычна гэта даўно ўжо не так.

Калі раней традыцыйная схема сям'і налічвала як мінімум сем чалавек (бабуля—дзядуля, бацька—маці і трое дзетак), то сёння — гэта пераважна чатыры чалавекі (бацькі і двое дзетак). З улікам той складанай эканамічнай сітуацыі, якая вызначае і ў бліжэйшы час будзе вызначаць наша жыццё, хутчэй за ўсё бацькі будуць абмяжоўвацца толькі адным дзіцем. Асобная гаворка пра здароўе нашых дзяцей, на якое ўплываюць шматлікія эканамічныя, сацыяльныя, экалагічныя і культурныя фактары. Жахліва ўсведамляць тое, што ўжо на момант нараджэння пераважная большасць дзяцей мае фізічныя, псіхічныя і разумовыя паталогіі. З кожным годам павялічваецца і колькасць жанчын, якія з нагоды розных хвароб не могуць стаць матуляй.

Хачу адразу ж зрабіць агаворку для тых, каму падалося: "Ну, вось, з'явіўся яшчэ адзін прарок ці калдун, які адным махам вырашыць усе праблемы: і сацыяльныя, і фізічныя, і духоўныя". Ніколі нават і думкі такой не было. Ні ў якім разе не імкнуся спрасціць складанасць праблемы. Але ўжо даўным-даўно пераканаўся — тысячагадовы вопыт нашых продкаў нельга выкрасць з памяці ў адзін дзень.

Улічваючы ўсю складанасць сучаснай сітуацыі, мне заха-

целася звярнуцца да велізарнага вопыту народнай культуры і паспрабаваць хаця б крыху зазірнуць у таямніцы стаўлення нашых продкаў да ключавой фігуры сямейна-радавых традыцый — да цяжарнай жанчыны. Хочацца спадзявацца, што тыя ці іншыя *парады, абмежаванні, забароны* або *рэгламентацыі*, якімі жылі і якіх прытрымліваліся нашы бабулі, могуць быць карыснымі для дзяўчат-сучасніц, якія збіраюцца стварыць сям'ю і марыць нарадзіць прыгожае і здаровае дзіця.

Стаўленне нашых продкаў да цяжарнай жанчыны было адначасова і сакральна-засцерагальным і абачліва-папераджальным. З аднаго боку, яна ўзводзілася ў статус Мадоны, якая не толькі давала жыццё новаму чалавеку — свайму дзіцяці, але нават магла паспрыяць лячэнню бясплоднасці ў тых, хто даўно марыў нарадзіць ды па розных прычынах не меў такога шчасця. З другога боку, на працягу ўсяго перыяду цяжарнасці жанчына знаходзілася як бы ў стане пэўнай сацыяльнай ізаляцыі. Яе паводзіны ў асяроддзі блізкіх і знаёмых строга рэгламентаваліся.

Нарматыўныя рамкі яе паводзін нябачна, нягучна і недакучліва, але тым не менш даволі жорстка і безапеляцыйна ўтваралі своеасаблівы прававы калідор або жыццёва-нарміруючую плынь, фарватэр якой часцей за ўсё прытрымліваўся залатой сярэдзіны, каб, крый Божа, не наскочыць на абмялелую затоку (не пераступай цераз крывое — дзіця гарбатым будзе) або, наадварот, каб часам не зацягнула ў глыбачэзны вір (не садзіся на камень — дзіця "скамянее"). Гэта тонкая мяжа (поле найбольш аптымальнага і спрыяльнага існавання) патрабавала ўзаемнай далікатнасці: як з боку дамачадцаў, так і з боку самой цяжарнай. Застаючыся нароўні з усімі, яна ўдзельнічала амаль што ва ўсіх жыццёва-побытавых справах, але як толькі набліжалася святочная, рытуальна-абрадавая сітуацыя, яе паводзіны рэзка абмяжоўваліся і строга рэгламентаваліся шэрагам прадпісанняў, якія цвёрда трымаліся ў памяці старэйшага пакалення і непахісна выконваліся членамі радавога або абшчыннага соцыуму. Абмежаванні былі звязаны з яе "двухжыццёвасцю": надаючы жыццё новаму чалавеку, яна быццам *была звязана* з іншым светам, *з вы-Раем людскіх душ, таму*, былі ўпэўнены нашы продкі, нейкі час *валодала незвычайнымі здольнасцямі*. Разуменне яе сацыяльнай, фізічнай і статусна-культурнай выключнасці *вымагала ад яе суродзічаў і ад тых, з кім яна кантактавала*, асабліва *стрыманых і паважлівых адносін.*

## СТАЎЛЕННЕ ДА ЦЯЖАРНАЙ ЖАНЧЫНЫ З БОКУ СУРОДЗІЧАЎ

На працягу ўсяго перыяду цяжарнасці жанчына займалася асноўнымі гаспадарчымі справамі, штодзённа кантактавала са сваімі роднымі і блізкімі. Аднак уся радзіна брала на сябе адказнасць за нараджэнне здаровага (фізічна, псіхічна і разумова) прадаўжальніка сваёй справы. Таму на асобныя дзеянні родных (асабліва ў час святкаванняў) накладваліся розныя абмежаванні. Класічным, асноватворчым прынцыпам мадэлявання ўзаемаадносін быў адзін з самых пашыраных прынцыпаў усёй народнай культуры: "падобнае спрыяе ўтварэнню падобнага або правакуе яго". Гэты рэгламентуючы прынцып ахопліваў *чатыры накірункі* жыццёвага клопату членаў сям'і і ўсіх тых, з кім даводзілася сутыкацца цяжарнай:

1) перасцярога яе самой;
2) жаданне станоўча паўплываць на фарміраванне плода і будучае жыццё дзіцяці;
3) розныя дзеянні, скіраваныя на лёгкія роды;
4) захаванне дзетароднай здольнасці на будучыню.

Практычна ва ўсіх славянскіх народаў існавала і да сённяшняга дня захавалася этыкетнае *прадпісанне – ні ў якім разе і ні ў чым не адмаўляць цяжарнай* (асабліва, калі просьба тычыцца якой-небудзь ежы), бо, маўляў, мышы пагрызуць усё ў хаце. Калі цяжарная аказвалася сярод гасцей за святочным сталом, то імкнуліся ўпрасіць яе хоць крышачку пакаштаваць усе прыгатаваныя стравы, таму што, былі перакана्ы, народжанае дзіця, стаўшы нават дарослым чалавекам, будзе пазбягаць ужывання той стравы, якой яна не паспытала[1]. Ні ў якім разе нельга было напужаць яе, каб у дзіцяці не з'явіліся карычневыя ("радзімыя") плямы. Цікава, што нават дарослыя, свавольныя мужчыны стрымлівалі свае эмоцыі ў прысутнасці цяжарнай і не распускалі языкі.

На Віцебшчыне існаваў звычай: у калядна-навагоднюю поўнач гаспадар ішоў у сад і трос або хлебнай лапатай стукаў па ўсіх пладовых дрэвах, каб быў добры ўраджай яблык, груш, сліў. Калі ж у хаце была парадзіха, гэта не рабілася, каб дзіця не захварэла на трасучку, або эпілепсію[2].

Усім дамачадцам катэгарычна забаранялася шыць, вязаць, прасці, сукаць ніткі ў "міжыкалядзь" (у час паміж першай і трэцяй куццёй), каб не ўскладніць роды.

## БЯЗДЗЕТНАСЦЬ ЯК САЦЫЯЛЬНАЯ ПРАБЛЕМА

З даўніх часоў славяне верылі, што цяжарная жанчына прыродай надорана шаманска-магічнымі прадуцыруючымі здольнасцямі. Скажам, у славакаў яе прасілі дзевяць раз абысці вакол садовага дрэва, каб яно пачало плоданасіць. Сербы лічылі, што пладаноснасць яблыні можа надаць тая цяжарная, якая ноччу распранутай абяжыць вакол яе. Паспрыяць ураджайнасці дрэва цяжарная магла пры ўмове, што менавіта яна сарве першы плод. Беларусы верылі, што купленая карова будзе багатай на малако і дасць здаровы прыплод, калі ў двары першай яе сустрэне цяжарная[3].

Да нашага часу не страціла сваёй актуальнасці вера ў тое, што розныя рытуальна-абрадавыя маніпуляцыі з удзелам жанчыны, якая чакае дзіця, могуць паспрыяць лячэнню бясплоднасці. Напрыклад, каб зацяжарыць, бясплодная жанчына прасіла цяжарную перадаць праз плот з рота ў рот кавалачак хлеба або павінна была пайсці на могілкі і зубамі вырваць траву з магілы, у якой пахавана цяжарная. На поўначы Беларусі шчыра перакананы, што цяжарнай трэба першай увайсці ў новую хату, тады яе бяздзетным гаспадарам пашчасціць нарадзіць[4].

Дарэчы, на агульным фоне мнагадзетных патрыярхальных сем'яў, з якіх складалася радавая або вясковая абшчына, бяздзетнасць лічылася вялікім няшчасцем. Нашы продкі былі ўпэўнены, што на бясплоднасць хварэлі выключна жанчыны; яна ўспрымалася або як пакаранне за цяжкі грэх, або як вынік вядзьмарскіх падробак і праклёнаў. *Бясплодным жанчынам забаранялася* ўдзельнічаць у агульнарадавых святкаваннях, *быць кумой, павітухай, хроснай маці*[5].

У аснове гэтай сацыякультурнай абмежаванасці ляжыць усё той жа прынцып падабенства. Бяздзетную не звалі прымаць роды, бо былі перакананы, што парадзіха больш не народзіць дзіця; не бралі ў якасці хроснай, таму што баяліся, каб яе хвароба не перадалася хрэсніку, і г.д. Пералічаныя абмежаванні ў культурным жыцці роду і вёскі з цягам часу фарміравалі ў хворай жанчыны стэрэатып непаўнацэннасці і тым самым моцна ўплывалі на яе паводзіны і паўсядзённыя зносіны з аднавяскоўцамі. Зразумела, што народная медыцына не магла пакінуць па-за ўвагай гэта захворванне. З цягам часу ў ёй сфарміраваўся самастойны раздзел ведаў, скіраваны на рознабаковае лячэнне цяжкай хваробы. Прывядзем некаторыя парады, якія давалі бясплоднай жанчыне:

сесці на тое месца, дзе толькі што адбыліся роды;
першай патрымаць на руках нованароджанага;
з'есці тры почкі з садовага дрэва, якое ўпершыню дало плады;
з'есці некалькі крупінак солі, насыпанай на посцілку, на якой толькі што ляжала парадзіха;
з'есці некалькі сліў або арэхаў-спарышоў;
нейкі час папіць адвар кары двух зросшыхся дрэў;
панасіць адзенне мнагадзетнай жанчыны;
легчы замест парадзіхі побач з толькі што народжаным дзіцем[6].

Праўда, у некаторых мясцінах лічылі, што *такі рытуал мог перадаць здольнасць нарадзіць бясплоднай, але пазбавіць гэтай здольнасці парадзіху*. Таму ў якасці рытуальнага кантакцёра выбіралі жанчыну, якая ўжо мела шмат дзяцей і не збіралася нарадзіць яшчэ.

У этнаграфічнай літаратуры зафіксаваны і шматлікія іншыя "сродкі" папярэджвання бяздзетнасці і яе лячэння. Так, на Віцебшчыне *вясельны каравай адразу ж пасля прыгатавання і да моманту яго падзелу напрыканцы вяселля надзейна замыкалі ў каморы*, бо верылі, *калі нехта* (зразумела, што на вяселле прыходзілі людзі з рознымі намерамі, у тым ліку і благімі) *украдзе хаця б невялічкі кавалачак з верхняй часткі* (г.зн. украдзе Долю маладых), то *сям'я застанецца бяздзетнай*[7]. І наадварот, каб сям'я была мнагадзетнай, маладую садзілі на вечка дзяжы, у якой рашчынялі цеста для хлеба, а да маладога злёгку датыкаліся хлебнай лапатай[8]. *Магічным сімвалам, які мог аднаўляць дзетародную функцыю, лічыўся пояс, які на сабе насіла цяжарная*. Гэтую ж ролю выконвалі і некаторыя атрыбуты пахавальнай абраднасці: ніткі з посцілкі, на якой ляжаў нябожчык, пясок з магілы, перавясла, якім перавязвалі рукі і ногі памёршаму. Цікавы звычай пазбаўлення ад бясплоднасці зафіксаваны ў Чэрвеньскім раёне. Перад тым як сустракаць вясельны поезд, бабуля маладога з аднаго боку вуліцы клала адамкнёны замок, а з другога — ключ. Як толькі маладыя праедуць, замок замыкалі і аддавалі бацькам. Калі ж у заручонай пары доўга не было дзяцей, замок адмыкалі.[9]

Існаваў *шэраг прадпісанняў* і *для тых бацькоў, у якіх памерла першае дзіця*. Каб пазбегнуць паўтарэння няшчасця:

**нованароджанаму не давалі тое ж імя;**
**выбіралі іншых хросных, запрашалі іншую бабку-павітуху.**

Калі ж памірала і другое дзіця, тады рабіўся іншы ход: *дзіцяці давалі імя бацькі*. Тым самым магчымыя цяж-

касці (і нават смерць) як бы пераадрасоўваліся старэйшым.[10]

У той жа час калі памірала цяжарная жанчына, то жывыя прадпрымалі цэлы шэраг ахоўных дзеянняў. На Палессі ў труну разам з ёю клалі пялёнкі, каб яна "не прыходзіла" ў сне і не прасіла іх "для свайго дзіцяці". Часам яе хавалі на ўскрайку могілак і дадаткова абгароджвалі магілу. Украінцы лічылі, што душа цяжарнай абавязкова трапляла ў рай, у той жа час сербы былі перакананы, што яна ператвараецца ў ваўкалака, які доўга будзе шкодзіць суродзічам.[11]

## АХОЎНЫЯ СРОДКІ ДЛЯ ЦЯЖАРНАЙ ЖАНЧЫНЫ

Увесь разнастайны вопыт народнай медыцыны і ўсе магчымыя паўсядзённыя ахоўна-засцерагальныя сродкі выкарыстоўваліся цяжарнай і яе раднёй для таго, каб паспрыяць нармальнаму развіццю плода і захаваць фізічную моц самой жанчыны. Гэтыя прафілактычныя меры прымаліся ўжо з моманту святкавання вяселля. Народныя лекары з розных мясцін Беларусі не адзін раз звярталі маю ўвагу на адзенне сучасных нявест-модніц, для якіх рытуальнае ўбранне перастала выконваць уласна абрадавую, строга рэгламентаваную ролю, а ператварылася ў фармальны знак, у якім асноўнае значэнне надаецца толькі эстэтычным асаблівасцям.

Сучаснае ўбранне нявесты стала нагадваць аддзенне прадстаўніц прыгожага полу на самых неверагодных конкурсах або бясконцых прэзентацыях і тэлевізійных шоу. Празмерная адкрытасць цела робіць яго абсалютна безабаронным перад вачамі шматлікіх гасцей, сярод якіх могуць быць так званыя біяэнергетычныя вампіры, людзі з чорнымі вачамі і цяжкім позіркам. У старой народнай традыцыі фата нявесты надзейна прыкрывала твар, вочы, валасы і плечы — стварала як бы дадатковы экран для найбольш жыццёва важных частак цела.

Больш таго, *каб пазбегнуць* сямейных *непаразуменняў*, скасавання шлюбаў, бяздзетнасці, сурокаў, мудрыя бабулі настойліва раілі і *раяць не здаваць сваё вясельнае ўбранне ў камісійны магазін, а захоўваць яго на працягу ўсяго жыцця.* Не пажадана браць убранне "на пракат", нельга карыстацца чужымі пярсцёнкамі, не дазваляецца станавіцца на голую зямлю, калі маладыя пасля вянчання прыязджаюць дадому і выходзяць з машыны. Існуе забарона нават зімой чым-небудзь накрываць плечы маладой паверх фаты.[12]

У славянскай народнай культуры вядомы шматлікія абярэгі, якімі павінна была карыстацца жанчына на працягу ўсяго перыяду цяжарнасці. Амаль паўсюдна ролю надзейных

ахоўнікаў маглі выконваць чырвоныя шарсцяныя ніткі, паскі, шнуркі, якія павязвалі вакол пальца, рукі, шыі, паясніцы або проста насілі пры сабе. Абярэгамі маглі быць іголкі, шпількі, нажы, завушніцы, пацеркі, шчэпкі ад разбітага Перуном дрэва, вугальчыкі, галінкі асвечанай вярбы, святаянскія (купальскія) зёлкі, кавалачак цагліны з печы, засушаны кавалачак вясельнага каравая, велікодная соль, галінка рабіны, кавалак чырвонай ніткі, на якой было завязана дзевяць вузлоў старэйшай жанчынай сям'і праз ногі цяжарнай.[13]

У праваслаўных славян існавалі звычаі, якія перасцерагалі вёску ад эпідэміі, спрыялі, напрыклад, выкліканню дажджу: рабіліся спецыяльныя ручнікі-аднадзёнкі, якімі затым апяразвалі храмы або ўсю вёску. Вось гэтым палатном таксама перавязваліся цяжарныя жанчыны. Ведалі нашы продкі і пэўныя рытуальныя дзеянні, якія выконвалі тую ж ахоўную ролю. Напрыклад, калі па вёсцы ішла пахавальная працэсія, то цяжарная расшпільвала ўсё адзенне і развязвала ўсе вузлы. Калі яна сустракала незнаёмага чалавека або аднавяскоўца, за якім вялася нядобрая слава, то засоўвала вялікі палец правай рукі за пояс і ціхенька шаптала: "Я не адна, са мной другі".

Надзейнымі ахоўнікамі цяжарных жанчын лічацца Багародзіца, святыя Ганна і Варвара, але асаблівай пашанай карыстаецца Параскева Пятніца.

## АБРАДАВА-ЭТЫКЕТНАЯ РЭГЛАМЕНТАЦЫЯ ПАВОДЗІН ЦЯЖАРНАЙ ЖАНЧЫНЫ

На працягу ўсяго перыяду цяжарнасці жанчына жыла быццам у дзвюх сістэмах вымярэння. З аднаго боку, яна займалася пераважнай большасцю звыклых паўсядзённых спраў, а з другога — кожны яе крок у межах хаты, падворка, вёскі, лесу ці поля рэгламентаваўся безліччу правіл этыкету і рытуальных забарон. Добра знаёмы з самага дзяцінства космас сялянскай сядзібы раптам набываў больш выразную рэльефнасць, нечакана дзяліўся на спрыяльныя і неспрыяльныя зоны. Гадавы колазварот драбіўся на пэўныя адрэзкі часу, якія зноўтакі вымагалі асаблівых паводзін. Нават адвечныя прыроднакасмічныя з'явы або свяцілы атрымлівалі рэзка акцэнтаваны статус сакральных і патрабавалі зусім іншага стаўлення да сябе. Напрыклад, цяжарнай нельга было спаць у тым месцы, куды трапляла святло месяца; катэгарычна забаранялася глядзець на сонца, каб "дзеці не сляпіліся або не скаліліся". Ні ў якім разе нельга было ступаць на віхор — у дзіцяці маглі быць крывыя ногі, а таксама глядзець на пажар. Не аднойчы

даводзілася чуць пра такія здарэнні. Адна з жанчын у перыяд цяжарнасці выпадкова аказалася сведкай пажару, спужалася і ад нечаканасці схапілася рукамі за галаву. У яе нарадзілася дзяўчынка, стала дарослым чалавекам, але да гэтага часу на тым месцы галавы, за якое калісьці ўхапілася маці, у яе растуць светла-жаўтаватыя валасы, хаця ўсе астатнія чорныя.[14]

Цяжарнай *не дазвалялася* садзіцца або станавіцца на парог. У такім выпадку, пераконвалі мяне старыя людзі, нараджэнне дзіцяці магло адбыцца толькі шляхам кесарава сячэння. Наогул прасторавых абмежаванняў было задужа шмат: забаранялася хадзіць па ўзмежку, станавіцца на тое месца, дзе seклі дровы, хадзіць на скрыжаванне дарог, каб спаліць прадметы, пры дапамозе якіх хацелі сурочыць. Нельга было цалаваць нябожчыка, пераходзіць дарогу пахавальнай працэсіі, хадзіць на могілкі. Не пажаданым лічылася хадзіць на гумно, млын, падыходзіць да новабудоўлі, ступаць на тое месца, дзе стаяла вядро з вадой, калі мылі падлогу (дзіця можа быць пляшывае, хварэць на лішай)[15].

Практычна *ўсе* пералічаныя вышэй *абмежаванні* і *забароны аб'яднаны адным* і тым жа *прынцыпам*: адбываецца фарміраванне новага чалавека і пакуль новае жыццё не заявіць аб сабе ў час нараджэння, жанчыне катэгарычна *забаранялася* "*кантактаваць*" *з* усімі *рэаліямі* зямнога існавання, *якія мелі пераходны статус*. Парог — сімвалічная мяжа паміж жывымі і продкамі; узмежак — пераходная зона паміж сваім і чужым; скрыжаванне дарог — рытуальная зона паміж "тым" (зноў-такі чужым) і гэтым светам; новабудоўля — стан незакончанасці; млын і гумно ў міфалогіі славян былі функцыянальна-статусна збліжаны з балотам — зонай існавання(гуртавання) усіх "цёмных" сіл (узгадайце, як па-рознаму ставіліся аднавяскоўцы і ў казках, і ў жыцці да мельніка, які сябраваў з чортам, і да каваля, які заўсёды быў у кантакце з жыватворным агнём).

Каб пазбегнуць фізічных паталогій у дзіцяці, *катэгарычна забаранялася* пераступаць праз крывую жэрдку ці аглоблю, вілы, граблі, сухі венік, паваленае бурай дрэва, праходзіць пад аркай, утворанай двума нахіленымі слупамі (плод перастане развівацца), пераступаць праз сякеру (каб не выклікаць датэрміновыя роды), скакаць праз канаву, лезці праз акно (дзіця магло нарадзіцца нежывым: праз акно даўней выносілі труну з нябожчыкам або ўносілі жанчыну-ўдаву, якая другі або трэці раз выходзіла замуж), хадзіць пад вяроўкамі і пераступаць праз іх (дзіця тройчы будзе абкручана пупавінай вакол шыі). Па гэтай самай прычыне нельга было сукаць ніткі, закладваць аснову ў кроснах, навіваць кросны, матаць ніткі ў клубок, прасці, ткаць, зашываць штонебудзь на сабе (каб дзіця не захварэла).[16]

Ад старых людзей даводзілася чуць і пра тое, што розныя фізічныя паталогіі ў дзіцяці ўзнікалі ў выніку парушэнняў прадпісанняў самой цяжарнай. Так, дзіцячая слепата магла быць справакавана тым, што жанчына перайшла дарогу пахавальнай працэсіі, шыла ў святочны час, з'ела хлеб, пагрызены мышамі, забіла гадзюку або жабу. Касавокасць магла быць выклікана тым, што маці доўга глядзела на ваду, у люстэрка або падглядвала праз шчыліну.[17]

Каб перасцерагчы дзіця ад шэрагу хвароб, нельга было станавіцца на разлітую ваду, выходзіць у двор пасля заходу сонца. Даводзілася чуць, бяссонніца ў дзіцяці — вынік таго, што маці з'ела нешта ўпотай, ці адагнала свінню нагой, ці прапусціла сабаку або ката паміж ног. Каб дзіця не мучылі фурункулы, нельга было насіць пад фартухам або за пазухай яблыкі, слівы і грушы. *Прысутнасць цяжарнай жанчыны выключалася падчас перакладвання нябожчыка ў* труну (каб дзіця не захварэла на эпілепсію). Дзіцячая грыжа магла быць вынікам таго, што маці кідала на вогнішча калы, дошкі, кліны. (У сувязі з гэтым хочацца ўспомніць, як знахарка бабуля Феня лячыла грыжу. Яна ўзяла невялічкае паленца з сучком, палажыла яго на калені дзяўчынцы так, каб сучок упіраўся ў жывот каля пупа, прагаварыла ўслых тэкст замовы, а затым папрасіла, каб дачка і яе маці аднначасова паўтарылі адны і тыя ж словы: "Грызі болей, каб не было ніколі". А бабуля-лекарка тым часам імітавала акт выгрызання грыжы з жывата дзіцяці. Такім чынам, кола замкнулася: калі кінуць у агонь кол — можа ўзнікнуць грыжа, тады сучком — сімвалам падабенства кала — яе можна ліквідаваць. Клін — клінам...) Лічылі, што дзіця будзе плаксівым, калі маці есць на хаду, глядзіць на агонь, разбурае птушыныя гнёзды; калі есць што-небудзь кіслае, злуецца або сварыцца з кім-небудзь — будзе нястрыманым і злым. *Каб пазбегнуць разумовых парушэнняў, нельга было заглядваць у труну*. Цяжарнай не пажадана было браць ваду ў калодзежы: расплясканая з вядра вада справакуе адліванне дзіцем выпітага малака, соку ці квасу.[18]

І наадварот, народныя мудрацы ведалі шмат прадпісанняў, выкананне якіх магло спрыяць нараджэнню прыгожага дзіцяці. Лічылася, што дзіця будзе падобным на таго, на каго паглядзіць цяжарная, калі пачуе першае шавяленне плода. Ёй раілі даесці крошкі хлеба, якія не даела прыгожае дзіця. Каб дзіця не было "белым як смерць", нельга глядзець на нябожчыка, затое *трэба часцей глядзець на іконы*.

Каб дзіця не было лысым, раілі не хадзіць без фартушка; каб дзіця не было слюнявым, не дазвалялася адліваць ваду з вядра ў калодзеж, разліваць, калі неслі ў хату. А каб у дзіцяці

не было благога паху з рота нават не дазвалялася нюхаць кветкі.[19]

Неабходна звярнуць увагу на тое, што ў славянскай традыцыі *цяжарная жанчына не магла быць хроснай маці* (памрэ ці яе дзіця, ці яе хрэснік), *свашкай* або *дружкай на вяселлі* (маладым пагражала няшчасце), *забаранялася прысутнічаць падчас упрыгожвання нявесты*[20].

### Парады сучасным маладым жанчынам, якія хочуць нарадзіць дзіця

У кожнай рэчцы ёсць два берагі. Адзін пакаты, засыпаны цёплым драбнюткім жвірам. Па ім з асалодай зойдзеш у ваду, пакупаешся, выйдзеш абноўленым са шчаслівым адчуваннем прыгажосці жыцця і неадольнага жадання жыць. Другі бераг — высокі, пакручасты, з рэзкімі непрадказальнымі паваротамі, побач з якімі павольная плынь раптам пучыцца жудаснымі вірамі. Ніводны нармальны чалавек не пажадае нырнуць з такога берага, бо нельга прадказаць вынік эксперыменту.

Вось таксама і жыццёвая плынь віруе між двума берагамі. Таму, калі вы збіраецеся нарадзіць дзіця, за некалькі месяцаў да зачацця "пастаўце" сябе ў жорсткія рамкі звычаёвага права і маралі, максімальна выкарыстайце вопыт сваіх бабуль — і на свет з'явіцца здаровы і прыгожы чалавечак, які ўсё жыццё будзе прыносіць радасць. Ёсць і другі шлях. Уласная разбэшчанасць, наталенне чалавечых страсцей і слабасцей, а ў выніку нараджаецца гаротнае дзіця, грэх перад якім не адмаліць да скону веку.

Права выбару за вамі, але памятайце: трэцяга — не дадзена.

## ЦІ МОЖНА ЗАПЛАНАВАЦЬ ПОЛ БУДУЧАГА ДЗІЦЯЦІ?

Завяршыць гаворку аб розных аспектах рэгламентавання паводзін цяжарнай жанчыны лагічна будзе народнымі ўяўленнямі аб магчымасці загадзя запланаваць пол будучага дзіцяці або па пэўных прыкметах прадказаць яго задоўга да нараджэння.

У асяроддзі беларусаў існуе просты, але, як пераконваюць людзі сталага веку, надзейны шыфр планавання полу будучага дзіцяці. Вось як ён выглядае:



Перад намі першыя літары назваў дзён усяго тыдня: панядзелак, аўторак, серада, чацвер, пятніца, субота і нядзеля. Уважліва прыглядаемся да схемы. Яна беспамылкова падказвае, што ў шыфры ёсць толькі адна пазіцыя, дзе ноч з двух бакоў агорнута "мужчынскімі" днямі: панядзелак — аўторак. Зачацце ў гэту ноч прадказвае нараджэнне хлопчыка. Шукаем, ці ёсць у шыфры яшчэ адна, цяпер ужо супрацьлеглая, пара "аднаполых" дзён. Ёсць! Ноч паміж пятніцай і суботай ("жаночымі" днямі) абяцае нам дзяўчынку. Будзьце асцярожныя з трактоўкай іншых пазіцый.

П А С Ч П (С ¦ Н)

***Недапушчальна***: субота/нядзеля і нядзеля/панядзелак.

Наўрад ці задаволіць нас спрэчная пазіцыя паміж суботай і нядзеляй (нядзеля — дзень ні для якога "дзела", ня-дзела-й).

Надзвычай далікатнай з'яўляецца пазіцыя паміж серадой і чацвяргом.

П А (С ¦ Ч) П С Н

Вельмі спрэчная пазіцыя: серада ("жаночы")/чацвер ("мужчынскі") — хто будзе? Для таго, каб больш выразна ўбачыць спецыфічнасць пазіцыі і зразумець яе наступствы, прапаную правесці нескладаны лінгвістычны эксперымент: выпісваем са слоўніка імёны пад кожную з вызначаных пазіцый. У адзін слупок трапяць каля 600 мужчынскіх імёнаў, у другі — прыкладна столькі ж жаночых. Але вось нечаканы вынік. У адным і ў другім слупках апынулася звыш 10 адных і тых жа імёнаў: Аляксандра — Аляксандр, Валянціна — Валянцін, Яўгенія — Яўген, Вікторыя — Віктар, і г.д. Двухполая пазіцыя ў шыфры (серада—чацвер) — двухполыя імёны — ці не таму ёсць сярод нас і двухполыя (транссексуалы, гермафрадзіты) людзі, ці не таму сёння столькі жадаючых змяніць пол?

Уважлівы чытач адзначыць: у шыфры сустракаюцца яшчэ дзве пазіцыі з "разнаполымі" днямі. Як быць з імі, пра што сведчаць яны? Гэтыя пазіцыі набліжаны да дакладна арыентаваных, непераходных. Суседства "разнаполых" (аўторак/серада) і "аднаполых мужчынскіх" (панядзелак/аўторак) дзён прадказвае нараджэнне хлопчыка з жаночымі (мяккімі) рысамі характару. І наадварот, пераходная пазіцыя чацвер/пятніца, набліжаная да ўласна "жаночай", быццам бы абяцае нам нараджэнне дзяўчынкі з жорсткім, мужчынскім характарам. І нарэшце апошняе: маргінальная (пераходная) пазіцыя (серада/чацвер) паміж зноў-такі пераходнымі ад мужчынскай да

жаночай (чацвер/пятніца) правакуе ўжо саму чалавечую разнаполасць.

Зразумела, што лінгва-культуралагічны аналіз падасца не зусім пераканаўчым і чытач запатрабуе больш надзейных доказаў. У такім разе можна ўласна філалагічны шыфр праверыць матэматычнымі разлікамі, параўнаўшы іх з некаторымі культуралагемамі традыцыйнай спадчыны. На дапамогу прыходзіць нумаралогія. Возьмем і пранумаруем кожны дзень тыдня:




Узгадаем некаторыя аспекты ўпрыгожання палескіх караваяў: пасярэдзіне ставілі “шышачкі” (галінкі дрэў), канцы адной з іх мелі двайное разгалінаванне (Y), гэта “шышачка” была аперазана выпечанай пляцёнкай-касой, якая нагадвала серп паўмесяца, сімвал жаночага пачатку. Канцы другой — трайное разгалінаванне (ψ), “шышачка” стаяла пасярэдзіне пляцёнкі-“сонца” — у міфалогіі мужчынскі пачатак. Такім чынам, лічбавыя паказчыкі шыфру дакладна адпавядаюць старажытным сімвалам у культуры нашых продкаў.

І апошняе. Было адзначана, што нядзеля з абодвух бакоў недатыкальная. Ёй адпавядае лік “7”. Са структуры народнага календара бачна, што сямёрка — лічба свяшчэнная. Дзень нараджэння Ісуса Хрыста — 7.01 (у адпаведнасці з грыгарыянскім стылем, якога прытрымліваюцца каталіцкія вернікі, гэта падзея адзначаецца 25.01, але для нумаралогіі 25 — тое ж, што і 7 (=2+5)), дзень святкавання Благавешчання — 7.04, дзень нараджэння Івана Хрысціцеля — 7.07, і г. д. У кожным з гэтых выпадкаў на сёмае чысло прыпадае вялікае свята, якое катэгарычна патрабуе — “не рабі”. Застаецца апошняе матэматычнае дзеянне: складваем пазіцыю серада (3) і чацвер (4). Вынік атрымаўся той самы — 7. Калі вынік аднолькавы, то і парада адпаведная: “не рабі”.

У навукова-папулярнай літаратуры можна сустрэць значна больш складаныя шыфры планавання полу дзіцяці. Таму, каб павысіць працэнт надзейнасці, прыводзім яшчэ адзін шыфр.

У славянскай этнаграфічнай літаратуры зафіксавана да-

волі шмат розных прыкмет, па якіх лёгка і дакладна маглі ўстанавіць пол будучага дзіцяці. Яшчэ са старажытных часоў у культурах розных народаў свету існаваў прыцып падзелу на мужчынскі і жаночы пачатак. Дык вось, у міфалагічнай мадэлі свету левы бок заўсёды сімвалізаваў жаночы статус, правы — мужчынскі. Так неабходна станавіцца ў храме падчас вяселля; садзіцца за памінальным сталом; такім чынам зашпільваецца наша верхняя вопратка (мужчынскае паліто — на правы бок, жаночае — на левы), так завязваліся паясы ў нацыянальных касцюмах.

Такога ж прыцыпу прытрымліваліся (і беспамылкова), калі вызначалі пол дзіцяці. Дастаткова было запытацца ў цяжарнай, з якога боку яна пачула першае шавяленне плода, як адразу ж ведалі, хто народзіцца. Або цяжарнай прапанавалі сесці, а затым устаць: калі яна дапамагала сабе правай рукой — будзе хлопчык, калі левай — дзяўчынка. Гэты ж прынцып спрацоўваў, калі прасілі проста паказаць руку або глядзелі на форму жывата. (Аб вялікім касмічным і культурным (рытуальна-абрадавым) падзеле на правае і левае як мужчынскае і жаночае гаворка будзе весціся асобна.)

Ведалі нашы продкі і іншыя сакрэты. Напрыклад, задоўга да зачацця і на працягу цяжарнасці рэкамендавалі мужу і жонцы есці акрайчыкі хлеба ("Еш акрайчык, будзе сын Мікалайчык"). Некаторыя старыя людзі раілі: за два месяцы да зачацця есці адпаведна "мужчынскую" (бурак, часнок, агурок), або "жаночую" (цыбуля, капуста, морква, бульба) ежу.

Хочацца звярнуцца да чытачоў з просьбай: калі вы ведаеце яшчэ якія-небудзь сакрэты народнай медыцыны, прыкметы дакладнага вызначэння полу дзіцяці, абярэгі, перасцярогі, забароны ў паводзінах цяжарнай жанчыны, калі ласка, падзяліцеся сваім уласным вопытам.

## "СЯЧЫСЯ-РУБАЙСЯ, І НА ГЭТЫ СВЕТ, МЛАДЗЕНЕЦ, ЯЎЛЯЙСЯ"

А як прыдзе ўрэмя-пара,
тады як з луку страла.

*З народнай замовы*
*на лёгкія роды*

У пабудове Сусвету існуе безліч самых розных таямніц. Але бадай што адной з найбольш загадкавых і прыцягальных была і застаецца *таямніца нараджэння чалавека*. Якія касмапланетарныя працэсы ўплываюць на сам момант нараджэн-

ня, на фарміраванне псіхічных і фізіялагічных асаблівасцей дзіцяці, на станаўленне духоўнага свету асобы? На гэтыя і многія іншыя пытанні, звязаныя з жыццядзейнасцю чалавека, з яго зямным шляхам, характарам яго прадвызначанасці або магчымасцю самому мець права штохвіліннага выбару, тысячы гадоў чалавецтва шукае адказу, але пакуль што так і не пранікла ў глыбінную сутнасць дадзенага феномена. Разам з тым пэўны гістарычны вопыт у вырашэнні гэтай праблемы ёсць. Па-свойму тлумачаць яе філосафы, прадстаўнікі дакладных навук, паэты і пісьменнікі. Своеасаблівай трактоўкі прытрымліваюцца тэолагі і вернікі розных канфесій. Праблема захавання і працягу роду чалавечага з'яўляецца цэнтральнай і ў шматвяковай народнай культуры.

Народныя звычаі, абрады, рытуалы, вусна-паэтычныя творы, павер'і і прыкметы, звязаныя з нараджэннем чалавека, надзвычай багатыя і разнастайныя. Яны з'яўляюцца працягам і арганічнай складанай часткай усёй светапогляднай сістэмы нашага народа.

Нараджэнне – гэта прынцыпова важная мяжа паміж працяглым і адказным дародавым перыядам і часам (наканаваным лёсам) далейшага зямнога існавання. Але, на думку навукоўцаў, гэтыя два этапы ў жыцці чалавека цесна ўзаемазвязаны. Некаторыя сцвярджаюць нават, што эмбрыянальнае жыццё (псіхічны або фізічны стан маці, яе духоўная моц або душэўны неспакой, харчаванне, паводзіны, кантакты з рознымі людзьмі) у значнай ступені праграміруе і прадвызначае наш зямны шлях. Пра гэта надзвычай выразна і яскрава сведчыць сістэма рэгламентацый паводзін цяжарнай жанчыны і стаўленне да яе з боку суродзічаў. Уважлівае знаёмства з культурай нашых продкаў дае падставы сцвярджаць, што яны таксама ведалі гэту ўзаемасувязь і рабілі ўсё магчымае, каб паспрыяць зямному жыццю сваіх нашчадкаў.

Клопат аб будучым дзіцяці пачынаўся задоўга да яго нараджэння, ужо з вяселля. Больш таго, сам час правядзення вяселля таксама рэгламентаваўся пэўнымі прыродна-касмічнымі рытмамі, якія, безумоўна і непазбежна, уплывалі на стан здароўя чалавека, яго фізічны патэнцыял, асаблівасці псіхафізіялагічных працэсаў.

У структуры вясельных абрадаў нават існавалі спецыяльныя рытуальныя дзеянні, скіраваныя на ўзмацненне патэнцыялу маладых: іх садзілі на вывернуты кажух або на дзяжу, каб сям'я была вялікай і шчаслівай; багацця зычылі, абсыпаючы жытам ці пшаніцай. А якія выдатныя ўзоры народнай педагогікі можна было ўбачыць і пачуць падчас дзяльбы кара

вая. Прадстаўнікі роду маладой і маладога зычылі жаніху і нявесце:

Дарую медзі, каб дзеці былі як мядзведзі.
Дарую грошы, каб былі дзеці харошы.
Дарую хлебам-соллю, шчасцем-доляю.
Дарую буракамі, каб дзеці не былі дуракамі.
Дарую бульбы падполле,
Каб было дзяцей застолле.

***

Колькі ў Колінай хаце куточкаў,
Каб столькі было сыночкаў.
Колькі ў Насці падушак,
Каб столькі было дачушак.

Дарэчы, перыяды святкавання вяселляў самым цесным чынам былі звязаны з клопатам аб здароўі будучага пакалення.

Статыстычныя звесткі мінулага стагоддзя, запісы рэгістрацыі шлюбаў у царкоўных кнігах, шматлікія фальклорныя крыніцы, а таксама ўспаміны жанчын сталага веку (гадоў пад 80—90) пераканаўча сведчаць, што найбольшая колькасць вяселляў на Беларусі прыпадала на два асноўныя перыяды: *Вялікую вясельніцу*, якая ахоплівала час ад Пакроваў (14.10) і да пачатку Піліпаўскага посту (28.11) і *зімовы мясаед*, які доўжыўся ад 21 студзеня і да пачатку Масленічнага тыдня.

Гэта пацвярджае багаты цыкл жніўных песень, у якіх апяваецца цяжкая доля маладзіцы — "трэба жыта жаць і дзіця даглядаць":

Й за гарою вецер вее,
Жыцейка палавее.
Й маладая маладзіца
За гаем жыта жала.
Жала яна, спазнілася,
Дзіцятка забылася.
Прыляцелі тры й анёлы
Дзіцятка й калыхаці.
Адзін кажа: – Калышэмо.
А другі: – Падзяржэмо.
Трэці кажа: – Долю дайма,
Да й самі ўцякайма[1].

Каб лепш зразумець ступень знітаванасці касмапланетарных, прыродна-біялагічных і сацыякультурных фактараў, якія непазбежна ўплывалі на стан здароўя цяжарнай, на фарміраванне плода і нараджэнне будучага дзіцяці, неабходна яшчэ раз звярнуцца да мал. 8.

Аналіз малюнка распачнем з перыяду, які адпавядае часу мясаедных вяселляў. Жыццёвы вопыт сведчыць: адразу пасля вяселля (пасля першай шлюбнай ночы) сям'я будзе спадзявацца на папаўненне. Тая ж схема паказвае, што *зачаццю і пачатку цяжарнасці папярэднічаў шасцітыднёвы Піліпаўскі пост*, а г.зн., што будучае *дзіця пачне фарміравацца ў ачышчаным ад шлакаў арганізме жанчыны.* Рухаемся далей. Зразумела, што плод развіваецца за кошт арганізма маці, якая тым часам (на дварэ "*мяса-ед*") атрымлівае самую энергаёмістую (бялковую) ежу. Нарэшце да пачатку мясаеду дадаем дзевяцімесячны перыяд цяжарнасці і трапляем па схеме (і адпаведна ў гадавым колазвароце) на тое месца, духоўным і прыродным цэнтрам якога з'яўляецца *Багач*, г. зн., што *нараджэнне дзіцяці супадала з часам года, калі ежа была найбольш вітамінізаванай.*

А з другога боку, перыяду восеньскіх вяселляў не патрэбен быў папераджальны пост, таму што да гэтага часу арганізм чалавека інтэнсіўна сілкаваўся вітамінізаванай садавінай і гароднінай.

Такім чынам, пачатак фарміравання плода супадаў з часам прыроднага спакою, працоўнага зацішша, псіхалагічнай стрыманасці (гэтага патрабавалі перыяды пастоў, якія накладвалі на паводзіны людзей цэлы шэраг маральна-этычных абмежаванняў), а вось нараджэнне дзіцяці прыпадала на самы прыгожы час, калі прырода літаральна кожную расліну напаўняла багаццем мікраэлементаў і вітамінаў, неабходных для нармальнага развіцця немаўля і аднаўлення маральных і фізічных сіл парадзіхі.

Былі ў нашых продкаў і свае сакрэты планавання полу будучага дзіцяці. Скажам, калі сям'я жадала хлопчыка, для надзейнасці пад ложак маладым клалі нож ці сякеру ("на сына"), калі ж хацелі дзяўчыну – люстэрка і грэбень ("на дачку")[2].

Надзвычай адказным быў перыяд цяжарнасці. Нормы звычаёвага права і этнапедагогікі даволі жорстка рэгламентавалі паводзіны цяжарнай жанчыны. Існавала цэлая сістэма забаронаў, абмежаванняў і прадпісанняў. У аснове рацыяналізму гэтай сістэмы ляжаў усё той жа прынцып "падобнае выклікае падобнае". Старэйшыя людзі папярэджвалі: цяжарнай жанчыне нельга стрыгчы валасы, каб не ўкараціць розум дзіцяці; а ў царкве падчас набажэнства раілі станавіцца наперадзе, тады і дзіцяці заўсёды будзе шанцаваць.[3]

Апошнія гадоў дзесяць аўтар спецыяльна займаўся зборам звестак аб самых незвычайных, здавалася б, непрадбачаных і нечаканых здарэннях, якія адбываліся ў час родаў і пасляро-

давы перыяд. Некаторыя сітуацыі на пачатку не паддаваліся ніякаму лагічнаму тлумачэнню, аднак праз нейкі час паступова выяўлялася тыпалогія звестак, у якой прычыны і наступствы звязваліся ў адзіны і непарыўны ланцужок. Прычым у гэтым ланцужку даволі выразна прасочваюцца міжпакаленныя сувязі, у якіх аказваюцца цесна знітаванымі маці і дачка, бабуля і ўнучка, дзед і ўнук або бацька і сын.

Напрыклад, супрацоўнік аднаго з раддомаў Мінска расказаў пра выпадак, калі *жанчына ў тэрмін нарадзіла дзіця*, развіццё якога прыпынілася ў лоне маці ва ўзросце шасці месяцаў. Праз некалькі дзён парадзіха прызналася, што за тры месяцы да родаў яна абрэзала сваю прыгожую касу. Менавіта з таго моманту спынілася развіццё плода.

На мой погляд, гэты факт яшчэ раз засведчыў, што валасы з'яўляюцца самым тонкім праваднікам касмічнай энергіі, якая сілкуе ауру чалавека, падтрымлівае яго фізічную моц і духоўныя памкненні. Пасля таго як будзе перарэзана пупавіна (жыватворная сувязь з маці), асноўным каналам сувязі дзіцяці з космасам і суродзічамі застануцца валасы. Менавіта таму іх катэгарычна забаранялася абстрыгаць да года, калі дзіця знаходзілася ў стадыі пераходу з "таго" свету (чэрава маці) у гэты, мацнела, станавілася на ногі, пачынала вымаўляць першыя гукі, склады і словы — праходзіла шлях "пачатковага ачалавечвання".

Дарэчы, у беларускай этнакультуралогіі сімволіка і абрадавая роля валасоў практычна не даследавана. Паасобныя звесткі даюць падставы сцвярджаць, што валасы з'яўляюцца самым моцным каналам энергетычна-інфармацыйнай сувязі з Сусветам, з космасам. Менавіта праз авалоданне імі калдуны маглі нанесці іх гаспадару самыя жахлівыя пашкоджанні або хваробы, напрыклад каўтун. Адна маладая маці паведаміла, што яе маленькі сын моцна хварэў, спатрэбілася пераліванне крыві і дзеля гэтага дзіця пастрыглі. Зараз гэтаму хлопчыку сем год, аднак словы ён вымаўляе так, "быццам рот напоўнены ежай".

Сёння ўсё больш і больш з'яўляецца звестак аб тым, што ў дзяцей, зачатых у пост, з цягам часу выяўляюцца фізічныя, псіхічныя і разумовыя паталогіі.[4]

Прыведзеныя прыклады дазваляюць меркаваць, што парушэнне этыкетна-абрадавых рэгламентацый бацькамі небяспечныя Боскай карай, жыццёвымі пакутамі дзяцей, а таксама могуць прывесці да датэрміновых родаў. Каб гэтага не здаралася, цяжарная жанчына раней звярталася да сваёй бабулі або да мясцовай народнай лекаркі па дапамогу. Тыя не толькі раілі не падымаць нічога цяжкага, пастаянна насіць пры сабе саматканы чырвоны пояс-абярэг, але дапамагалі магічным сло-

вам, спецыяльнымі рытуальнымі формуламі, замовамі, напрыклад такой:

*"Ішоў Гасподзь Бог Ісус Хрыстос па залатой гарэ, нёс залатыя ключы. Залатыя ключы, замкніцясь, рабе Божай, косьці, сайдзіцясь, а жываты, астанавіцясь на свае на места, на залатое крэсла. Як кіт-рыба на моры не баіцца ні тучы, ні хмары, так і ты, раба Божая, не бойся ні бівання, ні валяння, ні цяжолага падымання.*

*Так і вы, жываты, станавіцясь на сваё на места, на залатое крэсла. Як дуб на корані нядвіжым, нярушым, так у рабы Божай нядвіжыма, нярушыма, і з свайго места не трогаецца"*[5].

У асяроддзі беларусаў існуе перакананасць, што першае дзіця абавязкова народзіцца мёртвым у той пары, у дзень вяселля якой паміраў нехта з аднавяскоўцаў, або па дарозе з храма іх вясельны картэж сустрэў пахавальную працэсію. Такое ж няшчасце магло напаткаць і тую пару, вянчанне якой адбывалася ў храме, дзе раніцай адпявалі нябожчыка[6].

Усе гэтыя і шматлікія іншыя факты пераканаўча сведчаць, што перыяд цяжарнасці, роды і жыццё дзіцяці да года – гэта адзіны спецыфічны этап у жыцці жанчыны і дзіцяці, калі яны падуладны толькі космасу, а ўсе гэтыя "выпадковасці" не што іншае, як пакуль што не пазнаныя намі заканамернасці прыродна-чалавечых стасункаў.

Адзначым таксама, што разнастайныя абмежаванні пэўным чынам кампенсаваліся паважлівымі адносінамі да цяжарнай жанчыны з боку сваякоў і блізкіх.

У астатнім жыццё будучай маці асабліва нічым не адрознівалася ад ранейшага. Штодзённа зранку і да позняга вечара яна выконвала асноўныя гаспадарчыя работы. Этнаграфічныя матэрыялы мінулага ды ўспаміны сведчаць аб тым, што цяжарная жанчына магла нарадзіць дзіця на жытнёвай ніве або трапаючы лён у полі.

Аднак звычайна да гэтай падзеі рыхтаваліся загадзя. Падчас родаў абавязкова карысталіся паслугамі бабкі-павітухі ("пупарэзніцы") – жанчыны сталага ўзросту, паважанай аднавяскоўцамі. Часцей па дапамогу звярталіся да той павітухі, якая пражыла шчаслівае жыццё. Меркавалі, што шчасце будзе спадарожнічаць і нованароджанаму.

Момант нараджэння трымалі ў тайне, бо лічылася: колькі валасоў на галаве тых чужых, хто ведае аб гэтым, столькі няшчасцяў будзе ў жыцці дзіцяці. Шырока бытавала павер'е, што прысутнасць староніх людзей удвая падаўжае самі роды і значна павялічвае пакуты парадзіхі. У сувязі з гэтым месцам родаў звычайна было нежылое памяшканне: лазня, варыўня, хлеў або гумно.

Пакуль жонка збіралася пераходзіць у якую-небудзь з гаспадарчых пабудоў, муж хуценька спяшаўся да бабкі-павітухі, не забыўшыся прыхапіць з сабою акраец хлеба, пасыпаны соллю і загорнуты ў спецыяльны ручнік. Пастукаўшы ў дзверы і паклікаўшы бабку на парог, ён шаптаў ёй на вуха: "Хадзі, бабулечка, к нам. Нешта нашай маладусе ня дужа ладна дзелаецца"[7]. Кемлівая жанчына, безумоўна, ведала, пра што ідзе гаворка, і адразу ж рушыла за госцем, таксама прыхапіўшы кавалачак хлеба.

Як бачым, дыялог мужа з бабкай-павітухай у нечым нагадваў дыялог сватоў, якія прыйшлі заручыць маладых: каб не сапсаваць справу сватоў або не нашкодзіць родам, удзельнікі дыялогу прама не называлі тое, пра што можна было лёгка здагадацца.

Роля бабкі-павітухі ў падзеі нараджэння была надзвычай важная і адказная, прычым як у сакральна-магічным, так і ў прамым сэнсе.

Практычна кожны крок галоўных удзельнікаў вясельнага і радзіннага абрадаў падпарадкоўваўся міфапаэтычнаму прынцыпу падабенства, або прыродна-касмічных і сацыякультурных аналогій і асацыяцый. Мелася на ўвазе, што *той, хто прымаў удзел у ключавых абрадавых дзеяннях, быццам па жывому энергетычнаму каналу перадаваў усе свае здольнасці, якасці, рысы характару, здароўе, долю, шчасце і багацце таму, дзеля каго гэты абрад праводзіўся.* Атрымлівалася так, што бабка-павітуха пераразала жыццядайную пупавіну, якая звязвала маці і дзіця на працягу дзевяці месяцаў, і звязвала (паяднoўвала), знітоўвала сябе з тым, каго *першай* прыняла на рукі. (Узгадайце: як сустрэнеш Новы год, такім ён і будзе; хто першы – мужчына ці жанчына зойдзе ў хату ў новым годзе, так і шчасціць будзе; якое імя будзе ў першага стрэчнага ў калядную ноч, за хлопца з такім імем замуж пойдзеш, з якой нагі раніцай устанеш, так і пашанцуе...)

Нормы народнай культуры і этнапедагогікі сфарміравалі шэраг патрабаванняў, якім павінна была адпавядаць бабка-павітуха. Як правіла, *вясковая павітуха – гэта жанчына сталага веку, часцей за ўсё ўдава або замужняя жанчына, якая ўжо не здольная нарадзіць* і не мае рэгулаў. *Не магла быць павітухай бяздзетная жанчына і тая, якая ніколі не была замужам.* Існавала павер'е, што ў гэтым выпадку роды будуць цяжкімі, а народжанае дзіця доўга не пражыве. *Перавага аддавалася тым бабулям, якія пражылі шчаслівае жыццё і карысталіся павагай сярод аднавяскоўцаў.* Калі ж запрошаная прымаць роды аднойчы здрадзіла мужу, то лічылі, што дзіця будзе хворым і пражыве нядоўга. *Ні ў якім разе не запра-*

*шалі прымаць роды тых жанчын, у якіх быў злы і сварлівы характар, якія мелі чорныя вочы і "цяжкую" руку і хоць калі-небудзь абмывалі нябожчыка.*[8]

Поруч з акрэсленымі маральна-этычнымі якасцямі бабка-павітуха павінна была валодаць шэрагам самых неабходных акушэрскіх прыёмаў. Акрамя гэтага, у практыцы народнай медыцыны шырока скарыстоўваліся разнастайныя магічна-рытуальныя дзеянні: у хаце адкрывалі ўсе замкі, куфры, на парадзісе расшпільвалі ўсе гузікі, усіх родных прасілі развязаць паясы або расплесці косы. Бабка-пупарэзніца тройчы пастуквала нагой аб падлогу, тройчы пераступала туды-назад праз парог, тры разы абыходзіла стол. Дзеля таго каб перасцерагчы парадзіху ад сурокаў і нагавораў, побач з ёю клалі нож або абвязвалі яе чырвонай ніткай. Адной з найважнейшых складаемых частак абраду народзінаў былі спецыяльныя прафілактычна-прадуцыравальныя і гаюча-засцерагальныя замовы, якія павінна была ведаць бабка-пупарэзніца. Напрыклад, каб хутчэй і лягчэй распачаліся роды, яна прамаўляла наступныя словы:

*"Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Матцы памалюся. Ішоў Госпадзь Бог Хрыстос з нябес, за ім Прачыстая Матка ішла, у правай руцэ залатыя ключы нясла. Сустракае Госпадзь Бог Ісус Хрыстос з нябес.*

*— Куды ты, Маць Прачыстая, ідзеш?*

*— Іду я парадзіцу адведаці і младзенца з жывата выпускаці. Ці ты ж, младзенец, ці младзенка – пара табе з жывата выхадзіці, парадніцы кроў разліці.*

*Прашу я цябе, Прачыстая Маць, к сабе на помач сваёй праваю рукою"*[9].

Падчас родаў бабка-павітуха імкнулася рознымі дзеяннямі паспрыяць парадзісе. Яна пагладжвала цяжарнай спіну, расцірала жывот "драўляным" маслам, часам давала ў рот парадзісе яе ўласную касу, каб справакаваць ірвоту і тым самым выклікаць моцнае напружанне мышцаў жывата[10]. Акрамя таго, павітуха бясконца малілася, бо ў народзе верылі, што менавіта ў гэты час да парадзіхі прылятае Архангел Міхаіл і ўсе апосталы. (Лічыцца, што найвялікшымі апякункамі парадзіх з'яўляюцца Багародзіца, святыя Ганна, Варвара і Кацярына Вялікамучаніца. Меркавалі, што родам спрыялі св. Уласій, Іван Багаслоў і бабуля Саламаніда, якая, у адпаведнасці з апакрыфічнымі казаннямі, прымала Ісуса Хрыста.) Пры гэтым бабка-павітуха трымала ў руках "грамнічную" або "чацвярговую" (купленую ў Чысты чацвер) свечку. У выключных (цяжкіх) выпадках запальвалі вянчальныя свечкі.

У жыцці здаралася ўсякае. У адным выпадку "Бог хутка

даравау̌" парадзісе грэх і роды праходзілі хутка і лёгка, у іншым — яна мучылася дзень, другі, а то і трэці, але нарадзіць не магла. Тады ў ход ішлі ўсе магчымыя (ці якія калі-небудзь выкарыстоўваліся ў практыцы іншых павітух) спосабы дапамогі: напрыклад, цяжарная прапаўзала паміж ног мужа, які стаяў пасярод хаты, або муж пераступаў тройчы цераз жонку.[11]

Выкарыстоўваўся шэраг спецыфічных магічных дзеянняў, якія практыкавалі "прафесійныя" народныя лекары. Напрыклад, бралі тры каменьчыкі з трох лазняў, аблівалі іх вадой, якой затым апырсквалі цяжарную. Лічылася, што можа паспрыяць вада, у якой вымакала скура вужа, ці ў якую апускалі хатнія замкі, або якой акацілі першае знесенае вясною або тры звычайных яйкі.[12] Вадой абмывалі заручальныя пярсцёнкі мужа і жонкі і давалі цяжарнай папіць яе. У кубачак з вадой маглі апускаць вугальчыкі, якія "выскачылі" з печы, калі яна гарэла. Зразумела, што прыклады гэтыя зноў-такі грунтаваліся на прынцыпе падабенства: як лёгка вакацілася яйка з курыцы або выляцеў вугальчык з печы, так хутка павінны прайсці і роды.

Па тэкстах замоў можна зразумець, якія дзеянні выконвалі сама парадзіха, дамачадцы і пакліканая на дапамогу госця. Але, думаецца, што паэтычны бок замоў яшчэ больш гаворыць пра саму пупарэзніцу. Толькі выключнай маральнай чысціні жанчына здольная была трымаць у памяці такія высокамастацкія радкі і імкнуцца з іх дапамогай паспрыяць парадзісе, а потым са светлай радасцю і шчырай душой сустрэць з'яўленне на свет Божы новага чалавека:

> *"Госпаду Богу памалюся, усім божым угодні́чкам укланюся. Ранняя (вячэрняя) зара-зараніца, прашу быць Аўхіму Міхайлаву (знахар) памашніца. Раба божая і прэсвятая Багародзіца, і ты, маладзец (дзявіца), – няма пары, няма й травы, царськія вароты пазапіраны і кворткі пазамыканы. Прыйдзе пара – парасце трава, царськія вароты па'адпіраюцца, і хворткі па'адмыкаюцца, моладцу ці дзявіцы на свет можна выйсці (быку ці цяліцы, жарабцу ці кабыліцы)"*[13].

Падчас родаў маглі быць розныя непрадбачаныя сітуацыі: моцны крывацёк, разрывы, зрушэнні тазасцегнавых суставаў. Таму бабка-павітуха тут жа шаптала замову на спыненне крыві:

> *"Ішоў Гасподзь із небеса, баран із-за мора. Сустрэліся на калінавым масту. Зняў Гасподзь із барана руно і затыкаў крывавае жарало"*[14].

Вопытныя бабкі-павітухі прыкмячалі кожную дэталь, звязаную з момантам нараджэння дзіцяці, таму што ўсе яны былі зусім не выпадковымі, а ў пэўнай ступені лёсавызначальнымі.

Напрыклад, калі дзіця нараджалася тварам уніз, павітуха ўжо разумела, што яно доўга не пражыве; меркавалі, што жыццё будзе кароткім і ў дзяцей, якія адразу ж пасля нараджэння "не падалі голас". І наадварот, пашчасціць тым, хто нарадзіўся "ў рубашцы".[15]

Калі роды былі цяжкімі, то больш увагі ўдзялялі самой парадзісе. Трэба было не толькі прыпыніць кроў, але і ўправіць суставы. І гэты акт дапамогі не абыходзіўся без слоўнай магіі:

*"Святы Марцін, распусці на сем аршын, святы Несцер, звядзі на персцень, пастаў сустаў на сустаў, на сцыкі дзірачку астаў"*[16].

Шматвяковы вопыт народных лекараў і бабак-павітух, які трымаўся на назіраннях, прыкметах, павер'ях, пераконвае, што складанымі роды былі ў тых выпадках, калі пра іх даведваўся хто-небудзь з аднавяскоўцаў, асабліва жанчына. Успамінаючы імя парадзіхі, яна магла кепскімі словамі сурочыць яе (як адвольна, так і мэтанакіравана), а яшчэ горш рознымі чарадзейнымі дзеяннямі наслаць бяду або нават смерць на парадзіху або дзіця. Таму ў многіх вёсках існавала традыцыя: за два-тры тыдні да родаў цяжарная позна вечарам прыходзіла ў дом сваёй маці, каб нарадзіць там.

У традыцыйнай культуры розных славянскіх народаў існавала павер'е, што парадзіха на працягу сарака дзён пасля родаў з'яўляецца "нячыстай", "паганай". Гэта павер'е замацавалася яшчэ і таму, што Трэбнік змяшчаў спецыяльныя малітвы, якія чыталі адразу пасля нараджэння дзіцяці і на саракавы дзень яго жыцця. Пад уплывам гэтай храмавай традыцыі ўзнік шэраг абмежаванняў у паводзінах парадзіхі на працягу сарака дзён пасля родаў. *Ёй нельга было заходзіць у храм, падыходзіць да бажніцы, браць у рукі абраз і запальваць перад ім свечку, прысутнічаць на малебне ў доме, піць "хрэшчэнскую" ваду, асвечаную ў іншае прыстольнае свята, аглядаць пчол, даіць і выганяць карову ў поле, асвячаць яе пры першым выгане на пашу, хадзіць у госці на вялікае свята, ісці на вяселле, падаваць на стол хлеб, наразаць яго, хадзіць у свіран, дзе захоўвалася зерне або мука.*[17]

Шматлікія рытуальныя дзеянні былі скіраваны на праектаванне далейшага лёсу дзіцяці. З гэтай нагоды бабка ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а пакрывала іх саматканым палатном, каб паспрыяць багаццю нованароджанага.

Пупавіну хлопчыку пераразалі на нажы, сякеры ("каб імі добра валодаў"), на кавалачку хлеба, пазней на кніжцы. Яшчэ да нашага часу дзе-нідзе захаваўся старажытны звычай проста перабіваць яе вострымі камянямі. Пупавіну дзяўчынцы пераразалі на грэбні, "каб добра прала"[18]. Часам, каб засцераг-

чы дзіця ад грыжы, павітуха перагрызала яе зубамі. Пупавіну перавязвалі суровай ніткай або паскай цераблёнага лёну, у якую ўплятаталі (!) валасы маці. Валасы выстрыгаліся з правай касы або правай скроні, "каб дзіця ўсё жыццё было прывязана да маці". Праз некалькі дзён пупавіну завязвалі ў вузельчык і клалі ў куфар. Калі ж дзіцяці спаўнялася тры гады, гэты вузельчык даставалі і давалі маламу развязаць яго ("развязаць свой розум"). Дзіцячае месца ("пасцельку") заўсёды акуратна вымывалі, загортвалі ў анучу разам з лустай чорнага хлеба, яйкам або некалькімі галоўкамі цыбулі, усё гэта клалі ў лапаць і зарывалі ў якім-небудзь патаемным месцы (у падполлі, пограбе, каля печкі, у чырвоным куце), радзей у лазні пад палком, у хляве ці канюшні. Але часцей за ўсё паслед – сімвал прыроднай калыскі – закопвалі пад вугал хаты (калі нарадзжаўся хлопчык): "прывязваючы" дзіця да роднага дому і жадаючы яму стварыць сям'ю, пасядзець у чырвоным куце на вяселлі. Калі ж нараджалася дзяўчынка, то паслед, а то і пупавіну закопвалі пад парогам – каб "пайшла за парог" – выйшла замуж[19].

У славян вядомы былі і іншыя рытуальна-магічныя дзеянні з паследам. Напрыклад, каб у дзіцяці не было грыжы, "пасцельку" хавалі пад падвалінай з боку двара. Калі сям'я жадала наступнага хлопчыка, то паслед хавалі на гарышчы над чырвоным кутом, а калі думалі пра дзяўчынку — зарывалі на чужым полі. Калі ж у сям'і паміралі ўсе папярэднія дзеці, паслед зарывалі на сярэдзіне чужога поля. У народзе існавала перакананасць: *калі паслед не схаваць у тры дні, то тры гады дзяцей у гэтай сям'і не будзе.* М.Торэн прыводзіць сведчанні, у якіх сцвярджаецца наступнае: калі паслед вывернуць, то праз год у сям'і абавязкова народзіцца хлопчык, а калі паслед зарыць пупавінай *уніз*, то дзяцей у парадзіхі больш ніколі не будзе.[20]

Зарыванне паследу суправаджалася спецыяльнымі рытуальнымі формуламі:

> *"Ад зямлі ўзята, зямлі перадавайся, а ты, раба Божая, на зямлі заставайся", "Табе, свята месечка, на ляжанне, а Таццяне на здароўе", "Месту гніць, а дзіцяці жыць ды Бога любіць, бацьку і маці паважаць і бабку не забываць".*

Некаторыя бабкі-павітухі валодалі сакрэтамі, з дапамогай якіх імкнуліся паўплываць не толькі на лёс нованароджанага, але і на далейшае жыццё самой парадзіхі. Каб у яе не было радзімых плямаў, пасследам церлі твар, а каб не балеў жывот, "месца" клалі пад галаву. І наадварот, лічылі, што маці пры дапамозе адрэзанага невялічкага кавалачка паследу магла "зап-

раграмаваць" будучыя схільнасці свайго дзіцяці: калі яна кіне гэты кавалачак у канюшні, хлопец будзе ладзіць з канём, калі ж павесіць на саху ці плуг, хлопец вырасце дбайным і гаспадарлівым; калі рэшткі пупавіны кінуць каля царквы, дзіця будзе "любіць Бога", а то і манахам стане.[21]

У некаторых мясцінах парадзісе адразу пасля родаў давалі з'есці лусту пасоленага хлеба, прычым з гэтай лустай гаспадар спачатку лез у пограб, абыходзіў усе вуглы і запрашаў дамавога наступнай формулай-абярэгам: "*Суседзюхна-бацюхна, ідзі за мной*".

У асяроддзі беларусаў існавала павер'е аб тым, што лёс дзіцяці ў многім залежыць ад дня тыдня, у які яно нарадзілася. Так, лічылася, што народжаныя ў панядзелак, будуць няўмелымі, няўдалымі; у аўторак — здольнымі выконваць самую адказную работу. У сераду на свет з'яўляліся людзі, у якіх шчасце будзе межаваць з няшчасцем, багацце з беднасцю. У чацвер нараджаліся дзеці, здатныя да навукі, спрытныя, працаздольныя, але нядоўгага веку. Народжаныя ў пятніцу часцей за іншых могуць стаць злодзеямі або п'яніцамі, а ў суботу — будуць шчаслівымі і ўдачлівымі. Але самыя шчаслівыя дзеці нараджаліся ў нядзелю: ім заўсёды будзе шэнціць, а грамадскі поспех зробіць іх уладарамі свету.[22]

Адразу пасля родаў нованароджанага абавязкова купалі, а парадзіху добра парылі. Амаль што паўсюдна вытрымлівалася традыцыя тройнога ачышчэння парадзіхі: каб яна тройчы (тры дні запар) памылася ў лазні, прычым адным і тым жа венікам. Калі роды былі цяжкімі, парадзіха заставалася ў лазні ўсе тры дні: у яе была магчымасць добра выпарыцца, а затым управіць жывот і залатнік (пуп), каб не было грыжы і не балела сярэдзіна. Дзеля гэтага павітуха брала гліняны гаршчок і ставіла яго на пуп парадзісе. Яшчэ і сёння такім чынам народныя лекары правяць спіну ("упраўляюць залатнік")[23].

У адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі вельмі небяспечнымі для нехрышчонага дзіцяці з'яўляюцца кантакты з чужымі людзьмі, якія могуць сурочыць немаўля. З гэтай нагоды павітуха брала з сабой у лазню іконку, якой хрысціла ўсе вуглы і печку, а ў час купання дзіцяці пастаянна паўтарала словы ахоўнай малітвы: "*Анёлы з табой, ахоўнікі з табой*".

Даследчыца рускай народнай медыцыны М.Торэн апісала адзін даволі складаны і цікавы звычай, які наскрозь напоўнены прадуцыравальнай магіяй. Бабка з нованароджаным і патэльняй ідзе ў лазню наперадзе, а за ёю парадзіха, трымаючы ў руцэ нажніцы. Каля лазні бабка робіць на дзвярах тры крыжы і са словамі "Благаславі, Божа" перадае патэльню парадзісе ў правую руку. Тая падпіраецца патэльняй, пры гэтым

трымаючы нажніцы вастрыём наперад у левай руцэ. Бабка-павітуха вымывае дзіця, выцірае яго анучай, у якую загорнуты клок баранняй поўсці, выстрыжанай першы раз, яйка ад маладой курыцы і срэбная манета. Гэтым самым жадалі нованароджанаму шмат адзення, яды і грошай. Пасля вяртання з лазні анучу з амулетамі клалі пад галаву дзіцяці, а патэльню парадзіха ставіла пад свой ложак.[24]

Каб дзіця не баялася сурокаў, бабка акурвала яго ладанам, апырсквала святой вадой; спецыяльна загаворвала ваду, якой немаўля абмывалі, а парадзісе давалі крыху выпіць.

Пасля таго як дзіця пакупалі, бабка распачынала "правіць" яго: моцна сціскала галаву, каб яна была роўнай і круглай; выцягвала або, наадварот, сціскала нос, каб не быў доўгім і шырокім; туга спавівала ногі, каб не былі крывымі. Акрамя гэтых павітухі выконвалі і больш складаныя рытуальна-абрадавыя дзеянні. Каб дзіця не хварэла "на крыксы", яго (пасля абмывання) загортвалі ў палатно, перавязвалі лыкам і клалі ў чырвоны кут. Некаторыя павітухі злізвалі галаву нованароджанага і сплёўвалі на левы бок, каб ніхто яго не змог сурочыць.[25]

Каб дзіця было здаровым і дужым, любіла бацьку і было паважанае ім, яго спавівалі ў брудную бацькаву кашулю ці штаны.[26] На працягу шасці тыдняў пасля хрышчэння баяліся мыць і купаць дзіця, таму што ў гэты час яго цела "цвіце". Каб у дзіцяці не балелі вочы і твар быў чыстым, яго абмывалі мацярынскім малаком, не carмілі грудзьмі ў час навальніцы і адразу ж пасля яе. У славянскіх народаў існаваў звычай: дзяўчынку карміць левай, а хлопчыка правай грудзьмі. Катэгарычна забаранялася карміць дзіця грудзямі на працягу першых трох дзён.[27]

Сярод павітух існавала бясконцае мноства самых розных прыкмет-прадказанняў аб лёсе і характары будучага чалавека. Калі пупавіна мацуецца каля краю паследу, дзіця не будзе жыць, а калі пасярэдзіне – яго чакае доўгі век. Калі дзіця народзіцца з доўгімі валасамі, то пражыве кароткі век, будзе цяжкім і маларухомым. Дзіця, якое нараджаецца напярэдадні вялікага свята, будзе непрыгожым і неразумным. *Каб дзіця было ціхім і спакойным, першы раз яго трэба пакласці на правы бок*, а *каб яно было шчаслівым і багатым*, *у ваду для першага купання клалі срэбную манету.* Існавала перакананасць, што калі дзіця народзіцца сінім або белым, яно доўга не пражыве, а вось калі чырвоным – будзе жыць доўга і шчасліва, але мець сярдзіты нораў. Калі ў дзіцяці густыя бровы, яно можа вырасці хітрым і хлуслівым.[28]

Агульнапашыранай лічыцца забарона качаць пустую калыску і сушыць пялёнкі над агнём – дзіця не будзе спаць па начах.

Важнай падзеяй пасляродавага перыяду было першае купанне дзіцяці і наданне яму імя. У гэты час таксама прытрымліваліся пэўных рэкамендацый. Так, пры першым купанні дзіця трымалі тварам на захад. У ваду клалі розныя святаянскія травы і прадметы: дзевяць вугальчыкаў, невялічкую манету, бурштын, некалькі крышталікаў солі. Калі купалі дзяўчынку, то ў ваду далівалі малако, каб была прыгожая, белая з твару; хлопчыку далівалі піва, каб ён быў дужым і адважным.

Сярод мноства утылітарна-прагматычных і ўласна прафілактычных рэчаў, якія клалі ў ночвы дзіцяці, вылучаліся асноўныя, якія мелі сімвалічны, уплывовы на лёс чалавека, характар. Так, калі купалі дзяўчынку, то ў ваду абавязкова клалі аднакапеечную медную манету. Па ўяўленнях нашых продкаў, гэта павінна было паспрыяць таму, каб будучы менструальны цыкл праходзіў як мага лягчэй і карацей. У ночвы хлопчыку абавязкова клалі заручальны пярсцёнак бацькі. Хлопец – мужчына – гаспадар часцей быў па-за межамі хаты, яго трэба было “аперазаць” вечным магічным біяэнергетычным кальцом, якое перасцерагала чалавека ад сурокаў, нагавораў і іншых вядзьмарскіх штукарстваў. Нагадаю, што і сёння, калі мы адпраўляемся ў далёкую дарогу, то абавязкова прысядзем на адну хвілінку, а затым ужо перад парогам хаты ціхенька прамовім словы магічнай замовы:

Еду я ў дарогу,
Господзь Бог са мною.
Маці Боская перад вачамі,
Ісус Хрыстос за плячамі,
З бакоў анёлы мяне ахраняюць,
Усю бяду ад мяне адганяюць[29].

Вялікае значэнне мела і вада для першага купання. Калі хацелі, каб сын быў ганарыстым, паспешлівым, “гарачым”, спачатку налівалі кіпень, а затым ужо халодную. Калі ж хацелі мець спакойнага, стрыманага, разважлівага памочніка, то першай налівалі ваду са студні. *Ваду, у якой купалі хлопца, вылівалі пад яблыньку* (каб багатым быў), а *ваду, у якой купалі дзяўчынку — пад вішню* (каб была прыгожай, “краснай”). Як жа дзіўна замыкалася жыццёвае кола чалавека праз прызму зносін з Прыродай: пасля смерці бацькі сын ішоў у сад і высякаў самую пладаносную яблыню (іначай сад увесь загіне ў бліжэйшыя тры гады), калі памірала маці, то ў садзе высякалі вішню.

У выбары *імя* быў зацікаўлены ўвесь род, таму што ў народзе лічылі, што імя — гэта знак, сімвал чалавечай долі. Яно

шмат у чым уплывае на лёс чалавека, прадвызначае яго характар. Асабліва важным было не памыліцца ў выбары імя першынца, бо, меркавалі, ад гэтага будзе залежыць далейшы лёс усёй сям'і. Акрамя таго, у асяроддзі народных лекараў існуе перакананасць, што менавіта першае дзіця можа атрымаць ад Бога здольнасць дапамагаць людзям у цяжкую хвіліну.

Узгадаем старажытныя славянскія імёны фальклорных персанажаў: Алена-краса, Светаяр, Васіліса Прамудрая, Вярнідуб, Андрэй за ўсіх мудрэй, Івашка-мядзведжае вушка. У кожным з іх зашыфраваны тыя незвычайныя здольнасці, якія прадвызначалі характар жыццядзейнасці героя.

Народныя казкі зафіксавалі таксама традыцыю (якая і да сённяшняга часу захавалася ў народаў Сярэдняй Азіі) даваць імя ў адпаведнасці з паслядоўнасцю нараджэння дзяцей: Першынец, Серадольшы, Паскробыш. У больш позні час імёны язычніцка-ведыйскага пантэона багоў саступілі месца імёнам у гонар святых праваслаўнай ці каталіцкай царквы. Пажадана было, каб дзіця атрымала імя таго святога, у дзень ушанавання якога яно нарадзілася. Калі ж бацькам яно не падабалася, ім давалі магчымасць выбраць імя з царкоўнага календара за дзесяць дзён да і пасля нараджэння (у народзе лічылі, што лепш прытрымлівацца апошняга варыянта). Пачынаючы з Сярэднявечча паступова замацоўваецца яшчэ адна традыцыя — імя набывае ярка выражаны радавы пачатак: разам з самым моцным энергетычным абярэгам чалавека – яго прозвішчам – вялікая ўвага пачынае звяртацца на імя, якое насілі продкі: дзяды і бабулі. Прычым і тут абавязкова дзейнічаў прынцып падабенства. Унуку давалі імя таго дзеда, які пакінуў добрую спадчыну і карыстаўся павагай аднавяскоўцаў. Гэтым самым дзіця ўключалася (далучалася) у жыватворны ланцужок свайго Рода, пераймала яго эстафету, уласна кажучы "акультурвалася"; праз адпаведныя рытуалы і наданне імя яно станавілася чалавекам.

Толькі ў выключных выпадках дзіцяці давалі імя бацькі: калі сын нарадзіўся ў вялікае свята, напрыклад, на Юр'я, Івана Купалу, Міхаіла ці Мікалая, Пятра або Паўла. У адваротным выпадку існуе перакананасць, што з моманту надання сыну імя бацькі ў хаце пачынаецца энергетычная барацьба за выжыванне, якая часцей заканчваецца раптоўнай смерцю бацькі. У асобных выпадках імя бацькі давалі сыну мэтанакіравана. Калі, напрыклад, у сям'і паміраў першы, а затым і другі сын, то трэці абавязкова атрымліваў імя бацькі. Гэтым самым смерць свядома пераадрасоўвалі на бацьку, імкнучыся ўратаваць спадкаемца.[30]

На сённяшні дзень у аўтара сабрана вялікая колькасць

запісаў з розных мясцін Беларусі, у якіх людзі сведчаць аб тым, што ні ў якім разе нельга даваць дзецям імёны рана загінуўшых (родных ці знаёмых) людзей, бо існуе большая верагоднасць, што вельмі хутка іх напаткае такі ж лёс.

Напярэдадні *хрышчэння* дзіцяці бацькі выбіралі кумоў – хросных бацьку і маці. Справа гэта лічылася даволі адказнай, бо зноў-такі людзі меркавалі, што духоўнае жыццё новanароджанага ў пэўнай ступені будзе нагадваць лёс хросных, а самі хросныя з моманту хрышчэння станавіліся духоўнымі бацькамі дзіцяці і самымі ганаровымі ўдзельнікамі ўсіх святкаванняў (хрэсьбіны, вяселле, Масленіца, Вялікдзень), звязаных з жыццём хрэсніка. Кумамі маглі быць сваякі, пачынаючы з другога калена сваяцтва, добрыя знаёмыя ці проста суседзі. Даволі часта імі станавіліся тыя, хто быў на вяселлі бацькоў старшымі шаферам і шаферкай.

Беларуская традыцыя выпрацавала шэраг забарон і рэкамендацый, якія тычыліся выбару кумоў. Так, катэгарычна забаранялася, каб хросныя былі мужам і жонкай (у іх можа не быць сваіх дзяцей або, калі ёсць адно, то ўжо не будзе наступнага). Пажадана, каб першым хрэснікам у хроснай маці быў хлопчык, а ў хроснага бацькі – дзяўчынка[31].

Заключным этапам пасляродавага перыяду былі *хрэсьбіны* – прыгожы абрад прыняцця новanароджанага ў сям'ю, сцвярджэння яго родава-абшчынных паўнамоцтваў, які звычайна ладзілі ў дзень царкоўнага хрышчэння. Пакуль кумы вазілі дзіця ў царкву, дома хутка накрывалі сталы, запрашалі сваякоў і блізкіх.

Пасля хрышчэння кумы кіраваліся дадому, дзе іх на парозе сустракала маці немаўляці. Яна прымала дзіця ў вывернутым кажусе, каб засцерагчы ад сурокаў. Усе прысутныя запрашаліся за святочны стол. Натуральна, што галоўнымі і найбольш паважанымі гасцямі былі кумы і бабка-павітуха. Святочнае застолле распачынаў кум наступным пажаданнем: "*Як мы відзелі Янку пад храстом, штоб так відзелі мы пад вянцом, штоб ён добра пахаў ды добра малаціў*".

Абавязковай абрадавай стравай на хрэсьбінах была "*бабіна каша*", якую гатавала павітуха. Крута звараную кашу зверху ўпрыгожвалі кветкамі або цукеркамі. Падавалі яе ў канцы святочнага застолля. Дзяльбу "бабінай кашы" на хрэсьбінах можна параўнаць з дзяльбой каравая на вяселлі. Гэта быў найбольш прыгожы і шумлівы рытуал. Распачынаў яго кум. Ён адкладваў на талерку тры лыжкі кашы, ставіў побач чарку гарэлкі і нёс маці немаўляці. Затым браў гаршчок з кашай у рукі і крычаў: "Ой, горача!" І быццам незнарок упускаў гаршчок на стол так, каб ён рассыпаўся на чарапкі. Бабка прыбіра-

ла іх, а каша павінна была застацца цэлай. Гэта прадказвала хрэсніку доўгае і багатае жыццё. Калі разам з гаршком рассыпалася і каша, лічылася, што дзіця пражыве нядоўга.[32]

У некаторых мясцінах Беларусі на хрэсьбінах падчас падзелу кашы з'яўляўся "бусел" (нехта са знаёмых, пераапрануты ў вывернуты кажух, рукавы якога былі звязаны ў "дзюбу"). Ён віншаваў бацькоў, дарыў ім лялькі і прыгаворваў: "*Калі добра будзеце прасіць, дык я яшчэ буду насіць, насіць і насіць*".[33]

На жаль, у апошні час нашы сем'і значна паменшыліся: ці то добра прасіць развучыліся, ці то буслы радзей прылятаць сталі...

# ЖЫЦЦЁ І СМЕРЦЬ ЧАЛАВЕКА Ў ТРАДЫЦЫЯХ, АБРАДАХ І ПАЭЗІІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Добра вядома, што асновай, структурным ядром беларускай вусна-паэтычнай спадчыны з'яўляецца каляндарна-абрадавая паэзія, якая арганічна яднае чалавека з прыродай, космасам, яднае праз актыўны, зацікаўлены, вельмі выразна ап-радмечаны дыялог. Часам ён мае характар лагоднага звароту-прашэння, часам дасягае вышыняў катарсічнага малення-ачышчэння, а бывае і так, што прытомленая, знямоглая душа ўскалыхнецца эмацыянальным усплескам і тады зварот набывае характар непрыкрытай пагрозы.

Ідучы следам за Сонцам, за гадавым колазваротам, чалавек маліў, прасіў, пераконваў Творцу Сусвету, адухоўлены свет прыроды і са спадзяваннем на паразуменне араў, сеяў, сушыў, збіраў — жыў і выжываў, штогод аднаўляўся разам з вясною.

Аднак адвечны клопат аб паляпшэнні дабрабыту не быў самамэтай: жыць дзеля выжывання. Паралельна гэтаму клопату, а магчыма ў цесным перапляценні з ім, думкі кожнага чалавека імкнуліся ў будучыню, якая выразна бачылася ў сынах і ўнуках. Гонар за свой Род быў бадай што непараўнальны ні з чым. Усе педагагічныя, этычныя, эстэтычныя і сацыяльна-псіхалагічныя памкненні канцэнтраваліся найперш вакол падтрымкі высокага статусу свайго Роду. Зразумела, што важнейшыя падзеі, звязаныя з асноўнымі этапамі ў жыцці чалавека, абавязкова збіралі за святочным сталом усю радню і суправаджаліся сакральнымі абрадамі, традыцыйнымі рытуаламі, шчырымі, высокамастацкімі песнямі. Паступова нарадзіўся і сфарміраваўся ў складаную сістэму яшчэ адзін велічна-непаўторны цыкл святкаванняў, які ахопліваў найважнейшыя падзеі ў жыцці кожнага чалавека: яго фізічнае і духоўнае (хрэсь-

біны) нараджэнне, грамадскае і нябеснае паяднанне (вяселле і вянчанне), а таксама фізічную смерць і пахаванне. Першыя два этапы прыжыццёвых святкаванняў у пэўнай ступені былі разгледжаны. а вось тое, што тычыцца абрадаў, суправаджаючых апошні, заключны момант існавання чалавека на зямлі, узгадвалася толькі фрагментарна, у кантэксце больш шырокіх разважанняў і аналогій.

Разам з тым мае сустрэчы ў многіх мясцінах Беларусі з людзьмі рознага веку пераканалі: якой бы цяжкай і складанай у псіхалагічным плане не была тэма смерці чалавека і яго адпраўкі на вечны спачын, але гаварыць пра яе трэба; гаварыць спакойна і разважліва, стрымана і абачліва, звяртаючы ўвагу на прынцыпова важныя дэталі і акалічнасці, спрабуючы патлумачыць нашым сучаснікам іх сэнс, характар, рытуальную неабходнасць. Справа гэта надзвычай складаная, таму што сённяшнія інфарматары (людзі 60—70 гадоў) вельмі рэдка даюць хоць якое-небудзь тлумачэнне, а часцей абыходзяцца адказам, які нічога не тлумачыць, а проста канстатуе: “так нашы дзяды рабілі”, “так мне маці наказвала”, “так мне бабуля гаварыла”. Такая катэгарычнасць часта прыводзіць да таго, што на вяселлі ці памінках раптам узнікае спрэчка паміж людзьмі з розных мясцін. Кожны даказвае сваё, але чаму менавіта яго пазіцыя больш дакладная, абгрунтавана патлумачыць не можа. У выніку атрымліваецца, што агрэсія вакол чысціні захавання традыцыі толькі аддаліць людзей, пасварыць іх, замест таго, каб зблізіць, паяднаць і памірыць.

У сувязі з гэтым паспрабуем зрабіць няспешны экскурс у гісторыю фарміравання цыкла пахавальна-памінальных абрадаў, разгледзім яго ўнутраную структуру, логіку паслядоўнага разгортвання, ролю кожнага ўдзельніка, месца і прызначэнне шматлікіх атрыбутаў, асаблівасці выканання таго ці іншага рытуальнага дзеяння, па магчымасці звяртаючы ўвагу на тлумачэнне сэнсу кожнага з аналізуемых фактараў.

Спадзяюся, што мае разважанні дапамогуць зразумець асаблівасці нашага этнічнага светасузірання і светаўспрымання, народнага менталітэту, а найперш, гарадскім чытачам спасцігнуць некаторыя таямніцы і законы беларускай традыцыйнай культуры, чым, мяркую, здымуць шматлікія канфліктныя сітуацыі і дадуць магчымасць убачыць абрад не як набор забабонаў, а як нейкую ісціну, якую спасціглі нашы продкі і перадалі нам як агульную каштоўнасць, якую нельга парушыць і зняважыць або проста здаць у музей.

Навукоўцы мінулага і сучасныя даследчыкі вылучаюць *у пахавальнай абраднасці некалькі ключавых момантаў*, якія канцэнтруюць вакол сябе асноўныя рытуальныя дзеянні, *якія*

*сімвалізуюць два паслядоўныя пераходы чалавека: ад жыцця да смерці і з гэтага (белага) свету ў "той" (замагільны).* Найбольш значнымі з іх з'яўляюцца наступныя:

сімвалічная вестка аб тым, што смерць можа напаткаць каго-небудзь з дамачадцаў;

перадсмяротны час: дзеянні, скіраваныя на аблягчэнне надыхода смерці;

смерць чалавека і рытуальныя дзеянні ў першую пасля-смяротную гадзіну;

абмыванне і пераапрананне нябожчыка, стаўленне да рэчаў, з якімі чалавек быў у перадсмяротны час;

родныя і блізкія, суседзі і аднавяскоўцы наведваюць нябожчыка, спецыяльны цыкл галашэнняў;

другі дзень пасля смерці: выраб труны, афармленне, перанос у яе нябожчыка;

трэці дзень пасля смерці: з раніцы да абеду трое мужчын капаюць магілу (дол, яму);

труну з нябожчыкам выносяць з хаты;

пахавальная працэсія рухаецца па дарозе ад хаты да могілак;

пахаванне: асаблівасці паводзін удзельнікаў рытуалу;

памінальны стол адразу пасля пахавання;

цыкл памінак да года, рэгламентацыя паводзін членаў сям'і.

Кожны з этапаў пахавальнага абраду мае мноства рэгіянальных асаблівасцей, якія ў розных кутках Беларусі ўспрымаюцца па-свойму. Наша задача — паспрабаваць у межах магчымага патлумачыць найбольш тыповыя для Беларусі звычаі і рытуалы, абрадавыя дзеянні і рэгламентацыі, забароны і прадпісанні.

Аднак перш чым распавесці гаворку пра структуру пахавальнага абраду, пра характар паводзін сваякоў, пра асаблівасці паводзін сям'і на працягу года, неабходна паспрабаваць хоць крыху наблізіцца да разумення той складанай і таямнічай з'явы, якая на працягу многіх тысячагоддзяў хавалася за словам Смерць.

Зварот да старажытных міфаў, шырокага кола вусна-паэтычных твораў нашага народа дае падставы сцвярджаць, што Смерць — гэта істота, якая стаіць у адным шэрагу з такімі ўплывовымі на жыццё чалавека з'явамі, як Лёс і Доля ("Доля ў яго такая" — казалі ў народзе пра таго, каму асабліва шчасціла або не шанцавала ў жыцці). Нараджаючыся на свет Божы, чалавек атрымлівае ад Творцы той ці іншы Лёс, шчаслівую або гаротную Долю, інакш кажучы — пэўны жыццёвы шлях, які ў часавым вымярэнні вызначаецца паняццем Век. Прычым трэба адзначыць, што жыццёвыя стасункі чалавека са сваім Лёсам маюць двухбаковы характар. З аднаго боку, людзі

перакананы: Лёс кожнага загадзя прадвызначаны. У сувязі з гэтым неабходна ўзгадаць, што ў народзе бытуе шэраг прыкмет-індыкатараў, па якіх можна было беспамылкова прадказаць Лёс нованароджанага. Напрыклад, пра тых, хто нарадзіўся "ў рубашцы", казалі: шчаслівы чалавек, шанцаваць усё жыццё будзе. Бабкі-павітухі сцвярджалі: калі адразу пасля нараджэння дзіця заплача — будзе доўга жыць, калі ж не, то век у яго будзе кароткі. Заўважалі: калі першы зуб у дзіцяці будзе расці знізу, то век будзе доўгім, калі ж зверху — памрэ яшчэ малым; калі народзіцца тварам уніз — доўга не пражыве.[1] Гэтаксама благой прыкметай было, калі ў час хрышчэння воск з уціснутымі ў яго валасамі, выстрыжанымі на пачатку свяшчэннадзейства, ападаў на дно купелі.[2]

Пэўная запраграміраванасць нашага Лёсу і асабліва яго абмежаванасць у часе гучыць у прыказках: "Круці не круці, а трэба ўмярці", "Ляжы не ляжы — уставаць трэба, жыві не жыві — паміраць трэба".

У сувязі з гэтым неабходна ўзгадаць пра існаванне народных казак, дзе адзначаецца, што "раней людзі ведалі дзень смерці". Казкі захавалі два варыянты вырашэння дадзенай праблемы ў народнай свядомасці. З аднаго боку, асаблівасці менталітэту, выхаванага на прынцыпе "круці не круці, а трэба ўмярці"[3], правакавалі скептыцызм у паводзінах апошняга часу зямнога існавання. Некалі Бог хадзіў па зямлі. Бачыць, як адзін мужык плот саломай гародзіць. На пытанне Бога аб незвычайнасці паводзін мужык адмахнуўся: "А ўсё роўна зімой паміраць". Пасля гэтага Бог пазбавіў чалавека празарлівасці, і ён перастаў ведаць дакладны дзень сваёй смерці. Адэкватнай стала і рэакцыя: "Паміраць збірайся, а жыта сей!"[4].

З другога боку, вядома легенда пра тое, як чалавек, даведаўшыся аб тым, што яго сын загіне ў калодзежы, узяў і забіў вечка дошкамі. Аднак у названы час хлопец падышоў да калодзежа, лёг на дошкі і тут жа сканаў.[5] Такая палярызацыя рашэнняў наводзіць на думку аб тым, што народная свядомасць настойліва шукала выйсце з сітуацыі бязвыхаднасці. І знайшла яго ў маральна-этычным асэнсаванні з'явы.

Існавала ціхае спадзяванне, што сваім жыццём (учынкамі, дабрынёй, дапамогай, спагадай) чалавек можа паўплываць на свой Лёс і заслужыць у Бога палёгку.

Пра аднаго памёршага скажуць: "Адгараваў дык адгараваў" або "Што памучыўся, то памучыўся". А пра другога, наадварот, з добрай доляй зайздрасці падсумуюць: "Гэта ж трэба, заслужыў у Бога лёгкую смерць".

Як толькі чалавек аджыве свой Век, тут жа па распараджэнню Лёсу заўсёды прыходзіць Смерць, яна з'яўляецца, каб

“выпусціць з чалавека дух”, каб “забраць яго душу”. Прычым выканальніца яна даволі адказная: адкруціцца, адкупіцца ад яе не дадзена нікому і ніколі.

І па народных уяўленнях, і ў адпаведнасці з хрысціянскім вучэннем Смерць не ёсць гранічная мяжа, за якой надыходзіць вечны разрыў. Традыцыі ўшанавання памёршых яскрава сведчаць, што ў свядомасці беларусаў пашырана меркаванне аб тым, што душа памёршага адлятае ў вы-*Рай* і там жыве вечна, дапамагаючы прадстаўнікам свайго Роду і ў цяжкую гадзіну, і ў час агульнарадавых святкаванняў.

Аднак у плане будзённым, безумоўна, Смерць успрымалася вялікім горам, якое парушала задумы і спадзяванні сям'і, разлучала закаханых людзей, рушыла падмуркі гаспадарскай справы. Аб усіх вырашальных і невырашальных праблемах, якія паўстаюць перад сям'ёй пасля смерці чалавека, вельмі праніклёна, эмацыянальна-ўзрушана гаворыцца ў безлічы галашэнняў, якія запісаны збіральнікамі народнай творчасці.[6]

Да філасофска-культуралагічнага разумення Смерці ў славянскай традыцыйнай культуры можна наблізіцца праз больш шырокі касмапланетарны кантэкст. Вядома, што ў фальклорнай паэтыцы важнае месца належыць асацыятыўнаму светаўспрыманню. Кожная з'ява духоўнага свету чалавека апрадмечана вонкавымі рэаліямі прыроднага асяроддзя. Дастаткова ўспомніць адзін з пашыраных сярод усходніх славян сюжэтаў пра царэўну-несмяяну. Яе ўнутраны стан: маркотнасць, сум, задуменнасць, якія ператварылі дзяўчыну ў скамянелую постаць, — самым непасрэдным чынам уплывае на наваколле.

Аналагічнымі матывамі напоўнены і іншыя сюжэты казак, жніўных і вясельных песень, шматлікіх балад. Маштабнасць і глыбіня асацыяцый пераканаўча сведчаць, што ў падсвядомасці традыцыйнай культуры духоўна (душэўна)-прыродныя (касмічныя) сувязі маюць архетыпічны статус.

Адштурхоўваючыся ад гэтага тэзіса можна сцвярджаць, што асэнсаванне сутнасці Смерці чалавека ў народнай свядомасці абапіралася на тыпалогію цыклічнасці прыродных з'яў. Так званы міф аб паміраючым і ўваскрасаючым дрэве задаваў рытм прыроднай стадыяльнасці не толькі цыклу каляндарнай абраднасці, але і цыклу пахавальна-памінальных рытуалаў. На жаль, даследаванні ў галіне каляндарнай абраднасці ў нас знаходзяцца пакуль што на стадыі эмпірыка-факталагічнага асэнсавання з жорсткім падзелам цыклаў у адпаведнасці з порамі года. Вывучэнне ў гэтым накірунку — неабходны і непазбежны этап у развіцці самой навукі ў цэлым і дадзенай праблемы ў прыватнасці. Такі падыход дазваляе падрабязна прааналізаваць паўнату абрадавай структуры, патлумачыць ло-

гіку яе развіцця, рэльефна ўявіць функцыі персанажаў. У некаторых выпадках з'яўляецца магчымасць выявіць амплітуду ваганняў у інтэнсіўнасці святочных падзей у пэўны прамежак часу, напрыклад у багатым цыкле веснавой абраднасці, асэнсаваць паслядоўнасць змен рытуальных прыярытэтаў у залежнасці ад моманту разгортвання святочнай дзеі, напрыклад абуджэнне ад зімовага сну прыроды было ўдзелам вiруючай моладзі, жніво распачынала і заканчвала ўвішная гаспадыня, і г.д.

Аднак такі падыход не дазваляе выйсці на ўзровень разумення агульных структурных узаемасувязей і асэнсаваць каляндар як цэласную сістэму сацыякультурных і прыроднакасмічных узаемных стасункаў.

Аналагічная сітуацыя склалася і ў даследаванні сямейнай абраднасці. Кожны з яе цыклаў вывучаны паасобку. А.К.Байбурын і Г.А.Левінтон даволі грунтоўна раскрылі тыпалогію вясельнай і пахавальнай абраднасці[7]. Наступным крокам у гэтым накірунку можа быць якраз спроба тыпалагічнага (параўнальнага) вывучэння ўсёй сямейна-радавой абраднасці (радзіны — вяселле — памінкі) і святаў народнага календара.

Ёсць два структураўтваральныя феномены, якія загадзя правакуюць пошук у гэтым накірунку. Па-першае, структура ўсіх сямейна-радавых рытуальна-абрадавых комплексаў (ад нараджэння дзіцяці і да першага пастрыгання валасоў роўна ў год; ад моманту пачатку вяселля і да моманту нараджэння дзіцяці; ад моманту смерці чалавека і да моманту заключнага памінальнага стала на ўгодкі) трымаецца на агульнавядомым рытме 0—3—9—40—1 год.

Пасля заканчэння першага гадавога цыкла гэты рытм пераходзіць у структуру народнага календара і захоўваецца ў ім як найважнейшы культуратворны фактар.

Калі для пачатку памінак характэрна лінейнасць, прычым рытм мае як бы псіхалагічную дамінанту: спярша шэсць дзён паміж жалобнымі сталамі, затым — трыццаць, далей — чатыры с паловай месяцы, то пасля года ўшанаванне памёршых пераходзіць у структуру каляндарнай абраднасці, ператвараючы лінейнасць у колавую замкнёнасць, менавіта замкнёнасць у сэнсе дакладнасці прымеркаванасці. На гэтую паўтаральнасць накладаецца спіральная лесвічка радаводнага ланцужка: адны пакаленні застаюцца па-за межамі актыўнай памяці (што далей за сёмае калена), а месца блізкага гарызонта займаюць толькі што сканаўшыя.

Веснавое і восеньскае ўшанаванне продкаў адбываецца *на дзевяты дзень пасля Вялікадня* і *ў трэцюю суботу пасля Пакроваў*. Па-другое, у гадавым колазвароце існуе шэраг пазіцый, якія накладваюць жорсткія абмежаванні на правядзенне,

напрыклад, вяселляў. Што ж тычыцца абрадаў, звязаных з пачаткам жыцця і яго заканчэннем, то ў дадзеным выпадку народны этыкет задае прынцыпова іншую парадыгму дзеяння: "Смерць і радзіны не выбіраюць гадзіны".

Паспрабуем хаця б у самым агульным выглядзе аднавіць структуру народнага календара і па магчымасці выявіць контрпункты тыпалагічнага рытму.

Традыцыйны год пачынаўся вясной, калі абуджалася прырода, а доўгачаканае цяпло (і святло — дзень хутка павялічваўся) неслі птушкі на сваіх крылах з вы-*Раю*. Днём прылёту птушак (у народзе казалі: 40 выр'яў дадому вернецца) лічыцца свята Саракі[8].

Фальклорных сведчанняў таму, што менавіта птушка з'яўляецца пасрэднікам паміж гэтым і "тым" светам даволі шмат:

а) у песнях-баладах дачка скідваецца зязюляй і прылятае з "чужой старонушкі" ў сад роднай матулі, прычым гэты сімвалічны код зразумелы абодвум бакам: маці па голасу зязюлі пазнае голас сваёй дачкі, якае сумуе па "татачкаваму двару";[9]

б) у казках герой ператвараецца ў птушак, уцякаючы ад сваіх праціўнікаў;

в) да гэтага часу бытуе павер'е: калі птушка моцна стукаецца ў акно, трэба чакаць кепскай весткі;

г) у чарадзейных казках тыпу "тры начы на магіле бацькі" жораў вытаптаў проса;[10]

д) бусел (бацян) прыносіць з вы-*Раю* новую душу нованароджанаму;

е) па легендзе менавіта буслу Бог уручыў мех з пачварамі і загадаў аднесці на край свету (існуе версія, што нёс чалавек, але за непаслухмянства Бог ператварыў яго ў бусла);[11]

ж) для абраду "гукання вясны" выпякаліся з цеста птушачкі, хлапчукі нанізвалі іх на пруцікі, залазілі на стрэхі і спявалі песню: "Жавароначкі, прыляціце, вясну-красную прынясіце";[12]

з) у шматлікіх казках царкоўна-хрысціянскай тэматыкі сустракаецца птушка голуб як увасабленне душы чалавека, а таксама Духа Божага (параўнайце з рускай прымаўкай: "Голубь — птица Божия");

і) кампазіцыю вясельнага каравая заканчвае пара галубоў — сімвал паяднання дзвюх маладых душ, прычым той узровень, які яны займаюць, пацвярджае распаўсюджанае меркаванне аб тым, што шлюбы ўтвараюцца на нябёсах, на зямлі толькі спраўляюць вяселле.

Такім чынам, *веснавыя песні* — не што іншае, як *сакральна-магічны дыялог з Творцам Сусвету*, зварот да яго з просьбай аднавіць жыццё, удыхнуць душу ў прыроду.

Прылёт птушак сімвалізаваў двухбаковасць рытуальнага

дыялогу і яго выніковасць. Гэты вузлавы момант календара дапамагае зразумець адзін з пластоў семантыкі міфалагемы Смерці як пасрэдніка паміж "тым" і гэтым светам. У выніку значна пашыраецца полісемантызм сімволікі птушкі. Яна можа быць увасабленнем здані Смерці, пераносячай душу ў прасторы Раю або Пекла, а можа і сама быць персаніфікацыяй душы, якая шукае прыстанішча вечнага спачыну.

Наступным колам ажыўлення прыроды было "ўваскрашэнне" дрэў (што ў міфапаэтычнай мадэлі свету адпавядае гарызонту чалавека), таму з такой пашанай ставіліся да вярбы, якая першай рэагавала на пацяпленне. Галінкі вярбы былі самым актыўным чынам уключаны ў рытуал святкавання Вербніцы (хаця, дарэчы, яна больш нідзе не згадваецца: ні ў абрадавых сітуацыях, ні ў гаспадарча-побытавым кантэксце, за выключэннем св. Юр'я, калі жанчыны выганялі кароў на пашу, сцёбаючы іх тымі ж асвечанымі галінкамі). Нарэшце, надыходзіла пара ажыўлення самой матухны-зямлі: нездарма менавіта з ёй былі звязаны шматлікія забароны і перасцярогі ў паводзінах чалавека. Нельга было плот гарадзіць да Радаўніцы (у іншых варыянтах да Благавешчання). Юрай адмыкаў зямлю і выпускаў расу. Хтанічны ("той") свет ажываў і з'яўляўся на свет Божы толькі пасля першага грому, калі зямля ачысціцца першым дажджом.

Затым літаральна праз кароткі тэрмін гэты працэс набываў адваротны накірунак, прычым захоўваючы тую ж паслядоўнасць. Як толькі Сонца паварочвала да сваёй смерці (адразу пасля Купалля), пачыналі заціхаць галасы птушак: першай пасля Пятра замаўкала зязюля, затым астатнія.

Адразу ж пасля Пятра (12.07) і асабліва пасля Іллі (2.08) дрэвы пачынаюць скідваць лістоту. І, нарэшце, на Узвіжанне адбудуцца "вужовыя вяселлі" і ўсе паўзучыя гады адправяцца ў падземнае царства Вялеса.[13]

Яго ўладанні адначасова з'яўляліся царствам мёртвых, спачыўшых продкаў. Дыялог з продкамі свайго роду таксама падпарадкоўваўся закону цыклічнасці: вясной жывыя прасілі ў іх дазволу на сельскагаспадарчыя работы, а ўвосень, калі ўраджай быў сабраны і захаваны на зіму, дзякавалі за дапамогу. Дарэчы, час ад Пакроваў і да Радаўніцы лічыўся перыядам забароны ўсялякіх работ на зямлі, яе нельга было трывожыць, каб не наклікаць бяды на сям'ю і гаспадарку ў наступным годзе. І так адбывалася штогод. Усё ў прыродзе нараджалася вясной, дасягала найвышэйшага росквіту ўлетку, затым наваколлем паступова авалодвала старасць — восень, якая ўрэшце рэшт саступала дарогу белай Смерці — зіме. Гэта цыклічнасць шматразова паўтаралася на вачах аднаго і таго ж пакалення,

што не магло не паўплываць на ўсведамленне Смерці як з'явы не гранічнай, за якой няма нічога, а наадварот, яна была толькі мяжой, пераходам у іншую прастору існавання.

Пры гэтым час набываў характар дыскрэтнасці, разарванасці або спыненасці. Зіма (Смерць) займала амаль палову гадавога цыкла. Наваколле пусцела: птушкі адляталі ў вырай, ніжэйшы свет знікаў у падземным царстве. Узнікала праблема са стаўленнем да паняцця прасторы. Інтэнсіўна асвоеная ўлетку, яна быццам разрэджвалася, а суб'екты яе заселенасці пераносіліся ў іншае месца. Час надоўга застываў у сваёй нерухомасці. Псіхалагічна гэтаму спрыялі прыродна-ландшафтныя фактары: кароткі зімовы дзень, тое, што большую частку сутак чалавек праводзіў у абмежаванай прасторы сялянскай хаты пры святле лучыны, займаючыся звычайнымі надзённымі справамі. Людзі пралі, ткалі, лянцавалі, валялі валёнкі, правілі хамуты... Застаючыся жывым, чалавек быў выключаны з кантэксту актыўнага сумеснага з прыродай дзеяння і тым самым быццам пераносіўся ў іншы свет, жыццёвыя каардынаты якога — час і прастора — набывалі асаблівасці іншага вымярэння, набліжаючыся да велічынь пазаземнай Вечнасці. Відаць, на гэтай глебе і ўзнікла хрысціянская дыхатамія душы і цела. Пасля смерці чалавека яго цела адпраўлялі ў падземнае царства, а душа адлятала ў вы-*Рай* ("за сёмае мора").

Успрыманне Смерці *як закончанасці зямнога цыкла і пераходу ў свет продкаў* перадумовіла (прадвызначыла) спакойнае, стрыманае стаўленне да яе з боку нашых папярэднікаў. Яны задоўга да гэтага пачыналі рыхтаваць сабе пахавальнае адзенне, якое практычна паўтарала святочнае ўпрыгожанне. Арнамент на адзенні выконваў ролю ідэнтыфікатара, з яго дапамогай даўно памёршыя продкі "пазнавалі" тых, хто трапляў у свет Вечнасці пазней. Можна дапусціць, што гэткім жа арнаментам павінны былі быць аздоблены (прамаркіраваны) рытуальныя ручнікі, на якіх труну з нябожчыкам апускалі ў магілу.

У 1998 годзе сродкі масавай інфармацыі зрабілі цікавае паведамленне. Сямігадовы хлопчык з Вялікабрытаніі апынуўся ў стане комы. Пасля таго як апрытомнеў, хлопчык расказваў сваім бацькам пра неверагодную рэч: "Я доўга ляцеў цёмным калідорам, у канцы якога было незвычайнай чысціні святло. Там стаялі мае бабуля і дзядуля, апранутыя ў..." — і хлопчык дакладна назваў адзенне, у якое чатыры гады таму апранулі памёршых родных. Дзівіцца б не было чаму, калі б не адна акалічнасць — трохгадовае дзіця не было на пахаванні.

Разуменне Смерці як міфалагічнай істоты дазваляе зразумець шырокае кола табуіраваных прадпісанняў, якіх абавязаны былі прытрымлівацца родныя памёршага. Напрыклад, звы-

чаёвае права забараняе да года пасля смерці суродзіча спраўляць вяселле; жонка, маці і сёстры не маглі на працягу трох год удзельнічаць у вясёлых святкаваннях, спяваць і танчыць. Пэўныя абмежаванні накладваліся на паводзіны цяжарнай жанчыны, а вяселле дзяўчыны-сіраты праводзілася па-іншаму сцэнарыю. Катэгарычна забаранялася ў дзень смерці каго-небудзь з аднавяскоўцаў што-небудзь садзіць або сеяць.

Разам з тым, у адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі, памёршы чалавек мог "забраць" з сабою тыя ці іншыя людскія беды, "дапамагчы" вылечыць вельмі цяжкія захворванні, напрыклад эпілепсію, і г.д.

## АПОШНІЯ ПЕРАДСМЯРОТНЫЯ ДЗЕЯННІ

Людская смерць бывае рознай: *лёгкай, хуткай* і *цяжкай.* Калі чалавек паміраў лёгкай смерцю, то гэта ўспрымалася як заслуга перад Богам сваімі зямнымі жыццёвымі ўчынкамі. Але бывала і інакш. Чалавек доўга пакутаваў, яго корчыла, ліхарадзіла, часам ён трызніў, страчваў прытомнасць, затым зноў прыходзіў у сябе. У такім выпадку прысутныя пачыналі, як маглі, дапамагаць канаючаму. Выконваліся спецыяльныя рытуальныя дзеянні, якія шмат у чым паўтаралі рытуалы, звязаныя з нараджэннем члавека. Паміраючаму развязвалі ўсе вузлы (пояс), расшпільвалі гузікі, размыкалі замкі, якія былі ў хаце, адчынялі юшку ("каб душа лягчэй пакінула цела і хату"), выбівалі верхняе палена над дзвярамі, адчынялі дзверы ў хаце і хляве, часам узрывалі дошкі ў століі (у апошнім выпадку заўважалі, што так мог сканаць толькі вядзьмак").[15]

Хрысціянская традыцыя ўнесла пэўныя дапаўненні ў пахавальны абрад. Адным з важнейшых атрыбутаў-спадарожнікаў з'яўляюцца свечкі. Часцей за ўсё ў рукі паміраючаму (а затым яны выкарыстоўваліся на жалобным стале) давалі "грамнічную" свечку (якую асвячалі ў храме 15 лютага, на Грамніцы, або Стрэчанне) або купленую ў царкве ў Чысты чацвер перад Вялікаднем. Лічылася, што свечка асвятляе шлях душы на "той" свет. У больш шырокім плане яна сімвалізавала старажытную традыцыю выкарыстання агню ў час пахавання. Агонь выконваў ролю ачышчальніка ўсяго зямнога, цялеснага. Ён канчаткова вызваляў душу ад матэрыяльнай абалонкі і ліквідаваў жыццёвыя грахі чалавека.

## МОМАНТ СМЕРЦІ

Калі чалавек доўга паміраў і раптам сціх, то каб канчаткова пераканацца "адляцела душа" ці не (дыхае ён ці ўжо пера-

стаў), да вуснаў прыкладвалі перавернутае ніц люстэрка, хвіліну трымалі, а затым глядзелі: калі яно затуманена парай ад дыхання, то пакуль што ўстрымліваліся ад усялякіх дзеянняў; калі ж паверхня была сухой, разумелі, што чалавек сканаў, і трэба было распачынаць неабходныя абрады.

Памёршаму закрывалі рот (калі ніжняя сківіца не трымалася, яе падвязвалі аборай), заплюшчвалі вочы (часам клалі на вочы медныя пятакі), "каб не ўцягнуў у сябе ці не выглядзеў каго з жывых".[16]

Акрамя таго, трэба было тут жа спыніць хатні насценны гадзіннік. Люстэрка завешвалася белай прасцінай, каб не паглядзелася душа сканаўшага і не "забрала" з сабой таго, хто апошнім у яго паглядзеўся. Калі ў гэты час гарэла ў печы, то агонь адразу залівалі вадой, а галавешкі выносілі з хаты (дарэчы, гэта быў адзіны выпадак, калі агонь тушылі прымусова). Калі ў хаце стаяла вядро з вадой, то яе вылівалі ў агарод. Піць ваду, у якой "купалася душа", паўсюдна забаранялася.[17]

## АБРАДЫ ПЕРШАЙ ПАСЛЯСМЯРОТНАЙ ГАДЗІНЫ

Канстатацыя факта смерці прынцыпова змяняла характар паводзін радні памёршага. З гэтага моманту яна быццам пераходзіла ў разрад пасіўных сузіральнікаў, але ніяк не актыўных удзельнікаў. Адназначна патлумачыць змены наўрад ці магчыма. Напаткаўшае гора патрабавала выплакацца, засяродзіцца, каб асэнсаваць тое, што здарылася, таму самая блізкая радня павінна была пастаянна заставацца каля нябожчыка. А з другога боку, нябожчык, па ўяўленнях продкаў, лічыўся небяспечнай істотай, якая магла нашкодзіць застаўшымся ў жывых. Магчыма таму на пярэдні план разгортваемага рытуальнага дзеяння выходзіла самая старэйшая частка радні або аднавяскоўцаў. Практычна ва ўсіх этапах пахавання і правядзення памінальнага стала катэгарычна забаранялася прымаць удзел цяжарнай жанчыне.

Перад тым як распачынаць гаворку пра парадак выканання ўсіх этапаў пахавальнага абраду, неабходна звярнуць увагу на адну вельмі важную акалічнасць. Пахавальны абрад меў у сваім развіцці *тры ключавыя моманты*, якія шмат у чым прадвызначалі псіхалагізм усяго дзеяння: момант смерці чалавека, момант вынасу нябожчыка з хаты і момант апускання труны ў магілу. У эмацыянальным плане гэта былі самыя цяжкія этапы развітання (з жыццём, з хатай, у якой жыў чалавек, з белым светам), яны патрабавалі ад кожнага члена сям'і мужнасці, вытрымкі, самавалодання, узаемападтрымкі. У гэты час людзі найбольш эмацыянальныя не здольны былі кантра-

лявацъ свае паводзіны, ды і прынцыпы народнага этыкету патрабавалі ад жанчыны і плакаць, і галасіць, і слёзы ліць, іначай, лічылася, яна не паважае Род і не любіць памёршага.

Усе гэтыя акалічнасці, відаць, паўплывалі на агульны псіхалагізм разгортвання абраду. Ён набыў дакладную рытмічнасць, прычым спачатку амплітуда рытму чаргавалася ў межах адной-дзвюх гадзін, затым перыяд пашыраўся (павялічваўся). *У аснове чаргавання ляжала змена дзеяння і слова.*[18] Прынцыпова можна сказаць, што адно не столькі ўзаемадапаўняла другое, колькі, наадварот, выключала яго. Гэту рытмічную абрадава-слоўную зменлівасць можна праілюстраваць прыкладна такой схемай:

| 1 → | 2 → | 3 → | 4 → |
|---|---|---|---|
| *дзеянне:*<br>перадсмяротны час | *галашэнне:*<br>1 гадзіна, пакуль нябожчык астыне | *дзеянне:*<br>абмыванне, пераапрананне | *галашэнне:*<br>падчас наведвання суседзямі і раднёй |
| **5 →** | **6 →** | **7 →** | **8 →** |
| *дзеянне:*<br>перанос нябожчыка ў труну | *галашэнне:*<br>«А які ж табе дамок змайстравалі...» | *дзеянне:*<br>вынас нябожчыка з хаты | *галашэнне:*<br>развітанне з домам |
| **9 →** | **10 →** | **11 →** | **12 →** |
| *дзеянне:*<br>працэсія ідзе на могілкі | *галашэнне:*<br>развітанне радні | *дзеянне:*<br>труну апускаюць у магілу, чужыя кідаюць жменьку зямлі | *галашэнне:*<br>над магілай |
| **13 →** | **14 →** | **15 →** | **16 →** |
| *дзеянне:*<br>вяртанне ўдзельнікаў пахавання дадому, мыццё рук перад парогам хаты | *галашэнне, малітва:*<br>на пачатку жалобнага стала | *дзеянне:*<br>жалобны стол (трэба пакаштаваць усе рытуальныя стравы, выпіць тры чаркі гарэлкі) | *малітва:*<br>на заканчэнні памінальнага стала, развітанне |

Гэты рытм дапамагаў захоўваць псіхалагічную раўнавагу і не дапускаў празмерных стрэсавых зрываў. Галашэнне было своеасаблівай эмацыянальнай разрадкай. Яшчэ і сёння можна пачуць, як старэйшыя суцішаюць каго-небудзь з блізкай радні: "Паплач, паплач, на душы лягчэй будзе".

Такім чынам, логіка прапанаванай схемы паказвае, што адразу ж пасля канстатацыі факта смерці ніякіх рытуальных дзеянняў не адбывалася. Нехта з жанчын (маці, жонка, дачка) выбягалі ў двор і пачыналі моцна галасіць — па вёсцы разляталася жалобная абвестка: нехта памёр.

Нябожчыка адразу не чапалі: "Трэба, каб паляжаў, астыў". (Гэтыя ж словы гавораць пра ложак, на якім мы спім. Адразу, пасля таго як прачнуліся і ўсталі, прыбіраць яго нельга: "Трэба, каб астыў".)

Тым часам распальвалі ў печы (тонкія дровы клалі на сухую салому), бо трэба было хутка нагрэць чыгун вады, у якой затым мылі сканаўшага. Пакуль усё гэта рабілася, нехта з мужчын хадзіў прасіць кабет, каб прыйшлі памыць памёршага. Звычайна ў кожнай вёсцы гэта былі адны і тыя ж жанчыны, як правіла, сталага веку, часцей удовы. Ні адна з іх не мела права адмовіцца ад запрашэння. Не дазвалялася прымаць удзел у гэтай працэдуры жанчынам, якія яшчэ маглі нарадзіць.

Абмыванне сканаўшага распачыналі недзе праз гадзіну-паўтары. Нябожчыка клалі на падлогу, часам засланую саломай, распраналі, калі нешта перашкаджала, то вопратку або бялізну разрывалі. Абмывалі ў драўляных ночвах. У час гэтай працэдуры ў хаце забаранялася каму-небудзь прысутнічаць, асабліва дзецям і моладзі. Лічылася, што Смерць на працягу трох дзён не можа забраць з хаты душу, таму баяліся, каб хто-небудзь з прысутных у хуткім часе не загінуў.[19]

Вада, у якой мылі нябожчыка, лічылася небяспечнай для жывых (параўнайце, у казках "мёртвая" вада наносіць шкоду жывому чалавеку). Прычыны такога стаўлення былі розныя, а тлумачэнні іх мелі як міфалагічны, так і ўласна гігіенічны характар. Чалавек мог памерці ў выніку цяжкага інфекцыйнага захворвання, таму трэба было іншых членаў сям'і перасцерагчы ад новай бяды. Акрамя таго, вада была асноўным ачышчальным сродкам, прымала на сябе адмоўную энергетыку сканаўшага, а значыць сама магла набываць сілу энергавампіра і тым самым нанесці шкоду. Жанчыны імкнуліся выліваць ваду куды-небудзь за хлеў, у адстойнік з тым разлікам, што на гэтае месца да года не ступіць нага жывога чалавека.[20] Ночвы, у якіх мылі цела нябожчыка, нідзе ў гаспадарцы не выкарыстоўваліся. Рэкамендуецца адзенне, у якім памёр чалавек, а таксама прасціну, на якой ён ляжаў або ўкры-

ваўся, спаліць. Усімі астатнімі рэчамі памёршага можна было карыстацца толькі праз 40 дзён пасля смерці.[21]

## ПЕРААПРАНАННЕ ПАМЁРШАГА

Агульнае ўспрыманне смерці як з'явы, якая *пераносіць* чалавека *ў прастору і час* зусім іншага вымярэння — Бясконцасць і Вечнасць, перадумовіла неабходнасць і вызначыла асаблівасці рытуальнага пераапранання нябожчыка адразу ж пасля абмывання ў новае адзенне. Яно практычна заўсёды рыхтавалася загадзя і ляжала ў куфры побач з іншым святочным адзеннем. На большай тэрыторыі рассялення беларусаў лічылася, што адзенне павінна быць "*новае*", ніводнага разу "не адзяванае". Аднак асобныя глыбока веруючыя людзі прытрымліваліся іншай думкі: яны *апраналі падрыхтаванае "на смерць" адзенне і адзін раз у* вялікае прыстольнае *свята хадзілі ў ім у храм* на набажэнства, г.зн. адзенне як бы праходзіла абрад ачышчэння і рытуальнага асвячэння, набывала адпаведны статус перад падарожжам у Вечнасць.

У шматлікіх падання і легендах, чарадзейных казках і замовах можна знайсці апісанне "таго" свету (так яно ці не так, сказаць цяжка, бо вядома ж, што "адтуль яшчэ ніхто не вяртаўся"). Зразумела, калі ніхто "адтуль" не вяртаўся, то чалавек "мадэліраваў" яго такім, у якім жыў сам, толькі "*свет там быў ярчэйшы, лес зелянейшы і вада празрысцей*".

Прынцыповая тоеснасць характарыстык "таго" і гэтага свету абумовіла падабенства ўпрыгожання нябожчыка звычайнаму святочнаму ўбранству чалавека, які збіраецца на агульнарадавое свята. Адрозненні былі толькі ў арнаментальным аздабленні асобных частак адзення.

Але ж здараліся і непрадбачныя сітуацыі. Нехта мог выпадкова загінуць, нечакана цяжка захварэць або ўтапіцца і г.д. У такім выпадку ішлі па дапамогу да суседзяў, сваёй радні: нехта пазычыць кашулю, іншы штаны. Звычайна ніхто і ніколі не адмаўляўся, бо існавала павер'е, што памёршы "з таго свету шкодзіць будзе, нават гаспадарку звесці можа". Цікава адзначыць, што *палатно для адзення не рэзалі, а рвалі рукамі, а калі сшывалі, то іголку трымалі толькі "ад сябе" і нітку ніколі не адрывалі, а проста разрывалі каля іголкі і пакідалі "хвост"*.

Адзенне мужчыны было простым і звычайным: спачатку споднее ("каб холадна не было", "ён любіў цёпла апранацца"), паверх чыстую адбеленую палатняную сарочку, такія ж белыя штаны; на ногі адзявалі панчохі або абкручвалі невялічкай

полкай накшталт анучы. Зверху — чорныя каленкоравыя чаравікі або звычайныя лыкавыя лапці. Цікава, што жывыя мужчыны закручвалі анучы вакол нагі злева направа, а вось памёршаму, наадварот — справа налева.

Адзначым і такую важную акалічнасць: да канчатковага фарміравання рытуальнага адзення заўсёды ставіліся з вялікай адказнасцю, непарушна прытрымліваючыся дзедаўскай "завядзёнкі" — апрануць або пакласці побач усё тое, з чым чалавек не развітваўся пры жыцці. Прычым нават сёння шмат хто перакананы, што розныя здарэнні або няшчасці, якія могуць напаткаць сям'ю пасля смерці чалавека, — гэта вынік дапушчаных парушэнняў падчас пераапранання або пахавання. Узрушаныя жанчыны часам пытаюцца: што рабіць? Пахавала мужа, а партсігар не палажыла. Цяпер кожны дзень сніцца і дакарае, што, маўляў, "цыгарэт пашкадавала".

Таму адзенне перад падарожжам на "той" свет было дэталёва прадуманым. Абавязкова побач з галавой клалі шапку, пад пояс (які, дарэчы, не завязвалі вузлом, а проста канец падтыкалі пад апаяску) падкладвалі ручнік-уціральнік, канцы якога павінны былі быць незарубленымі. Да пояса мацавалі кісет з махоркай, у рукі давалі невялічкую насовачку, збоку клалі грэбень.[22]

І яшчэ адна дэталь. У старадаўнія часы рукі памёршага клалі крыж-накрыж, прычым у мужчын зверху была правая рука, у жанчын — левая. Хрысціянскі ўплыў некалькі перайначыў гэту традыцыю. Зараз правую руку кладуць зверху ўсім праваслаўным верніка, а таму, хто лічыў сябе каталікам (і мужчынам, і жанчынам), левую.

Як адзначаюць даследчыкі, у адзенні жанчыны пераважаў белы колер. Гэта зусім не выпадкова, таму што з даўніх часоў у славянскіх народаў менавіта белы колер быў сімвалам смерці (можна спаслацца на некаторыя фразеалагічныя звароты, сэнс якіх непасрэдна тычыцца разглядаемай тэмы: спужаўся так, што аж пабялеў; стаў белы як смерць; бачыў я цябе ў труне ў белых шкарпэтках; белая з касою ўсю ноч пад акном хадзіла; і г.д.). Дарэчы, да нашых дзён на Украіне і ў некаторых раёнах Магілёўскай вобласці захаваўся звычай: людзі, якія ідуць "адведаць" памёршага або збіраюцца на жалобны стол, павязваюць на левую руку белую хусцінку ці навалочку. Звычай апранацца ў чорнае з'явіўся пад уплывам хрысціянска-манастырскай традыцыі, але найбольш шырока распаўсюдзіўся ў пасляваенны час пад уплывам тых глыбока драматычных падзей, якія не абмінулі ніводную беларускую сям'ю.

Звычайна жанчыну апраналі ў светлую палатняную кашулю, тоўстую, у шмат складак спадніцу або андарак.[23] У даваен-

ны час жанчыне-нябожчыцы павязвалі расшыты старажытнымі ўзорамі фартух, які трымаўся на спецыяльным поясе. А вось галаву павязвалі трохметровай наміткай, канцы якой былі чырвонымі і закрывалі скроні памёршай. На ногі абавязкова адзявалі суконныя панчохі ці шкарпэткі.

З гэтай традыцыйна знаёмай сітуацыі вылучалася смерць незамужняй дзяўчыны. Яе апраналі, як нявесту перад вянчаннем: вянок з жывых ці засушаных кветак, вэлюм, падвянечнае плацце.[24]

На шыю нябожчыку вешалі крыжык на марлевай нітцы, у руку давалі невялічкія абразкі.

Пасля гэтага пачыналі рыхтаваць спецыяльнае пасмяротнае ложа, на якім нябожчык звычайна знаходзіўся, пакуль мужчыны не зробяць труну — калыску Вечнага спачыну — або човен, які павінен будзе перавезці сканаўшага праз раку часу ў "той" свет, дзе ён (час) не "цячэ" з мінулага ў будучыню, а існуе нерухома, статычна.

Пасмяротнае ложа ладзілі на лаве на покуці: калі паміраў мужчына, яго клалі на лаву справа ад абразоў, жанчыну — злева, г.зн. уздоўж сцяны ад вуліцы. Пад галаву клалі звычайную падушку, зверху накрывалі тонкім белым палатном, пазней марляй, гардзінамі. Рукі і ногі перавязвалі аборкай або бінтам. У народзе існуе глыбокая перакананасць, што гэтыя "перавяслы" набываюць лекавыя здольнасці[25].

Пакуль выконваўся комплекс падрыхтоўчых рытуалаў і пакуль нябожчык суцішна не займе месца пад абразамі, у хаце захоўвалася "мёртвая" цішыня. Але як толькі падрыхтоўка будзе скончана, уся прастора хаты напаўнялася тужліва-надрыўным галашэннем:

А дубочак ты мой зялёненькі,
А бярозка мая кудравая,
А ці ветры ж цябе падвеялі,
А ці ж буры цябе падламілі?
А супражачак мой міленькі,
А куды ж гэта ты прыбраўся,
А нашто ж ты мяне пакінуў?
А да каго ж я цяпер прыхінуся:
Няма ў мяне нікога роднага!..[26]

Як бачна з тэксту, галашэнне — з'ява ў вуснай паэзіі беларусаў даволі своеасаблівая і патрабуе асобнага падрабязнага разгляду. Тут жа заўважым толькі, што ў прыведзеным прыкладзе (а ён тыповы, універсальны для розных рэгіёнаў пражывання беларусаў) арганічна зліваюцца дзве паэтычныя плыні: з аднаго боку, агульнафальклорная паэтыка са сваімі ўстойлівымі сінонімамі, метафарамі, вобразамі, з другога — моцны

імправізацыйны пачатак: гора кожнага ўспрымалася і перажывалася па-свойму. Даўно зазначана: шчаслівыя людзі падобныя адзін да аднаго, гора ў кожнага сваё.

Кожны новы госць, які пераступіў парог хаты, сустракаўся ўсплескам эмоцый, чарговым галашэннем, сюжэтная канва якога магла паўтарацца, а магла мець непасрэдную сувязь з жыццёвымі перасячэннямі сканаўшага і зайшоўшага ў хату госця.

## РЭГЛАМЕНТАЦЫЯ КАНТАКТАЎ ЖЫВЫХ З ПАМЁРШЫМ

Адным з найцікавейшых аспектаў пахавальнага абраду з'яўляецца стаўленне да памёршага з боку жывых на працягу таго часу, пакуль ён знаходзіцца ў пакоі і ляжыць у труне. Здавалася б, асноўныя абрадавыя дзеянні пачатковага этапа выкананы,прайшоў першы эмацыянальны ўсплеск, сітуацыя пэўным чынам стабілізуецца і пераходзіць у рэчышча павольнага трохдзённага асэнсавання таго, што адбылося (або здарылася). Аднак гэты спакой даволі зманлівы, перш за ўсё знешне. Унутрана ён перапоўнены псіхалагічным дынамізмам і патэнцыяльнай магчымасцю эмацыянальнага выбуху ў любую хвіліну. Дастаткова было пераступіць парог хаты каму-небудзь з аднавяскоўцаў або з далёкай радні, як уся жыллёвая прастора імгненна поўнілася галашэннямі, енкамі, лямантам, кароткімі воклічамі, хліпаннем.

Разам з тым за гэтым знешнім праяўленнем абрадавых паводзін існаваў яшчэ адзін рытуальны кантэкст, які па ступені сваёй значнасці, магчыма, пераўзыходзіў кантэкст эмацыянальна-побытавы. Маецца на ўвазе глыбінны пласт сакральна-магічных ведаў, пра якія не гаварылі ўслых, але за ступенню валодання якіх усе прысутныя сачылі літаральна на кожным кроку. Прычым уважлівымі павінны былі быць два бакі: і тыя, хто знаходзіўся ў памяшканні, і тыя, хто прыходзіў у хату. Веды гэтыя, як сцвярджаюць навукоўцы, былі звязаны з магіяй у дзвюх яе выявах — белай і чорнай.

На жаль, у савецкія часы гэтай праблемай ніхто прафесійна не займаўся. А ўсебаковае яе вывучэнне адкрыла б, безумоўна, надзвычай цікавыя бакі нашай самасвядомасці і этнічнага светасузірання. Прычым часам можна сутыкнуцца з супрацьлеглым стаўленнем да гэтай праблемы як з боку інфарматараў, так і навукоўцаў. Адны перакананы, што пытанне падлягае шырокаму гісторыка-культурнаму і этыка-псіхалагічнаму даследаванню, іншыя проста адмахваюцца, сцвярджаючы, што ўсё гэта плады хваравітага мыслення.

Думаецца, што, як заўсёды, ісціна знаходзіцца паміж двума берагамі. Пра тое, што за ўсім гэтым "нешта ёсць", сведчыць людская памяць, якая з пакалення ў пакаленне перадае сакральныя веды. А вось для таго, каб пад іх падвесці надзейную навуковую (?) базу, неабходны шматгадовыя назіранні, сацыялагічныя зрэзы, аналіз пахавальных сітуацый і прасочванне дзейнасці пэўнага архетыпічнага, міфалагічнага ці псіхалагічнага модуля, які абавязкова (?) спрацоўвае, калі рытуал выкананы: а) з захаваннем усіх патрабаванняў; б) з рознай ступенню адхіленняў, з парушэннямі.

Напрыклад, неаднаразова даводзілася чуць: калі памёр малады мужчына, то апошні гузік у кашулі (або гальштук у сучасным варыянце) не зашпільвалі. Гэтым самым усім прысутным давалі зразумець, што сям'я памёршага не супраць, каб нявестка хутка выйшла замуж другі раз.[27] Мне расказвалі пра такі выпадак. Жанчыны, якія мылі і пераапраналі нябожчыка, пакінулі гальштук не зацiснутым, а прыспушчаным. Маці нябожчыка "прачытала" сітуатыўны кантэкст і вырашыла яго падправіць: яна туга зацiснула гальштук. Кажуць: дзесяць год вакол удавы "хлопцы гужам ходзяць, але да вяселля справа не даходзіць".

Існуе перакананне, што чалавек, які прыйшоў "адведаць" памёршага, абавязкова павінен спачатку паглядзець на ногі, а затым ужо на твар, інакш ён можа цяжка і надоўга захварэць.[28]

Народная лекарка Ф.А.Бондарава расказвала, што яна раіць цяжка хворым людзям падчас наведвання сканаўшага ўзяцца рукамі за яго ногі і пра сябе папрасіць: "Ты пайшоў, забяры з сабой мае хваробы", — і вы вельмі хутка адчуеце палёгку. За ногі нябожчыка раілі патрымацца і таму, хто ўвогуле баяўся кантакту з памёршым. Мне неаднаразова даводзілася чуць, як бабулі падказвалі сваім унучкам: "Дзіцятка маё, ты ж толькі на пераносіцу не глядзі". Магчыма, гаворка ідзе пра трэцяе — духоўнае — вока чалавека.

## "МОЙ ТАТКА-САЛАВЕЙКА, ПРЫЛЯЦІ РАНЕНЬКА!"

Спецыфічнай рысай беларускага пахавальнага абраду з'яўляецца актыўнае выкарыстанне ў ім аднаго з самых незвычайных жанраў вуснай паэзіі — галашэнняў. Паэзія плачу, паэзія жальбы, паэзія душэўнага паратунку, бадай што, самая загадкавая, самая таямнічая і складаная ў плане псіхалагічнага ўспрымання. Дзіўны наш народ, а яшчэ больш дзіўная і незразумелая яго душа: шчасце і радасць — плача, гора на-

паткае, бяда ў аконную шыбу пазірае — зноў-такі плача. Але плач гэты ў найвышэйшай ступені непаўторны, утрапёны, шчырым паэтычным радком выпеставаны.

У матулі памерла дачка. Здавалася б, жаночае сэрца ніколі не вытрымае такога Боскага выпрабавання, здранцвее, скамянее. Аднак яна, гэта душа, не пакрыўдзіцца на Бога, не паскардзіцца на лёс, а толькі маркотна, быццам саромеючыся за тое, што прысутных ад спраў будзённых адарвала, загалосіць:

Дачушка мая любая!..
А зрабіла мне вяселейка пячальнае.
Нашы песні невясёлыя,
Нашы песні маркотныя,
А ні музыкі не іграюць,
А ні дзевачкі не скачуць,
А ўся наша бяседанька
Слёзкамі ўмываецца.[29]

*У структуры* беларускага *пахавальнага абраду* вылучаюцца *тры* найбольш *экспрэсійна-эмацыянальныя моманты*, калі без галашэнняў проста не абысціся. Гэта бывае ў той час, калі труну з нябожчыкам выносяць з хаты, калі надыходзіць момант апошняга развітання з памерлым, калі труну апускаюць у магілу.

Пераканаш, што жахлівую страту кожная сям'я, кожны чалавек перажывае па-свойму. У імгненне вока рвуцца ўстойлівыя сямейныя сувязі, адносіны, парушаецца здаўна заведзены рытм-цыкл гаспадарчых клопатаў. Галашэнне ў такім разе выконвае даволі незвычайную ролю. Часам яно ператвараецца ў высокамастацкі паэтычны шэдэўр, словы якога — быццам просьба-малітва прачнуцца, апрытомнець, устаць і надалей заставацца з роднай сям'ёй; быццам малітва-прашэнне да Творцы Сусвету пачакаць, не забіраць душу ў прасторы Космасу, удалеч Вечнасці. Часам плач гучыць як прашэнне прабачэння за недасказаныя словы кахання, павагі, шанавання і адначасова як пафасная ацэнка яго ўменняў і гаспадарлівасці, пры гэтым кожны з прысутных ужо разумеў, што змест галашэння скіраваны не толькі ў мінулае (як гэта было), але адначасова і ў будучыню (гэтага ўжо ніколі не будзе):

Мой жа гаспадарочак,
мой жа ты сакалочак!
А ты ж, бывала, куды паедзеш,
ты ж у мяне рупішся,
Як і ў двор паспець і
там дзела супаўняюць;
Ты ж, бывала, у поле паедзеш —
і ў двор рупішся,

Каб і копку прывезць, і ў гумно
паглядзець, —
Каб жа мне выжняяць, каб і змалаціць,
І ў поле паспець — пасеяць і запахаць.[30]

Прычым зафіксаваныя збіральнікамі тэксты сведчаць пра тое, што жанчына, якая страціла мужа-гаспадара і па-свойму перажывае гора, ці то свядома, ці то падсвядома абапіраецца ў сваёй бядзе-галашэнні на агульнафальклорныя паэтычныя знаходкі: "гаспадарочак-сакалочак", "адлятаеш галубчык-пралесачка", "ручкі мае любыя і мілыя, ручкі мае дарагія, а нараболіся ж вы, ручачкі", "кармілец мой — краснае сонца".

Часам можна сустрэць зусім нечаканыя галашэнні, якія поўняцца паэтычнымі радкамі, быццам запазычанымі з любоўнай лірыкі ці больш пазнейшых па часе ўзнікнення гарадскіх рамансаў. Магчыма, яно так і было: жанчына-спявачка, якая ведала не адзін дзесятак абрадавых ці пазаабрадавых песень (асабліва мінорных па гучанні або, як у народзе казалі, "жаласлівых"), тут жа імправізавала найбольш тыповымі рыфмамі, удала дапаўняючы адным-двума слоўцамі, каб сюжэт галашэння адпавядаў той падзеі, якая напаткала сям'ю:

А мой жа ты галубок!
А мой жа ты сакалок!
Чаму ж ты мяне пакінуў?
Без цябе мне свет загінуў.
Учора ж ты касіў, араў —
А сёння ўжо бараду задраў.[31]

Тыя ж трапныя паэтычныя параўнанні можна пачуць і ў галашэннях дзяцей па бацьку:

А сягоння ляжыш, сівы галубочак,
І не даеш савету ні мамцы —
сваёй галубцы, ні нам.
Мамка-галубка сядзіць каля
свайго галубка
І кліча цябе.[32]

Чытаючы прыведзеныя прыклады галашэнняў і звяртаючы ўвагу на, здавалася б, часам не адпаведны сітуацыі паэтычны стыль, трэба мець на ўвазе адну вельмі істотную акалічнасць, веданне якой адразу здымае ўсе непаразуменні. Справа ў тым, што ў народнай культуры існавала жорсткае табу ў рытуальнай сітуацыі называць рэчы сваімі імёнамі. Узгадайце, як кадзіруецца рытуал сватання ў вясельным абрадзе, як бабуля, якая праводзіла першае рытуальнае купанне дзіцяці, пазбягала называць немаўля яго імем. Гэтаксама было і *ў па-*

*хавальным абрадзе: кожнае дзеянне мела свой паэтычны код фіксацыі.*

Асабліва высокай ступенню метафарызацыі вылучаліся галашэнні, якія суправаджалі рытуал пераносу нябожчыка ў труну. Найбольш пашыраная на Беларусі назва — дамавіна. Сэнс даволі празрысты — дом, домік для вечнага спачыну. На першы погляд быццам бы той самы дом, у якім жыццё цепліцца, і разам з тым — не той:

Ужо, мой браток, кажуць
                    табе зрабілі домік,
Я пайду пагляджу і скажу табе, які ён...
Вот схадзіла я, брацік, і паглядзела:
Вельмі зверху харошы,
                    хараша ўбраны,
Але я пабачыла ўсярэдзіне —
                    так страшна:
Ні аднаго акенца, ні дзвярэй, цёмна...[33]

Мне ўжо даводзілася пісаць пра тое, што ў пахавальнай абраднасці ўсё рабілася як бы наадварот у параўнанні з вяселлем. Гэта "перавернутасць" надзвычай вобразна сканцэнтравана і ў некаторых галашэннях:

Збудавалі табе свяцёлачку
Цёмную, нявідную...
Няма ні дзвярэй, ні ваконачак,
Што не зайдзе ясна сонейка,
Ні ветрык не павее,
Ні дожджык не зайдзе!..[34]

Бадай што найбольшай эмацыянальнасцю і драматызмам вылучаецца заключны этап пахавальнага абраду, які ахопліваў дзеянні, звязаныя з вынасам нябожчыка з хаты, шляхам на могілкі і апусканнем труны ў магілу. Гэта быў апошні зямны шлях чалавека, які ён пераадольваў ужо не сам, а з дапамогай усяе радні, суседзяў, знаёмых. Дарога была ў адзін бок, беззваротнай, таму ў галашэннях яе часта называлі "паследняя дарога", "сабраўся ты ў вялікую дарогу". А вяла яна ў "далёкую старонaчку", у "чужу-дальнюю старонушку".

А тым часам душа памерлага адлятала ў вырай, таму ў галашэннях яе параўноўваюць з птушкай: зязюляй, голубам, салаўём, лябёдачкай, ластаўкай, сокалам. І гэтыя вобразныя параўнанні маюць "перавернуты" характар. Калі ў абрадавых песнях пераважаюць матывы хуткага вяртання птушак з выраю, то ў галашэннях гэты матыў адсутнічае — шляху назад ужо ніколі не будзе: "Мая галубачка, мая ластачка, мая залётная. Лябёдачка мая беленькая! Зязюлька мая, кукушачка! Ад

мяне адлятаеш", "Сокал ты наш ясны, сокал ты наш мілы, куды ж ты далёка ад нас адлятаеш?", "А тыж маё дзіцятачка, палясцела ў выр навекі".

Гэта цяпер, пакуль боль данімае аголеным нервам, страта ўяўляецца беззваротнай і канчатковай. Крыху пазней, калі боль суцішыцца, "дыялог" з памерлымі набудзе іншы характар, "апрадмеціцца" ў іншых варунках, праз штогоднія "сустрэчы" на могілках на Радаўніцу і праз "запрашэнне" дадому на Восеньскія Дзяды.

## АПОШНЯЯ НОЧ У РОДНАЙ ХАЦЕ

Прыйдзецца, як тэй зязюльцы,
Кукаваць па свету лятаючы.

*З народнага галашэння*

Народная традыцыя патрабавала, каб памёршага хавалі толькі на трэція суткі. Якая таямніца Вечнасці прыхавана менавіта за такім часам пераходу чалавека з гэтага свету ў "той", якім зместам павінны быць напоўнены абрады развітання з нябожчыкам з боку сям'і, радні і проста аднавяскоўцаў, якімі патрабаваннямі рэгламентаваліся паводзіны суродзічаў у светлую частку сутак і ўначы? Пытанням няма канца, але не заўсёды на іх маюцца адказы. Вядома толькі адно: пахаванне на трэці дзень адбывалася ў многіх народаў свету незалежна ад іх веравызнання. Тады становіцца зразумелым, што ў дадзеным выпадку мы маем справу з касмічнай сузалежнасцю і перш за ўсё з пэўным цыклам энергетычнага абмену паміж пры-*Род*-ай, *Род*-ам чалавечым і касмічным вы-*Раем*.

На аснове адпрыроднага універсальнага трохдзённага цыкла чалавечага развітання са светам жывых сфарміраваўся і біблейскі пастулат аб тым, што цела Ісуса Хрыста знікла з людскіх вачэй на трэці дзень пасля смерці. Таму калі на абшарах славянскага рассялення стала пашырацца хрысціянская традыцыя, то гэта і некаторыя іншыя універсаліі сацыякультурнага і псіхафізіялагічнага кшталту спрыялі больш хуткаму збліжэнню дзвюх культур.

Калі адразу ж пасля смерці чалавека вестку аб напаткаўшай сям'ю бядзе па наваколлі неслі жаночыя галашэнні, то на другі і трэці дзень гэта былі спецыяльныя знакі: у адным выпадку — ручнік, павешаны на акно ад вуліцы, у другім — чорныя харугвы, якія ставіліся да сцяны з боку вуліцы. Любы вясковец, госць здалёку або "боскія людзі" (жабракі, пагарэльцы, калекі), якія траплялі ў гэты населены пункт, адразу ж

бачылі знак бяды і ніколі не прамінаді той хаты, заходзілі хоць на хвілінку пастаяць каля памёршага, паспачуваць сям'і.

Да нашых дзён лічыцца абавязковым "адведаць" сканаўшага дома, а затым правесці за вёску пахавальную працэсію. Гэта этыкетнае прадпісанне тычылася нават тых сваякоў або аднавяскоўцаў, з якімі нябожчык быў не ў прыязных адносінах.

Кожны, хто пераступаў парог хаты, падыходзіў да памёршага і садзіўся каля яго на лаву. Абавязкова трэба было ціхенька памаліцца аб спасенні душы яго і тым самым паспрыяць ёй на саракавы дзень патрапіць у светлы Рай.

Часцей за ўсё здаралася так, што прыход новага чалавека абуджаў сярод прысутных і асабліва блізкай радні новую хвалю эмоцый. Хата зноў і зноў поўнілася тужлівымі жаночымі галасамі. Галасілі і дзеці, і маладзіцы, і жанчыны сталага веку. Вядомы збіральнік беларускага фальклору мінулага стагоддзя П.В.Шэйн адзначаў, што галасілі не толькі тыя, хто сядзеў каля нябожчыка, але і тыя жанчыны, якія прыходзілі адведаць сканаўшага. Калі жанчына не галасіла над нябожчыкам, то гэта ўспрымалася непавагай да яго і глыбокай абразай для яго радні.[35]

Яшчэ раз адзначу, што галашэнні — гэта адзін з самых незвычайных жанраў беларускай песнятворчасці і высока эстэтычнага слоўнага мастацтва. У іх найбольш арганічна і своеасабліва зніталася мастацкая традыцыя продкаў (у якой мелася мноства ўстойлівых словазлучэнняў, якія тонка спалучаліся з сітуацыяй страты і гора, на памяць усплывалі адшліфаваныя цэлымі стагоддзямі вобразы) і ўвесь паэтычны талент і душэўны боль-роспач асірацелай радні. Пахавальныя галашэнні — гэта духоўная веліч нашага народа, яго стрыманасць і здольнасць суперажываць, гэта святое ачышчэнне жывых перад памяццю памёршага, часам знак прымірэння некалі пасварыўшыхся сваякоў або суседзяў. Відаць, галашэнні выконвалі яшчэ і даволі важную псіхафізіялагічную ролю. Яны дапамагалі праз слёзы, праз эмацыянальна прамоўленае (прагалошанае) слова пазбегнуць глыбокіх псіхічных надломаў і стрэсаў. Дзіўная рэч (хаця ў значнай ступені характэрная для менталітэту беларуса), але колькасць галашэнняў і іх эмацыянальная моц з'яўлялася своеасаблівым індыкатарам пашаны і павагі да нябожчыка і ўсяе яго радні.

Рытуал наведвання памёршага адбываўся заўсёды па-рознаму. У адных мясцінах людзі прысядуць, пагалосяць, ім падрабязна раскажуць, як і што чалавек гаварыў перад смерцю, як паводзіў сябе ў апошнюю хвіліну. У іншых месцах, напрыклад у цэнтральным рэгіёне Беларусі, вядомы вёскі, дзе

гасцей абавязкова пачастуюць паляніцай, пірагамі і гарэлкай або нечым іншым у залежнасці ад пары года.

Да нашага часу ў народзе існуе перакананасць, што нябожчыка нельга пакідаць нанач аднаго, таму што, маўляў, Хрыста анёл сцярог усю ноч. Калі ж сканаўшага пакінуць аднаго, то нячыстая сіла можа ўчыніць сапраўдны палтэргейст: у хаце будуць трашчаць сцены, вуглы,столь, з'явяцца здані даўно памёршых. Украінцы, напрыклад, адразу ж пасля смерці чалавека выганялі з хаты ката, бо верылі, калі кот пераскочыць праз мёртвага, то ён імгненна ператворыцца ў белага ката-вампіра, які на працягу года пасля смерці гаспадара будзе прыходзіць у двор, пад вокны хаты і да самага ранку жаласна мяўкаць.[36]

Часцей за ўсё ноччу каля памёршага сядзелі старыя людзі. Ім было што ўспомніць як пра сваё жыццё, так і пра жыццё нябожчыка.

На поўдні Магілёўшчыны існаваў своеасаблівы абрад, які атрымаў назву "гуканне нябожчыка". На досвітку ўсе тыя, хто правёў ноч каля яго, выходзілі ў двор, мыліся, самі абмывалі твар памёршаму і выціралі спецыяльным ручніком, пры гэтым гаварылі з ім, як з жывым. Потым запальвалі свечку, ставілі яе пад абразамі і доўга маліліся. Тым часам сваякі памёршага выходзілі ў двор і моцна галасілі. Праз колькі хвілін яны вярталіся ў хату і падносілі жанчынам, якія тут начавалі, па чарцы гарэлкі і кавалачку хлеба з соллю, дзякавалі ім і адпраўлялі дадому, каб тыя маглі да пахавання ўправіцца і прыгатаваць абед.[37]

Калі смерць напаткала чалавека ў цёплую пару года (асабліва ў летнюю спёку), зразумела, што трэба было рабіць розныя захады, каб запаволіць арганічны працэс разлажэння трупа. Дзеля гэтага бралі драўляныя ночвы (але не тыя, у якіх купалі дзяцей), *напаўнялі іх вадой, разведзенай марганцоўкай*, затым да мезенца левай рукі нябожчыка прымацоўвалі медны дрот і рабілі своеасаблівае "зазямленне": другі яго канец апускалі ў посуд, які стаяў пад лавай.

Трэба сказаць, што наша паспешлівае 20 стагоддзе прывяло да таго, што спрадвечныя абрады продкаў мы пачынаем скарачаць і карэліраваць. У выніку ўжо лічыцца нармальным, калі нябожчык пераначуе ў роднай хаце хаця б адну ноч. Аднак, парушаючы дадзены маці-прыродай рытм, мы пачынаем шкодзіць і самім сабе і сваім дзецям. *Прыпыніцеся хоць у такую часіну, адкіньце прэч паўсядзённы тлум і ціха пра сябе пагаварыце з Вечнасцю.* А словы шчырай малітвы дапамогуць вярнуць душэўны пакой і фізічную моц.

## “У ДАРОЖАНЬКУ НЕВАЗВРАЦІМУЮ”

Надыходзіў трэці, заключны, дзень знаходжання памёршага “ў сваёй роднай хатачцы”. У гэты дзень было асабліва шмат клопату: адправіць мужчын выкапаць магілу; падрыхтаваць калёсы, сані ці, як сёння, аўтамашыну, на якіх нябожчыка павязуць апошнім зямным шляхам; дамовіцца з раднёй і суседзямі аб падрыхтоўцы памінальнай вячэры, а таксама запрасіць святара адслужыць малебен.

Дзень пахавання — самы цяжкі і ў псіхалагічным плане. Калі ў асобных выпадках момант смерці бывае нечаканым і сведкі гэтага няшчасця нават не адразу ўсведамляюць важнасць таго, што здарылася, то на трэці дзень прыходзіць цвярозае асэнсаванне напаткаўшай бяды. Таму *асноўныя этапы выканання пахавальнага абраду трэцяга дня — вынас труны з хаты, развітанне з памёршым і апусканне труны ў магілу* — перапоўнены галашэннямі, плачам, часам стратай прытомнасці.

І ўсё ж побач з эмацыянальна ўзбуджанымі членамі сям'і памёршага заўсёды знаходзіліся старыя людзі, якія сачылі за характарам паводзін кожнага з удзельнікаў абраду, за паслядоўнасцю і дакладнасцю выконваемых дзеянняў, за адпаведным ужываннем розных рытуальных рэчаў. Менавіта так: літаральна кожная дэталь заключнага этапа мела не толькі маральна-этычнае значэнне, але і сакральна-магічнае, якое, на думку знаўцаў традыцыі, было непасрэдным чынам звязана з далейшым лёсам самай блізкай радні памёршага.

Практычна на ўсёй тэрыторыі Беларусі існавала і да нашага часу захавалася традыцыя выносіць труну з нябожчыкам з хаты не раней поўдня і не пазней шаснаццаці гадзін. Гэтай працэдуры некалі абавязкова папярэднічаў хрысціянскі абрад адпявання. У хату запрашалі святара і хор пеўчых. Святар, як правіла, займаў месца каля ног ці справа ад нябожчыка, побач з ім станавіліся жанчыны з царкоўнага хору, а прастору хаты ад парога і да труны займала радня і аднавяскоўцы. Усе прысутныя павінны былі на працягу малебна трымаць у руках запаленыя свечкі, загорнутыя ў насовачкі ці невялічкія кавалачкі саматканага палатна. Да свечак гэтых ставіліся з вялікай перасцярогай: не пажадана было, каб яны патухлі, нельга было нечакана ўпусціць або зламаць, таму што гэта магло паслужыць нядобрай прыкметай-прадказаннем магчымай хуткай смерці яшчэ каго-небудзь з блізкай радні сканаўшага.

У некаторых мясцінах пражывання беларусаў зафіксаваны такі звычай: як толькі святар распачне адпяванне, старэй-

шы сын гаспадара ішоў у сад і высякаў самае лепшае пладовае дрэва (яблыню, грушу, сліву, вішню) або заразаў курыцу ці гуся. У народзе лічылі, што ахвяру нябожчыку трэба прыносіць абавязкова, інакш прападзе сам і звядзецца гаспадарка.[38]

Як толькі заканчвалася адпяванне, распачыналася падрыхтоўка да вынасу нябожчыка з хаты. На жаль, сёння нават у вёсках (не кажучы ўжо пра гарадское насельніцтва) не ўсе дакладна (зразумела, з захаваннем мясцовых асаблівасцей) ведаюць, як і ў якой паслядоўнасці выконваецца гэты рытуал. А складанага тут якраз нічога няма. Трэба ўявіць сабе структуру магілы і надмагільнага ўзвышэння (вертыкальная паслядоўнасць) і захаваць гэту чарговасць (толькі надаўшы ёй гарызантальную лінейнасць). У такім жа парадку пахавальная працэсія будзе рухацца на могілкі. Такім чынам, удакладняем:

спачатку выносяць распяцце або крыж (у некаторых вёсках гэта быў асобны крыж, які неслі на чале пахавальнай працэсіі, а затым прыносілі дадому і захоўвалі ў сенцах да таго часу, пакуль не памрэ наступны жыхар гэтай вёскі, тады крыж будзе захоўвацца ўжо ў той хаце);

затым абраз;

потым кветкі і вянкі, іх трымаюць, як правіла, дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту або маладзіцы (толькі ні ў якім разе не цяжарныя), яны становяцца ў дзве шарэнгі, утвараючы жывы калідор;

далей двое (бывае і чацвёра) мужчын сталага веку выносяць вечка ("крышку") труны;

пасля гэтага ў пакоі застаецца толькі сям'я, каб развітацца з памёршым перад дарогай у Вечнасць;

хвілін праз пяць мужчыны просяць сям'ю пакінуць хату, каб ніхто не перашкаджаў акуратна вынесці труну;

нарэшце чацвёра (шасцёра) самых дужых мужчын сталага ўзросту выносяць з усімі перасцярогамі нябожчыка з хаты.

Рытуал вынасу труны з хаты ўмоўна можна раздзяліць на некалькі мікраэтапаў, кожнаму з якіх надавалася вельмі вялікае значэнне.

Як толькі мужчыны возьмуць труну на рукі, вызваленыя табурэткі або лавы ні на хвіліну не пакідалі без увагі. У адных мясцінах на іх адразу ж садзілі каго-небудзь з членаў сям'і (каб не баяўся памёршага і мог хадзіць на могілкі), у іншых — перакульвалі ("каб новая смерць не ўбілася ў хату").

Паўсюдна на Беларусі лічыцца недапушчальным, каб нехта з дамачадцаў дапамагаў выносіць труну.

Вельмі важным і адказным з'яўляецца момант пераносу труны праз парог. Шмат у якіх мясцінах яе тройчы апускалі на парог, але ў той жа час нельга было датыкнуцца трунай да

вушакоў дзвярэй — гэта прадказвала хуткую смерць яшчэ каго-небудзь з членаў сям'і. На Мазыршчыне ў гэты момант дзве жанчыны выконвалі цікавы засцерагальна-папераджальны рытуал. Адна з іх станавілася ў сенцах каля дзвярэй, а другая — перад дзвярамі ў хаце. Як толькі мужчыны пераносілі труну над парогам, жанчына, якая стаяла ў сенцах, перадавала той, што стаяла ў хаце ля печы, бохан хлеба і соль.[39]

У практыцы народных знахараў існуе спосаб лячэння эпілепсіі, у якім выкарыстоўваюць якраз гэты момант. Хворага чалавека кладуць на парог, накрываюць шчыльнай чорнай тканінай і праносяць над ім труну.

У старажытнасці труну выносілі з хаты не праз дзверы, а праз акно, што дакладна адпавядае закону рытуальнай перавернутасці: калі жывыя ўваходзілі праз дзверы, то памёршага трэба вынесці праз акно, "каб дарогі дадому не ведаў" (мелася на ўвазе, каб душа памёршага не вярнулася і не забрала каго-небудзь з дамачадцаў).

Па дарозе ад хаты і да могілак пахавальная працэсія будзе неаднаразова прыпыняцца на мяжы паміж рознымі зонамі. Першы прыпынак будзе зроблены ўжо за парогам хаты, каб гаспадар мог "развітацца" са сваёй гаспадаркай.

А тым часам дзверы ў хаце зачынялі (каб ніхто некалькі хвілін туды не заходзіў), а ва ўсіх гаспадарчых забудовах, наадварот, адчынялі.[40]

Як толькі працэсія пачне збірацца ў дарогу, нехта з суседзяў вяртаўся ў хату і пасыпаў падлогу зернем жыта. А літаральна праз некалькі хвілін хату пачыналі прыбіраць: вымяталі і мылі падлогу, праўда вядро са смеццем і з бруднай вадой пакідалі ў хаце каля парога, пакуль удзельнікі пахавання не вернуцца дадому.

Пасля кароткага "развітання" гаспадара са сваім былым жытлом труну бралі на рукі, выносілі са двара і пэўны час (часта да скрыжавання дарог) неслі на плячах. Затым труну ставілі на калёсы ці аўтамашыну, якую наперадзе ўпрыгожвалі хвояй. Спераду мацавалі дзве невялічкія елачкі, дно машыны ўсцілалі галінкамі вялікай елкі, тут жа, збоку, клалі ладны ахапак дробна насечаных яловых лапак, якія кідалі пад ногі пахавальнай працэсіі, пакуль яна не выходзіла за вёску.

Абрадавы этыкет патрабаваў, каб літаральна кожны аднавясковец прыйшоў развітацца з памёршым. Маленькіх дзяцей да года, а таксама немаўлят будзілі і выходзілі з імі на вуліцу (глядзець на пахавальную працэсію праз акно катэгарычна забараняецца).

Напрыканцы вёскі працэсія спыніцца апошні раз. Радня, суседзі, сябры рушаць далей, а нехта вернецца дадому рыхта-

ваць жалобны стол. Як толькі пахавальны картэж крыху ад'едзе, усе, хто застаўся ў вёсцы, прыгнуцца і кінуць услед яму па тры жменькі зямлі. Жывыя як бы адганялі ад сябе смерць, рабілі тут тое, што ўсе астатнія выканаюць на могілках.

## ПАХАВАННЕ

Паследняе павіданнейка
І паследняе папрашчаннейка.

*З народнага галашэння*

Зробім крок назад і распавядзем гаворку пра падрыхтоўку магілы да пахавання.

З гісторыі нашай культуры, а таксама на падставе шматлікіх археалагічных даследаванняў вядома, што ў славян існавалі дзве разнавіднасці пахавання: ямнае трупапалажэнне і трупаспальванне. Зараз цяжка сказаць, якая з формаў рытуалу была больш ранняя, а якая ўзнікла пазней. Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, што стадыяльна больш старажытнай з'яўляецца трупаспальванне. Магчыма, яно і так. Аднак надзейныя ў такім выпадку першакрыніцы — фальклорныя творы і абрадавыя кантэксты — гавораць пра іншае.

У гадавым колазвароце ўсходнеславянскіх народаў вядома некалькі святаў, у структуры якіх існаваў абрад пахавання або іншага знішчэння асноўнага міфалагічнага персанажа. Так, на Масленіцу (калі зямля яшчэ спала зімовым сном і яе чапаць не дазвалялася) саламянае пудзіла *спальвалі*, а попел *утоптвалі* ў снег. А вось на святах веснавога і летняга цыклаў рэшткі рытуальных страў, важнейшыя святочныя атрыбуты *закопвалі* ў зямлю.

Рэшткі ежы, якія заставаліся на стале пасля велікоднай ранішняй трапезы, гаспадар закопваў на сваім полі, каб зямля спрыяла ўраджаю. У паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі да гэтага часу захаваўся абрад "пахаванне стралы". На Ушэсце "стралу вадзілі" па вёсцы з канца ў канец, а затым *хавалі* на мяжы жытнёвага поля, каб Пярун не палажыў саспелае жыта. У Цэнтральнай Расіі летам праводзіліся абрады "*пахаванне зязюлі*", "*пахаванне Кастрамы*", "*пахаванне русалкі*"[41].

Гэты невялічкі экскурс у абрады рытуальных пахаванняў спатрэбіўся для таго, каб паказаць, што абодва варыянты пахавання нябожчыка існавалі на Беларусі і сёння могуць успрымацца як раўназначныя. Таму не трэба сумнявацца ў правамернасці сучаснага абраду крэміравання памёршых.

У сувязі з гэтым нельга не ўзгадаць звычай несці на могілкі

посуд з вугальчыкамі, узятымі з печы ў доме памёршага чалавека. Даследаванне старажытных месцаў пахавання дало археолагу Г.Х.Татуру падставы сцвярджаць, што на тэрыторыі Беларусі існаваў і своеасаблівы рытуал пахавання, у якім фактычна аб'ядналіся два розныя варыянты. На будучым месцы пахавання распальвалі вогнішча і толькі тады, калі яно згасне і астыне, туды клалі памёршага і засыпалі зямлёй. Калі паміраў наступны суродзіч, то ўвесь рытуал паўтараўся ўжо на ўтвораным узвышку. Даследчык налічыў *дзевяць* культурных гарызонтаў, якія сведчылі аб такой жа колькасці пахаванняў на гэтым месцы.[42]

І ўсё ж у вясковай мясцовасці да нашага часу людзі прытрымліваюцца звычаю ямнага пахавання.

Выкапаць магілу прасілі траіх дужых мужчын, узрост якіх абавязкова перавышаў 40 год (лічылі, тым, хто планаваў павелічэнне сваёй сям'і, нельга было прымаць удзел у такой справе). З сабой ім давалі бутэльку гарэлкі і якую-небудзь закуску. Выкапаць магілу трэба было да паўдня.

Этнаграфічныя звесткі сведчаць, што час падрыхтоўкі магілы таксама быў напоўнены рознымі рэгламентацыямі і абмежаваннямі ў паводзінах мужчын-капачоў і іх аднавяскоўцаў. Па апісаннях этнографаў мінулага стагоддзя, падчас капання магілы непажаданай была прысутнасць жанчын, тым больш удавы, якая нядаўна пахавала мужа; меркавалі, што гэта магло справакаваць новую смерць ці ў сваёй хаце, ці ў хаце тых, каго зараз напаткала гора.

Лічыцца, што глыбіня магілы павінна быць у рост сярэдняга чалавека — 170—180 см. Мужчыны стараліся выкапаць яму з роўнымі сценамі, каб па шырыні і даўжыні яна была трохі большай за труну, бо, крый Божа, дастаць труну назад і пашыраць яму (прыкмета вельмі нядобрая).

Як толькі магіла будзе выкапана, мужчыны пакладуць над ёю рыдлёўкі крыж-накрыж, вып'юць па чарцы гарэлкі і будуць "сцерагчы магілу" да прыбыцця пахавальнай працэсіі.

Набліжаўся самы *кульмінацыйны момант* трохдзённай драматычнай дзеі: пахавальная працэсія прыбывала на могілкі. Усе прысутныя станавіліся паабапал магілы. Труну апускалі на ўзвышша з жоўтага пяску, здымалі крышку і распачыналі апошні, заключны этап развітання сям'і, радні і блізкіх з памёршым.

Старыя людзі расказвалі мне, што гэта адзін з найбольш адказных момантаў ва ўсім пахавальным абрадзе. Мяне пераконвалі, што практычна кожны крок яго ўдзельнікаў меў уплывовы характар на далейшы лёс. Трэба было перш-наперш развязаць аборы-перавяслы, якімі былі звязаны рукі і ногі нябожчыка.

З гэтым можа быць шмат непаразуменняў. Сёння мала хто ўяўляе, што з імі рабіць, куды дзяваць. Аднак усе ведаюць, што гэта рэч надзвычайная. Так, сапраўды. Людзі, пасвечаныя ў таямніцу сусвету, раяць: ні ў якім разе нельга дапусціць, каб перавясла трапіла ў рукі чужога чалавека, бо з гэтымі рэчамі займаюцца чараўніцтвам. Адно з самых жахлівых наступнае: чужы чалавек імкнецца ўкрасці гэтыя аборы, а затым у поўнач пойдзе на могілкі, закапае іх каля крыжа старой магілы. Вынікі могуць быць непрадказальнымі: у сям'і да дзевяці год могуць не нараджацца дзеці; на працягу наступнага года род чалавека, якога хаваюць, можа страціць яшчэ трох прадстаўнікоў. Таму святары, якія прысутнічаюць на пахаванні, забараняюць браць перавяслы каму-небудзь з чужых людзей, а проста кідаюць іх у магілу ("ні нашым ні вашым").

Аднак гэта нейтральны варыянт, скіраваны на тое, каб не нашкодзіць. Людзі сталага веку рэкамендуюць захоўваць гэту рэч дома, але не ў жыллёвай частцы хаты (калі ёсць дачка, то яна доўга замуж не выйдзе). Гэтымі аборамі можна будзе дапамагаць лячыць радыкуліты, болі ў суставах, ціск, эпілепсію...

Пасля канчатковага ўпрыгожання труны да яе падыходзіла ўся радня і развітвалася з нябожчыкам, тройчы цалуючы яго: у лоб, вусны і рукі.

Самая блізкая радня несупынна галасіла:

А прашчай, мая сястрыца,
А прашчай, мая дарагая,
А болі ж я цябе не ўбачу.
А болі ж я цябе не ўстрэчу.
Зарастуць твае сцежкі-дарожкі,
А на якой жа мне дарожачцы цябе сустракаці?
А ў якой жа кучачцы цябе пазнаваці?[43]

* * *

Яблычка маё недаспелае,
Ягадка мая недазрэлая!
Дзетанька маё міленькае,
Дзетанька маё любіменькае!
Лісточак мой зялёненькі,
Цвяточак мой чырвоненькі!
Без пары ты адпадаеш,
А мне пячаль пакідаеш,
Пташачка мая любенькая!
Пацера наша вялікая,
Пацера наша дарагая,
Пацяралі мы сыночка,
Пацяралі дарагога.
Вот паследні разочак
Цалую цябе, сыночак.[44]

* * *

Пaследнюю мінутачку,
Пaследнюю гадзіначку
Я з табою бачуся.
Ох, дабранач, цётухна,
Дабранач, мілая.
Мы ж з табою больш не пабачымся,
Мы ж з табою больш не пагаворым.[45]

Усе прысутныя разумелі: плачам не ажывіш, не ўратуеш, таму апошняе развітанне імкнуліся не зацягваць. Мужчыны бралі жанчын пад рукі і адводзілі (а то і адцягвалі ў непрытомнасці) іх убок.

Адразу ж пасля развітання мужчыны-капачы закрывалі труну векам, забівалі цвікамі і ставілі на рыдлёўкі, якія ляжалі папярок магілы. Затым пад труной прапускалі два доўгія палатняныя ручнікі (зараз — вяроўкі), у апошні раз прыўздымалі "калыску" памёршага, даставалі рыдлёўкі і нарэшце павольна апускалі яе на дно ямы.

Аднак перад тым як апускаць труну, магілу асвячалі вадой і члены сям'і памёршага кідалі ў яе медныя грошы. У некаторых мясцінах на труну кідалі палатно, на якім яе апускалі, ніткі і іголкі, якімі нябожчыку шылі навалачку і адзенне, прычым канец іголкі-"мяртвіцы" абавязкова ламалі. Гэта рабілася для таго, каб рэчамі не завалодалі чараўнікі і не нашкодзілі якой-небудзь іншай сям'і.

Калі магіла была засыпана роўна з зямлёй, у яе ставілі крыж (у праваслаўных — у галаве, у каталікоў, уніятаў і старавераў — у нагах), а затым ужо ўзводзілі надмагільны насып. З чатырох бакоў і зверху яго "запячатвалі", робячы рыдлёўкай крыжападобныя знакі.

У Заходняй Беларусі над магілай рабілі надбудову, якая нагадвала невялічкую хату. Крыж быў прыкрыты дзвюма дошчачкамі накшталт страхі, а на саму магілу клалі выдзеўбанае па форме лодкі-карабля палена.

Пакуль магільшчыкі ўзводзілі насып, старэйшыя прысутныя разыходзіліся па могілках, каб наведаць сваіх памёршых суродзічаў.

Нарэшце, самы апошні момант пахавання таксама меў важнае значэнне. Шматлікія звесткі сведчаць: у асяроддзі беларусаў *існуе* няпісанае *правіла: хто першы пакінуў могілкі, той першы сюды і вернецца*. Гэта можа быць не заўтра і не паслязаўтра, гэта можа быць праз вялікі адрэзак часу, але закон быў бязлітасны, таму звычайна адказнасць браў на сябе самы стары сярод прысутных.

## ПЕРШЫ ПАМІНАЛЬНЫ СТОЛ

Ах, мая мамачка мілая,
А ўжо ўсе госцейкі вярнуліся,
Усе суседачкі прыйшлі,
Толькі ты, мамачка, там засталася.

*З народнага галашэння*

Трохдзённы цыкл пахавальных абрадаў заканчваўся жалобным сталом. Усе ўдзельнікі пахавання гуртам вярталіся дадому, каб справіць калектыўна-радавую трапезу, якая адначасова сімвалізавала ўшанаванне памёршага і прадаўжэнне жыцця. Аднавяскоўцы імкнуліся падтрымаць сям'ю, якую напаткала гора, добрым словам, шчырым спачуваннем, абяцаннем дапамагчы ў час правядзення пасяўных работ і збору ўраджаю.

Як толькі ўдзельнікі пахавання заходзілі ў двор, жанчыны выносілі *вядро з вадой, ручнік, мыла і конаўку*, каб кожны памыў рукі перад парогам хаты. Там, на могілках, людзі бралі рукамі магільны жвір, г.зн. уступалі ў непасрэдны кантакт з "тым" светам, светам даўно памёршых продкаў, а такі кантакт быў небяспечным для фізічнага здароўя чалавека, стану яго псіхікі, энергетычнага патэнцыялу. Таму абавязкова трэба было памыць рукі (як асноўны канал камунікацыі, сувязі), каб не прынесці ў хату новую смерць.

Рытуал ачышчэння скончаны. Гаспадар або гаспадыня запрашалі гасцей у хату. Там ужо быў накрыты жалобны стол. Госці заходзілі і гуртам збіраліся каля печы, чакаючы, пакуль святар правядзе ліцію.

На Магілёўшчыне і Міншчыне да нашага часу захаваўся звычай: дзе толькі жанчыны, а дзе і мужчыны, пераступіўшы парог хаты, падыходзяць да печы і тройчы дзвюма рукамі дакранаюцца да яе брыля. Хутчэй за ўсё гэты рытуал сімвалізаваў заканчэнне зваротнага пераходу гасцей са свету продкаў у свет жывых.[46] Печ і агонь сімвалізавалі бясконцасць жыцця і з'яўляліся своеасаблівым каналам сувязі (комін) з душамі продкаў.

Спачатку святар або нехта са старэйшых жанчын чыталі малітву пры запаленай свечцы, а затым ужо гасцей садзілі за стол. Зразумела, што за сталом абавязкова павінна было быць *месца для памёршага*. Сярод беларусаў вядомы два варыянты афармлення гэтага месца. У адным выпадку *ў чырвоным куце ставілі асобны невялікі столік, на якім размяшчалі бохан хлеба, сальніцу, шклянку з зернем жыта, пшаніцы ці аўса, у*

*якую ставілі памінальную свечку, а таксама талерку для рытуальных страў*. У другім — *месца для памёршага вызвалялі ў тарцы стала побач з чырвоным кутом, а на лаве нават пакідалі адно вольнае*.

Важнай акалічнасцю жалобнага стала была пасадка гасцей. Перш-наперш адзначым, што *члены сям'і памёршага за памінальны стол ніколі не садзіліся, ні ў якім разе не дапускаліся туды дзеці і моладзь дашлюбнага ўзросту*. Яшчэ раз нагадаем, што *памінальны стол ставіўся толькі ў адну лінію*, што сведчыла *пра разрыў сямейнай пары* і *пра* той *калідор*, які звязваў гэты і "той" свет. У такім разе паводзіны ўсіх удзельнікаў рытуалу падпарадкоўваліся прынцыпу разрываадзіноты. У сувязі з гэтым узніклі *два варыянты пасадкі гасцей*. У адным выпадку *мужчыны садзіліся асобна, уздоўж сцяны, а жанчыны адпаведна насупраць іх*. У другім — мужчыны садзіліся з абодвух бакоў, але бліжэй да чырвонага кута, а жанчыны сваім гуртам або на другім канцы стала, або ўвогуле за асобным сталом, які ставілі каля печы ці парога.

Сама рытуальная трапеза таксама магла пачынацца па-рознаму. Так, збіральнік народных традыцый мінулага стагоддзя Е.Р.Раманаў адзначаў, што ў Аршанскім павеце абрад распачынала жанчына, якая абсыпала зернем памёршага (пры вынасе труны з хаты) і падлогу. На пачатку памінальнай вячэры тая ж жанчына брала лусту хлеба, чарку гарэлкі, тры лыжкі канону, станавілася на парозе і звала (запрашала) на сумесную трапезу душу памёршага. Пасля гэтага гаспадар браў чарку гарэлкі і, звяртаючыся да "святых радзіцеляў", гаварыў прамову: "Няхай жа ўжо наш пакойнічак ляжыць і на нас грэшных з таго свету не забывае ды хлеба-солі засылае, каб нам самім было што спажываць і яго праведную душачку ўспамінаць! Чэсныя ж і праведныя радзіцелі! Хадзіце к нашаму сталу, гарэлачкі выпіць і за бацькаваю малітваю хлеба-солі пакушаць. За здароўя ж ваша, госьцікі. Піця ўжо на здароўя. Давай жа, госпадзі, каб на гэтым стале ні папіта, ні паедзена было!"[47]

Жалобны стол распачынаўся спецыяльнымі рытуальнымі стравамі — канонам (сытой) або куццёй. Куццю варылі з грэцкіх, рысавых, ячных ці прасяных круп на вадзе з дабаўленнем мёду. Для падрыхтоўкі канону зноў-такі ў вадзе разводзілі мёд, а затым туды крышылі абаранкі ці якое-небудзь іншае печыва (сёння выкарыстоўваюць батон). Рытуальную страву пускалі па абодва бакі стала, пачынаючы ад чырвонага кута. Кожны госць тройчы браў яе з агульнай місы, каштаваў і перадаваў суседу.

Пасля канону прысутныя тройчы хрысціліся і ціха пра-

маўлялі: "Дай жа, Божа, нашаму нябожчыку вечны пакой, царства нябеснае, рай светлы. Няхай спачывае ды нас доўга дажыдае!"

У самім характары правядзення жалобнага стала таксама існуе варыятыўнасць. У адным выпадку стол накрывалі і больш нічога не даносілі, не падавалі. А, напрыклад, у Гомельскім павеце стравы падавалі паасобку. Адну пададуць — госці разбяруць і з'ядуць, затым другую і г.д. Сярод абавязковых страў былі наступныя: боршч з буракоў ці капусты, суп з якой-небудзь крупы, локшына, смажанае мяса ці рыба, піражкі, каша і ўзвар. У старажытнасці колькасць страў была дакладна вызначанай — *сем*. Аднак ужо ў мінулым стагоддзі іх маглі падаваць і болей, усё залежала ад заможнасці сям'і.

У некаторых мясцінах на стол падавалі паляніцу — гарачы пшанічны хлеб. Гаспадар трымаў яго ў руках, а кожны госць павінен быў адламаць сабе кавалак. Хлебам сілкаваўся жывы чалавек, а парай ад яго — душы даўніх "радзіцеляў". Менавіта *таму народны этыкет забараняе ламаць хлеб у паўсядзённым жыцці*.

Удзельнікі жалобнай трапезы выпівалі *тры разы* і перакульвалі чаркі, што сімвалізавала заканчэнне вячэры. *Першым з-за стала ўставаў самы стары чалавек,* а *затым адначасова — усе астатнія.* Зноў ціха маліліся, выказвалі гаспадарам на развітанне свае спачуванні і ішлі дадому. Стол прыбіралі толькі на наступны дзень, лічылі, што ноччу душы памёршых прыдуць у госці і таксама падсілкуюцца.

У народнай культуры беларусаў на працягу года пасля смерці чалавека адзначаліся яшчэ некалькі памінальных сталоў — на дзевяты і саракавы дзень, а таксама ў год.

# ЧАЛАВЕК І СВЕТ



# СІМВОЛІКА СТЫХІЙ ПЕРШАТВАРЭННЯ

## АГОНЬ І РАТУЕ, І ГУБІЦЬ

Яшчэ адной з асноўных стыхій-першаэлементаў Сусвету, якая ўдзельнічала ў фарміраванні прыроднага і культурнага наваколля чалавека, быў *агонь*. У народнай свядомасці захавалася некалькі паданняў аб яго паходжанні. У адным выпадку лічыцца, што агонь — тварэнне д'ябла. Чэрці вынайшлі яго, калі вымушаны былі пакінуць неба і апынуліся на зямлі. Легенда сцвярджае, што аднойчы Бог хадзіў па зямлі разам са святымі Пятром і Паўлам. Нечакана яны ўбачылі вогнішча, якое ахоўвалі чэрці. Бог прылажыў да агню палачку, тая і загарэлася. Чэрці захацелі адламаць частку, якая гарэла, тады Гасподзь ударыў палкай аб камень, пасыпаліся іскры... з таго часу людзі даведаліся, як можна здабыць агонь.[1]

Шэраг легендаў даюць іншае тлумачэнне. У старадаўнія часы Творца Сусвету прагнаў з Раю Адама і Еву, а разам з імі і таго чорта, які спакусіў першых людзей свету. Ад грымотаў нячысцік схаваўся пад дрэвам, але Бог дацяў яго перуновай стралой. Ясень, пад якім сядзеў д'ябал, імгненна загарэўся. Адам распаліў сваё цяпло ад таго агню і захаваў яго да сённяшняга дня для людзей.[2]

У легендах такога кшталту, безумоўна, пераважае думка аб нябесным паходжанні агню, ён — Божы промысел. Разам з тым у асобных тэкстах можна знайсці падрабязны аповед пра тое, як чалавек навучыўся здабываць агонь самым старажытным спосабам: шляхам доўгага і цярплівага трэння верацяна, замацаванага ў просценькім тачыле, або звычайных драўляных палачак, зробленых з "моцнага дрэва".

Адлюстраванне непрыхаванай дваістасці ў трактоўцы паходжання агню — з'ява далёка не выпадковая для беларускай народнай прозы і ўвогуле для менталітэту народнага мыслення, у аснове якога ляжала няспешнае і ўсебаковае асэнсаванне жыццёвых і прыродных рэалій. Справа ў тым, што агонь ад прыроды сваёй спалучаў два супрацьлеглыя пачаткі: ён мог сагрэць, накарміць, вылечыць, перасцерагчы ад эпідэміі, паспрыяць дзетараджэнню, знішчыць або нейтралізаваць зло, насланае чараўніком або ведзьмаком. І разам з тым ён жа здольны быў вынішчыць заможную гаспадарку, нашкодзіць чалаве-

ку, звесці яго ў зман і нават загубіць у балотных уладаннях нячысціка.

У асяроддзі ўсходніх славян (пераважна сярод беларусаў) да нашага часу існуе самая жорсткая забарона заліваць агонь вадой, пляваць на яго, датыкацца нажом, пераступаць цераз яго або сказаць пра яго што-небудзь кепскае. У пасляваенныя часы старэйшыя хлапчукі-падлеткі ганялі коней у начное. Каб было не так боязна, каб адагнаць ваўкоў, яны распальвалі вогнішча, якое гарэла аж да раніцы. Але ніхто не заліваў яго вадой, а давалі магчымасць павольна дагарэць. Я памятаю, як у дзяцінстве мая бабуля раскладвала "цяпельца" на прыпечку, але перад гэтым абавязкова хрысцілася і ціхенька шаптала некалькі слоў замовы ад пажару.

Агонь і яго ўтаймавальніца — печ — даволі шырока выкарыстоўваліся ў шматлікіх вясельных і памінальных абрадах. Агонь — гэта жыватворны ачаг, які не проста падтрымліваў гаспадарку, але мог пэўным чынам паўплываць на лёс чалавека або прадказваць яго. Калі на змярканні, адвячоркам гаспадыня запальвала агонь, каб можна было сесці за прадзіва або ткацтва, а тым часам нехта з дамачадцаў лаяўся ці проста гучна гаварыў, то жанчына настойліва перапыняла іх, заўважаючы: "Хопіць вам сварыцца, языкамі малоць, ці не бачыце, што агонь распальваю!" — і сварка ў хаце тут жа сціхала.

Нябеснае паходжанне агню цесна знітоўвае яго з Творцам Сусвету і напаўняе яго сімволіку лёсавызначальным сэнсам. Аб гэтым сведчаць шматлікія павер'і, з якімі можна сустрэцца ў розных кутках Еўрапейскага кантынента. Напрыклад, калі дровы паварушыць качаргой і яны хутка разгарацца, гэта значыць, што адсутныя ў доме гаспадар ці гаспадыня знаходзяцца ў добрым здароўі і вясёлым настроі. Калі збіраешся ў далёкую дарогу, то перад тым як выйсці з хаты, вусце печы абавязкова трэба зачыніць засланкай. Калі раніцай агонь моцна "салыпае" — вырываецца за вусце прама ў комін, то гэта прадказвае моцную сямейную сварку. Аб няшчасці, а часам нават смерці сведчыла поўнае затуханне жару, прыгатаванага для таго, каб распаліць цяпло назаўтра раніцай.

Асаблівай пашанай сярод еўрапейскіх народаў карыстаўся так званы "чысты агонь". Калі ў якой-небудзь вёсцы пачыналася эпідэмія яшчуру, то нехта з мужчын браў два ліпавыя або ясеневыя бруські і старанна цёр іх да таго часу, пакуль не з'явіцца язычок полымя. Гэтым агеньчыкам падпальвалі старую салому, траецкі "май", свежыя яловыя галіны. Праз густы дым праганялі ўвесь вясковы статак. А кожны гаспадар браў з вогнішча па адной галавешцы і нёс дадому, каб запаліць уласнае цяпельца і тым самым перасцерагчы ад хваробы ўсё

жывое.[3] Агонь, здабыты такім чынам, яшчэ называлі "жывым", бо ён узнікаў, ажываў сам, як дар прыроды. Менавіта такім агнём беларусы падпальвалі купальскія лаўжы (кучы галля).

Аднак на Беларусі вядомы легенды і павер'і пра агонь зусім іншага характару. Вешчунамі смерці лічацца так званыя "балотныя агні". Існуе павер'е, што "балотны агонь" свеціцца ў тым месцы, дзе ляжыць труп немаўляці. Ва ўспамінах старых людзей ёсць перакананасць, што "балотныя агні" часта можна ўбачыць над магілай нядаўна спачыўшых людзей.[4] Мільгаючы ў начной цемры, яны лёгка могуць збіць з дарогі любога падарожніка, каб заманіць у балота і там утапіць яго. Некаторыя распавядальнікі казак упэўнены, што такія агні загараюцца і на месцы кладаў, якія хавае ў сабе наша зямля.

Усё гэта сведчыць пра тое, што ***сімволіка агню надзвычай багатая ў беларускай народнай культуры. Яго аналагам у касмапланетарным плане з'яўляецца сонца, а ў рытуальна-абрадавым кантэксце — свечка.***

## "ВАДА-ВАДЗІЦА, БОЖАЯ ПАМАЧНІЦА"

У адпаведнасці са старажытнымі міфалагічнымі ўяўленнямі славян вада — адна з асноўных стыхій, якая прымала ўдзел у стварэнні Сусвету і дала жыццё ўсяму жывому на Зямлі. Многія навукоўцы, якія даследуюць гісторыю паходжання славянскіх народаў, перакананы, што месцам іх узнікнення з'яўляецца скандынаўскі востраў Руген[1], у цэнтры якога стаяла каменная выява галоўнага боства — апекуна. Можа таму ў шматлікіх народных замовах вельмі часта ўзгадваецца гэта свяшчэннае месца першатварэння, якое смела можна параўнаць з біблейскім Раем або гарой Арарат, на якой пад тоўстым слоем ільду (згодна з легендай) захоўваецца Ноеў Каўчэг. Там, на гэтым востраве, знаходзіцца эталон нашай духоўнасці, нейкі універсальны лекавы сродак, які дапамагае падчас лячэння мноства хвароб: "На моры, на акіяне стаіць востраў, на тым востраве стаіць хатка, а ў той хатцы жывець бабка, а ў той бабкі стаіць караваць дубовая, на той караваці ляжаць падушкі пуховыя. На тых падушках вам гуляць і буяць, а на гэтага раба Божага маладзёна забываць"[2].

З цягам часу славянскія плямёны рассяліліся па ўсёй Еўропе, аднак да нашых дзён самы кансерватыўны жанр фальклору — народныя замовы — захаваў у сваёй кампазіцыі і сюжэтнай аснове абавязковае ўяўнае вяртанне да той першакрыніцы, якая брала пачатак з-пад Алатыра-каменя: "Добры вечар, вада-вадзіца, Божая памачніца! Цякла ты з утоку сонца,

з-пад яснага месяца, з-пад Алатыра-каменя і мыла-памывала жоўтыя пяскі, крутыя беражкі, белае каменне, сырое карэнне, лугі, балоння, шаўковую траву — і мый-памывай раба божага маладзенца".[3]

Гэты старажытны міфалагічны сюжэт паслужыў асновай для ўзнікнення вялікага мноства легенд і паданняў аб цудадзейных крыніцах, якімі поўніцца наша беларуская зямля. Дарэчы, да адной з такіх святых крыніц (яна знаходзіцца ў Мінску непадалёку ад праспекта Машэрава) ездзяць сотні мінчан (каб наталіць смагу, узяць вады для першага купання немаўля і г.д.). У часы хрысціянізацыі на Беларусі нават сталі ўзнікаць легенды пра тое, што каля свяшчэнных крыніц разпораз знаходзяць нерукатворныя абразы з выявай Боскай Маці ці Параскевы Пятніцы, якая лічыцца апякункай жыццядайнай стыхіі.[4]

Цікава, што ў народнай магіі рэчаў, пры дапамозе якіх можна нашкодзіць чалавеку і яго гаспадарцы (соль, пясок і г.д.) безліч, а вось дапамагчы пазбавіцца ад хваробы здольна толькі вада. На жаль, навукоўцы-фізікі ці хімікі не вельмі імкнуцца патлумачыць гэты незвычайны феномен вады. Якім чынам яна ўспрымае слоўную інфармацыю лекара, захоўвае яе даволі працяглы час (адны сцвярджаюць, што 40 дзён, іншыя — нават да года) і здольна ўздзейнічаць на хворага так, быццам лекар побач? Хачу звярнуць увагу на адну істотную дэталь: сёння, калі наша дзяржаўнае медыцынскае абслугоўванне знаходзіцца ў стане заняпаду, многія людзі звяртаюцца да экстрасенсаў, парапсіхолагаў, біяэнергетыкаў. Ездзяць за сотні кіламетраў, просяць "нагаварыць" ("зарадзіць") ваду і са спадзяваннем на поспех аддаюць за гэта вялікія грошы. Аднак *трэба памятаць, што як толькі вы будзеце праязджаць па мастку над ракой, ваша "лекавая" вада імгненна страціць нададзеныя ёй якасці.*[5]

Неабходна адзначыць, што, згодна народным уяўленням, гаючай была не толькі вада, якую "загаварыў" лекар, але і тая, якую бралі з крыніцы або студні на ўзыходзе сонца. Асабліва першая, таму яе нельга было ні адліваць з вядра, ні далінаць, а чалавек у гэты час не павінен прагаварыць ні слова. Гэтай вадой мыліся, давалі піць хворым, жывёле, апырсквалі ўсе пабудовы, вуллі, выкарыстоўвалі для варажбы.[6]

Сярод беларусаў асаблівай пашанай карыстаецца вада, набраная з трох, сямі ці нават дзевяці рэчак або калодзежаў, а таксама тая, у якой варыліся велікодныя яйкі, якой мылі хлебную дзяжу, абразы, якую пралілі праз рэшата, адтуліну ад сучка ў смаліне або праз дзвярную завесу. Існуе павер'е, што гаючыя здольнасці набывае і тая вада, у якую апускалі розныя

лекавыя расліны, святаянскія зёлкі, вугальчыкі са сваёй печы, медныя, срэбныя ці залатыя манеты.

Дарэчы, у больш позняй хрысціянскай культуры рытуалы з вадой таксама сталі займаць даволі прыкметнае месца. У гадавым колазвароце існуе некалькі святочных дзён, калі пажадана асвячоную ў храме ваду браць дадому: на Раство Хрыстова, Вадохрышча, Стрэчанне, у Чысты чацвер, на Вялікдзень і Івана Купалу. Абрад далучэння чалавека да храма — хрышчэнне — таксама не абыходзіўся без вады.

Неабходна заўважыць, што *ачышчэнне вадой з'яўляецца ключавым рытуалам* ва ўсіх асноўных падзеях, звязаных з новым этапам у жыцці чалавека (першае купанне немаўля; вядром з вадой перагароджвалі дарогу вясельнай працэсіі; абмыванне нябожчыка, і г.д.).

Вада давала жыццё, але магла і пазбавіць яго. У міфалогіі яна з'яўляецца мяжой паміж гэтым і "тым" светам. У вадзе жывуць душы заўчасна загінуўшых дзяўчат (русалкі)[7]. Балотная вада, напрыклад, лічыцца прытулкам нячыстай сілы. Таму старыя людзі раяць: калі заходзіш у ваду (у любым выпадку), трэба сказаць словы кароценькай замовы: "*Я ў ваду, нячысцік — з вады; я з вады, нячысцік — у ваду!*"

У асяроддзі беларусаў да нашых дзён захавалася няпісанае правіла абавязкова закрываць нанач калодзежы і посуд з вадой, іначай у ёй будуць купацца чэрці. Вельмі небяспечнай лічыцца вада, якая знаходзілася ў хаце, калі ў сям'і (і нават у вёсцы) нехта памёр. Таму, як толькі па вёсцы ляцела вестка аб смерці, гэту ваду тут жа вылівалі на двор.

Напрыканцы хочацца ўзгадаць агульнапашыраную перакананасць усіх падарожнікаў: калі вы хочаце зноў вярнуцца ў мясціну, якая вам спадабалася, абавязкова трэба ў вадаём ці фантан кінуць медную манету. Праўда, пакуль што ў нас "медзякоў" няма. Можа, калісьці з'явяцца. Будзем помніць традыцыю.

## "ЗЯМЛЯ СВЯТАЯ, ЯНА НАША МАЦІ"

На Беларусі шмат мясцін, рытуальнымі цэнтрамі якіх з'яўляюцца рукатворныя курганы. І гэта зусім не выпадкова. Са старажытных часоў курганы былі месцам пахавання найбольш знакамітых нашых продкаў, людзей неардынарных ва ўсіх адносінах. Таму часам курганы называлі валатоўкамі, бо, у адпаведнасці з легендамі, там былі пахаваны волаты-першапродкі.[1]

У 20 стагоддзі на долю нашага народа выпаў цяжкі і па-

кручасты лёс. Адной з найбольш пакутлівых старонак была Вялікая Айчынная вайна, пасля якой на месцах асабліва жорсткіх баёў былі ўзведзены мемарыяльныя комплексы. Сярод іх вылучаліся ўсё тыя ж курганы. Найбольш знакаміты — Курган Славы пад Мінскам. Ён насыпаны рукамі тых, хто вызваляў Беларусь і ўцалеў у тым ліхалецці. Сюды ж была прывезена зямля з тых мясцін, дзе адбываліся ключавыя падзеі той вайны.

У цэнтры Мінска, на плошчы Перамогі, быў створаны мемарыял. У спецыяльных урнах там знаходзіцца зямля, прывезеная з усіх гарадоў-герояў.

Чаму ж менавіта зямля аказалася тым свяшчэнным звяном, якое паяднала жывых і загінуўшых, мінулае і сучаснасць?

Вытокі такой выключнай пашаны трэба шукаць у нашай традыцыйнай культуры, шматлікіх абрадах, звычаях, творах вуснай народнай спадчыны.

З сівой даўніны лічылася, што ў аснове стварэння свету ляжаць чатыры найважнейшыя кампаненты: зямля, вада, агонь і паветра. Прычым, у адпаведнасці з біблейскімі паданнямі, *першай Бог стварыў зямлю*. З таго часу яна і з'яўляецца самай свяшчэннай часткай навакольнага свету. Аб гэтым яскрава сведчаць *шматлікія забароны і прадпісанні наконт паводзін людзей у дачыненні да зямлі*: яе нельга біць калом, бізуном, розгай. Некаторыя народныя лекары перакананы: той, хто плюе на зямлю, правакуе цяжкія захворванні органаў дыхання. Зямлю нават нельга калупаць нагой. У манголаў да гэтага часу абутак робяць з закругленым наском, каб нават спатыкнуўшыся, выпадкова не зачапіць зямлю. А ва ўсіх славянскіх народаў самай моцнай клятвай (ад якой ні пры якіх умовах нельга было адрачыся) лічылася тая, калі чалавек цалаваў, а затым з'ядаў жменьку зямлі.[2]

У адпаведнасці са старажытнымі міфалагічнымі ўяўленнямі зямля — жывая істота, якая несла ў сабе жаночы пачатак. Яна апладнялася жыватворным дажджом — увасабленнем мужчынскага пачатку — і давала новы ўраджай. Таму ў каляндарна-абрадавых песнях, у казках і легендах яе называюць не інакш як "маці-сырая зямля".

Як усё жывое, зямля нараджалася вясной, а памірала ўвосень. Гэта акалічнасць стала прычынай узнікнення шэрагу розных рытуальна-абрадавых дзеянняў, якія былі скіраваны на тое, каб, з аднаго боку, паспрыяць спору, урадлівасці зямлі, а з другога — накладвалі на паводзіны чалавека даволі жорсткія маральна-этычныя патрабаванні ў адносінах да яе. Напрыклад, на Масленіцу рабілі снежныя горкі, аблівалі іх вадой, а затым толькі што абраўшыя шлюб маладыя пары каталіся з

іх на санках. Штучны лёдавы пагорак — знак цяжарнасці зямлі, а катанне з яго мела двухбаковую накіраванасць: вірлівая моладзь імкнулася абудзіць зямлю, а тая ў сваю чаргу павінна была паспрыяць жыццядайнаму патэнцыялу толькі што заручонай пары. Напрыканцы Масленічнага тыдня людзі збіраліся ўсёй вёскай за ваколіцай і спальвалі саламяную Марану — смерць, увасабленне зімы. Затым кожны ўдзельнік абраду браў прыгаршчу попелу, ішоў на сваё жытнёвае поле, рассыпаў яго па ім і затоптваў у снег: няхай адышоўшае ў нябыт прарасце ўлетку новым коласам.[3]

Гэты ж самы сэнс — абуджэнне зямлі — укладваўся беларусамі і ў абрад велікоднага качання яек (святочная гульня таксама адбывалася на самым высокім месцы ў вёсцы). Для павелічэння ўрадлівасці зямлі па ўсіх кутках свайго прысядзібнага ўчастка гаспадар утыкаў галінкі вярбы, асвячонай у храме на Вербніцу. Ці, напрыклад, адразу пасля вяртання дадому з велікоднага ўсяночнага богаслужэння гаспадар садзіў за стол усю сям'ю і адбывалася доўгачаканая святочная трапеза, калі можна было ўдосталь наесціся смажаніны, вяндліны, каўбасы, сыру з маслам. Рэшткі, якія заставаліся на стале (шалупінне яек, косці, кавалачкі хлеба і яйка), бацька нёс на жытнішча і злёгку прысыпаў зямлёй.

Аналагічнае ахвяраванне прыносілася Духу Зямлі і напрыканцы жніва. Некалькі апошніх нязжатых каласоў прыгіналі долу і пакідалі, каб поле не заставалася "голым" і было спорым на будучы год.

Стаўленне да зямлі як да жывога арганізма сфарміравала ў асяроддзі беларусаў забарону чапаць яе ад Пакроваў (часта ад Узвіжання) і да Благавешчання або Радаўніцы. У гэты час нават помнік на магіле нельга было ставіць. Людзі сталага веку звярталі маю ўвагу на такую акалічнасць: калі нехта з блізкіх паміраў у той час, калі зямля "спала" (а трэба было капаць дол), то яна магла "наслаць" голад на гэтую сям'ю на тры наступныя гады.

У сувязі з гэтым неабходна нагадаць яшчэ адзін абрад, які быў вядомы ў асяроддзі паўночных славян і атрымаў назву "заложныя нябожчыкі". Стаўленне да зямлі як да святыні патрабавала перад пахаваннем пераапрануць нябожчыка ва ўсё чыстае, белае. Але калі чалавек скончыў жыццё самагубствам, яго не хавалі, а кідалі ў спецыяльную яму за гарадской мяжой (а ў вёсцы хавалі асобна), прыкрывалі ад звяроў галінамі дрэў. І толькі пасля таго як закончацца асноўныя палявыя работы, "заложных нябожчыкаў" хавалі на Сямік — у чацвер на сёмым паслявелікодным тыдні. Калі ж гэты звычай парушаўся, лічылі, што зямля нашле засуху і неўраджай.[4]

У традыцыйнай культуры беларусаў зямля ўспрымалася як родны кут, родная старонка, Радзіма, як месца нашага часовага існавання на гэтым свеце і як магіла — месца вечнага спачыну. Таму з такой павагай і нашы продкі, і нашы сучаснікі ставяцца да наведвання магілак, карпатлівага шчыравання вакол іх напачатку цыкла сельскагаспадарчых работ і напрыканцы яго. Прычым у пахавальным абрадзе зямля была і застаецца адным з асноўных рытуальных атрыбутаў, які надзяляецца неверагоднымі прароцка-магічнымі здольнасцямі. Напрыклад, апошнім рытуальным дзеяннем развітання з нябожчыкам з'яўляецца трохразовае кіданне жменькі зямлі ў магілу. І сёння беларусы перакананы: калі ў час пахавання нечакана абсыпецца край магілы, то гэта неабвержнае сведчанне, што на працягу года з гэтай сям'і пойдзе на "той" свет яшчэ хто-небудзь.

Зямля шырока выкарыстоўваецца ў чорнай і белай магіі. Напрыклад, каб хлопец добра адслужыў у войску і вярнуўся дадому жывым і здаровым, маці прасіла сына выканаць наступнае рытуальнае дзеянне: босай правай нагой пакінуць каля парога хаты выразны след. Яна збірала зямлю са следа ў чыстую хусціну, завязвала на два вузлы і несла ў хату, каб захоўваць за іконай на ўвесь тэрмін вайсковай службы.[5]

Такім чынам, мы нараджаемся на зямлі, пройдзем па ёй, пакінуўшы, спадзяемся, выразны след, а праз нейкі час навечна адыдзем у яе мацярынскае ўлонне. У адным з паданняў, запісаных М.Федароўскім, ёсць цудоўныя паэтычныя радкі, якія адлюстроўваюць нашы адносіны да зямлі і бацькоўскую павагу да яе:

Зямля святая, яна наша маці,
Яна нас жывых корміць,
а па смерці да сябе прыхіляе.[6]

## СІМВОЛІКА ДРЭЎ

### "КУЧАРАВАЯ, А НЕ ДЗЯЎЧЫНА"

У традыцыйнай культуры славян адметнае месца займаюць два дрэвы: дуб і бяроза. Калі з дубам звязаны ўяўленні аб пабудове Сусвету, аб эмацыянальна-культурным цэнтры, вакол якога разгортваліся шматлікія язычніцкія свяшчэннадзействы, аб мужчынскім пачатку ў бесперапыннай жыццёвай плыні, то бяроза сімвалізавала сабой жаночы пачатак і менавіта таму стала вызначальным атрыбутам цэлага шэрагу святочных рытуальных комплексаў, асноўнымі ўдзельнікамі якіх былі дзяўчаты.

З асаблівай пачцівасцю і шанаваннем ставіліся да бярозы ўсходнія славяне падчас правядзення траецка-сёмушных, або "зялёных святак". Каб зразумець вызначальную ролю гэтага магічнага дрэва ў веснавой абраднасці і песнятворчасці, паспрабуем зазірнуць у сівую даўніну не толькі беларусаў, але і іншых еўрапейскіх народаў. Розныя этналагічныя крыніцы сведчаць, што практычна ва ўсіх народаў Старога свету вядома прыгожае свята ў гонар майскага дрэва. Яно прыпадала на 1 мая і адпавядала важнай падзеі – пачатку лета. Перадсвяточным адвячоркам у цэнтры населеных пунктаў ставілі ўпрыгожанае дрэва – старадаўні сімвал росквіту прыроды, урадлівасці зямлі, пачатку новага цыкла жыццяпісу роду чалавечага. Абранне ў якасці такога сімвала бярозы было зусім не выпадковым. Яна адной з першых рэагавала на сонечнае цяпло, ажывала і распачынала актыўны рух сваёй унутранай энергіі.[1]

Навукоўцы-этнографы лічаць, што свята ў гонар ушанавання майскага дрэва ўзнікла ў тыя часы, калі еўрапейскія народы пераходзілі да земляробства. Свяшчэннае дрэва павінна было перадаць сваю жыццесваральную здольнасць зямлі і актыўна ўплываць на яе ўрадлівасць. Ва ўсходніх славян, у тым ліку беларусаў, ушанаванне майскага дрэва адбывалася не на пачатку, а напрыканцы мая, што цалкам адпавядала надыходу лета ў нашай геаграфічнай зоне.

З прыходам хрысціянства "зялёныя святкі" набылі рухомы характар і сталі адзначацца адначасова з Тройцай. Кожная сялянская сям'я аздабляла свой падворак і хату маладой зелянінай. Вароты, сцены хлява, дзверы ў хату, вуглы, сенцы ўпрыгожвалі галінкамі магічна-ахоўнага дрэва. Людзі імкнуліся "забяспечыць" сябе дабрабытам, плённасцю ў працы і прыгожым даўгалеццем. Асабліва выразным у гэтым плане быў звычай ставіць "май" – маладое бярозавае дрэўца ў рост чалавека – пад кожным акном хаты з боку двара.[2] Калі ж згадаць, што акно – вока ў свет, пасрэднік паміж жыллём чалавека і Сусветам, космасам, то стане зразумелым: *тры* ўкапаныя *бярозкі пад трыма вокнамі* доўгай сцяны хаты – гэта абавязковае *ўключэнне кожнага з трох пакаленняў*, якія жылі пад адным дахам адной сям'ёй, *у чарговы кругаварот жыцця*, у веснавы вір прыроднага абуджэння і росквіту.

Бярозавыя гаі станавіліся ў гэты час месцам чарадзейства дзяўчат перадшлюбнага ўзросту. У чацвер Траецкага тыдня, на Сямік, яны збіраліся гуртам і са звонкімі песнямі-вяснянкамі ішлі ў гай "завіваць бярозкі". Кожная з іх выбірала асобную мясцінку, дзе дрэўцы раслі вельмі блізка, прыгіналі вяршаліны і папарна сплятали іх у вянок. Вянкоў плялі гэтулькі,

на колькі чалавек варажылі: для бацькі, маці, сясцёр і братоў, для свайго каханага. Роўна праз тыдзень, у чацвер Русальнага тыдня, дзяўчаты зноў ішлі ў лес, каб расплесці вянкі і даведацца аб долі сваіх родных. Па стану бярозавага вянка (засохлы або жывы, зялёны) яны імкнуліся прадказаць, які век наканаваны кожнаму.[3]

Старажытны сэнс гэтага абраду дае падставы меркаваць, што бяроза была ва ўяўленнях нашых далёкіх прашчураў своеасаблівым дрэвам-медыятарам, якое звязвала паміж сабой “той” свет (царства памёршых продкаў) і гэты свет – уладанні іх жывых нашчадкаў. У гэтым выпадку варажба дзяўчат – і завіванне бярозак, пусканне бярозавых вянкоў на ваду – была закадзіраваным, сімвалічным дыялогам з продкамі, спробай з іх дапамогай зазірнуць у дзень заўтрашні, апрадмеціць і прачытаць хоць бы ў самай сціслай форме кнігу свайго жыцця. Напрыклад, чый вянок першы прыстане да берага, тая раней за ўсіх пойдзе замуж. Калі ж вянок нечакана закруціць вірам і пацягне на дно, чакай розных непрыемнасцей, а то і смерці.[4]

Аб непасрэднай сувязі бярозы з царствам мёртвых і іх здольнасці ўплываць на ўрадлівасць зямлі сведчылі таксама і абрады Русальнага тыдня. У шматлікіх міфалагічных легендах і паданнях адзначаецца, што русалка ў гэты час выходзіць з вады і гойдаецца на галінах бярозы. Прычым падкрэсліваецца нават вонкавае падабенства русалкі і яе радавога дрэва.

Бярозавы вянок выконваў ролю не толькі прадказальніка, але і засцерагальніка. Каб ўратаваць статак кароў ад ваўкоў і паспрыяць яго малочнасці, пастухі завівалі вянкі і надзявалі іх на рог жывёліне. Адзін вянок прадбачлівы пастух аддаваў вечарам гаспадыні, якая клала яго на з’ядзенне карове, а другі потым высушвала і карысталася ім як магічным амулетам.[5]

У больш познія часы майскае дрэва пачало выкарыстоўвацца і ў некаторых іншых сацыякультурных кантэкстах. Скажам, малады хлопец ставіў бярозку перад акном хаты сваёй каханай, выказваючы свой намер узяць з ёю шлюб.

Глыбокія міфалагічныя карані шматлікіх славянскіх вераванняў, звязаных з бярозай, пакінулі значны след у розных жанрах вусна-паэтычнай творчасці. Як сімвал сувязі з “тым” светам яна фігуруе ў народных замовах і казках. Так, на пачатку 80-х гадоў у Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці была запісана казка, у якой бяроза з’яўляецца дрэвам-першапродкам, дрэвам-татэмам.[6]

У больш познія часы роля бярозы ў жыцці чалавека значна пашыралася. Яна стала адным з найлепшых прамысловых дрэў. Дровы з яе цешылі селяніна сваім цяплом на працягу

доўгай марознай зімы. Бярозавым сокам можна было наталіць смагу ў час летняй спякоты. Адвары лісця і пупышак шырока выкарыстоўваліся пры лячэнні рэўматызму і іншых захворванняў. Нездарма ж бярозавы венік стаў найважнейшым атрыбутам такой ачышчальнай працэдуры, як параннe ў лазні. Высокі ціск хутка паніжаецца, калі выпіць шклянку настою чагі – грыба, які расце на бярозе.

Гэта побытавая універсальнасць дрэва апаэтызавана ў шматлікіх народных прыказках  і загадках:

*"Зялёная, а не луг, белая, а не снег, кучаравая, а не дзяўчына".*

*"Крой маю п'юць, косці мае паляць, маімі рукамі адзін аднаго б'юць".*

*"Ой, Божа, мой Божа, крой маю ссуць, мяса маё ядуць, косці на агні паляць".*[7]

Яшчэ ў першай палове 20 ст. на Берасцейшчыне маладыя, вяртаючыся ад вянца, праязджалі пад жывой бярозавай аркай, утворанай перапляценнем вяршалін двух дрэў, што стаялі паабапал дарогі. Прыгожы, паэтычны і глыбока сімвалічны звычай, за якім бачыцца ўслаўленне чысціні і святасці Богам створанага шлюбу, праз які апявалася цнатлівасць нявесты, адвечны клопат роду чалавечага аб шчаслівай долі.

На жаль, не часта можна ўбачыць, каб сучасны вясельны поезд праязджаў праз такую браму вернасці і лучнасці ў сусвет даўгалецця  і вечнасці.

## ТАМ СТАІЦЬ ДУБ

Ужо адзначалася, што архітэктура сялянскага жытла яўляе сабой як бы змешаную мадэль міфапаэтычнага космасу беларусаў. Тры асноўныя ўзроўні добра знаёмай нам вясковай хаты — дах, жылая частка і пограб — адпаведна суадносяцца з трыма сферамі касмапланетарнай пабудовы ў славянскай міфалогіі і вусна-паэтычнай творчасці. Вышэйшую сферу, сферу духоўнай існасці займае язычніцкі пантэон багоў, сярэдні ярус належыць чалавеку і жывёльнаму свету, а ніжні — насяляюць хтанічныя істоты і нашы продкі.

Цікава адзначыць, што кожная з гэтых сфер не ізалявана, а наадварот, суіснуе ў пэўных узаемаадносінах з усімі астатнімі. Прычым своеасаблівым медыятарам, сувязным звяном з'яўляецца чалавек, жыццё і дзейнасць якога, у сваю чаргу, залежаць ад характару ўзаемадзеяння як з вышэйшым, так і ніжэйшым светам. Яскравае сведчанне таму — шматлікія народныя святы, абрады і традыцыі. Напрыклад, на Грамніцы асвя-

чаліся свечкі, якія на працягу года суправаджалі практычна ўсе найбольш значныя падзеі ў жыцці чалавека. Кожны новы цыкл сельскагаспадарчых работ распачынаўся перш-наперш навядзеннем парадку на магілах продкаў, ад прыхільнасці якіх, лічылі, залежыць урадлівасць зямлі.

У беларусаў, як і ў іншых славянскіх народаў, адным з увасабленняў міфапаэтычнай мадэлі свету з'яўляецца *сімвал* вечнага *жыцця — дуб*. Дастаткова нагадаць адзін з найбольш устойлівых матываў такіх старажытных вусна-паэтычных твораў, як замовы і казкі, і мы ўбачым, што даволі часта асноўнае сюжэтнае дзеянне ў іх разгортваецца ў тым месцы, дзе расце гэты валадар свету:

"На моры-акіяне, на востраве Буяне стаяў дуб Якуб на дванаццаць какатоў, на дванаццаць парасткаў. На тым дубе залатое гняздо, у тым гняздзе ляжаў вуж".[1]

Дубовыя гаі або месцы, на якіх раслі паасобныя вячыстыя дрэвы, лічыліся свяшчэннымі. Нашы продкі адзначалі каля іх найбольш важныя гадавыя святы, пры гэтым абавязкова прыносілі ім свае ахвяраванні. Пад шатром агромністых галін нязгасна гарэў свяшчэнны агонь — сімвал бесперапыннасці людскога радаводу.

Дарэчы, у шматлікіх тэкстах народных замоў можна знайсці як бы апісанне маршруту да месца свяшчэннадзейства. З прыняццем хрысціянства гэтым месцам становіцца чырвоны кут у хаце, дзе народныя лекары і пачалі выконваць цудадзейны магічны рытуал. Аднак яны ўсё роўна згадвалі магічную формулу, пры дапамозе якой мысленна пераносіліся на колішняе свяцілішча:

"Устану я рана-раненька, памыюся белым-бяленька, благаслаўлюся-перахрышчуся. Пайду з дзвярэй у дверы, з варот у вароты, выйду ў чыстае поле на ўсход сонца. Там стаіць дуб..."

Аб тым, што менавіта дуб (як адзінае цэлае) быў свяшчэнным дрэвам ва ўяўленнях нашых продкаў, сведчыць той факт, што паасобныя яго часткі (галінкі, кавалачкі) не скарыстоўваліся ў якасці атрыбутаў у народных абрадах і рытуалах. У той жа час і многія іншыя дрэвы выконвалі ці не галоўную абрадатворную ролю: вярба — падчас святкавання Вербніцы і Юр'я; бяроза — на Юр'я, Тройцу і Купалле; клён — на Тройцу і г.д.[2]

Аднак менавіта дуб ва ўсёй сваёй цэласнасці і непарушнай святасці згадваецца ў шматлікіх казках, легендах, паданнях, прыкметах і павер'ях, загадках. Напрыклад, у беларускім фальклоры шырока вядома такая загадка:

Стаіць дуб-старадуб,
На тым дубе-старадубе
Сядзіць пцічка-варанічка,
Ніхто яе не спаймае:
Ні цар, ні царыца,
Ні красна дзявіца.[3]

"Пцічка-варанічка", якая сядзіць на вяршаліне магутнага дрэва, не што іншае, як Ярыла — Сонца. Такім чынам, тут у паэтычнай форме падаецца структура Сусвету, *верхняя частка* якога належыць Богу, свету дабра і ведаў. Непасрэдна з гэтай загадкай звязаны замовы, у якіх адзначаецца, што ў кроне гэтага дрэва звівае гняздо *воран* або *вуж*. Шматлікія сацыякультурныя кантэксты сведчаць: адзін і другі (дуб і сонца) *з'яўляюцца сімваламі вечнасці, празарлівасці, пазнання*. Нагадаю, лічылі, што той чалавек, які атрымлівае на Узвіжанне вужову карону, пачне разумець мову прыроды і зможа прадказваць лёс суродзічаў.

У некаторых іншых варыянтах гэтай загадкі ёсць, на першы погляд, не зусім прыкметны паварот думкі: ніхто ад гэтай птушкі "не адхрысціцца". Канечне ж, у дадзеным выпадку гаворка ідзе пра смерць. І тады зразумела, чаму смерць аднаго з папулярных казачных герояў — Кашчэя Бессмяротнага — знаходзіцца ў куфэрку, які падвешаны на разгалістай кроне высачэзнага дуба. Хто асмеліцца парушыць пакой свяшчэннага дрэва і залезці на яго вяршаліну? Ніхто з людзей нават і падумаць аб гэтым не мог. Менавіта таму яйка як сімвал вечнага жыцця — бяссмерця — знаходзіцца пад аховай татэмнага дрэва, якое вызначае лёс кожнага чалавека.

Неабходна адзначыць і такі цікавы гістарычны факт. На тэрыторыі рассялення старажытных славян археолагі знайшлі мноства фігур аднаго з галоўных багоў нашых продкаў — Перуна. Большасць з іх была выраблена з дубовых калодак. Яшчэ ў бягучым стагоддзі на Беларусі некаторыя са свяшчэнных дубоў называлі "перуновымі".[4]

*Сярэдняя частка* дрэва сусвету сімвалізавала прастору жыццядзейнасці чалавека. Ён прыходзіў да дуба не толькі ў час ахвярапрынашэнняў. Месца вакол яго было для нашых продкаў цэнтрам агульнай еднасці. Мне пашчасціла запісаць народную казку, у якой гаварылася, што каля дуба адзначалася вяселле, а сам абрад шлюбу заключаўся ў трохразовым абыходзе маладымі свяшчэннага дрэва. Ці не адтуль, з тых даўніх часоў захавалася ў нас традыцыя абавязкова наведаць агульнанацыянальныя святыні адразу ж пасля вянчання ў храме або пасля рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСе?

Да дуба "звярталіся" і па дапамогу. Лічылася, што ён пад-

сілкоўвае чалавека сваёй энергіяй, дае моц і здароўе. Напрыклад, калі балела спіна, трэба было тройчы пацерціся аб яго ствол пасля таго, як прагрыміць першы гром. Настоем дубовай кары ў народнай медыцыне лечаць некаторыя скурныя захворванні, а таксама зубны боль. Многія вядомыя мне знахары лечаць грыжу,прыкладваючы да жывата дубовую цурбалку з сучком. Сучасныя спецыялісты ў галіне біяэнергетыкі звычайна даюць такую параду: калі вы адчуваеце сябе кепска, спачатку трэба падысці і пастаяць каля алешыны — яна забірае адмоўную энергію, затым на некалькі хвілін абхапіць рукамі дуб, які надоўга падсілкуе вас станоўчым энергетычным патэнцыялам.

Яшчэ ў пасляваенныя часы ў некаторых мясцінах Беларусі да свяшчэнных дубоў прыходзілі на Радаўніцу, ахвяруючы дрэву пэўныя памінальныя стравы, а на яго галінках развешвалі белыя саматканыя ручнікі.

*Ніжняя частка* дрэва сусвету суадносіцца ў народнай міфалогіі з хтанічным светам, месцам існавання розных пачвар. У тых жа замовах ад змей сустрэнем наступны ландшафтны арыенцір: "На сінім моры-акіяне стаіць дуб, пад тым дубам ляжыць Латыр-камень, пад тым камнем ляжыць чорная руна, у той руне жыве змяя, змяя Скурапея..."[5]

У некаторых беларускіх чарадзейных казках адзначаецца, што пад дубам знаходзіўся ўваход у "трыдзевятае царства" — царства смерці: "Так Вырві-дуб даляцеў да дуба, нарваў аднаею рукою, вырваў з коранем, як махнуў, так ніведзь дзе паляцеў! Ажно ж бачыць, нара ў гару ідзе пад тым дубам!"[6]

Такім чынам, прыродны волат нашай зямлі ўяўляе сабой вельмі складаны і вельмі багаты па зместу сімвал. Гэта і мадэль сусвету, гэта і напрамак працякання часу з мінулага праз дзень сённяшні і ў будучыню, гэта і радаводны "летапіс", які надзейна звязвае прашчураў і нашых сучаснікаў. Апошнюю генеалагічную повязь прадстаўнікоў розных пакаленняў вельмі трапна сфармуляваў Р.Барадулін:

Чым цягнецца вышэй
у неба дрэва —
Глыбей
ідуць карэнні ў зямлю.

## "ДА Й АСІНКАЮ ЗАЛАМЛЮ"

Ёсць у нашых лясах яшчэ адно незвычайнае дрэва – асіна, вакол якой аплялося мноства легенд і паданняў, прыкмет і павер'яў. Самае дзіўнае – у яе "паводзінах". Нават калі пры-

рода, здавалася б, заснула глыбокім сном, які не парушаецца і лёгкім павевам ветру, асіна трымціць, шапоча сваім лісцем, бы хвалюецца за нейкі непапраўны грэх. Так яно ці не так – адзін Бог ведае, але праз стагоддзі, з глыбокай даўніны даляцела легенда, быццам наканавана ёй вечна трэсціся за тое, што з яе быў зроблены крыж, на якім Сын Божы Ісус Хрыстос быў распяты іншаверцамі. Народнае паданне сцвярджае, што і цвікі, якімі прыбілі Збавіцеля да крыжа, таксама былі асінавымі. Ёсць яшчэ адно тлумачэнне незвычайных "паводзін" гэтага дрэва. Падчас уцёкаў у Егіпет іудзеяў Маці Боская схавалася са сваім сынам пад асінай, але тая шапаценнем лісця выдала іх. А адна са старажытных легенд паведамляе, што на асіне павесіўся самы вядомы здраднік з роду чалавечага – Іуда.[1] Больш позняе беларускае паданне "Пра бярозу і асіну" пасвойму "асэнсоўвае" прыродную асаблівасць дрэва. Яно зазначае: бяроза і асіна – гэта няверная жонка і яе палюбоўнік. Жонка разам з каханкам забіла свайго мужа, за што Бог ператварыў яе ў бярозу і тая штогод абліваецца слязамі (сок пускае) за свой учынак. "Палюбоўнік жа астаўся асінаю, якая ўвесь час трасецца са страху дрыжачаю ліствою,"[2] – падводзіць вынік паданне, укладваючы ў гэтыя словы маральна-этычнае асэнсаванне злачынства.

Усе гэтыя аповеды пра лёс дрэва, відаць, у многім і прадвызначылі стаўленне да яго беларусаў і іншых славянскіх народаў. Каб перасцерагчыся ад хваробы, нашы продкі не выкарыстоўвалі гэта дрэва пры будаўніцтве хаты, не садзілі на падворку. Але, каб пазбавіць гумно і хлеў ад нячыстай сілы, у сцяну абавязкова клалі некалькі асінавых плашак.

У шэрагу рытуалаў, звязаных з чорнай магіяй, яскрава прасочваецца цесная сувязь асіны з чортам, з нячыстай сілай. Жыхар вёскі Вялікі Рожан Салігорскага раёна М.Коўчык (дарэчы, таленавіты майстар слова, які ведае процьму мясцовых казак, легенд і паданняў) расказаў мне, як тутэйшы люд вызначаў, хто з вясковых жанчын-вядзьмарак забіраў у кароў малако. Гаспадар высякаў вялікі асінавы кол і ўбіваў у зямлю, здзіраў з яго кару і кідаў на раскладзенае вогнішча, над якім падвешвалася даёнка, дзе кіпяцілася марлевая цадзілка. Кажуць, ведзьма абавязкова прыйдзе прасіць патушыць вогнішча.[3]

Распазнаць ведзьму можна было і іначай. Асінавымі дрэвамі палілі ў печы, а затым на полымя ставілі патэльню з соллю. Праз некалькі хвілін у хату ўлятала вядзьмарка і абяцала адрабіць назад нанесеную карове шкоду, якая ні з таго ні з сяго пачынала даіцца крывёю.

З этнаграфічнай літаратуры таксама вядома, што асіна вы-

карыстоўвалася падчас розных святкаванняў як надзейны абярэг гаспадарчых пабудоў і свойскай жывёлы. Напрыклад, на Юр'я, у дзень першага выгану жывёлы ў поле, гаспадыня сцёбала карову галінкамі вярбы, а вось каб перасцерагчы яе ад ведзьмаў, якія спраўлялі шабас у купальскую ноч, у дзверы хлява ўтыкалі некалькі галінак асіны. Праз асінавае галлё, пакладзенае перад парогам хлява, павінен быў пераступіць конь, якога толькі што купілі і прывялі дадому. Нанач у вуглах будучай хаты (як толькі быў пакладзены першы вянок падрубы) ставілі чатыры асінавыя калы. Такой жа "агароджай" селянін перасцерагаў сваю жытнёвую ніву незадоўга да збору ўраджаю, каб ніхто не зрабіў заломаў і не забраў спор на будучы год. А калі такое ўсё ж здаралася, то мясцовы знахар вырываў залом калом і спальваў скручаныя каласы на асінавым вогнішчы. Асінавыя ж калы ўбівалі ва ўсіх канцах вёскі, каб перасцерагчы яе ад эпідэміі.[4]

У песеннай спадчыне беларусаў, асабліва ў траецка-сёмушным цыкле, шырока вядома паэтычная метафара "заламіць асіну":

Правяду русалку, правяду
Да й асінкаю заламлю,
Каб тая русалка
Па жыце не хадзіла,
Майго жыта не ламіла.
Маё жыцейка дробнае
Ды ў каласкі буйнае.
Правяду русалку, правяду
Да й асінкаю заламлю.[5]

"Заламаць асінку" – значыць, выканаць адпаведнае рытуальнае дзеянне ў пэўны час (у свята) і пэўным месцы (за ваколіцай, на мяжы лесу і поля, поля і ракі як культуралагічных сімвалаў "таго" і гэтага свету) з мэтай перасцярогі радавой тэрыторыі.

Асіна як адзін з галоўных рытуальных атрыбутаў шырока выкарыстоўвалася ў пахавальнай абраднасці, асабліва ў выключных сітуацыях. Вядома, што над магілай чалавека, памёршага "сваёй" смерцю, ставілі сасновы крыж. Самагубцаў або тых, хто памёр заўчасна, хавалі не на агульных могілках, а асобна. Лічылі, што яны маглі нават пасля смерці ўчыняць шкоду жывым, таму прама ў цела нябожчыка ўбівалі вялізны асінавы кол. Гэты звычай даў жыццё ўстойліваму словазлучэнню "колам стаў", якое па сваёй стылістычнай афарбоўцы нагадвае звычайны праклён.

На поўдні Беларусі на магіле мёртванароджанага дзіцяці распальвалі вогнішча з асінавага голля, а на магілцы ж нях-

рышчанага дзіцяці пакідалі камень або трохкутнік, складзены з галін асінавага дрэва.

Зразумела, што такое вялікае кола ахоўна-магічных рытуалаў не магло не паспрыяць выкарыстанню асіны ў народнай медыцыне. Вялікае няшчасце, калі ў сям'і дзіця хварэе на эпілепсію. Што толькі не спрабавалі народныя лекары, каб пазбавіцца гэтай бяды! Нават шматок валасоў затыкалі ў вушак дзвярэй і забівалі асінавым калком. Меркавалі: дзіця перарасце (перагоніць) сваю хваробу і такім чынам назаўсёды адолее яе. Бяссоніцу, крыксы, начніцы таксама лячылі з дапамогай асіны: з невялікага палена выдзёўбвалі спецыяльныя ночвы і клалі іх ў калыску. Лекавалі таксама зубны боль, грыжу і спуд.

Неаднаразова на сваім ўласным вопыце пераконваўся, што "збіць" павышаны ціск і суцішыць галаўны боль можна вельмі простым спосабам: да патыліцы прыкласці асінавы кругляк і патрымаць некалькі хвілін. А каб адчуваць сябе лепш, на тое ж месца затым пакладзіце бярозавую дошчачку. Вельмі хутка ваша стомленасць пройдзе.

Трымайце ў хаце як мага больш прадметаў з натуральнага дрэва, і ваша здароўе адгукнецца на энергетыку прыроды.

# СІМВОЛІКА БЕЛАРУСКАГА ЖЫТЛА

## ЧЫРВОНЫ КУТ

Наша родная зямля ўдоўж і ўпоперак апаясана міжнароднымі магістралямі, знакамітымі гістарычнымі шляхамі, гасцінцамі, прасёлкамі. Аднак галоўная пуцявіна чалавечага жыцця – дарога ад роднага дому да храма.

Чырвоны кут сялянскай хаты і алтар велічнага хрысціянскага храма на першы погляд непараўнальныя. Але гэта толькі на першы погляд, бо і тое і другое – эпіцэнтр духоўнага жыцця чалавека. Храм з яго велічнасцю, узнёсласцю, імклівым бегам да нябёсаў заўсёды быў і застаецца свяшчэнным востравам , на якім злучаюцца лёсы людзей, полем духоўнасці, якое ачышчае душу кожнага з нас і сілкуе яе энергіяй Космасу, сфакусіраванай у абразах Багародзіцы, Ісуса Хрыста, яго апосталаў, мноства святых.

Уся прастора храма дакладна структуравана, кожная яго зона строга вызначана і выконвае сваю непаўторную ролю. Мы памятаем, напрыклад, што з левага боку ставілі свечку за здароўе жывых, з правага – у гонар тых, хто стаў добрай памяццю нашага роду. Галоўная вось храма звычайна з'арыен-

тавана на першы прамень узыходзячага сонца ў дзень таго святога, імя якога будзе нададзена царкве або касцёлу. Падчас набажэнства хрысціянін становіцца сведкам папярэдняй гісторыі царквы, гісторыі жыцця яе заснавальніка Ісуса Хрыста. На працягу некалькіх гадзін ён перажывае-пражывае жыццё Хрыста, тым самым нібы суадносячы свой жыццёвы шлях, разгорнуты ў часе і прасторы, узважваючы адпаведнасць уласных этычных арыентацый дзесяці асноўным запаветам хрысціянства. *Храм – зямны прытулак, на якім чалавек атрымлівае сілу веры і спадзявання.*

Вертыкальная структура храма нагадвае мадэль Сусвету, космасу, якая мае тры адпаведныя ўзроўні. Верхні ярус – сфера вечнасці, сярэдні – сфера жывых, а падполле, або скляпенне, – зона смерці, зона захавання продкаў. Нагадаем структуру Нясвіжскага фарнага касцёла, пад падлогай якога знаходзіцца адзіны ў Еўропе склеп, у якім да сённяшняга часу захоўваюцца 102 саркафагі з продкамі радаводу Радзівілаў.

Сваёй фундаментальнасцю, памерам функцыянальных частак, сузалежнасцю службовых зон храм быў разлічаны на абшчыннае свяшчэннадзейства, таму, прыцягваючы да сябе чалавека, ён разам з тым падаўляў яго сваёй веліччу. Чалавек губляўся ў ім.

Зусім па-іншаму адчуваў сябе чалавек у прасторы звычайнай сялянскай хаты. На працягу шэрагу стагоддзяў беларусы выпрацавалі такі космас свайго жытла, які абавязкова спрыяў духоўнай і фізічнай камфортнасці. Яго маштабы адпавядалі агульначалавечым параметрам і тым самым стваралі адчуванне не прыніжэння, а наадварот – уласнай велічы і гаспадарскага авалодання прастораў.

Як у храме, так і ў звычайнай сялянскай хаце існаваў дакладны парадак. Кожнае яе акно, куточак, лава, ложак, печ, стол, парог, бэлька мелі сваё непаўторнае прызначэнне. У адным з папярэдніх артыкулаў ужо вялася гаворка пра вертыкальную структуру хаты. Зараз хацелася б больш дэталёва разгледзець гарызантальную структуру прасторы жывых.

На большай частцы тэрыторыі Беларусі пашырана традыцыя рабіць тры акны ў доўгай (з двара) сцяне хаты. Гэта невыпадковы сімвал: ён увасобіў у сабе тры пакаленні, якія звычайна жылі пад адным дахам: бабулю з дзядулем, бацьку і маці, а таксама трое дзетак. Каб пераканацца, што гэта так, трэба ўвайсці ў хату і ўважліва прыгледзецца да яе інтэр'ера. Тады ўздоўж супрацьлеглай – без вокнаў – сцяны мы заўважым атрыбуты пражывання кожнага з трох пакаленняў: два ложкі і палаці на печы.

Вядома, што ў жылой частцы хаты звычайна было тры



Акно — як канал сувязі з іншым светам. Фота пачатку 20 ст. Слуцкі раён.

бэлькі, якія не толькі ўтрымлівалі дошкі столі, але і дзялілі прастору хаты на адпаведныя зоны. Прастора хаты ад парога да першай бэлькі (каля печы) была зонай гасцей (адсюль і сучасная назва першага невялічкага пакойчыка ў гарадской кватэры – прыхожая, для тых, хто прыходзіць у госці), затым зона гаспадароў і нарэшце трэцяя бэлька выконвала ролю радаводнага дрэва жыцця і памяці. Пад ёю жывыя звычайна не сядзелі.

Дык вось менавіта ў першую бэльку (бліжэй да печы, сімвала жыцця і зоны пражывання старэйшага пакалення) убіваўся крук, да якога мацавалася люлька для немаўля. Атрымліваецца звычайная педагагічная сітуацыя. Бэлька яднала два пакаленні. З аднаго боку, старэйшае (як носьбіт народнай мудрасці) і малодшае – якому гэтую мудрасць трэба было перадаць. Тое ж мы маем у зачыне большасці народных казак: “Жылі-былі дзед і баба і былі ў іх унукі”.

У кожнай вясковай хаце былі *два сімвалы жыцця – печ* і *стол*, якія звычайна знаходзіліся па дыяганалі адзін ад аднаго. Стол заўсёды стаяў бліжэй да *самага свяшчэннага месца хаты – чырвонага кута*. Уласна кажучы, покуць – пачэсны кут выконваў ролю невялічкай, прыбліжанай да чалавека копіі храма. З гэтай нагоды ў верхняй частцы кута заўсёды вісеў абраз, абавязкова пакрыты прыгожым саматканым ручніком.[1]

Кожная святочная падзея або рытуальная сітуацыя, звязаныя з асноўнымі этапамі чалавечага жыцця, разгортваліся ў непасрэднай блізкасці да чырвонага кута. Напрыклад, тры калядныя куцці падчас падрыхтоўкі святочнай вячэры стаялі на покуці, на лаве, засланай сенам і белым ручніком. Там жа знаходзілася "бабіна каша" як асноўны атрыбут радзінна-хрэсьбіннай абраднасці, а на працягу года стаяў "гаспадар" – апошні жытнёвы сноп чарговага ўраджаю.

Бадай самую значную ролю выконваў чырвоны кут у час святкавання вяселляў, а таксама калі спраўляліся пахавальна-памінальныя сталы. За вясельным сталом маладыя сядзелі менавіта на покуці, дзе як бы сыходзіліся, звязваліся ў адзінае цэлае дзве сцяны – сімвалы двух родаў. Сцяна з боку двара сімвалізавала тэрыторыю гаспадароў, таму ўздоўж яе і садзіліся госці з боку маладога. Нявеста прыходзіла "з вуліцы", а таму прадстаўнікі яе роду рассаджваліся ўздоўж сцяны з двума вокнамі (для месяца і сонца).[2]

За ўсё жыццё чалавек меў права толькі двойчы заняць галоўнае месца ў чырвоным куце. Другі раз – адразу ж пасля смерці. Спачатку яго клалі на лаву, а затым, калі была падрыхтавана труна, перакладвалі ў яе і зноў-такі ставілі ў кут, галавой да абразоў.

Прычым абавязкова трэба звярнуць увагу на прынцып размяшчэння гасцей у час той ці іншай вечарыны. На вяселлі пачэснае месца на покуці займалі маладыя. Побач з імі садзіліся шафер і шаферка: гэтым давалі знаць, што яны (сведкі) павінны падхапіць і прадоўжыць эстафету жыцця. (Таму на другі дзень вяселля, пасля дзяльбы каравая, маці жаніха здымала з нявесты вэлюм і перадавала яго шаферцы.) Затым за стол садзіліся хросныя бацькі маладых. А далей па ўзросту папарна рассаджваліся ўсе старэйшыя людзі. Для самых старых накрываўся асобны стол, каля парога.

Калі ж у хаце ладзілі памінальную вечарыну для прадстаўнікоў свайго роду, то на вугал стала, бліжэй да покуці, ставіўся сподак – рытуальны знак таго, хто адышоў у нябыт. Госці ж за сталом рассаджваліся ў такім парадку: уздоўж сцяны садзіліся па ўзросту мужчыны, а ад сярэдзіны хаты, зноў-такі пачынаючы са старэйшых, – жанчыны. Логіка пасадкі была тая ж: наступная чарга за намі. Таму за памінальны стол не пажадана садзіць нежанатую моладзь, бо народная прыказка строга папярэджвае: "не лезь раней за бацьку ў пекла".

За абразамі, што віселі ў чырвоным куце, звычайна захоўваліся асноўныя свяшчэнныя атрыбуты ахоўна-засцерагальнага характару. Тут ляжалі грамнічныя свечкі, без якіх не адбывалася ніводная рытуальная падзея; у белай хусцінцы

знаходзілася жменька зямлі са следам хлопца, які пайшоў у войска, і г.д.

У паўсядзённым жыцці тройчы на дзень тут, за сталом, збіралася сям'я, каб падсілкавацца не толькі фізічна, але і духоўна.

## ПРАЗ ПАРОГ РУКІ НЕ ПАДАВАЙ

Такая звычка бытуе ў нашым народзе і цяпер. А вытокі яе — у сівой мінуўшчыне. Найбольш старажытныя па часе ўзнікнення народныя казкі, паданні, легенды, замовы і загадкі даюць магчымасць зрабіць выснову аб трохузроўневай міфапаэтычнай мадэлі сусвету беларусаў. Верхні ўзровень займаў пантэон язычніцкіх багоў, сярэдні належаў самому члавеку, а ніжэйшы (падземны) быў месцам існавання розных пачвар. Падзямелле было адначасова і месцам вечнага існавання продкаў. Чалавек, займаючы сярэдні, прамежкавы статус у гэтай іерархіі, адчуваў сваю залежнасць і ад сусвету багоў, і ад свету продкаў. Усё яго жыццё было скіравана на пошук магчымасцей гарманічнага суіснавання.

Яскравым сведчаннем трохузроўневасці славянскай мадэлі сусвету з'яўляецца драўлянае дойлідства беларусаў, а таксама кампазіцыя некаторых жыццёва важных атрыбутаў сялянскага жытла. Абапіраючыся на фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы 19—20 ст., паразважаем аб структуры звычайнай беларускай хаты.

Аказваецца, у сваім класічным выглядзе стуктура хаты таксама мае тыя ж тры сферы вялікага Космасу.[1] Асноўным з'яўляецца сярэдні ўзровень — месца штодзённага пражывання чалавека, сям'і. Прычым і тут існаваў пэўны парадак. Уся гарызантальная прастора хаты дзялілася на некалькі важных зон, аб якіх усе дамачадцы ведалі, а таму паводзілі сябе ў адпаведнасці з іх функцыянальным прызначэннем. Кампазіцыя ўнутранай часткі строга групавалася вакол сілавой лініі жыцця, дыяганалі на процілеглых канцах якой заўсёды знаходзіліся печ і покуць (чырвоны кут).

Чаму ж гэту дыяганаль можна назваць лініяй жыцця? Справа ў тым, што *печ* — гэта не што іншае, як *форма прыручэння агню — старажытнага сімвала жыцця*. Можна сказаць так: жыццё ў хаце працягваецца да таго часу, пакуль печ цёплая, або, наадварот, печ цёплая, пакуль у хаце палае цяпельца жыцця. Бліжэй да чырвонага кута ставіўся стол, вакол якога збіралася дзеля падтрымання свайго фізічнага і духоўнага існавання сям'я.

У паўсядзённым і святочным жыцці сялянскай сям'і

надзвычай важную ролю выконваў *парог*. Познім калядным вечарам дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту збіраліся ў той хаце, дзе звычайна спраўлялі вячоркі, і варажылі, якой першай пашчасціць замуж пайсці. На парог хаты клалі па аладцы, адчынялі дзверы і клікалі сабаку. Чыю аладку ён з'есць першай, тая і замуж хутчэй пойдзе. Калі нават і сёння мы зачэпімся нагой за парог, адразу зазначаем: павінна нешта здарыцца. Каб у хату не заходзілі людзі з адмоўнай біяэнергетыкай, старыя раяць у парог уваткнуць дзве іголкі. Перад тым як адправіцца да нявесты, малады праходзіў пад ручніком, у абодва канцы якога было закручана па бохану хлеба і які на высока ўзнятых руках трымалі яго бацькі. Дык вось гэта рытуальная арка чакала хлопца каля парога. Праходзячы пад ёй, малады павінен быў прыгнуцца, схіліць галаву — пакланіцца продкам свайго роду. Шырока вядома павер'е аб тым, што гаспадыня не мае права падаць што-небудзь суседцы праз парог, а мужчыны ні ў якім разе не падаюць адзін аднаму рукі праз парог пры сустрэчы або на развітанне.[1] Гэтаксама нельга нічога падаваць і праз іншыя зоны смерці: праз труну з нябожчыкам і праз магілу.

Большасць з нашых сучаснікаў ведае аб гэтым, але не можа растлумачыць, *чаму парог стаў такой незвычайнай зонай у хаце*. Адказ можна знайсці, калі ўважліва ўгледзецца і паразважаць пра ніжні ўзровень пабудовы хаты. Яшчэ і сёння ў многіх вясковых хатах адразу за парогам ёсць вечка (вочка — тое ж вока), праз якое можна трапіць у пограб (падполле, склеп), дзе на працягу халоднага часу захоўваюцца бульба, квашаная капуста, засоленыя гуркі, грыбы, слоікі з варэннем. Але гэта цяпер. А значна раней, недзе паміж 6 і 14 стагоддзямі пограб (паграбенне) быў месцам пахавання памёршых. Гэта быў перыяд крэмацыі, трупаспальвання. Памёршага чалавека спальвалі на рытуальным месцы, а урну з прахам хавалі пад парогам. Значыць, гістарычна *парог — зона захавання продкаў*. Тады становяцца зразумелымі ўсе пералічаныя вышэй сітуацыі. Дарэчы, прасочым, напрыклад, за паводзінамі свата, які заходзіць у хату з мэтай заручэння дачкі гаспадароў. Ён пераступіць парог, тройчы правай нагой пастукае па ім, затым дойдзе да першай бэлькі ў хаце (якая адзначае мяжу паміж прасторай гасцей і гаспадароў), прыпыніцца і будзе казаць: "Яны маўчаць (продкі) і вы (гаспадары) не пярэчце".[2] Сутнасць гэтага звароту будзе зразумелай толькі тады, калі мы будзем памятаць, якую функцыю выконвала кожная зона нашай хаты ў міфалогіі беларусаў.

Важную ролю ў структуры духоўнага космасу беларусаў выконвае таксама *прастора пад дахам*. Слова "дах" хутчэй за



Вясковая хата.



Дахавае акенца.

ўсё запазычана праз польскую мову з нямецкай, але, калі яно гучыць, так і чуеш старажытнабеларускае — дух. Прастора пад дахам — месца, куды злятаюцца душы продкаў у пэўныя рытуальныя дні. Менавіта таму ў сівой мінуўшчыне існаваў прыгожы звычай — першы блін, спечаны на Масленіцу, забаранялася есці жывым, ён прызначаўся душам продкаў, таму яго клалі на дахавае (ду́хавае) акенца. Гэта *адзін з галоўных прынцыпаў традыцыйнай культуры: спачатку ахвяраванне продкам*, а толькі *потым частаванне жывым*. Можа таму мы гаворым: першы блін комам... для тых, хто парушыць звычай часу мінулага[3].

Такая ж *трохузроўневая структура* характэрна *для пабудовы печы* і *калодзежа*. Вядома шмат казак, у якіх герой шукае сваю суджаную, а яе забраў Кашчэй Бессмяротны — адзін з уладароў "таго" свету. Трапіць да яго можна праз калодзеж. З улікам гэтай акалічнасці структурную вертыкаль калодзежа можна расшыфраваць наступным чынам. Сярэдняя (надземная) частка — зона падыходу жывых. Чалавек ідзе да яго, як да продкаў, па дапамогу. Вада — аснова жыцця. Але патрапіць у зону продкаў дапамагае прыстасаванне, якое называюць "журавель". Гэта назва і тут невыпадковая. На Беларусі асаблівай павагай карыстаецца гэта птушка-вястун, якая прылятае з вы-*Раю* (ад продкаў) і нясе нам вестку аб надыходзе новага года, новага прыроднага цыкла жыцця.

Такім чынам, ***усё сказанае яскрава сведчыць аб адзінстве законаў пабудовы Сусвету і духоўнага космасу нашых славянскіх продкаў***. Ці зможам мы — іх нашчадкі — аднавіць гэтую гармонію і ўступіць у раўнапраўны дыялог з прыродай або і надалей будзем дыктаваць ёй свае ўмовы суіснавання, непазбежна набліжаючы час самавынішчэння?

## ПЕЧ МАЯ КАФЛЯНАЯ

Жытло чалавечае, як і ўсё навокал, з цягам часу мяняецца. Людзі заўсёды імкнуліся зрабіць яго больш канструктыўным, зручным, утульным і прывабным для шматпакаленнай сялянскай сям'і. Найбольш істотныя змены адбыліся з цэнтральным атрыбутам сялянскай хаты — печчу, тым сімвалам жыцця, жыватворным ачагом, які сілкаваў сям'ю энергіяй сонца. Сапраўды так, агонь у печы ўспрымаўся зямным эквівалентам сонца, якое ў народнай лексіцы называлася "слонца", таму і прыстасаванне, якім зачынялі печ на ноч або дзень, называлі "заслонка" або "засланка".

Па сваёй сутнасці *печ* цалкам *паўтарае мадэль хаты і нагадвае трохузроўневую структуру міфалагічнага дрэва Сусвету: падпечак, загнет і дымаход* (комін, душнік). Яе асноўныя элементы функцыянальна і канструктыўна афармляліся следам за этапамі фарміравання хаты. Прычым міфапаэтычная роля іх сэнсава вельмі блізкая. Хата ў цэлым вызначала межы асвоенай, адухоўленай чалавекам прасторы ў адрозненне ад неасвоенай, што бегла за лінію гарызонта. Печ у пэўнай ступені можна лічыць сімвалам утаймавання стыхіі агню.

Узгадаем, што ў старажытныя часы галоўны рытуальны агонь пастаянна гарэў пад магутнай кронай дуба, сімвалізую-

чы тым самым галоўны ачаг жыцця племені. Калі ж адбылося выдзяленне з родаплемяннай структуры новай сацыяльнай адзінкі — сям'і, перад людзьмі паўстала патрэба мець адпаведны ачаг у кожным доме. Гэты невялічкі крок у гісторыю дазваляе зразумець цэлы шэраг рытуальных дзеянняў, звязаных з ушанаваннем печы. Ёй, як галоўнаму захавальніку жыццёвай эстафеты таго ці іншага роду, аддавалася даніна пашаны падчас практычна ўсіх важнейшых святкаванняў. Асабліва прыкметнае месца займала яна ў вясельнай абраднасці. Калі ў хату прыходзілі сваты, то дзяўчына залазіла на печ і сядзела там, пакуль гаваркія госці вялі перамовы з бацькамі. Саскочыўшы на падлогу, нявеста тым самым падавала знак, што яна згодна пайсці замуж.

Цікавы абрад адпраўкі ў сваты падае М.Я.Нікіфароўскі: "У той час, як выбраны сват пераступае парог жаніховага дома, каб выправіцца ў сваты, сямейнікі спяшаюцца пакідаць на печ усё, што акажацца ў качарэжніку: вілкі, качаргу, "галéнь" (венік) і нават смецце, каб сватаўство ўдалося. Тут жа яны хорам, перабіваючы адзін аднаго, крычаць: "Заглядайце на грады, каб вам былі рады!" У адказ на гэта сваты моўчкі хапаюцца за рог печы: стукаюць кулакамі ў вушак"[1].

У паўночна-ўсходняй частцы Беларусі яшчэ і сёння захаваўся так званы стаўбавы абрад[2], які праводзіўся каля прыпечнага слупа ў хатах і маладой, і маладога. Уласна з гэтага абрадавага дзеяння распачыналася асноўная частка працяглага вясельнага спектакля. Калі госці рассаджваліся вакол стала, сват залазіў на слуп і песняй звяртаўся да прысутных з просьбай дазволіць адкрыць урачыстае святкаванне.[3]

Вялікую ролю ў вясельнай абраднасці выконвалі ручнікі і паясы. Пояс быў абавязковым атрыбутам адзення жаніха і нявесты, перасцерагаў іх ад уздзеяння благіх людзей: ад сурокаў і "паддзелаў". Задоўга да замужжа маладая павінна была сплесці спецыяльны пояс, які яна кідала на печ, упершыню пераступіўшы парог хаты свайго суджанага. Тым самым яна як бы гаварыла ўсім прысутным: з гэтага моманту мяне будзе ахоўваць ачаг новай хаты.

Рытуальным цэнтрам разгортвання вяселля ў хаце маладой таксама была печ. За ёю хавалася маці нявесты. Увайшоўшы ў хату, жаніх тройчы звяртаўся да яе з просьбай даць канчатковую згоду на шлюб. Маці пагаджалася толькі тады, калі за трэцім разам будучы зяць адорваў яе грашамі.

Аднак асноўныя падзеі разгортваліся вакол печы падчас гатавання самага галоўнага атрыбута вясельнай урачыстасці — каравая. Прыгожы, шматступенны рытуал быў багата аздоблены спецыяльнымі песнямі, у якіх апяваліся каравайніцы,

рэчы, неабходныя для выпечкі святочнага хлеба, і асабліва печ, у якой народзіцца новых хлеб — сімвал новай сям'і, жыцця маладых у новым сацыяльным статусе.

Нараджэнне і першыя гады жыцця дзіцяці таксама цесна звязаны з рытуалаформай печы. Напрыклад, пры першым рытуальным купанні нованароджанага ў начоўкі клалі 9 вугальчыкаў.[4] На працягу першай паловы года ваду пасля купання дзіцяці вылівалі ў падпечак.[5] У многіх мясцінах Беларусі валасы пасля першага падстрыгання немаўляці спальвалі на прыпечку.[6] А ўсе малочныя выпаўшыя зубы кідалі ў запечак, прыгаворваючы: "Мышка, мышка! На табе зуб касцяны, а дай мне жалезны!"

Такое ж важнае месца займала печ і ў пахавальнай абраднасці беларусаў. Так, вяртаючыся з могілак пасля пахавання, родныя і блізкія нябожчыка збіраліся на памінальную трапезу. Але перш чым сесці за стол, усе прысутныя па чарзе падыходзілі да печы і абедзвюч датыкаліся да яе брыля.[7] Святкаванне Восеньскіх Дзядоў распачыналася тым, што гаспадар падыходзіў да загнета, заглядваў у комін і зваў душы сваіх продкаў.[8]

Печ выконвала прыкметную ролю і ў каляндарнай абраднасці. Напрыклад, у Чысты чацвер попел выграбалі з печы і неслі ў курнік (каб добра несліся куры) або летам пасыпалі ім капусту (каб яе не паелі чэрві). Трэба адзначыць, што з асаблівай увагай дамачадцы адносіліся да неабходнасці пастаянна захоўваць цяпло. Лічылася, калі гарачыя вугальчыкі, загорнутыя попелам на ноч, патухнуць, сям'ю напаткае няшчасце. *Дазвалялася патушыць агеньчык у печы толькі на Вялікдзень і Купалле* — у тыя найвялікшыя святы, якія адпавядалі фазам найвышэйшага росквіту Сонца.

На палескіх абшарах рассялення беларусаў добра вядомы абрад "жаніцьба коміна", які праводзіўся двойчы на год: у дні веснавога і восеньскага раўнадзенства.[9] Вясной праз спецыяльны рытуал нашы продкі дзякавалі печы за захаванне цяпла на працягу доўгай і халоднай зімы. Ушанаванне печы напярэдадні зімы было скіравана на тое, каб зноў-такі заручыцца яе падтрымкай на новы перыяд заміранння прыроды.

Аб тым, што печ з'яўлялася сімвалам сямейнага ачага, сведчаць міфалагічныя легенды, з якіх мы, напрыклад, ведаем, што за печчу жыў дамавік — дух-ахоўнік хаты і сям'і. Магчыма, менавіта ён праз дзірку ў смаліне на прыпечку дапамагаў зняць сурокі або чары, калі маці пралівала ваду, якой лячыла сына ці дачку. Гэтую ж думку пацвярджае і строгае папярэджванне госцю або дамачадцу, які нечакана сказаў благое слова ў

прысутнасці дзяцей. Гаспадар хаты тут жа заўважаў: “Печ у хаце!” Або нехта з прысутных сам успамінаў пра забарону і рабіў агаворку: “Сказаў бы, ды печ у хаце!”

Цікава адзначыць, што ў мінулыя часы колькасць гаспадарак у вёсцы ўлічвалася менавіта па колькасці “дымоў”.

## ПАДКОВА НА ШЧАСЦЕ

Хто з нас з дзяцінства не памятае дзвюх прыкмет, якія тычыліся рэгламентацыі паводзін па-за межамі хаты: не хадзі праз “цыганскія” вароты (арку, утвораную тэлеграфным слупам і яго дадатковай падпорай); калі знойдзеш падкову, прынясі яе дадому — шчасце паселіцца ў ім. Але ж атрымліваецца: адзін і той жа сімвал хавае ў сабе два супрацьлеглыя пачаткі — Дабро і Зло? А можа нашы далёкія ці ўжо блізкія продкі нешта наблыталі? Для таго каб знайсці адказы на гэтыя пытанні, неабходна ўзгадаць як мага больш рытуальных дзеянняў, сітуацый або становішчаў, цэнтральным атрыбутам якіх з’яўляецца *арка* ў розных яе праявах.

Аказваецца, гэта сімвалічная форма шырока выкарыстоўваецца не толькі ў народных абрадах, але і ў рытуалах, якімі абстаўляюць працэдуру лячэння народныя знахары, не толькі славянскія, а наогул еўрапейскія. Прывяду некалькі прыкладаў, якія сустракаюцца ў этнаграфічнай літаратуры мінулага стагоддзя.

Каб пазбавіць дзіця ад грыжы або перамагчы рахіт, дзейнічалі наступным чынам. Двума клінамі расшчаплялі ствол ясеня настолькі, каб праз утвораную адтуліну (арку) можна было прасунуць хворае дзіця. Затым кліны выбівалі, а дрэва моцна перавязвалі вяроўкамі. Лічылі, як толькі дрэва зрасцецца, дзіця адолее хваробу.

Вядома, напрыклад, што ў Балгарыі, як толькі пачыналася эпідэмія коклюшу, адна з вясковых лекарак шукала вярбу, выграбала з-пад яе каранёў зямлю так, каб утварылася арка-лаз, і ўсе дзеці з гэтай вёскі прапаўзалі праз яе. Лічылася, што гэта рытуальнае дзеянне перасцеражэ ўсіх удзельнікаў рытуалу ад эпідэміі. Амаль што такім жа чынам лячылі большасць дзіцячых хвароб у Даніі.[1]

Надзвычай цікавым спосабам лячэння коклюшу карысталіся ў мінулым стагоддзі ірландцы. Трэба было знайсці менавіта трохгадовую асліцу і дзевяць разоў перадаць дзіця з рук у рукі голым пад жыватом і над спіной жывёліны. Затым выдаіць у яе тры сталовыя лыжкі малака, выстрыгчы з-пад жывата і са спіны па тры шарсцінкі, палажыць іх у малако на

тры гадзіны, а потым даць дзіцяці яго выпіць. Гэту працэдуру трэба паўтарыць тры раніцы запар.[2]

У розных мясцінах Беларусі даводзілася чуць, што сімволіка аркі павінна прысутнічаць у рытуале лячэння хворых на эпілепсію. Маўляў, дастаткова хвораму прапаўзці пад жыватом маладога (яшчэ не запрэжанага ў калёсы) каня, як хвароба хутка не стане. У Верхнядзвінскім раёне дзве старыя бабулі расказвалі, як у іх вёсцы "вылечылі" аднаго хлопца. Яго паклалі на парог, перад тым як з хаты выносіць нябожчыка, накрылі галаву чорнай хусцінай і пранеслі над ім труну.

Прывядзем некалькі прыкладаў рытуальнага выкарыстання аркі і ў беларускіх народных абрадах і гульнях. Яшчэ ў даваенны час беларускія дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту на Сямік (чацвер перад Тройцай) хадзілі ў лес і праводзілі абрад кумлення. Яны выбіралі дзве прыгожыя маладыя бярозкі, якія стаялі побач, прыгіналі іх вяршаліны і пераплятаді між сабой. Затым дзяўчаты, якія сябравалі, браліся папарна за рукі і, спяваючы веснавыя песні, праходзілі праз арку. Гэта сімвалізавала іх цесную паяднанасць, гатоўнасць дапамагаць адна адной ва ўсіх справах. Калі адна з сяброўак хутка выходзіла замуж, то другая абавязкова была ў яе старшай шаферкай.[3]

Сімволіка аркі літаральна пранізвала абрад беларускага вяселля. Пасля таго як дружына маладога выкупіць маладую, бацькі яе станавіліся перад парогам хаты і ўтваралі трыумфальную арку-(Ра-)дугу спецыяльным рытуальным ручніком. У чырвоныя канцы апошняга загортвалі па бохану хлеба, які трымалі адной рукой (маці — левай, бацька — правай), а другой — як мага вышэй уздымалі сярэдзіну ручніка. Маладыя, узяўшыся за рукі, праходзілі пад гэтым Млечным Шляхам (або летняй вясёлкай, якая ўздымалася да неба пасля дажджу).

Калі ж маладыя вярталіся з-пад вянца, то яны павінны былі праехаць праз вясковую браму (яшчэ адна арка, якая існавала на ўездзе практычна ва ўсе населеныя пункты Еўропы) або заязджалі на брычцы прама ў двор, праехаўшы пры гэтым праз сваю "родную" браму. Вясельны каравай (сімвал сонца, неба, якое паяднала маладых) клалі на вечка (параўнайце: век, вечнасць, век векаваць) дзяжы і на ручнік, а потым уносілі ў хату на высока ўзнятых руках хросныя бацькі.

Асаблівая павага надавалася яшчэ аднаму сімвалу аркі — дузе каня, на якім да вянца ехаў малады са сваёй світай, а назад — новаст792аная шчаслівая пара. Дугу абавязкова ўпрыгожвалі рознакаляровымі стужкамі, жывымі або папяровымі кветкамі (калі вяселле было ўзімку), прывязвалі да яе некалькі гучных званочкаў, якія, паводле народных уяўленняў, павінны

былі сваім звонам адагнаць усялякую нячыстую сілу, прадухіліць чараванне мясцовых ведзьмакоў.[4]

Сімволіка аркі выкарыстоўвалася і ў час радзінаў. Муж парадзіхі імчаў да святара і прасіў адчыніць у храме Царскія Вароты. А ў той вёсцы, дзе храма не было, існавалі іншыя спецыфічныя рытуалы, якія былі скіраваны на тое, каб хутчэй даць палёгку цяжарнай жанчыне: яна паціхеньку павінна была прапаўзці пад лавай, зэдлікам або проста паміж ног свайго мужа.

А прымхлівае дзіця, якое часта пакутавала ад сурокаў. Раілі лячыць наступным чынам. Пасярэдзіне хаты ставілі стол і прасілі дзіця прапаўзці пад ім вакол кожнай ножкі, утвараючы васьмёркі.

Неабходна адзначыць, што сімволіка аркі суправаджала чалавека не толькі ў святочных падзеях. Яе прысутнасць можна заўважыць літаральна на кожным кроку ў паўсядзённым побыце. Напрыклад, чырвоны кут у хаце. Яго духоўным цэнтрам, той прыцягальнай сілай, якая прымушала забыцца на ўсё мітуслівае і падумаць аб Вечнасці, была ікона. Кожная дбайная гаспадыня абавязкова пакрывала яе "саматканым Млечным Шляхам" — прыгожа вышытым ручніком. І меў гэты ручнік форму небасхілу, вясёлкі, свяшчэннага покрыва, якое, быццам крылы анёла або бялюткае покрыва Маці Боскай, засцерагала сям'ю ад ваеннай навалы, эпідэмій, людской зайздрасці і сямейнага разладу.

Раніцай гаспадыня ставіла ў печ гаршкі з рознымі стравамі. Вусце печы і само паднябенне мелі тую ж аркападобную форму. Калыска, у якой немаўля набіралася моцы, каб хутчэй выйсці за парог і ўбачыць прасторы Космасу, з якога прыляцела яго душа, таксама была прыкрыта палажком у форме аркі. "Калыску", у якой чалавека адпраўлялі ў апошні шлях, закрывалі цяжкім драўляным полагам — вечкам — зноў-такі Небам Вечнасці і Спакою.

У гонар вялікіх перамог у сталіцах еўрапейскіх дзяржаў (Парыж, Берлін, Санкт-Пецярбург) будавалі Трыумфальную арку як знак гераічнасці мясцовага люду.

Як гэта ні дзіўна, але і апошняя хвіліна нашага зямнога існавання і пераход на "той" свет звязаны з той жа, але перавернутай, аркай, якую ўтвараюць ручнікі, на якіх апускаюць труну з нябожчыкам у магілу.

Такім чынам, усе згаданыя рытуальныя і побытавыя кантэксты ўжывання сімвала аркі сведчаць, што *праход* (прапаўзанне, апусканне, перанясенне) *праз яе азначаў прынцыпова важныя змены ў жыцці, разрыў з мінулым статусам і набыццё зусім іншага.* Прычым арка, выгнутая ўверх, перасцерага-

ла, прыкрывала, заступалася за чалавека. Арка, выгнутая ўніз, сімвалізавала касмічны пераход у іншыя сферы быцця. З гэтага вынікае: падкову над уваходам трэба мацаваць толькі выпукласцю ўверх.

А чаму ж тады нельга праходзіць праз "цыганскія" вароты? Чаму ў народзе кажуць у такім разе: будзе балець галава, перастанеш расці або застанешся адзін у жыцці? Справа ў тым, што шматлікія кантэксты выкарыстання аркі мелі пераважна рытуальны характар: трэба было засцерагчыся ад эпідэміі або пазбавіцца ад хваробы — праходзь праз арку. І наадварот, калі ты здаровы, дужы і шчаслівы, то не праходзь праз яе, каб не страціць усё гэта і не наклікаць бяды.

Раніцай, перад тым як пераступіць парог свайго дома або кватэры, затрымайцеся на хвілінку, прытуліце да сябе рукі, утварыўшы далонямі арку, і падумайце пра добрае, пажадайце сабе і сваім блізкім Дабра і Здароўя — усе мары збудуцца.

# РУСА КАСА ДА ПОЯСА

Апошнім часам на сустрэчах з настаўнікамі, сярод якіх пераважная большасць жанчын, даводзіцца чуць пытанні, якія міжволі гуртуюцца вакол наступнай праблемы: чалавек і яго рэчы ў кантэксце культуры і этыкету. Напрыклад:

— Што рабіць з рэчамі памерлага чалавека?

— Ці можна пазногці і валасы стрыгчы ў любы ці трэба ў пэўны дзень?

— Ці праўда, што нельга дарыць свае фотаздымкі?

— Што рабіць з падстрыжанымі валасамі?

Іншы раз людзі расказваюць пра розныя здарэнні і просяць растлумачыць іх сэнс. На другі дзень пасля вяселля прыбіралі ў хаце. У спальні пад палавіком знайшлі скручаную і абпаленую сабачую поўсць. Адкуль яна ўзялася і што б гэта мгло значыць? Іншая гаспадыня ранкам на парозе сваёй хаты знайшла белы вузельчык, у якім зноў-такі была чорная поўсць сабакі і ката. Такі ж "падарунак" аднойчы знайшлі зашытым у пінжак маладога на вяселлі...

Я хацеў бы вылучыць толькі адзін аспект закранутай праблемы і паспрабаваць паказаць, наколькі моцна мы звязаны са светам уласных рэчаў і наколькі моцна можа ўплываць на нас тое, што нядаўна было разам з намі, а затым трапіла ў іншыя рукі.

Даўно ўжо не дае спакою сітуацыя, з якой рэгулярна сутыкаемся ў нашых цырульнях. Малады чалавек або сімпатычная дзяўчына завіталі сюды са спадзяваннем упрыгожыць сябе

сучаснай, моднай і шыкоўнай прычоскай. Цырульнік імкліва ўзяўся за справу. І вось тое, чым яшчэ ўчора адны ганарыліся і чаму другія зайздросцілі, раптам аказалася на бруднай, засмечанай падлозе, пад нагамі чужога чалавека, які пазней змяце вашы валасы, зблытае-скруціць з іншымі і... Што з імі будзе далей — адзін Бог ведае. А што пра такую сітуацыю гаворыць народны этыкет?

Да сённяшняга часу сярод славян жыве звычай: калі ўбачыш старога дзеда з вялікай барадой, то абавязкова трэба дакрануцца да яго — будзе шчасціць і ў багацці і ў здароўі. На жаль, не ўсе дзяўчаты і маладыя жанчыны прытрымліваюцца традыцыі прыкрываць валасы хусцінкай, калі заходзяць у храм. У многіх сем'ях яшчэ і сёння бацька выконвае спрадвечны рытуал: вярнуўшыся дадому з богаслужэння ў гонар першага ўнясення Хрыста ў храм (15.02), ён запальвае грамнічную свечку і злёгку выпальвае на валасах кожнага з дамачадцаў невялікі крыжык.[1]

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што валасы ў адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі — гэта, з аднаго боку, жыццядайны асяродак, у якім злучыліся ўсе фізічныя і духоўныя сілы кожнага чалавека, а з другога — ці не самы актыўны канал энергетычнага сілкавання ад Космасу. Цвёрда пераконваешся ў гэтым, калі згадваеш, што ў народзе была традыцыя збіраць валасы на працягу ўсяго жыцця, а затым класці іх у труну, як толькі чалавека не стане. Так, іменна ў той дзень, калі дзіцяці спаўняўся роўна год, праводзілі рытуал першага падстрыгання, таму што былі ўпэўнены: выкананне гэтай працэдуры раней "адразала язык", г.зн. перапыняла развіццё мовы і дзіця доўга не магло загаварыць. Дзіця абстрыгалі цалкам, а тыя валасы захоўвалі за іконай на працягу ўсяго жыцця.[2]

Такіх вось рэгламентацый да стрыжкі валасоў прытрымліваліся ўсё жыццё. Лічылася, што *валасы нельга стрыгчы ў аўторак, пятніцу і нядзелю*. Лепш за ўсё гэта рабіць у чацвер. Але неабходна памятаць яшчэ аб адным нябесным фактары: каб валасы раслі хутка і іх было шмат ("поўна на галаве"), найбольш спрыяльным часам для стрыжкі лічылі *перыяд ад маладзіка да поўні*.

На Гомельшчыне захаваўся цікавы звычай, які тычыўся пастухоў. У перыяд з Юр'я да Кузьмы-Дзям'яна ім забаранялася стрыгчы валасы, каб каровы не разбрыдаліся, у лесе не губляліся і на іх не напаў воўк.

А вось убачыць распушчаныя валасы — *сімвал належнасці да прыроднай стыхіі, да "таго" свету* — можна было толькі ў русалкі (міфалагічная жаночая істота, якая жыве ў вадзе; утраплёная душа заўчасна загінуўшай дзяўчыны), якая вярта-

лася са свету продкаў на адзін дзень у Русальны тыдзень, каб выбраць сабе пару.

Таму жывыя ставіліся да валасоў вельмі далікатна. Іх імкнуліся не чапаць ні ў якія святочныя дні, асабліва ў дзень Івана Галавасека. Кожны выпаўшы валасок падбіралі, скручвалі на пальцы і ці захоўвалі ў спецыяльным месцы, ці спальвалі ў печы. Але ні ў якім разе не выкідвалі, таму што былі перакананы: падхопяць гэты волас мыш або птушка і "заўюць" яго ў сваё гняздо. У такім выпадку можна было захварэць "на каўтуна": валасы збіваліся ў пакручасты вузел, галава трашчала ад болю. Вылечыць хваробу мог толькі вельмі моцны і вопытны народны лекар пры дапамозе спецыяльных замоў. (Адну з іх чытайце ў канцы артыкула.)

Відаць, менавіта пад уплывам такіх здарэнняў, якія помніліся ў народзе, і ўзнікла прыказка, звязаная з найвялікшым святам Благавешчання: "Птушка гнязда не ўе, дзеўка касу не пляце".

Узгадаем, што і вэлюм нявесты мае менавіта такую канструкцыю, каб перакрываць на час святочнай падзеі асноўныя каналы міжасабовай некантактнай сувязі: вочы і валасы. Прыгожую дзявочую касу прыкрывалі доўгай часткай вэлюму. А вось маладому валасы выпальвалі крыжам. На Навагрудчыне існаваў і такі вясельны звычай: хросная маці маладога выстрыгала некалькі валасоў з галавы жаніха і нявесты і падпальвала гэты пучок, каб "злучыць" навечна маладых.

У асяроддзі славян жанчынам катэгарычна забаранялася выходзіць на вуліцу, прыходзіць у госці або на вечарынку з непрыбранымі і непакрытымі валасамі (асабліва небяспечным лічылася выходзіць у двор у час навальніцы: магло забіць). Разам з тым былі пэўныя гаспадарчыя справы, калі, наадварот, валасы трэба было распусціць: пры родах; у знак жалобы на працягу сарака дзён пасля смерці каго-небудзь з родных; калі мялі лён (каб ён быў мяккі і валакністы)[3] і г.д.

Выкарыстоўваліся валасы і яшчэ ў некаторых рытуальных сітуацыях: перш за ўсё, каб перасцерагчы чалавека ад розных хвароб або дапамагчы яму пазбавіцца ўсялякіх непрыемнасцей. Напрыклад, калі ў жанчыны адно за адным паміралі дзеці, то ў час родаў яна збірала свае валасы, а затым рассыпала іх вакол нованароджанага. Калі ў час попрадак, вячорак ці іншых шматлюдных падзей каму-небудзь станавілася блага, то з кожнага прысутнага выстрыгалі па некалькі валаскоў, затым спальвалі іх, а гэтым дымам абкурвалі сурочанага чалавека.[4]

У нашай сучаснай сітуацыі, калі ў сям'і гадуюць адно, ра-

дзей двое дзетак, лепш, памятаючы ўсе папярэднія парады, скарыстаць яшчэ адну. Трэба доўга і старанна расчэсваць валасы на Вялікдзень, каб было столькі ўнукаў, колькі валасоў на галаве.

### *ЗАМОВА АД КАЎТУНА*

*Не я ж надзімаю, матка Хрыстова. Калі каўтун-каўтуніца, то ідзі шырокімі балатамі, чыстымі палямі, сінімі марамі за цёмную цямнічку, за глыбоку крынічку, там ты западай-прападай, на целе не бывай.*

*Каўтуночак-галубочак, улезь Мані на вяршочак, я табе ўгаджу, вінамёду навару, залатыя кубачкі палажу, срэбну мякку пасцелечку пасцялю. Айцец Мікола, матка Хрыстова, залюбі, Божа, мой дух. Калі Бог памажэ, то і я памагу.*

*На гары стаяў дубок, пад тым дубком бабка. Не ўмела ні чытаць, ні пісаць, толькі ўмела каўтуна і каўтуніцу выгавараць. Яна ўгаварала, мне памагала. Прыляціце, птушачкі, з бору, забярыце каўтуна і каўтуніцу з сабою, занясіце на сіняе мора, на чыстае поле, дзе каройкі трайку не з'ядаюць, вады не співаюць, там каўтуна і каўтуніцу пакідаюць.*[5]

# ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА: ПАМІЖ БЫЦЦЁМ І МІФАМ

## "СВІНКА — ЗАЛАТАЯ ШАРСЦІНКА"

З глыбокай старажытнасці да нас даляцеў трапны выраз: усё вяртаецца на кругі свае. Пацвярджэнне яму можна знайсці не толькі ў тысячагадовай гісторыі, але і ў нашым сучасным жыцці. Недзе ў 60—70-я гады распачаўся даволі моцны адток сельскага насельніцтва ў гарады. Настолькі моцны, што горад аказаўся не падрыхтаваны да такой колькасці рабочых рук. У апошнія гады, калі адбываецца супярэчлівы пераход эканомікі на рынкавыя формы гаспадарання, усё больш людзей пазбаўляецца надзеі на пастаянную работу. Адны з іх ідуць у малы бізнес: купляюць — перапрадаюць, іншыя — едуць назад у вёску і распачынаюць сваю справу: становяцца фермерамі. Аднак вярнуцца да зямлі, да адвечнага чалавечага занятку не так проста. Земляробства, жывёлагадоўля, садаводства — гэта важны і складаны раздзел агульначалавечай культуры, якая стваралася тысячагоддзямі. У адзін дзень асвоіць яе проста немагчыма. Таму раз-пораз мы звяртаемся да вопыту нашых продкаў і, абапіраючыся на яго, спрабуем распачаць тую ці іншую справу.

У некаторых папярэдніх артыкулах даваліся найбольш агульныя парады пасадкі і збору садавіны і гародніны. А зараз хацелася б адгукнуцца на просьбы чытачоў і расказаць

пра вопыт нашых дзядоў у жывёлагадоўлі: калі лепш купляць карову, каня, свіней, як выбраць, па чым распазнаць нораў і характар, як паспрыяць прыплоду і добрай малочнасці, як перасцерагчы ад "дурнога" вока і г.д. Часцей за ўсё пытаюць, як купляць і гадаваць парасят, калі лепш закалоць свінню, як і каму пажадана складаць сала, каб яно заўсёды было смачным, і г.д. Давайце прыслухаемся да таго, што гаворыць нам народная мудрасць.

Безумоўна, асноўнай жывёлінай у гаспадарцы беларусаў была карова. Таму менавіта з ёю звязвалі спадзяванні на дабрабыт, на бязбеднае існаванне сям'і на працягу ўсяго года. У земляробчым плане ніводная сям'я не магла абысціся без валоў ці коней. Свінні заўсёды займалі другаснае, менш важнае месца ў жывёлагадоўлі. Аднак у савецкія часы пасля вымусовай калектывізацыі атрымалася крыху іначай. Коні сталі ўласнасцю калгасаў, а вось большую частку года сям'я трымалася за кошт саланіны, каўбас і вяндліны. Можа таму нашы чытачы найперш цікавяцца асаблівасцямі народнага вопыту свінагадоўлі.

Нават першаснае знаёмства сведчыць аб тым, што гэта была цэлая сістэма, якая ахоплівала самыя розныя, самыя нечаканыя аспекты.[1]

Аказваецца, пра тое, наколькі "поўным", багатым будзе хлеў, думалі яшчэ задоўга да яго пабудовы. Нашы продкі лічылі, калі хлеў залажыць на "старык" (калі серп месяца нагадвае літару С — "стары"), то ўсё жывое ў ім адно за адным будзе здыхаць. І наадварот, калі першы вянок пакласці на другой фазе Месяца ("пад поўню"), то хлеў будзе поўніцца жывёлай. У некаторых мясцінах сяляне імкнуліся пакласці хоць у адзін вянец бервяно са старой мельніцы, тады, лічылася, свінні будуць весціся без зводу. Моцным абярэгам жывёлы ад сурокаў, які таксама спрыяў багатай пладнасці свінні, было наступнае рытуальнае дзеянне: калі ставілі хлеў, то ў гняздзе, якое рыхтавалі пад шып вушака для дзвярэй, высвідроўвалі заглыбленне, забівалі туды альховы колік і заламвалі яго. Да нашага часу дажылі павер'і аб тым, што гаспадаром хаты з'яўляецца дамавік, а духам-ахоўнікам хлява — хлеўнік. Таму ў тым месцы, дзе будуць дзверы (у парозе), абавязкова закопвалі ахвяраванні: рогі, капыты або косці хатняй жывёлы, у больш познія часы ў Столінскім раёне ўзнікла "завядзёнка" ахвяраваць хлеўніку чарапаху. Практычна кожны крок гаспадароў быў абумоўлены важнейшым прынцыпам народнай магіі: "падобнае спрые падобнаму". Так, напрыклад, каб свінні раслі вялікімі, карыта рабілі з таго дрэва, на якім было гняздо вялікай птушкі.

Спецыялістам у галіне народнай культуры вядомы цэлы шэраг рытуальных дзеянняў, звязаных з важнымі святочнымі падзеямі штогадовага календара. На святочны стол мяса, сала, каўбасы і вяндліну гаспадыня наразала вялікімі кавалкамі, каб "вялікай" вялася жывёла. А каб свіней у хляве было багата, рэкамендавалася апранацца, не ўстаючы з пасцелі. Мужчынам жа раілі дзеля добрага "заводу" свіней пасля навагодняй ночы абувацца прама на печы.

Цікавым назіраннем падзяліўся бацька М.Багдановіча. Па сведчанні яго інфарматараў, калі прадаеш парася і пасадзіш яго ў мех уперад галавой, трымаючы за заднія ногі, то ў прадаўца парасяты хутка зусім звядуцца, а ў пакупніка размножацца. Калі ж парася пасадзіць у мех заднімі нагамі, то прадаўцу заўсёды будзе добра, але тыя, хто купляе, "заводу" няхай не чакаюць. Таму, каб не было крыўды ні ў кога, парася трэба саджаць у мех спінай, трымаючы за ногі.

Хочацца спадзявацца, што для нашых уласнікаў будуць карыснымі яшчэ некаторыя парады пра тое, *як самім дачакацца і выгадаваць парасят*.

На Віцебшчыне сяляне лічылі, што ў "заводнікі" лепш пакідаць таго кабанчыка, у якога хвост завітушкай і трымаецца ўгору, а для развядзення парасят выбіралі тую свінку, у якой было больш за восем саскоў. Існавала перакананасць, калі свіння "паходзіць" (адбудзецца злучка) у перыяд паміж маладзіком і поўняй, то ад яе можна чакаць столькі парасят, колькі дзён прайшло пасля маладзіка. З той жа мэтай некаторыя гаспадыні выконвалі яшчэ і такое магічна-прадуцыравальнае дзеянне: яны запрашалі да сябе жанчыну, якая нарадзіла многа дзяцей, і прасілі яе тройчы праз парог пакарміць свінню са свайго прыполу аўсом ці жытам.

Катэгарычна забаранялася, заганяючы ў хлеў пароснуюсвінню, біць яе чым-небудзь, бо потым яна абавязкова загрызе сваіх парасят. Тое ж самае магло здарыцца, калі гаспадар або гаспадыня, заходзячы ў хлеў, што-небудзь жавалі ў роце.

Калі свіння доўга не парасілася, запрашалі цяжарную жанчыну і прасілі яе на суравой нітцы завязаць як мага больш вузлоў, затым мясілі хлебнае цеста і ўціскалі ў яго гэту нітку. Цеста запякалі і аддавалі з'есці свінні: лічылі, яна хутка стане пароснай.

Прадуцыравальны характар мелі яшчэ некаторыя абмежаванні і перасцярогі. Напрыклад, у першыя тры дні да свінні, якая апарасілася, пажадана, каб падыходзіла толькі гаспадыня, тады свіння будзе прыносіць прыплод тройчы на год. Каб у двары ніколі не пераводзіліся свінні, лічылася немэтазгодным прадаваць або дарыць тых парасят, якімі свіння апарасілася

першы раз. Існавала прыкмета, калі парася ссе матку і пры гэтым часта забягае наперад і трэцца каля яе лычам, то яно доўга не пражыве. У першыя тры дні нельга было пералічваць парасят, паказваючы на іх пальцам, бо ўсе пералічаныя хутка здохнуць, асабліва калі той, хто лічыць, будзе дзівіцца.

Каб парасяты ці свінні хутка набіралі вагу, гаспадыня некалькі разоў запрашала да сябе мажную (поўную) жанчыну і прасіла яе патаўчы бульбу і замяшаць цеста для іх. Іншыя жанчыны выкарыстоўвалі ў сваёй практыцы некаторыя магічныя формулы. Напрыклад, калі заварвалі пойла для свіней, то муку кідалі па жменьцы і пры гэтым прыгаворвалі: "Як дурны без розуму жрэ і як ад гэтага прэ, так каб і мая свіння ела і таўсцела. Амінь".

Калі часам здаралася, што адна за адной здыхалі некалькі свіней, то сяляне былі перакананы, што нехта з суседзяў ці нядобрых людзей зрабіў порчу. Тады трэба было на маладзік у час кармлення тры разы прагаворваць наступную засцерагальную замову:

*"На моры-амары, на сінем камені стаяў дуб, на том дубу дванаццаць какатоў, на тых какатах стаяў дом, а ў тым доме сам Гасподзь жыў і Прачыстая. Гасподзь нёс рыбу, а Прачыстая крэст, сустрэлі мужчыну і сталі пытаць:*
*— Што ў вас чуваць?*
*— Хочуць свінні здыхаць.*
*— Наце ячменю, наварыце крупеню, дайце пад'есці і не будзе ўпадку".*

У этнаграфічных працах нашых папярэднікаў можна знайсці шэраг добрых парад, якія тычыліся не толькі гадавання свіней, але і таго, калі лепш забіваць, што і як пры гэтым рабіць. Гаспадыні прыкмецілі: калі свінню зарэжуць на маладзік, сала будзе беленькім, калі ж на "старык", то пажаўцее; калі пад поўню, то сала і мяса будуць "паўнець" у гаршку. Лепш свежаніну рабіць у панядзелак, пятніцу і суботу, таму што ў назвах астатніх дзён (аўторак, серада, чацвер) ёсць літара "р": лічылі, складзеную ў гэтыя дні саланіну паядуць чэрві. Не дазвалялася біць свінню і ў той дзень, у які ў гэтым годзе былі Пакровы.

Прыгожа і лоўка разабраць свінню мог не ўсякі чалавек. Таму часам некаторыя мужчыны запрашалі на дапамогу сваіх суседзяў: старых і спрактыкаваных людзей, якія ведалі не толькі тэхналагічны ланцужок, але і шматлікія рытуальныя дзеянні, якія абавязкова суправаджалі важную падзею. Найперш на грудзіне рабілі двайны надрэз у выглядзе крыжа, затым падразалі "цыцачкі", неслі іх і кідалі назад у свінарнік — гэта павінна было паспрыяць "заводу" свіней. "Свіную касу"

(селязёнку) аддавалі дзяўчатам, каб у іх былі густыя і доўгія валасы. Мужчынам есці яе забаранялася, бо летам у час касавіцы яны маглі зламаць касу. Складваць сала на доўгае захаванне дазвалялі старым дзядам, каб яно "не паслюзла".

## "НАДАРЫ, БОЖА, МАЮ КАРОЎКУ ДОБРЫМ ЗДАРОЎЕМ, ЖОЎТЫМ МАСЛАМ, БЕЛЫМ СЫРАМ"

У папярэднім артыкуле гаворка ішла пра некаторыя асаблівасці народнага вопыту свінагадоўлі. Але ж агульна вядома, што самай галоўнай істотай уласнай гаспадаркі была карова. Сырадоем, адтопленым малаком або сонечна-жоўтым маслам ласаваліся і старыя, і малыя і ў дзень будзённы, і ў дзень святочны. Традыцыйная кухня беларускага сялянства налічвае добрую сотню страў, уявіць сабе якія без малака ці малочных прадуктаў проста немагчыма. Гэта і блінцы, налiснікі з тварагом, адтопленае малако са смятанай, дранікі або бабка з халодным малаком, якое прастаяла дзень у пограбе ў "дыхаючым" гліняным збанку...

З гэтай нагоды з боку гаспадароў да каровы было асаблівае стаўленне. Яе прыдзірліва і няспешна выбіралі на базары, шанавалі і леставалі, як дзіця, на працягу ўсяго дойнага перыяду, перасцерагалі ад нядобрага вока, не дазвалялі лаянкі ў яе адрас, начамі не спалі, чакаючы ацёлу, гатовыя ў любы момант прыйсці на дапамогу. У час падрыхтоўкі да выдання зборніка "Магія слова чароўнага" я быў нечакана здзіўлены адной акалічнасцю. Класіфікацыя народных замоў, запісаных са слоў старых людзей з розных куточкаў Беларусі, высвеціла цікавую заканамернасць. Аказалася, што народныя лекары ў сваёй практыцы выкарыстоўваюць да 30 разнавіднасцей тэкстаў замоў, якія суправаджаюць перыяд жаночай цяжарнасці і родаў. Прыкладна такая ж колькасць іх можа быць выкарыстана для дапамогі рагулі, ад якой чакаюць прыплоду. Цікавая дэталь, у тэкстах некаторых ахоўна-прадуцыравальных замоў яны таксама стаяць побач: "Ёсць на небе тры зарніцы, і ўсе яны памачніцы: адна да жынак, другая да дзевак, трэцяя да кароў".

Давайце ж ціхенька адхінем фіранку і ўважліва паназіраем за паводзінамі гаспадароў, іх штодзённым клопатам у развядзенні буйной рагатай жывёлы.[1]

## КУПЛЯ-ПРОДАЖ КАРОВЫ

Камерцыйны акт куплі-продажу каровы і далучэнне яе да новых гаспадароў займаў у культуры нашых продкаў надзвычай важнае месца. Справа ў тым, што гэты юрыдычны факт быў не звычайнай фармальнай падзеяй перадачы жывёліны з адных гаспадарскіх рук у іншыя, а хутчэй спецыфічным рытуалам, ад дакладнага выканання якога залежыў далейшы дабрабыт і пакупніка, і прадаўца. Парушэнне пэўных элементаў абрадавага дзеяння магло прывесці да таго, што карова лёгка прыжывалася ў новых гаспадароў, але затое папярэднія доўга не маглі набыць, завесці або выгадаваць першацёлку. Натуральна, што адзіна правільным было строгае выкананне адвечных звычаяў, якое гарантавала абодвум бакам надзейны дабрабыт і штогадовы прыплод. Небяспека таго, што парушэнне рытуалу магло прывесці да непрадказальных наступстваў, вымагала ад кожнага з бакоў быць абачлівым і асцярожным, уважліва сачыць за маніпуляцыямі партнёра, тым часам хітра і тонка прыхоўваць свае.

Але наперад трэба было вырашыць яшчэ адну важную праблему: якой масці можна было купляць карову, бо ў народзе да нашага часу жыве вера ў тое, што гаспадаром-ахоўнікам хаты і двара з'яўляецца дамавік. І калі яму не спадабаецца масць каровы, ён зжыве яе са свету. Па якіх жа прыкметах можна было шукаць і выбіраць масць жывёліны? Вядома іх дастаткова шмат. Найбольшае пашырэнне набыла традыцыя выбіраць карову такой масці, якога колеру валасы ў гаспадара або шэрсць у кошкі. Існуюць і больш складаныя спосабы вырашэння гэтага пытання. Напрыклад, калі доўга не шанцуе ўдала выбраць карову, гаспадар выконвае наступнае магічнае дзеянне. Як толькі вясной ён убачыць першую ластаўку, то тут жа на абцасе правай нагі перакруціцца, затым возьме з таго месца жменю зямлі і ўважліва ўглядаецца: якога колеру волас ці шарсцінку знойдзе (а знойдзе абавязкова, невядома адкуль і возьмецца), той масці трэба купляць карову або каня.

У прадаўца жывёлы былі ўласныя "сакрэты"-прадказанні, па якіх ён спрабаваў павярнуць ход падзей на сваю карысць. Агульнавядома забарона прадаваць карову пасля ацёлу, гэтаксама нельга прадаваць і першае цяля. Лічылася, што такім чынам перапынялася плоднасць жывёлы і значна пагаршалася яе малочнасць. Прыкладна такі ж лёс мог напаткаць гаспадарку, калі карову прадавалі са свайго хлява. Акт куплі-продажу лепш было здзяйсняць на нейтральнай тэрыторыі — на базары.

Перад тым як адправіцца на торг, гаспадар выводзіў каро-

ву на сярэдзіну двара і выстрыгаў на яе ілбе і спіне два крыжы, каб ніхто не сурочыў і чыя-небудзь цяжкая рука "не звяла" ўсю жыўнасць. Калі ж прадавалі цяля, то некалькі шарсцінак выстрыгалі з яго крыжа, каб карова не перастала даіцца. У некаторых мясцінах гэтыя дзеянні выконвалі на скрыжаванні дарог. У прыёме выстрыгання шэрсці знітаваліся два аспекты народнай магіі. З аднаго боку, затыканне поўсці ў сцяну хлява спрыяла захаванню плоднасці і ўдойнасці, а з другога — пакінутыя валасы як бы перадавалі спор прадаваемай жывёлы іншай, якая будзе тут жыць надалей.

Гэты рытуал і ўваходзіць у склад цэлай сістэмы аднатыповых дзеянняў, накіраваных на дасягненне жадаемага выніку. Напрыклад, каб захаваць спор нівы, жнеі абавязкова пакідалі на полі "Вялесаву бараду" — некалькі спелых каласоў. Асаблівую цікавасць выклікае падобнае дзеянне ў дачыненні да людзей. Добра вядома, што першае падстрыганне дзіцяці дазвалялася толькі ў той дзень, калі яму спаўняўся адзін год. Як правіла, гэтыя валасы захоўваліся за іконай на працягу ўсяго жыцця чалавека. І толькі ў адзіным выпадку можна было развязаць вузельчык з гэтым незвычайным скарбам. Калі сына адпраўлялі ў войска, то перад тым як ён пакіне хату, матуля выстрыгала з яго галавы некалькі валасінак. Іх яна хавала ў гэты вузельчык. Адтуль брала некалькі тых, ранейшых валаскоў, клала ў нацельны кулон або мяшочак, які сын на працягу ўсёй службы насіў з сабой. Гэта быў абрад сімвалічнага прывязвання сына да сваёй хаты, а таксама надзейная гарантыя, што ён вернецца дадому жывы і здаровы.

Сам торг з'яўляўся не толькі фінансава-камерцыйным актам. Аказваецца, ён быў прасякнуты спецыфічнымі дзеяннямі, якія маглі справакаваць дабрабыт або шкоду. Так, пакупнік прыдзірліва ўглядаўся, на якой частцы воза сядзела гаспадыня. Былі ўпэўнены, калі ўселася на пярэдняй восі або пасярэдзіне, то гэта сведчыла аб яе чараўніцтве з мэтай адабраць малако ў прадаваемай каровы. Часам гаспадыню прасілі злесці з воза. Калі тая згаджалася, меркавалі, што нічога дрэннага яна не рабіла, калі ж адчайна супраціўлялася, карову ў яе проста не куплялі.

Існавала і такое павер'е: калі прададзеную скаціну шкадаваць, то яна не прыжывецца ў новых гаспадароў. Пакупнік заўсёды прасіў прадаць карову разам з вяроўкай, на якой яе прывялі на базар (адсюль і прыказка: "Прапала кароўка, прападзі і вяроўка"). Аднак продаж вяроўкі мог скончыцца тым, што гаспадар-прадавец, магчыма, мог пазбавіцца спору ў сваім хляве. Таму на базар вялі на вяроўцы, спецыяльна купленай для гэтай падзеі; перадаваць аброць ці вяроўку трэба было не

голымі рукамі, а праз крысы верхняй вопраткі, а таксама толькі з правай рукі прадаўца ў правую руку пакупніка, якая абавязкова павінна быць зверху. Па тлумачэнні У.Даля, гэта было знакам таго, што гаспадар прадае жывёлу па добрай волі, не шкадуючы. Некаторыя навукоўцы схільны бачыць у гэтым рытуале вельмі глыбокія карані, якія ўходзяць у першавытворныя прынцыпы міфалагічнага светаўспрымання. Шматразова згадваемы прынцып "падобнае выклікае падобнае" дазваляе сцвярджаць, што абодва бакі выкарыстоўвалі крысо вопраткі толькі таму, што баяліся: голыя рукі могуць справакаваць пустэчу ў хляве. (Узгадаем працэдуру дзяльбы каравая на вяселлі. Маладых катэгарычна забаранялася віншаваць поціскам голай рукі — могуць быць або беднымі, або бяздзетнымі.)

Акт продажу заканчваўся тым, што пакупнік браў карову за вяроўку і тройчы па сонцу абыходзіў воз, а прадавец тым часам вяртаў яму некалькі капеек назад. Такім чынам усталёўвалася раўнавага гаспадарскага ўзаемазаахвочвання.

Калі карову куплялі непасрэдна ў двары гаспадароў, то яе рэкамендавалі забіраць у першай палавіне дня, але ні ў якім разе вечарам; калі торг адбыўся адвячоркам — толькі назаўтра раніцай. Такое абмежаванне звязана з разуменнем пэўных фаз дня. Пераход дня ў ноч лічыўся вельмі благім часам і параўноўваўся па сваім значэнні з апошняй квадрай Месяца. Забіраючы карову, пакупнік або яго жонка імкнуліся прыхапіць з сабою жменьку зямлі з двара былога гаспадара (бралі зямлю з падваротні хлява або каля правага вушака дзвярэй) і затым рассыпаць яе па сваім двары: "прывязаць" карову да свайго двара.

Цікавыя рытуальныя дзеянні выконваліся гаспадарамі падчас прывядзення каровы ў новы двор. Гаспадыня звычайна сустракала яе хлебам-соллю і давала з'есці першы адрэзаны акраец. Лічылася добрай прыкметай, калі купленую карову будзе сустракаць цяжарная жанчына. У некаторых мясцах жывёліну сустракалі гэтаксама, як маладых пасля вянчання: у варотах клалі кажух, вывернуты поўсцю наверх.

На Беларусі вядомы і звычай абліваць карову вадой, калі яе толькі заводзяць у двор, каб яна не "сумавала" па папярэдніх гаспадарах. У той дзень, калі карову прывялі да новых гаспадароў, катэгарычна забаранялася што-небудзь пазычаць (у тым ліку і грошы). Гэты звычай цесна пераплецены з семантычна блізкімі сітуацыямі: нічога не пазычаць у той дзень, калі нарадзілася дзіця або ацялілася карова.

## КАБ ХУТЧЭЙ АДПАЛЯВАЛА

Практычна ўсе вядомыя захады гаспадароў, накіраваныя на злучку каровы, зноў-такі грунтаваліся на традыцыйных рытуальна-магічных дзеяннях, якія сімвалізавалі паяднанне, зблiжэнне. Напрыклад, адным з найбольш надзейных спосабаў імітацыі дасягнення жадаемага быў сімвалічны акт кармлення каровы хлебам з соллю праз плот. Калі карову прыводзілі да быка, то гаспадар адвязваў вяроўку, якой вёў скаціну, і апяразваўся ёю сам. Моцным сродкам ад бясплоднасці лічылася і такое дзеянне: пасля таго як хлеб пасадзілі ў печ, бралі нож і саскрабалі з лапаты рэшткі цеста, якія перамешвалі з соллю і давалі карове, але не з рук, а перакідвалі праз дзвярную завесу. У заходніх раёнах Беларусі з гэтай нагоды рабілі так: бралі шнурок, на якім вясной падсушвалі вяндліну або саланіну, і навязвалі карове на шыю.

На працягу шматлікіх стагоддзяў гаспадарання чалавека ўзніклі і захаваліся ў народнай памяці прыкметы, па якіх можна было прадказаць, цёлкай ці бычком ацеліцца карова. Так, калі яна "пахадзілася" да паўдня ці на пустое вымя, ліжа сабе спіну, жвавая, то трэба было чакаць бычка; калі ж нядоенай або ў другой палове дня, ліжа сабе бакі, застаецца ціхай і спакойнай — цёлку. Нагадаю і такую незвычайную прыкмету: калі незадоўга да ацёлу хвост у каровы будзе мець звычайны выгляд, чакайце цёлку, калі ж заўецца — бычка.

Дбайныя гаспадыні на працягу ўсяго перыяду цельнасці прытрымліваліся цэлай сістэмы абмежаванняў і перасцярог. Аказваецца, у гэты час нельга было віць вяроўкі, пугу-пляцёнку, вязаць з матузоў дываны, гарадзіць пералаз, бо цяля ўродзіцца са звітымі або вывернутымі ножкамі. А каб перасцерагчы карову ад featurenага чарадзейства або ліхога вока, трэба было вывесці яе ў дво́р і тройчы перакінуць праз спіну сякеру, толькі з таго боку, з якога даілі.

## АЦЁЛ

Яшчэ раз хочацца паўтарыць, што ступень свяшчэннадзейства падчас нараджэння дзіцяці і з'яўлення на свет цяля была амаль што аднолькавай. Гэта быў адказны момант, ад якога залежыла здароўе не толькі цяляці, але і самой каровы. Больш таго, правільныя дзеянні з паследам прадвызначалі далейшы лёс рагулі.

У час ацёлу не пажаданай была прысутнасць чужых людзей, каб кепскія вочы не выклікалі прыпадак, таму адразу ж карову і цяля трэба было апырскаць вадою, асвечанай у храме

на Вадохрышча, і абсыпаць соллю, якую ў Чысты чацвер ставілі на ноч на скрыжаванні дарог. Лічыцца, што цяля будзе добра расці, калі адразу ж пасля ацёлу абкурыць саскі каровы грамнічнай свечкай. А каб карова не страціла малако, яе абсыпаюць асвечаным макам. Асобныя гаспадыні выконвалі больш складанае рытуальна-магічнае дзеянне. Як толькі расцеліцца першацёлка, трэба набраць поўную даёнку вады, роўна з берагамі, затым здаіць з кожнага саска накрыж па тройчы на тую ваду і даць яе папіць карове. Рэшткі лінуць на карову ад крыжа да галавы — ніякія чары не прычэпяцца да яе.

Нашы продкі былі перакананы, што малочнасць каровы ў многім залежыць ад дня ацёлу. Скажам, калі гэта панядзелак ці пятніца — малака будзе вельмі мала, хоць ты бяры і дразу вядзі рагулю на базар. Найбольш шчаслівымі лічыліся аўторак, серада і чацвер. Існавалі таксама прадказанні аб малочнасці, зыходзячы з напрамку размяшчэння цяляці адразу пасля ацёлу. Мой бацька разважаў так: калі галава скіравана на ўсход — вырасце вялікім і дужым; калі на захад — лепш зарэзаць або прадаць. З даўніх часоў вялікай пашанай карысталіся бычкі-блізняты: калі ўзараць на іх поле, заўжды будзе добры ўраджай, а збажыну ніколі не паб'е град; калі ж абараць на іх усю вёску, не будзе паморaў.

Асаблівую павагу трэба было ўдзяляць "месцу" або "пасцелі", якую пажадана тут жа закапаць у гной, каб карова не з'ела: верылі, што пасля гэтага малако будзе пеніцца аж да другога цялення. Калі карова доўга не магла ачысціцца ад "месца", бралі стары венік або мятлу і праводзілі ім па крыжы, затым неслі на скрыжаванне дарог і закопвалі. Усё гэта імкнуліся выканаць так, каб ніхто не ўбачыў — інакш не будзе карысці.

Часам можна сустрэць і такі абрад. Гаспадыня брала паслед у рукі і тройчы абыходзіла карову супраць сонца. Затым двойчы апускала яго да ног жывёліны і нарэшце злёгку пляскала ім на ілбе каровы, прыгаворваючы: "Матуля-рагуля, як ты стаіш, так і стой. З нагі на нагу не пераступай, хвастом не махай, галавой не круці, лёгка даіся, дадому заўсёды вярніся". Пасля гэтага паслед закопвалі ў праходзе, каб наступнай была цёлачка, або ў куце — каб быў бычок. Этнографы ўзгадваюць і крыху іншы варыянт такога абраду. Жанчына спачатку праводзіла пaследам па хрыбце каровы ад галавы да хваста і казала: "Рагуля-баравуля, так стаяла твая бабуля, так стаяла твая матуля і табе так стаяць наказвала". Гэта дзеянне паўтаралі тры разы, пасля чаго паслед закопвалі ў зямлю пад гной і ў тое месца ўбівалі кол са словамі: "Як гэты кол стаіць, так і ты стой".

Да нашага часу вясковыя знаўцы народнай мудрасці выконваюць вельмі эфектнае прафілактычнае дзеянне: карове першага ацёлу спілоўваюць адзін або два рогі, прасвідроўваюць у іх невялікія дзірачкі і ўпускаюць туды "жывое срэбра" (ртуць). Гаспадыні перакананы: лепшага сродку ад сурокаў і розных чараванняў проста не існуе.

# ЧАЛАВЕК І СУСВЕТ



# СЛАВЯНСКАЯ МІФАПАЭТЫЧНАЯ МАДЭЛЬ СВЕТУ:
## бінарная апазіцыя *правае—леваe*

У другой палове 20 ст. асноўныя накірункі фалькларыстычных даследаванняў на Беларусі канцэнтраваліся вакол уласна жанравых структур. Аднак падрабязнае структурна-функцыянальнае даследаванне на наступным этапе вымагае прац абагульняючага характару, у якіх было б дадзена філасофска-культуралагічнае асэнсаванне беларускай этнакультурнай традыцыі. Даўно ўжо наспела патрэба ў шырокамаштабных кампаратывісцкіх даследаваннях, скіраваных на вывучэнне культурных архетыпаў, іх семантыкі, семіятычных кодаў нашай культуры. Заключным звяном у ланцужку этнакультурных даследаванняў можа стаць вывучэнне светапоглядных асноў: асаблівасцей светаўспрымання, светаадчування, светаўсведамлення і нарэшце светабудовы ў цэлым. Вынікі такіх даследаванняў стануць трывалым падмуркам для стварэння беларускай (у кантэксце агульнаславянскай) этнакультурнай мадэлі свету, у якой дыяхронны (вертыкальны) зрэз будзе сінтэзаваць духоўныя полюсы, на якіх, з аднаго боку, сканцэнтраваны язычніцкі пантэон уладароў неба, а з другога — пантэон боствaў — уладароў зямлі (са сваёй уласнай падструктурай: хтанічны свет, стыхіі зямлі і вады і “свет” продкаў). У аснове гарызантальнай (сінхроннай) структуры знаходзіцца пантэон Духаў, якія “ажыўляюць” наваколле і гаспадарчыя пабудовы. Кожны крок чалавека, кожная інтэнцыя якой-небудзь дзейнасці абавязкова падпарадкоўваліся закону каштоўнаснай арыентацыі, які структураваў прастору на аснове прынцыпу этыка-рэгламентуючай і ацэначнай палюсарнасці: *правае—левае, спераду—ззаду, маё—чужое, дабро—зло, жыццё—смерць, мужчынскае—жаночае* і інш.

Якая з гэтых бінарных апазіцый першасная, а якая вытворная, сказаць беспамылкова немагчыма, хаця старажытныя міфалагічныя сюжэты прымушаюць думаць, што асноватворным магло быць супрацьстаянне *маё—чужое*, за якім бачылася становішча эмбрыянальнай камфортнасці, абароненасці, надзейнасці (космас жытла, маё) і нязведаны, нязвыклы свет па-за межамі асвоенай тэрыторыі (антысвет чужынцаў). У непасрэднай блізкасці ад антыноміі *маё—чужое* стаіць прыродна-

экзістэнцыяльнае супрацьстаянне *жыцця і смерці*. У больш познія часы гэтыя катэгорыі набываюць ацэначна-каштоўнаснае або этыка-прававое асэнсаванне і трансфармуюцца ў катэгорыі *дабра і зла*. Касмаганічны акт першатварэння, адлюстраваны ў беларускай міфатворчасці, не тлумачыць, чаму менавіта такім чынам адбылася палярызацыя каштоўнасных арыенціраў у структураванні культурнай айкумены, аднак іх прасторавая суаднесенасць даволі выразная: злева(-), справа(+), спераду(+), ззаду(-). Гэты ж самы прынцып пакладзены і ў аснову матрыцы ружы вятроў. Зразумела, калі адштурхнуцца ад тэкстаў замоў, у якіх народны лекар на ўзроўні слоўнай экстрапаляцыі пераносіць сябе ў рытуальнае месца радавых святкаванняў, то даволі выразную пазначанасць атрымае класічны арыенцір: тварам на усход(+). У такім выпадку маркіраванасць ружы вятроў будзе цалкам адпавядаць жыццёваму космасу чалавека: усход і поўдзень — знак "+", захад і поўнач — знак "-".

## БІНАРНАЯ АПАЗІЦЫЯ *ПРАВАЕ—ЛЕВАЕ:* культурныя кантэксты

Знаёмства з беларускай этнакультурнай традыцыяй паказвае, што супрацьпастаўленне правы—левы з'яўляецца адным з найбольш пашыраных як у структуры рытуальна-абрадавых комплексаў, так і ў побытава-сітуатыўным плане. Перш за ўсё звернемся да абрадавых кантэкстаў і прасочым, якім чынам гэты культуралагічны прынцып уплываў на паводзіны ўдзельнікаў абраду і на структураванне прасторавага локуса святочнага дзеяння.

### 1. Рытуальна-абрадавыя кантэксты апазіцыйнасці *правае—левае*

Неабходна адразу адзначыць, што дыхатамія правае—левае найбольш выразна і шматбакова праяўляецца пры супастаўленні абрадавых структур, якія ляжаць у аснове шматдзённых сямейна-радавых святкаванняў вяселля і памінак. Практычна ўсе іх вузлавыя моманты падпарадкаваны аднаму алгарытму развіцця, аднак у залежнасці ад таго, якая эмацыянальная дамінанта пераважае (жыццясцвярджальная ці развітальная), адно і тое ж дзеянне мяняе свой знак на супрацьлеглы.

1.1. Распачынаецца сервіроўка святочнага стала. Калі ён рыхтуецца з нагоды важнай падзеі ў зямным жыцці чалавека

(радзіны, чарговы дзень нараджэння, вяселле, юбілей сумеснага жыцця, правады ў войска, наваселле і інш.), то абрус кладзецца на стол *правым бокам,* лыжка і відэлец — выемкай уверх (да сонца, каб сонца "купалася"); калі ж рытуальная трапеза адбываецца з нагоды паслясмяротнага ўшанавання каго-небудзь з родных або блізкіх, то абрус засцілаюць *левым бокам*, а лыжку пераварочваюць выемкай уніз (відэлец увогуле на стол не клалі).

1.2. Дыяметральнай супрацьлегласцю адрозніваўся рытуал пасадкі гасцей за вясельны і жалобны стол. Так, за вясельны стол *галоўныя персанажы* святкавання (*маладыя)* заходзілі, рухаліся следам за сонцам — злева направа. А вось за жалобны — *усе прысутныя* заходзілі ў адваротным накірунку — супраць сонца, на захад. Аднак напрыканцы трызны *ўсе госці* (за выключэннем самага старога) *уставалі адначасова* і *выходзілі ўжо па сонцы*, што павінна было азначаць толькі адно: няхай жыццё доўжыцца ў гэтай хаце.

1.3. Гэты ж самы прынцып захоўваецца яшчэ ў дзвюх рытуальных сітуацыях.

1.3.1. Пасля таго як закончыцца выкуп нявесты і перад тым, як маладыя адправяцца да вянца, бацька дапамагаў дачцэ выканаць абрад развітання са сваім домам, культурна-абрадавым эпіцэнтрам якога быў *стол*. Ён апяразваў дачку ручніком і *тройчы па сонцы* абводзіў яе вакол стала, а затым вёў да парога.

1.3.2. У другой палове 20 ст. гэты рытуал атрымаў новае жыццё ў гарадскіх умовах. Перад тым як адправіць парадзіху ў раддом, муж тройчы па сонцы абводзіў жонку (будучую маці) вакол стала.

1.4. Перад тым як вясельны картэж адправіцца да храма на вянчанне, маці маладой *тройчы па сонцы* абыходзіла ўсіх удзельнікаў абраду і абсыпала іх зернем жыта.

1.5. Калі вясельны картэж уязджаў у вёску, да хаты маладой ён павінен быў пад'ехаць толькі з таго боку, з якога ўзыходзіла сонца.

1.6. Вароты на могілках заўсёды з'арыентаваны на захад, таму труну з нябожчыкам заносяць на могілкі і падносяць да магілы толькі з захаду.

1.7. На ўсёй тэрыторыі Беларусі існуе звычай сустракаць маладых перад парогам хаты. Маці трымае на руках хлеб-соль, а бацька два кілішкі і штоф з гарэлкай. Піць яе маладым забараняецца. Таму як толькі бацька нальe і прапануе выпіць, маладыя пасмакуюць (прыгубяць) і, зразумеўшы, што гэта не іх пітво, *выльюць гарэлку правай рукой праз левае плячо.*

Дэтэрмінаванасць прыярытэтнага ў культуры накірунку "злева направа" можа быць шматаспектнай: псіхалагічнай, фізіялагічнай, біялагічнай. Аднак, думаецца, што ўсе варыянты падпарадкаваны ўніверсальнай касмалагеме: руху Сонца па небасхіле (хаця вядома, што на самой справе Зямля рухаецца вакол сваёй восі і вакол Сонца ў левы бок). Калі на працягу светлавога дня Сонца рухаецца злева направа (што і вызначае спецыфіку разгортвання рытуалаў жыццепрадуцыравальнага характару), то ноччу, калі трапляе ў царства смерці — Танатаса, яно павінна прайсці шлях у адваротным накірунку — справа налева, каб раніцай зноў з'явіцца на гарызонце на ўсходзе.

Гэтаму касмаганічнаму прынцыпу падпарадкаваны шматлікія дзеянні не толькі ў рытуальна акцэнтаваных, але і побытава-будзённых сітуацыях. Напрыклад, калі гаспадыня сшывала дзве полкі ў посцілках, у спадніцы, у настольніку, зашывала навалачку або сяннік, то іголку яна абавязкова трымала "на сябе" і шво доўжылася *злева направа*. Калі ж адпаведныя дзеянні выконваліся ў час падрыхтоўкі рытуальных атрыбутаў для пахавання, усё рабілася ў адваротным накірунку — *справа налева*.

## 2. Бінарная апазіцыя *правае—левае:* этыка-нарматыўныя кантэксты

Касмаганічны ўніверсум структуравання прасторы на правае — левае ахопліваў практычна ўсе сферы дзейнасці старажытнага чалавека. У катэгорыях народнай педагогікі і этыкі гэта апазіцыя трансфармавалася ў супрацьстаянне *Дабра і Зла*, Шчасця і Гора (Бяды), Долі і Нядолі. Аб гэтым сведчаць славянскія народныя казкі і быліны. Герой стаіць на скрыжаванні дарог, яму неабходна зрабіць выбар, у якім накірунку пайсці далей. Камень-валун, які выконваў ролю маркёра цэнтра асвоенай прасторы, падказваў: *налева* пойдзеш — *смерць* знойдзеш, *направа* пойдзеш — *жывым будзеш*.

## 3. Апазіцыя *правае — левае* як увасабленне мужчынскага і жаночага пачаткаў

Адной з найбольш пашыраных праяў апазіцыі правае—левае з'яўляюцца шматлікія сацыякультурныя кантэксты, у якіх адпаведным чынам разведзены *мужчынскі (правае)* і *жаночы (левае)* пачаткі.

3.1. Адным з асноўных атрыбутаў народнага касцюма з'яўляецца пояс, які сімвалізаваў завершанасць адзення і выконваў ролю надзейнага магічна-ахоўнага сродку, без якога нельга

было збірацца ў далёкую дарогу і нават выходзіць на вуліцу. Паясы адрозніваліся сваім арнаментам, шырынёй, даўжынёй і спосабам павязвання ў залежнасці ад сацыяльнага статусу яго ўладальніка. Звычайна *жанчыны завязвалі вузел з левага боку, мужчыны — з правага*. Аналагічным было павязванне рытуальных ручнікоў у асноўных удзельнікаў беларускага вяселля, а таксама мацаванне кветак у дружак маладой і дружкоў маладога. Гэты ж самы прынцып канструявання адзення захаваўся ў еўрапейскіх народаў да нашага часу. Мужчыны зашпільваюць сваю вопратку на правы бок, а жанчыны — на левы.

3.2. Вельмі высокім статусам семіятычнасці быў надзелены святочны стол — вясельны або памінальны. Вясельны абрад сімвалізаваў саюз, паяднанне двух родаў, таму госці садзіліся за сталом сямейнымі парамі, побач. За памінальным сталом збіраліся з нагоды смерці аднаго з членаў сям'і. Смерць раз'ядноўвала. Таму стол ставілі толькі ў адзін рад, а госці садзіліся за ім парамі, але не побач, а насупраць адзін аднаго. Жанчыны — бліжэй да сярэдзіны хаты (*злева ад уваходу*), а мужчыны — уздоўж сцяны (*справа ад уваходу*).

3.3. Старажытная ведыйская апазіцыя правае—левае была запазычана хрысціянствам, у традыцыі якога атрымала ўскладненую трактоўку: а) этычную (як супрацьпастаўленне Дабра і Зла) і сацыякультурную (з правага боку чалавека ахоўвае Анёл, а з левага — спакушае Д'ябал). А паколькі першая жанчына свету спакусіла Адама і тым самым справакавала першародны грэх, яе месца ва ўсіх рытуальных сітуацыях было пазначана адмоўным знакам (з левага боку). Менавіта таму падчас вянчання ў храме нявеста стаіць злева ад маладога.

3.4. Аднак найбольш сістэматызаваным праяўленнем апазіцыянальнасці *правага* і *левага* як *мужчынскага і жаночага* пачаткаў з'яўляецца структура хрысціянскага календара. Калі схему яго прадставіць у выглядзе кола, то акажацца, што *святы, звязаныя з жыццём Ісуса Хрыста* (Раство, Вадохрышча, Стрэчанне, Вялікдзень, Ушэсце і дзень нараджэння Івана Хрысціцеля, які пахрысціў Ісуса), будуць *пазначаны з правага боку*, а вось *святы*, якія датычаць *жыцця Багародзіцы* (дзень яе нараджэння, дзень смерці, Увядзенне ў храм і Пакровы), размесцяцца *з левага боку* ад вертыкальнага дыяметра. Гэты канструктыўны прынцып быў пакладзены ў аснову храмавай архітэктонікі.

# ЧАЛАВЕК У СТРУКТУРЫ МІФАПАЭТЫЧНАЙ МАДЭЛІ СВЕТУ (ЭКОЛАГА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ РЭГЛАМЕНТАВАННЯ ПАВОДЗІН)

Дзве дзіўныя рэчы даволі доўгі час не даюць мне спакою. Па-першае, чаму сталася так, што аварыя на Чарнобыльскай АЭС (якая знаходзіцца няхай сабе і на мяжы, але ўсё ж на тэрыторыі Украіны) больш за ўсё прынесла пакутаў беларускаму народу? Па-другое, улетку 1997 года над Беларуссю пранёсся страшэнны буран, які моцна надарваў нашу народную гаспадарку, а мноства людзей пакінуў без жытла. І вось што здзіўляе: прыродная стыхія пранеслася менавіта ў купальскую ноч (маецца на ўвазе ноч летняга сонцавароту). Аб чым усё гэта сведчыць? І ці апошнія прыродныя катаклізмы выпрабоўваюць духоўны патэнцыял нашага народа? Адказам можа быць экзістэнцыяльная дылема: ці то мы сваімі паводзінамі ў другой палове 20 ст. парушылі адвечныя законы прыродна-касмічнага і сацыякультурнага суладдзя, выпрацаваныя на працягу тысячагоддзяў нашымі продкамі, ці то нам (зноў-такі дзякуючы духоўнай спадчыне мінулага) наканавана незвычайная гістарычная перспектыва, гарызонты якой адкрыюцца толькі пасля шэрагу касмічных выпрабаванняў, скіраваных на катарсічныя іспыты нашай душы і свядомасці.

Ніводны з полюсаў прапанаванай бінарнай апазіцыі не можа быць прыняты ў якасці генералізаванага. Гарызонты будучыні, як правіла, залежаць ад вышыні сучаснага становішча і ад глыбіні вытокаў мінулага, ад ступені асэнсаванасці, цеснай паяднанасці гэтых двух берагоў нашай гісторыка-культурнай плыні. Аднак, на вялікі жаль, валодаючы адным з найбуйнейшых сярод славян (і не толькі) метатэкстам фалькклорнай спадчыны, мы пакуль што не ўсвядомілі і ўсебакова не асэнсавалі яго жыццятворную ауру, гуманістычны патэнцыял, сямейна-радавы экзістэнцыялізм, фундаментальнымі сістэмаўтваральнымі прынцыпамі якога былі: адвечная мара аб паляпшэнні дабрабыту, штодзённы клопат аб захаванні і падаўжэнні свайго Роду, непарушна-святое стаўленне да ўшанавання радаводнай памяці. На працягу 19 і 20 ст. нашымі рупліўцамі збіральнікамі былі занатаваны і выдадзены дзесяткі зборнікаў вуснай народнай паэзіі, у якой адлюстравана практычна ўся сістэма фальклорных жанраў у яе шматтысячнай поліфаніі тэкстаў. Амаль што кожны з прадстаўленых жанраў быў у той ці іншай ступені даследаваны беларускімі навукоўцамі. Аднак да гэтага часу агаленым нервам застаецца праблема

генезісу беларускай культурнай традыцыі, якую не адно пакаленне навукоўцаў ціха абмінае, таму што падступіцца да яе нельга па дзвюх прычынах. Па-першае, пакуль што не рэканструяваны старажытны міф, які, па-другое, ляжаў у аснове міфапаэтычнай мадэлі свету тых мікра- або макрасоцыумаў, якія ўдзельнічалі ў этнагенезісе беларусаў. Дарэчы, няведанне асноватворнага міфа і адсутнасць выразнага разумення пазіцыі чалавека ў мадэлі свету ўжо не адно дзесяцігоддзе абвастрае праблему сацыкультурнай самаідэнтыфікацыі для нашай моладзі.

Мы паспрабавалі пайсці ў адваротным накірунку. Праз сістэматызацыю вялікай колькасці фактаў культуры выявіць іх структурныя (дыяхронныя і сінхронныя) узаемасувязі і, хацяб пры першым набліжэнні, аконтурыць мадэль свету, а затым ужо зрабіць крок да рэканструкцыі міфа, які ляжаў у аснове беларуска-славянскай касмагоніі.

Беларуская мадэль свету пабудавана сіметрычна. Адна яе частка накіравана да сонца, зорак, месяца і таямнічых сіл прыроды; другая, супрацьлеглая, заглыбляецца ў замагільны свет продкаў і абапіраецца на веру ў бяссмерце душы, на ўяўленні аб тым, што чалавек і пасля смерці можа дапамагаць або шкодзіць жывым. Сімвалічным адлюстраваннем гэтай мадэлі стаў рытуальны ручнік, адзін канец якога мадэліруе свет жывых, а другі (перавернуты як у люстэрку) — “той” свет, свет мёртвых, свет продкаў. Белае поле паміж імі — дарога, Млечны Шлях у Вечнасць, вертыкальны зрэз нашай духоўнай спадчыны. На гарызанталі гэтай мадэлі знаходзіцца прырода з яе шматлікімі праявамі (вада, расліннасць, жывёльны свет). Нагадаем, як у народным календары ўшаноўваецца *вада* на Вадохрышча, у Чысты чацвер, на Сёмуху і Купалле. Ключавымі атрыбутамі шматлікіх абрадаў была і застаецца расліннасць: на Каляды на святочны стол пад абрус клалі сена, на Вербніцу ўшаноўвалася дрэва, якое першым рэагавала на веснавое пацяпленне, на Тройцу хата і падворак упрыгожваліся аерам або галінкамі шыракалістых дрэў. Калядна-навагодняя містэрыя, найбагацейшы юраўскі абрад выгану жывёлы ў поле, таямніцы абрадавай паэтыкі Узвіжання, нарэшце, бязмежныя абшары казачнага эпасу — яскравае сведчанне пачцівых адносін чалавека да жывёльнага свету.

Сам жа чалавек знаходзіўся на перакрыжаванні гэтых дарог. Ён шанаваў прыроду, шмат у чым абмяжоўваў і стрымліваў сябе, што давала магчымасць выжыць у самых складаных абставінах. Праз сотні год ён стварыў непаўторную вусную энцыклапедыю жыцця — багатую паэтычную спадчыну і складаную сістэму абрадаў, павер’яў, перасцярог, табу, рэгла-

ментацый і прадпісанняў, якія, з аднаго боку, карэліравалі ўзаемаадносіны з наваколлем, а з другога, абапіраючыся на заўважаную цыклічнасць, рытмічнасць, прадказвалі будучы ўраджай, паляпшэнне сямейнага дабрабыту, палёгку пры ўтрыманні хатняй жывёлы падчас працяглага стойлавага перыяду.

У беларускай традыцыйнай культуры захаваліся рознажанравыя і рознахарактарныя квінтэсенцыі народнай мудрасці. Гэта маглі быць проста рацыянальныя назіранні за станам прыроды ў пэўныя дні года, якія дазвалялі з вялікай доляй трапнасці прагназіраваць надвор'е на цэлыя часавыя перыяды.

*Як два дожджыкі ў маю, мужык будзе жыць, як у раю.*

*Калі на Грамніцы певень з-пад страхі нап'ецца вадзіцы, то на Юр'я вол наесца травіцы.*

*Калі на Іллю дождж, то яшчэ сорак дзён будзе ліць.*

Вельмі блізка да прыкмет-назіранняў дапасуюцца шматлікія практычныя парады.

*Сей авёс у гразь — багаты будзеш, як князь.*

*На свята Антоній сей авёс для коней, а як удасца, то і прадасца.*

*Прыйшоў Багач — кідай рагач, бяры сявеньку і сей памаленьку.*

З прыведзеных прыкладаў добра бачна, што прыкметы-назіранні маюць характар стрымана-няпэўнай фармуліроўкі, а вось парады адрозніваюцца не толькі перакананасцю інфарматара ў сваіх назіраннях, але і пэўнай настойлівасцю, часам нават катэгарычнасцю сфармуляванай думкі. Што тут галоўнае: прыкмета, усвядомленая праз вопыт шматгадовых назіранняў, або сэнс самой парады, перадаваемай спадкаемцам?[1]

Да вышэйзгаданых форм фіксацыі, назапашання і трансляцыі ведаў далучаюцца *этапныя квінтэсенцыі*, у якіх гучыць не проста трапнае назіранне за прыродна-сацыяльнымі ўзаемасувязямі, а сканцэнтравана інфармацыя абагульняюча-выніковага характару. Гэта як бы вехі ў жыцці чалавека, быццам мяжа яго працоўных стасункаў.

*Да Багча баба рабача, па Багчы хоць за плот валачы.*

*На Тадора поўна камора.*

*Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйшла Ілля — апала два, прыйшоў Спас — пайшло лета ад нас.*

*Грамніцы — хлебу палавіца.*

Прынцыпова іншы характар сацыяльнай дэтэрмінаванасці мае *этыкетна-нарматыўнае табуіраванне*. У яго сістэму ўваходзяць шматлікія сакральна-магічныя інтэнцыі: перасцярогі і забароны, якія, як правіла, жорстка рэгламентуюць паводзіны членаў сям'і, роду, вясковай абшчыны перш за ўсё ў

святочныя дні або падчас выканання рытуальна-абрадавых дзеянняў. Прычым неабходна адзначыць, што гэтыя забароны маюць не абсалютна універсальны характар (калі на розныя святы гадавога кола накладваліся абмежаванні ў працоўнай дзейнасці, у характары паводзін). Прыкладнае звужэнне спектра нарматыўных паводзін і табуіраванне мелі сацыяльную (полаўзроставую, статусную) накіраванасць. Шматлікія прыклады беларускіх парэмій сведчаць, што абмежаванні ў паводзінах з адначасовым завышэннем патрабаванняў да дазволеных норм былі раўнамерна размеркаваны па ўсіх порах года. Змяніліся толькі акцэнты табуіравання. (**Забаранялася**: у Градавую сераду працаваць, каб град шкоды не нарабіў; жанчынам ткаць і прасці ў пятніцу; мыць галаву на Івана Галавасека; да Спаса есці яблыкі жанчынам, у якіх памерлі дзеці; распачынаць сельскагаспадарчыя работы да Радаўніцы або Благавешчання, бо перш трэба навесці парадак на могілках суродзічаў; стрыгчы пазногці ў міжыкалядзь, бо каровам капыты зганяць будзе.)

Аднак асаблівай варыятыўнасцю, разгалінаванасцю і ўсебаковасцю вызначаецца сістэма сацыякультурных рэгламентацый і прадпісанняў. Вось дзе сапраўды сутыкаешся з філасофскімі вышынямі культуры нашых продкаў, з яе гуманістычным пафасам і літаральна адшліфаваным этыкетна-нарматыўным кодэксам жыцця і маралі.

З безлічы зафіксаваных прыкладаў прывядзем найбольш цікавы і актуальны для нашых сучаснікаў:

моладзь да 18 год за памінальны (жалобны) стол не дапускалася: ёй жыць, доўжыць радавод, таму пакуль ты не стварыў сям'ю і не прадоўжыў эстафету жыцця, за "стол смерці" не садзіся;

калі ў хаце нехта паміраў, то цяжарную жанчыну тут жа перавязвалі чырвоным поясам-абярэгам, яна выходзіла з хаты наперад пахавальнай працэсіі і на могілкі яе не пускалі;

першым з могілак пасля пахавання павінен быў выйсці самы стары сярод прысутных чалавек, бо, лічылася, дзейнічае вялікі касмічны закон: хто першы выйдзе, той першы сюды і вернецца;

вясельны каравай з моманту выпечкі і да моманту падзелу яго сцераглі, каб ніхто да яго не датыкнуўся, бо існуе павере': дастаткова каму-небудзь адламаць з сярэдняй яго часткі невялічкі кавалачак (забраць Долю ў маладых), як гэта новастворaная сям'я застанецца бяздзетнай.

Мне давялося налічыць каля 300 прадпісанняў, звязаных з паводзінамі жанчыны у перыяд цяжарнасці:

не садзіся на камень, плод "скамянее";
не ступай на парог — дзіця не народзіш;
не хадзі пад вяроўкамі — дзіця будзе тройчы абкручана пупавінай;
не абстрыгай валасы — з таго дня плод перастане развівацца, і г.д.

Вышэй быў прыведзены цэлы шэраг паэтычных народных мініяцюр, якія розняцца між сабою ступенню афарызацыі, закончанасцю думкі, характарам уласнай перакананасці ў праўдзівасці закадзіраванай інфармацыі, маштабам сацыяльна-прыроднай і прыродна-сацыяльнай дэтэрмінаванасці, нарэшце ўзроўнем сакралізацыі назапашаных ведаў. Зараз яшчэ цяжка адказаць на пытанне, якім фактарам адпавядае ўзровень сузалежнасці і нарматыўнасці, закадзіраваны ў згаданых лагаформах.

Аднак мае шматгадовыя ўласныя назіранні і характар выканання табуіраваных прадпісанняў сведчаць аб тым, што гэта сістэма дзейнічае і даволі жорстка і аднанакіравана. Яе парушэнне прыводзіць да шматлікіх уласных і сямейных трагедый. Таму перш чым развітацца з мінулым, трэба яшчэ і яшчэ раз падумаць аб тым, а што створым і пакінем нашчадкам і Вечнасці мы самі.

# ЛІТАРАТУРА

## БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР


[1] *Аничков Е.В.* Весенняя обрядовая поэзия на Западе и у славян. СПб., 1903, ч. 11; 1905, ч. 2.

[2] *Булгаковский Д.Г.* Пинчуки. Этнографический очерк//Зап. Имп. рус. географ. общ-ва по отд-нию этнографии. СПб., 1890.

[3] *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 7. Вильна, 1912.

[4] *Бессонов П.* Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, очерками народного обряда, обычая и всего быта. М., 1871.

[5] *Шейн П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1. СПб., 1887. Яго ж: Белорусские народные песни с относящимися к ним обрядами, обычаями и суевериями. СПб., 1874.

[6] *Карский Е.Ф.* Белорусы: Очерки словесности белорусского племени. Вып. 1. Народная поэзия. М., 1916.

[7] *Чичеров В.И.* Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX веков. М., 1957.

[8] *Пропп В.Я.* Русские аграрные праздники. Л., 1963.

[9] *Соколова В.К.* Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979.

[10] *Виноградова Л.Н.* Зимняя календарная поэзия западных и восточных славян: Генезис и типология колядования. М., 1982.

[11] *Барташэвіч Г.А.* Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985. Яе ж: Жанравая спецыфіка каляндарна-абрадавай паэзіі ўсходніх славян//Узроўні агульнасці фальклору ўсходніх славян. Мн., 1993. С. 138—258.

[12] *Ліс А.С.* Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў. Мн., 1998.

[13] *Лозка А.Ю.* Беларускі народны каляндар. Мн., 1993.

[14] *Васілевіч У.А.* Беларускі народны каляндар//Паэзія беларускага земляробчага календара. Мн., 1992. С. 554—612.

[15] *Ліс А.С.* Купальскія песні. Мн., 1974. С. 42—46.

[16] *Бессонов П.* Белорусские песни. С. 66.

[17] *Federowski M.* Lud bialoruski. Warszawa, 1958. С. 717.

[18] Библейская энциклопедия. М., 1991. С. 412—413.

[19] Настольная книга священнослужителя. Т. 3. М., 1979. С. 579.

[20] Легенды і паданні /Склад. М.Я.Грынблат, А.І.Гурскі. Мн., 1983. № 229. С. 185—186.

[21] Земляробчы каляндар /Укладанне, класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і каментарыі А.І.Гурскага. Мн., 1990. С. 272—273.

[22] *Богданович А.Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Гродно, 1845. С. 122—125.

[23] Архіў аўтара. У перыяд з 1974 па 1994 г. мне тройчы даводзілася

назіраць гэтае рытуальнае дзеянне ў в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці.

[24] Саньтьи ВѢды Перуна. Книга мудрости Перуна. Круг Первый. АСГАРДЪ-Омск, 1999. С. 193—194.

[25] *Шейн П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1. Ч. 1. СПб, 1887. С. 47.

[26] Зімовыя песні /Укладанне тэкстаў, уступны артыкул і каментарыі А.І.Гурскага. Мн., 1975. № 265. С. 205.

[27] Валачобныя песні /Укладанне тэкстаў, уступны артыкул і каментарыі Л.М.Салавей. Мн., 1980. № 72. С. 122—127.

[28] "Дай Божа знаць, з кім век векаваць": Беларуская народная варажба / Уклад. У.А.Васілевіч. Мн., 1993.

[29] *Крук І.І.* Следам за сонцам. Беларускі народны каляндар. Мн., 1998. С. 14.

[30] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: Канец XIX — пачатак XX ст. Мн., 1993.

[31] Магія слова чароўнага /Склад. І.І.Крук, З.В.Крук, Г.І.Кутырова. Мн., 1995. С. 251—258.

[32] Зямная дарога ў вырай. Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3 /Уклад У.А.Васілевіч. Мн., 1999. № 317. С. 102.

[33] Архіў аўтара. Неаднаразова мне даводзілася чуць гэтую прыказку на Гомельшчыне, у Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці, а таксама ад роднай бабулі А.І. Крук.

[34] Земляробчы каляндар. С. 134.

[35] *Панкеев И.А.* От крестин и до поминок. М., 1997. С. 79.

[36] *Ліцвінка В.Д.* Святы і абрады беларусаў. Мн., 1997. С. 173.

## Млечны шлях пад рукамі бабулі

[1] *Айванхов О.М.* Золотые правила ежедневной жизни. М., 1993. С. 14—16. Яго ж: Новая земля: Методы, упражнения, формулы, молитвы. М., 1994. С. 21—44.

[2] *Пропп В.Я.* Исторические корни волшебной сказки. Л., 1986. Гл. па гэтай тэме: *Балушок В.Г.* Инициации древних славян (попытка реконструкции)//Этнографическое обозрение. 1993. № 4. С. 65. Яго ж: Роль жінки в юнацьких ініціаціях давних слов'ян //Родовід, 1994. № 4; Парубачі ініціаціі в україньскому традиційному селі //Родовід, 1994. № 7.

[3] Легенды і паданні. С. 205—208.

[4] Там жа. С. 186—188.

[5] *Валодзіна Т.В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. Мн., 1999. С. 31—36, 58—63, 64—77, 92—96.

[6] Архіў аўтара. Запісана ў 1977 г. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад В.А.Кавалевіч.

[7] Легенды і паданні. С. 214. Гл. таксама: Полесский этнолингвистический сборник: Материалы и исследования. М., 1983. С. 46.

[8] Архіў аўтара. Запісана ў 1993 г. у в. Азярышча Мінскага раёна ад народнай лекаркі Ф.А.Бліновай.

[9] Пачынаючы з 1992 г. я запісаў ад Фені Антонаўны Бліновай больш за 70 замоў ад розных хвароб, некалькі сеансаў яе лячэння запісана на відэа.

[10] У савецкай фалькларыстыцы магія і магічная паэзія заставаліся па-за ўвагай навукоўцаў, а, магчыма, існавала няпісаная забарона дасле-

даваць гэты пласт духоўнай культуры. 90-я гады сталі літаральна "залатым векам" для ўсіх тых, хто цікавіўся, збіраў і вывучаў сакральна-магічную паэзію і асаблівасці яе рытуальна-абрадавага выкарыстання. Гл. па гэтай тэме: Замовы /Уклад. Г.А.Барташэвіч. Мн., 1992; Русские заговоры /Сост. Н.И.Савушкина. М., 1993; *Максимов С.В.* Нечистая, неведомая и крестная сила. СПб., 1994; Русское колдовство, ведовство, знахарство /Сост. М.Северов, Н.Ушаков. СПб., 1994; Лонго Ю. Третий глаз. Т. 4. М., 1995; *Аксенов А.П.* Я — не колдун, я — знахарь. Ростов-на-Дону, 1996; 777 заговоров и заклинаний русского народа /Сост. А.Александров. М., 1997; *Фролова Н.А.* Тайны лечебной магии и народной медицины: способы народного врачевания в свете науки, религии и философии. К., 1997; *Смирнова И.М.* Магия как она есть. М., 1997; *Панкеев И.А.* Тайны русских суеверий. М., 1997; *Казакова І.В.* Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры. Мн., 1997; Молитвенный народный лечебник. Мн., 1998; Энциклопедия быта русского народа, составленная Иваном Алексеевичем Панкеевым. Т. 2. М., 1998; *Степанова Н.И.* Большая книга магии. М., 1999.

[11] *Казакова І.В.* Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры. Мн., 1997. С. 62—66. *Голан А.* Миф и символ. М., 1993. С. 188—238.

[12] *Фадзеева В.Я.* Беларускі ручнік. Мн., 1994; Ручнік як увасабленне традыцыйнай культуры беларусаў. Віцебск, 1998.

[13] *Хокинс Дж., Уайт Дж.* Разгадка тайны Стоунхенджа. М., 1984.

[14] Пра герб і сцяг. Мн., 1993. С. 5.

[15] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 29.

[16] Там жа. С. 39—54; *Крук І.* "Сячыся-рубайся, і на гэты свет яўляйся": Роды і стаўленне да іх у культуры нашых продкаў //Роднае слова. 1999. № 5—6. С. 199—205.

[17] *Конан У.М.* Беларуская эстэтыка і мастацкая культура: Гісторыя, традыцыі і сучаснасць. Мн., 1988. С. 6.

*Казакова І.В.* Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры. С. 65.

[18] Вяселле. Песні. Т. 1 /Уклад. Л.А.Малаш. Мн., 1985. С. 65.

[19] *Сысоў У.М.* Беларуская пахавальная абраднасць: структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння. Мн., 1995. С. 18.

[20] Там жа. С. 17.

[21] *Фадзеева В.Я.* Беларускі ручнік. С. 81.

[22] Там жа. С. 81. Гл. таксама: Магія красы //Мастацтва, 1996. № 6. С. 35.

[23] *Сысоў У.М.* Беларуская пахавальная абраднасць. С. 69.

[24] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні /Укладанне тэкстаў, уступны артыкул і каментарыі У.А.Васілевіча. Мн., 1986. С. 146—192.

[25] *Фадзеева В.Я.* Беларускі ручнік. С. 87.

[26] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 189.

[27] *Крук І.І.* Сімволіка колераў у традыцыйнай культуры беларусаў //Роднае слова, 1997. № 1. С. 150.

[28] *Голан А.* Миф и символ. С. 221—238.

[29] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 31.

[30] Вяселле. Песні. Т. 2 /Уклад. Л.А.Малаш. Мн., 1986. С. 129—130.

[31] Вяселле. Абрад /Уклад. К.А.Цвірка. Мн., 1978. С. 172.

[32] Там жа. С. 183.

[33] Там жа. С. 181.

[34] Замовы. С. 249.

[35] Энциклопедия суеверий /Сост. Э. и М.А.Рэдфорд, Е.Миненок. М., 1995. С. 190.

[36] Вяселле. Абрад. Мн., 1978. С. 183.

[37] Вяселле. Песні. Т. 2. Мн., 1986. С. 35.

## Перавернуты кілішак на стале

[1] *Ерёмина В.И.* Ритуал и фольклор. Л., 1991. *Байбурин А.К.* Ритуал в традиционной культуре. СПб., 1993.

[2] Радзінная паэзія/Укл. М.Я.Грынблат. Мн., 1971. *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: Канец XIX – XX ст. Мн., 1993.

[3] *Толстой Н.И.* Переворачивание предметов в славянском погребальном обряде//Язык и народная культура: Очерки по славянской мифологии и этнолингвистике. М., 1995. С. 213—222.

[4] *Сысоў У.М.* З крыніц спрадвечных. Мн., 1997. С. 358.

[5] Архіў аўтара. Восенню 1981 г. на працягу пяці дзён я запісваў ад С.М.Вежнаўца разнажанравыя казкі. Аднак перад тым, як размясціцца, казачнік абавязкова пазіраў на столь і неяк загадкава заўважаў: "Пад бэльку не спяшайся, паложаць, як свечку ў рукі дадуць".

[6] Чарадзейныя казкі. Ч. 2 /Склад. К.П.Кабашнікаў, Г.А.Барташэвіч. Мн., 1978. № 117—119. С. 496—501; Казкі ў сучасных запісах /Уклад. К.П.Кабашнікава, Г.А.Барташэвіч. Мн., 1989. № 91. С. 181—184.

[7] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 140.

[8] Архіў аўтара. Запісана ў 1985 г. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад В.А.Кавалевіч, 1925 г.н.

[9] *Булгаковский Д.Г.* Пинчуки. Этнографический очерк. СПб., 1890. С. 190.

[10] *Топорков А.Л.* Домашняя утварь в обрядах и поверьях Полесья (XIX — начало XX в.) //Дисс. канд. истор. наук. Л., 1986. С. 104.

[11] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Витебск, 1897. С. 122.

[12] Архіў аўтара. Запісана ў 1979 г. у в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна Мінскай вобласці ад М.В.Коўчыка.

[13] *Толстой Н.И.* Переворачивание предметов в славянском погребальном обряде. М., 1995. С. 219.

[14] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 127.

[15] Архіў аўтара. Так рабілася ў нашай сям'і, калі ў 1985 г. памерла маці, а ў 1990 г. — бацька.

[16] Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Т. 2 /Уклад. У.Васілевіч. Мн., 1998. С. 231.

[17] *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 8: Быт белоруса. Вильно, 1912. С. 529, 530.

[18] *Сысоў У.М.* Беларуская пахавальная абраднасць. С. 17; *Юркевич И.* Остринский приход Виленской губернии Лидского уезда //Этнографический сборник ИРГО. Вып. 1. СПб., 1853. С. 290.

Мая маці зачыняла печ засланкай нават тады, калі дровы добра разгарэліся і шугала полымя. Сітуацыя стабільнасці (сляды чалавека не вымяталіся) павінна была захоўвацца да таго часу, пакуль чалавек не дасягаў месца прызначэння. З гэтай нагоды ўспомнім пра магічныя дзеянні, якія суправаджаюць выкананне замаўлення "прысушак" або "адсушак". *Хлопца*, які падабаўся дзяўчыне, *запрашалі ў госці і сляды яго*

*мялі венікам* ад парога да печы — *у хату*. І наадварот, *калі юнак не падабаўся дзяўчыне* ці бацькам, то пасля таго як ён пойдзе з хаты, *яго сляды вымяталі за парог*.

Мае шматлікія сустрэчы з воінамі-афганцамі далі магчымасць адкрыць "вялікую тайну" іх "удалага" лёсу падчас службы. Многія з іх былі перакананы, што выжыць, ацалець ва ўмовах небяспечных баявых аперацый ім дапамаглі матулі: як толькі сын пераступаў парог роднай хаты, маці брала след босай нагі, загортвала яго ў чысцюткую хусцінку і "вяртала", уносіла ў хату, захоўвала за абразамі.

[19] *Шейн П.В.* Великорус в своих песнях, обрядах, обычаях, верованиях, сказках, легендах и т.п. Т. 1. Вып. 2. СПб., 1900. С. 778.

[20] Архіў аўтара. Запісана ў 1990 г. ад В.А.Кавалевіч.

[21] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 22, 29, 141.

[22] Там жа. С. 146.

[23] Там жа. С. 27.

[24] Там жа. С. 110.

[25] Там жа. С. 200—201.

[26] Там жа. С. 226—227.

[27] Там жа. С. 225.

[28] Там жа. С. 102.

[29] 15 лютага 1994 г., на Грамніцы, каля царквы, што на Вайсковых могілках у Мінску, стаяла жанчына і расказвала тым, хто падыходзіў, гэту замову. На маю просьбу назваць сябе адрэагавала катэгарычным жэстам нязгоды.

[30] Замовы. С. 77, 327.

[31] *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 8. С. 540.

[32] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 361.

## У чыіх руках прадзіва нашага лёсу

[1] *Берман И.* Календарь по народным преданиям в Воложинском приходе Виленской губернии Ошмянского узеда. Т. 5 //Зап. Имп. рус. географ. общ-ва по отд-нию этнографии. СПб., 1873. С. 18. *Булгаковский Д.Г.* Пинчуки. Т. 13. С. 183. *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 51.

[2] *Степанова Н.И.* Большая книга магии. М., 1999. С. 679.

[3] Архіў аўтара. Запісана ў 1971 г. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад А.І. Крук. Яна тлумачыла, што і чаму нельга класці на стол: шапку і грэбень — будзе балець галава; ключы — нядоўга пражывеш у гэтай хаце; сумку — не будуць весціся грошы ў сям'і.

[4] Гэта з'ява агульнапашыраная і агульнавядомая. Падчас сустрэч са сваякамі, шматлікіх фальклорных экспедыцый па ўсіх раёнах Гомельскай і Мінскай абласцей, паездак на Гродзеншчыну, Віцебшчыну, Брэстчыну і Магілёўшчыну даводзілася не аднойчы прысутнічаць на вяселлях, пахаваннях, святочных імпрэзах і пастаянна сутыкацца з гэтай застольнай акалічнасцю — хлеб, пячэнне і цукеркі заўсёды прапаноўвалі браць толькі "ў пару".

[5] Архіў аўтара. Запісана ў 1977 г. у в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна ад А.Захарчэні.

[6] Жніўныя песні /Укладанне тэкстаў, уступны артыкул і каментарыі А.С.Ліса. Мн., 1974. С. 28. Яго ж: Жніўныя песні. Мн., 1993. С. 129—130; Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў. Мн., 1998. С. 130—134.

[7] Жніўны песні. Мн., 1974. С. 741. № 349 р.

[8] Архіў аўтара. Запісана ў 1971—1999 гг. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад В.А.Кавалевіч.

[9] *Лозка А.Ю.* Беларускі народны каляндар. С. 6—7.

[10] *Валодзіна Т.В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. С. 78.

[11] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 146. Гэтага ж прынцыпу прытрымліваліся дома ў час Змітраўскіх Дзядоў: “Гаспадар, наліўшы чарку, адлівае з яе некалькі кропель на абрус для духаў, такім жа чынам п'юць па чарзе астатнія. Ніхто не кране стравы, перш чым не адалье па лыжцы ў пастаўленую на стол міску, якая пасля напаўнення рознымі стравамі для дзядоў ставіцца каля акна”. Гл. там жа. С. 162.

[12] *Морозов И.В.* Таинственным путем Гермеса. М., 1994. С. 174.

[13] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 154.

[14] Там жа. С. 147, 156.

[15] Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 253. Вяселле. Абрад /Уклад. К.А.Цвірка. Мн., 1978. С. 307, 327.

[16] Вяселле. Абрад. Мн., 1978. С. 302.

[17] Архіў аўтара. Запісана ў 1996 г. у в. Канчаны Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ад Г.Ф.Жуклевіч і Т.Ф.Марынскай.

[18] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 162.

[19] Архіў аўтара. Запісана ў 1999 г. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад У.І.Жданка.

[20] Магія слова чароўнага. С. 106. № 73.

[21] Там жа. С. 103. № 68.

[22] Там жа. С. 165. № 174.

[23] Там жа. С. 78—79. № 31.

[24] Там жа. С. 87—88. № 42.

[25] Там жа. С. 96. № 55.

[26] Жыцця адвечны лад. Т. 2. С. 41.

[27] *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 8: Быт белоруса. С. 302.

[28] *Крачковский Ю.* Быт западно-русского селянина. М., 1874. С. 166.

[29] *Сержпутоўскі А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1930. С. 76.

[30] *Federowski M.* Lud bialoruski na Rusi Litewskiej. T. IV. Warszawa, 1935. С. 353—354.

[31] *Мухлинский А.* Праздники, забавы, предрассудки и суеверные обряды простого народа в Новогрудском повете Литовско-Гродненской губернии //Вестник Европы, 1830. № 14. С. 272.

[32] *Сержпутоўскі А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 87.

[33] Там жа. С. 87.

[34] Там жа. С. 88.

[35] Жыцця адвечны лад. Т. 2. С. 434.

[36] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 177.

[37] *Сержпутоўскі А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 77.

[38] Там жа. С. 42.

[39] Там жа. С. 32.

[40] *Неверович В.* О праздниках, поверьях и обычаях у крестьян белорусского племени, населяющих Смоленскую губернию //Памятная книжка Смоленской губернии на 1859 год. Смоленск, 1859. С. 164.

[41] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 174.

[42] *Сержпутоўскі А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 95.

[43] Там жа. С. 78.

[44] Там жа. С. 58.
[45] Там жа. С. 173—174.
[46] Жыцця адвечны лад. Т. 2. С. 202.
[47] *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 8: Быт белоруса. С. 306.
[48] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 98.
[49] *Шлюбскі А.* Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны. Ч. 2. Мн., 1928. С. 107.
[50] Жыцця адвечны лад. Т. 2. С. 99.
[51] Там жа. С. 150.
[52] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 175.
[53] Жыцця адвечны лад. Т. 2. С. 175.
[54] Казкі ў сучасных запісах /Укладанне тэкстаў, уступны артыкул і каментарыі К.П.Кабашнікава, Г.А.Барташэвіч. Мн., 1989. № 32. С. 55—56. Запісаў І.І.Крук у 1980 г. у в. Уборкі Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці ад К.М.Мельнікавай.
[55] Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы /Уклад. Ф.Янкоўскі. Выд. 3-е, дапрацаванае, дапоўненае. Мн., 1992. С. 112.
[56] Там жа. С. 257.
[57] Вяселле. Абрад. Мн., 1978. С. 374.
[58] Энциклопедия суеверий. М., 1995. С. 189.
[59] Дзіцячы фальклор. Мн., 1972. С. 395.
[60] Замовы. С. 137.
[61] Там жа. С. 254.
[62] Там жа. С 345.
[63] 777 заговоров и заклинаний русского народа. М., 1997. С. 50.
[64] *Мамуна Н.* Почему именно двенадцаць? //Наука и религия, 1991. № 9. С. 51.
[65] Мифы народов мира. Т. 2. М., 1988. С. 358—360.
[66] *Штейнбах В.Л.* От Олимпии до Москвы. М., 1980. С. 10—21.
[67] *Хокинс Дж., Уайт Дж.* Разгадка тайны Стоунхенджа. М., 1984.
[68] Замовы. С. 124.
[69] Там жа. С. 289.
[70] Там жа. С. 121.
[71] Там жа. С. 325.
[72] *Степанова Н.И.* Большая книга магии. С. 423.
[73] *Крук І.І.* Нешчаслівая пятніца, 13-га //Звязда, 13 сакавіка 1998.
[74] Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі /Уклад. К.П.Кабашнікаў, Г.А.Барташэвіч. Мн., 1971. С. 60, 117, 150.
[75] Сацыяльна-бытавыя казкі /Склад. А.С.Фядосік, Л.Г.Бараг. Мн., 1976. С. 182, 262, 318.
[76] Чарадзейныя казкі. Мн., 1973. Ч. І. С. 134; Мн., 1978. Ч. ІІ. С. 115.
[77] Чарадзейныя казкі. Ч. І. Мн., 1973. С. 159.
[78] Там жа. С. 131.
[79] Там жа. С. 159.
[80] *Крук І.І.* У пошуках “Трыдзевятага царства”: Універсаліі беларускай народнай культуры //Роднае слова, 1999. № 7. С. 206—213; Яго ж: Хранатоп “Трыдзевятага царства” ў структуры беларускіх рытуальна-абрадавых комплексаў //Етнічна історія народів Европи: Традиційна етнічна культура слов’ян. Київ, 1999. С. 154—157.
[81] *Лозка А.Ю.* Беларускі народны каляндар. С. 66—68.
[82] *Журавлёв А.Ф.* Домашний скот в поверияx и магии восточных славян. М., 1994.

## Сімволіка дзён і дат у народнай культуры

[1] *Ермолов А.С.* Всенародная агрономия. М., 1996. С. 87.

[2] *Лозка А.Ю.* Беларускі народны каляндар. С. 7.

[3] Гл. названую вышэй літаратуру па магіі і народнай медыцыне.

[4] *Ермолов А.С.* Всенародная агрономия. С. 79—91; Зямная дарога ў вырай /Уклад. У.А.Васілевіч. Мн., 1996. С. 271.

[5] *Степанова Н.И.* Большая книга магии. С. 703.

[6] *Лозка А.Ю.* Беларускі народны каляндар. С. 7.

[7] Там жа. С. 74.

[8] Там жа. С. 105.

[9] *Степанова Н.И.* Большая книга магии. С. 703.

[10] *Ермолов А.С.* Всенародная агрономия. С. 81—91.

[11] Легенды і паданні. С. 135—136.

[12] *Байбурин А.К.* Ритуал в традиционной культуре. СПб., 1993. С. 160.

[13] *Крук І.І.* Сімволіка дзён і дат у народнай культуры //Звязда, 18 сакавіка 1998. Яго ж: "Чысты чацвер" і "радзіцельская субота" //Алеся, 1997. № 3. С. 12.

[14] *Ермолов А.С.* Всенародная агрономия. С. 88.

[15] *Крук І.І.* Следам за сонцам. Беларускі народны каляндар. Мн., 1998. С. 51—52.

[16] Там жа. С. 72.

[17] Там жа. С. 73.

[18] *Ліцвінка В.Д.* Святы і абрады беларусаў. Мн., 1997. С. 72; Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 183.

[19] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 145.

[20] *Крук І.І.* "Цыбулю садзяць толькі ў пятніцу", ці Погляд на сучаснае жыццё вачыма фалькларыста са стажам //Мінская праўда, 3 жніўня 1996.

[21] *Чичеров В.И.* Зимний период русского народного земледельческого календаря XVI—XIX вв. М., 1957. С. 57; *Рыбаков Б.А.* Язычество древних славян. М., 1981. С. 387—392.

[22] *Крук І.І.* Параскева Пятніца //Алеся, 1998. № 2. С. 12.

[23] *Фадзеева В.Я.* Беларускі ручнік. С. 99—113.

[24] Легенды і паданні. С. 136—138.

[25] *Афанасьев А.Н.* Происхождение мифа. Статьи по фольклору, этнографии и мифологии. М., 1996. С. 220.

[26] *Рыбаков Б.А.* Язычество древних славян. С. 388.

[27] *Максимов С.В.* Нечистая, неведомая и крестная сила. СПб., 1994. С. 422—423.

[28] Там жа. С. 424.

[29] Зямля стаіць пасярод свету /Уклад. У.А.Васілевіч. Мн., 1996. С. 549—550.

[30] *Рыбаков Б.А.* Язычество древних славян. С. 386; *Максимов С.В.* Нечистая, неведомая и крестная сила. С. 428.

[31] *Крук І.І.* "Чысты чацвер" і "радзіцельская субота" //Алеся, 1997. № 3. С. 12.

[32] Русский православный обряд погребения. М., 1996. С. 67.

[33] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 177.

[34] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 36.

[35] Там жа.

[36] Зямля стаіць пасярод свету. С. 550.

[37] Там жа. С. 550—551.

[38] *Ермолов А.С.* Всенародная агрономия. С. 80.
[39] *Крук І.І.* Сімволіка дзён і дат у народнай культуры // Звязда, 18 сакавіка 1998.
[40] Зямная дарога ў вырай. С. 249.
[41] Там жа. С. 72.
[42] Там жа. С. 73.
[43] Там жа.
[44] Там жа. С. 170.
[45] Там жа.
[46] Там жа. С. 186.
[47] Там жа. С. 192.
[48] Там жа. С. 262.
[49] Там жа. С. 273.
[50] Зямля стаіць пасярод свету. С. 50.
[51] Там жа. С. 242.
[52] Там жа. С. 546.
[53] Замовы. С. 186.
[54] Там жа.
[55] Там жа. С. 187.
[56] Там жа. С. 186.
[57] Зямная дарога ў вырай. С. 222.
[58] Там жа. С. 227.
[59] Зямля стаіць пасярод свету. С. 49
[60] Там жа. С. 290.
[61] Там жа. С. 303.
[62] Архіў аўтара. Так у 1968 г. вывяла бародаўкі з маёй рукі бабуля Аўдоцця.
[63] *Ермолов А.С.* Народное погодоведение. М., 1945. С. 274—275, 181—282.
[64] Там жа.
[65] Там жа. С. 279.
[66] Зямля стаіць пасярод свету. С. 252.
[67] Там жа. С. 253
[68] Там жа. С. 258.
[69] Зямная дарога ў вырай. С. 170—171.
[70] *Лозка А.Ю.* Беларускі народны каляндар. С. 5.
[71] *Степанова Н.И.* Большая книга магии. С. 111—114, 334—336.

## **“Выйдзі, мамачка, з свячамі, мы тваіх дзяцей звянчалі”**

[1] *Ліцвінка В.Д.* Святы і абрады беларусаў. Мн., 1997. С. 17.
[2] Вяселле. Песні. Т. 2. /Уклад. Л.А.Малаш. Мн., 1986. С. 180.
[3] Беларускі фальклор /Склад. К.П.Кабашнікаў, А.С.Ліс, А.С.Фядосік, І.К.Цішчанка. Мн., 1985. С. 241—242.
[4] *Сысоў У.М.* З крыніц спрадвечных. Мн., 1997. С. 301—302.
[5] Архіў аўтара. Запісана ў 1997 г. у в. Канчаны Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ад Г.Ф.Жуклевіч, 1918 г.н.
[6] Архіў аўтара. Запісана ў 1997 г. у в. Сенькава Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ад Л.І.Кадыш.
[7] Вяселле. Песні. Т. 3. С. 254.
[8] Беларускі фальклор. С. 251.

## "Сам Бог каравай месіць"

[1] Шматлікія звесткі аб асаблівасцях гэтага прыгожага абраду — дзяльбы каравая, а таксама прыклады вясельных песень гл. у кн.: Вяселле. Песні. У 6-ці кнігах /Склад. Л.А.Малаш. Мн., 1981; Вяселле. Абрад /Уклад. К.А.Цвірка. Мн., 1978.

## "Я не адна, са мной другі"

[1] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 20.

[2] Жыццё адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Т. 2. С. 334.

[3] Славянские древности: Этнолингвистический словарь /Под ред. Н. И. Толстого. Т. 1. А—Г. М., 1995. С. 160—161.

[4] Там жа. С. 166.

[5] Жыццё адвечны лад. С. 125.

[6] Там жа. С. 166—168.

[7] Архіў аўтара. Запісана ў 1997 г. у в. Сенькава Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ад А.К.Марынскай.

[8] Вяселле. Абрад. С. 308—309.

[9] Архіў аўтара. Запісана ў 1976 г. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад В.А.Кавалевіч.

[10] Жыццё адвечны лад. С. 127.

[11] Славянские древности. С. 160—161.

[12] Архіў аўтара. Шматразова даводзілася чуць пра гэта ў час экспедыцый па ўсіх раёнах Гомельшчыны, Міншчыны, у Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці.

[13] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 12—26.

[14] Жыццё адвечны лад. С. 42—48, 52—78.

[15] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 12—22.

[16] Жыццё адвечны лад. С. 42—79.

[17] Там жа.

[18] Там жа. С. 66—79.

[19] Там жа.

[20] Там жа. С. 123—127.

## "Сячыся-рубайся, і на гэты свет, младзенец, яўляйся"

[1] Жніўныя песні/Уклад. А.С. Ліс. Мн., 1974. С. 98. № 39д.

[2] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 13; *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 58.

[3] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 6.

[4] Замовы. С. 328.

[5] Замовы. № 1107. С. 327 – 328.

[6] Архіў аўтара. Запісана ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці.

[7] *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 8: Быт белоруса. С. 323.

[8] *Науменко Г.М.* Этнография детства. М., 1998. С. 29 – 35.

[9] Замовы. Мн., 1992.

[10] *Науменко Г.М.* Этнография детства. М., 1998. С. 34.

[11] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 30 – 31. *Науменко Г.М.* Этнография детства. С. 54 – 56.

[12] *Науменко Г.М.* Этнография детства. С. 32 – 34.

[13] Замовы. № 1121. С. 331.

[14] Там жа. № 504. С. 161.

[15] *Науменко Г.М.* Этнография детства. С. 54 – 55.

[16] Замовы. № 1125. С. 332.

[17] *Торэн М.Д.* Русская народная медицина и психотерапия. М., 1996. С. 439.

[18] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 32.

[19] Архіў аўтара. Запісана ў 1985 г. у Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці.

[20] *Торэн М.Д.* Русская народная медицина и психотерапия. С. 457.

[21] Жыцця адвечны лад. Кн. 2. С. 100 – 102.

[22] Там жа. С. 92.

[23] Архіў аўтара. Менавіта такім спосабам у 1992 г. уратавала ад цяжкага дыскагеннага радыкуліту аўтара гэтых радкоў народная лекарка Ф.А. Блінова, жыхарка в. Азярышча Мінскага раёна.

[24] *Торэн М.Д.* Русская народная медицина и психотерапия. С. 462.

[25] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 30.

[26] Радзіны/ Уклад. Г.А.Пятроўская, Т.І. Кухаронак. Мн., 1998. С. 91.

[27] *Науменко Г.М.* Этнография детства. С. 49.

[28] Там жа. С. 56 – 60.

[29] Архіў аўтара. Запісана ў 1994 г. ад невядомай жанчыны прыкладна 60 гадоў (прозвішча назваць адмовілася) у дзень Грамніц на Вайсковых могілках у Мінску.

[30] Жыцця адвечны лад. С. 127 – 128.

[31] Там жа. С. 123 – 127.

[32] Там жа. С. 137.

[33] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 67.

## Жыццё і смерць чалавека ў традыцыях, абрадах і паэзіі беларускага народа

[1] Жыцця адвечны лад. С. 96.

[2] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 20—21.

[3] Гл. казкі тыпу СУС 332 (Сравнительный указатель сюжетов: Восточнославянская сказка /Сост. Л.Г.Бараг, И.П.Березовский, К.П.Кабашников, Н.В.Новиков. Л., 1979), напрыклад: Казкі ў сучасных запісах /Уклад. К.П.Кабашнікава, Г.А.Брташэвіч. Мн., 1989. С. 181—184.

[4] Легенды і паданні. С. 51—52; *Federowski M.* Lud bialoruski. T. II. Warszawa. № 336.

[5] Архіў аўтара. Запісана ў 1970 г. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад А.І.Крук.

[6] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 195—443. Даследаванню паэтыкі пахавальных галашэнняў і іх цеснай узаемасувязі са структурай абраду прысвечаны кандыдацкая дысертацыі У.М.Сысова, асноўныя палажэнні якой выкладзены ў кн.: Беларуская пахавальная абраднасць: структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння. Мн., 1995.

[7] *Байбурин А.К.* Ритуал в традиционной культуре. СПб., 1993; Байбурин А.К., Левинтон Г.А. Похороны и свадьба //Исследования в области балто-славянской духовной культуры: Погребальный обряд. М., 1990. С. 64—98.

[8] *Васілевіч У.А.* Беларускі народны каляндар. Мн., 1993. С. 18.

[9] Балады ў дзвюх кнігах. Кн. 1 /Уклад. Л.М.Салавей. Мн., 1977. С. 91—96.

[10] Казкі ў сучасных запісах. С. 282—289. Па класіфікацыі — СУС 530, 540 А.

[11] Легенды і паданні. С. 59—60.

[12] *Крук І.І.* Беларускі народны каляндар. Мн., 1998. С. 63.

[13] Легенды і паданні. С. 185—189.

[14] Жыцця адвечны лад. С. 29—250.

[15] Там жа. С. 255—260.

[16] Там жа. С. 255—262.

[17] Там жа. С. 258.

[18] *Сысоў У.М.* Беларуская пахавальная абраднасць. С. 125.

[19] Жыцця адвечны лад. С. 261.

[20] Там жа. С. 262.

[21] Там жа. С. 240—242.

[22] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 127.

[23] Там жа. С. 137.

[24] Там жа. С. 132, 138.

[25] Там жа. С. 114, 127, 134, 153.

[26] Там жа. С. 279.

[27] Там жа. С. 110.

[28] Архіў аўтара. Запісана ў 1985 г. у в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ад В.А.Кавалевіч.

[29] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С 361.

[30] Там жа. С. 297.

[31] Там жа. С. 301.

[32] Там жа. С. 216.

[33] Там жа. С. 393.

[34] Там жа. С. 299.

[35] *Шейн П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного Края. Т. 1. Ч. 2. СПб., 1890. С 525.

[36] *Гнатюк В.* Похоронні звичаї й обряди. Т. 31—32//Етнографічний збірник. Львів, 1912. С. 227.

[37] *Сысоў У.М.* З крыніц спрадвечных. Мн., 1997. С. 367.

[38] *Сысоў У.М.* Беларуская пахавальная абраднасць. С. 51.

[39] *Шейн П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1. Ч. 2. С. 540.

[40] *Чубинский П.П.* Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край. Юго-Западный отдел. Материалы и исследования. Т. 4: Обряды: родины, крестины, свадьба, похороны. СПб., 1877. С. 708.

[41] *Юдин А.В.* Русская народная духовная культура. М., 1999. С. 147—149.

[42] *Татур Г.Х.* Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и её археологическое значение. Мн., 1892. С. 194—195.

[43] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 407.

[44] Там жа. С. 341.

[45] Там жа. С. 415.

[46] *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вып. 8: Быт белоруса. Вильно, 1912. С. 528.

[47] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 126.

## Агонь і ратуе, і губіць

[1] Легенды і паданні. С. 108—109.
[2] Зямля стаіць пасярод свету. С. 43—45.
[3] *Сержпутоўскі А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 274.
[4] Легенды і паданні. С. 358.

## "Вада-вадзіца, Божая памачніца"

[1] *Демин В.Н.* Тайны русского народа. М., 1997. С. 414—433.
[2] Замовы. С. 315.
[3] Там жа. С. 320.
[4] *Панченко А.А.* Народное православие. СПб., 1998. С. 118—122.
[5] Архіў аўтара. Аб гэтым мне расказала ў 1985 г. К.Д.Крук з в. Згурск Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці.
[6] *Панченко А.А.* Народное православие. С. 86.
[7] Зямная дарога ў вырай. С. 561—574.

## "Зямля святая, яна наша маці"

[1] Легенды і паданні. С. 48—51, 240, 248, 250—251.
[2] Зямля стаіць пасярод свету. С. 39, 41.
[3] *Крук І.І.* Беларускі народны каляндар. С. 73.
[4] *Зеленин Д.К.* Избранные труды. Очерки русской мифологии: Умершие неестественной смертью и русалки /Вступит. ст. Н.М.Толстого; подготовка текста, комментарии, указат. Е.Е.Левкиевской. М., 1995. С. 44, 63, 129—138.
[5] Архіў аўтара. Пра гэты абрад мне расказваў мой бацька І.А.Крук, а таксама звыш 70 воінаў-афганцаў, якія прызываліся ў войска з розных мясцін Беларусі.
[6] Зямля стаіць пасярод свету. С. 39.

## "Кучаравая, а не дзяўчына"

[1] *Пропп В.Я.* Русские аграрные праздники. Л., 1963. С. 60; *Соколова В.К.* Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979. С. 190–192; *Токарев С.А., Филимонова Т.Д.* Обряды и обычаи, связанные с растительностью//Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. М., 1983. С. 148.
[2] *Крук І.І.* Беларускі народны каляндар. С. 109.
[3] Там жа. С. 110–113.
[4] Зямная дарога ў вырай. С. 59.
[5] Жыцця адвечны лад. С. 424–442.
[6] Казка запісана ад К.М. Мельнікавай, якая жыла ў в. Уборкі Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук, фонд 8, воп. 82, спр. 201.
[7] Загадкі/Склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі. М., 1972. С. 65–66.

## Там стаіць дуб

[1] Замовы. С. 127.

[2] *Кагаров Е.* Культ фетишей, растений. СПб., 1913. С. 93, 95; *Топоров В.Н.* Древо жизни. Древо мировое. Древо познания //Мифы народов мира. Т. 1. М., 1980. С. 396—407; *Токарев С.А., Филимонова Т.Д.* Обряды и обычаи, связанные с растительностью. С. 147—148; *Ненадавец А.М.* Пакланіцеся дубу. Мн., 1992. С. 20—30. Яго ж: Святло таямнічага вогнішча. Мн., 1993. С. 10—30.

[3] Загадкі. С. 22.

[4] *Ненадавец А.М.* Пакланіцеся дубу. С. 54—64.

[5] Замовы. С. 122.

[6] Чарадзейныя казкі. Ч. II. С. 97.

## “Да й асінкаю заламлю”

[1] Зямля стаіць пасярод свету. С. 149—150.

[2] Легенды і паданні. С. 75.

[3] Архіў аўтара. Запісана ў 1979 г. у в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна Мінскай вобласці.

[4] Зямля стаіць пасярод свету. С.148—154.

[5] Паэзія беларускага земляробчага календара /Уклад. А.С.Ліс, народны каляндар падрыхтаваў У.А.Васілевіч. Мн., 1992. С. 291.

## Чырвоны кут

[1] *Байбурин А.К.* Жилище в обрядах и представлениях восточных славян. Л., 1983; Яго ж: Ритуал в традиционной культуре. СПб., 1993.

[2] *Крук І.І.* Чырвоны кут //Алеся, 1995. № 4. С. 12; Яго ж: Прадметна-атрыбутыўная семіётыка традыцыйнай культуры беларусаў //Заслаўскія чытанні. 1995. Заслаўе, 1997. с. 119—122.

## Праз парог рукі не падавай

[1] *Байбурин А.К.* Жилище в обрядах и представлениях восточных славян. Л., 1983; Яго ж: Ритуал в традиционной культуре. СПб., 1993.

[2] *Коваль У.І.* Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы. Гомель, 1995. С. 116—118.

[3] *Крук І.І.* Праз парог рукі не падаюць //Работніца і сялянка, 1994. № 10. С. 12.

## Печ мая кафляная

[1] *Никифоровский Н.Я.* Простонародные приметы и поверья. С. 55.

[2] *Варфоломеева Т.Б.* Северобелорусская свадьба: Обряд, песенно-мелодические типы. Мн., 1988. С. 13, 17.

[3] Вяселле. Абрад /Уклад. К.А.Цвірка. Мн., 1978. С. 364.

[4] *Moszyuski K.* Polesie wschodnie. Warszawa, 1928. C. 179.

[5] *Сержпутоўскі А.К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. С. 147.

[6] *Кухаронак Т.І.* Радзінныя звычаі і абрады беларусаў. С. 92.

[7] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 14; Жыцця адвечны лад. С. 289.
[8] Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. С. 174.
[9] Восеньскія святы /Уклад. А.Лозка. Мн., 1995. С. 18—22.

## Падкова на шчасце

[1] Энциклопедия суеверий /Сост. Э и М.А.Рэдфорд, Е.Миненок. М., 1995. С. 15—16.
[2] Там жа.
[3] *Романов Е.Р.* Белорусский сбоорник. Вып. 8. С. 229.
[4] Архіў аўтара. Пра такі варыянт упрыгожвання дугі паведалі жанчыны сталага веку ў 1996 г. у вёсках Сенькава, Канчаны, Каханавічы, Дзёрнавічы, Бігосава, Асвея Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці.

## Руса каса да пояса

[1] *Крук І.І.* Беларускі народны каляндар. С. 42.
[2] *Federowski M.* Lud bialoruski na Rusi Litewskiej. T. 1. Krakow, 1897. С. 309.
[3] *Сицинский А.А.* Акушерская помощь в Минской губернии. СПб., 1893. С. 59.
[4] Жыцця адвечны лад. С. 108—109, 112—113; Славянские древности. Этнолингвистический словарь. Т. 1. А—Г. М., 1995. С. 420—423.
[5] Замовы. С. 244.

## "Свінка — залатая шарсцінка"

[1] Этнаграфічныя звесткі аб умовах і асаблівасцях свінагадоўлі гл. у кн.: Зямля стаіць пасярод свету: Беларускія народныя прыкметы і павер'і /Уклад. У.А.Васілевіч. Мн., 1996. С. 387—392.

## "Надары, Божа, маю кароўку добрым здароўем, жоўтым маслам, белым сырам"

[1] Шматлікія звесткі аб асаблівасцях утрымання каровы ў гаспадарцы і стаўлення да яе як да міфалагічнага персанажа гл. у кн.: Зямля стаіць пасярод свету: Беларускія народныя прыкметы і павер'і /Уклад. У.А.Васілевіч. Мн., 1996. С. 341—377.

## Чалавек у структуры міфапаэтычнай мадэлі свету

[1] Шматлікія звесткі па разглядаемай тэме змешчаны ў кн.: Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер'і /Уклад. У.А.Васілевіч. Мн., 1998.

# ЗМЕСТ


Слова да чытача ............ 5

**Чалавек і час** ............ 7

Беларускі народны каляндар: шляхі фарміравання, архітэктоніка, семантыка і семіётыка рытуальна-абрадавых комплексаў ............ 8

Сэнсава-семантычныя аспекты сінхранізацыі абрадавых комплексаў у народна-ведыйскім і хрысціянскім календарах ............ 25

Культ продкаў як структураўтваральны прынцып народнага календара ............ 30

Асноўныя прынцыпы фарміравання рытуальна-абрадавых комплексаў беларусаў ............ 32

**Чалавек і яго лёс** ............ 49

Млечны Шлях пад рукамі бабулі ............ 50

Сімволіка ручніка ў традыцыйнай культуры беларусаў ............ 50

Перавернуты кілішак на стале, або Закон рытуальнай перавернутасці ў беларускай народнай культуры ............ 83

Прадметна-атрыбутыўны код, або Пераварочванне прадметаў у пахавальным абрадзе ............ 84

Акцыянальны код. Вяселле і памінкі: супрацьлеглая накіраванасць рытуальных дзеянняў ............ 92

Вербальны код. Супрацьлегласць паэтычных характарыстык у вясельнай і пахавальнай паэзіі ............ 99

У чыіх руках прадзіва нашага лёсу, або Сімволіка лікаў у культуры беларусаў ............ 106

Сімволіка цотнасці і няцотнасці ............ 108

“Першым разам, лепшым часам” ............ 123

“Сем раз адмерай, адзін раз адрэж” ............ 127

“Дванаццаць братоў-малайцоў” ............ 132

“У трыдзевятым царстве, у трыдзесятым гасударстве” ............ 136

Сорак ............ 150

Дата нараджэння і лёс чалавека, або Квадрат Піфагора дапамагае зазірнуць у будучыню ............ 153

Сімволіка дзён і дат у народнай культуры ............ 155

Фазы Месяца і іх уплыў на сістэму прыкмет, павер’яў, характар гаспадарчай дзейнасці ............ 169

**Чалавек і яго род** ............ 179

“Выйдзі, мамачка, з свячамі, мы тваіх дзяцей звянчалі” ............ 180

“Сам Бог каравай месіць” ............ 195

“Я не адна, са мной другі” ............ 215

Цяжарная жанчына ў культуры нашых продкаў ............ 215

“Сячыся-рубайся, і на гэты свет, младзенец, яўляйся” ............ 229

Жыццё і смерць чалавека ў традыцыях, абрадах і паэзіі беларускага народа ............ 245

**Чалавек і свет** ........................................................................ 279
Сімволіка стыхій першатварэння ........................................................ 280
Агонь і ратуе, і губіць ..................................................................... 280
"Вада-вадзіца, Божая памачніца" ..................................................... 282
"Зямля святая, яна наша маці" .......................................................... 284
Сімволіка дрэў .................................................................................... 287
"Кучаравая, а не дзяўчына" ............................................................... 287
Там стаіць дуб ..................................................................................... 290
"Да й асінкаю заламлю" ...................................................................... 293
Сімволіка беларускага жытла ............................................................. 296
Чырвоны кут ....................................................................................... 296
Праз парог рукі не падавай ................................................................ 300
Печ мая кафляная ............................................................................... 303
Падкова на шчасце .............................................................................. 306
Руса каса да пояса ............................................................................... 309
Гаспадарчая дзейнасць чалавека: паміж быццём і міфам .................. 312
"Свінка — залатая шарсцінка" ............................................................ 312
"Надары, Божа, маю кароўку добрым здароўем, жоўтым маслам, белым сырам" ........ 316
**Чалавек і Сусвет** ................................................................................ 323
Славянская міфапаэтычная мадэль свету: бінарная апазіцыя *правае—левае* ........ 324
Бінарная апазіцыя *правае—левае*: культурныя кантэксты ................. 325
Чалавек у структуры міфапаэтычнай мадэлі свету (эколага-культуралагічныя аспекты рэгламентавання паводзін) ........ 329
**Літаратура** ......................................................................................... 334

Навукова-папулярнае выданне

**КРУК Янка (КРУК Іван Іванавіч)**

**СІМВОЛІКА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ**

Рэдактар *Л. А. Крупіч*. Мастак *Ю. А. Тарэеў*.
Мастацкі рэдактар *А. М. Хількевіч*.
Тэхнічныя рэдактары *В. А. Віценка, Г. М. Хейфец*.
Карэктар *Л. К. Місуна*.
Падпісана да друку з гатовых дыяпазітываў 04.01.2003.
Фармат 60×90 1/16. Папера афс. №1. Гарнітура Школьная.
Ум.друк.арк. 22,0. Ул.-выд.арк.20,58.
Тыраж 2500 экз. Заказ 25.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларусь»Міністэрства інфармацыі
Рэспублікі Беларусь.Ліцэнзія ЛВ №2 ад 17.01.2001.
220004, Мінск, праспект Машэрава,11.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Друкарня «Перамога».
222310, Маладзечна, В. Таўлая, 11.

**Крук Я.**

К84 Сімволіка беларускай народнай культуры. — Мн.: Беларусь, 2003. — 350 с.: іл.

ISBN 985-01-0460-0.

Разглядаюцца асноўныя абрады, рытуалы, звычаі беларускага народа, якія суправаджалі чалавека ад нараджэння да пахавальнага вогнішча, а таксама сімволіка колераў, лікаў, кожнага дня, тыдня, спрыяльныя і неспрыяльныя тыдні ў залежнасці ад фазы Месяца. Вялікая ўвага ўдзелена космасу сялянскай хаты, асноўным яе рытуальным зонам: чырвонаму куту, печы,парогу.

Кніга адрасавана выкладчыкам культуралагічных дысцыплін, студэнтам ВНУ, настаўнікам, шырокаму колу людзей, якія імкнуцца спасцігнуць таямніцы духоўнай спадчыны беларусаў.

**УДК 393.3 (=826) + 008(476)**
**ББК 82.3 (Беи) + 71(4 Беи)**



# СІМВОЛІКА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КУЛЬТУРЫ

**КРУК Іван Іванавіч – кандыдат філалагічных навук, даследчык духоўнай культуры беларускага народа, аўтар 4 манаграфій і зборнікаў, больш чым 250 артыкулаў па гісторыі і тэорыі фальклору, міфалогіі, народных вераваннях, абрадах і звычаях. Даследуе праблемы рэканструкцыі славянскай міфапаэтычнай мадэлі свету, расшыфроўкі сімволікі традыцыйнай культуры.**

**У прапануемай чытачу кнізе аўтар падводзіць вынікі дваццацігадовай збіральніцкай і даследчыцкай дзейнасці. У цэнтры ўвагі абрады, якія суправаджалі асноўныя падзеі ў жыцці чалавека. Кніга – не толькі позірк у сівую мінуўшчыну беларускага народа, найперш – гэта клопат аб захаванні і перадачы духоўнай спадчыны продкаў ашчадным і зацікаўленым спадкаемцам.**

ISBN 985-01-0460-0
9 789850 104601

ЯНКА КРУК